СЦЯПАН КУХАРАЎ

БАЦЬКАВІЧЫ





СЦЯПАН КУХАРАЎ

БАЦЬКАВІЧЫ

АПОВЕСЦЬ, АПАВЯДАННІ



МІНСК
«МАСТАЦКАЯ ЛІТАРАТУРА»
1991

ББК 84Бел7
К 95

Обыкновенная, незаметная деревня в глубинке, на востоке Могилевщины... Здесь и живут герои повести и рассказов писателя, среди которых он родился и вырос, делают свою извечную крестьянскую работу, встречают те перемены, которые принесла в тихую деревеньку советская власть, строят новую жизнь.

К $\frac{4702120201—013}{М302(03)—91}$ БЗ 62—90

ISBN 5-340-00541-0

© С. Кухараў, 1991

БАЦЬКАВІЧЫ

АПОВЕСЦЬ



ЧАСТКА ПЕРШАЯ

1

Непрыкметная, ціхая наша вёска Бацькавічы заснавалася ў глыбіннай лясной старане; здавён, як помняць дзяды, стаіць яна пры дарозе. Не на палевіку, што зімою раўняецца снегам, і знаку ніякага не відаць, аж пакуль не ачарсцвее зямля і не зальсніцца зялёнай накідкай травы. Паўз Бацькавічы ляжыць гасцінец, злучаючы суседнія раёны: на захад — беларускі, на ўсход — рускі. З усходу шыбуюць аўтамашыны з ільном, хлебам, а на ўсход — з лесам, цэглаю...

Можа, якіх гадоў сорак назад усцяж бацькавіцкай дарогі раскашаваліся таўшчэзныя, як абхапіць пры камлі двум чалавекам, высозныя, калматыя ў вяршынях бярозы. Казалі, што іх пасадзілі, калі за царыцу была Кацярына. Цяпер жа толькі на хутары, які быў аддзяліўся ад Бацькавіч у прышчэпаўшчыну, ацалела яшчэ адна такая бяроза. Ля хаты старога Паўлюка. Яе і называюць Паўлюковай бярозай. А Паўлюкова таму, што падчас Вялікай Айчыннай вайны ўсе старыя бярозы папілавалі на дровы і спалілі, а стары Паўлюк, як ні было цяжка з дрыўмі, не рашыўся замахнуцца на бярозу. «Пакуль я буду жывы, то ты будзеш жыць, мая добрая пявуння». Знаходзіліся нядбайнікі, што не раз завейнымі начамі спрабавалі падкрасціся, каб спілаваць «кацярынку». Ды хіба яе ўхопіш так; і стары мікалаеўскі салдат не даваў маху: як толькі пагражала небяспека, ён увішна ссоўваўся з печы, нацягваў кажух і валёнкі і выходзіў на двор, спускаў з ланцужка цюліка і сам настройваўся ў засаду. Сабачы брэх і паўлюкоўскі кашаль змушалі аматараў бярозавых дрывец цішком, непрыкметна ўходзіць ні з чым.

На бярозе гнездаваліся буслы. Вайною яны недзе былі паразгубіліся, а тады ўжо, калі нашы прагналі фашыстаў, па вясне, як пацяплела і зямля, ачысціўшыся ад снегу, падчарсцвела,— прыляцела маладая пара, і Паўлюк радаваўся, бы дзіцё. «Не была б то радзіма,— думаў стары,— дзе ні блукаеш, ні вандруеш, а ўдвору цягне, пад свой родны кут». Ён лічыў, пэўна, што маладая пара — радня тым, здаўна-даўнейшым буслам, якія гнездаваліся на абжытым седале.

Канечне ж, нашы Бацькавічы не маюць гістарычных помнікаў, якія паказвалі б на тое, што вёска вельмі ўжо здавён-даўняя, старажытная. Але ўсім вядома, што яна даўней часта гарэла — на гародах глеба як з вуголлем; хаты тады ставіліся то бліжэй да горкі, дзе цяпер гумнішчы, то на загароддзі, да вады, дзе сажалкі і балацяныя лужкі — забалоцце.

За якую паўсотню гадоў Бацькавічы разы са тры, як не кожны двор, будаваліся. І ўсё часцей войнамі. Дакладней, не ў вайну, а пасля, як трохі аціхне навальніца і людзі ачомаюцца, прыйдуць да раўнавагі. Старыя памятаюць, што хаты ў Бацькавічах паліліся па-чорнаму; калі палілі ў печы, то дым цягнуўся не праз комін, а проста слаўся пад столлю, дзе была адтуліна, якая зачынялася і адчынялася; і дыму таго хапала і хаце і усім, хто жыў у ёй. Але, як любіў казаць адзін бацькавіцкі чалавек, які ў свае дзевяноста гадоў застаў яшчэ калектывізацыю і драўлянай сошкай-рагуляй з падлеткамі ў ахвоту калгасную бульбу абворваў,— тыя кýранкі па сто гадоў стаялі. Дзіва што: сцены ж прасмольваліся скрозь і блішчалі, бы кавалачкі вугалю-антрацыту.

У 1917 годзе, пасля Вялікага Кастрычніка, з Пецярбурга ў Бацькавічы на паштовай парцы коней з'явіўся матрос-балтыец Андрэй Палуян і на аселіцы пры ўсіх людзях аб'явіў: «Свабода! Мір без анексій і кантрыбуцый! Свабода на вечныя вякі!»

Мужыкі перш за ўсё ўхапіліся за лес: балазе ён быў над бокам, але не свой, а пана Стошы, які хоць і жыў недзе далёка, мабыць, у самым Гомелі, ды ягоныя аканомы і арандатары пільна бераглі кожнае дрэва, кожную сухастоінку.

Ад той першай сусветнай вайны ў Бацькавічах асталося яшчэ хат колькі з асінніку, бо ў тым лесе расло найбольш асіны. Да слова сказаць — вартае дрэва, якое ў

наш час чамусьці зусім не ў модзе. І падлогі ў хатах былі з асінавых дошак. І нават на столь ішла асіна. Праўда, хто меў нешта ў кішэні, то на столь выбіраў сасну ці елку. Але добра служылі і асінавыя дошкі. Калі іх як мае быць аблетаваць, а затым пусціць пад гэбель, то дошкі будуць служыць доўга, увесь век.

Тым хатам стаяць бы па сто гадоў, каб ім даць добрыя стрэхі. У Бацькавічах раней не было завядзёнкі накрываць хаты дранкай ці шчапою, не кажучы ўжо пра гонту: усе стрэхі спрэс саламяныя. І стаялі яны многія гады. З паўночнага боку такая страха абымшэе і выдае бы аксамітавая; ад сонца ж пашарэе і першыя гады блішчыць, як цынкавая бляха. Бывала, калі часам наляціць вецервіхор, тады бяда — здзярэ страху, бязлітасна абшчыпле ўсю дазвання. Пад дранкай была адна кузня, што мясцілася спачатку пры дарозе, блізка ля грэбелькі, а ўжо за калгасам — проста ўпобачкі з вуліцай, на сядзібе Баянка. Яшчэ, праўда, адна хата была пад гонтай, адзінокая, без хлеўчукоў і сенцаў, на ўбітым, як ток, выгане. У ёй жыў бедны яўрэй Лейзар з бяздзетнай жонкай Ентай. Як і ва ўсіх жыхароў, у іх быў надзел — пустая, няўробленая зямля, на полі буяў адзін быльнік, ды на межах у пояс жаўцела піжма. А хата ў Лейзара была пад гонтай. І ганак быў з выхадам на вуліцу. Як пачыналіся цёплыя дні, на гэтым ганку любіла з вясны ўсё лецейка сядзець Ента, сабіраць у вясковых кабет-абгаворніц усе навіны.

Калі ў Бацькавічах сяляне злучылі свае гарбатыя вузенькія палоскі ў агульнае поле і зажылі калектыўна, людзі на сотках жыта не сеялі, і не было з чаго натрэсці кулёў ды падладзіць стрэхі. Многія двары паскідалі струхлелую салому і паднавілі стрэхі толькі ў першую пасляваенную восень.

У трэці раз на нашай памяці Бацькавічы будаваліся пасля апошняй вайны. Глядзіш і не пазнаеш тых хат, што былі калісьці: ужо на цагляных штандарах і на падмурках, а стрэхі пад шыферам. Вядома, не ўсе. Але ўсё больш і больш. На вокнах — ліштвы; пайшла мода ашалёўваць знадворку сцены. Можна нават сустрэць пафарбаваныя аканіцы і адмысловыя веранды. Куды таму Лейзару з тым сваім трухлявым ганачкам!

А над стрэхамі рагулькі антэн. Іх яшчэ не так многа. У агранома Півоні, у брыгадзіра Максімца, у настаўнікаў Говара і Кірэйчыка. І школа ў Бацькавічах ёсць. Таксама ўжо як камяніца, у светлым будынку. Але не ў тым, дзе

некалі і я вучыўся; тая школа стаяла блізка ад нашае хаты, цераз дарогу, а гэтая наводшыбе, на аселіцы; збоку да старога будынка паставілі прыбудовак.

Некалі Бацькавічы славіліся яшчэ сваімі лазнямі. Вельмі маленькія, на палок парыцца садзілася адразу ўсяго чалавекі тры, але гэта былі цудоўныя лазенькі. Стаялі яны ў садках, ля сажалак. Звычайна, як надыдзе субота, звечарэе, то і пацягнуліся к небу з лазняў шызыя пахучыя дымкі. А прыцемкамі — з вёдрамі, з венічкамі, ад якіх у нос патыхала маладой бярозай, мужчыны неяк асцярожна і ўрачыста кіраваліся да лазняў. Парыцца ў Бацькавічах любілі і ўмелі. Свае чэмпіёны гэтай справы былі: мераліся, хто больш мог уседзець на палку пры большай пары. І цяпер яшчэ ўспамінаюць, найбольш старыя, як хадзіў у лазню Лейзар. Ён быў вялікі дасціпнік, але парыцца не ўмеў. Як толькі хто-небудзь з мужчын браўся за карэц, каб падліць вады на гарачую крушню-печ, Лейзар адразу кумельгам вылятаў у прымыльнік. І потым ужо, ахалодаўшыся добра, вяртаўся ў лазню і жартаўліва гаварыў: «А дзе тут мой венік бярозавы?» Яму адразу мужчыны працягвалі некалькі венікаў. Свой венік прыносіць ён не меў звычкі.

Пасля лазні пілі квас, медавуху, яблычны ці бураковы расол. Распараныя і расчырванелыя, мужчыны сядзелі ўлетку на прызбах, а ўзімку ля напаленых пяколкаў (так называліся ў нас у даўніну камінкі, якія звычайна палілі ўвечары, каб на ноч было пяплей, а часта і для асвятлення) і бавілі час рознымі казаннямі ды паданнямі.

Цяпер лазні яшчэ канчаткова з моды не выйшлі, але іх небагата ўжо. Вядома, якая тут прычына: дроў малавата, ды і маладзейшыя ўлетку ахвотней то на сажалкі сходзяць, то на рэчку, якая далекавата, праўда, за ляском. І рэчка тая — адно званне. Рэчкай маці-прырода абдзяліла Бацькавічы. Недалёка працякае Палужанка, але і гэта ўжо невялікая раскоша — вясною яшчэ нішто, вады трохі збірае, а ў летнюю пару, які выдасца год, перасыхае — курыца перабяжыць.

Кажуць — яшчэ недзе ёсць вёскі з такою назвай, як наша. Я чуў: ёсць Браткавічы, Зяцькі, Прымакі, Сёстры, дык і Бацькавічы могуць быць. Ды пра іншыя Бацькавічы я нічога не ведаю. Я кажу пра нашы Бацькавічы, дзе я нарадзіўся, адкуль пайшоў у свет, у людзі, дайшоў аж да Берліна, разам з многімі нашымі героямі-воінамі ўдзельнічаў у штурме фашысцкай сталіцы і на абкуранай

дымам і порахам сцяне крэйдай накрэсліў: «За Савецкую Беларусь! За родныя Бацькавічы!»

Між першых беларускіх вёсак у апошнія дні верасня 1943 года Бацькавічы сустрэлі сваіх вызваліцеляў. Сустрэча была радаснай і незабыўнай. І боль вялікі. Уцякаючы, фашысты-факельшчыкі двароў дваццаць спалілі, спалілі б і больш, можа, і ўсю вёску, але не паспелі, бо спяшаліся — наша артылерыя і наша пяхота ішлі следам, наступаючы немцу на пяткі.

Мне не часта даводзілася выязджаць з Бацькавіч. Тады яшчэ, як вучыўся завочна ў Магілёве ў педінстытуце, ездзіў часцей. Сустракаўся з калегамі, чуў ад іх пра іншыя вялікія ды шумлівыя вёскі і сёлы.

А што я скажу пра свае Бацькавічы? Вёска, і ўсё. Пра такія і сёння яшчэ пачуеш: «Глухамань, мядзведжы кут». Да райцэнтра — пятнаццаць вёрст з гакам, да бліжэйшай станцыі Камунары — пяцьдзесят з такім жа гакам. Да цэнтра калгаса — тры кіламетры.

Ды няхай жа я не пабуду які месяц дома, сярод сваіх людзей, то мне неяк не па сабе, як чаго не стае, як нешта табе на душы непарадак, нейкі сум ці шкадаванне. І спяшаешся дадому, як у нас кажуць, удвору. Ужо як пад'едзеш гасцінцам да бярэзнічку, што сам панасеяўся апошняй вайною, дзе поле не аралася і здзічэла, то сэрца неяк соладка заные і ты, здаецца, выскачыў бы з перапоўненай, прапахлай дарожным пылам «пасажыркі» і паджгаў бы пехатою...

Не я адзін. Землякі ўсе не ў крыўдзе на свой лёс, не шкадуюць, што нарадзіліся ў Бацькавічах. Гэта ў нас пачуеш прымаўку: «У Бірулях пагуляй, у Горках пагасцюй, а ўдвору — у Бацькавічы».

Між намі кажучы, я даўно-даўно, яшчэ калі ў нашым раёне пачала выходзіць свая газета «Чырвоны сцяг» (яе ў нас і па гэты час называюць ласкава «Сцяжок»), пачаў сёе-тое занатоўваць сабе пра Бацькавічы, пра яе жыхароў. Мне ўсё думалася, што нашы людзі нейкія асаблівыя, хоць і жывуць у глушы, вартыя таго, каб пра іх ведалі.

Заметак тых перад вайной трохі набралася, але ў ліхалецце, у чорныя дні акупацыі, запісанае загінула ў агні (пры адступленні фашысты спалілі нашу хату). У Бацькавічах, як і ва ўсіх нашых лясных вёсках, білі ворага ўсе, хто мог трымаць у руках зброю: людзі змагаліся супроць фашыстаў і на фронце, і ў тыле.

Насталі гады мірнага жыцця. Час, як вядома, адбірала работа. Калі ж выдавалася якая хвіліна, я варушыў у памяці перажытае, браўся за пяро, аднаўляў, што было ўжо напісана, і вёў новыя запісы. Іх пакрысе збіралася. У нашу школу прыслалі трэцяга маладога настаўніка, і я напрасіўся, каб мне далі бібліятэку. Можа, як-небудзь я раскажу і пра нашу бібліятэку. Яна, праўда, не такая, як пры клубе ў Ігліцы, у цэнтры калгаса, але на сённяшні дзень ёю можна задаволіцца.

Можа, каму будзе цікава, як усё гэта рабілася ў Бацькавічах і як мае землякі станавіліся на ногі, жылі і жывуць гэтым часам. Шчыра скажу, яны крышачку любяць пахваліцца ці, ва ўсякім разе,— не даць сабе ганьбы. Як заўважыў наш жартаўнік Іванічка, а ў вочы — Якаў Іванавіч, якому ўжо ад леташніх пакроваў, мне здаецца, пайшоў семдзесят шосты год: «Не ўсё тое красна, што блішчыць». Але ж, як часта бывае між людзей, і заўважаецца і выстаўляецца напаказ якраз тое, што мае бляск і знешнюю прыгажосць!

А раптам хто здалёк ці зблізку захоча завітаць у Бацькавічы, пасвацаць якую нашу дзяўчыну ці астацца ў прымаках. Скажу адкрыта, у нас не дужа каб прыжываліся прымакі. Іх чамусьці ў нашай старане называюць зяцькамі. Ды ўжо каторы і ўкараніцца, то яго не адарвеш і не спораш парачом. Нягледзячы нават, што за ім доўга, мо нават на ўсё жыццё, як дзядоўнік, прычэпіцца і будзе трымацца гэтае самае — зяцёк. Зусім жа не азначае яно, што і ўсе туташнія цешчы, жывучы з зяцямі, трымаюцца старой прымаўкі: прымачы хлеб — сабачы. Наадварот, часцей і часцей пачуеш шчырае: «Мой зяцёк, як шызы галубок».

Сёння нашых бацькавіцкіх людзей можаце сустрэць і на Курылах, і ў Талды-Кургане, і ў Данбасе, і на Кубані... Не, гэта не пералётныя птушкі. Праўда, наш самы стары чалавек, амаль стогадовы Дзямід Півоня, які толькі адзін раз на сваім доўгім вяку выязджаў з Бацькавіч (на прызыўны пункт, калі прыйшла пара ісці ў салдаты, але яго адпусцілі — вельмі ладна недачуваў), сказаў бы, што «ета самыя і ёсць летуны». Дзяміда ў нас лічаць за дзівака. Можа, гэта трохі і так, бо ён, як астаўся без жонкі, жыве бабылём. Каня па дровы ў лес не бярэ, а ўсё лета сушняк і хвораст тралюе на тачцы-двухколцы; для сваёй кароўкі сена накошвае на дарожках, узлесках, збірае свірэпу ды пырнік.

Кажуць, што Дзямід і ў лазню рэдка ходзіць ужо — відно, ад той пары, як свая лазенька, што мясцілася ў невялічкім, некалі цудоўным, прапахлым улетку мятай і ранеткамі садку, даўно падгніла, і гаспадар разабраў яе на дровы. Стары зімою неяк пераб'ецца, нагрэўшы гаршчок вады ў печы, а ўлетку парыцца пад паветкай. Некаторыя смяюцца, а ён не зважае, наносіць вады ў балею, каб на сонцы ўгрэлася, а тады сцягне яе пад паветку, скіне нагавіцы і сарочку ды венічкам нашлёгае сябе і зноў, вясёлы і зухаваты, тупае па двары ці корпаецца ў садку.

Вясковыя людзі, асабліва маладыя, з Дзяміда пакеплі-ваюць, жартуюць, але ён не крыўдуе. Іншы раз нейкі там падшываненец скажа: «Дзямідка, калі ета ўжо будзеце жаніцца?» Дык ён, вядома, недачуе і перапытвае: «Які табе падатак? Ужо ж казалі — не трэба плаціць. Гады мае ўжо выйшлі...» Тады той жэўжык крыкне ў самае вуха дзеду: «Жаніцца, кажу, глушня!..» Здагадаўшыся, дзед нязлосна махае рукой і смяецца на ўвесь свой шчарбаты рот: «Ідзі ты к чорту, лятун...»

Тут, відаць, чалавеку, які не жыў у Бацькавічах і не ведае старога Дзяміда і яго гісторыі пра падатак, усё гэта незразумелае. А справа тут такая. У пасляваенныя гады ў хату Дзяміду налічвалі падатак за бяздзетнасць, а ён, вядома, не плаціў, спасылаючыся на свае старыя гады; аднойчы, калі таго падатку набралася немалая сума, паклікалі дзеда ў сельсавет і спыталі, чаму не плаціць таго падатку на халасцякоў.

— Я ж во стары,— хітра ўсміхаючыся, сказаў Дзямід, цярэбячы сівую шорсткую бародку.

— То ў цябе ж дзеўкі ёсць,— падказаў фінагент, які і паклікаў дзеда для ўшчування.— За дзевак належыць плата...

— Дык я вінаваты, што іх ніхто не бярэ? — спакойна працягваў Дзямід і, падумаўшы, раптам зарагатаў, як блазан: — Бяры во ды сам з каторай ажаніся...

Даўно тое было. Ужо няма тых дачок пры дзеду — адна праз колькі гадоў захварэла ды памерла, а меншая выйшла замуж. Наведваецца часта да старога, памые яму бялізну, падлогу пашаруе, вазоны палье на вокнах (стары, як памяць па даўно памёршай жонцы, якая вельмі любіла, каб на падаконніку стаяў вазончык, не зводзіць кветкі ў хаце). А людзям не забываецца, як Дзямід наадрэз адмовіўся плаціць той халасцяцкі падатак. Ён абураўся

вельмі, што бяруць з дзяўчыны нейкі там падатак за тое, што яе ніхто не ўзяў замуж і ў яе няма дзіцяці.

...То я і кажу: прачытае хто-небудзь з нашых людзей, што жывуць недзе далёка ў свеце, паківае галавою, ухмыльнецца: «Глядзі ты, як гладка маніць, во брахун-манюка»,— а потым задумаецца, памаўчыць у одуме і ўздыхне, нешта яму як успомніцца, і ён аж ускрыкне ад узрушэння: «А ета ж нашы Бацькавічы!»

На нейкі момант, можа, яму захочацца пабыць у тым сваім кутку, пахадзіць па тых сцежках, дзе лёгка бегалася басанож, падыхаць тым гаркаватым увосень дымком на бульбянішчы, дзе з равеснікамі ўдосталь наядаўся печанай бульбы; сустрэцца з тым жа дзедам Дзямідам, які ўсё ніяк не састарыцца і мінулым летам, дальбог не лгу, катаўся на веласіпедзе. Тыя ж падшываны, што з ім любяць падражніцца, і навучылі.

Калі хто надумае, то няхай прыедзе ўлетку, калі настане пара адпачынкаў. Не пашкадуе! Між іншым, у нас цяпер курсіруе аўтобус якраз да саменькіх Бацькавіч, спыняецца на развілцы, дзе быў некалі, мабыць, памятаеце, «пятачок» — на ім найперш расставаў вясною снег і пад вечар любілі збірацца мужчыны пакурыць і пачасаць языкі. Калі на наш не патрапіце, то сядайце на горскі, ён тут жа спыняецца, дзе дом нашага цяперашняга брыгадзіра. А за шафёра ў нас часта ездзіць Рэпка, вельмі ўжо строгі і, кажуць, справядлівы дзядзька: школьнікаў заўсёды бярэ, нават па дарозе, калі каторы не дачакаецца ды пабяжыць дачасна. І заўсёды білеты дае. Як хто не ведае пра гэта і ціхенька суне грыўню ў руку, то Рэпка нават добра адчытае: «Што ты, браток, мяне хочаш рвачом зрабіць. Не выйдзе! Не ведаеш Рэпку. Рэпку ўвесь раён ведае... Мне ўжо два гады асталося да пенсіі...»

Ёсць у нас, мабыць, толькі адзін чалавек — ездзіць гэтым нашым маршрутам,— які чамусьці не ў ладах з Рэпкам. Гэта наш сельповец Амяллян Гладыш. Прозвішча ў яго іншае, але ў Бацькавічах яго больш ведаюць пад такой мянушкай. Мужчына ўжо ў гадах — на Поўначы, кажуць, у такія гады ўжо на пенсію выходзяць, а наш Амелька ўсё яшчэ ездзіць, бы маладзёнак, і нават зімой, у кузаве сельпоўскага грузавіка. Вельмі ж любіць ён прыпасаць такі ходкі тавар, як «водка московская». Віна ён не прызнае, яшчэ «волжскае» куды ні шло — згодзіцца, а калі прапануюць «гамзу» ці «дымят», то Гладыш так раскрычыцца, што не дасі яму рады. І што вы думаеце,

Гладыш крыкам бярэ: яму часцей даюць гарэлку, а іншым — «гамза» ці той жа «дымят», які будзе стаяць аж да касавіцы, калі ўжо і Гладыш з міжраённай базы вяртаецца ні з чым. Яшчэ на вуліцы з кузава чуцён яго прастуджаны дыскант: «Усё! Нікс. Капут. Сухі закон...»

Амелька Гладыш садзіцца ў Бацькавічах другім рэйсам, а дзевятай гадзіне. Яно і язды тае — тры кіламетры. Раней, канечне, ён хадзіў пешкі. Гэта яшчэ калі адзін час у Бацькавічах быў за старшыню — ці не пяты па ліку ад вайны старшыня. Да яго быў нейкі навалока з Вялікіх Хутароў, меў нейкае невыразнае прозвішча, якое ўсе ўжо даўно забыліся... Той так напіваўся, што аднойчы п'яны каля кузні заснуў стоячы і нагавіцы ссунуліся з клубоў. Дайшло ўсё да раённага начальства, і пасля неўзабаве благаславілі нам за старшыню свайго — Гладыша. Гэты, канечне, добра піў, бо нездарма Гладышом празвалі, але ў яго была на такое загартовачка: па-першае, ён чалавек з моцнай, нашае бацькавіцкае, пароды, па-другое, гадоў дваццаць быў на вайсковай службе, старшыной авіятэхнічнай роты (і на апошняй вайне). Але ж гарэлка, яна, кажуць, і быка зваліць. Можа, па гарэлцы яшчэ б Гладыш трымаўся, ды пачалося вядомае пасля вайны ўзбуйненне калгасаў, і Бацькавічы далучылі да Ігліцы. Гладыш пахадзіў год ці два ў намесніках, і зноў нехта з раёна заўважыў, што ў Гладыша мікраадукацыя — тры класы пачатковай школы. У дадатак яшчэ — Гладыш вычварна і вельмі бязбожна лаяўся, не шкадаваў, як кажуць, ні вуха ні носа. Калі ўжо хто зачэпіць яго, нават без злосці, так з нейкай дробяззю звернецца да яго, то пад благі настрой хутчэй убірайся: «Трыбога, госпада, душу, пячонкі, селязёнкі...» І пайшла, і панеслася. Спяшайся затыкай вушы. А лепш бяжы без аглядкі, бо і не такое пачуеш.

Пазней, гэта ўжо калі на пасаду старшыні пачалі падбіраць людзей, якія маюць адпаведную адукацыю, і наш Гладыш вылецеў з сядла. Выцяўся, але, вядома, не разбіўся. Гладыша накіравалі ў Ігліцу, на працу ў сельпо. Там, як відаць, і самому старшыні работы не бог ведае колькі, і стаў Гладыш дастаўляць тавары. На гэтай пасадзе справы ў яго ішлі няблага. Толькі часам прарывалася старая звычка — лаянка...

Як толькі ўваб'ецца ў «пасажырку» наш Гладыш, зойме сабе месца на першым сядзенні ад шафёра, адразу ўсе насцярожваюцца, хлопцы пачынаюць ужо ціхенька, у кулак, хіхікаць, а потым і смяяцца. Амелька тым часам, як

кажуць, нуль увагі, падае шафёру пятак. Рэпка моўчкі адрывае яму ад стужкі білет. Амелька, унурыўшыся, пачынае кляваць носам — мусіць, яшчэ з учарашняга, бо ў кумы трохі перабраў і добра яшчэ не працверазіўся. А тады раптам пехта з задняй лаўкі падштурхне:

— Амеля, раскажы-тка, як ета Грышка цяля купляў... на базары ў Маластоўцы...

— А што было, брат, то было. Сам бачыў, тоісь сам чуў. Перад етай вайной яшчэ...

У аўтобусе ўжо стаіць рогат. Больш за ўсіх стараецца, вядома, сам Гладыш, хаця ён ужо сваю гэтую «ахінею» расказваў, мабыць, многа разоў.

Аднойчы ў аўтобусе ехаў наш стары бацькавіцкі чалавек. Жартаўнік, але не балбатун. Ён моўчкі паківаў галавою, нешта прагаварыў сабе пад нос, а як сышлі на прыпынку, запыніў Гладыша і сказаў: «Ну, брат, не ведаў, што ты такі боўдзіла, Амяллян. Праўду людзі кажуць, што ў цябе клёпкі, мабыць, не стае...»

І пайшоў, плюнуўшы.

Амелька на гэты раз сумеўся, аслупянеў, як мыла з'еў. Унурыўшы галаву ў плечы, паплёўся да сельмага. Згорбленая яго постаць выдавала, што чалавеку нешта ўсё ж дайшло, дапякло трохі.

Больш я не чуў, каб у аўтобусе калі-небудзь Гладыш выхваляўся сваімі пустымі жартамі.

...Прыязджайце ў Бацькавічы ўлетку. Можна і зімой, але ўлічыце, што зімы апошнія гады снежныя, гасцінец расчышчаюць трактары, але ненадоўга — за адну ноч усё так замуроўваецца, што дарогі амаль не відаць. Нічога, даедзеце на санях — пошту возяць з нашай брыгады мужчыны і як бачыш падкінуць.

Калі ж не выпадзе, то хоць пачытайце, якія ў нас навіны. А каб вы былі найбольш у курсе, мне давядзецца часам заглянуць крыху ў мінулае. Далёка ў гісторыю не будзем забірацца, бо на гэта трэба багата часу і, як кажуць спецыялісты, большая панарама. Мы ж тут спынімся на лепш вядомых нам вехах жыцця Бацькавіч і лёсе асобных жыхароў, якія пакінулі па сабе нейкі след.

Не шукайце тут чаго незвычайнага. Усё занатавана так, як было ў жыцці. Зменены крыху толькі асобныя прозвішчы: бо не ўсе нашы бацькавіцкія жыхары трапілі «на пяро». Чым жа, скажыце, тыя горшыя, што тут не названы?

Мае землякі, што жывуць у Бацькавічах, і тыя, што

назаўсёды аселі на цаліне ці ў Сібіры, сябе і сваіх знаёмых і без гэтага пазнаюць. А добрым людзям, якім захочацца ўзяць у рукі гэту кніжку, ці не ўсё роўна, якім імем хто названы. Наш адзін бацькавіцкі жыхар, калі, бывала, яго хто-небудзь назаве не так, як ён значыцца ў сельсаветскіх спісах, а па вулічнай мянушцы, заўсёды гаварыў: «Называйце хоць гаршчком, толькі ў печ не саджайце...»

2

У школе аднойчы зайшла ў нас з дзецьмі гаворка пра тое, якімі былі раней, ну, скажам, гадоў сорак назад, нашы Бацькавічы, як жылі нашы бацькі і дзяды, калі ўсталёўвалася савецкая ўлада і людзі гаспадарылі яшчэ на шнурах-палосках, а пра машыны толькі нам, малым, расказвалі ў школе настаўнікі ды вычытвалі ў газетах.

Прыйшло ў галаву запытаць у чацвёртакласнікаў:

— Дзеці, хто ведае, што такое кросны?

Маўчаць, паціскаюць плечукамі. Дзяўчынкі зрабілі вялікія вочы: «Не ведаем». Толькі адна вучаніца, унучка таго дзядулі, які так удала ўціхамірыў Амельку Гладыша, падняла руку.

— Калі ласка, скажы, Зіна Кавалік.

— Гэта тое, на чым ткуць. Пад паветкаю ў нас валяюцца нейкія валікі, дзядуля казаў, што гэта ад кроснаў...

— А хто ведае, як выглядае ступа? — пытаю я ў вучняў.— А пра таўкач ведаеце?

Успомнілі пра лапці. І лапці сталі ўжо далёкай гісторыяй. Цяпер лапці могуць сплесці толькі старыя, такія, як Дзямід Півоня ці Іванічка — Якаў Іванавіч. Але таго ж Якава Каваліка ў лапцях ад самай апошняй вайны я не бачыў. Зімой валёнкі з галёшамі, улетку — чаравікі ці сандалі. Дзямід Півоня толькі на касавіцу абувае лыкавыя ці лазовыя лапці, калі з касою завіхаецца на сажалках, дзе пасля касцоў астаюцца сям-там «недакоскі», касмылікі травы ды асакі між кустоў,— гэта ўжо Дзямідава доля, яму за гэта ніхто не выгаворвае.

Гляджу на сваіх вясковых хлапчукоў і дзяўчынак, апранутых у чыстыя гарнітурчыкі, у крамныя кофтачкі і абутых у сандалі і чаравікі, і памяць выхоплівае адзін малюнак за другім. Мы ўжо так звыкліся з усімі нашымі сённяшнімі набыткамі, што нават не прыгадваем, як было некалі, у што мы некалі апраналіся, што насілі ў буд-

ні і ў свята. Якая гэта сапраўды была раскоша — звычайныя, простыя чаравікі ці тапачкі-прарызінкі.

...Вясна. Ясныя сонечныя дні. Рана ачысціліся палі ад снегу, абветрала зямля. Збеглі раўчукі, прыдарожныя бярозы апырснуліся кволай зелянінай. На поле пацягнуліся вазы з гноем. Дзеці ўжо гуляюць у лёгкіх пінжачках і світках, басанож, гэта азначае «на бацькавых падэшвах». Школьнікі, вучні шостага класа, шпацыруюць яшчэ ў лапцях: хто ў лыкавых (у людзей гаспадарлівых і больш дбайных заўсёды на жэрдцы ў хаце, а часцей у клеці была падвешана цэлая нізка — пар дзесяць-пятнаццаць — лапцей: большыя — для дарослых, меншыя — для дзяцей і падлеткаў), хто ў лазовых. Мой бацька, як правіла, усю зіму быў у шахтах: як ён сам казаў, з вугалю выскакаў чырвонцы. Ён так уходжваўся там, што не заўсёды меў часу напісаць дамоў ліст, не кажучы ўжо пра што большае. Я бегаў у школу ў чунях: чуні я сам умеў рабіць з аборачак, якія звіваў з пяньковых ачосаў. А каб чуні добра насіліся, іх падшываў або якім-небудзь шкуратом — кавалкам старой аўчыны, або кавалкам гумы.

У нашым шостым класе ў Горках, дзе я вучыўся ў сямігодцы, было за дваццаць вучняў; большасць з іх — дзяўчынкі з багацейшых сем'яў — насілі балеткі ці чаравікі.

Неяк вясною, было ўжо цёпла і суха, па ўсіх класах пранеслася нечаканая навіна: у школу прыехаў усебеларускі старасta А. Р. Чарвякоў з пісьменнікамі. На легкавушцы. З такое нагоды ўсю школу вывелі на зялёную палянку, на ўзлобак узрэчча. Быў мітынг. Выступалі госці. Іх віталі настаўнікі. З вучняў далі слова мне. Я да смерці перапалохаўся. Нічога нават перад сабою не бачыў. Нешта ўсё ж гаварыў, забыўшыся на паперку, якую мне падрыхтавалі. Наш настаўнік літаратуры, відаць, таксама хваляваўся — інакш ён заўважыў бы, што мае зрэбнікі ў вялікіх латах, а мае чуні вельмі ўжо нязграбныя і кашы просяць. Сарочка на мне была крамная — сіняя ў белую палоску. Можна было б узяць каго іншага з класа, хто быў апрануты больш прыстойна. Але выкладчык паклікаў мяне — мо таму, што я пісаў нейкія вершы, маляваў усе загалоўкі і карыкатуры ў школьнай насценгазеце.

Калі я адышоўся ад стала, прывітаўшы гасцей, супакоіўся, раптам мне стала страшэнна сорамна за свае стаптаныя чуні і яшчэ за белыя латкі на крыху падсіненых, хатняй работы штанах. Я гатовы быў праваліцца скрозь зямлю. Я паабяцаў сабе не быць такім свавольнікам — мя-

не вечна дакарала маці, што на мне ўсё гарыць. Вядома, большая крыўда была на бацьку, які не падаваў голасу з тых шахтаў. Абяцаў мне чаравікі і штаны з чортавай скуры. Ужо вясна настала, а яго няма ні самога, ні тых штаноў...

Ідучы дамоў, я крыху супакоіўся. Уляглася, аціхла крыўда на бацьку. І сапраўды, відаць, нялёгка адбіваць яму тыя чырвонцы ў вугальным пласце. У мінулы раз, калі бацька прыехаў з Данбаса і на стол паклаў некалькі паперак, я не стрымаўся і запытаў: «Тата, як етыя грошы ў шахтах зарабляюць?» Ён адразу ж сур'ёзна адказаў, што чырвонцы з вугалю выторкваюцца толькі самымі кончыкамі, як абхапіць двума пальцамі, але як пацягнеш — паперка рвецца, трэба яе адбіць акуратненька вакол, а вугаль моцны, як камень, вось і сячэш яго такім малатком-секачом, пакуль чырвонец сам не вылузнецца. Ты яго бярэш і ў кішэню. Але ж і пазавіхаешся, аж разоў дзесяць ці болей абальешся потам, не раўнуючы, як у лазні. А пласт той вугальны — менеў як метр увышкі, то даводзіцца стаяць на каленцах ці нават ляжаць на спіне. «Няхай бы яны спрахлі, тыя чырвонцы! — урэшце перадумваю я.— Не трэба мне ні чаравікаў, ні тых штаноў з чортавай скуры. Няхай бы бацька не ездзіў на шахты, а жыў дома, як усе...»

...Бацька прыехаў на лета дадому таго ж дня цёмначы. Дакладней, не прыехаў, а прыджгаў пехатою з Камунараў, адмахаўшы за дзень пяцьдзесят вёрст. Ды з добрай паклажай за спіной. Як пачала маці ўранні разглядаць той хатуль, дык аж сэрца зайшлося: там былі чорныя, насычаныя вугальным пылам сарочкі ды споднікі, пары дзве шахцёрак — гэтак называліся брызентавыя спяцоўкі для працы ў падзямеллі. На дне мяшка ляжалі цвікі. Маці паспрабавала падняць і сказала: «Добрых пуды са два».

— Ты б ужо лепш вугалю набраў, як валок етыя цвікі,— сумна пажартавала маці. Не абрадаваў яе гэты бацькаў набытак.

На печы, дзе ўсё адлежваўся пасля вялікай дарогі бацька, чулася ціхае пакашліванне. Бацька адмоўчваўся, зусім нічога не кажучы пра свае чырвонцы. А мне ўсё ж гасцінец прывёз. Праўда, гэты раз не штаны і не чаравікі, а толькі кепачку з сіняга шавіёту, на шэсць кліноў, з гузічкам наверсе. Гатоў быў скочыць на сёмае неба я ад шчасця. Вядома, я насіўся з кепачкаю, бы той кот з салам: павешу на жэрдку і зноў здымаю, кручу ў руках (пе-

рад печчу ў нас была жэрдка, канец яе тырчаў якраз перад запечкам, мне зручна было адсюль павесіць кепачку на жэрдку).

Маці, убачыўшы, як я кешкаюся з кепачкай, упікнула:

— Кінь ты ўжо, Алёша. Павесь картузок. Паспееш яшчэ нацешыцца.

Маці завіхалася каля печы. Гатавала снеданне, не падаючы выгляду, што не задаволена бацькавымі заробкамі.

Я ж усё вешаю сваю кепачку-шавіётанку. Раптам яна паляцела проста ў шайку з памыямі, што стаяла тут жа пры печы. Кулём я саскочыў за кепачкай, выхапіў яе з шайкі. Адразу ж нахапілася думка: падсушыць у чалесніку. Чапляю кепачку на вілачнік і ў печ. Здаецца ж, патрымаў адну хвіліначку, а калі выцяг і з замерлым сэрцам узяў у рукі, то мая кепачка-падарунак у руках так і разлезлася — яна ўмомант спарахнела на агні.

І як не было майго шчасця-радасці — яно растала, як лёгкі туман пад сонцам. Я гатоў быў невядома што зрабіць з сабою, разарваць сябе на шматкі. Горкімі слязьмі, наўзрыд плакаў я, і нават бацькаў абяцанак не мог прывесці мяне ў раўнавагу, вярнуць спакой. Самае галоўнае, што нечым было пахваліцца сябрам, якія ў той дзень панабіваліся ў хату.

Бацька, як і паабяцаў, прывёз мне кепачку з раёна, можа, не горшую і за большыя грошы, але мяне яна ўжо так не радавала, як тая, з далёкіх шахтаў.

У хату ішлі і ішлі суседзі, як бы незнарок, чаго-небудзь пазычыць, але я добра ведаў: тут прычына — бацькаў прыезд.

Увесь доўгі дзень не зачыняліся дзверы. Маці ледзь паспявала падаваць на стол. Пілі гарэлку. Закусвалі свайго вырабу каўбасой, селядцамі, якіх бацька прывёз з шахтаў і якіх хапіла ненадоўга: пасля пайшлі ў ход агуркі, капуста — наш вясковы наедак, якім мы тады карміліся ўсю зіму. Хлеба не было: елі праснакі — румяныя, свежыя, вельмі смачныя. Іх умелі ў Бацькавічах выпякаць: варылі ачышчаную бульбу, таўклі яе ў ступе, доўга, да клёўкасці, і, дадаўшы з прыгаршчы мукі, таўкачом перамешвалі, пакуль яна не стане зусім клёўкай. Затым рэзалі цеста на кавалкі, раскачвалі на муцэ і на лапаце саджалі ў печ. Праз гадзіны дзве праснакі гатовы. Падавай на стол і сілкуйся. Калі ж да абеду яшчэ далёка, то праснакі загортваюцца ў ручнік і кладуцца на палічку ці ў суднік.

Каровы ў нас, як памятаецца, сваёй не было, і малако тады-сяды нам прыносіла цётка Прося, матчына меншая сястра з Біруляў.

Бацька, захмялелы, хваліўся за сталом, што ён зарабіў няблага і надумаў набыць машыну-ваўначоску. Даволі ўжо бадзяцца, трэба нарэшце стаць гаспадаром.

Госці згаджаліся, ківалі галовамі і напаўнялі чаркі. Толькі матчына большая сястра Ганна, якая таксама завітала да нас з Пакроўкі (пад той час быў такі хутар недалёка ад Бацькавіч), хітра жмурылася, а як глынула трохі з чаркі, то не пасаромелася, перад людзьмі сказала пра швагра тое, што думала:

— Ат, кінь ты, Іванка, хваліцца, маўчы лепш. Хвалько ты, вось табе якое маё слова!..

— Хто хвалько? — крыкнуў бацька і злосна звёў бровы, выхапіў з кішэні кашалёк і шпурнуў пачак чырвонцаў на стол: — Во, глядзі, які я хвалько!..

Госці аж раты паразяўлялі. На стале рассыпаліся чырвонцы. Шмат грошай. Усім было дзіва, што Іван Баянок зарабіў такое багацце. Яго ведалі і ў Бацькавічах, і нават у Горках, дзе ён адразу ж, па ўстанаўленні савецкай улады, разам з мясцовымі актывістамі арганізаваў саўгас у былым маёнтку Стошы і ў Бірулях, дзе жыў яго цесць Ціхан Мазоль, весялун і масцеравы чалавек, які любіў пабыць у кампаніі, умеў узяць чарку, але галавы ніколі не губляў і меў павагу ад сваіх людзей. Зяця — майго бацьку — дзед Ціхан недалюбліваў, бо ў бацькі была шырокая натура і абыякавасць да сялянскага жыцця. Бацька — своеасаблівы чалавек, меў нешта ад даўніх бадзяжнікаў-басякоў. Да сялянскай працы ў яго душа не ляжала. Ён мог спакойна дзе-небудзь «тачыць лясы» ў суседа ў той час, як яго зжатую палоску ў шматкі разносілі коні, бо ўсе суседзі збажыну ўбралі і пусцілі ўжо скаціну на ржышча. Ніколі не спяшаўся ён змалаціць жыта, яно магло ляжаць доўга, звезенае, аж пакуль не налягуць мышы. Затое, калі бацьку паставілі берагчы саўгаснае дабро, не ўсякі мог паткнуцца, каб сабе ўхапіць сена ці снапоў з былой панскай зямлі, перацягнуць сабе, на сваю палоску. Пад яго наглядам быў і сад. Яблыкаў у тым дваццатым годзе была процьма, аж голле вісла і ламалася. У сад лазілі па начах, але ведалі, што калі ў будане дзяжурыць Баянок, то не паможа і абрэзак пад пахай — давядзецца стаяць у канторы перад дырэктарам і выпрошвацца. У яго не было, як кажуць, ні сватa ні брата. Можа,

за гэта і недалюбліваў цесць зяця, хоць стары і сам быў такі — на капейку нічога чужога не зачэпіць. А мо і таму, што зяць не надта каб ахвотна браўся на першым часе, пасля жаніцьбы, за гаспадарку і дужа любіў сваю неспакойную службу ў саўгасе. Бывала, як толькі ўз'едзе да цесця на двор на стаенніку пад сядлом, саскочыць спружыніста і ўвішна, то дзед Ціхан толькі махне рукою, а іншы раз нават сплюне: «Гуляка, басяк...» Затым усё ж лагаднее, і каня рассядлае, і насыпле аўса ў карытца, а зяця запросіць у хату. Паставіць і глячок з гарэлкай, але не праміне выпадку, каб не даць зяцю чарговай праборкі, добрага такога прачуханца.

Нядоўга тады ў Горках пабыў першы саўгас — гады са два, не больш. Яго рэарганізавалі ў камуну, а затым у калгас. Бацька з мянушкай Саўхоз, якая прыліпла да нас на ўсё жыццё, вярнуўся ў Бацькавічы. Добра, што сабе хату найперш пабудаваў — вядома, з дапамогай цесця. Падзяліўся з братам і пачаў гаспадарыць самастойна на зямлі. Няцяжка ўявіць ягонае тое гаспадаранне, калі мець на ўвазе, што была хата з адным зашклёным акном, тры ж закладзены круглякамі — не хапіла сілы паставіць рамы і луткі. У хаце ўсяго што печ ды калыска.

Не дзіўна, што часам у маладога гаспадара апускаліся рукі. Натуры бацька быў гарачай, не любіў і не ўмеў укленчваць ні перад суседзямі, ні перад раднёю. Браўся за ўсякую справу сам, горача; кемлівы, ён адразу перайманаў усё, што вымагала жыццё. У яго галаве нараджаліся розныя ідэі, але не хапала волі, настойлівасці, каб іх здзейсніць, давесці пачатае да канца. І не толькі з-за недастатковай настойлівасці, а яшчэ, відаць, і таму, што не ўсё было пад сілу аднаму, без падмогі і апірышча.

Выручала магутнае здароўе. Ён мог адзін справіцца з бервяном ці з падвалінай, лёгка мог увесь дзень прастаяць і на сталюзе з пілою і сам умеў змайстраваць калёсы ці прасніцу, адштукаваць ночвы... Ля зямлі, як ужо вядома, корпацца не надта хацеў, але рабіў усё ўвішна, хлёстка, калі за што браўся.

Добра памятаю, як мы з бацькам сеялі жыта, звозілі снапы, аралі. Зусім хлапчука, яшчэ і ў школу не хадзіў, мяне бралі з сабой малацьбіты на гумно, і я завіхаўся, стараўся, колькі было змогі: з цёплай ёўні скідваў на ток сухія снапы, варочаў іх, а бацька з маткаю праходзілі па акалоце з цапамі. Аж загледзішся, калі бацька праходжваўся туды-сюды па таку: та-та, та-та — звінела ў вушах,

а я скоранька паварочваў кожны сноп другім бокам. Ды дзе там паспееш, я блытаюся ў саломе, спяшаючыся; на дапамогу прыходзіць маці, і глядзіш — весела перагукваюцца ўжо цапы. Малацілі звычайна асеннімі досвіткамі, пры лямпе-шахцёрцы, падвешанай на саху высока над токам. Пасля быў «перакур»-снеданне. Тады яшчэ доўга пахлі рукі цёплымі жытнёвымі каласамі, а ў вушах звінела, бы песня: та-та, та-та-та...

Усё ж, відаць, натура бадзяжніка брала сваё, і бацька неўзабаве ад'язджаў на шахты: спачатку ў Крывы Рог і адтуль вяртаўся ўвосень, перапэцканы ў чырвань-руду, уся бялізна была як перасыпаная цагляным пылам; потым перабраўся ў Данбас, дзе ўвесь час, здаецца, працаваў на шахце І-біс «Амерыканка». Дадому звычайна прыязджаў пад вялікдзень, доўга гуляў, хадзіў па радні, па суседзях з хаты ў хату, а калі наставала пара ў поле — за гаспадарку браўся без імпэту, як бы адбываў нейкую радоўку. Усю нагрузку брала на сябе маці, нам дапамагала яе радня.

Пакрысе і замацавалася за ім у вёсцы слава чалавека, які не ўмее жыць так, як усе. Ён не спяшаўся ні пасеяць, ні зжаць. У яго магло сена падгнісці ў пракосах. Бульба — астацца не скароджанай ці не абагнанай. Нават конь быў у нас не такі, як ва ўсіх,— нейкай дзіўнай пароды, яго звалі Ардэн. Шэры ў яблыкі, высачэзны і худы, як здань. Да работы быў нягодны, а шкоднік — на рэдкасць. Як уцячэ з табуна, дык шукаеш яго колькі дзён і не знойдзеш, пакуль сам не прыйдзе, не прывалачэцца, знябыўшыся без вады...

Не любіла бацьку, канечне, больш матчына радня. Для людзей ён быў добры, умеў сябе паказаць з лепшага боку і стараўся людзям дагадзіць як мог.

...І цяпер, калі з выпадку яго прыезду ў нас сабраліся людзі, цётка Ганна ўшчувае бацьку за яго басякаванне, за несур'ёзныя адносіны да жыцця. А ён раптам і казырнуў перад усімі: маўляў, глядзіце, людзі, які я, не з пустымі рукамі прыехаў — грошы зарабіў і збіраюся пусціць іх куды трэба.

— Усё адно ты хвалько,— не адыходзіла і стаяла на сваім дакорніца-цётка.— І гультай!..

Гэта ўжо было занадта. Бацька сціснуў кулакі, заскрыгатаў зубамі, але яго перахапілі мужчыны. Той жа Іванічка — Якаў Кавалік, сусед і бацькаў добры прыяцель, зацягнуў песню; мужчыны і бабы падхапілі, і хутка баць-

ка, забыўшыся, завёў сваю любімую: «Стэп ды стэп кругом...»

...Увосень, калі ўжо ўсё папрыбіралі з поля і пасеялі на зіму жыта, бацька па першым белым сняжку-зазімку з клункам-заплечнікам пешкі шыбаваў на знаёмую станцыю. Мы асталіся дома ўтраіх. Мне ўжо было мінула сем гадоў і страшэнна хацелася ў школу. Можа, таму што школа стаяла блізка, побач з нашай хатай. Маці ж была няўмольная, сказала: «Пойдзеш на будучы год. Хто ж будзе Таню калыхаць?»

Пад вясну бацька вярнуўся дамоў. Спехам зноў сабраўся ў дарогу — на Смаленск. Адтуль вярнуўся стомлены, амаль хворы, але радасны: купіў-такі машыну-ваўначоску. Яе неўзабаве прывезлі два так званыя спяцы, пажылі ў нас колькі дзён, наладзілі машыну і з'ехалі.

Бацька быў на вышыні свайго шчасця. Цяпер ён, Іван Баянок, інакш адчуваў сябе ў кампаніі бацькавіцкіх гаспадароў. Маўляў, глядзіце: я не галадранец і не гуляка.

Ваўначоска стаяла ў хаце. Яна прыводзілася ў рух рукамі — з абодвух бакоў за ручкі браліся два чалавекі і круцілі драўляны барабан, абабіты стружкай з металічнымі цвікамі-калючкамі. Вакол барабана насустрач рухаліся таксама калючыя валікі, злучаныя шківамі. Воўну невялічкімі шматкамі жанчыны ці падлеткі кідалі на брызентавае палатно, якое падавала яе на валікі. Прайшоўшы праз усе хітрыя, з калючкамі самай рознай даўжыні і таўшчыні, валікі, воўна лёгкім, мяккім пластом намотвалася і намотвалася на драўляны навойчык. Як толькі набіралася добрая кудзеля, машыну спынялі, і кудзеля здымалася.

Калі часалі воўну, у хаце не было ніякага паратунку ад пылу: ён, едкі і густы, аж выпіраў столь, набіваўся ўсюды, куды толькі мог убіцца; пыл пластамі ляжаў на вокнах, на сценах, на ручніках, што віселі на покуці над багаўнёй. Увечары, вядома, машына пасля работы чысцілася, пыл абмятаўся, але назаўтра ўсё пачыналася спачатку. Свежы чалавек, завітаўшы ў хату, нават калі машына не працавала, пачынаў чыхаць і сморкацца, аж заліваўся слязьмі.

Гаспадар, задаволены і шчаслівы, увіхаўся каля машыны не ведаючы стомы. Завозчыкаў было спачатку мала. Потым пайшла пагалоска, што ў Бацькавічах можна счасаць воўну дзёшава і «напавер» ці нават за бутэльку

якой-небудзь гары, і людзі з навакольных вёсак павалілі валам. Завознікаў хапала...

Убачыўшы, што гаспадар згаворлівы, адразу ж, як канчалі работу, наладжвалі пачастунак. Тыя, што стаялі ў чарзе, далучаліся да кампаніі, і пачыналася гулянка. Каб не астацца ў даўгу, бацька таксама ставіў сваю бутэльку.

— Думаеце, я жмот які, захрыбетнік? — апраўдваўся тады бацька, ужо добра падпіўшы.— Жонка, стаў на стол усё, што ёсць. Няхай людзі ведаюць — Іван не скнара!..

Набраўшыся як мае быць, тут жа ўсе клаліся — хто дзе. А больш цвярозыя пачыналі заводзіць ваўначоску самі і круцілі, колькі каму хацелася. Маці спачатку перажывала, сама глядзела за парадкам, а потым, упэўніўшыся, што толку мала — адцуралася: завозчыкі самі кіравалі, як хто хацеў.

Праз колькі месяцаў ваўначоска сапсавалася. Колькі ні корпаўся, ні пацеў ля яе бацька, але наладзіць не змог: воўна не растрэсвалася, уся адзежа (часальныя валікі) забівалася, і давялося яму ехаць да спяцоў. Яны прыехалі, прабылі ў нас тыдзень ці болей, сяк-так пусцілі машыну, але ўжо, як раней, яна не ішла.

Усё кончылася тым, што бацька разабраў сваю любіміцу на часткі — усе валікі, шасцяронкі склаў у клець, а сам зноў засумаваў, пачаў нудзіцца, сяк-так дажыў да восені, а тады махнуў па старым маршруце — на шахту І-біс. А ў Бацькавічах задзьмулі злосныя сіберныя вятры, пасля каляд заснежыла, ударылі густыя завірухі-завеі, круціла, як гаршку. З вятрамі і завеямі ў хату панеслі ся новыя, не вядомыя дагэтуль словы: «пяцігодка», «заём». А з імі: «калгас», «суцэльная калектывізацыя»...

Нас, падлеткаў-калыгвузаў, усё гэта незвычайна захапляла і цікавіла. Не зважаючы на завеі і халады, мы, як ачмурэлыя, дурэлі на вуліцы, пакуль не мерзлі, як ледашы, а намерзшыся, зашываліся да каго-небудзь у хату, найбольш да тых, у каго бацькі не строгія, забіраліся на печ і адтуль, сцішыўшыся, слухалі, як радзіліся і вохкалі нечага бацькі.

3

Школа ў Бацькавічах стаіць навідавоку, пры дарозе, па правы бок, калі ехаць з раёна. Яе агаралі нешта ў хуткім часе, як у Бацькавічах стаў на ногі калгас «Удар-

нік». (Поўная назва на яго пячатцы — «Ударнік 3-га года пяцігодкі».) У старым школьным будынку — звычайнай сялянскай хаце, толькі ў ёй замест печы ў куце стаяла грубка без лежака — пасяліўся з сям'ёй першы бацькавіцкі старшыня Грыцко Гопка, украінскі рабочы-дваццаціпяцітысячнік. Адзін хлопец з нашай басаногай каманды, Сашка Кіпень, бацька якога ўзімку часта ездзіў на заробкі, толькі не ў Данбас, а ў Крывы Рог, быў вельмі прагавіты да грошай, слова «дваццаціпяцітысячнік» разумеў па-свойму: у старшыні, мабыць, у банку вялікія грошы — дваццаць пяць тысяч! Мы не верылі Сашку, бо сам старшыня і зімою хадзіў у доўгім пашарпаным паліто на «рыб'ім мяху» і ў рыжых валёнках, падшытых старым лямцам. Хіба толькі шапка ў яго была хвацкая — стаўбун з шэрай смушкі, і яна ў яго сядзела неяк на самай макушцы, а чупрына, як воранава крыло, раскашавалася над ілбом. У Гопкі было трое дзяцей: большая дачка Каця вучылася ў Горкаўскай сямігодцы, і двое хлопцаў, якія яшчэ не хадзілі ў школу. Маці іх, яе называлі проста Гопчыха, усё нешта кволілася, усё хварэла. Калі трохі ёй добрылася, то хадзіла на поле, як і ўсе вясковыя жанчыны. Старшыня спачатку кватараваў у аднаго селяніна, там жа, дзе змяшчалася і кантора, а потым перабраўся ў старую школу і зрабіўся нашым суседам. Я амаль штодня бегаў да Гопкаў і на свае вочы бачыў, як яны жылі: на абед выстаўлялася тая ж крупеня ці капуста, што і ў нас, а ўвечары — вараная бульба і агурочны расол...

Школа наша, тая, што пабудавалі за калгасам, уцалела вайной. Яе былі запалілі нямецкія факельшчыкі, калі беглі з Браншчыны, не азіраючыся, увосень 1943 года. Яна згарэла б, канечне, каб не Амяллян Цярэшка, ціхманы і трохі дзівакаваты стары, што не пабег, як усе, у балота, а хаваўся на гародзе, у акопчыку. Убачыўшы, што агнём ахапілася страха, падбег і ватоўкай затушыў агонь. Сам апёкся трохі, а школу ўратаваў.

Раней школа мела тры пакоі: два для вучняў і адзін — настаўніцкая і бібліятэка; месца хапала на паўсотню вучняў, болей ніколі не набіралася. А цяпер вучняў палавіна ад таго, як было некалі. Каб яшчэ агараць нешта падобнае на клуб (да вайны быў прыстойны клуб), то лепей і не трэба. Цяпер пакуль што сабрацца людзям недзе, апрача як у школе: тут і кіно круцяць, і бібліятэка ў трох шафах, і лектар калі які завітае — то зноў жа ў школе збіраюцца.

Меркавалі мы з нашым загадчыкам Пятром Рыгоравічам (ён мяне нядаўна змяніў, бо ўжо, нарэшце, скончыў педінстытут — завочна, вядома, — і маладзейшы, то яму, як кажуць, і кніжкі ў рукі) і так і гэтак. І пагадзіліся на тым, што трэба хоць бы прыбудовак — на новую школу грошай нам не паабяцалі, сказалі: «Ваша трохі патрывае яшчэ...»

Прыбудовак — гэта зальчык, дзе можна ўжо і разгарнуцца. Лішні класны пакой, а ўлетку — клуб і хата-чытальня, называйце як хочаце.

Неяк прыехаў да нас інспектар райана Антон Нілавіч Пабягайла і пачаў нас ушчуваць: «Як вам не сорамна, сябры, а яшчэ доблесныя ўдзельнікі Айчыннай вайны, патрыёты свайго роднага сяла. А музея свайго не маеце. Хоць бы куток які зрабілі!..»

Наківаў нам як мае быць, забег да Пятра Рыгоравіча, загадчыка школы, на кватэру. Так, менавіта забег, бо не той ужо стаў Пабягайла, гады ўжо не тыя, здароўе падбілася, ды і вайна адабрала сваё (Антон Нілавіч у артбатарэі снарады падносіў). А бывала, як прыбудзе, так адразу на абед, а прыязджаў ён часцей за ўсё пад Новы год (і пад Новы — стары год, там жа, вядома, недзе пасярэдзіне, былі яшчэ і каляды), калі свежына на стале ў кожнай хаце — абавязковы пачастунак. Умеў Пабягайла чарку ўзяць, як кажуць, па патрэбнасці: пад хатнюю кілбасу сельгаснапітак ішоў без пярэдыху, транзітам, а пасля яшчэ і пад яблыкі мочаныя; тады можна было і за планы брацца, праверачку рабіць. Такое было пабягайлаўскае правіла. Ды не той час ужо, як казаў наш дамарошчаны клубнік Непрабудны, які за дваццаць пяць гадоў нікуды не выязджаў з Бацькавіч,— цяпер, брат, адной чыстай анкеты мала: трэба і калган мець на плячах, бо раз-два — і жорсткая пасадка...

Сала ўжо Пабягайлу не паднось — паглядзіць, пакруціць носам і зморшчыцца.

— Што вы, Антон Нілавіч? — аж моліцца Пятро Рыгоравіч.— Свежанькае. Свайго адкорму. Во толькі асвежаваў Віню (так загадчык называў пестуна-кабанчыка за пражэрлівасць і выключны, чыста йоркшырскі лыч). Калі смажанае не ўпадабаеце, то я марожанага накрышу. Частуйцеся, я ж ад усяе душы!..

— Пятро, дарагі мой чалавек, што ты мне падносіш атруту етую? — разамлелы ад першаку, нязлосна ўшчувае гаспадара Пабягайла.— Мінулася тое ўрэмя, калі сала лі-

чылася за пачастунак. Цяпер жа, сам знаеш, у сельмагу шпроцікі ды сардыначкі ўсякія: і нашы, рыжскія, і мараканскія...

«Бач ты, яму захацелася шпроцікаў,— падумаў Пётр Рыгоравіч.— Распаneў, браце інспектар, на шпроцікі пацягнула, а яшчэ леташняй зімой, калі ўчыняў разнос пад канікулы, то менціў сала, як бы шурку дроў напілаваўшы». А да інспектара наблізіўся — зрабіў ласкавую міну:

— Ды во, Нілавіч, усё ніяк у той магазін не дабрацца, ета каб свой быў, то збегаў бы, а час, самі ведаеце,— усё то сшыткі, то, як выпадзе вольная часіна, бяжыш... агітатар жа, самі ведаеце...

— Ведаю, ведаю,— Пабягайла пазяхнуў і адкінуўся на спінку крэсла, пашкроб за вухам. Гэта азначала, што ў інспектара настрой яшчэ не сапсаваны: можна яго разварушыць.

— Яшчэ па адной, Нілавіч? — Пятро Рыгоравіч асцярожна паглядзеў на інспектара і працягнуў руку да глячка.

— Хіба што па адной,— памякчэў інспектар і дадаў пагрозліва: — Па адной, Чмель, чуеш! Я ж табе не архірэй, што ўсё любіў па адной ды па адной... Ды, глядзі, каб парадак мне быў, паняў?

— Разумею, Антон Нілавіч. Зробім. Пра музей не скажу, а куток будзе. Ужо самому вушы пратрубілі. Ды самі бачыце, цеснавата. Потым жа, уласна, няма нічога такога, каб хваліцца. Нам бы вот каб магазінчык які. Усё ж, Нілавіч, вёска. З пасёлкамі. Вёска, можна сказаць, велікаватая, самастойная. Дзве брыгады. Комплексныя. А хаця б які ларочак, дык няма. За якой, даруйце, ерундовінай прыся ў Ігліцу ці ў Горкі. А да вайны быў свой магазін. І сціпла, самі ведаеце, жылі, а якое там што — запалкі ці там соль-шмоль, цукеркі, пячэнне — было ў магазіне. А то валачыся тры кіламетры. Чалавек мог бы колькі лішніх вазоў гною адвезці, а ён з-за драбязы вымушаны соўгацца ў Ігліцу...

— Што, вы не можаце дабіцца, каб магазін адчынілі? — Пабягайла сумна паківаў галавою, перастаў жаваць яблык (ён вельмі любіў мачонікі — антоны, заквашаныя Зояй Сцяпанаўнай, жонкай загадчыка школы).— А яшчэ франтавікі...

— Напісалі ўжо нават у Мінск,— апраўдваўся Пятро Рыгоравіч.— Чакаем, што скажуць, а райспажыўсаюз адно чаўпе, што яму, бачыце, нявыгадна, непрыбыткова...

— Калі што — пішыце яшчэ,— рашуча сказаў, бы адрэзаў, Пабягайла.— Паперы ў вас няма, ці што? Стукайце, як кажуць, ва ўсе дзверы. А то разленаваліся тут, абраслі мохам. Маўчыцё, як тыя самы. Будзеце маўчаць, дык вас і куры ў смецце заграбуць... Панятна, дарагі мой чалавечак?..

— Самі ведаеце, панятна!..

— Дык не спіце тут у шапку. Франтавікі мне яшчэ!

Пятро Рыгоравіч ведаў натуру інспектара: калі той нагадаў пра франтавікоў, то ўсё— больш пітва не возьме, кладзецца спаць, а заўтра, апаласнуўшыся калодзежнай вадою, пахмеліцца гарачым яблычным варам — і ў школу. Не даруе ніякай дробязі, ад яго не схаваеш ні адной пылінкі. Дасць перцу па ўсіх правілах, не зважаючы ні на даўнюю дружбу, ні на тое, што загадчык школы як-ніяк ходзіць на пратэзе, ці як у нас называюць, на казённай назе.

...Перад тым як распусціць вучняў дадому, Пятро Рыгоравіч зрабіў аб'яву:

— Дзеці, калі ў каго ёсць якія старыя фатаграфіі ці даўнія паперы, прыносьце і здавайце нашаму бібліятэкару Аляксею Іванавічу. Лыжкі драўляныя, міскі, карцы, сальніцы, самапрадкі — усё нам спатрэбіцца. Будзем ствараць свой школьны музей...

— А лапці можна? — падняўся белагаловы хлопчык з апошняй парты.

— І лапці можна,— пацвердзіў Пятро Рыгоравіч і сумеўся: — Але дзе іх знойдзеш. Можа, спецыяльна заказаць якому дзеду, каб змудраваў?..

— Мой дзед умее,— пахваліўся той жа белагаловы хлопчык.— Папрашу, ён спляце...

— Добра, Віця. Скажы, што настаўнік прасіў, для музея.

— А медалі можна прыносіць? — пачуўся голас аднаго хлопчыка, бацька ў якога нядаўна памёр, і, відаць, у доме асталіся бацькавы ўзнагароды.

Не паспеў яшчэ настаўнік нічога адказаць, як дзеці зашумелі, пачалі хваліцца. Адзін сказаў, што ён прынясе дзедавы граматы, іх далі дзеду ў Маскве; другі пахваліўся, што ў яго бабулі ёсць аж два медалі — казала, што яшчэ да вайны іх далі ёй за лён.

Усе пачалі наперабой крычаць:

— І ў майго дзеда ёсць медаль.

— І ў майго...

— А ў майго бацькі ордэн,— весела абазваўся той жа белагаловы хлопчык.— Мой бацька фашысцкага генерала ў палон узяў.

— Франтавыя і партызанскія ўзнагароды можа аддаць музею той, каму яны належаць,— растлумачыў настаўнік.

Тут зазвінеў званок, і ўсе падхапіліся, кінуліся збіраць кніжкі, складваць у ранцы і партфельчыкі. Дзяўчынка ў кутку, ад правага акна, чамусьці сядзела не варухнуўшыся. У вачах нейкая збянтэжанасць і крыўда. Пятро Рыгоравіч таксама парадкаваў у шафе і крадком пазіраў на дзяўчынку. Яна ўсё сядзела як скамянелая.

— А ты, Таня, чаму не ідзеш дадому? — запытаў ён нарэшце.

Дзяўчынка ўсё маўчала, унурыўшыся ў кніжку, што ляжала закрытая перад ёю. Пятро Рыгоравіч заўважыў, што ў дзяўчынкі вусны аж уздрыгваюць і з вачэй гатовы пырснуць слёзы.

— Можа, цябе пакрыўдзіў хто? — ласкава спытаў Пятро Рыгоравіч.

Таня раптам гучна расплакалася і скрозь слёзы прагаварыла:

— А чаму ў майго дзеда няма ніякага медаля? Ён жа на вайне быў, і рукі адарвала яму, і амаль што сляпы астаўся...

У Пятра Рыгоравіча адразу варухнулася дваістае пачуццё. Што ёй сказаць? Яе дзед быў да вайны здаравяк на ўсе Бацькавічы. Яшчэ калі сам настаўнік быў хлапчуком, той здаравяк, які цяпер ужо дзед, паспрачаўся з цеслярамі, што прынясе ношку жэрдак-паплецвін. І прынёс звязак — як укласці на падводу. Звязак прынёс з лесу, больш як за вярсту. А бывала, хлопцы пачнуць дужацца або выдумаюць што-небудзь, каб паказаць сваю сілу і спрыт на сенажаці ці ў полі, то за Калмыком — так называюць Танінага дзеда — ніхто не ўгоніцца. Працаваў ён за дваіх, але і зладзюга быў, якога пашукаць яшчэ. Калі што дзе блізка ляжыць, не размінецца. У людзей ён нічога, канечне, не браў, а ля калгаснага, бывала, міма не пройдзе: і ля снапоў рукі пагрэе, і сянца пацягне, а на ток калі ўварвецца ноччу, то награбе колькі панясе. Яго, канечне, маглі б прыпільнаваць і даць гадоў колькі адсідкі, але з ім свае, бацькавіцкія, не хацелі звязвацца, і Калмыку ўсё сыходзіла з рук.

Пасяліўся тады цяперашні Танін дзед Гаўрыла Калмык на аселіцы, на ўбітай скацінай мураве, ля грэбель-

кі. Пустэча была, дзе свінні ды куры пасвіліся, а Калмык праз колькі гадоў на гэтай пустэчы і сад пасадзіў, і пчол завёў — адным словам, зажыў чалавек. Некаторыя разважалі так: калгаснае — не маё ўласнае, махнулі рукой, а людзі справядлівыя і сумленныя шчыра хацелі, каб Калмыка неяк утаймаваць. Ды не так проста было Калмыка прасачыць, бо ён умудраўся і там прыхапіць, дзе, здавалася, усё на добрай завале.

Як пачалася вайна, Калмыка ў войска не ўзялі — блізарукі ён быў і, як усе старыя і калекі, аставаўся ў Бацькавічах увесь час акупацыі. Жыў ціха, на работу, якую давалі соцкі ці староста, хадзіў без ахвоты — абы радоўку адбыць; на вочы немцам, калі тыя зрэдку наязджалі ў вёску, стараўся не паказвацца і, кажуць, меў сувязь з партызанамі.

Як толькі ў Бацькавічы прыйшлі нашы, Калмыка, як і іншых мужчын, прызвалі ў армію: ён ваяваў у сапёрнай часці і падарваўся на міне.

У год вялікай перамогі з вайны прыходзіла нямала мужчын калекамі. Ведама, такая вайна была. Вярнуўся і Калмык, пакалечаны, без абедзвюх рук. Па вёсцы пайшла пагалоска: «Гаўрыла прыйшоў...» Канечне ж, шкада чалавека. Няможна і смяяцца.

Невядома, ці браў што калгаснае Калмык, вярнуўшыся з вайны інвалідам, але ў тыя гады яго часта можна было бачыць уначы на таку, дзе малацілі збожжа, ля капцоў з бульбай, калі яе ўбіралі з поля,— начамі не спаў Калмык, па старой звычцы ўсё хадзіў па полі, нічога не браў, праз людзей некаму пагражаў: «Сам не вазьму, але і нікому не дам ні каліва...»

Нядоўга пабыў Калмык за няштатнага вартаўніка. Мусіць, надакучыла сачыць за іншымі ці па якой другой прычыне ён з'ехаў з Бацькавіч, а жонка яшчэ раней кінула яго з усім набыткам. Нічога не ўзяла, толькі сына меншага, а дачка жыла дома, потым выйшла замуж. Таня — яе дзяўчынка, вучыцца ў чацвёртым класе.

Павандраваўшы па свеце, Калмык вярнуўся ў Бацькавічы. Можа, ужо назаўсёды. Ажаніўся ў трэці раз. Жанчына знайшлася, не пагрэбавала бязрукім. Але не наша, не з Бацькавіч. Адна наша дзяўчына-перастарка неяк пажыла з ім трохі, ды збегла. Калі дапыталіся прычыны, то яна неяк вымавіла толькі адно слова: «Боўдзіла».

Калмык яшчэ дужы, каржакаваты, як дуб, абпалены маланкамі і з абламанымі сукамі. На гулянкі, на якія ў

Бацькавічах вялікія ахвотнікі, ходзіць рэдка, хіба што калі ў чыёй блізкай хаце. Іншы раз завітае да дачкі — паклічуць на пачастунак; людзі дзівяцца, як ён кульцямі ашчаперыць шклянку і вып'е ўсю, колькі нальюць, да кропелькі, а тады плача, роўма раве, скрыгоча зубамі. Можа перакуліць шклянкі тры-чатыры. Пасля буяніць. Зяць спяшае звязаць яго вяроўкай, бо ніякія ўгаворы не памагаюць. Усё перад сабою ломіць, крышыць. Калі на каго кінецца з кульцямі — літасці не чакай: загняце і можа нават зубамі ўчапіцца.

У таго ж самага Пятра Чмяля, калі ён паранены вярнуўся з вайны ў 1945-м, Калмык убачыў на гімнасцёрцы ордэн, доўга-доўга прыглядаўся здаравейшым вокам, моўчкі нешта бубніў сабе пад нос, а пасля і пытае:

— Што гэта ў цябе, Пятрусь?

— Ды, бачыш, ордэн.

— Га, вам ордэны...— І рынуўся на хлопца. Падбеглі людзі, ледзь адцягнулі Калмыка.

Усё гэта неяк, нібы ў калейдаскопе, пранеслася ў галаве Пятра Чмяля, пакуль Таня паспакайнела, збірала кніжкі.

Зацягнуўшыся цыгарэтным дымам, Пятро Рыгоравіч рыпнуў пратэзам (яму ўжо праз колькі гадоў аднялі ніжэй калена пераламаную нагу), прайшоўся сюды-туды і сказаў:

— У твайго дзеда быў медаль... Усім, хто быў на вайне, давалі. Яшчэ і ордэн дадуць, калі ўжо не далі. Усім, хто ў свой час не атрымаў узнагароды, а ваяваў і быў паранены, даюць. Упэўнены, што і твайго дзеда не абмінуць... Ідзі дахаты і не плач!

Пятро Рыгоравіч, растрывожаны, доўга не мог супакоіцца; усё думаў пра Калмыка. «Вот жа чалавек. Ну і характар! Колькі гадоў, а на сэрцы рана-крыўда не загаілася. Вядома, чалавек аддаў абедзве рукі, пашкодзіў вочы. Яго можна зразумець. Але ж не адзін ён... З Бацькавіч, лічы, амаль з кожнага двара пайшлі, а вярнуліся нямногія, і тыя — хто без рукі, хто без нагі. Многа ўжо ляжыць пад маяком, на могільніку. Гэта ж не жартачкі. Чвэрць веку, як была тая вайна, а яе рэха яшчэ чуецца, трывогай і болем аддае ў сэрцы».

Правільна заўважыў вялікі чэшскі педагог Ян Амос Каменскі: «Душа дзіцяці — чыстая грыфельная дошка...»

У Іванічкі — Якава Іванавіча, нашага калгасніка-ветэрана, які ўжо даўно на пенсіі, але не сядзіць без справы:

за кладаўшчыка, выдае збрую, трымае ў парадку інвентар брыгады,— захавалася працоўная кніжка. Ад той кніжкі, праўда, асталося не вельмі многа: няпэўнага колеру пакамечаная і сцёртая вокладка і некалькі лісткоў, на якіх мясцінамі можна прачытаць лічбы і пералік работ. Кожны месяц тады ў кніжку запісваліся зароблены працадні. А на вокладцы ясна захаваўся год: 1933. І прозвішча калгасніка — Кавалік Якаў Іванавіч.

Унучка Каваліка прынесла ў школу гэтую кніжачку. Калі яна папрасіла што-небудзь у дзядулі для школьнага музея, то Якаў Іванавіч сказаў:

— Во вазьмі, Зіначка. Няхай маладыя паглядзяць, як некалі твой дзед працаваў. Не які-небудзь гэндрык-лайдак быў твой дзед, а ўдарнік на ўвесь калгас!

Помніцца, кніжкі гэтыя выпісаны рукою нашага першага калгаснага рахункавода Сямёна Міронава, якога часцей называлі Марцін. У вочы — Сямён Восіпавіч, а за вочы заўсёды Марцін. Чаму так, не ведаю. Здаралася нават — якая-небудзь пажылая кабета, забыўшыся, звернецца да яго: «Марціночак, дзіцятка», ён толькі хмурыўся, паводзіў сваім доўгім бусліным носам і ўставаў, дыбаў да зашмальцаванай і заляпанай з усіх бакоў шматкамі наклеек-аб'яў шафы.

— Цічас, цічас праверу,— пісклявіў Сямён-Марцін і ўрачыста выцягваў вялікую пульхную гросбух.— У мяне, брат, усё точна... Усё як на прычасці. Памінальніца ета не схлусіць!..

Сямён-Марцін быў, я сказаў бы, вельмі асаблівым рахункаводам. Мушу адразу агаварыцца, каб не было няўвязкі, што ён нідзе не праходзіў ніякіх спецыяльных бухгалтарскіх курсаў; ён скончыў некалі, яшчэ за царом, пачатковую школу, меў даволі арыгінальны, размашысты почырк, пісаў хутка, памылак рабіў небагата, толькі часта блытаў беларускае напісанне з рускім, затое лічбы ў яго былі арыгінальныя, марцінаўскія — вельмі фацэтныя і з рознымі завітушкамі. Калі ён, скажам, піша лічбу «два», то яна ў яго выгінастая, як лебядзіха, а ўнізе яшчэ нібы распластаная вузенькая васьмёрка; «пяць» — чысты сярпок з мудрагелістай шапкай на канцы, а зверху — размашыстая тонкая рыса...

Калі мяне — хлапчука, які перайшоў у пяты клас, наш старшыня Рыгор Іванавіч Гопка прывёў да Сямёна-Марціна і сказаў: «Прымай, Сэмэн, памочніка»,— той зморшчыўся, пашкроб за вухам кручкаватым, запэцканым у

чарніла пальцам, змераў сухім позіркам маю шчуплую постаць і паказаў на табурэтку, таксама ўсю заляпаную, як і доўгі дашчаны стол, чарнільнымі плямамі.

— Сядай. Цічас праверым, як цябе там у школе вучылі,— і падаў мне перапісваць табель, якія тады для кожнай брыгады вывешваліся на сцяне ў канторы калгаса. Табелі ўсе пісаліся на шпалерах, разлінаваных алоўкам, бо добрай паперы не хапала і на больш важныя патрэбы.

Я з хваляваннем пачаў рабіць табель. Скажу — я ўжо не раз прыглядаўся да почырка Сямёна-Марціна і не раз на кавалку паперы, а часцей за ўсё на такіх жа шпалерах, як і ў канторы, трэніраваўся. Мне было цікава пісаць такія ж размашыстыя і з гэткімі вычварнасцямі літары, і я ўжо ўмеў напісаць «С. Міронаў» так, як гэта рабіў сам Сямён-Марцін. Табель пісаўся па алфавіце, я напісаў ужо некалькі прозвішчаў, і толькі вывеў «С», каб напісаць Сямёнаў, як над маім вухам пачулася:

— Ого, братачка! Цічас у цябе палучаецца. О, братачка... Ну давай, давай!..

З гэтага дня я пачаў памагаць Сямёну-Марціну ва ўсім яго рахункаводстве. Працаваць з Сямёнам Восіпавічам было добра і весела. Ён надзіва быў вясёлы, з гумаркам чалавек, праўда, гарачы, але адходлівы — доўга не гневаецца, не злуе. Усё, што рабілася ў вёсцы, лавіла яго чуйнае вуха, бы лакатар. Ён страшэнна любіў і ведаў усе вясковыя навіны. От, бывала, піша Сямён-Марцін нешта, а адным вухам перахоплівае ўсё, што расказвае які-небудзь дзядзька-насмешнік, завітаўшы ў кантору, каб перакурыць ці проста «патачыць лясы». Сямён-Марцін водзіць пяром, унурыўшыся, і слухае, а потым раптам як падскочыць, схопіцца за галаву:

— От звесткі-нявесткі, каб ты спрах, Андрэй! Што я праз цябе тут напісаў?..

Як агонь, успыхвае сварка-лаянка. Сямён-Марцін не аціхае, пакуль не выпхне з канторы таго балаку Андрэя. Толькі сцішыцца, увойдзе ў смак, зноў піша, пачынае нешта падбіваць на лічыльніках, а тут нехта другі ўжо завядзе якую-небудзь «анцімонію», што азначае пустую гутарку, і Сямён-Марцін спакваля кладзе за вуха аловак, падхопліваецца з месца (сухарлявы, доўгі, ссутулены, а сядзець любіў, падклаўшы адну нагу пад сябе), чыкільгае, бы той кульгавы бацян, па рыпучых маснічынах, з усімі рагоча, закінуўшы стаўбунаватую галаву, аж бярэцца за бакі. Тады раптам спахопіцца, паставіць светлыя лупатыя

вочы на таго, хто толькі што яго рассмяшыў, і як закрычыць на ўсю хату:

— Вон, лайдакі-баламуты, адсюль! Цічас тут будзе Гапко, ён вам намыліць галовы. Вон, кажу, а то як пастаўлю на праўленне! Яй-богу, пастаўлю, і ета вам так не мінецца. Папомніце мяне!..

— Ды што ты, Восіпавіч, ета ж мы для спакаення нерваў і для тваёй жа карысці,— нехта з тых балакаўдасціпнікаў ужо асцярожна пачынае апраўдвацца.— Ета ж тут процьма работы, скулку можна, ета, з добры кулак, за дзень, ета, насядзець. Пабойся бога, Сямёне...

— Нічога не хачу знаць! Хваця! Дос мне тут казлоў валяць,— трохі ўжо спакайней, без гневу гаворыць Сямён-Марцін і працягвае тонкую, з гнуткімі пальцамі руку да мяшэчка з самасадам у таго ж дзядзькі на закрутку.— Мне што, я нічога, а вот хлапец наблытае. Старшыня казаў, каб тут без дзела ніхто не тырчаў, як тая тычка ў канаплях. Ідзіце, бо будзеце знаць, як тут нечакана нахопіцца Гапко!..

А той Андрэй, якога Сямён-Марцін во толькі вытурыў у каршэнь, нейкім чынам зноў апынуўся ў хаце і тупае ўжо каля вядра з вадою. Робіць выгляд, што зайшоў напіцца. Заўважыўшы, аднак, што Сямён-Марцін адышоў і палагаднеў, скручвае самакрутку з добрую аглаблю і, спярша асцярожна, а пасля смялей, зноў пачынае свае баітурэсы.

— Браткі, ці чулі новасць? — рыжая барада ў Андрэя неяк сама тырчком задзіраецца ўгору, а шыя высоўваецца і даўжэе, і ўвесь ён неяк дзіўна набычыўся, нібы баіцца рассмяяцца.

— А ета што там такое? — Сямён-Марцін бруднымі пальцамі пачэсвае востры няголены падбародак і соладка зацягваецца чужым самасадам.

— Ай, баюся казаць, Восіпавіч, бо яшчэ штрафу прыпаяеш. Ведаю цябе!..

— Што ты, Андруха, які там штраф,— лагаднее Сямён-Марцін.— Ты ж ведаеш — мне што, разві я супроць, а вось Гапко наскочыць — хваця вам, будзя і мне. Слыш, Андруха, што ета там было такое?..

— Дык бачыш... Унь такое дзела.— Андрэй сцягвае з галавы лінялую падзіраўленую кепку з аблупленым, некалі бліскучым брылем, кладзе ў яе свае курэцкія прылады.— Ета ж у Аўтарохаве грэчку пасеялі... Братка, шара-

ёй. Ну, ета значыць шкарлупамі, шалупіннем. Грэчку тую на крупы здзерлі, а пасеялі адной шараёй...

— Бачыў ты, кум, сонца! Якія яны мудрыя! — аж разявіў рот ад здзіўлення Сямён-Марцін і закруціў галавой, зачмокаў языком. Ён ужо нават забыўся на тое, што во толькі самым сур'ёзным чынам сварыўся з Андрэем, з іншымі такімі ж балакамі,— яны на самай справе перашкаджалі працаваць.

Тут з парога раптам грымнуў знаёмы голас — рашуча, размашыстым крокам у кантору ўвайшоў старшыня і са словамі: «Ось, бісавы душы»,— кінуў на стол свой шэры стаўбун — ужо добра ўгравала сонца, вясна ўжо, як старыя казалі, уселася на куце, пад багаўнёю, і сейбіты выйшлі ў поле, а старшыня ўсё насіў на галаве зімовую шапку. Відаць, у старшыні не было якой кепачкі, бо і вясною ён не расставаўся са сваім стаўбуном, у гарачыню насіў яго проста ў руках.

Як зайшоў старшыня, мужчын ураз як ветрам здзьмула.

— Што ў нас тут чуваць, Сэмэн? — коратка кінуў старшыня раханкаводу. Той моўчкі падаў старшыні папку з паперамі-дырэктывамі, якіх тады ішло не надта багата, і зачастую яны былі вельмі кароткія — некалькі друкаваных радкоў на папяроснай паперцы. Старшыня чытаў іх доўга і ўважліва, а потым вяртаў рахункаводу, казаў сваё любімае «ясно, што дзіло тэмное» і пачынаў разглядаць зводкі, падрыхтаваныя ўжо для перадачы ў сельсавет і ў раён — адтуль часцей за ўсё прысылаліся дырэктывы і распараджэнні.

Ва ўсіх тых дырэктывах было адно — сеяць, сеяць і сеяць, не зважаючы ні на што,— за невыкананне старшыня калгаса і брыгадзіры строга папярэджваліся, аж да аддачы пад суд.

Старшыня ведаў усё гэта не менш за нас з Сямёнам-Марцінам, старанна і ўважліва вывучаў зводку, запыніў позірк на словах «ячмень» і «лён» — там стаялі асцярожныя, ледзь прыкметныя прочыркі. Старшыня, звёўшы крылатыя бровы, уздыхнуў:

— Воны ж мяне з'ядуць з вантробамі.

Сямён-Марцін круціўся на табурэце, чмыхаў гарбатым носам, тады падхапіўся ўвішна, абедзвюма рукамі, дакладней локцямі, падшмаргнуў свае пералатаныя ўжо шмат разоў штаны галіфэ, у якіх ён улетку шпацыраваў, як і вясковыя мужчыны, басанож. У такі момант Сямён-

Марцін выглядаў вельмі смешна — нібы той Дон Кіхот. Пастаяў гэтак трохі, як збянтэжаны, але тут жа, апамятаўшыся, пачаў бойка апраўдвацца:

— Ну што мне рабіць, Рыгор Іванавіч. Хоць ты іх рэж, етых брыгадзіраў. Яшчэ, гавораць, рана сеяць лён і ячмень, гразюка на полі, лужыны скрозь стаяць, няможна ў такую гразь семяно глуміць. Ета ж чыстая праўда, таварыш старшыня...

Старшыня доўга маўчаў, насупіўшыся, звёўшы злосна бровы, бліскаў спадылба бялкамі калючых вачэй — выдавала, ён пакутаваў, змагаўся з самім сабою. Ён не горш за Сямёна-Марціна ведаў, што сеяць у гразь нельга, але ж дырэктыва — закон, ад яе адступіцца няможна ні на крок. Загадана — значыць, рабі, і ніхто на месцы дырэктыву адмяніць не мог, не меў сілы. Закон пераступіць нельга. Закон маглі смялейшыя неяк абыходзіць. Наш старшыня ўмеў выкручвацца так, каб і пасеяць у лепшыя тэрміны, а не проста зерне ў зямлю кінуць, і каб дырэктыва была не парушана.

І раптам цішыню рве ўжо нам знаёмае:

— Сэмэн, фіксуй!

Сямён-Марцін ведае, што ад яго патрабуецца. Ён моўчкі ў графе «Пасеяна: ячмень» піша — 15 гектараў, у графе «Пасеяна: лён» — 6 гектараў.

Старшыня моўчкі, унурыўшыся, падпісвае зводку. Мы ведаем, што гэта адзінае выйсце з такога становішча. Пакуль зводка дойдзе ў сельсавет, а там пакуль зробяць адну зводную па ўсім сельсавеце, адтуль яна пойдзе ў раён — міне два дні. Выветрае глеба, і можна будзе сеяць.

Крыху пасядзеўшы, старшыня пачынае гаварыць пра кузню — без яе, вядома, калгасу не абысціся. Кузні тады ў нас, можна сказаць, зусім не было. Ад старой, дзе працаваў Лейзараў брат Мордух, асталася толькі адна развалюшка. За кузню ўзяўся з усёй уласцівай яму гарачнасцю мой бацька. Пасябраваў тады шчыра са старшынёй і гатоў быў са скуры вылузнуцца, абы зрабіць усё, што яму даверацъ людзі.

— Ведаеш, Сэмэн, у нас будзе каваль! Сват знайшоў яго,— раптам вымавіў старшыня.

Гэта пра майго бацьку. Мне прыемна. Вось толькі што сватамі яны ў жарт называюць адзін аднаго — мне зусім не падабаецца, аж прыкра.

— А што я казаў? — у тон старшыні падладжваецца Сямён-Марцін.— Ежалі возьмецца Іван-Саўхоз, то не пад-

вядзе. Яму толькі пасабіць трэба ды ў руках трымаць, бо як загуляе, тады — на ўсё рукой махне!..

— У мяне не загуляе,— зіркнуў у мой бок старшыня.

4

Я сядзеў, унурыўшыся ў паперы, якія даў мне перапісваць Сямён-Марцін, і чуў, што чырвань апякала мне вушы і шчокі. Я баяўся, каб старшыня не прыгадаў усё, што адбылося ў той год напрадвесні...

...Пачалося яшчэ зімою. Дзень пры дні ў Бацькавічах праводзіліся сходы. Мужчыны некаторыя стараліся кудынебудзь затуліцца ці з'ехаць, каб не хадзіць на тыя сходы. На сходах стаяла і рашалася адно і тое ж пытанне, падрыхтоўка да сяўбы, суцэльная калектывізацыя. Ад раёна за прадстаўніка ў Бацькавічах быў таварыш Архіпцоў. Запомніліся яго доўгі кавалерыйскі, па пяты, шынель, стаптаныя чаравікі і абмоткі. Няголены, з цёмнымі кругамі пад вачамі, змораны твар. Шапка-будзёнаўка з вялікай, на ўвесь лоб, пяцікутнай зоркай, а на шыі яркі чырвоны шалік, канцамі матляўся, нібы трапяткія крылы. За ім па пятах, след у след, крочыў нязменны «сябар вёскі» Ціт Мірончык — старэйшы брат нашага рахункавода, з ім Косцік Баянок, старэйшы брат майго бацькі. Галайда-прымак, вядомы ў раёне чырвоны партызан, удзельнік грамадзянскай вайны. З ім аднойчы здарылася такое. Неяк Галайда з мужыкамі выпіваў на хутары. Адзін хутаранін, Сазон Рубец, па п'янцы згроб яго даведкі-паперкі, якімі Галайда меў звычай часта выхваляцца, і шпурнуў на пяколак, а там быў агонь, смажылася яечня. Галайда шамятнуўся за імі, але было позна — паперы тыя ахапіліся полымем, згарэлі.

Ціт, Косцік, Іван Галайда — першыя нашы калгаснікі. Жменька сялян-актывістаў. З іх у Бацькавічах пачынаўся калгас.

Нялёгка людзі рвалі пупавіну, якая іх звязвала са сваім конікам, са сваёй палоскай, і станавіліся на шлях калектыўнага жыцця. Як цяпер падумаю, аж смешна робіцца. Да чаго даходзіла ўпартасць, з якою людзі чапляліся за старое, не верылі, што можна жыць інакш, у дружбе і згодзе.

Архіпцоў на сходзе гаварыў доўга, да хрыпаты. Хата была поўная людзей. Стоўпіўшыся, жанчыны і маладзей-

шыя хлопцы слухалі стоячы; на лаўках уздоўж сцен, на палку пры печы, на ўслонцах сядзелі старэйшыя.

— Хто запісваецца наступны, прашу! — кідае, ужо, можа, у соты раз, Архіпцоў і называе прозвішчы тых, што запісаліся.

Маўчанне. Тады Архіпцоў пачынае выгукваць:

— Андрэй Кавалік, чаму не пішацеся?

З натоўпу вытыркаецца шапка — цэлая авечка, а затым мільгае смешная, з касмылямі рыжая бародка:

— Я — за. Але ж ета няхай тэя, каторыя... Я ж не крайні...

У натоўпе ўсхліп гоману і смеху.

— А хто ж крайні? — чуецца голас ад стала, дзе прэзідыум: Архіпцоў, Ціт, Косцік.

— Лявон крайні,— выгуквае сіпла гаспадар шапкі-кучомкі і кумельгам шыецца ў натоўп.

Лявона — самага заможнага селяніна ў Бацькавічах — ужо не было на свеце. Гаспадарка ягоная абкладзена цвёрдым заданнем; і ўся яго маёмасць стала, можна сказаць, калгасная, бо Лявоніха была хворая, як казалі тады — «не пры сваіх», а дачка прасілася, каб яе прынялі, але ёй пакуль што было адмоўлена.

Усе засмяяліся, бо Андрэй лоўка ўхітрыўся адмаўчацца, спасылаючыся на тое, што не ён крайні: маўляў, не з мяне трэба пачынаць той спіс.

— А вы, Амяллян, Аўхім, чаму маўчыцё? — гэта ўжо Ціт Мірончык, наш нязменны бацькавіцкі паўпрэд у сельскім Савеце, звяртаецца да братоў Цярэшкаў, што яшчэ ніяк не вырашаць гэтага, мусіць, самага складанага ў іх жыцці пытання.

— Дык я, ета што! Хоць і цяперака,— адзываецца смялейшы з братоў Аўхім.— У мяне што, б'ят, адна кабылка... Я, б'ят, хоць куды, хоць на край свету... Адзін мамент!..

Аўхім шкрэбае чунямі да стала, засланага чырвоным міткалём, бярэ ў заскарузлыя тоўстыя пальцы канчурок алоўка, што ляжыць тут жа на паперы, ставіць некалькі загагулек — гэта азначае, што ён распісаўся і абавязваецца здаць калгасу насенне, інвентар, каня. Ён з сённяшняга дня — калгаснік.

...Запісаліся былі ўжо многія. Можа, больш як палавіна вёскі. А мой бацька, які прыехаў зімою, пад самыя каляды, дадому, усё яшчэ нечага марудзіў, не адважваўся сказаць, што ён «за камунію», хаця быў душою разам з

вясковай беднатою, а вонкава, знешне стаяў у гурце з сялянамі больш заможнымі і якія сапраўды не спяшаліся прыняць новы лад жыцця. Такіх, хто трохі супраціўляўся, а больш — проста ўпарціўся, у нас набіралася небагата — Карп Півоня, Антон Кіпень, сям'я Аўдакіма Кораня і, здаецца, яшчэ некалькі двароў. У Бацькавічах мала было такіх сялян, якія жылі зусім упрогаладзь, не мелі кавалка хлеба. Памятаецца, што самыя нашы бядняцкія гаспадаркі — удава Зайцава, Навалаіха, сям'я Вераб'ёвых, Пімен Давідзёнак, удава Бальшавічка, Галайда-партызан, Іван Мацвяёнак, Сямён Гуска — і тыя неяк перабіваліся з хлеба на квас. Хоць пра такіх казалі: «Ён ніколі не каштаваў хлеба з бярозавікам: быў хлеб — не было бярозавіку, быў бярозавік — не было хлеба».

...Доўга ра́дзіліся і шапталіся такія сяляне, як наш сусед Карп, у якога тройка коней і жарабок-стаеннік, брычка на жалезных рысорах, сад амаль на дзесяціну. Яны ж падбівалі і майго бацьку, каб трымаўся іх рукі. А яму, шахцёру і бедняку, вельмі імпанавала тое, што з ім ладзяць хаўрус такія аўтарытэтныя, паважаныя гаспадары.

— Што будзем рабіць, Іван Панасавіч? — сустрэўшыся каля веснічак ці каля студні, даверліва гаварыў Карп Кузьміч, сухарлявы мужык у зграбным дубленым кажушку, разгладжваў акуратныя русявыя вусікі, свідраваў карымі вочкамі просты і адкрыты твар Івана-галетніка і сцішана шаптаў: — Трымайся, сусед, не можа быць, каб, етае, сілком пхаць. У газетах пішуць самі ж, што, етае, пхаць агулам нельга, будзе толькі кружэнне галоваў...

— Думаю, Кузьміч, думаю,— падтакваў Іван, а ў самога на сэрцы, як камень, прыкрыя цяжкія думкі: «Добра табе гаварыць, Кузьміч, а што б, скажам, старая ўласць вярнулася, то няйначай і маю б дзялёнку згроб сабе, як некалі ў дзеда адхапілі паўнадзела; давалі і давалі яму напавер грошы на гарэлку, а потым прад'явілі — аддай, а аддаць яму не было чым, давялося заплаціць кроўнай зямелькаю...

Тое, значыць, засела ў памяці і ўнука. І цяпер іх палосы аддзяляла толькі мяжа. Стаўшы гаспадаром, мой бацька часам, захапіўшыся, мераў крокамі сваю палоску і гаварыў іншы раз мне: «Во, колькі етыя, брат, загрэблі нашае зямлі. Усё праз дзедаву слабасць. Кваплівыя на чужое. Ета, брат, такія людзі, што глядзі, не варонь, а то ўраз абмантачаць, пад самы корань!»

Дык чаму ж бацька цяпер усё ўпіраўся, не падаваў

заяву, а калі апынуўся ў спісе для раскулачвання побач з Кузьмічом, то чамусьці нават не спужаўся. Можа, ад самалюбства ці яшчэ ад чаго?..

Ужо прадвеснем, калі снег асунуўся і пачарнеў, а са стрэх падалі са звонам капяжы, калі певень сярод дня садзіўся на жэрдку і заводзіў сваё «ку-ка-рэ-ку», да нас на двор завітала камісія — тры чалавекі, з іх толькі Ціт Мірончык быў з Бацькавіч ды знаёмы наш прадстаўнік Архіпцоў у расхрыстаным шынялі, з нязменным чырвоным шалікам на шыі. Зайшлі ў хату. У хаце ў нас было пуста. Якраз як бацька мой любіў пажартаваць: «Адзёжы — што на кожы, харчэй — што ў жываце». Пасярод хаты калыска, дзе люлялася ўжо трэцяя сястрычка, Таня; на стале — бульбяныя праснакі, на палку — сяннік, адзіны ва ўмовах нашай вёскі матрац, але ў нас ён набіты не сенам, а жытняй саломай, за зіму зляжалай, аж сыпалася праз дзяружку пацяруха.

Мы з белагаловым Гараськам — сынам Навалаіхі, удавы, якая першай расквіталася з нялюбым, гібельным для яе аднаасобным жыццём,— увесь час гульма гуляем дома. Абодва мы худыя, як трэскі. У мяне пад пінжачком-зрэбнікам картовая сарочка — бацька з Данбаса прывёз, а штаны сваёй работы, збольшага падсіненыя; на нагах велікаватыя чаравікі, а ў Гараські — адзіны абутак на зіму і лета — падраныя рыжыя валёнкі, іх ён перахоплівае ў маткі, калі тая скіне з ног, і прыбяжыць да мяне; часцей за ўсе ён прыбягаў басанож. Заскоча босы і з парога куляй ляціць на печ — адагрэцца. У Гараські зрэбная кашуля, ніколі не зашпіленая, на жываце з вялікай дзіркай, штаны з грубай даматканіны, што звычайна ішла на мяхі. Усё гэта ў лапіках і зашмальцаванае да чарнаты.

Гараська быў добры па натуры хлопец, весялун. Плячысты. Каржакаваты. Белабрысы, стрыгся ён вельмі рэдка; валасы кудлаціліся і пасмамі ляжалі на шыі; твар круглаваты, з прыгожымі смяшлівымі пухлінкамі вакол вуснаў; выдавала, бы Гараська ўсягды ўсміхаецца. Вочы таксама нейкія ўсмешлівыя, вялікія, як з сапраўднага нябеснага блакіту. Калі Гараська смяяўся, паказваў рад белых буйных зубоў. Заўсёды вясёлы і таварыскі, Гараська быў здатны на выдумкі, умеў выразаць з дрэва розныя цацкі, з гліны чалавечкаў ляпіў, з саломы майстраваў кошыкі, шапачкі. Мы не сумавалі.

На гэты раз, дачуўшыся, што і нас могуць раскулачыць, я расхваляваўся не на жарт. Я ўсё расказаў Гарась-

ку, і мы — калі да нас завітала камісія — усю сваю гульню кінулі і назіркам цікавалі, што яна, строгая камісія, будзе рабіць.

— Апісваць маёмасць? — звярнуўся да маці адзін з траіх, што ўвайшлі ў хату.

— Апісвайце,— суха сказала маці, не здымаючы нагі з пачопкі на калысцы, якая вісела на ўбітым у брус круку пры запечку. Маці нібы скамянела, твар белы як палатно.

— Што ў вас са скаціны? — у цішы чуваць той жа хрыплы голас.

— Конь,— спакойна кажа маці.— Але ён такі, што ці падымецца сам на ногі. Зазімлевы. Ляжыць вунь пластом. На вяроўках падымаем...

— Яшчэ?

— Карова. Здыхляціна, адны рэбры. Сена ад каляд амаль што няма. Не знаю, ці выйдзем на вясну...

— Ну, а дзе Іван? — гэта ўжо голас Ціта, які паважна расклаў свае пашкі-прычындалы на стале.

— А я за ім хаджу? — ужо больш злосна адказвае маці.— Можа, збіраецца на Салаўкі...

— Ну, ты кінь, хазяйка,— кажа незнаёмы ў скуранцы, грузны чарнявы чалавек з доўгім кручкаватым носам і вялікімі бліскуча-цёмнымі вачамі.— Тут не жартачкі. Мы сур'ёзна,— ён надта ж пільна, як бы нанава, абвёў вачамі новую, зусім не абжытую хату і дадаў запытальна: — Ну, а дзе ж тая машына... Ваўначоска, пра якую ў нас значыцца?..

— Глядзіце, вунака яна, у клеці,— зноў жа спакойна, нават з нейкай насмешлівасцю ў голасе кажа маці.— Добра, каб вы яе разам з гаспадаром забралі!..

Архіпцоў сядзеў моўчкі, схіліўшы галаву, нейкі хмурны ці, можа, разгублены. Яшчэ раз прайшоўся з кута ў кут, уздыхнуў і рэзка кінуў:

— Пайшлі!

Адчынілі дзверы ў клеці самі. У кутку навалам ляжалі валікі, з калючай адзежай барабан з ручкамі. Машына была звалена туды яшчэ ўвосень. Страха крыху працякала, і ўсё пакрылася ржой, зацягнулася павуцінай. Члены камісіі, убачыўшы груду ламачча, весела пераглянуліся і ўсе трое засмяяліся.

— Што будзем рабіць? — спытаў Архіпцоў.

Той, што быў у скуранцы, махнуў рукою. І ўсе з нейкай палёгкай пакрочылі са двара. На тым і скончылася

раскулачванне. А бацька, падпіўшы, яшчэ колькі дзён потым на сяле хваліўся: «Не знаю, што мне рабіць. Ета ўгарэў, дык угарэў...»

І марудзіў з уступленнем у калгас. Яму раілі кінуць дурасць, а сур'ёзна падумаць пра свой лёс. Калі-нікалі да нас заглядваў старэйшы бацькаў брат Косцік, які хадзіў у актыве і ўжо ўвесь хутар сагітаваў уступіць у калгас. Браты між сабою не дужа ладзілі. Меншы ўсё злаваў, што большы не лічыць яго за сталага чалавека, таму не вельмі і хацеў слухаць, на што настаўляў яго большы.

Як толькі заходзіла гаворка пра тое, як жыць далей, Косцік смяяўся:

— Вот было б добра, каб цябе, упіру, правучылі як след. Папілаваў бы дровы на Салаўках, тады, можа, стаў бы чалавекам.

Бацька злаваўся, лаяўся і крычаў: «Не вучы мяне, я такіх вучыцеляў не хачу знаць. Ты, браток, мяне голага выгнаў пад зіму. Я, як бачыш, не змёрз, дык нечага мяне тут адчытваць і павучаць. Сваёю мазгаўнёю жыву...»

Старэйшы падымаўся з застолля, насоўваў на галаву шапку і, не развітаўшыся, шыбаваў з хаты.

Неўзабаве і прыехаў у Бацькавічы Гопка, камуніст-дваццаціпяцітысячнік. Пачаў прыглядацца да нашых людзей, як хто жыве, чым дыхае. З бацькам Гопка адразу сышоўся, можа, нават пасябраваў. Між імі склаліся нейкія паблажлівыя таварыскія адносіны. У жарт яны пачалі гаварыць адзін аднаму «сват». Іншы раз новы старшыня заглядваў да нас і ў хату. Здаралася, мы снедалі: на стале дымілася параная бульба, поўны капец, як у нас гаварылі; у місе апетытна жаўцеліся агуркі. Часам госцяй на стале з'яўлялася і патэльня — свайго сала мы не мелі, маці прыносіла які брус сала ад радні, з Біруляў, дзе жылі мае дзед і бабуля, даволі заможныя людзі.

Гопка як бы незнарок заводзіў гутарку пра тое, што хаціла б ужо такім, як Іван, канючыцца, трэба гарнуцца да калгаса. Вясною, намякалі яшчэ, не паглядзяць на тое, што данбасавец, а скідкі ніякай не атрымае — зямля будзе адрэзана па вуглы, а для такіх аднаасобнікаў (іх асталася меншая палавіна вёскі) палосы адвядуць на Хамінцы, на пясчаных выдмах, дзе спрадвеку бадылле ніякае не расло, адзін чэзлы хвойнік сцелецца па ўзлобках...

Бацька ж бесклапотна сыпаў жартамі:

— Нам што? Нам, малярам, сем вёрст да нябёс!.. Згарыць адно сяло, паедзем у другое...

За такой бесклапотнасцю і напускной абыякавасцю хавалася яго душэўная трывога. Ён быў на раздарожжы; у Данбас ехаць зноў не выпадала, там спасцігла яго няўдача — у забоі яго неяк прысыпала пародай, і, адляжаўшы ў бальніцы каля паўгода, ён прыехаў з намерам, відаць, назаўсёды астацца дома, асесці на зямлі, на сваім надзеле.

Як потым я ўпэўніўся, калі крыху падрос і стаў разбірацца, што да чаго,— мой бацька быў чалавек настрою. У яго галаве заўсёды роіліся нейкія планы, яго цягнула некуды далёка, яму хутка ўсё надакучвала дома, і ён пачынаў гаварыць маці:

— Паеду. Не буду жыць тут. Як хочаш, а я больш не магу...

«Куды? Чаго?» — каб хто спытаў, ён і сам не адказаў бы. Перад гэтым вунь два гады збіраў грошы, не піў, «скеснічаў», як сам казаў, бо наважыў купіць гэтую самую машыну, якую потым, праз некаторы час, сваімі ж рукамі раскідаў і, кінуўшы ў закутак, паехаў па старым маршруце.

Вярнуўшыся, ён, мне здаецца, сур'ёзна не задумаўся над тым, як жыць далей. З кім яму: з тымі, што не прызналі яго за сталага чалавека і гаспадара, а цяпер прытвараюцца, што маюць у ім роўню, ці з тымі, хто адразу рушыў насустрач новаму. Нашы ж суседзі мелі, канечне, большы парадак і большы дастатак дома. Ім цяжэй, мусіць, было расставацца са сваім набыткам — у іх і лепшыя будынкі, і спраўнейшыя коні, і пагляднейшы інвентар. У нас жа, шчыра прызнацца, і здаваць калгасу не дужа было чаго: адно гуменца, што перад гэтым сяк-так агаралі, ды канюка, якую, як надыдзе вясна, падымалі на вожках.

А бацька ўсё мянтрэжыўся, упарціўся.

Настала вясна — векапомная вясна ў Бацькавічах. За вёскай — яравыя пасевы калгасныя, поле роўнае, уробленае, а там, за курганнем, адвялі ўчасткі для аднаасобнікаў. Яны вадзілі туды на повадзе сваіх цялушак, тралявалі гной на тыя свае палоскі.

Тым часам пачалася паласа новых сходаў. У Бацькавічах на ўсе лады загаварылі пра суцэльную калектывізацыю. Гопка, як і раней, заходзіў да нас: сустракаўся з бацькам, але ўжо чамусьці пра калгас гутарку не заводзіў — старшыні, відаць, надакучыла бацькава ўпартасць, і ён пусціўся на хітры ход: няхай той сам, сваім одумам усё рашае.

Мяне ўсё часцей цягнула ў дом, дзе жыў старшыня.

Яго самога дома ніколі не было. Уранні, на досвітку, пабяжыць і ўвесь дзень недзе прападае, не прыходзіў нават і на абед. Работы яму хапала — і ў канторы, і ў брыгадах, і яшчэ трэба было паспець на сходы, што адбываліся ў сельсавеце і ў раёне.

Гаспадыня часта хварэла, і дзеці іх былі самі сабе. Мы пасябравалі з Кацяй — дачкой старшыні; вучыліся ў адным класе, толькі я хадзіў у сямігодку ў Ігліцу, а яна ў Горкі. Разам часта рыхтавалі ўрокі. Усё часцей і часцей я наведваўся ў дом да Гопкаў — відаць, не толькі таму, што іх кватэра была недалёка, цераз дарогу, у былой школе. Нейкая неадольная сіла цягнула мяне туды, да заўсёды вясёлай Каці, маёй равесніцы. З ёю мне было прыемна і хораша, і я ўсё больш адчуваў неабходнасць бачыць яе, гаварыць з ёю...

Мы разам чыталі кніжкі. Рашалі задачкі. Рабілі хатнія заданні. Каці цяжка давалася мова — яна рабіла памылкі, і мы пісалі дыктанты, якія я падбіраў ёй з граматыкі ці якой-небудзь кніжкі.

Неяк мы сядзелі адны. Хлопцы, меншыя яе браты, забавіліся на вуліцы, і Каціна маці недзе засядзелася ў суседзяў. Мы пра нешта размаўлялі. Памятаю, Каця расказвала пра свой гарадок на Крыварожжы, пра кавуны, якіх я ніколі не бачыў і ў вочы. Потым яна ўрупілася ў кніжку, а я пачаў нешта крэмзаць на чыстым аркушы. У мяне была нейкая благая звычка: дзе б я ні сядзеў, чым бы ні займаўся — пападзіся мне пад руку аловак ці ручка, а тым больш з добрым пяром, я пісаў і пісаў, забыўшыся пра ўсё на свеце. І кніжкі ў мяне стракацелі подпісамі і надпісамі. Яшчэ я любіў распісвацца. Нат цяпер саромлюся гэтай звычкі, як прыгадаю. Любіў я пісаць крэйдай на дошцы, пальцам на запацелым акне, цвікамі на асінавых зашарэлых сценах. Неяк, калі яшчэ вучыўся ў трэцім класе, ад гэтай звычкі мяне адвучыў настаўнік Адам Паўлавіч, які застаў мяне за гэтым благім заняткам. Праўда, я не пісаў благіх слоў, як рабілі некаторыя хлопцы, нават большыя за мяне. Я пісаў звычайнае «Міша + Маша = любоў», але Адам Паўлавіч захапіў мяне на першым слове і сказаў толькі адно:

— Эх, Алёша, ад каго, але ад цябе такога не чакаў...

І пайшоў сваёю дарогай, нават не зірнуўшы ў мой бок. Больш на сценах, здаецца, я не крэмзаў.

Усё ж прага пісаць, бачыць, як кладуцца літары адна да адной, як выстройваюцца радкі напісанага, мяне не па-

кідала. Асабліва не мог я раўнадушна прайсці, калі пад руку трапляўся кавалак чыстых шпалераў. Яны тады былі ў модзе — на іх пісалі, малявалі лозунгі. Між іншым, у школе яшчэ з першых класаў не абыходзілася без мяне, калі набліжалася якое рэвалюцыйнае свята. Я ахвотна пасля заняткаў аж да ночы мог прасядзець, мудруючы над тым, як лепш размясціць літары, якія зрабіць адценні, каб атрымаўся арыгінальны прыгожы лозунг. Лозунгі рабіліся на шпалерах. Мелаваны бок шпалераў вельмі зручны для пісання простым ці хімічным алоўкам. Літары клаліся як бы самі, выходзілі прыгожыя, рука лёгка хадзіла па шурпатай паперы.

Калі Гопка прывозіў з раёна сшыткі, блакноты, іншы раз і мне перападалі адзін-два сшыткі ці які блакноцік — Рыгор Іванавіч дарыў мне як суседу ці, можа, за тое, што я памагаў Каці рыхтавацца па мове.

На стале спакусліва ляжаў чысты лісток лашчонай паперы ў клетачку. Ручка ў мяне была металічная з любімым пяром — «школьнае» № 86. Каця забавілася з кніжкай, а я пачаў практыкавацца. Мне чамусьці адразу прыйшлі ў галаву першыя словы. Не задумваючыся, я напісаў:

«У праўленне калгаса «Ударнік № 3» (так скарочана ў нас пісалі доўгую назву нашага калгаса — «Ударнік 3-га года пяцігодкі»)

ад грамадзяніна Баянка Івана Панасавіча

З а я в а...»

Крыху падумаўшы, адразу склаў тэкст:

«Прашу прыняць мяне ў калгас з усёй сям'ёй і маёмасцю. Абавязуюся строга выконваць Статут сельгасарцелі».

Тут жа, ніжэй, як нас вучылі на ўроках мовы, паставіў подпіс заявіцеля і дату.

Свой твор адразу ж паказаў Каці. Тая прачытала і моўчкі сунула ў шуфлядку стала. Пры гэтым сур'ёзна, як дарослая, сказала:

— Правільна, Алёша. Даўно варта было...

І паабяцала, што аддасць бацьку. Вядома, не майму, а свайму, гэта значыць — старшыні. Я не на жарт спалохаўся, пачаў і так і гэтак прасіць Кацю, каб аддала назад гэтую паперку, але яна, усміхнуўшыся лагодна, сказала:

— Дзівак, не бойся!..

Я, сумны і разгублены, пацягнуўся дадому. У той жа вечар адбыўся чарговы сход з вядомым ужо парадкам дня, і мой бацька стаяў як ашаломлены, калі Гопка прачытаў перад усімі людзьмі гэтую заяву. Яму нічога не аставала-

ся рабіць. Дома ён, яшчэ злосны, разбудзіў мяне з пасцелі і спытаў:

— Скажы чэсна, твая работа? Не бойся, біць не буду...

Я прызнаўся.

— От чорт, шалапут етый,— з напускной злосцю прагаварыў ён у мой бок, а потым прысеў да стала і да маці: — Давай, Улляна, вячэру...

Я цішком зашыўся над посцілку, баючыся паварухнуцца. І недзе ў глыбіні душы адчуў, што бацька задаволены тым, як уся гэта цяганіна з уступленнем у калгас для яго вырашылася нібы сама сабой.

Маці пачала мяне абараняць, ды бацька толькі моўчкі махнуў рукою. Ён, ведаеце, ніяк не мог надзівіцца ў душы з майго такога выбрыку. Пабурчаўшы крыху, ён супакоіўся і больш мне нічога пра гэта не ўспамінаў. Аказалася — у яго як гара звалілася з плеч. Ён як бы выпрастаўся і памаладзеў.

5

Каваля, па прозвішчы Мароз, нанялі аж з Чырвонай Гары — суседняга раённага гарадка. Мы яго называлі дзед Мароз. Васачэзны, аж пад столь, ссутулены, з вялізнымі, бы клешчы, чорнымі кулакамі, з сівой ускудлачанай барадою, стары каваль, бы кропелькі пазбіраў, нагадваў Дзеда-Мароза, якога малявалі ў дзіцячых кніжках.

Каваль астаўся на кватэры ў нас — яго прывёз з Чырвонай Гары бацька і пайшоў разам з ім на працу. Бацька падмеўся быць за памочніка ў старога каваля — малатабойцам.

Бацька загарэўся новай ідэяй — стаць кавалём. Мусіць, ён не толькі не супярэчыў, а нават сам падаў думку, каб кузню паставілі на нашай сядзібе, якраз людное месца, пры вуліцы. Разам з мужчынамі-плотнікамі збіраў зруб, накрываў кузню дранкай, здабываў кавальскае начынне і цяпер апытаў і прывёз каваля.

Час тады быў нялёгкі. У вёсцы многія сем'і нават галадалі. З вясны перабіваліся праснакамі з гнілой бульбы, сабранай на бульбянішчы. Як толькі пачала набірацца зеляніна, збіралі шчаўе на лужках, рэзалі ля платоў маладую крапіву — усё зяленіва ішло ў страву. Хлеб быў гасцінцам.

А наш дзед Мароз прыехаў у Бацькавічы з сундучком,

а ў гэтым сундучку на дне ляжаў вялікі, з рэшата, падсмажаны, як пераспелы каштан, бохан. Каваль сталаваўся асобна. Маці яму варыла капусту, булён, кіпяціла малако. Абедаў каваль звычайна адзін, асабняком, а мы — сваёй сям'ёю.

Маці наліла дзеду ў паліваную міску гарачай капусты, на талерку выцягла ладны кавалак ялавічыны — для каваля калгас выдаваў мяса. Дзед спачатку мые рукі, затым сядае да таго запаветнага сундучка, доўга бразгоча ключыкам, адчыняе замочак, дастае свой бохан, адразае ладную скібку і сундучок зноў замыкае. Сёрбае наварыстую капусту, апякаючыся, крэкча ад здавальнення, смакуючы пахучы, крыху ачарсцвелы хлеб — такога, здаецца, у нас ніколі не было, на нашым стале. Яшчэ на дне асталася капуста, а скіба ўжо знікла, дзед не заўважыў, як з'еў яе.

Адвярнуўшыся знарок тварам да акна, я глытаю слінкі і раблю выгляд, што чытаю. На самай справе мне было не да чытання, бо пах хлеба, своеасаблівы ап'яняючы пах, густы і духмяны, які ідзе толькі ад жытнёвага, спечанага ў сялянскай печы хлеба, не даваў мне спакою, кружыў галаву, пераварочваючы ўсё ўсярэдзіне. Маці, відаць, заўважыла гэта і старалася як-небудзь выбавіць мяне. Разпораз яна прыдумвала для мяне новае даручэнне.

— Алёшка, бяжы хутчэй — куры на градах! — казала яна тонам загаду.

— Чую. Зараз,— згаджаюся я, а сам сяджу як прыкуты. Нават не кратаюся з месца.

Мне ўсё мроіўся каштанавы бохан, ачароўваў мяне, як чараўнік, хмяліў, бы якое пітво. Я стараўся не глядзець на дзеда Мароза, але адчуваў кожны ягоны рух за сталом. Чую, як дзед тукнуў драўлянай круглай лыжкай, як з крэктам падняўся з-за стала і хутка забразгаў замочкам — яму не хапіла тае лусты, і ён пачаў адмыкаць акуты жалезнымі абручамі сундучок. Дзед кактаў, а замочак не даваўся, ключ даваў пустыя абароты; доўга корпаўся дзед ля сундучка, аж раса на лбе выступіла, аж зазлаваўся і прагаварыў грозна і буркліва:

— От кэб на цябе халера!..

Нарэшце замочак здаўся, і новая скіба ў яго пад рукамі. Дзед усё абедае. Неўзаметку і новая скіба знікае, а яшчэ ж мяса асталося. Яго ж, ведама, не будзеш есці адно, без хлеба. Сундучок на замку і стаіць на сваім ранейшым месцы — пад лаваю. Дзед нездаволена хмурыцца,

чмыхае, крэкча грамчэй, як звычайна, нешта буркоча сабе ў сівую бараду — яму, напэўна, ніякавата ў трэці раз брацца за той капрызлівы замочак, а можа, нават шкада хлеба — бохан, як мне вядома, браўся на тыдзень, з панядзелка да суботы, у суботу бацька запрагаў каня, і дзед выбіраўся дадому, у сваю далёкую Чырвоную Гару.

Прайшло колькі хвілін. Я чую, як зноў неахвотна забразгацеў замочак, і той жа, такі спакуслівы хлебны пах ударыў мне ў нос. Як праз сон я пачуў ужо грознае, зусім новым голасам:

— Каму я казала? — крычыць маці і хапаецца за трапкач.— Там куры на агародзе ўсё перавярнулі. А ты сядзіш тут, вісус!

У голасе я ўлавіў намёк на тое, што, маўляў, не спадзявайся на дзедаву ласку, бо хоць бы ён і даў які кавалачак, то не мне ён належыць — ёсць меншая трохгадовая Таня, якой якраз той кавалачак больш патрэбен — яна ж дзіця зусім...

Ды дзед Мароз ужо хлебча з конаўкі ваду, выцірае бараду і глядзіць, ладкуецца, дзе б гэта аблюбаваць месца на шырокім палку — «каб жырок вакол пупа завязаўся».

Я зрываюся з месца, бягу да парога, але мне насустрач ідзе бацька — такі ж высокі і даўгалыгі, з моцнымі жылістымі рукамі, у расхрыстанай выцвілай сарочцы навыпуск, на плячах і жываце ўся яна зрашэчана, як бы ўсё адно дробам, пырскамі распаленага жалеза. Пакуль стары каваль абедаў, бацька паспеў добра памэнчыцца ля накавальні. Я ўжо гэта ведаў — ён стараўся хутчэй пераняць сёе-тое ад каваля, спяшаўся хутчэй узяцца за кавальскія абцугі сам. Гопка цвёрда сказаў: «Ты ж, сват, мух ротам не лаві, а падвучвайся. Сам ведаеш, мы не можам доўга дзяржаць таго дзіда: ён за год пусціць нас па світу, увесь хліб таго...»

Кожную вольную хвіліну бацька лавіў, стараючыся як найхутчэй асвоіць кавальскае рамяство. Праўда, дзед Мароз не хаваў ад яго сакрэтаў, вучыў, як бацька казаў, «на совісць». За якія месяцы два ён налаўчыўся так, што і нарогі пачаў правіць, і бароны наводзіў як мае быць, і нават сякеру ўжо ўмеў загартаваць ці матыку направіць...

— Куды ты, Алёшка? — аддаецца ў вушах мне бацькаў голас.— Во січас будзем абедаць...

Я спыняюся, і маці як бы нічога мне і не загадвала — маўчыць. Дастае з печы гаршчок з капустай, без мяса — малатабойцу ялавічыны тады яшчэ не давалі, як старому

кавалю. Бацька дастае з судніка на стол пульхныя праснакі, загорнутыя ў ручнік, каб не ачарсцвелі, і мы сям'ёю садзімся за стол.

Бацька мой уяда-жартаўнік. Калі ў нас цяжка з наедкам і на стале — звычайна нішчымная бульба ці рэдзенькая заціркa-поліўка, а замест хлеба — адны праснакі, ён, як толькі паўсядземся, усчынае гаворку пра розныя смачныя стравы.

— Алёшка, хочаш яечні? — пачынае ён, абмакнуўшы цёплую бульбіну ў тоўчаную канапляную муку.

— Хачу,— нічога не падазраючы, адказваю я.

— А скварак з блінамі?

— З'еў бы...

— Якія ты болей любіш бліны: грэцкія ці пшанічныя?..

— Усякія,— адказваю я ўжо злосна, адчуваючы нейкі падвох.

— А са смятанай?..

— І са смятанай,— кажу я, і ў мяне з вачэй па гарошыне закапалі слёзы. Паклаўшы лыжку, я, надзьмуты і абражаны, сунуся ад стала.

А бацька, як ні ў чым не бывала, сёрбае капусту, апетытна заядае цеплаватымі праснакамі, і на яго твары ні цяню суму. Толькі калі маці пачынае яго ўшчуваць за такое блазенства, за несур'ёзнасць, ён хітра жмурыцца, кладзе мне на плячо цяжкую, прапахлую жалезам руку і гаворыць:

— Што ты як сыч надзьмуўся? Дурань, еш ідзі... Ета ж я так, штоб табе смачней елася...

...Касьба. Памятаю, як яшчэ да калгаса ў Бацькавічах мужчыны хадзілі на сенажаць. За дні два-тры то там, то тут надвячоркам чулася вясёлае перастукванне малаткоў — касцы кляпалі косы, і ў трапяткой, напоенай летнімі пахамі вячэрняй цішы плаваў перазвон кос.

Яшчэ зацемна, досвіткам — колькі там тае чэрвеньскай ночы, зара з зарою пераклікаецца, нібы тыя косы,— адзін за адным выходзяць з двароў касцы, яшчэ сонныя, пацепваюцца ад халадку спрасоння. Спаважнымі крокамі, як бы неахвотна і ляніва, кіруюцца за аселіцу.

Перш-наперш касьба зачыналася за вёскай, ля сажалак, дзе лугі цямнеліся адразу ж за гародамі. Кожны двор меў шнур лугу на сталым месцы, і заўсёды касьба пачыналася з адводу межаў. Збіраліся ўсёй грамадою, «вобчаствам», з вешкамі: сусед з суседам браліся за адвод мя-

жы, утырквалі на адным краі вяху з вехцем травы, каб вока здалёку бачыла яе, тады з другога краю ставілі другую такую вяху, і адзін з мужчын чарціў нагою след, а другі за ім касою прарэзваў вузенькую сцежачку. Затым правяралі, удакладняючы, ці не загнуў хто ў чужое, і браліся за косы. Ніхто не хацеў спазніцца — кожны стараўся выйсці на сенажаць у грамадзе, не астацца ззаду.

Здаецца, межы адводзіліся надта ўжо прама, як пад шнур, а глядзі — ужо сусед залез у тваё, асабліва нізінкаю, дзе мятліца і дзяцельнік густы, сакаўны,— там каса нібы сама жыкае і хапае траву як шалёная.

Стаўшы ў рад, ідуць касцы. Нібы выхваляючыся адна перад другой, жыкаюць косы, аж захліпаюцца ад прагнасці — на поўны захват бяруць, і трава адчайна, паслухмяна кладзецца ў пракосы. Сонца ўжо непрыкметна чырвоным колам выкацілася з-за недалёкага ляска, і востра, аж цяжка дыхаць, запахлі кветкі.

Касцы, забыўшыся, ідуць усё далей і далей. Не чуюць, як свінцом напаўняюцца і млеюць рукі, як дубянее спіна. Далёка, па ўсім лузе чуецца: «Жмык-жах. Жжжык-шшах...»

Нехта спыніўся, абмоквае ў гарлачык з вадою мянташку, пройдзецца па жале касы, ускіне галаву, ці далёка сусед, а той ужо крокаў на пяць адарваўся — паласа пайшла крыху ўзгорачкам, і трава не такая густая, як нізінкай, дзе больш вільгаці і гусцейшы травастой, аж касаўё гнецца, калі заводзіш узмах касою; ён змахне едкі пот з твару, перадыхне і бярэ шырэйшы захват і нічога не чуе вакол, толькі адно ў вушах: «Жжык-шшах... Жжык-шшах...»

Тады ж адзін перад адным людзі спяшаюцца і згрэбці сена, ды так, каб наперад суседа,— ужо той, хто згрэбае сена апошнім, не праміне спрактыкаваным вокам угледзець: там ухоплена крыху, тут загрэбена, і палоса ўсё адно як пляшывая. Што зробіш. Скажы, то доўга будзе гневацца сусед, глядзець на цябе крыва. Не злавіў — не кажы, што ўкраў.

Мне засела ў памяці касавіца ў першыя гады калгаса ў Бацькавічах, калі старшыняваў той жа Грыцко Гопка.

Незабыўнае было відовішча. Надвячоркам загаманіла вёска: у дварах пераклікаліся малаткі, перазвоньваліся косы. Нарад атрымалі ўсе мужчыны — усе, хто ўмеў трымаць касу. Загад не мінуў ні старшыні, ні брыгадзіраў, ні

вартаўнікоў, ні конюхаў. На сенажаць выходзілі, як па трывозе, як на талаку.

У кузні аставаўся стары каваль, а бацька ўвечары, яшчэ завідна, накляпаў касу, прыладзіў да касаўя, у торбачку склаў усё, што спатрэбіцца на лузе,— мянташку, бабку, малаток.

Прыцемкам на двор заскочыў старшыня. З касою пад пахаю, задыханы — спяшаўся.

— Сват, адбі і мэні зброю!..

— Рыгор Іванавіч, такжа на луг? — пацікавіўся бацька, як бы крыху здзівіўшыся.

— Я шо, хіба не людына! — пакрыўдзіўся старшыня.— Як усім, так і бісаву сыну...

— І то праўда,— згадзіўся бацька і таксама пажартаваў: — Старшыні касу трэба навесці, каб сама касіла...

— Оцэ, бісаў сват, хай тэбэ камар забадае,— не астаўся ў даўгу старшыня.

Уранку — яшчэ плаваў на загуменні туман — рушылі па вуліцы касцы. Міма нашай хаты прайшла цэлая грамада — мужчыны ўсяго канца. Брыгадзір Якаў Кавалік спыніўся, гукнуў на ўвесь голас:

— Гэй, Іван Панасавіч, скора?

— Іду, іду! — з панадворка адказаў бацька і ўмомант апынуўся ў гурце, ужо здароўкаўся з мужчынамі.

Бы з рэшата, сыпаліся жарты, вясёлыя воклічы. Мужчыны ішлі на закоскі, як на вяселле. Закоскі ў Бацькавічах цяпер аздабляліся і добрай чаркай, і вясёлай, хмельнай пагулянкай — з песнямі, пачастункамі.

Як змовіўшыся, мужчыны з непрыхаваным чаканнем пазіралі на Якава Каваліка — чакалі, што скажа брыгадзір. Чыста паголены, у белай вышыванай касаваротцы, падпаясаны салдацкай папругай, у крамных штанах навыпуск, у чаравіках (звычайна ж Якаў Іванавіч насіў лыкавыя лапці; заўсёды зграбна, можна сказаць, лепш за ўсіх бацькавіцкіх мужчын Кавалік умеў абувацца — так абгорне нагу белай кужалёвай анучаю, што люба паглядзець). Сёння і шапачка-блінок на галаве брыгадзіра сядзіць неяк фарсіста — набакір, і з-пад брыля прыгожа, зухавата выглядае пасмачка цёмных валасоў.

Брыгадзір ведаў, чаму паглядаюць у яго бок касцы, але як бы не здагадваўся, маўчаў, схаваўшы ўсмешку ў карых вачах.

Маўчалі і мужчыны, не жадаючы быць да часу цікаўнымі,— яны, мабыць, ведалі ўжо, што брыгадзір нешта на-

думаў. Была ж на тое згода праўлення. На закоскі асвежавалі кабанчыка, змалолі пшанічнай мукі.

— Адкуль зачнём? — звярнуўся да грамады рослы, самы доўгі з мужчын Васіль Шылай, калі ўсе спыніліся.

— Можа, ад гародаў, як вы, мужчыны? — азваўся брыгадзір, адчуваючы, што звяртаюцца касцы менавіта да яго.— Тут цьма-гусцеча. Пакуль не ўгрэла сонца, пашчыруем. З расічкаю!

— А я думаю — трэба ад Мікольска! — выгукнуў дзядзька Раман, можа, старэйшы між касцоў, шчуплы, вельмі рухавы чалавек з рэдкай попельнай бародкай, азірнуўшыся вакол, падшмаргнуў нагавіцы і дадаў: — Ты, Іванавіч, не ўлічыў, што з расою курганне етае пойдзе лягчэй, а ўгрэе сонца — мы і да нізінкі дабяромся, у нізінцы раса патрымаецца даўжэй. Што, ухнем!..

Мужчыны рушылі на пагорак: луг увесь як дыміўся параю, у кустах кудзеліўся туман, белы спадыспаду, палосамі — на дзень мелася гарачыня. Травы соладка драмалі, не патрывожаныя касою.

Паскідаўшы жакеткі і верхнія сарочкі, касцы рассыпаліся па лузе. З краю зачаў пракос вядомы на ўсім канцы асілак Васіль Шылай, чарнявы, з буйным, прыгожым тварам, яшчэ не жанаты, ды ўжо ў гадах дзяцюк. У плячо сталі брыгадзір Якаў Кавалік, Карп Кузьміч (і яго пазней прынялі ў калгас), побач бацька, Андрэй Кавалік, Паўлюк і Харытон Півоні, Раман Говар, Паўлюк Сямёнаў, Цімох Бручвянок, Аўхім і Амяллян Цярэшкі, Антон Кіпень. Шарэнгу касцоў замыкалі старыя — Дзямід Півоня, Агей Дваян і Трахім Мікіцёнак — яны сталі ў край шарэнгі: як развінуцца, разгарачацца мужчыны, не стрымаць старым націску, не ўгнацца за маладымі, а стаяць наперадзе рызыкоўна — на пяткі націскаюць...

Ужо ў іншых калгасах была індывідуальная здзельшчына, газеты паведамлялі пра такіх шчырцоў, называлі такіх ударнікамі, яны ставілі рэкорды — больш за ўсіх маглі ўзараць на полі, скасіць лугу на сенажаці і г. д. Між іншым, свае ўдарнікі былі ўжо і ў Бацькавічах.

Першы дзень касьбы — закоскі. Касцы сталі гуртам, арцеллю. Нейкае новае пачуццё авалодала імі — людзьмі, якія дагэтуль былі ўсяго што суседзямі; не раз даводзілася ім спрачацца і затым мірыцца праз гэтыя межы, прарэзаныя, мусіць, яшчэ прапрадзедамі,— горкасць крыўды і помслівасць перадаваліся ад пакалення да пакалення.

Наша палоса межавала з лугам Якава, цяперашняга

брыгадзіра. Бацька сябраваў з Кавалікамі — жылі згодна як суседзі. Аднак жа, бывала, пакуль бацька раскатурхаецца ды збярэцца на луг, то ўжо Кавалічыха, цётка Лукер'я, вяртаецца з сенажаці, вясёлая, у белым-белым, з фарсістымі пеўнікамі фартушку і ў гарусавай квяцістай хустцы, сціпла і шчыра вітаецца:

— А, Панасавіч, бог на помач!..

Што ж, Панасавічу, як бачыш, нічога не астаецца — адно і ёй у тон: «Спасібачка, Васілеўна». А на душы прыкрасць: увішны сусед даўно скасіў свой лужок, а суседка ўжо і сянцо падварушыла. Вядома, сусед не нахабнік, не зачапіў надта чужога, але мяжа лягла ў яго пракос.

А тут раздолле. Раскоша. На людзях можна паказаць, на што ты здатны, і не трэба хвалявацца за нейкі там хунт сена, за тое, што цябе нехта абагнаў, абкасіў. Бацька крочыць нага ў нагу з Якавам-брыгадзірам. Яны перакінуцца словам, жартам, памянташаць косы, і спее цішыня, нічога не чутно, адно што рыпае кассё ў жылістых руках, як не захліпаецца ад націску каса; трава шчыльненька, пад посвіст касы кладзецца ў пракос; зрэзаныя, яшчэ доўга цвітуць у пракосах яркія кветкі, над лугам ценяпька звіняць руплівыя пчолы, гуллівыя стракозы.

— Глянь, Іванавіч! — крычыць раптам бацька пад вуха брыгадзіру. — Вунь ля амбара, хто ета там?..

— Бач ты,— брыгадзір выпростваецца, прыкладвае да вачэй далонь.— І каса на плячы... Хто б ета такей. Здаецца ж, мужчыны нашы ўсе тутацька...

— Хто? Ай, не бачыш,— гаворыць бацька, не перастаючы касіць.— Грыцко наш...

— Цэ гарно! — падладжваючыся пад голас старшыні, заўважае брыгадзір і дадае жартам: — Вось дасць пылукопаці!

— З ім, брат, не жартачкі,— устаўляе бацька.— Цягавіты чарцяка. Як за што возьмецца, то ўжо не адступіцца. Я калі ў Крывым Розе працаваў, то неаднойчы бачыў, як украінскія хлопцы з нашымі дужаліся. Пад нізам каторы з іх апынецца, не кажы яшчэ, што твая ўзяла: як вывернецца, пальцы ў рот не кладзі — умомант адхваця!..

— Давай яго наперад паставім,— прапануе Кавалік.— Няхай трохі папацее!..

— Ты што, можа, забыў ужо? Помніш, як летась Гопка даказаў сваё,— раптам сумеўся бацька,— калі што якое, не пакрыўдзім. Чалавек жа, можна сказаць, свой ужо!..

Тым часам на луг спяшаўся ў сваёй шапцы-стаўбуне

старшыня. Каса, як належыць сапраўднаму касцу, на плячы. На другой руцэ пінжак: відаць, старшыня добра ўжо ўгрэўся. Раман Говар, згледзеўшы старшыню, крыкнуў смеючыся:

— Гопка сюды шпарыць. Мужчыны, беражыцеся!..

— Не дужа лыбся, бо табе ж і дасць прачуханца,— упікнуў Харытон Півоня.

Раман, на шчасце, гэтых слоў не пачуў, бо тады б успыхнула, як агонь на ветры, сварка, разгарэлася б на ўсё забалоцце. Раман, гарачлівы і задзірысты, мог адзін перакрычаць цэлую грамаду. Добрай душы чалавек, ён усюды і заўсёды, абы хто яго зачапіў, з усімі імгненна ўступаў у спрэчку. У яго заўсёды была свая думка, свой погляд на рэчы. Калі, скажам, гаворыць той жа Карп Кузьміч — а ён умеў пагаварыць разважліва і талкова, па дробязях у спрэчку не кідаўся, не любіў пустамельства,— то ўжо выдасць нешта важкае і ўраз чалавека пераканае, што той не зможа не пагадзіцца з ім. Усе слухаюць і згодна ківаюць галовамі, хоць мо хто ў душы і не згодзен з ягонай думкай, але чамусьці маўчыць ды яшчэ і падтаквае. Раман жа адразу, чыста задзірысты певень, не задумваючыся, рынецца ў бойку. Кузьміч сцепанецца, пачынае божкацца, прыклаўшы руку да грудзей, ды Раман уз'ярыцца ўжо не на жарт, абарве адразу таго, і ўсё:

— Круцель ты, Кузьміч, крутнёю жывеш!..

І, сплюнуўшы, шусне ад яго.

Хата Рамана глядзела вокнамі на Кузьмічоў, самы вялікі ў Бацькавічах сад, іх аддзяляла шырокая вуліца, па якой праходзіў шлях. Сад быў абнесены такой агароджай, што і курыцы не праціснуцца, але здаралася — кураняты, адолеўшы дарогу, забіраліся ў сад, на грады і на лужок, што зелянеўся за густымі ясенямі. Кузьміч калі быў у садзе, то звычайна ціха падказваў ваўкадаву: «Жук, бяры!» — і ад той квактухі з куранятамі аставалася толькі адно пер'е.

Аднак усё гэта вельмі хутка забывалася, і суседзі здароўкаліся, як і раней, жылі дружна, хоць Раман ніколі не змоўчыць і не саступіць Кузьмічу, калі што не па яго. Рамана іншы раз называлі Гамарнікам, ён ганарыўся гэтым, бо, як і Гамарнік — чырвоны камандзір — служыў у Чырвонай гвардыі.

Харытон Півоня даводзіўся раднёю Кузьмічу (між іншым, усе Півоні ў Бацькавічах звязаны сваяцтвам, хаця між імі ўзнікалі і сваркі, і нават бойкі). Людзі ведалі іх,

яны жылі па звычцы: «Свае б'юцца, чужы не лезь». Харытон мог бы сказаць моцна, каб пачуў Раман, але ўбачыў, што сюды ідзе старшыня і неразумна зачынаць спрэчку з Раманам-крыкуном.

А Гопка ўжо шыбаваў па лузе. Скінуў сваю шапку-стаўбун. Расперазаўся, павітаўся з мужыкамі. Смуглявы, амаль што чорны ад першага вясновага сонца, Гопка вылучаўся ад бацькавіцкіх мужчын — амаль двухметровага росту, шырокі ў плячах, з бліскучымі чорнымі валасамі, у якіх настойліва прабівалася сівізна, ён з твару быў маладзей за свае сорак гадоў. Мужчына ў самай сіле. Яго палюбілі ў Бацькавічах, нягледзячы на строгасць і нават жорсткасць — час быў, як вядома, такі, што нялёгка было ў іншым выпадку і не перагнуць; рабілася ўсё без вопыту, новыя сцежкі пракладваліся па цаліне. Старыя межы заворваліся часта і ўпоперак; важна было іншае — межы знікалі, і палеткі радавалі людзей, вызвалялі іх ад спрадвечнай цемры і галечы і цешылі шчаслівай радаснай надзеяй.

— Як вы тут, хлопцы, без мэнэ? — чуўся характэрны ўкраінскі басок Гопкі. Памянташыў касу, стаў у шарэнгу побач з брыгадзірам.

Мужчыны, што гналі пракосы недалёка, спыніліся, пачалі глядзець, як пойдзе ў старшыні каса. Яно і летась Гопка выходзіў у грамадзе на сенажаць, але тое ўжо забылася. Усіх цікавіла, як ён цяпер вытрымае: махне раздругі касою і, як робяць часам іншыя начальнікі такога рангу, уткне касу ў лугавіну: маўляў, бачыце, я ўмею, але мне няма часу — справы...

Адчуваючы на сабе цікаўныя позіркі, Гопка налёг на касаўё. Каса, добра наведзеная, лёгка ўпівалася ў траву — мужчыны якраз выбраліся з курганчыкаў і кустоў на роўнядзь, дзе трава густая і мяккая, як на ўзрэччы. Каса ў яго руках аж спявала, бы тая скрыпка ў добрага музыканта.

Брыгадзір і бацька пераглянуліся: нічога, добра траву рэжа старшыня!

Работа на лузе спорылася. Падахвочаныя старшынёй, касцы працавалі не ведаючы стомы, стараліся, шчыравалі: ніхто не хацеў паказацца няўмекам. А ў старшыні і ў самога ўжо добра ўпрэла і змакрэла чупрына. Але ён як бы не заўважаў вакол сябе нічога — адно толькі слухаў, як каса прагавіта рэжа траву ды ад натугі рыпіць касаўё.

Сонца яшчэ не высока. Яно неяк незаўважна выкацілася з-за лесу, адскочыла ад вяршынь і добра пячэ касцам у галовы і спіны. Як бы павісла над ліпамі Карпа Кузьміча. Васіль Шылай ужо скінуў рубашку і астаўся ў адной кужалёвай сарочцы, вышэй локцяў закасаў рукавы; параздзяваліся ўсе маладзейшыя, адно старыя спаважна махаюць косамі, не зважаючы, што мацнее гарачыня. Трэба б перакур, ды старыя маўчаць, не падае голасу брыгадзір. Моўчкі шчыруе і старшыня.

Якаў-брыгадзір, як здагадаўшыся, спыніўся, акінуў вокам скошаную плошчу, абцёрся крысом сподняй сарочкі, тады звярнуўся да бацькі, які таксама стаў і пачаў выціраць травою касу, намерваючыся яе навастрыць.

— Можа, адпачнём трохі? — падаў голас Якаў і паглядзеў на старшыню.— Іванавіч, яшчэ не замарыўся?..

— Оцэ, упрэў ужэ, друзі! — аддыхваючыся, сказаў старшыня.— Мабуць, трэба перакур...

Мужчыны сыходзіліся ў гурт. Хто як мог расселіся і палеглі на пракосах. Курцы закурылі. Нейкі час маўчалі, зацягваліся цэрпкім дымам самасаду і махоркі; нехта прынёс з кустоў біклагу з вадой; у цяні біклага з дубовых клёпак, прыкрытая мяккай травой, яшчэ не паспела ўгрэцца; ваду пілі нагбом, рассеўшыся на траве, перадавалі біклагу з рук у рукі і смачна кракталі, здаволеныя, выціралі далонямі ваду на тварах і на грудзях.

Адпачыўшы і ахалодаўшыся, касцы шумна загаманілі. Пасыпаліся жарты. Пачынаў звычайна хто-небудзь адзін, скажам, той жа Якаў Кавалік. Умеў Якаў, наш брыгадзір, каго-небудзь прабраць як мае быць, умеў і пажартаваць, але не злосна, а дасціпна, тактоўна. На гэты раз аб'ектам для жартаў стаў Трахім Мікіцёнак — шчупленькі, аброслы рэдкім шчаціннем пажылы чалавек, які і сам за словам у кішэню не лез, але з прычыны сваёй сарамлівасці, а можа, з прычыны стомы (ён не бог ведае які быў асілак!) ляжаў, разамлелы, уводдалі і маўчаў.

— Трахімка, раскажы што смешнае,— звяртаецца да яго Якаў Кавалік і хітра жмурыцца, як бы нешта ведаючы, але не хоча сказаць дачасна.

— Няхай старшыня раскажа,— адразу ж знайшоўся Трахім і, чмыхаючы носам, дадаў: — Мы ета будзем свае пупы надрываць тутака ўвесь век, як цяпер, ці што? Я чуў, што ў Германіі ўжо даўно касілкі ды конныя граблі... А мы ўсё як пры дзеду-шведу. А казалі — калгас...

Пачуўся рогат. Мабыць, больш ад таго, што ведалі Тра-

хімку. Ён, балака, ужо мо ў соты раз расказваў мужчынам, што вунь недзе там, у свеце, за сінімі марамі, людзі жывуць не так, як у нас, не надрываюцца дзень і ноч, а хлеба ўдосталь ядуць. Усе яго філасофскія расказы ўсур'ёз не прымаліся; людзі ведалі, што ў самога Трахімкі не завязалася і не склалася жыццё — зямлі было ўсяго паўнадзела, а сям'я вялікая, дзеткі дробныя, і ён ніяк не мог выцерабіцца з галечы, а там яшчэ надарылася бяда — згарэлі хата і ўсе будынкі. Каб не спагадаў цесць, то, можа, і таго не меў бы, што цяпер мае — хоць хатка ды сеначкі з пунькай. Як стаў калгас, Трахім з дзецьмі падмеўся пасвіць авечкі. Дочкі пагналі на поле статак, а Трахім разам з усімі згадзіўся на касьбу — на закоскі ў першы дзень, а там, вядома, і без яго абыдуцца.

— Пагадзі, Трахімка,— перахоплівае Якаў.— Што, не верыш у сілу пралетарыяту? Не верыш, што і ў нас касілкі і жняяркі пойдуць не горшыя, як у тых германцаў. Масква не адразу строілася...

— Чаму? Верую,— не здаецца Трахім і борзда, бы хлапчук, падхопліваецца, становіцца — рукі ў бокі.— Я ж не кажу, абы плявузгаць. А вось кагды тое будзе — хто мне адкажа, хто ёсць хазяін?..

— Пяць жняярак заказалі,— коратка ўстаўляе старшыня і таксама ўстае, выпростваецца на ўвесь свой магутны рост.— На жніве будзе нашым жанчынам палёгка. А на літо і касілкі і граблі купім. Яснэ дзіло?..

Трахім, пашкрэбваючы патыліцу, клыпае на сваё месца, а старшыня прыпадае да біклагі. Доўга п'е, пырскаючы вадою, затым весела акідвае позіркам грамаду:

— Ну што, друзі, па конях!..

— Так. Пачнем, а то сонца вунь аж на гару ўжо забралася...

Мужчыны разбіраюць косы. Чуцён шоргат мянташак. Умомант увішна выстройваюцца, становяцца ў рад. Ад узмахаў, як ад ветру, пакалыхваюцца травы, кладуцца пракосы. Сонца ўсміхаецца ў красках.

А з вёскі ўсё мацней даносяцца галасы. Ужо відаць белыя хусткі. Узвілася адтуль, дзе хусткі, песня — голас усім знаёмы, над касцамі пранеслася:

— Васіліна. Праворніца дзяўчына!..

— А што, гром-дзеўка! — азваўся Раман Говар і, не зважаючы, што яго мала хто слухае, затараторыў: — Ета, бывалачы, у даўніну, яшчэ я быў падшыванцам, хадзілі мы рабіць у двор. Зграбалі сена. Не песні мы тады пелі,

а слязьмі абліваліся. Век не забуду, як па спіне мяне грабільнам выцяў наглядчык, падла!..

— Можа, любілі пад кустамі насядзець, то і грабільнам па спіне пападала,— з усмешкаю заўважыў Якаў і, каб не пакрыўдзіць, лагодна дадаў: — Такі чалавек, як вы, яшчэ з маленства маеце нянавісць да паноў...

— З маленства, а што б ты думаў?.. Успомні тое, як казакі праз Бацькавічы перліся ў маёнтак Стошы бунт уціхамірваць. Паласавалі, скажу табе, братка, усіх і нас, падлеткаў, не абмінулі. А ты кажаш, з маленства!..

— Раман, глянь, дзе ўжо сонца,— абазваўся Карп Піворя, ён увесь час, калі быў перакур, маўчаў, не ўступаючы надта ў размову (відаць, саромеўся старшыні ці наогул ад таго, што не даспадобы, вядома, яму было тое натхненне, з якім завіхаліся на арцельным лузе ўчарашнія галетнікі і беднякі). Раман так працяў позіркам суседа, што той адразу неяк сцішыўся і абмяк, разгублена азіраючыся па баках.

Прамаўчаў цяпер і Раман, стрымліваючыся, каб не раскрычацца, не паддацца сваёй гарачнасці. Вядома, не надта ён хацеў, каб такія, як Карп, прымаліся ў калгас, бо адчуваў нутром, што яны за прыяцелі беднякам, якія во атрымалі разгарненне і распараджаюцца ўсім, парадкі свае наводзяць, а яму — гаспадару — рот, лічы, заткнулі.

Яны яшчэ, напэўна, не раз схопяцца. І, вядома, вінаваты тут не адно ранейшае суседства і накопленыя за доўгі век узаемныя крыўды і няпрыязь. Проста яны, відаць, былі розныя людзі. Па духу. Па сваіх адносінах да новага жыцця, да тых парасткаў, якія настойліва прабіваліся праз дзірван старога і набіралі сілу, каб забуяць, расквітнець для працоўнага чалавека сваёй зямлі шчасцем.

Луг зазвінеў галасамі жанок і дзяўчат. Улучыўшы момант, як гоман трохі аціх, улёгся, Васіліна, прыклаўшы далонь да вуснаў, на ўсю моц закрычала:

— Абе-еее-ед!..

На тым баку Бацькавіч, аж над Ігліцай, рэха адгукнулася, загалёкала:

— Э-эге-ге-еее!..

Касцы выціралі з ілбоў пот, прыкрывалі косы травою, каб не адыходзіла сталь на сонцы, і нетаропка і асцярожна кіраваліся пакошаю на пагорак, дзе ўжо клапатлівыя рукі гаспадынь рассцілалі настольніцы, ставілі гладышы-спарышы са стравамі, ладнымі скібкамі кроілі хлеб, наразалі не скупячыся сала...

6

Напрадлецці канчаліся заняткі ў школе, і хлопцы, мае равеснікі, не сядзелі дома склаўшы рукі, не білі ў канікулы лынды: памагалі бацькам, займаліся карыснай працай, рабілі ўсё, што было па сіле.

Нам — Сцяпану Говару, Мішу Цярэшку, Сашку Кіпню — на кожны дзень давалі адзін і той жа нарад: скарадзіць пасевы бульбы. Пасля, як бульба адскочыла ад зямлі і пачала ўжо кусціцца, памагалі мужчынам абганяць бульбяныя рады. Мы вельмі ганарыліся і стараліся ўсё рабіць як найлепей.

Выязджалі на палетак рана. З усходам сонца. Самі ж бегалі ў табун па коней на выган ці на пакос, аж за Далёкае Балота.

Брыгадзір дзядзька Якаў звычайна наказваў, якога каму ўзяць каня.

— Алёшка, возьмеш заўтра ў пару Рыжага і Буланку,— сказаў брыгадзір яшчэ ўвечары.— Ды глядзі ж, хамут для Буланкі добры падбяры, штоб не намуляў плечы... Праверу!..

Сам ужо не маленькі, я добра ведаў, што калі возьмеш Буланку, то не трэба брыгадзіру зусім турбавацца — на поле можа прыйсці і сам Дзямід. Не згледзіш, як і адкуль ён з'явіцца, былы гаспадар жаробкі. Ужо колькі гадоў, як коней абагулілі, а ён сам водзіць на пашу сваю Буланку, поіць і наогул стараецца не выпусціць з рук. Гаспадары ўсе ўжо змірыліся з тым, што коні абагуленыя і цяпер кожны бярэ таго каня, якога скажа брыгадзір. А Дзямід — барадаты цецярук, як мы называлі яго за вочы,— не хацеў прызнаваць, што Буланка ўжо не ягоная, уласная, а належыць калгасу.

«Ну,— думаў я пра Дзяміда,— няхай толькі паткнецца, цецярук глухі. Дадзім яму прачуханца». Падумаў, а сам спахмурнеў — не хацелася мне запрагаць у пару да Рыжага — аднаго з двух маладых, адной масці коней, што здаў калгасу наш сусед Паўлюк Сямёнаў,— гэтую самую Дзямідаву Буланку. З тым Дзямідам толькі зачапіся — праходу не дасць.

Мы баранавалі трыма парамі. Першым Сашка Кіпень, даўганогі хлопец, можа, старэйшы за мяне на адзін год, такі, як і я, белагаловы, з выцвілымі непрычэсанымі валасамі, у майцы і саматканых нагавіцах. Побач трымаў-

ся я, а ля мяне — Аўхімава Адарка, круглатварая дзяўчына — не горш за нас, падлеткаў, правіць коньмі.

— Гэй, не драмліце, драмлюгі! — азіраючыся, крычаў на мяне і на Адарку Сашка, па мянушцы Ламей (ва ўсіх, як і ў Сашкі, абавязкова была якая-небудзь, ды яшчэ і не адна, мянушка), і сам, размахваючы пугаю, подбегам увіхаўся ля коней.— Не спіце, скора горача стане, тады — пад бярозы, у цянёк...

— Не крычы ты, Ламей дурны,— буркнула сабе пад нос Адарка, але ўсё ж пачынала варушыцца і сцябала лазінай коней, валюхалася хутчэй, чапляючы нагамі кусцікі бульбы.

— Гэй, давайце! — зноў я чую над вухам Сашкаў сіплы басок; мне бачна, як пылок курыць у Сашкі пад нагамі, як ляскаюць і звіняць бароны.

Мне ўвогуле падабалася, як Сашка завіхаўся ля коней, з ім добра было, але ягоная празмерная прага і заядласць, якімі ён заўсёды вылучаўся з нашай кампаніі, мяне раздражнялі. Мне не па душы было, як Сашка заўсёды выхваляўся, стараючыся мець перавагу над равеснікамі ў гульні, якія мы разам выдумлялі, а калі ў яго што не клеілася, то загараўся, злаваўся і кідаўся на кожнага з кулакамі. Сашка рабіўся чырвоны, як параны рак, соп і страшэнна лаяўся.

Надоечы з Сашкам мы пабіліся. І проста без дай прычыны. У мяне была крушынавая кавенька, яе я адштукаваў вясною, як мы гуртам бегалі ў недалёкі лес, Крывалессе, па сарочыя яйкі. Сашка падскочыў і пачаў ірваць з рук кавеньку:

— Дай мне!

— Ты мог бы і сам такую зрабіць...

Сашка выхапіў у мяне кавеньку і бягом наўцёкі. Я ўдагонку за ім. Уцякаючы, ён раптам спыніўся, хапіў кавенькай па калене, і яна хруснула, разламалася. Мы счапіліся загрудкі. Праўда, між намі магла, як кажуць, у любую хвіліну прабегчы чорная кошка, усё магло адразу сапсавацца.

Мы, занятыя кожны сваім, ішлі за коньмі, увесь час трымаючы вока, каб бароны бралі роўны захват.

— Да тых бярозак забараную, і шабаш! — паказвае Сашка і пугаўём паганяе на пагорак сваю парку, а сам аж сапе, увесь узмакрэў.

— Добра,— кажу я, блытаючыся ў лейцах, падхопліваюся і паганяю коней — стараюся не адстаць ад Сашкі.

— Ламей дурны, не бяжы ты ўжо так! — Адарка ўжо далёка адстала і засаплася.— Гоніш, як шалёны якей. Няхай пабача Дзямід, будзе вам. Зусім пад пенаю Буланка!..

— Падумаеш, Буланка! — мяне як хто ўкалоў знянацку.— Буланка не яго ўжо, саўсім цяпер калгасная!

Сашка пачуў усё, і яго раптоўна бы хто кіпнем абдаў, аж вочы вырачыў. Сашка баранаваў на сваіх конях, якіх здалі ў табун,— вараным жарабку і буланай, з падпалінамі на баках кабыле. Відаць, і ён яшчэ шкадаваў сваіх коней, як і той Дзямід-цецярук.

— Канечне, штоб усе здалі такіх, як ваш Ардынец, то быў бы той шчэ калгас...

— Маўчы ўжо, Ламей, не задавайся сваімі коньмі,— не хваючы крыўды, сказаў я. Ламей была абразлівая мянушка, так называлі аднаго чалавека, які бегаў па вёсках, ганяўся за людзьмі, бо быў не пры сваім розуме.

— Хто Ламей? Я — Ламей? — аж перакрывіўся ад злосці Сашка, спыніў коней і падбег да мяне з пужкай, увесь закалаціўся, пырскаў слінаю.

— Ты, а хто ж!..

Сашка агрэў мяне пугаўём па галаве. Я кінуў лейцы і ўчапіўся Сашку ў прапылены віхор. Мы, як пеўні, схапіліся, пакаціліся па раллі. Падбегла Адарка, мітусілася, бегала вакол нас, войкала:

— Ай, дурні! Што ета яны дзелаюць. Байбусы. Ай, божачка!..

Мы, шкуматаючыся, качаліся, панабівалі ў нос і ў рот пылу, павывальваліся ў зямлі, падрапалі адзін аднаму твары. Сашка падмяў мяне пад сябе і ўсеўся на спіне, пачаў кляваць па плячах і па галаве кулакамі. З усёй сілы рваўся і не мог ніяк выбавіцца. Убачыўшы, што справа набывае нядобры паварот, Адарка схапіла за каршэнь Сашку, з усяе сілы адцягнула. Я неяк усё ж выхапіўся з-пад яго, і Сашка адваліўся; тады зноў, задыханы і раз'ятраны, рынуўся на мяне. Адарка закрычала грозна:

— Пажджыце, дурні! Ой, пападзе вам, вунака брыгадзір ідзе!..

Мы ўраз разбегліся, пачалі атрэсвацца. Злосныя і раз'юшаныя, азіраліся вакол. Сюды набліжаўся чалавек. Барадаты. У доўгай світцы і самаробным ваўняным капелюшы. Доўгі, перашчыкнуты ў поясе вераўчынай — здалёк чалавек нагадваў вялізную бухматую пчалу, што стала на пярэднія лапкі.

— Так ета вы работаеце? — пачулі мы грозны гнуса-

вы голас.— А коні стаяць галодныя! Пагадзіце ж, шалапуты. Паскачаце ў мяне...

Гэта быў Дзямід Півоня — былы гаспадар Буланкі, якую ён бярог больш, чым сваё вока.

— Мы ж нічога, дзядзька Дзямід,— адсопшыся, заенчыў Сашка, скоса пазіраючы на мяне.— Во, бачыце, коні ніколечкі не мокрыя. Мы,— ён замяўся, атрасаючы сваю скамечаную майку,— ета мы так сабе... дужаліся!

Дзямід, вядома, не слухаў яго. Ды, мабыць, і не цікавіўся, што мы там выраблялі на раллі. Як утрапёны, ён падышоў да Буланкі, агледзеў хамут, падправіў сядзёлку, кінуў ёй вехцік травы, якую прынёс з сабою. Пастаяў, як нічога не бачыў перад сабою, задуменны, у скрусе.

— Глядзіце ж, ета ўжо коні змакрэлі,— суха сказаў Дзямід і паказаў рукою на лужок, недалёка ад могільніка.— Адпражыце. Няхай трохі атойдуць... Перахопяць трохі!..— І пашкандыбаў, падгерыста калматы, рыжабароды цецярук, лёгка выкідваючы перад сабою сучкаватую кавеньку-папірашку, доўгую, з сябе ўвелькі.

Дзямід, з'явіўшыся нечакана, як бы памірыў нас. Мы з палёгкай уздыхнулі. Паглядзелі адзін на аднаго, сустрэліся вачамі. Мне чамусьці стала смешна. У вачах Сашкі адна светлая сінеча — падалося, што злосць ягоная раптам адышла, знікла зусім, рассеялася, бы гэты пылок, што курэў яшчэ над нагамі, ападаў на раллі, узварушанай баронамі.

Як і я, Сашка гарачы, падхоплівы, але адыходлівы, доўга не трымаў злосці.

Я ўжо не памагаў Сямёну-Марціну, бо ўзялі яму сталага ўчотчыка, а атрымоўваў нарады ад брыгадзіра — з мужчынамі ездзіў па сена, а ў самае жніво стаў памочнікам у жнеяра. У жняярку запрагалі тройку коней, двое паркаю, а адзін, важак, наперадзе. На ім — паганяты, нібы той кавалерыст.

За жнеяра стаў Іван Шылай, па мянушцы Лепяцень, мужчына невялікага росту, але вёрткі і цягавіты, як чорт.

Да Івана Лепяценя мяне паставілі памочнікам. Не ведаю, хто гэтак распарадзіўся: сам брыгадзір, а можа, нават бацька. Ведаю адно, што бацька, калі маці пачала гаварыць з Іванам, каб не дужа налягаў на мяне, сказаў:

— Нічога з ім не станецца, а працадзень лішні прынясе...

Нам выдзялялі лепшых коней: пару рыжых Сямёнавых і жарабка Карпа Півоні. Як еду я на жарабку, то Кузьміч абавязкова стрэнецца, гляне ў мой бок, блісне вачамі і, сплюнуўшы праз зубы, пойдзе, не адказаўшы на маё «здрастуйце».

Жняярка стаяла ля кузні. Іван запрагаў коней (я падносіў хамуты, сядзёлкі, лейцы), і мы кіраваліся праз вуліцу па поле, я ехаў на жарабку вярхом, Іван на сваім металічным табурэце лабагрэйкі. Ля бока ў мяне біклага з халоднаю яшчэ вадою і торбачка з абедам; у Івана — у руках запасны нож (мы яго называлі пілою) да жняяркі.

Сонца — свежы каравай — ужо выкацілася з-за лесу і плыло над вёскай. Ужо добра ўгрэлася ўсё навокал: усю расу на траве, на дрэвах як бы хто выпіў адразу, з налопу. Ціхім шэптам страчала нас жыта, каласы пад цяжарам зярнят ледзь чутна шуршалі, як бы прасіліся, каб мы пачакалі крыху, далі ім нагаманіцца...

— Ну, што ты, Алёшка, раскіс,— звычайна гаварыў Іван, калі мы пад'язджалі да нівы.— Пачнём, як кажуць, памаліўшыся...

— Но, вараны! — я лёгенька пхнуў нагою пад бок пярэдняга, напяўшы павады закілзанай аброці. Коні крануліся, застракаталі, захадзілі нажы, уразаючыся ў густое, як трыснёг, жыта. Яно радкамі, пстрыкаючы ва ўсе бакі зярнятамі, клалася на палатно. Іван узмахнуў у паветры рагачом і, злаўчыўшыся, адным заходам спіхнуў бярэма збажыны на ржышча.

— Гэй! Гэй-э-эй! — крыкнуў ён на коней, і яны, памахваючы галовамі, ірвануліся наперад. Ужо, напяўшы пастронкі, яны не кідаліся скубці каласы, як у першы дзень, і мне стала лягчэй. Я сядзеў на пярэднім кані ў сядле з сапраўднымі страмёнамі і пільна сачыў, каб пярэдні трымаўся блізка ля жытняй сцяны і не чапаў каласоў. У мяне ў руках напагатове куртаценькая плётачка. Я ўяўляў сябе чапаеўскім Пецькам, калі не больш. Дармо што джгала заедзь — авадні і мухі, што бязлітасна паліла сонца. Коні пачалі нерваваццца, пацелі, адбіваліся хвастамі і галовамі ад аваднёў і мух і рабілі круг за кругам. Іван паабяцаў старшыні, што сажне столькі, колькі жнуць лабагрэйкаю ў Гопкі на радзіме, у Крыварожжы.

— Не здужаеш,— сказаў Гопка, калі гаварылі яшчэ каля кузні, як Іван тачыў нажы.— На Украіне, братко, не такі парубкі, не табе роўня!..

— Вот пабажуся, што дам,— аж малаціў сябе па грудзях кулаком і кляўся Іван.— Пяць актараў, пабачыш, дам. Абы машына вытрымала!..

— А што яе, машыну етую, халера возьме,— аж хапаліся за бакі ад рогату мужчыны.

— Цэ пабачым,— няпэўна адказаў старшыня і ўсміхнуўся бліскучымі вачамі — радаваўся, што яму ўдалося разварушыць людзей і цяпер яны пакажуць сябе, свой спрыт у працы.

...Мы ўжо вельмі стаміліся. Іван абкруціў сарочкаю галаву, ён увесь быў мокры, аблівaўся потам. І коні — бы выкупаныя ў вадзе. Сонца паліла, пранізваючы промнямі-стрэламі з самай вышыні, як кіпнем абдавала ўсё — і поле, і коней, і нас...

Дзе падзелася дзікасць, грацыёзнасць нашага жарабка, ён стаў ціхі, такі ж рахманы, як усе коні, галавою махаў неахвотна і лена, рыжыя ж цягнулі роўна і ўпарта, і здавалася, яны не так стаміліся. Во каб раптам побач аказаўся Карп — у яго ад злосці павылазілі б на лоб бельмакі. Во дзе было б ужо лаянкі — Карп рэдка лаяўся, але калі ўжо хто яго раззлуе — гэта можа толькі дзядзька Раман,— тады ўцякай: спуску не дасць нікому — ні свату, ні брату, ні роднаму тату.

Раптам, як праз сон, я чую:

— Алёшка, спыняй. Пакурым...

— Добра. Коні ўсе мокрыя, бы з вады.

— Эге-ге,— Іван саскоквае з сядзення, аббягае вакол жняяркі, чухае патыліцу:

— Коней, відаць, трэба будзе замяніць...

Трывожна-радасным позіркам ён акінуў зжатую ніву. Жыта роўнымі кучкамі бялее на ёй, усё роўна што статак авечак. На сонцы салома блішчыць, бы авечая воўна,— залацістае руно, дый годзе. Уся прастора ад неба да зямлі запоўнена густою парнасцю. Пах, уласцівы толькі жытнёваму полю, калі жніво п'яніць, будзячы ў душы сціпанасць і неабдымна-гарачую ўрачыстасць. Стома бярэ сваё, закалыхвае, але знутры, з грудзей, ірвалася, разліваючыся слодыччу, радасць — радасць, якую можа абудзіць у сэрцы пах спелай нівы, водар жытнёвых каласоў.

Пасля абеду мы змянілі коней. Гэтыя, канечне, не такія дужыя, як ранейшыя, але і гарачыня паменшала. Сонца, нібы злітаваўшыся, неахвотна затулілася за воблакі. Недзе на захадзе пагрымела, нахапіўся свежы ветрык — мы ўсё адно як выкупаліся ў свежай вадзе, потым

увесь час было ціха і пахмурна. Коні цягнулі роўна. Мне стала лягчэй. Затое Іван увесь увапрэў: жыта пайшло густое, каласы бічастыя, саломка бы трысцё, і ён не паспяваў спіхваць гусцечу з палатна. Нажы ўсё часцей і часцей забіваліся, даводзілася спыняцца і чысціць.

— Ну, брат, ета лабагрэйка, халера...— спрабаваў жартаваць Іван, а потым пачынаў клясці таго, хто прыдумаў такую машыну.

— А ёсць жа самаскіды,— падтакваў я...— На самаскідзе толькі кіруй коньмі, а жыта само такімі граблямі згортваецца з палатна...

— Знаю, таксама чуў,— згаджаўся Іван.— Казалі, што тыя жнейкі нетрывалыя, хутка ломяцца. А лабагрэйка, яна, халера, устойлівая. А што лоб грэеш, то ета, як Гопка кажа, нічога. Моцны лоб, кажа, не перагрэецца...

Пад вечар на поле прыйшлі сам старшыня, брыгадзір і нават рахункавод Сямён-Марцін. Марцін падмігнуў мне, нядаўняму свайму памочніку, і сказаў, паказваючы на зжатую паласу, якая цягнулася аж за небасхіл:

— Ну, Алёшка, малайчына, на Чырвоную дошку без перасядкі, братачка!..

Было неяк радасна і млосна — страшэнна нылі, аж ламіла ў каленях, ногі. Пачалося замерванне плошчы. Я ні на крок не адставаў ад мужчын. Больш за мяне, вядома, хваляваўся Іван: ён жа паабяцаў, пакляўся перад людзьмі, перад старшынёю, што дасць рэкорд. А як не дасць — сораму не абярэшся на ўсе Бацькавічы.

Памералі хутка: плошча была роўная, узгоркавая паласа — звычайны прамавугольнік. Пачалі множыць: тут пачаліся спрэчкі, бо ў Сямёна-Марціна атрымоўвалася адна лічба, а ў брыгадзіра — другая. Перамножылі. Нават Іван не стрымаўся, пачаў нешта шкрэбаць прутком на сцежцы. Нарэшце старшыня падыходзіць да Івана, ашчапервае за шыю і зычна, аж рэха адгукнулася на загуменні, віншуе з перамогай, з першым сапраўдным рэкордам на жніве ў Бацькавічах. І адразу ж, узрушаны і радасны, да рахункавода:

— Сэмэн, фіксуй звестку, бягом у сельраду!..

Сямён-Марцін павольна і ўрачыста раскрывае зашмальцаваную папку і нешта туды запісвае. Іван, абмяклы і разгублены, смаркаючыся, ціха бубніць сабе: «Пяць актараў, ета шчэ што. Можна б і болей, дык жыта ж тае, халера, бы той чарот. Чарот чысты ета!..» Яго мурзаты, востры, як у дзятла, твар аж свіціцца, а вочы блішчаць,

як два сінія вугольчыкі. Іван, збянтэжаны, хмыліцца, намагаецца ўсміхнуцца, але стомленасць бярэ сваё, і ён, спахапіўшыся, тузае мяне за рукаво:

— Алёшка, давай да коней!..

Увечары, калі мы ўз'ехалі з палявой дарогі ў Бацькавічы, нас павіншаваў Трахімка — вясковае радыё, ад якога не схаваеш і макавага зернетка.

— Ета, брат, урэзалі,— піскляві ў, не хаваючы зайздрасці, Трахімка.— Ета, відна, працадзён восем шаснулі. Ета праўда, Антонавіч?

— Пяць актараў. З гакам! — пераможна прамовіў хмельны ад шчасця Іван. Памарудзіў, бы нешта прыпамінаючы, тады, прыжмурыўшыся, выгукнуў: — Пяць ета шчэ што! — І пашыбаваў, цяжка ўгінаючыся, дадому.

Мне дома не сядзелася. Сяк-так павячэраўшы, я пабег на вуліцу, з тайным, глыбока прыхаваным намерам сустрэць Кацю — хіба я мог не падзяліцца з ёю сваёй радасцю! У душы расло, набыло акрэсленасць хвалюючае пачуццё. Яна цяпер стане глядзець на мяне зусім інакшымі вачамі.

Першае, што я сказаў Каці, калі мы стрэліся, што з Іванам Шылаём буду ля жняяркі, аж пакуль не скончыцца жніво.

— І мне так хочацца на луг ці на поле,— задумліва прамовіла Каця і ўздыхнула.— Ды мама хварэе, саўсім злягла, і цяпер мне трэба і есці наварыць, і хлопцаў даглядзець, і ў градах траву выпалаць. Мне цяпера хапае...

— Нічога, паправіцца ваша мама,— ад душы паспачуваў я Каці. У мяне сэрца працялася жалем, бо чуў, што мае словы мала суцяшаюць Кацю. Хацелася сказаць ёй нешта такое, каб суцешыць яе, каб ёй стала весялей, ды такіх слоў у мяне не знаходзілася. І я змоўк, не ведаючы, як памагчы гору, якое раптоўна звалілася на плечы дзяўчынкі.

Нехта з гурту заспяваў песню. І ўсе дзяўчаты і хлопцы, не турбуючыся пра тое, ці будзе зладжанай песня, падхапілі. Галасы не стасаваліся, і некаторыя хлопцы сталі проста перакрыкваць дзяўчат, дурэць.

Каця непрыкметна паднялася, ціха шапнула мне:

— Пойдзем адсюлека...

Незаўважна Каця знікла за вуглом, дзе на прызбе сядзелі ў гурце дзяўчаты. Хвілінку счакаўшы, я паспяшаўся за Кацяй. Затрымаў яе ля ганка. Мы адшыліся ў засень Раманавых ліпак. Сталі блізка да ліпкі, каб нас ні-

хто не заўважыў з вуліцы. Маўчалі, як бы збаяўшыся адно аднаго. Я, хвалюючыся, узяў Каціну руку, затрымаў у сваёй. Яна не аднімала яе, толькі ціхенька, мабыць, аднымі вуснамі, сказала:

— Не трэба, Лёша.— Затым, уздыхнуўшы, дадала: Глядзі, якія прыгожыя зоркі!..

Я паглядзеў угору, на бязмежна-высокі купал, усеяны, бы залатымі макавінкамі, зорамі. У цёмным бяздонным небе яны нібы дрыжалі, таямніча пераміргваліся. Каця, забыўшыся на ўсё на свеце, мройна глядзела на неба, цікуючы за нейкай, мабыць, сваёю зоркай. Раптам адна, чыркнуўшыся аб аксаміт неба, паляцела ў бездань. Каця, схамянуўшыся, ціха прамовіла:

— Мая!..

Я лёгенька паціснуў Каціну руку, і яна мне ледзь прыкметна адказала на поціск. Я стаяў блізка да Каці, і яе мяккія цёмныя валасы дакраналіся маёй шчакі. Мне стала чамусьці горача, аж цяжка дыхаць. Здалося, што Каця чуе, як бухае маё сэрца. Я баяўся, каб Каця гэтага не заўважыла, і крышачку адхінуўся, адпусціў яе рукі. Каця, бы зачараваная, усё глядзела некуды ўдалячынь, цікуючы, мабыць, сваю зорку. Яна, мусіць, забылася на мяне, нібы я зусім зараз не існаваў. Бо чаго ж яна раптам, як ачнуўшыся, ступіла крок у цемру, заспяшалася і раптоўна знікла. Калі я, схамянуўшыся, кінуўся наўздагон, яна ўжо была на ганку, сцішана прамовіла:

— Да пабачэння...

— Да заўтра,— адказаў я, збянтэжаны.

...У пашай раённай газеце «Чырвоны сцяг» з'явілася заметка, у якой расказвалася пра тое, як Іван Шылай і Аляксей Баянок з калгаса «Ударнік» паставілі рэкорд на жніве, зжалі за дзень 5,15 гектара жыта лабагрэйкай.

Тая газета была ў канторы, у Сямёна-Марціна; ён таксама павіншаваў мяне і сказаў, што нам будзе прэмія. Тут жа, на сцяне, вісела Чырвоная дошка — кавалак шпалераў у рамцы, правы бок якой быў пафарбаваны ў чырвоны колер, а левы — у чорны; у правым баку характэрным почыркам Сямёна-Марціна былі выведзены нашы прозвішчы.

Мне падалося, што я нават у сваіх вачах стаў куды большы за свае трынаццаць гадоў. Чамусьці кароценькая, у некалькі радкоў заметка ў газеце, як цвік, забіты ў свежую дошку, засела мне ў галаву. У маёй душы пасяліўся нейкі неспакой. Перад вачамі стаялі радкі літар, з

якіх складваліся словы, неяк шчымліва хваляваў своеасаблівы пах друкарскай фарбы; здавалася, я нічога больш прыемнага ніколі не адчуваў у жыцці — так узрушыла маё сэрца тая заметка. Аднекуль, з глыбіні душы, нахапілася думка: каб самому напісаць у газету. Я чуў, што ёсць селькоры, іх заметкі бачыў яшчэ раней у «Бедноте», «Крестьянской газете», якія нам з маім сябруком Гараськам яшчэ раней, як у нашай хаце спыняўся паштальён, даводзілася бачыць. Хто тыя селькоры, я не ведаў, а ў Сямёна-Марціна спытаць саромеўся. Нашага ж настаўніка цяпер не было ў вёсцы — ён на летнія канікулы з'ехаў у сваю вёску, да бацькоў.

«Можа, параіцца з Кацяй?» — падумаў я, але адразу ж адагнаў гэтую думку: Каця яшчэ пасмяецца з мяне...

Здарылася так, што тым летам мяне неяк падмяў жарабок, і на жняярцы мяне замяніў Міхась Цярэшка, мой аднагодак і таварыш, і цяпер я часта круціўся то ля кузні, то ля свірна, дзе збіраліся ў вольную часіну людзі. Мне кінулася ў вочы, што пажарны інвентар параскіданы, бочкі парассыхаліся без вады, пажарная помпа, можна сказаць, сапсутая.

«А як здарыцца пажар? — мільгнула думка.— Во будзе перапалох. З такімі бочкамі хіба паспееш... Яны ж цякуць, як рэшата. А ў адной зусім няма дна — нехта, відаць, нагою выбіў,— і яна ляжыць тут жа, пад паветкаю...»

Хто ж вінаваты? Вядома хто — пажарны староста. За старасту цяпер быў той самы рыжы Ціт Мірончык, весяльчак, які часта хадзіў «пад градусам». Яшчэ калі былі таварыствы сумеснай апрацоўкі зямлі, камітэты дапамогі, ён займаў у іх кіруючыя пасады. З незапамятных часоў Ціт быў бацькавіцкім пасланцом у сельскім Савеце. Казалі, што ён часта і сам сябе туды выбіраў, але гэта, мабыць, нагаворы.

Ціта Мірончыка не зблытаеш ні з кім у Бацькавічах. Ён быў напышлівы, з хвацкімі вогненна-рыжымі, як у фельдфебеля, вусамі, у шэрым са свайго сукна пінжаку з накладнымі кішэнямі, у скураной кепцы і ў стаптаных ботах. Іншы раз шпацыраваў Ціт і ў лапцях, аборы замотваў на адну трэць лыткі, прыгожа і зграбна. Часта бачылі яго і ў валёнках з галёшамі — гэта ўжо як пачалі жыць за калгасам.

Пад пахай у Ціта заўсёды была зашмальцаваная, нянэўнага колеру папка, завязвалася яна на бухматыя

шнуркі. У папцы былі ўсе падатковыя паперы. Яму тады было, мусіць, за сорак, але хадзіў ён лёгка, спорна і борзда. Заўсёды з люлькай у зубах. Пра яго паходку гаварылі, што ходзіць Ціт каньком, а некаторыя яшчэ дадавалі незразумелае — кандыбоберам. Гаварыў Ціт спаважна, з гонарам. Кажуць, што на службе ў царскай арміі Ціт меў нейкі чын.

Не ведаю, па якой прычыне, але, мусіць, ад таго, што ў Ціта быў асаблівы нюх на гарэлку,— ад яго ні адзін чалавек не мог схавацца, ён абавязкова наскочыць, калі хто надумае выціснуць затор самагону. Ціту ў калгасе далі новы адказны ўчастак: вясковую ДПД — добраахвотную пажарную дружыну. Звычайна ж яго называлі проста пажарны староста.

Больш за ўсё пажарны староста турбаваўся пра тое, каб у кожнай хаце на вулічнай сцяне была дошчачка — на ёй маляваўся пэўны прадмет з супрацьпажарнага начыння. Калі, скажам, у нас на сцяне намалявана было вядро — гэта азначала: як надарыцца пажар, трэба бегчы з вядром; у каго на сцяне дошчачка з намаляваным багром — бяжы з багром і г. д. Гэтага парадку пажарны староста трымаўся моцна. Бывала, як зойдзе ў хату, дык яшчэ з парога будзе крычаць:

— Трахім Паўлавіч, ведаеш, што, ета, табе, як здарыцца дзе пажар...

— Ведаю,— паспешліва адказваў Трахім.— З лесвіцай...

— То-та ж,— зацягваўся дымком Ціт і пачынаў філасофстваваць пра тое, што пажар — справа небяспечная і можа ўзнікнуць нечакана. Затым, калі ягоны нос нічога пэўнага не ўлоўліваў, ішоў у другую хату, затым — у трэцюю. Да нас ён прыходзіў ужо з бутэлькай, заткнутай пакуллем, урачыста ставіў яе на стол і, скасавурыўшыся ў бок маці, звычайна гаварыў:

— Улляна, ты ўжо, ета, звіняй. Дзеля прыклёпу. Па кроплі...

«Кропля», вядома, канчалася тым, што і бацька падаваўся на здабычу. Яны сядзелі позна, аж да вечара, забыўшыся пра ўсё на свеце. Гэта як не было пільнай работы. А здаралася, што і ў гарачы час лета Ціт, як мае быць назюзькаўшыся, няпэўнай хадою кіраваўся проста да нас на паграбішча і валіўся кулём на зляжалую, сухую кастрыцу. Тут яго, вядома, не мог знайсці ні адзін прадстаўнік з раёна, якія ў летнюю пару даволі часта ездзілі па

вёсках,— іх болей, як грозных жонак, баялася мясцовае начальства. Бывала, куды толькі не хаваліся нядбайныя брыгадзіры ці старшыні: і ў падмосце, і на гарышча, і ў лазні, але адусюль іх выпорвалі і, вядома, задавалі ім добрага пытлю.

У мяне чамусьці хутка выспеў каварны план — напісаць пра Ціта-пажарніка ў газету. Доўга не спатрэбілася думаць — я ўсё расказваў проста і нічога не выдумляў. Нават над загалоўкам не ламаў галавы: «Пажарны старэйшы Ціт Мірончык бяздзейнічае». Праўда, у заметцы пра гарэлку я змоўчаў, бо тады трэба было б пісаць і пра свайго бацьку, але я проста збаяўся. Пад заметкаю падпісаўся: Аляксей Баянок, напісаў яшчэ слова «селькор», але пасаромеўся і сцёр.

Пісьмо аддаў у рукі Іллюку Шпадаруку — нашаму бацькавіцкаму паштальёну — і сказаў:

— Глядзі ж, Іллюха, маўчы... Калі што якое, каб ніхто не знаў, сам ведаеш...

— Ну што ты, Алёшка, барані бог, усё будзе як пад замком.

Іллюк сунуў канверт у вялізную скураную сумку, якая ў яго звісала ніжэй каленяў; сам Іллюк маленькі, сухенькі, як корчык, затое нос як у добрага мужчыны, а на яго твары — чыстая дзюба ў варанёнка.

Паштальёнам Іллюк быў выключнай сумленнасці, з усіх паштальёнаў, якія перабылі ў Бацькавічах на маім вяку: пісьмаў нічыіх ён не чытаў, гэта кожны пацвердзіць, газет не ўтойваў, пераводаў і паштовак не губляў, разносіў усю карэспандэнцыю адразу, як прыходзіў ці прыязджаў з Ігліцы, з паштовага агенцтва. Хадзіў пешкі. (Каня браў толькі ў вялікую сцюжу ці бездараж.) Іллюк быў заўсёды ў нейкім прыўзнятым настроі і ўручаў чалавеку пісьмо ці аддаваў газету, бы падарунак на свята. Калі праходзіў міма вашае хаты, а хто-небудзь стаяў ля варот ці ў веснічках, ён вінавата ўсміхаўся сваёй адметнай усмешкай і ласкава гаварыў:

— Вам, цётачка, яшчэ пішуць. Яй-богу, мамачка...

Трухаў, дробна сігаючы кароткімі нагамі, блытаючыся ў доўгім, з чужога пляча, паліто, якое яму дасталося ў спадчыну, мабыць, яшчэ ад дзеда-шахцёра.

Як адправіў праз Іллюка сваё тое злашчаснае пісьмо, я заўсёды, канечне, стараўся не размінуцца з паштальёнам, лучыў момант абавязкова патрапіць яму на вочы. А час цягнуўся. Мінуў месяц, другі, насталі халады, а мне не

чутно ніякай вестачкі. Іллюк пры сустрэчы разводзіў рукамі і з вінаватай усмешкай на заклапочаным твары гаварыў адно і тое ж: «Пісьмо з пошты адправіў. Так што не нудзься, браток, чакай — адвет будзе...»

Неяк я корпаўся на двары — шыгаллем і зямлёю абкідваў заваліны, каб на зіму праз сцены ў падмосце не забіраліся маразы, калі ў весніках паказалася знаёмая постаць паштальёна ў нязменным чорным палітоне і ў выцвілай будзёнаўцы. Яшчэ здалёку ён асіпла крычаў:

— Алёшка, ну і аддзёр ты, браток, корту!..

Іллюк патрос перад маім збянтэжаным тварам газеткай.

— Во, глядзі, тутацька. На, чытай!..

Я ўзяў у рукі газетны лісток, прабег вачамі ўсе заметкі і адным дыхам запар прачытаў знаёмае: «Пажарны стараста Ціт Мірончык бяздзейнічае». І подпіс: «Аляксей Баянок».

Адразу ўдарыла ў галаву, стала вельмі горача. Другі раз пачаў радок за радком чытаць сваю заметку. Літары стаялі прыгожымі радкамі і нібы нашэптвалі мне на вуха: «Ну, Алёшка, малайчына. Цяпер, брат, пра цябе ўведаюць усе. Увесь раён. Радасць жа якая!..»

Нібы адгадаўшы маё узрушэнне, Іллюк паляпаў пасяброўску мяне па плячы і пачаў хваліць:

— Правільна, Алёша. Так і трэба. А то ўжо разгультаіліся, пачулі вольніцу нашы начальнічкі!.. Шараваць іх нада — з пясочкам, наждачком!..

Але я ўжо не слухаў і нічога не чуў, што гаварыў Іллюк. З газетай шамятнуў у хату — дома нікога не было; мільганула думка: збегаць зараз жа да Гопкавых, пахваліцца Каці, але стрымаўся — дома, я ведаў, і сам старшыня; ахалодаўшыся, вырашыў адкласці візіт да вечара: будзе прычына зайсці і заадно пабачыцца з Кацяй.

Мне ўжо не працавалася; то браў у рукі рыдлёўку, то клаў яе, а браўся за газету, перачытваў свой першы надрукаваны твор. Я ўжо ўяўляў сабе, як яшчэ напішу, буду пісаць і пісаць, закінуўшы ўсе пагулянкі, абы толькі хапіла ў Іллюковай торбе месца для маіх лістоў. Я пачаў прыкідваць, пра што і пра каго я напішу, і неяк губляўся адразу, бо не ведаў сапраўды — пра што ж яшчэ напісаць?..

Раптам за маёй спіной грымнуў строгі бацькаў голас:

— А-а, байбус, шалапут. А-а, бандыт ты етакі!.. То ўсё

не было з табою адхлання — гароды ды садкі з дружкамі латашыў. А цяпер, ета, знайшоў сабе работу — перад усімі людзьмі абняславіў. Ці можна ж ета, дуралей ты, асінавая твая даўбешка!..

Як аслупянеў я. Сапраўды, за што ж на мяне так накінуўся бацька? Хіба я зрабіў нешта благое, непрыстойнае? А тое, што Ціт адно п'е гарэлку, а бочкі ўсе парассыхаліся і пажарную кішку вунь па вуліцы валочаць дзеці, дык хіба гэта парадак?

Не паспеў я разявіць рот, каб нешта сказаць для свайго апраўдання, як бацькава жылістая рука ўчэпіста хапіла мяне за каршэнь, а ў другой мільгануў абрывак вяроўкі. Па плячах, па спіне пасыпаліся шлегі, балючыя і частыя.

— Ой, татачка, не бі. Не буду, я не вінаваты,— заенчыў я на ўвесь двор.

— Яшчэ і не ведаеш, шалапутная галава твая,— адышоў бацька, адсопшыся, выпусціў мяне з рук. Я трохі адбегся, бо адчуваў, што яшчэ, відаць, у бацькі злосць не прайшла канчаткова.

— Дайжа распісаўся сам, а тады — не ведаю. Каля кузні толькі што чыталі. Якраз і Ціток быў. Ета ж даўмецца, выкінуў такі выбрык!.. Людзі, ета, за бокі браліся, ад рогату аж клаліся ўсе. А Ціток млеў як ашпараны. Ну, глядзі, байбус, на вочы яму не пападайся, яшчэ кухталёў надае. Калі етага вот з цябе мала...

— Дык што, можа, не праўда? — асмялеў я крыху, выціраючы слёзы. Было не так балюча, як крыўдна за тое, што бацька мяне лічыў усё яшчэ за блазна. А пра мяне ўжо газета пісала, маё імя на Чырвонай дошцы значылася сярод першых ударнікаў у Бацькавічах.

— Ты яшчэ будзеш мне апраўдвацца, баламут! — Але бацька ўжо крыху аціх, астыўшы; прысеў на прызбе, пачаў рабіць самакрутку.— Выкінь яшчэ што-небудзь такое, дык з двара вытуру. Адзін сын — няхай і етага не будзе. Мне не надыць такея... Бацьку роднага не шануеш... Насуперак волі бацькі — ета не сын! Ета ж недавярак, анціхрыст, вот ета хто!..

Апраўдваючыся, я выцяг з кішэні газету, прачытаў яму ўсю заметку.

— Бач ты, байбус, складна брэшаш!..

Бацька пакруціў галавою, зацягнуўся дымам, скрозь кашаль прагаварыў сам сабе:

— Яно калі папраўдзе, дак Ціток етага заслужыў.

Саўсім згультаіўся, лежабок. Ляжыць у цяньку, а працадні бярэць...

У мяне крыху адлягло на сэрцы. Я ўзяўся за рыдлёўку, а бацька, яшчэ пабурчаўшы, пайшоў у хату — на абед. Мне ж есці зусім не хацелася.

У паветры закружыліся, бы матылькі, першыя сняжынкі. Я пачаў рукамі лавіць іх, пушынкі, белыя зорачкі, браў у рукі, а яны тут жа таялі, знікалі, ператвараючыся на вачах у малюсенькую кропельку.

На душы палягчэла. Стала зноў радасна.

Немаведама чаму ўспомнілася, як мы некалі, яшчэ дашкаляты, дражнілі нашага нязменнага «сябра вёскі» Ціта Мірончыка. Ён, бывала, валюхаўся зігзагам па вуліцы са сваёй неразлучніцай-папкай пад пахаю, а мы беглі талакой услед і крычалі:

— Ціт, Ціт, хадзі малаціць...

— Жывот баліць...

— Ціт, Ціт, ідзі кісель есці...

— А дзе мая вялікая лыжка?..

Ціт спыняўся, доўга стаяў няўцямна, пазіраючы ў наш бок. Патрасаў нам кулаком і шкандыбаў, хістаючыся, далей па вуліцы.

Стала неяк сорамна ад таго свайго блазенства. Я ж у тых справах быў, калі шчыра, завадатарам.

7

Быў звычайны асенні дзень. Свяціла нярыкае нізкае сонца. З каміноў віліся ў шэрае неба дымкі. Пастух выганяў на пашу скаціну. З раніцы Грыцко Гопка заскочыў да нас, пакурылі з бацькам, перакідваючыся нязначнымі словамі. Зацягнуўшыся дымам, старшыня сказаў, што Галі, так называў ён жонку, стала дрэнна і ён адправіў яе ў раён, у бальніцу. Трахім запрог жарабка, а з маткай паехала і Каця.

— Ось, бачыш, яшчэ і другая хвароба,— Гопка нервова сплюнуў, схапіў з услончыка сваю шапку, устаў.— На Рашатнёўцы, кажуць, малатарня стала, нейкая пачвара шворан пусціла ў барабан, і ўсё патрушчылася...

— Хто ж, калі не сам гаспадар,— выказаў здагадку бацька.— Малатарню аддаў, цяпер стала шкода, дык і зганяе злосць. Ета такія людзі, што калі яго не бярэ, то гатоў папсаваць, абы не дасталося нікому... Ета такія ўжо захрыбетнікі...

— Якая людына, бісава душа! — мацюкнуўся Грыцко.— Мы іх, мярзотнікаў, выганім. Выганім, сват, як думаеш?..

— Нялёгкае ета дзела, Рыгор Іванавіч... Карэнні, сват, глыбока паўрасталі. А нада — з коранем, хоціць з імі цацкацца!..

Бацька ўстаў, падышоў да печы, узяў з чалесніка качаргу, паварушыў ёю дровы, тады ўжо звярнуўся да маці, якая ўвіхалася тут жа, ля печы.

— Доўга яшчэ будзеш тут важдацца? Як той Трахімка казаў, ніколі парою цёплай бульбы не з'ясі...

— Дак што я, сама палезу ў печ? Бачыш, якія дровы — адна вада, сіпяць, як чортведама што,— апраўдвалася маці, але заварушылася, забрынчала патэльняй.

Паўз вулічнае акно мільганула знаёмая постаць Гуціна — нашага новага каваля, якога нанялі замест дзеда з Чырвонай Гары. Той пабыў з паўгода, наваліў вазы са два збожжа і, спаслаўшыся на слабое здароўе, даў лататы. Бацька нейкі час пляскаў трохі на пару з Васілём Шылаём, маладым мужчынам, які толькі што прыехаў з Данбаса. Пад той год многія бацькавіцкія шахцёры з'ехаліся дамоў: на шахтах, пагаворвалі, не стала заробку і падняласа страшэнная дарагоўля — заробленых грошай не хапала на харчы. Старшыня прывёз з мястэчка Гуціна — кажуць, добры будзе каваль, калі яшчэ ўтрымаецца. Во ўдараць халады — мабыць, і ён збяжыць, уцячэ. Гуцін вельмі худы, як тычка, адна скура ды косці...

Мужчын у Бацькавічах пабольшала. Улетку работы хапала для ўсіх: і з касою, і за плугам, і з тапаром — пабагульвалі аборы, пуні, клеці, адрыны, гумны — са старога шалупацця збіралі новыя будынкі: канюшні, кароўнікі, свірны. У Бацькавічах стала пяць брыгад. І дзве цяслярскія. Цясляр, а ў нас ён называўся плотнік (плотнікам быў, бадай, кожны другі мужчына і нават многія хлопцы). З хлопцаў якія яшчэ там былі плотнікі? Як у той прымаўцы: «Каб не клін ды не мох, то і плотнік бы здох...»

Ужо браліся ядрана-халодныя дні. Зямлю знячэўку прыхапіла марозам, і на вуліцы грамыхала, бы парожняя бочка, калі па грудах трусіла падвода — калёсы ці мажара.

Намэнчыцца, натрасецца Каця, пакуль даедуць да таго мястэчка: хворая Гопчыха пластом ляжыць на сенніку, хіба яе ўтрымаеш на руках. Дзе там, тая Каця яшчэ

дзяўчынка — чатырнаццаты год. Шкада ёй маткі. Каця апошнія дні ходзіць выпетраваная, як нежывая,— толькі адно вочы блішчаць, налітыя слязьмі, бы мокрыя пераспелыя вішні.

Збіраюся ў школу,— мне якраз той дарогаю, на Ігліцу. Можа, калі вяртацьмуся са школы, то сустрэну іх падводу — яны, мабыць, будуць ехаць ужо назад.

Мы селі снедаць. Раптам стук у акно. Да балонкі прыліпла кудлатая галава Гуціна:

— Іванка, да горна!..

На хаду зашпільваючы кухвайку, бацька шуснуў з хаты, уся бульба асталася на стале, смачна дымячыся параю. Маці, злосная, бурчала: «Усё етак, усё спяшаючыся, не можа, ета, пад'есці спакойна, як чалавек...»

Мне таксама не выпадае чухацца — да школы вярсты са тры добрыя. Па дарозе рэдка калі трапіцца падвода, і не кожны, паспагадаўшы, возьме ды прапануе: «Садзіся, шалапут, пад'едзь трохі». Часцей за ўсё як убачыць падводчык, што з торбачкай за плячыма соўгаецца падлетак, то сцебане каня і міма прамчыцца. Дзямід Півоня ніколі, бывала, не праскочыць міма: ён дужа коней беражэ, не конча сваю Буланку, ездзіць заўсёды ціха, конь у яго ў пашане.

Гопка, сапраўдны ўкраінец, аднекуль прыдбаў дзве пары валоў. Адну пару ўзяў самохаць Дзямід і не памыліўся, бо часта выходзіў у перадавікі на валах па вывазцы гною і на перавозцы сена ці саломы. На валах Дзямід працаваў, аж пакуль яны не састарыліся; правільней — адзін год не хапіла корму, валы заняпалі, і іх пусцілі на мяса. Дзямід вельмі доўга сумаваў і казаў: «Абідна, ета ж людзі не разумеюць, што вол — надзейная сіла ў дзярэўні».

Я неўзабаве дагнаў Дзяміда, які, бы той цар на троне, рассеўся ў драбінах, з-за пляча для прыліку тырчыць доўгая палка-паганялка; валы ў ярме ціха і цягавіта ступаюць па дрогкай дарозе.

— Дзень добры, дзядзька Дзямід! — крычу я ў самае вуха падводчыку.— Куды ета вы?..

— Садзіся во. І маўчы,— усміхаецца ў злямцаваную бараду Дзямід.

— Спасібачка. Я спяшу,— кажу ўжо цішэй і паказваю, што магу спазніцца ў школу, едучы на валах.

— То бяжы,— бубніць сабе пад нос Дзямід і нібы засынае.

Вярнуўшыся са школы, я, апякаючыся, сёрбаў гара-

чую наварыстую капусту, запраўленую баранінай (і ў нас ужо было мяса); раптам чую нейкія крыкі і енкі на вуліцы. Зірнуў у акно: па вуліцы мужчыны — здаецца, Раман і Яўмен Цярэшка — вялі падпашкі дзядзьку Івана Дваяна, мажнога, плячыстага чалавека ў шэрым пінжаку, адна рука ў яго абгорнута белым ручніком — чырвоныя плямы пабілі ручнік. Дзядзька Дваян вяла крычаў і мацюкаўся.

Я вопрамеццю, з усіх ног, на двор. У сеначках стаяла маці, уся зацярушаная хлебным пылам і шамашыннем, прыйшла ад малатарні, падавала снапы.

— Што там такое? — з трывогай выдыхнуў я.

— Ды вон, ты не відзіш, Дваяна павялі,— хмурна сказала маці.— У барабан... усунуў руку, і пажмакала... Наверна, без рукі чалавек астанецца... Калека... А ўсё, ета, свая дурасць!..

Умомант я апынуўся ля гумна, на таку. Там яшчэ стаяў страшэнны вэрхал: жанчыны крычалі, мужчыны іх супакойвалі, і нельга было ўжо нічога зразумець, хто што гаварыў. Неўзабаве прыскочыў сюды і Гопка, бледны, з шалёнымі вачамі, супакойваў людзей, стараўся выявіць, як усё тое здарылася.

— Дак ён, відна, сам трохі вінаваты,— як супакоіліся крыху, сказаў брыгадзір Якаў Кавалік.— Ета ж Дваян сам прыйшоў на ток, паглядзеў, як малацілі, і каршуном да малацільшчыка: «Не ўмееш падаваць, дрында!» А падаваў у машыну Андрэй, ягоны швагер. Той моўчкі кідае ў барабан снапы і не зважае, што Дваян строіць кепікі. Дваян пастаяў крыху, наліваючыся злосцю, тады адпіхнуў швагра ад машыны і пачаў сам пхаць у барабан снапы. «Вот як надо»,— сказаў ён і войкнуў, як уджалены, схапіўшыся за руку.

— Ось, дурніла,— змрочна паківаў галавою старшыня і загадаў мужчынам: — Швыдчэй каня, вязіце хутка ў бальніцу!..

— Ужо... Я распарадзіўся,— сказаў Якаў Іванавіч і аб'явіў людзям, каб разыходзіліся. Малатарня стала. Андрэй-падавальшчык павёз з пажваканай рукою швагра ў бальніцу.

Увечары таго ж дня, не паспелі Трахім і Каця вярнуцца дадому, як з бальніцы перадалі: памерла ад разрыву сэрца Гопчыха.

...Яе хавалі на наступны дзень, пад вечар. Было яшчэ светлавата, прыцемкі яшчэ, мабыць, забавіліся за гарою,

куды нетаропка скацілася халаднаватае, як бляшанае, сонца. Брыгадзір Якаў і Раман зрабілі для Гопчыхі дамавіну з новых чышчаных дошак, адштукавалі з сасновага бруса крыж.

Цётка Галя ляжала на высокай, напханай сенам паркалёвай падушцы; на галаве — новая гарусавая хустка ў кветкі. Смуглявая прыгажуня — жанчына як бы прылегла адпачыць ці заснула.

Гопка, бы скамянелы, з прыпухлымі вачамі ўвесь дзень, не адыходзячы, сядзеў каля труны. Пад цяжарам няшчасця чалавек нібы змагаўся з ударам, які звaліўся на яго плечы ў адзін дзень — раптоўная смерць жонкі і здарэнне каля малатарні. Ля яго ўвесь час да каленяў ціснуліся хлопчыкі — Лёня і Рыгорка. Сыны не зводзілі вачэй з труны, усё пазіралі на замоўкшую маці. Яна, маўклівая і прыбраная, нібы сабралася на якое вялікае свята, ды во прылегла на хвілінку. Ім яшчэ не верылася, што бачаць сваю маці апошні раз.

Каця, наплакаўшыся яшчэ ў дарозе і за гэтую бясконцую ноч, сядзела сцішаная, з сухімі няўцямнымі вачамі. Яна як бы нічога і не бачыла перад сабою, нікога, апрача твару маці.

У хату ўвесь час заходзілі людзі — бабулькі, кабеты, дзяўчаты, мужчыны, падлеткі, дзеці. Пабыўшы крыху, нібы аддавалі даніну павагі нябожчыцы, выціралі слёзы, сморкаліся і ціха, на пальчыках, выходзілі. Бабулькі і кабеты аставаліся ў хаце надоўга. Увесь час чуліся ўсхліпы, божканне, вохканне — людзі шкадавалі як маглі нябожчыцу.

Гопкавы хлапчукі не варушыліся, толькі калі бацька падышоў, каб нечага пераКінуцца словам з мужчынамі,— відаць, што ўжо наставала пара класці нябожчыцу на падводу, яна стаяла ўжо каля хаты напагатове, меншы Рыгорка, такі ж смуглявы, вельмі падобны на маці, учапіўся бацьку за руку і заплакаў на ўвесь голас — як закрычаў усё роўна, злякаўшыся.

За труною на могілкі, што на гары між вячыстых бяроз і соснаў і белай, яшчэ не выветранай драўлянай вышкі-маяка, дыбалі, насупіўшыся, людзі, цэлы натоўп. Гопчыху ў Бацькавічах любілі за шчырасць і дабрату. Яна ніколі не выхвалялася і не падавала выгляду, што жонка старшыні. Як і ўсе жанчыны, хадзіла палоць лён, акучваць бульбу, шчыравала на калгасных градах, вучыла вясковых жанчын, як вырошчваць заводныя гуркі; Гопчы-

ха любіла людзей і не галілася на людское, калі адзін час у калгасе рабіла ў яслях за кухарку.

Во ўжо сталі развітвацца, і да труны падышла Каця, я не стрымаўся — слёзы ў мяне самі паліліся, буйныя, па гарошыне, засцілі шчымлівым туманом вочы.

— Бывай, мамо,— ледзь чутна шапталі Каціны прыпухлыя, засмяглыя вусны... Каця прыпала да матчынага твару і захліпнулася ў рыданнях.

Лёня і Рыгорка закрычалі, як бы хто на іх кінуўся з нажом. Аж зайшліся ў плачы. Іх ніхто не супакойваў. Людзі ведалі, што так лягчэй будзе,— давалі волю выплакацца.

— Прашчайцеся, дзеткі! — загадала старая Мацвеіха, славутая ў вёсцы бабка-павітуха; яна для ўсіх была сваім чалавекам на кожных народзінах і на пахаванні. Яна і цяпер распараджалася тут, як гаспадыня. Яна і падвяла хлопчыкаў да труны, каб развіталіся з маткай.

— Прашчайся, Рыгор Іванавіч,— падштурхнуў нехта і Гопку, які ўвесь час скамянела стаяў ля труны як апантаны, з апушчанай непакрытай галавою; вецер перабіраў, калмаціў яго смалянай чорнасці густыя валасы; мне падалося — яны ўраз пабялелі, найбольш на скронях, як прысыпаныя свежым раннім інеем.

Схамянуўшыся, старшыня стаў на калені, прымяўшы свежы жарсцвяны пясок перад труной, прыпаў галавою да пажаўцелага ўжо твару сваёй Галі, нейкі момант затрымаўся, тады цяжка адпіхнуўся, відаць, намагаўся нешта сказаць, але з грудзей вырваўся толькі балючы стогн; марудна, як пад вялікай, не па сіле ношай, натужна ўстаў, яго падтрымалі рукамі мужчыны, што стоўпіліся вакол магілы.

Вечка труны суха грукнула — зачынілася, рэзка і адрывіста; ягоны грук балюча адгукнуўся ў сэрцах; чмякнуўся малаток па цвіках, загадзя да паловы забітых у пагабляваную дошку. Труну на вышмараванай пяньковай вяроўцы апусцілі ў свежую яму. Па чыстых, белых, з-пад гэбля дошках дробна і глуха забарабанілі камякі гліны. Людзі, як абмяклыя і вінаватыя, шморгалі насамі, усхліпвалі — плакалі...

Ачомаўшыся, я заўважыў, што стаю амаль ужо адзін,— на тым месцы, дзе во толькі натоўпам стаялі, аплакваючы нябожчыцу, людзі, цяпер узнікла невялічкая горка згрэбенага пяску-жаўцяку; над ёю, бы вартавы навыцяжку,

высіўся старанна выструганы сасновы крыж, выдзяляючыся з усіх крыжоў-суседзяў сваёй яркай белізною.

Мігам я дагнаў людзей, што выцягнуліся ланцужком па дарозе з могільніка, і параўняўся з Кацяй. Хацелася сказаць ёй нешта ласкавае, суцешнае, паспачуваць ёй, але слоў такіх не было, у галаве ўсё пераблыталася і змяшалася. Ужо на вуліцы, калі людзі пачалі разыходзіцца па хатах, я крануў Кацю за плячо і сказаў ціха, як не сваім голасам:

— Не плач, Каця...

— То я ж не плачу,— ледзь чутна абазвалася Каця і, памаўчаўшы, праз слёзы, як бы крышку цяплейшым голасам, дадала: — Алёшка, прыходзь да нас...

— Прыйду. Абавязкова прыйду,— паабяцаў я.

8

У тую восень у Бацькавічы прыслалі новых настаўнікаў — Аляксея Мікалаевіча Свербікава і Антаніну Кандратаўну Лабачэўскую. Абое даволі маладыя, хаця Аляксей Мікалаевіч быў ужо жанаты і меў двое дзяцей; яго хлопчыкі-дашкаляты, адзін да аднаго, як грыбкі-баравічкі. Моладзь сустрэла настаўнікаў радасна, бо, як вядома, маладыя з маладымі заўсёды згаворацца хутчэй і паразумеюцца лепш.

У Бацькавічах была ўжо і свая культурная сіла — Васіль Верабейчык, які ўлетку прыехаў з настаўніцкіх курсаў і прывёз з сабою навушнікі; жыў ён у свайго старэйшага брата Хведара, што астаўся ў прымах на гаспадарцы Лявона Кораня. Высока над вільчыкам іх хаты, дзе ў першай палавіне памяшчалася калгасная канцылярыя, тырчаў шост-жардзіна, ад яго цягнуліся драты з беленькімі шарыкамі. Канец дроту ішоў праз акно ў хату, на падаконніку ляжалі два чорненькія карабочкі, злучаныя металічнай дужкай. Кожнаму, хто прыходзіў з хлопцаў ці мужчын у хату, Васіль даваў надзець на вушы тыя карабочкі — яны ледзь чутна хліпалі, і калі прыслухаешся, то пачуеш сапраўдны чалавечы голас — гэта было радыё. Усе ішлі да Верабейчыкаў, каб паслухаць «радзіва» — сапраўднае дзіва, і я сам на свае вушы тады чуў: «Гаворыць Мінск», а другі раз па-руску: «Говорит Москва...»

Васіль неўзабаве надоўга з'ехаў з вёскі на сваё месца работы настаўнікам. Казалі, што аж пад Мінск, у нейкае

Заслаўе. Бацькавіцкія мужыкі ганарыліся тады: наш хлопец, можна сказаць — з самых беднякоў, выбіўся ў людзі: «Першы настаўнік з Бацькавіч. Хіба гэта не слава, хіба не радасць для жыхароў вёскі?..»

Надыходзіла зіма. Новыя настаўнікі часцей пачалі збіраць моладзь у школе. Раней, як помніцца, ведалі адно: вечарынкі, ігрышчы з аднастайна-надакучлівымі танцулькамі ці яшчэ горш — гульнёю ў чахарду, у жгута...

Адно і тое ж з зімы ў зіму. Аднастайна, як шэрыя піліпаўскія дні.

Між вясковых хлопцаў усю ўладу над маладымі трымалі балышуны Андрэй Говар, Ляксандра Сідорык, Іван Кавалік, Максім Цярэшка, Мікола Данееў. Тады толькі два, здаецца, Андрэй Говар і Іван Кавалік, хадзілі часта ў Горкі, на сходы камсамольскай ячэйкі, і крыху трымаліся асабняком. Яны лічыліся ў Бацькавічах і лікбезнікамі, па вечарах вучылі дарослых цётак і дзядзькоў грамаце — чытаць і пісаць.

Аляксей Мікалаевіч, новы настаўнік, загаварыў з хлопцамі пра тое, каб у Бацькавічах стварыць свой драмгурток і самастойна ставіць п'есы. Не жыць жа нам толькі тым, што пакажуць у Ігліцы, у сельсавеце, ці ў Горках, дзе ёсць свае хаты-чытальні.

— Арцістаў у нас нямашака,— дакорліва сказаў Іван Кавалік, намякаючы на тое, што, маўляў, артысты, ахвотнікі ёсць, але няма завадатара.

— Чаму ета няма? — успыхнуў гарачлівы Ляксандра Сідорык, дужы чарнявы хлапчына.— Каб хто запісаўся, то і я пайшоў бы. Зрабілі б спектаклі не горшыя, як у тых горкаўцаў...

— Дак за чым жа астаноўка? — усміхнуўся Аляксей Мікалаевіч.— Прыходзьце ўвечары. Усе гуртом падумаем, памяркуем ды і пачнём!..

— А настаўніца прыйдзе? — раптам спытаў Ляксандра і густа пачырванеў, збянтэжана лыбіўся — даўгалыгі, няўклюдны, у кароткім паўкажушку хлапчына.

Хлопцы зарагаталі, хітра пераміргнуліся. Настаўнік, мабыць, нічога ў гэтым не ўлавіўшы, пацвердзіў:

— Канечне. Абавязкова будзе і Антаніна Кандратаўна. Прыходзьце, хлопцы. Падумаем, каго ж нам з дзяўчат запрасіць.

...На першую рэпетыцыю сабралася цэлая талака хлопцаў. Асабняком, купкамі ціснуліся дзяўчаты: Васіліна Піворня — большая дачка Дзяміда, модніца і языкастая; Вар-

ка Цярэшкавых — флегматычная бялявая таўстушка; чарнабровая Настуля, моцнага складу і гаваруння — дачка беднай удавы Зайчыхі; Хрысціна, сястра Івана Кавалька, аднаго з першых бацькавіцкіх камсамольцаў, і, бадай, самая старэйшая з дзявоцкай капэлы — Ганка Давыдовіч, празмерна сарамлівая і ціхоня, увесь час хавалася за сваіх маладзейшых таварышак, а калі ўсе яны смяяліся, яна, каб як-небудзь стрымацца, прыкрывала рот рукою. З твару Ганка, бадай, самая прыгожая і вылучалася сваёй далікатнасцю.

Пачалі рáдзіцца, якую ўзяць п'есу.

— Давайце паставім «Чырвоныя кветкі»...— прапанавала Антаніна Кандратаўна.

— А пра папоў там ёсць што? — спытаў Ляксандра Сідорык, сумеўшыся.— Мне ролю бацюшкі можна.

— Пра папоў? — ускінула над пукатым светлым ілбом тонкія бровы-падкоўкі Антаніна Кандратаўна і змоўкла, як апёкшыся, затым ціха дадала: — Гэтая п'еса пра грамадзянскую вайну. Там ёсць партызаны, вясковыя хлопцы, дзяўчаты...

— Мне штоб пра папоў, ета дзела,— расчаравана працягваў той жа Ляксандра і, адышоўшыся да грубкі, змоўк, лыбіўся, як дурніла які.

— Можа, спачатку якую лягчэйшую возьмем,— выказаўся Аляксей Мікалаевіч.— У мяне ёсць зборнік. П'есы Галубка. З вясковага жыцця. Пачытаем. Калі спадабаецца якая, то возьмем. Дамовіліся?

— Добра,— пачулася з натоўпу.— Чытайце!

Пачыталі адну кароткую п'есу. Яе слухалі ўважліва — мабыць, п'еса ўсім спадабалася. А як узяліся размяркоўваць ролі, ні да чаго пэўнага не прыйшлі: той не хоча быць за кулака, той не згаджаецца на ролю кулацкага сынка, а галоўнае, на дзявочую ролю — вясковай красуні, якую хочуць сілком выдаць замуж за кулацкага сынка, бамбізу і распусніка,— не згадзілася Антаніна Кандратаўна.

— Правільна! Лепш ужо «Чырвоныя кветкі»,— падтрымаў настаўніцу Ляксандра Сідорык.— Я за «Чырвоныя кветкі»...

— Хлопчыкі, баюся я, не пацягнем,— як не ўзмаліўся Аляксей Мікалаевіч. Ды тут усе дружна загаманілі:

— Прайдзёць! Не бойся, Ляксей Мікалаевіч. Вот пабачыш, прайдзёць!..

Настаўнік мусіў згадзіцца. Ён ужо бачыў гэтую п'есу

на клубнай сцэне ў раёне, дзе, канечне, былі моцныя сілы артыстаў-самадзейнікаў. Ставілі яе ў Горках — там таксама актыў большы: настаўнікі, камсамольцы з навакольных вёсак. Тут жа першая спроба. Як кажуць, першы блін... П'еса ж вялікая. Масавыя сцэны. Хор трэба каб быў...

За п'есу ўсё ж узяліся. Сёе-тое скарацілі. Асобныя масавыя сцэны выкінулі, сабралі хор. Праўда, песні тыя, а іх шмат у п'есе, не ўсе развучылі, але нічога — дзяўчаты спявалі песні, якія ім больш вядомыя,— свае, бацькавіцкія. Антаніна Кандратаўна выконвала ролю Зоські — нявесты партызанскага камандзіра Андрэя Блажко. На ролю камандзіра падмеўся сам Ляксандра. Трэба сказаць, што на сцэне ён трымаўся бойка, іграў з натхненнем; да яго мажной постаці вельмі стасаваліся і бесказырка, і цяльняшка, пазычаныя ў горкаўскіх артыстаў на адзін спектакль-прэм'еру.

Хлопцы пастараліся: адштукавалі драўляныя вінтоўкі, наганы, трашчоткі, якімі замянілі на сцэне стрэлы; хлопцы спачатку былі папрыносілі і прыпеканкі, але ад іх потым адмовіліся. Калі паказвалася сцэна расстрэлу партызан, за кулісамі стаяў адзін з хлопцаў і грукаў пранікам па дошцы — імітаваў стрэлы.

У гурце вясковых хлопцаў і дзяўчат на сцэне былі і мы з Кацяй. Каця не спявала — насіла жалобу па маці.

На спектаклі было поўна народу. Папрыходзілі дзяды і бабулі з Бацькавіч і моладзь з абодвух хутароў. Самы большы школьны пакой быў перапоўнены — недзе яблыку ўпасці, а ў парозе даўката, таўкатня. Многія ўвесь вечар, як ішоў спектакль, стаялі — у кажухах і світках, захутаўшыся ў хусткі і ў шапках; было цесна, горача, дымна. Паветра было такое, што аж лямпа часам гасла,— адчынілі акно, упусцілі свежы марозны струмень.

Артыстаў віталі шчыра, ад душы. На ўсіх зрабіла вялікае ўражанне сцэна расстрэлу партызан. Калі іх паставілі поплеч і прапанавалі завязаць вочы, а яны сказалі: «Страляйце. Мы — не баязліўцы!» — у зале пачуўся плач, усхліпы.

Артысты разыходзіліся позна. Заціхла вёска. Амаль ва ўсіх хатах патухлі агні. Мацнеў марозік, і свежы калядны сняжок рыпеў пад нагамі, ціхія гукі — палускванне марозу ў прысадах — бадзёрылі і жывілі настраёвасць. Артысты былі на сёмым небе ад шчасця. Аляксей Мікалаевіч, каржакаваты, вёрткі ў рухах, гаварун, цяпер сыпаў словамі, як з сяўні грэчку, памагаў сабе выразнымі,

рэзкімі жэстамі рук. Аднаго ён хваліў, другому ўказваў на промахі ў ігры. Адразу ж і падаваў новыя ідэі. Дамовіліся п'есу паставіць яшчэ раз, а там — можна нават з'ездзіць да суседзяў, у Арцюхі ці ў Ігліцу.

Супакоіўшыся, ахалодаўшыся на марозіку, Аляксей Мікалаевіч згледзеў у гурце мяне, крануў за плячо.

— А ты, Алёшка,— сказаў настаўнік да мяне,— сам ведаеш, не праваронь такую падзею ў Бацькавічах. Я сур'ёзна. Ясна?

— Ясна, Аляксей Мікалаевіч,— здагадаўся я, на што намякаў настаўнік, і сказаў голасна, каб усе чулі: — Напішу...

— Дык не забудзь жа: лепшыя артысты Лабачэўская і Сідорык,— кпліва кінуў нехта збоку. З яўным намёкам на тое, што нашы двое артыстаў ужо на даволі доўгі кавалак дарогі адсталі ад гурту. Яны ішлі галава к галаве, і, падалося, Ляксандра трымаў настаўніцу пад ручку.

«Глядзі ты, як хутка знюхаліся,— падумалася раптам.— Ета, відна, усё праз п'есу. Канечне ж, такая прыгожая наша настаўніца не падружыцца з няўклюдам, з дрывалом етым. Яны ўсё праз п'есу гамоняць. Іначай пра што ж...»

Мне карцела зачапіць Кацю. Нейкая невядомая сіла цягнула да яе. Яе мілы, заўсёды звабліва-ўсмешысты смуглявы тварык з бліскуча-чорнымі валасамі, заплеценымі ў таўставатыя косы, нечакана з'яўляўся ў думках, так нечакана і раптоўна, што я часам аж слупянеў.

Надаралася гэткая ўдача, удалая хвіліна — пра ўсё, што хвалявала, пагаварыць з Кацяй. Але як падступіцца? Ёй, канечне, не да мяне цяпер: яна сама за гаспадыню ў хаце. У яе вунь колькі турбот!..

Здалося, і мароз як бы паслабеў. Не чутно яго лёскату ў веццях ліп. Над садам Карпа Півоні высока, у лёгкіх аблачынках купаўся маладзік — чысты, назублены сярпок. Пачыналася завея, завіруха.

На паваротцы я ўсё ж затрымаў Кацю. Мы стаялі, сціснаныя, ля весніц, слухалі, як у канцы пад Мікольскам яшчэ барукалася з марознай цішай хмельная песня. Каця маўчала, уздыхаючы. Маўчаў і я як утрапёны, як бы на мяне чмур які найшоў. Як усё роўна адняло мову. Раптам Каця заспяшалася, сціснана і неяк надта ласкава прамовіла: «Позна ўжо, Алёшка, бацька будзе ўшчуваці...»

9

Зіма-валачобніца гуляла ў хмельным буянстве. Па вечарах бацькавіцкія мужыкі — маладыя і старыя — збіраліся дзе-небудзь у цёплай хаце пакурыць гамэрняй, абмяняцца навінамі, пабалакаць, «перамыць косці» адзін аднаму і суседзям, за вочы і ў вочы,— і доўгія зімовыя ночы не так абрыдзяць. Мужчыны калі ўжо аблюбуюць, бывала, чыю хату — у каго дзяцей дробных няма ці заўсёды па пяколачку дыхае цяпельца і гаспадар газы не рэжыміць,— то хоць махалам махай, не адкараскаешся. А калі яшчэ і сам гаспадар любіць пачасаць язык, ахвочы пабыць у грамадзе, з людзьмі пабавіць час, ды да таго ж і гаспадыня не злосная і не жмінда — тады дзверы ў такой хаце не зачыняюцца, заўсёды раскрыты на́пята для кожнага.

У Бацькавічах было некалькіх такіх хат. Людзі ішлі туды кожны вечар, не турбуючыся і не баючыся, што іх там сустрэнуць крывым вокам і не адкажуць шчыра на твой «добры вечар».

Спярша, як яшчэ Бацькавічы толькі перабудоўваліся на калектыўныя рэйкі, добрым прыстанішчам для вячэрніх зборышчаў была цёплая і дамавітая хата дзеда Антона Сідаронка, якога ўсе ведалі па мянушцы Кур.

Дзед Антон — невялікага росту карузлік, з хітрымі, вострымі вочкамі, пышнымі, з сівізною, пракуранымі вусамі, кароткай сівой бародкаю. У Кура заўсёды тырчала з рота адмысловая грушавая люлечка з бліскучай меднай аправай і крывою іголкай на шнурочку — для выкалупвання га́ры; цераз левую руку вышэй локця перакінуты кісет, напоўнены самасадам-мацаком.

Дзед Антон звычайна сядзеў на прыпечку, звесіўшы ногі на хату, і бесперастанку смактаў сваю люлечку. Збоку, недалёка, у лучніку гарэла лучына. Як толькі лучыніна дагарала, дзед з печы тут жа, не ўстаючы, браў новую і прыпальваў... Дзед маўчаў, але чуйна прыслухоўваўся да гаворкі, якая плыла то марудна, то ўспыхвала, як новая лучына. Можна без перабольшання сказаць, што дзед вёў рэй усёй бяседы.

Мужчыны, якія збіраліся ў дзеда, сядзелі бадай заўсёды на сваіх аблюбаваных месцах: Харытон і Сямён-Марцін — на ўслончыку, ля акна на вуліцу, мой бацька на палку, недалёка ад гаспадара, зяць Сцяпан Цярэшка, самы, бадай, маладзейшы з сталых наведвальнікаў, нядаўна

ажаніўся з большай дзедавай дачкой Ганкай; Сцяпанаў бацька Іван Мацвеевіч, рыжабароды смяшлівы чалавек, як звычайна, вялікімі крокамі туды-сюды мераў маснічыны і гамзаў пра адно і тое ж, як старэйшы яго брат — вялікі гаварун і праныра — прабіўся ў бацюшкі, а жылі Цярэшкі ў беднасці і галечы, беднякі былі на ўсю акругу. Калі ў Піцеры перамагла рэвалюцыя 1917 года, быццам той бацюшка перайшоў на бок бальшавікоў, і яго не зачапілі.

— Відна, там такей быў бацюшка,— перапыніў свата дзед Антон, папярхнуўшыся дымам, закашляўся, і праз кашаль пачулася: — П'яніца, гламызда твой брат быў, калі ты хочаш знаць. Помняць, як пароў спічагом драўляным дзяцей, што не хацелі закон божы вучыць. Памятаюць і нашы, каторыя тады вучыліся...

— Кажуць, ён недзе ў Кіеве цяперака,— як бы знарок падгрэчыў дзеда Харытон, вялікі перасмешнік, ад якога ніколі ніхто не ўратуецца, абгаворыць кожнага, хто патрапіць на вочы.

— Якей там у Кіеве. Схапілі, кажуць,— грыміць голас з парога. Гэта ўвайшоў стары Антонаў сусед і равеснік, доўгі, як жардзіна, сівавусы стары, якога звалі дзіўна — Максач, а поўнае імя яго было Максім. Усміхаючыся ў густую з сівізной бараду, Максач тлумачыць: — Сядзіць жа ў кутузцы твой брахнінька-бацюшка. Палітграмату чытае сваім кумпаньёнам.

Гарачлівы і востры на язык Антонаў сват з ходу, нахопам навастрыўся быў кінуцца ўжо на дзядоў Антона і Максача, як у дзвярах з'явілася падгерыстая постаць Сямёна-Марціна, і размова скіравалася ў новае рэчышча. Усім хацелася даведацца, як праўленне паставілася да гаспадароў, якія незаўважна пахавалі свае плугі і хамуты, напрыцягвалі на двары сані і мажары. Ужо набліжаецца дзень пробнага выезду, а ў брыгадах недалічваюцца барон, плугоў, калёс, дугаў, аглобляў; парасхватвалі і вупраж. Цікава, куды глядзіць праўленне?

— Прахціканты, маталыгі,— рагоча ў пракураныя, калючыя вусы дзед Антон.— Яны, прахіндзеі, думаюць, што калгас разваліцца...

Вядома, дзед выказаў тое, што непакоіла і хвалявала ўсіх. Чуткі ўсялякія хадзілі: маўляў, да вясны, а там зноў кожны сеяць будзе на сваёй палосцы. Ды не ўсе выказвалі ўголас свае сумненні і свой непакой. А дзед Антон сказаў адкрыта, смела. Жыў ён небагата, хаця гаспадар з яго быў

някепскі, надзел ягоны быў узорам для іншых — на ягонай палосе спела ўмалотнае жыта, буяла густая ярына, садок у дзеда быў — ад яблыкаў голле гнулася, сабе хапала, і людзям не шкадаваў яблычак, за што і паважалі яго. Сыны яго падраслі ўжо і пажаніліся. Каб не калгас, вядома, то тую, хаця і добрую, палоску трэ было б падзяліць між імі, і ад яе асталіся б толькі межы-акраўкі. Разумеў дзед Антон усё і цвёрда, абедзвюма нагамі стаяў за калгас. Як сам казаў, не вагаўся асабліва, не брыкаўся, а адразу ў аглоблі...

— Няхай. Няхай хватаюць, дахватаюцца,— загаварыў Сямён-Марцін, напаляючыся, размахваў запэцканымі ў чарніла сухімі рукамі, у такт сваім словам пахітваў доўгім гарбатым носам.— Ужэ выбралі камісію. Будзе з раёна прадстаўнік і пойдзе па дварох...

— Трэба, братухны, лазню жарчэй напаліць. А што, як каму-небудзь давядзецца ў лазні пасядзець,— апасліва загаварыў Максач і раскатурхаў Харытона, які ўжо быў пачаў кляваць носам, угрэўшыся: — Чуш, Харытонка, там не ўсцягнуў хто-небудзь перадок твой на гарышча? Яго ж нешта нямашака пад паветкай. Ужэ нехта звалок, прыхаваў недзе тыя твае жалезныя колы...

— Вярзеш ты, дзядзька Максім, нейкую верзяю, абышто плявузгаеш, як наеўся абы-чаго,— падхапіўшыся, прабурчаў Харытон і нервова заёрзаў на ўслончыку.— Я ўсё здаў, што ад мяне было паложана. І вазок адвёз, і акаваныя колы. Усё чыста здаў!..

— А дзе саламарэзкі? Куды іх парасцягвалі? — усходаўся Антонаў зяць Сцяпан. Ён увесь час маўчаў, чуйна прыслухоўваўся да таго, што гаварыў Сямён-Марцін.— Пад паветкай у Карпа дзве саламарэзкі стаялі, і ўжо няма. На аднэй, балбочуць, Агей ужо сечку сабе рэжа...

— Ета ягоная і ёсць,— падняла галаву з печы Антонава жонка.— Етую ж чалавек здаў, то ён яе мае права і забраць назад, калі што якое...

— Глядзі, якая мая Катра мудрая! — аж захліпаўся ад смеху гаспадар.— Дужа ты ў мяне, баба, разумная! Дык аддай яму ўсё — і калёсы, і атосы, ды няхай коціцца з калгаса... На ўсе чатыры стараны!..

— Во ета праўда, Антон Клімавіч,— як абліты кіпнем, падхапіўся Сямён-Марцін і каршуном да мужчын: — Хопіць вам тут агітацыю распускаць. Калі хочаце знаць, вы так можаце на сённяшні дзень стаць падрыўнікамі калгаса. Панятна?..

— Ясна-панятна,— прамовіў Антонаў зяць Сцяпан, скеміўшы, што і яму можа ўляцець, калі дойдзе гэтая размова да Гопкі, а тым больш да Архіпцова, які зноў прыехаў у Бацькавічы.

Стары Антон, зморшчыўшыся, сыкнуў на зяця і, налучыўшы момант, дыпламатычна, з намерам «перамяніць пласцінку» перадаў свой зашмальцаваны кісет на хату:

— Закурвайце, мужчыны. Не слухайце етага балабона!..

Мужчыны задымілі цыгаркамі і павялі размову пра тое, як нехта некалі бычка на лазню цягнуў, каб травіцу на столі стравіць, і яшчэ пра такія ж смешныя гісторыі, на якія бацькавіцкія жыхары вельмі здатныя.

Карп Кузьміч, зблажэлы, стаяў ля стала перад членамі праўлення і, прыціснуўшы рукі да грудзей, пускаў у ход усё сваё красамоўства.

— Грамадзяне-таварышы,— аж ледзь не біў паклоны чалавек, калоцячы кулаком сябе ў грудзі.— Браточкі. Не магу ж я ўгледзець, хто ета ўсё здзелаў. Няхай мне рукі і ногі паадсыхаюць, няхай яму адлежаць у хваробе, калі я хоць відзеў тыя колы. Я там і блізка не быў. Я вам, таварышы, усё здаў, і карыстайцеся на здароўечка, дарагія таварышы!..

Ён змоўк, падкаціўшы вострыя шэрыя вочкі пад столь, тады ўставіўся ўмольным позіркам на старшыню, чакаючы яго прысуду.

— Так тыя колы самі закаціліся да цябе ў сянніцу? — прыжмурыў левае вока старшыня і грымнуў на ўсю хату: — Колгоспна маёмасць — не знаеш, што за гэта табе палагаецца? Разумееш?..

Карп прыціснуў рукі да грудзей, залепятаў, як перад абразамі, забожкаў:

— Што хочаце, усё бярыце. Кажух апошні аддам... Усё, усё як ёсць, толькі не судзіце!..

— Сэмэн, фіксуй! — старшыня аж бліснуў бялкамі вачэй, з іх аж красала злосць, абвёў усіх запытальным позіркам: — Што рабіць будзем, мужчыны?..

— Паколькі, як сам заявіў Карп Кузьміч, яшчэ да таго, як мы зачалі абход па дварах,— пусціўся ў дыпламатыю Якаў Кавалік,— то можна, думаю, абмежавацца абмеркаваннем і суровым папярэджаннем. А як вы?

— Мы не маем на тое права,— сцепануў плячамі Архіпцоў.— За разбазарванне арцельнай маёмасці — пад суд!..

Карп Кузьміч схапіўся рукою за сэрца, жахліва падкаціў вочы і застагнаў:

— Пажалейце ж, людзі добрыя!..

Старшыня зморшчыўся, бы яму забабелі зубы, пашкроб у патыліцы.

— Наступнага. Хто там?..

Дзверы з рыпам, бы нехаця, расчыніліся, і аброслы шчаціннем мужычок у злямчанай авечай шапцы, у махнатай жаночай хустцы на шыі, у вялізных разбітых чунях, падшытых сырамятным цялячым ласкутом, з'явіўся ў парозе. Цяжка, шумна дыхаў, азіраўся па баках. Усе неяк адразу ажывіліся.

Андрэй Кавалік — брат Якава, брыгадзіра і члена праўлення. Андрэй нешта скоранька пачаў мармытаць, але нельга было нічога разабраць — з рота адно што пырскала сліна. Шапка ў яго руках трымцела, бы на ветры вехаць сена.

— Што ў яго там? — звярнуўся старшыня да Сямёна-Марціна, які дакладваў пра ўсіх людзей, каго выклікалі на «прачоску».

— Паступіла заява,— старанна чаканіў Сямён-Марцін,— што грамадзянін Андрэй Кавалік зарэзаў цяля ад свае каровы без дазволу на тое...

— А што? Я адзін? Усе рэжуць,— пачаў апраўдвацца Андрэй, няўцямна азіраючыся па баках.

— Чаго ета ўсе? — Сямён-Марцін ва ўпор уставіўся на Андрэя ўтрапёнымі вачамі.— Заява паступіла на цябе, Андрэй Іванавіч...

— Як ты сам не знаеш, Сямёнка,— хітрая ўхмылка скрывіла шчаціністы твар Андрэя.— Людзі рэжуць, і я разгавеўся...

— Сёння цялё — заўтра карова,— узняў ад папер стомлены твар Архіпцоў і загаварыў павучальна: — Калі кожны зарэжа сваё цялё, то калгас астанецца без кароў. А ёсць цвёрдае заданне стварыць да вясны малочна-таварную ферму. Ясна?

— Яснае дзела,— уздыхнуў Гопка.

Невядома, пра што падумаў тады камуніст-дваццаціпяцітысячнік Грыцко Гопка. Можа, перад яго вачамі прамільгнулі хатка дзікаватага Андрэя, занесеная па вільчык снегам, з адным абледзянелым акном пад саламянай матай, і мурзатыя Андрэевы дзеці — чарнавокі падлетак Адамка, які ўсё лета і дняваў і начаваў з бацькам ля кал-

гасных коней, крыху большая, але яшчэ не дарослая Параска, якая дзень пры дні ўходжваецца ля калгасных авечак...

А можа, Грыцко згадаў сваю Галю-прыгажуню, што згасла без пары, набыўшы яшчэ ў галодны год на Украіне язву страўніка, а тады яе схапіла нейкая пошасць, і давялося пахаваць Галю без пары, далёка ад роднага краю... Грыцко ўспомніў, як гэтай ноччу прахапіўся меншы яго хлопчык — Рыгорка і спрасоння крыкнуў: «Не хачу. Не хачу я!.. Мама, мамачка мая родная!..» Грыцко злавіў сябе на думцы, што вось дзеці ўжо не будуць ведаць пра тое Крыварожжа, яны ўжо гавораць так, як і ўсе бацькавіцкія дзеці. А Каця — Каця зусім як маці. Ужо трэці год ходзіць у школу, вучыцца па-беларуску, а гаворыць, як Галя,— чыстая ўкраінка.

Старшыня ўздыхнуў і нязлосна паглядзеў на Андрэя, ацішана, але рашуча прамовіў:

— Вы свабодны, дзядзька Андрэю. Там шчэ хто?..

...Тады, перад вясною, многія з бацькавіцкіх сялян былі парэзалі цялят, і з людзей строга спаганялі, не зважаючы ні на што. Па нагаворах заможных гаспадароў многія сяляне забіралі з брыгаднага двара свой інвентар, стараліся, каб як-небудзь ухапіць вехаць сена ці ношку саломы для сваёй Буронкі ці Рагулі, якія качанелі ў пуньках на камлыгах, без падсцілкі.

Карпа Півоню, які неўпрыкметку быў сцягнуў колы з былой сваёй выязной брычкі і прыхаваў у сене, адправілі пад канвоем у раён, дзе ён з месяц пілаваў дровы для раённай пякарні. Андрэя ж, як несвядомага элемента, прабралі на сходзе і аштрафавалі працаднямі.

Увогуле, у Бацькавічах не дужа каб кралі калгаснае, не было такое завядзёнкі. Але асобныя выпадкі былі. Як, скажам, з вехцем сена ці якое травы ўлетку, якая скрозь буяла на ўзмежжы, ля дарог, на сцежках, і такія шчырцы, як той Дзямід Півоня, не лічылі гэта за крадзеж, а хутчэй — як праяўленне гаспадарлівасці, уласцівай для сапраўднага вясковага чалавека.

Старшыня ж за такое не перадаваў у раён, а разбіраўся сам на месцы ці выносіў на праўленне.

...Напрадвесні ў Бацькавічах выбралі за старшыню Іллюка Каваліка, мясцовага чалавека — нядаўняга камандзіра Чырвонай Арміі, які дагэтуль працаваў брыгадзірам.

Па першых праталінах Гопкі ад нас выехалі. Грыцка Гопку прызначылі старшынёй калгаса «Новы шлях» у далёкай лясной вёсцы, аж на другім канцы раёна.

Мы рассталіся з Кацяй нечакана і раптоўна.

10

Зіма, доўгая і снежная, нарэшце пачала здавацца, пайшла на спад.

На дварэ стаяў сакавік, месяц святла. Тая пара, калі дзень ужо зраўняўся з ноччу. Зіма з вясною сустракаліся. У народзе гэты дзень называўся — стрэчанне. У Бацькавічах казалі — саракі. Зрання цісне марозік, снег, белы, моцны, зусім без прыкмет чарнаты і не пабіты сонечнымі стрэламі, іскрыцца белізною, а як трохі ўднеецца, сонца паднімецца вышэй, угрэе добра, са стрэх пачнуць са звонам падаць капяжы, і на дварэ ля пуні праклюнецца баразёнка-раўчучок. Смешна, як да яго спяшаюцца куры. У падстрэшшы весела куляюцца і б'юцца мурзатыя вераб'і. Казалі, што на саракі з выраю прылятаюць першыя птушкі. Малым казалі маці: «Сорак саракоў усякіх птушак з цёплага мора ляціць удвору». Яшчэ пячэ мароз і снег-мацак дражніцца з пякучым сонцам, нібы выхваляецца сваёй ядранай белізною. Ды ўжо сям-там відаць, як сонечныя пікі праткнулі той снег аж да самай зямлі і на пагорках з'явіліся праталіны — вочы вясны.

У Бацькавічах на саракі ў кожнай хаце пяклі з мукі птушачак — хто з пшанічнага цеста, а хто з бульбянага, з таго, што ішло на праснакі і каржы. Дзеці бралі птушачак у кішэні, выбягалі з хат; на ўгрэве, пад сонцам, забаўляліся з цёплымі, толькі што з печы птушачкамі, мяняліся адзін з другім, падкідвалі іх угору, з імі гушкаліся на арэлях. Саракі помніліся доўга. Саракоў чакалі, як вялікага свята. Малыя загадзя яшчэ цікавіліся ў дарослых, ці скора будуць тыя саракі — тады можна будзе выйсці з хаты, падурэць на дварэ. Звычайна ў чыім-небудзь гумне на сохі ў зацішку чаплялі вяроўку ці вожкі — гушкаліся на арэлях. Пагушкацца любілі і малыя, і хлопцы, і дзяўчаты, паглядзець на забаву моладзі ахвотна прыходзілі і дзядзькі...

Той год на саракі Сцяпану Міронаву, Адаму Чэрніку і мне прыйшла позва з раёна: з'явіцца ў райком ЛКСМБ на зацвярджэнне. У нас ужо была свая камсамольская

ячэйка, якая прыняла нас траіх у камсамол. Наперадзе нам было яшчэ самае галоўнае — зацвярджэнне на бюро райкома камсамола.

Мы доўга і старанна рыхтаваліся: вывучалі Праграму і Статут ВЛКСМ, чыталі газеты і трэніраваліся, як будзем адказваць на пытанні, якія могуць нам даць у райкоме. Мы, вядома, дужа хвалявaліся.

— Не бойцеся,— супакойваў нас перад ад'ездам настаўнік Аляксей Мікалаевіч, які быў сакратаром нашай камсамольскай ячэйкі.— Галоўнае, смела трымайцеся. Там жа свае людзі. Вы ж актыў наш, можна сказаць, будзеце першымі камсамольцамі ў сваёй вёсцы!..

Выехалі мы ўранні, яшчэ з печаў рэдка ў якой хаце віўся дымок. Дарога трымалася, як зімой. Каняка наш хоць не надта добры бягун, ды нічога, цягнуў лёгка наслiжаныя палазы, і сані лёгка беглі з горкі. У перадку сядзеў Адам, белабрысы хлопец у паўкажушку, а паверх — накідка-чухмянёк з башлыком сваёй работы, як у дарослага мужчыны, у мяне і ў Сцяпана на плячах пінжакі. Праз іх у запазуху лёгка прабіраўся мароз. Ва ўсіх абутак вядомы — лапці. У каго з лыка, у каго пяньковыя чуні.

На горку конь наш запаволіў хаду. Нам жа здалося, што ён зусім стаіць на месцы, не варушыцца — так мы хвалявaліся.

— Паганяй! — крычу я.— Спознімся, трэба ехаць скарэй.

— Я ж паганяю, дак конь етый, як не знае, каго вязець,— жартуе Адам.— Но, гэндлік!..

А Сцяпан, хутаючыся ў бацькаў башлычок, усё мыкае, шэпча сабе пад нос нешта, усё роўна як моліцца. Я ціснуся спіною да яго і выразна чую — ясна далятаюць асобныя словы: «СНК СССР... ЦВК БССР...» І зноў ціхі шэпт, абрыўкі слоў. Тады адразу, неспадзявана штурхель мне ў плечы. Сцяпан ад хвалявання аж не можа патрапіць зубам на зуб.

— Алёшка, чуеш, хто ета СНК СССР?..

Я называю прозвішча тагдышняга старшыні Саўнаркома СССР, і Сцяпан супакойваецца, але ненадоўга. Праз некалькі хвілін яшчэ штуршок у плечы, яшчэ новае пытанне. Сцяпан больш за нас хваляваўся, і яго хваляванне перадавалася нам. І не без падстаў.

Тады, між іншым, да паступаючых у камсамол прад'яўляліся строгія патрабаванні. Як і ў ячэйцы, так і ў райкоме пры прыёме ў камсамол задавалі нам шмат пытанняў.

Даехалі мы хутка. Яшчэ ў мястэчку над стрэхамі плавалі пахучыя дымкі —не выпалілі ў печах, а ў райкоме ўжо ішоў прыём. У калідоры мільгалі шэрыя світкі, кажушкі, шапкі-трывухі, ваўняныя стаўбункі, картузкі з патрэсканымі брылямі; зрэдку можна было ўбачыць і белую ці каляровую хустку — дзяўчат было зусім мала.

Час ад часу адчыняліся дзверы, і адтуль выходзіў хтонебудзь з гэтых вясковых хлопцаў, расчырванелы, як спалоханы і адначасова радасны, з чырвонай кніжачкай у руках — камсамольскім білетам. Перапоўненае шчасцем сэрца тахкала гулка і ўтрапёна, і хлопец спяшаўся выказаць сваю радасць і сваё ўзрушэнне, што цераз край напаўнялі ўсю яго маладую істоту.

— Браточкі, не страшна, зусім не боязна! — громка, аж захліпаючыся ад радасці, выгукнуў нейкі віхрасты хлопец, джога, востры на язык, выйшаўшы з кабінета з камсамольскім білетам у руках.— У мяне дак адно спыталі — пра Варашылава...

— Пра Варашылава? — наш Сцяпан аж прасвятлеў, замігаў густымі, як у дзяўчыны, вейкамі, неяк смешна павёў убок сваім доўгім сухім носам і ціхенька выціснуў: — А я думаў!..

З дзвярэй прасоўваецца ўсё адно як кужалёвая галава дзяўчыны:

— Калгас «Ударнік». Ёсць? Заходзьце. Ды не гамузам, а па адным...

Сцяпан валюхнуўся першы. Спалохана азірнуўся па баках і, угнуўшыся, знік за дзвярыма. З затоеным дыханнем мы стаялі, чакаючы, што з ім будзе. Як бы прайшла цэлая вечнасць, пакуль Сцяпан паказаўся, вясёлы і нейкі, як нам падалося, пасталелы і заспакоены. Той жа штурхель мне ў бок:

— Давай. Не страшна!..

Я пераступіў парог кабінета — невялічкага пакойчыка з шалёвачнай пераборкай і рыпучымі, такімі ж шалёвачнымі дзвярыма, абклеенымі знутры шпалерамі. За сталом, засланым чырвоным міткалём, сядзела двое мужчын, аднаго з іх — высокага, крыху сутулаватага, над ілбом цэлым вехцем кучаравіўся смольны чуб — я ведаў: гэта быў першы сакратар райкома. Зводдалі, ля расчыненай шафы, за прыстаўленым столікам сядзела бялявая дзяўчына ў ахоўнага колеру кофтачцы, правільней — у гімнасцёрцы. Яна нешта пісала.

Чарначубы назваў маё прозвішча, імя і імя па бацьку, год нараджэння, нацыянальнасць і г. д.

Усе, як мне падалося, працялі вачамі маю шчуплую постаць у шэрым выліняльым пінжачку, у чунях.

— Якія будуць пытанні? — звярнуўся да членаў бюро сакратар і ўзняў вясёлыя шэрыя вочы, ва ўпор глядзеў на мяне.

Мужчына, што сядзеў па правы бок ад сакратара райкома, сказаў:

— Няхай таварыш адкажа, хто можа быць членам ВЛКСМ...

Я пераступіў з нагі на нагу, хапануў поўным ротам паветра і не сваім, перасеўшым голасам завёў:

— У члены ВЛКСМ прымаецца перадавая, свядомая, палітычна праверапая...

— Гэта ён ведае,— крануў за плячо таго мужчыну сакратар і да мяне: — Скажы, таварыш Баянок, нешта ты цяпер не пішаш у раённую газету... Прапясочваў некаторых. Правільна! Што ж, можа, спужаўся чаго?..

— Не. Не спужаўся,— сумеўся я.— Проста мы цяпер больш займаемся сваімі справамі. Гурток драматычны стварылі. Лікпункт у нас — такжа работа...

— Адным словам, усё ў вас там ціха і гладка? — не зусім ясна для мяне было, куды хінуў сакратар.— Спадзяюся, што селькораўскае пяро не ступіцца, не заржавее. Панятна, таварыш камсамолец?..

— Панятна...

Я пачуў, як сакратар райкома прамовіў: — Прымаем?

— Так. Прымаем,— адказалі ўсе члены бюро.

А дзяўчына ў гімнасцёрцы паспела ўжо выпісаць камсамольскі білет. Перадаючы яго мне, сакратар сказаў:

— Віншую, таварыш, з уступленнем у члены Усесаюзнага Ленінскага Камуністычнага Саюза Моладзі...

Ён моцна паціснуў мне руку. З трапяткім сэрцам, нічога не сказаўшы, я шуснуў за дзверы. Было такое пачуццё, што я ўзышоў на нейкую гару і, задыхаючыся ад борздай хады, не мог аддыхацца. Я адчуваў сябе на гары, з якой радасна было глядзець на свет, на бязмежныя прасцягі, што развінуліся перад вачамі...

...З мястэчка мы выехалі апоўдні. Таго хвалявання ўжо як не было — ва ўсіх у грудзях буяла радасць. У кішэнях ляжалі дарагія кніжачкі з сілуэтам Ільіча на вокладцы, а ў галовах — рой гарачых думак і вясёлкавых летуценняў.

Не палохала нас дарога. Яна, з раніцы такая лёгкая і сухая, у поўдзень зусім раскісла. Там, дзе сліжыўся снег, ляжала спрэс рыжая каша. Палазы ўразаліся глыбока, і конь натужна цягнуў сані, спацеў увесь і аж курэўся парай.

Сонца ўжо свяціла нам з другога боку, і ў высокім чыстым небе плавала празрыстая сінеча. Весела перашэптваліся прыдарожныя бярозы, старанна абмытыя, падсвечаныя яркім цёплым сонцам.

Канём правілі па чарзе. Адзін сядзеў у санях. Двое шлёпалі пехатой — ногі прамоклі, у чунях цвікчэла вада. Дзіўна, што ўсім было цёпла, і не так ад сонца, як ад таго вялікага пачуцця і вялікай радасці, якія перапаўнялі нашы юныя гарачыя сэрцы. Мы сталі камсамольцамі. Такімі, як наш настаўнік Аляксей Мікалаевіч і нашы старэйшыя таварышы Андрэй, Іван, што ўжо вучыліся ў горадзе, як Васіль, што першы з бацькавіцкіх беднякоў выбіўся ў настаўнікі. Цяпер мы станавіліся на іх месца. На нас землякі ўскладваюць вялікую надзею. Мы — культурная сіла ў Бацькавічах. Мы крочым, не адчуваючы, што прамоклі па пояс, што нашы пінжакі і кашулі расхрыстаныя. Нам лёгка і хораша. Мы як бы выраслі ў сваіх вачах.

Няхай сабе сані вышэй палазоў у талай вадзе, няхай дыбае сабе ціха наш конік. Не глядзім, куды лацвей ступіць,— крочым па лужынах, месім рыхлы снег-кашу. Нам і есці не хочацца — нашы торбачкі ляжаць некранутыя, хоць там на полудзень — добрыя акрайцы хлеба і ладныя скваркі.

За пагоркам нечакана, як намаляваны, узнік знаёмы маяк-вышка, у яшчэ голых бярозах і зялёных соснах віхлялася знаёмая дарога.

Блізка ўжо Бацькавічы.

11

У дзесятую нядзелю ад вялікадня ў старой і раскіданай вёсцы Горкі, якая славілася вялікім дваром абшарніка Стошы, царквой і святою крыніцай, зблізку і здалёк збіраюцца людзі на кірмаш. На дзесятуху — так называецца кірмашовы дзень — з'язджаюцца аж з усёй ваколіцы ганчары, калёснікі, бондары, лыжачнікі, самапрадачнікі; едуць пчаляры з мёдам, воскам, кавалі са сваім таварам — вілкамі, чапёламі, качэргамі, сякерамі... Едуць і

джгаюць пешшу пакупнікі, каб набыць сёе-тое для гаспадаркі. Ідуць і едуць маладыя, каб патаўкацца ў гамэрні, паслухаць песні лірнікаў, паскакаць пад гармонік, паглядзець на ўвесь стракаты кірмаш,— такое бывае адзін раз на год. Яшчэ за тыдзень ці болей гавораць пра дзесятуху ў кожнай хаце, старыя рахуюцца, што купіць, што можна будзе прадаць. Моладзь строіць свае планы: збірае грошы, каб мець на гасцінец — семкі, цукеркі, пернікі; хлопцы дамаўляюцца аб сустрэчах на дзесятуху ля крыніцы, у самым шумлівым месцы. Да крынічкі з гары ўніз вядуць сходцы, па іх увесь кірмашовы дзень рухаецца натоўп — адны ўніз, другія ўгору. У жанчын і дзявок — глечыкі, гарлачыкі, біклагі з празрыстай вадой. Яна, казалі, гаючая, памагае ад дзевяноста дзевяці хвароб.

За колькі дзён у хаце ў нас адбываецца прыкладна такая гаворка:

— На дзесятуху, відна, трэба б з'ездзіць,— гаворыць да маці бацька.— Шайкі ўжо саўсім парассыхаліся, да бёрда ты ж хацела купіць...

— На якое ліха тое бёрда,— адмахваецца маці,— там на якія дзве губкі будзе таго палатна, дык у Ганны пазычу... Грошы ж, сам знаеш...

— Грошы? — задумваецца на хвіліну бацька, але адразу ж знаходзіць выйсце: — Возьмем пшаніцы, прададзім, будуць і грошы...

— Якая там пшаніца,— аднекваецца маці.— Шыгалле адно асталося, я амаль усю пшаніцу на крупы патаўкла...

— Ого, мяшок жа ж поўны быў,— сур'ёзна непакоіцца бацька за тую пшаніцу — першы свой заробак у калгасе.

Прыгадалася, як яго тады ўдала разыгралі мужчыны з тою пшаніцай, калі атрымліваў з кладоўкі.

Кладаўшчык зважыў мяшок — восем пудоў. Пшаніца важкая, зерне налітое, бы волава, намалотная ўдалася тады — нейкі прывазны гатунак. У Бацькавічах той год яшчэ за старшыню быў Гопка, то папаелі людзі пшанічных бліноў, а хто меў багата працадзён, то ўдосталь і хлеба паеў з пытляванай мукі. Даўней не было завядзёнкі, каб хлеб пячы з пытляванкі. Пшанічны хлеб пяклі адзін раз на год, на вялікдзень. Ружовыя пшанічныя боханы называлі «паска». За калгасам той Андрэй-бедалага неяк пахваліўся мужчынам: «У мяне цяпер, браточкі, амаль кожны дзень паска!..» З яго смяяліся, бо ведалі, што яшчэ нядаўна ў Андрэя і праснакі на стале не залежваліся, бо дзеці і праснаку жадны былі.

Мужчыны з зайздрасцю пазіралі на ладны мяшок з пшаніцаю, які атрымаў на свае працадні бацька — ён ужо сам працаваў за каваля. За малатабойца стаў Васіль Шылай; аддзяліўшыся ад старога Лепятня, ён жыў на хутары за паўкіламетра ад калгаснага свірна. Васілю, які пад той час сядзеў на ганку — курыў з мужчынамі, нехта шапнуў:

— Аняго данясеш? — І паказаў на мяшок з пшаніцай, ля якога тупаў бацька, думаючы, як гэта каб трапіўся хто з фурманкай ды падкінуў мяшок з пшаніцай.

— А што будзе, як данясу? — выгукнуў Васіль, сплёўваючы недакурак.

— Куды данясеш? Можа, да сваёй хаты, на пасёлак? — здзівіўся бацька, пакратаўшы васьміпудовы мяшок, і раптам сур'ёзна прапанаваў: — Данясеш — твая пшаніца...

— Давай. Панясу.

Яму паддалі на плечы. Васіль ціха і цяжка паплёўся па шляху з тым мяшком на плячах. Мужчыны глядзелі ўслед, вохкалі і жартавалі, а бацьку было, вядома, не да жартаў — увесь заробак так лёгка спляжыўся.

Бацька разгублена і з цьмянай надзеяй, што Васіль спыніцца, пазіраў яму ўслед, а той усё пасоўваўся далей, аж пакуль не схаваўся ў коўратах свайго двара.

Бацька прыйшоў дадому як мыла з'еўшы. Васіль жа неўзабаве, зайшоўшы да нас у хату, паклікаў бацьку ў кузню і сказаў, зачырванеўшыся:

— Дзядзька, забярыце ж сваю пшаніцу. Няхай хлопец запражэ каня і прывязе...

Потым хітра падмігнуў бацьку:

— Ета што з табою, дзядзька, удваіх працуем. Каб хто другей прайграў, то не аддаў бы. Яй жа богу, не аддаў бы. А што прайграў, то я не вінаваты. Было не закладацца.

Бацька хмура маўчаў, адчуваючы сваю вінаватасць. Сапраўды, чаго ж яму крыўдаваць на Васіля, сам жа набіўся з гэтым сваім закладам.

— ...Столькі пшаніцы! — нібы ачнуўся ад думак бацька і сам быў кінуўся ў сеначкі, дзе стаялі мяшкі са збожжам, але раптам аціх: — Няўжо ўсю з'елі!..

— Не з'елі, канечне,— адразу знайшлася маці, дзівячыся, як гэта гаспадар так распаліўся.— Во ўжо забыў, што пазычыў Косціку, а, тае ж, за аўчыны, за дубленне Кірылу — два пуды...

— Там яшчэ асталося, возьмем, а потым мне дадуць аванс, выпішу,— крыху ахалодаўся бацька і тут жа да мя-

не: — Алёшка, на дзесятуху пабудзеш дома... Мы з табою паедзем затое на Латакі, там сёлета будзе вялікі базар. Добра?..

Я моўчкі кіўнуў галавой, бо ў мяне цяпер выспеў свой план: хоць я не пабуду на кірмашы, затое, як мне думалася, гэта кампенсуецца з ліхвою.

Усе раз'едуцца на кірмаш, у вёсцы амаль нікога не астанецца, нават ні старшыні калгаса, ні брыгадзіра, і я вазьму з крука на сцяне ключ ад кузні і распалю сабе горан. У мяне выспявала даўняя задума — скаваць сабе складанчык, такі, якія рабіў яшчэ дзед Мароз з Чырвонай Гары,— лёгкі, прыгожы, з медзянымі тронкамі. Тронкі ў мяне ўжо гатовыя — прыхаваны, а вось нож, лязо я надаўмеўся зрабіць сам. Я ж бачыў, як гэта рабіў каваль...

Я спяшаўся, каб справіцца, пакуль пачнуць вяртацца людзі з кірмашу. Як толькі фурманкі перасталі грукацець на вуліцы і нашы выбраліся з дому, я подбегам памчаўся да кузні, захапіўшы карабок з запалкамі. Нібы злодзей, дрыжачымі рукамі адамкнуў кузню, прашмыгнуў туды і ўзяў на завалу знутры дзверы.

Горан умомант разгарэўся і палаў на ўсю моц. Мех, захліпаючыся, сапеў, іскры сыпаліся, шугалі навокал, ярка асвятляючы кузню. Я ўхапіў абцугамі металічную пласцінку і кінуў яе ў гарачае вуголле, пакратваючы адной рукой мех за рукавіну, другою трымаў у абцугах пласцінку — паварочваў, і яна хутка зрабілася чырвоная, затым пазалацілася і стала ўраз зусім белая.

Я выхапіў яе з горна і наблізіўся да накавальні. Узяў у руку малаток — не молат, з якім увіхаўся Васіль-малатабоец, а невялікі, не надта цяжкі малаток, з якім некалі чараваў тут дзед Мароз. О, які ён быў паслухмяны ў яго, як лёгка плюшчыў і вычвараў розныя цуды, гэты звычайны малаток! Але чамусьці мяне ён зусім не слухаецца. Я нават не патраплю добра ўдарыць там, дзе трэба, не кажучы ўжо, каб надаць пласцінцы належную форму, нешта падобнае на лязо.

Можа, усё ішло ў мяне няўдала ад таго, што я спяшаўся і хваляваўся, баючыся, каб мяне не застукалі. Я завіхаўся, ляскаў малатком па напаленай у горне белай пласцінцы і, спяшаючыся, выцягваў яе на кавальню. Я ўжо спацеў, перапэцкаўся ў вугальную сажу, апёк рукі, і гэтая пласцінка выскоквала з абцугоў і ледзь не апякла мне ногі — я, вядома, у той час уходжваўся ля накавальні басанож.

Нарэшце мне падалося, што нешта падобнае на лязо ўжо ёсць — гэтую пласцінку, распляскапую і крыху завостраную з аднаго боку, я сунуў у карыта з вадою, што стаяла каля накавальні,— трэба ж было лязо загартаваць. Жалеза з шыпеннем загаласіла: сіп-шы-ык...

Я паглядзеў на тое, што зрабіў. Гэта было зусім не лязо для сцізорыка — проста нейкая пляскатая і крывая палосачка, якую і пад вось не падкладзеш, і мне стала крыўдна і балюча. Дым казытаў мне ў носе, набіваўся ў рот, сляпіў вочы, і мне хацелася плакаць — ад роспачы, ад злосці на сябе, што ў мяне нічога не атрымалася: я няўмека.

Хацелася пачаць усё зноў, ды раптам у дзверы страшэнна загрукалі — нехта аж ламіўся ў кузню. Хто б гэта? Каму спатрэбілася ў кірмашны дзень завітаць сюды? І я тут здагадаўся: гэта ж нехта бяжыць на дым, які, канечне, цадзіўся праз усе шчыліны, хоць дзверы і былі зачынены і ўзяты на завалу.

Са страху я ледзь адкінуў завалу і стаяў, разгубіўшыся ад нечаканасці. У дзверы прасунулася калматая галава глухога Дзяміда. Ён спакойна і лагодна заўсміхаўся, растапырыўшы свае цёмныя, з шурпатымі даланямі ручышчы:

— Што ета ты тут робіш, зулік?..

Я паказаў на гарачы кавалак жалеза, які яшчэ дыміўся і сіпеў перада мной сярод кузні. Нешта незразумелае гаварыў, амаль ляскаючы зубамі ад перапуду.

— Падумаў, што кузня гарыць,— усё так жа нязлосна ўхмыляючыся, гаварыў Дзямід. Ён памаўчаў, абвёў мяне зноў абыякава-лянівым позіркам і ціха прамовіў: — Кінь, а то бацька дасць, палучыш лупкі...

І падыбаў, шырока ступаючы і заграбаючы нагамі пыл. Я зірнуў на сваю сарочку, якую мне далі дзеля свята,— яна, уся перапэцканая, у некалькіх месцах свяцілася прапалінамі. Але мне яе ніяк не было шкода. Самае крыўднае — у мяне нічога не атрымалася з ножыкам. Я разгроб вугаль на горне, каб хутчэй пагас, зачыніў кузню і, перапоўнены злосцю і крыўдаю на сябе, пацёгся гародам дахаты.

Мне прыгадаўся жартаўлівы расказ дзеда Мароза пра тое, як адзін хвалько падмеўся скаваць плуг. Каваў, пляскаў, сілы шмат страціў, а плуг не выходзіў, тады кавальняўмека рашыў выкаваць серп. Біў-біў малатком, пакуль убачыў, што сярпа не будзе. Тады ён пачаў рабіць ножык.

Рабіў ды рабіў, сунуў у ваду тое, што засталося ад металу, і толькі пачулася: пшш-ык...

Дзямід усё ж не выдаў мяне, нічога не сказаў бацьку пра маё кавалёўства, але бацька і так здагадаўся, што я быў у кузні, убачыўшы мае перапэцканыя штаны і сарочку.

Іллюк са сваёй неразлучнай скураной торбаю прачыкільгаў паўз вокны і, схамянуўшыся, бадзёра паклікаў мяне:

— Алёшка!..

Я выбег на двор, кумельгам да паштальёна.

— Скачы,— сказаў таямніча Іллюк.— Табе ліст...

Я думаў, што ліст быў, як і дагэтуль я атрымліваў, з рэдакцыі. На гэты раз канверт зусім інакшы — блакітны, з маркай — чырвонаармеец у будзёнаўцы. З хваляваннем я разглядаў канверт, сэрца забілася часта-часта, як у злоўленай у сіло сініцы; я пазнаў знаёмы почырк — прамыя, роўныя літары з чоткімі, выразнымі завітушкамі.

«Дарагі Алёша! — прачытаў я на лістку ў клетачку са школьнага сшытка.— Піша табе вядомая Каця, ваша былая суседка. Як ты жывеш, Алёша?

Пра сябе напішу, што мы жывыя і здаровыя. Мы жывём у доме аднаго раскулачанага селяніна. Лёня наш ужо перайшоў у трэці клас. Да школы тут недалёка, як і ў Бацькавічах. Я вучылася добра. Тут настаўнікі добрыя, па мове я падцягнулася, цяпер рыхтуюся паступаць у медыцынскі тэхнікум у Гомелі.

Я тут не падружылася з дзяўчатамі, яны нейкія не таварыскія, кажуць, што я задавака, бо дачка старшыні. А я зусім не такая, як яны думаюць пра мяне. Цяпер я рыхтуюся да экзаменаў.

Пакляніся, што ты мяне не забудзеш. Я цябе ўвесь час успамінаю.

Напішы мне пра ўсе навіны. Куды ты збіраешся паступаць? Вельмі хочацца пабыць у Бацькавічах, наведаць маміну магілку.

Чакаю адказу на маё пісьмо. Каця».

Далей было напісана слова, відаць — «цалую», але закрэслена нязграбна. А потым прыпісана: «Бацька тут ажаніўся з адной жанчынай. Яна нейкая кіслая, а бацька хоча, каб мы яе называлі мамай. Каб ты ведаў, Алёша, як мне тут сумна...»

Каціна пісьмо як бы перавярнула ўсё маё нутро. Я жыў

нібы ў нейкім перэальным, фантастычным свеце. У думках складаў адзін за адным варыянты адказу, і ўсе яны мне не падабаліся, бо мяне ахапіла нейкае пачуццё, якому я не ведаў, як даць тлумачэнне, але гэта было пачуццё незвычайнае; я адчуў, што Каця для мяне — самы дарагі чалавек, з якім мне хацелася сустрэцца і не разлучацца праз усё жыццё. Я пачаў складаць сабе план, як з ёю сустрэцца. Нашы дзяўчаты збіраліся ў Лясковічы ў ягады — вёрст за дваццаць з гакам ад Бацькавіч, ды мяне ж туды не пусцяць, я цяпер зноў стаў за памочніка ў рахункавода ў канторы, дзе работы ў летні час цераз край.

Урэшце я рашаю, што напішу ліст і буду чакаць зручнага выпадку, а як паеду з Сямёнам-Марцінам у раён, там будзе лягчэй наведацца ў Лясковічы. Лягчэй, вядома, гэта сказаць, а як я прыйду да Гопкаў, што пра мяне падумаюць? Вядома ж, Кацін бацька здзівіцца: «Алёшка? Адкуль ты? Што здарылася?..»

Ужо каторы раз перапісаны ліст. Хацелася выказаць свае пачуцці да Каці, але як? Трэба было знайсці такія словы, ды дзе іх возьмеш? Сказаць жа проста — я цябе кахаю, Каця, сумую па табе і дзень і ноч успамінаю — гэта ж вельмі смешна. Я згарэў бы ад сораму, калі такое напісаць, і я напісаў простае і вельмі сухое пісьмо. А пра тое, што ў мяне тварылася на душы, Каця магла хіба што здагадацца. Я напісаў, што вельмі рады яе лісту, расказаў, што мы ўжо з хлопцамі — камсамольцы, што ў нас хутка будзе свой трактар; мае сябры Адам і Сцяпан прасіліся, каб іх паслалі на курсы трактарыстаў, але ім сказалі, што няхай крыху пабольшаюць, а я збіраюся ў педтэхнікум, таксама ў Гомель.

Каця, вядома, магла сама здагадацца, што я выбраў Гомель іменна таму, што і яна туды падае дакументы. Дагэтуль я цешыўся марай — толькі ў Магілёў, у газетны тэхнікум, але цяпер вырашана цвёрда — у Гомель, вучыцца на настаўніка.

Мы марылі пра сустрэчу, а лёс рыхтаваў нам ростань на доўгія-доўгія гады. Пад восень я падаўся ў Гомель на вучобу ў педтэхнікум, які затым стаў называцца педвучылішча. Каця ж з бацькам і мачахай паехалі на радзіму, у сваё Крыварожжа.

Кажуць, увосень Каця была ў Бацькавічах, пасадзіла на матчынай магілцы калінавы куст і вельмі шкадавала, што не ўбачылася са мною. Пра ўсё мне расказала большая сястра Дуся, калі я прыехаў на зімовыя канікулы.

ЧАСТКА ДРУГАЯ

1

Дамоў, у Бацькавічы, я прыехаў перад сёмухай. Тутэйшыя, хто за ўсё жыццё нікуды з сяла не адлучаўся, называюць сёмуху — духа. «Духа — ета вясёлае свята: можна і паскакаць і пакуміцца...», «На духа ў Горках дужа бальшыя базары збіраюцца...».

Як здавён вядзецца, ужо ў суботу ва ўсіх хатах мыецца і шаруецца падлога, падмятаюцца падворкі. Покуці і вокны прыбіраюцца свежымі, адбеленымі ручнікамі і набожнікамі, ложкі засцілаюцца сваёй работы, з вясёлкавымі пералівамі коўдрамі-посцілкамі; столь уквечваецца галінкамі клёна, арабіны і ясеню; галінкі бярозы, сцяблы аеру раскідваюцца на падлозе. Веснічкі і ганачкі так жа ў зялёнай аздобе. Уся гэтая ўкраса зелянінай называецца — май.

Бярозкі яшчэ з кволымі, сакаўнымі лісточкамі і ружова-клейкімі сярожкамі-завушніцамі з недалёкага ляска — Крывалесся — зіхацяць перад кожнай хатай. Перад святам падлеткі робяць па некалькі рэйсаў у лясок па зелянініну, якая набрала ўжо моцы, і ўсё Крывалессе аж свеціцца, пераліваючыся на сонцы; лапушыцца кустоўе арэшніку; маладыя вольхі, асінкі красуюцца на палянах, нібы выхваляючыся перад прыгажунямі бярозкамі і веселунамі клёнамі. Для вясковых свавольнікаў было найвялікшай радасцю дыбаць дамоў з поўнымі бярэмамі пахучага зялёнага вецця, перацягнутага па самай сярэдзіне вяроўчынай. Кожны стараўся набраць сабе лепшага вецця-маю ды яшчэ вырваць з каранямі пару бярозак, каб заадно і аздобіць сядзібу. Бярозкі садзіліся перад домам, перад вулічнымі вокнамі. І таму, бадай, ля кожнай хаты раскашава-

ліся прысады — арабінка, клёнік, ясень, вярба, ліпка, кусты чаромхі-калакалушы.

Учора, калі маці ўзялася шараваць падлогу, то бацька як бы незнарок сказаў:

— Алёшка, можа б, сцягаўся ў Крывалессе? Прынясі трохі маю. Няхай і ў нас будзе свята...

— Не, тата,— запярэчыў я.— Мне неяк няёмка. Не пайду я!.. Гэта свята — рэлігійнае.

Я ж студэнт, заўтрашні настаўнік, і мне ніяк не выпадае цягнуцца з сябрукамі ў лес па той май — сапраўды, сёмуха ж рэлігійнае свята.

Бацька насмешліва пакпіў з мяне:

— Дзівак ты, хлопец. Ета ж самая што ні на ёсць народная завядзёнка. Явар, зяленіва, чаромха... Ета ж прыгажосць! Хату прыбяром, явару насцелем на падлозе. Сабе прыемна, і чалавеку льга зайсці ў хату. Што ж, калі ты не маеш ахвоты, тады патэпаю сам...

Пад вечар бацька прынёс з Крывалесся вялікую ношку зяленіва і нават выкапаў дзве невялічкія, з празрыстымі клейкімі лісточкамі бярозкі.

У суботу яшчэ завідна мы ўпрыгожылі хату, а бярозкі бацька ўкапаў у коўратах, і яны, юныя і бесклапотныя, весела трымцелі галінкамі, не ведаючы, мабыць, што жыць і красавацца ім тут давядзецца нядоўга.

Сёмуху ў Бацькавічах святкуюць аж тры дні. У нашым канцы, ля Шылаёвых, будзе гулянне з гармонікам. Сцяпан Пілецкі, прымак, «крывое калясо», як яго ахрысцілі нашы дзяўчаты-сядухі, не пашкадуе сваёй тулянкі. Пастараецца ад душы і ягоны сусед Алёха Целяпей са сваім бубнам. Эх, весялун-бубен! Па тым, як ты бухаеш і звініш бомамі, самы абыякавы да музыкі бацькавіцкі жыхар кажа: «Ета ўжо Целяпей выцілінгвае. Яго работа».

Моладзь загадзя і старанна строіцца, рыхтуючыся да пагулянкі, да так званага кумоўства — такая ў Бацькавічах здавён жыве завядзёнка. Хлопцы, дзяўчаты, нават падлеткі набіраюць па колькі яек, выпрошваюць у бацькоў дзялку сала, акраец хлеба, нясуць з сабою скавародку і купкамі кіруюцца за аселіцу, у жытнёвае поле, на ўзлесак ці на лужок — у самае зацішнае месцейка,— там паляць вогнішча... Пакуль пячэцца яечня, водзяць карагод, спяваюць песні, дурэюць, жартуюць. Тады палуднуюць. Часам замест гарэлкі п'юць бярозавік, хлебны квас ці нават сцюдзёную ваду — кумяцца. Гэта і называлася ў Бацькавічах — куменне.

Уруніўшыся ў чытанне нейкай кніжкі, я не заўважыў, як у хату зайшлі Сцяпан і Мішка, мае суседзі і сябрукі, па-змоўніцку пераміргнуліся. Падалося, на іх тварах быў мне папрок: «Глядзі ты, які стаў наш Алёшка — пабыў у горадзе і ўжо цураецца нашае хеўры. Глядзі, як яно палучаецца!..»

Гаварылі пра розную дробязь, а пра сёмуху зусім не ўспаміналі, як бы гэта нас ніколькі не турбавала. Ніхто не браўся сказаць першы, бо надоечы ў школе быў сход, і прынята пастанова камсамольскай ячэйкі нікому не святкаваць духа, а ўсім калгасам зрабіць нядзельнік. «Маладым, а перш-наперш камсамолу,— сказаў старшыня Іллюк, нядаўні чырвоны камандзір, які вярнуўся з Чырвонай Арміі і змяніў Гопку,— ніякага кумення. Усе выйдзем. Усе, як аднае маткі дзеці. Не забывайцеся пра завядзёнку і ўгавор: што хаўрусна, тое красна!» Нехта з парога, у натоўпе, крыкнуў: «Дак і куміцца ж — таксама хаўрусна!..»

Іллюк сціснуў пашчэнкі, бліснуў бялкамі пукатых сталёва-шэрых вачэй: «Ты мне тамака, Кіпень, не канькай! Піццё — смяццё!.. Усім на васкрэснік. Работай дакажам, што мы не верым ні ў якія духі, ні ў святыя, ні ў васкрэсшыя. Панятна, што сказана?..» — «Ясна,— скрывіўся даўгалыгі Кіпень, нервова пакратаў шчаціністае падбароддзе і забубніў сабе пад нос: — І кошка бліноў напячэ, калі сала сцячэ!..»

...З нашае братвы ў ячэйцы і Сцяпан Говар-Гамарнік, і Мішка Цярэшка. Не камсамолец толькі Сашка Кіпень. Яго бацька Антон — жмінда і захрыбетнік, гарачун, падхоплівы, як сухая кастрыца,— не пускае сына на сходкі, не дае яму дазволу хаўруснічаць з намі, камсамольцамі. «Не хадзі з тымі вісусамі-ветрагонамі,— настаўляў Кіпень сына і пачынаў шморгаць носам, зрабіўшыся ўмомант чырвоны, як печаны рак.— Яны табе не роўня, етыя галетнікі, абібокі. Бязбожнікі, яны на добрае не навучаць, да добрага не давядуць. Слухайся во дзеда свайго, ён стары, але разумны і мудры. На свеце яшчэ той не радзіўся, хто б за яго быў разумнейшы. Ты не слухай іх, не ідзі на тыя іх васкрэснікі. Пабачыш, яны яшчэ з голаду пухнуць будуць, калхознікі етыя. Галапупнікі, галадранцы, такія, не раўнуючы, як іхнія бацькі...»

— Што табе тыя бацькі зрабілі, не чапай іх! — спрабуе агрызнуцца такі ж гарачы і падхоплівы яго Сашка.— Я хачу з хлопцамі пайсці... Духа ж заўтра...

— То вазьмі ды сцягніся да дзеда,— адпускаецца і лагаднее Кіпень, падсоўвае да сябе бліжэй гаршчок з адваранай бульбай, сёрбае з карца ўзахлёб агурочны расол.— Там богу памолішся. Баба апрычонікаў дасць, пачастуе нечым смачным...

— А куміцца хлопцы збіраюцца...

— Куміцца,— скрывіўся Кіпень, вочы ўмомант выпачыліся.— Не хадзі з імі, ветрагонамі. Не люблю я іх, галадранцаў етых, што са сваім калхозам выпендрываюцца. І сынкі іх такія ж. Які куст, такі і адростак. Усё... Гамон!..

Сашка захныкаў, але ненадоўга, хутка супакоіўся. Нахмураны, цішком вылез з-за стала, выцер абшмараваным рукавом чорныя, як у бацькі, губы і ваўчком выслізнуў быў з хаты, ды на парозе запыніўся:

— Я скора... Трохі пагуляю... Пасяджу на лавачцы...

— Глядзі ж, Сашке!

Кіпень, які перад вялікаднем прыдыбаў з Крывога Рога, з шахт, дзе да месца, а дзе не, устаўляў украінскія словы, стараючыся падкрэсліць, што ён — не роўня бацькавіцкім старажылам, якія далей, як станцыя Камунары, за паўсотню вёрст, нідзе ў свеце не былі.

А Сашка, канечне ж, доўга не сядзеў на той лавачцы, а хутка прытарабаніў да нас, чмыхаючы прастуджаным носам, падсеў да стала, дзе Сцяпан Говар, узіраючыся, бы певень, сваім здаровым вокам, другое некалі, падшыванцам, ненарокам скалоў ножыкам, разразаючы шнурок ад чаравікаў, заўзята гартаў кніжку. Мішка ўсхвалявана дзяліўся планамі заўтрашняга свята. Але яму не даў дагаварыць Сашка, умомант зачырванеўшыся, ён гарачыўся:

— Хлопцы, я думаю, як бы нам ета куменне зрабіць! Ну, што маўчыцё? Мы ж свае, са свайго канца, добрая будзе ў нас кампанія, праўда?..

— Няўежна, дык улежна? — засмяяўся Мішка.

Кіпень такі, што з ім надта піва не зварыш. Заядлы і нэндза. Знойдзе прычынку за лучынку, і ліха не абярэшся. Але ж ад яго так лёгка і не адкараскаешся. Знойдзе пад зямлёю, хоць бы і надумаліся мы зрабіць нешта, сабраліся б без яго на якую складчыну.

Я думаю, сказаць Сашку пра нядзельнік ці не? Ды і маўчаць не выпадала. Сашка ж як здагадваўся, што ў нас нейкая змова, аж працінаў усяго мяне сваімі вострымі шэрымі вочкамі, хмурыў выцвілыя бровы, часта трубіў носам.

«Гыркала нейкі»,— хочацца сказаць на Сашку.

Паклаўшы рукі пад галаву, на чарэні адлежваецца бацька, мусіць, дрэмле — ён толькі прыйшоў з кузні. Не хачу, каб ён слухаў нашае размовы. Ён, мабыць, спіць ужо, нічога не чуе. Трэба было б пагаварыць з хлопцамі пра нядзельнік, але я не ведаю, з якога боку лацвей падысці: хлопцы ж таксама з мухамі, могуць пайсці за Сашкам, бо як ні кажы, а да кумення яны ахвочыя, і такое свята, як сёмуха, бывае не кожны дзень.

Добра, каб Говар падтрымаў мяне. Ён нядаўна ўступіў у камсамол, і з ім гаворка простая. Ты — камсамолец і абавязаны выконваць Статут. А там сказана: камсамолец — змагар супраць рэлігійнага дурману. А Мішка? Ён падтрымае, бо хлопец памяркоўны, паслушнік. А гэты Сашка? З ім цяжэй. Адразу прад вачыма паўстае яго бацька — злосны, заўсёды нечым не здаволены, глыбаед, гарладзёр. І на сходах ён будзе гнуць сваё, цягнуць заўсёды ўбок, абы на сваім настояць. Праўду людзі кажуць: які Хомка, такая яго і жонка, якое карэнне, такое і насенне...

— Вы, хлопцы, як сабе хочаце,— нарэшце кажу я і пазіраю сябрукам у вочы,— а я пайду на нядзельнік. І ты, Сцяпане, відаць, пойдзеш. Праўда?..

— Пайду, а як жа! — ахвотна адазваўся Говар.— Папрацуем зрання. А пасля абеду, пад вечар, можам і мы... Ну, складзёмся і пойдзем на Гараўшчыну. Там цяпер прыгожа!..

— Там цыганы свой шацёр распасцерлі,— раптам засопся Сашка.— Во, братцы, жывуць людзі, не жнуць, не сеюць, а ўсё маюць! Булахоўскі казаў, што бачыў, як цыганы снедалі,— можа, з рэшата скаварада і скваркі па лапцю ў місе. Во, хлопцы, жытуха! Усё жыццё — на прыродзе. Не трэба ім май цягаць у хату. Іхняя хата — увесь наш бярэзнік. Хай ім нядобра ікнецца!..

— Сціхні ты, Кіпень! — падхапіўся Говар, стаў на сярэдзіне хаты, узяўся рукамі ў бакі.— Я супраць етага кумення, хлопцы. Як ні кажыце, а ета ёсць рэлігійнае свята, і мы як камсамольцы павінны паказаць, што мы — сіла. Дружна ўсе выйдзем на грэбельку. Алёша, давай не будзем шмаравозіць... Як скажаш, так і будзе. Усе пойдзем! Нечага табе, Сашка, смуту сеяць!..

Кіпня як варам аблілі, ён рыўком падцягнуў зашмараваныя, з суравіны нагавіцы, засопся, як задыханы конь, заморгаў выцвілымі вейкамі, пачаў церці пачырванелыя вочы:

— Ідзіце. Рабіце як хочаце. А я пайду на той канец. Там не такія акцівісты, як вы. І дружыць з вамі не буду...

— Сціхні ўжо, Кіпень! — махнуў рукою Сцяпан Говар.— Ідзі. Можа, не прападзём і мы як-небудзь. Адна галавешка не гарыць, а толькі тлее!..

— Ну, і пайду,— Сашка шуснуў да дзвярэй, на парозе крыкнуў: — Вы яшчэ папросіцеся ў мяне, акцівісты вашывыя!..

— Ідзі, хлопец,— надта ж спакойна, як без злосці, вымавіў Мішка Цярэшка.— Сэрца — не камень, адляжа...

А Сцяпан Говар не мог ніяк супакоіцца. Яго твар аж скрывіла. Думалася, што ён зараз кінецца на Кіпня з кулакамі:

— Каб тваёй і нагі сюды не ступала! — крычаў ён наўздагон. — Дурыла... Ламей дурны!..

— Не трэба, хлопцы,— шкадаваў я, што гэтак усё абярнулася, хоць і адчуваў, што з Сашкам гэткае ўжо не ў першы раз, таму прымірэнча сказаў: — Мы ж — выхаваўчая сіла. Як ні кажыце, а Сашка наш, хоць і несвядомы элемент. Не трэба было з ім так груба абыходзіцца...

— Які госць, такое і частаванне,— усё яшчэ не адпускаўся, як заўсёды разважлівы і лагодны, Мішка. Памаўчаў. Затым прабачліва дадаў: — Бацькава дохля, але нічога, адумаецца...

— Думаеш, прыйдзе? — супакоіўшыся, загаварыў Сцяпан Говар, заўсміхаўся, і яго вяснушчаты твар засяродзіўся, выдаваў, бы хлопцу не шаснаццаць, а гэта ўжо сталы мужчына, які ўмее думаць, мае свой погляд і свае меркаванні.

— Мабыць, што не ўседзіць,— выказаўся я.— Гэты Кіпень такі, што разгарачыцца, ускіпіць, як на вуголлі, а тады прыбяжыць, будзе плакацца, каб у гурт прынялі.

— Ад напасці не прапасці,— абазваўся Мішка сваёй любімай прыказкай. — Ліха перамелецца, радасць застанецца...

Мы яшчэ не астылі як мае быць, не ачомаліся ад Сашкавай выхадкі, як на парозе паказаўся Аляксей Свербікаў. Каржакаваты, нават карачун, але шырокі і мажны ў плячах, Аляксей Мікалаевіч быў ужо жанаты чалавек, меў жонку і двух хлопчыкаў. «Балаўнікі, усе ў бацьку»,— казала языкастая настаўнікава жонка Свербічыха пра сваіх хлопчыкаў Лёню і Валодзю, яшчэ дашкалят. Наш настаўнік жыў душа ў душу з усімі вясковымі жыхарамі,

з мужчынамі і з падшываццамі, з хлопцамі, што вучыліся ў Ігліцы і ў Горках, дзе ўжо меліся школы-сямігодкі.

Калгас у Бацькавічах, пераадолеўшы час «хістання», трывала стаў на калектыўную дарогу, хутка набіраўся сілы і моцы. Яму, нашаму калгасу, яшчэ даволі часта і балюча заміналі нядобразычліўцы і злоснікі, накшталт таго ж Антона Кіпня ці вясковага хітруна Карпа Кузьміча і да іх падобных вясковых заможнікаў. Але новае, маладое нястрымна заваёўвала галоўныя пазіцыі, смела разбіраючы парогі і загарадзі старой вясковай заскарузласці.

— Мы — маладая сіла, і мы куём будучыню! — крыху заікаючыся і бліскаючы бялкамі вялікіх шэрых вачэй, казаў наш камсамольскі важак Аляксей Свербікаў.— А гэта азначае, што ўсюды і ва ўсім мы павінны быць першымі, умацоўваць веру людзей у рэальнасць ідэй, палітыкі партыі ў вёсцы аб пераводзе яе на новыя, калектыўныя рэйкі жыцця.

Уляцеўшы, бы віхор, у хату, Аляксей Мікалаевіч паправіў шавіётавую кепку, якая была з'ехала ў яго аж на патыліцу, акінуў усіх зычліва-вясёлым позіркам і з хрыпатасцю ў голасе прамовіў:

— Добры дзень, хлопцы!

І адразу ж лёгка, з падскокам прайшоўся па хаце, пачаў здароўкацца з кожным, прамаўляючы:

— А я ўжо абабег усіх — і ў цябе, Говар, быў, і да цябе, Цярэшка, заходзіў. Думаю, дзе мае арлы, дзе яны папасваюцца... Каб у Алёшкі, меркаваў, то не собіла. Ведаю, што Алёшка наш — заняты чалавек. У навуку ўдарыўся. І на канікулах, калі, можна сказаць, самыя заўзятыя навукаеды маюць звычку паляжаць дзе-небудзь у цянёчку ці на рыбку паласавацца, а табе адно — толькі кніжкі ды кніжкі. Аж, бачу, сур'ёзнымі справамі заняліся. Відаць, маракуеце, як духа пасвяткаваць. Што, адгадаў?..

— Не, Аляксей Мікалаевіч,— як бы ў нечым адчуваючы сваю віну, прабачліва сказаў я.— Мы во якраз і ўсчалі гэтую гаворку — пра заўтрашні нядзельнік. Ды ўсю абедню нам, як заўсёды, сапсаваў Сашка. Пасварыўся ўжо і знік, як чорт у балота!..

— Нідзе ён не дзенецца,— рашуча сказаў Цярэшка.— Кіпень, ён і ёсць кіпень. Адкіпіць сваё і будзе з намі як міленькі!..

Аляксей Мікалаевіч ведаў, колькі нам давялося валэндацца з гэтым Кіпнем, каб хоць трохі перайначыць

яго, прыгарнуць да калектыву. Сашка вучыўся ў Ігліцкай сямігодцы, перайшоў у сёмы клас, і настаўнік узяў над ім шэфства — да восені падрыхтаваць у камсамол. Казаў пра гэта не раз і на сходах, і нам усім, камсамольцам, увёў тое ў вушы, але хлопцы лічылі, што Сашка, як кажуць, яшчэ не дарос. І гэта было дзіўна і смешна, бо Сашка — даўгалыгі, стаўбунаватая ў белых выцвілых валасах галава, нахабна-дзёрзкія шэрыя вочы, прамы даўгаваты нос, раздвоенае падбароддзе. Калі ў добрым настроі, калі яму падтакваеш, ні ў чым не пярэчыш, Сашка нават усміхаецца, яго ўсмешка прыемная, ажыўляе суровы твар, але бяда, калі ён узлуецца, тады становіцца як ашалелы, раз'юшыцца, храпе, аж ноздры раздзімаюцца, вочы як ашклянеюць; з ім, з Сашкам, тады лепш не займацца: шпурляе ўсё, што трымае ў руках ці згледзіць навокал.

— Што ж, хлопцы, давайце бліжэй да справы,— прамовіў Свербікаў пасля нейкага роздуму. (Можа, у Аляксея Мікалаевіча прамільгнула ў галаве думка пра гэтага Сашку — віхрастага задзіру-шалапута, які мог бы стаць добрым камсамольцам.) — Пакінем у спакоі Сашку! Зараз жа рушым да мяне на кватэру, напішам лозунг. Нельга ж так, каб нядзельнік — ды без лозунга! Дзе толькі мы яго павесім, каб усе людзі прачыталі?

— Можна было б на арцы!

— Так. Правільна. Можна і на арцы,— згадзіўся Аляксей Мікалаевіч.— Людзі будуць ехаць і з вёскі, і з хутароў, і ўсім будзе відно. А словы якія напішам? Я думаю так: «Ударнай працай ударым па адсталых настроях!»

— Трэба як-небудзь карацей,— заўважыў Говар, і сам задумаўся, не ведаючы, як жа гэта сказаць, каб было і коратка, і ўсім зразумела, і заклікала ўсіх на ўдарыны нядзельнік...

— Тады давайце напішам: «Усе выйдзем дружна на балоты!» — прапанаваў Мішка Цярэшка, хітнуў русявым чубам, які ўвесь час навісаў яму на вочы, закрываючы пукаты лоб у рэзкіх зморшчынках.— Будзе ясна і панятна!..

А ў мяне зараз жа ўсплылі і зарыфмаваліся словы: «І папрацуем у ахвоту».

— Малайчына, Алёшка,— ухваліў мой дадатак настаўнік.

І лозунг ужо быў гатовы: «Таварышы калгаснікі! Выйдзем дружна на балота. Папрацуем па-ўдарнаму, у ахвоту!»

2

Туман сінім поясам падперазаў хаты, кучаравіўся ў прысадах. Уранні на вараным жарабку верхам прыскакаў з рашатнёўскага канца перахлябісты, у выбеленай, як палатно, гімнасцёрцы, туга перацягнутай у поясе прапахлай потам папругай, Іллюк Кавалік, старшыня; глуха азвалася вуліца тупатам капытоў Ворана тады, і зараз жа адзін па адным з вулічных акон у хату хлынулі галасы — то асіплыя, мужчынскія, то рэзка-тонкія, жаночыя; натужна і неяк лена прарыпеў за глухой сцяною калодзежны почап — гаспадыні спяшаліся набраць вады.

Вуліца абуджалася звычайным, для ўсіх ужо звыклым Мацейкавым воклічам: «Гэй, гані каровы!», я яго ўяўляю сабе да драбніц. Рыжы, зарослы попельна-жаўтлявай шчэццю ад падбародка да вушэй Мацейка — не стары яшчэ дзяцюк, крываногі — наскі ўнутры, пяты ўраскід — быў надзіва гарласты і крычаў моцна, яго голас чуцён быў аж за гарою, пад Арцюхамі.

Мацейка, шлёгаючы пужкай, з берасцянкай за плячыма, клыпаў ранішняй вуліцай, збіраючы статак, і смачна ўдыхаў казытлівыя пахі, што плылі з каміноў, і любаваўся раніцай, якая займалася шырока, рассейваючы з начы густую парнасць ад кустоўя, з-за грэбелькі, схаванай у грывастых лазняках. Яна змешвалася з пахучымі дымкамі і хвалямі разлівалася па вуліцы, чаплялася за вільготна-замшэлыя платы, асядаючы на адсырэлых за ноч імшыста-попельных саламяных стрэхах.

Устоеная з начы сцішанасць яшчэ кволіцца на прызбах, на бярвеннях, на лавачках пад разлапістымі клёнамі, ля ўтульна-разгалістых, абшмараваных да бляску пры камлі вербах. Ціха яшчэ і на бугарку, дзе дворышча колішняга вясковага карчмара Лейзара, а цяпер крыва прыляпілася хаткі балакі і перасмешніка Трахімкі. Ён не забараняў моладзі збірацца каля яго хаты, і яму, зычліўцу, мы плацілі дабратою. Бывала, як толькі пагасне ў вокнах святло капцілкі — то ўжо Трахімкава сям'я кладзецца на спачын, і мы пераходзім на шэпты, гаворым напаўголаса і стараемся не ўсчынаць песень. Бывае, што і раздурэемся і забываем на ўсё, але між нас ёсць і Трахімкавы паслы — цыбатая Варка, цемнавокая летуценніца, і яна, падкурчыўшы ногі, сцішылася тут, на лавачцы; калі хто раскрычыцца, то напамінае: «Глядзіце, а то бацька прачнецца: дасць вам на абаранкі...»

Мне даўно не спіцца, але вельмі не хочацца ўставаць. Хвалююць усе гукі і галасы, якімі поўніцца вуліца, і пах ад прывялых галінак, церпкі водар аеру на вышкрабеных да жаўцізны падложынах, лёгкія стрэлы-патрэскванне дроў-хмызу ў печы, знаёмы і такі мілы звон скаварады аб прыпек — маці ўжо наскідала горку духмяных грэцкіх блінцоў, і яны прыкрыты кужэльным ручніком, каб не астывалі, не калянелі... Усё гэта ранішняе зліваецца ў святочна-ўрачыстую карціну і вярэдзіць нутро прыемным адчуваннем блізкага сняданка.

Як імгненне, як бліскавіца, усплывае наказ настаўніка: «Глядзі ж, Алёшка, не засніся. На нядзельнік — мігам! Ты ў нас, памятай, не госць. Ты наш, бацькавіцкі камсамолец».

Увішна скідваю з сябе цёплую дзяружачку, якою ўкрываўся звечара, і, праціраючы вочы, шлэпаю босымі ступакамі на падчарсцвелую за ноч падлогу; прыемны да шчымлівасці халадок лагодзіць усяго, аддаецца салодкім штуршком у сэрцы.

— Хай бы паляжаў яшчэ трошкі, сынок,— кажа спагадліва маці і кідае пахучы, відаць, апошні блінец з масляна-чорнай скаварады. — Сянні ж свята. Святая тройца. Як даўней казалі, духа, святыя ўгоднічкі!..

У мяне раптам вырвалася:

— Якое ета свята? Усё, мабыць, папоўскія выдумкі... Рэлігійны дурман...

— Не трэба етак, дзіцятка,— спакойна і, здалося, неяк няпэўна запярэчыла маці, поркаючыся ў качарэжніку, бы нешта згубіўшы. — Казалі старыя людзі — духа, ета ад таго, што бог у трох асобах: бог — айцец, бог — сын і бог — святы дух...

— Ну, маці, і скажаш,— заўсміхаўся я.— Які ж ён, той святы дух? Дзе хто яго бачыў?

— Не, не кажы етак, хлопец,— маці падхапіла подмазку і пачала заўзята націраць ёю скавараду.— Не мы яго, етый святы дух, выдумалі. Не нам і абгаворваць яго. Я і сама часам задумваюся, які ён, тэй бог, і ці ўгаджае ён каму, бо іншы раз просіш яго, молішся, а тэй бог да цябе як глухі, як яму і ўсё шлунне зойме. Але, бачыш, не ад нас пайшло: бог і няхай будзе бог...

— А ў нас сёння нядзельнік будзе,— весела кажу я і пачынаю ўмывацца, набраўшы ў кварту сцюдзёнай вады з вядра.— Бацька казаў, што і ён пойдзе. Будзем канаву

капаць — грэбельку трэба ачысціць. Азярцо будзе сваё ў Бацькавічах...

— Бязбожнік твой бацька,— маці загрукала нечым у качарэжніку.— Няхай ідзе, калі яму не сорамна перад людзьмі. Ета ўжо табе я не магу казаць насуперак — ты ўжо вучышся, больш мяне ведаеш, разумныя кніжкі чытаеш — табе я не буду пярэчыць, а бацька няхай не дзяцініцца. Трэ было б і гарод пакрапіць, бо нешта дажджу доўга няма і на градах усё смагне. Хто яго ведае, ці ёсць той бог, але ж не намі завядзёнка етая заведзена... Вунака, кажуць, бабы збіраюцца з пратасэямі на Хамінку, жыта неяк трэба ратаваць, яно асмягла, на пагорках і ўзлобках пабялела, а каласкі пустыя, ані зярнятка. А вы, бязбожнікі, нядзельнікі нейкія выдумляеце. Няма на вас упыну, шалахвосты кручаныя...

Маці тут жа ўрупілася ў сваё — змоўкла. Твар яе, пасечаны зморшчынкамі ля вачэй і вакол рота, стаў абякавы, але яна не выказвала асабліва сваёй непрыязі да таго, што ў такі дзень бацька як устаў, так і пацёгся некуды да суседзяў, можа, нават да брыгадзіра Якава Каваліка. Можа, яны ўжо радзяцца, як гэта зрабіць, каб і на грэбельку пайсці з актывістамі, а потым, увечары, магчыма, у нашым садку, пад дзічкай-трайчаткаю, дзе летнім вечарам прахалода, як у ляску, развесці цяпельца і павесяліцца. Можна і на траўцы паляжаць, і ў цёплым сутонні вечара нагаварыцца ўдосталь.

— Давай, мама, ужо будзем снедаць, ці што? — прысаджваючыся да стала, кажу я да маці, бо ведаю, што на вуліцы ўжо збіраюцца на цвінтары хлопцы.— Бо нешта ж бацька наш недзе ды забавіўся...

— Бацька твой, можа, ужо дзе разгавеўся, абнашчыўся,— буркліва кажа маці, але, бачу, бярэ чапялою нашу частунніцу-скавародку, на якой дымяцца смачным дымком ружовыя пахучыя скваркі, асцярожна ставіць яе на стол, дае мне духмяных блінцоў. Значыць, у маці не благі настрой.

Похапкам снедаю: спяшаюся на цвінтар, дзе звычайна збіраліся ў святочныя дні мужчыны, і тут жа ля іх часта, пакуль не надакучыць, таўкуцца хлопцы-падлеткі. Тут ужо людна. Талака мужчын з нашага канца. Сабраліся хлопцы амаль з усяе вёскі. Вядома, тут камсамольцы з абодвух хутароў. Апрануліся па-будняму — найбольш у шарачковых і зрэдку ў паношаных крамных портках, у лёгкіх пінжачках, у картовых і суравых сарочках, хто

босы, а хто ў якіх чаравіках ці апорках. З тапарамі, з рыдлёўкамі. Аляксей Свербікаў у сваім нязменным з сіняга шавіёту гарнітуры, белая рубашка ў дробную сінюю палоску, каштанавы чуб увесь час то наскокваў, то спадаў, закрываючы бліскуча-карыя вочы: настаўнік нешта гаварыў, у такт словам раскідваў рукамі, характэрным і для ўсіх бацькавіцкіх людзей знаёмым рухам локцяў падцягваў штаны галіфэ, і рабіў ён гэта так часта, а асабліва, калі выступаў на сходах ці так на людзях, і ўсё закідваў назад ладную, занадта вялікую для яго росту галаву, і каштанавы чуб усё матляўся, бы падтакваў гаспадару, ухваляў ягоную неўтаймаваную зухаватасць. Блізка тут стаяў і Сцяпан Говар, амаль што ў новай шэрай касаваротцы, у руках трымаў свежавыструганае дрэўка загорнутага ў трубачку сцяга. Ведаю, што сцяг гэты ўчора пашыла з кавалка чырвонага міткалю жонка настаўніка — Свербічыха, а дрэўка выштукаваў Говар-старэйшы, які, нягледзячы на свае пажылыя гады, паблажліва і нават ухвальна ставіўся да нашых камсамольскіх задумак. Удзельнік грамадзянскай вайны, ён ганарыўся, што бачыў Будзённага і ваяваў пад камандаваннем славутага камдыва Гая. У Говараў на сцяне, побач з абразамі, вісеў партрэт савецкага палкаводца Гамарніка. Яго самога называлі Гамарнікам. У Рамана былі рэдкаватая, але добра дагледжаная русявая бародка і вялікія яршыстыя вусы — здавалася, Раман з твару быў падобны да таго Гамарніка, што на партрэце.

Людзі, напэўна, кагосьці чакалі, перагаворваліся, нецярпліва пазіралі ў бок Мікольска. Трэба сказаць, што з гэтага хутара яшчэ, мабыць, чакалі нечага, бо неяк коса глядзелі на ўсё новае, што крэпла ў арцельных Бацькавічах; хутаранцы не надта каб кідаліся падтрымаць гэтае новае, а трымаліся прымаўкі: «Пажывём — пабачым. Паглядзім, што выйдзе з вашага раю...»

Старшыня Іллюк скеміў гэтую палітыку мікольцаў і часцей пачаў заглядваць туды, гутарыў то з адным, то з другім, як кажуць, моваю нядаўняга чырвонага камандзіра. Калі які-небудзь, скажам, той жа Міколка Півоня, вясковы філосаф, пачне разводзіць, як тут кажуць, анцімонію, то Іллюк не злосна, але ўладна перапыніць яго: «Вы, дзядуля, не віляйце, як тая Ліса Патрыкееўна, а проста, адкрыта кажыце, каб усім ясна было; вілянне, адвільванне вашай светласці не паможа».

Дык гэта, аказваецца, і чакае грамада Іллюка, мабыць,

ён і скокнуў на жарабку да мікольцаў пагаварыць па душах.

Перамаўляючыся, мужчыны пачалі пакрысе праяўляць неспакой; некаторыя патэпалі да калодзежа, а іншыя нецярпліва пазіралі на шлях, у бок таго ж Мікольска.

— Таварышы, ціха. Зараз рушым! — супакойваў людзей Аляксей Мікалаевіч і сам станавіўся на пальчыкі, выцягваў шыю, каб убачыць, што там, у Мікольску.

Нечакана, выхапіўшыся з абдымкаў віслакосых бяроз, з боку Мікольска напятую струну цішыні рванула песня:

— Наш паровоз, вперед лети!

Натоўп на цвінтары, бы адна істота, заварушыўся, ажыў; твары людзей засвяціліся, як ад сонца, а яно не прабілася яшчэ праз нагрувашчаныя пласты попельнашэрых воблакаў ці заблыталася недзе ў купчастых ліпавых прысадах Карпа Кузьміча, што густа навіслі на прасла, дастаючы галінамі аж на сярэдзіну дарогі.

То тут, то там у натоўпе размаітыя галасы ўхваляюць прыход мікольцаў:

— Глядзіце, ідуць!..

— Гэта ўсё Іллюк. Старшыня!

— Іллюк, ета праўда. Але ж там і кансамолы ёсць...

— Ёсць, а як жа. І песня, гляньце, кансамольская...

— Анягож!..

Доўгая, як тычка, жанчына ў кужалёвай кофце, вышыванай чырвонымі ніткамі заблыццю, ціха, як сама сабе, гаварыла: «Які зачын, такі зажын». Я падумаў, што б гэта азначала, але тут Аляксей Мікалаевіч, падняўшыся, колькі мог, на пальчыкі ў сваіх велікаватых стаптаных чаравіках з самаробнымі, з пянькі, шнуркамі і заікаючыся, мабыць, ад хвалявання, крыкнуў:

— У шарэнгу па два!.. Станавіся!..

Страпянуўшыся канцамі, як крыламі, ярка-чырвонай птушкай узвіўся ў руках Сцяпана Говара чырвоны міткалёвы сцяг. Ён быў невялікі, на які метр ушыркі, але на сонцы, якое ўмомант выхапілася і, залатое, сляпучае, урачыста і велічна плыло над Кузьмічовымі ліпамі, і цёплая чырвань залаціла твары людзей, рыдлёўкі на іх плячах, сонечныя промні, як нябачныя стрэлы, наскрозь прашывалі палотнішча міткалю.

Бацькавічане выкіраваліся на дарогу якраз у той момант, калі пад арку ступіла з песняй купка мікольцаў. Наперадзе з імі дыбаў Іллюк-старшыня, бясконца шчаслівы, усміхаўся белазубай усмешкай, піякавата хмурыў

свае сталёва-шэрыя вочы і ў такт хадзе памахваў рукою. З раніцы яго прастуджаны ад недасыпання басок лучыўся ў хоры ўзбуджаных галасоў:

Наш паровоз, вперед лети,
В Коммуне — остановка...

Між мужчын і хлопцаў з Мікольска ззаду шкандыбаў каратканогі і кляшняваты вусач — стары Міколка. Дзіўна, што ў зубах у дзядулі не было яго прадымленай, з грушавага сука, у меднай аправе люлечкі — няўжо і дзядуля спявае з усімі? А што ж, і такое бывае! «Сэрца не камень...» — падумалася.

Песня дужэла, набраўшы моцы,— яе падхапілі бацькавіцкія. Уся грамада з рыдлёўкамі і сякерамі пакіравалася да грэблі — тут ужо самавіта паходжвалі мужыкі нашага канца — брыгадзір Якаў Кавалік, Раман Говар, бацька, яшчэ некалькі мужчын, якіх, напэўна, не на жарт клянуць кабеты і дзяды вунь з тых хат, што ў нястройным шнурку ўздоўж шляху. Вуліца мяжуецца з пагібельнай грэбелькай-балотцам, якую там шануюць і баяцца зачаніць сяляне, бо тады, думаюць яны, знікне грэбелька, вада сцячэ, сцягнецца і не будзе дзе нават нагавіцы прапаласкаць, не тое каб прыткнуцца качаняці ці гусцы.

— Дак што, пачнём, хлопцы? — спытаў Іллюк, павітаўшыся з мужчынамі.— Канаву павядзём, я думаю, нізам, да Крывалесся. Як вы, мужчыны?..

— Мы тут радзілі раду ўжо,— ступіў наперад Кавалік, брыгадзір, прыплюснуў насмешлівае вока.— Самае што сюдою пусціць ваду. А тады, як прасохне, ачысцім грэбельку. Тут, я ведаю, крынічкі ёсць. Падземныя. Іх абы прачысціць трохі, даць продых, і вады будзе, уга, колькі!

— Дзяды казалі, што тут некалі азярцо было,— падтрымаў брыгадзіра Раман Говар і самавіта пакратаў гамарнікаўскую бародку, смешна пахітаў лысаватай галавою: — А цяпер, бач, раскаю заплыло, куп'ё, як бародаўкі, скрозь. Гіне наша грэбелька, гіне!..

— Не загіне! — пачулася смелае з грамады.— Давай, Іллюк, работы. Не на бліны прыйшлі!..

— І праўда, людцы, бярыце лапаты,— абазвалася Васіліна, жаночы камісар. Яна была пакуль тут адна з дзяўчат і апранулася, як на свята: белая вышываная кашуля, зашнураваная на шыі чырвонымі шнурочкамі, сацінета-

вая, у фальбоны, спадніца, на нагах чаравікі з высокімі, акурат пад лыткі, халяўкамі — на шнурках; заплеценыя ў касу русыя валасы, падвітыя кольцамі на скронях, адкрывалі высокі без аніводнай маршчынкі лоб; твар яе, белы, з ямачкамі на шчоках, густа ружавеўся — мо ад сонца, а напэўна, ад узрушэння, якое поўніла ўсю яе. Васіліна — першая вясковая актывістка, хоць яшчэ не камсамолка, была і з хлопцамі дружная і бойкая. Вось толькі ў камсамол уступіць не адважвалася. Калі пачыналі гаварыць з Васілінай пра камсамол, то яна, бянтэжачыся, адказвала: «Дзе ўжо мне, я старая ўжо... Да таго ж і непісьменная». Яна не такая ўжо была і старая — ёй было тады мо якіх гадоў дваццаць з «хвосцікам», што тычыцца граматы, то Васіліна і пісаць умела, і кніжкі чытала.

Скінуўшы хустку-гарусоўку, Васіліна заняла сабе дзялянку, пачала спорна адкідваць глёўкую, парослую дзікай лебядою і трыпутнікам, балотную зямлю.

Сталі ланцужком хлопцы. Мужчыны занялі сабе асобную дзялянку. Яны казалі з іроніяй: «Мы — старыя. Тут, як тэй казаў, з боку прыпёку, а там пабачым, чыя возьме...»

Аляксей Мікалаевіч увішна і хутка расставіў людзей, тады і сам, паплявáўшы на далоні, пачаў арудваць рыдлёўкай:

— Хлопчыкі, блаславімся!

— Памянём тройцу-багародзіцу,— падхапіў Раман Говар, вываročваючы смаліcты корч-патарчаку з глею.

Хлопцы зарагаталі. А Мішка, дасціпнік-спакайняка, тут жа адарыў усіх прымаўкай:

— Наляжам, браткі. Што хаўрусна, тое красна!..

— Што, што ета ты, ветрагон, сказаў? — падхапіў дзед Міколка, які поркаўся зводдаль — ладкаваў карчы ў кучу — для старога знайшлася па яго сіле работа.

— Ета я, дзеду, кажу: атаўка — сену прыбаўка,— зарагатаў Мішка і пачаў сцягваць з увапрэлых плячэй картовую сарочку.

— Так, так, дзеткі,— піскляві ў, не хочучы астацца ў даўгу, дзядуля.— Вясною ліcток, увосень сучок...

Па грэбельцы пранёсся, бы свежы ачышчальны ветрык, задорны, вясёлы смяшок. Грамада ўхваліла дзедавы досціпы. У людзей, здавалася, прыбаўлялася сілы. Адчувалася, людзі прыйшлі сюды без прынукі, па загаду сэрца, і таму праца, асвечаная натхненнем, была лёгкай; ніхто не зважаў, што ўжо саднілі мазалі, млее, а тады

становіцца праўцом спіна і ўсё цела наліваецца бы свінчаткаю.

Нехта з гурту, там, дзе занялі дзялянкі мікольцы, з імі, між іншым, маўклівы і нахмураны, шчыраваў і старшыня, нечакана падаў голас неяк асабліва задзірыста:

— Гэй, анціхрысты, чаго прыўнылі? Спяём, ці што?

— Ды праўда, якое ж ета свята — без песні! — з другога канца звонкагалоса азвалася Васіліна. І зараз жа завяла: — А ў полі верба расна-а-а...

І ўсе як адзін грымнулі:

— Там гуляла дзеўка красна-а-а...

Не спяваў толькі дзед Міколка, гэта, мабыць, ад таго, што ў зубах дымілася неразлучная люлечка.

Неўзабаве песня як абарвалася. Васіліна, напэўна, першая заўважыла, што з боку вёскі, ад шляху, дзе ў хісткім мроіве жывым срэбрам пераліваліся вокны канцавых хат, паказалася працэсія — чародка жанок з харугвамі. Наперадзе шырока і неяк нязграбна, як не сваімі ступакамі, пагойдваючыся, сягаў праставатосы, у доўгай суравой сарочцы навыпуск мужчына, выставіўшы доўгія рукі наперад, з іконай; над ёй цялёпкаліся вышытыя на канцах белыя крылы ручніка. Працэсію ўмомант згледзеў і Іллюк, бо над прыціхлай грэбелькай паласнуў, як бізун, ягоны перарывісты голас:

— Глянь! Ета ж Антонька! Во гад печаны, без нажа рэжа!

Стала надта ціха. Як абарвалася, дзынкнула туга напятая струна. Нібы па камандзе, усе паднялі галовы, пачалі ўглядацца ў той бок шляху, дзе ў воблаку пылу марудна і віхлява рухалася цёмная купка і над ёй блішчала, адліваючы меддзю, ікона маці-багародзіцы. З хвіліну цягнулася гнятучае маўчанне. Людзі з трывогай і чаканнем пазіралі на Іллюка: ён жа — старшыня, і ягонае слова — закон. А ён, злосны, стаяў, сцяўшы пашчэнкі, аж жаўлакі захадзіліся на шчоках, зіркаў бялкамі пацямнелых вачэй — маўчаў. Тады рвануўся вопрамеццю па купінах на шлях, дзе, пакалыхваючыся, соўгалася маўклівая працэсія.

— Я ж яму! Я ж яму! — задыхана крычаў Іллюк і з гарачкі ўхапіў у рукі чыюсьці шапку, махаў ёю як апантаны і ў маўкліва-грозную цішыню ўсё крычаў: — Во аспід! Звяруга! Выганю з калгаса!..

Ён быў ужо пабег туды, на задымлены чорным пылам

шлях, але мужчыны яго запынілі. Пачалі ўсе настойліва супакойваць.

— Не чапай іх, Рыгоравіч, няхай ідуць,— стрымліваючы сваю ўзрушанасць, казаў Аляксей Мікалаевіч, але і сам аж заікаўся ад узрушэння: — Праваронілі, ядры іх корань. Мы — на балота, а яны, бачыш, на поле, жыта ўздумалі свянціць. Во старацелі, ядры іх у корань!..

— Во прахіндзей віславухі! — Іллюк аж калаціўся ўвесь, як у ліхаманцы, і ўсё распаляўся: — Здэцца, даў бы яму выспячча, нагрэў бы і ў хвост і ў грыву калматаму чорту, даў бы так, што да новых венікаў помніў. Во гад, ламіна етая!..

— Дос табе ўжо, Ілля,— бацька пачаў скручваць цыгарку і перадаў кашшук з махоркай старшыні.— Не крычы дужа ўжо. Ты — гаспадар, а гаспадару нягожа гарачку пароць...

З гурту праціснуўся наперад дзед Міколка:

— Правільна, Баянок, кажаш. Няхай моляцца. Ад іх малення каласкі не здрабнеюць... Усё еты Антонька, шыбенік... Яму, канечне, воўчаму лыку, і я лазы даў бы... Добранька аддубасіў бы!..

Загаварылі, зашумелі ўсе. Грамчэй за ўсіх крычаў Якаў Кавалік. Нават нельга было ўлавіць, што ён намагаўся сказаць. Толькі калі людзі, накрычаўшыся, супакоіліся, Кавалік выказаўся, даводзячы, што тут вінаватая і маці Кіпня, шаптуха-праведніца.

— Качарга запечная,— ужо больш спакойна, з усмешкаю гаварыў ён.— Яна людзей падбіла. А тут жыта... Сухмень... Хлеба не будзе... Трэба ікону маці-багародзіцы насці на поле, бо жыта ўсё дазвання загіне. Бачыш, і пацёгліся... Як тыя авечкі!..

— Якое карэнне, такое і насенне,— нечакана выгукнуў Мішка Цярэшка.

Пад смех і жарты людзі пакрысе займалі свае месцы, і работа ўваходзіла ў ранейшае рэчышча. Супакоіўся крыху і старшыня, моўчкі, з нейкай апантанасцю выкідваў цяжкія камякі глейкай зямлі. І раптам зноў пачуўся збянтэжана-трывожны крык:

— Дзядзька Ілля, зірніце сюды!..

— Сашка Кіпень! Далібог, ён!

— Антонаў сынок?! — пранеслася ў грамадзе.

— Душа мая крывая — усё прымае,— буркнуў сабе ў прапахлыя самасадам рудыя вусы дзед Міколка. Ад-

нак, мусіць, яго мала хто пачуў, бо ўсе моўчкі бралі ў рукі рыдлёўкі, займаючы месцы ля канавы.

Запыханы, сарочка наросхрыст, Сашка прымчаўся на грэбельку. Сапучы і румзаючы, стаў расказваць, як стары Кіпень змушае яго несці на Хамінку свянцоную ваду ў біклажцы, а калі Сашка наадрэз адмовіўся — дубасіў сына сырамятным гужам, а тады зачыніў на завалу ў клеці і прыгразіў: «Ты глядзі ў мяне, паганец, сядзі тут, пакуль не адумаешся, не папросіш у бацькі прашчэння».

— А ты што ж, не паслухаўся? — як бы з падколам запытаў Аляксей Мікалаевіч.— Даведаецца, што ты збег сюды, да камсамольцаў, яшчэ раззлуецца, біць будзе...

— А я й не баюся,— усхліпваў Сашка.— Калі на тое, то і ў камсамол запішуся,— азіраючыся па баках, рашуча дадаў: — Мяне, брат, голымі рукамі не возьмеш... Не дамся, не злаўлюся!..

— Даўно б так, Сашка,— ухвальна сказаў Мішка, падміргнуў і запрасіў Сашку да сябе: — Во бяры лапату ды не кляні свайго тату...

— Дзе ты яго не будзеш клясці,— Сашка сігануў праз купіны і ўскочыў на насып. І вось ён ужо заўзята, а больш з нейкай крыўдай ці злосцю, працуе ў грамадзе, абліваючыся, як і ўсе, потам. Пасля, у час перакуру, ужо спакойна гаварыў: — Ета ж такі бацька, праз яго брыдка людзям глядзець у вочы...

Казалі, Кіпень яшчэ ўвечары, калі Сашка вярнуўся з грэбелькі, кідаўся на сына з бізуном, але той выкруціўся і з крыкам «пайду да Свербікава» выскачыў за парог.

3

Бадай, нідзе не ўбачыш такіх прыгожых зор, як над Бацькавічамі. У жніўні зоры асабліва вабныя: буйныя, ярка-зіхатлівыя і нейкія як ласкавыя, бы жывыя. Па вечарах, калі неба глыбее і гусцее, зоры высыпаюць буйна, густым засевам і як цвітуць усё адно. Асабліва, калі глядзець на іх доўга, неадрыўна, аж пакуль не стомяцца вочы, не пачнуць сонна плюшчыцца — і не стане мроіцца ў галаве зусім нерэальнае, фантастычнае.

Выдае, бы зоры па-змоўніцку пра нешта важнае перамаўляюцца, а тады адна, як сарваўшыся, чыркне, акурат запалка, ляціць праз усё неба, і след ад яе ясна і вы-

разна кладзецца, а глядзіш — ужо няма тае зоркі, і нават следу не засталося — толькі тое месца прыкмеціш, а ўжо на тым бяскрайнім дыване гарыць, іскрыцца, мігае мігаўка-іскрынка — новая зорка, і вакол свецяцца, блішчаць ганарліва-халодным бляскам большыя і меншыя зоркі-спадарожніцы, ірдзяцца залатымі камочкамі, зліваючыся і разыходзячыся, бы ў карагодзе...

Была самая пара жніва. Работы хапала ўсім, дарослым і падлеткам. Шчыравалі днём і прыхоплівалі ночы. Спяшаліся звезці з поля збажыну, браліся за малацьбу. Хоць мы ўжо лічылі сябе дарослымі, але за малацьбітоў нас яшчэ не лічылі. Праўда, і нам давалі нарад у начную змену. Мы трымаліся асобна і жылі сваім жыццём.

Увечары мы з Сашкам звозілі на ток снапы. Малатарню паставілі ў новай, сабранай з абагуленых сялянскіх адрын і гумнаў вялізнай будыніне, накрытай кулёвай саломай толькі з аднаго боку, ад поля, а сонечны, да хат, бок яе яшчэ чарнеўся кроквамі-паплётамі, і праз латы, аплеценыя пры круках лазою, акурат праз дзіравае рэшата, свяціліся і сыпаліся, бы зярняты з сяўніцы, залатыя асцюкі-зоркі.

Новая, перад жнівом дастаўленая трактарам з Камунараў малатарня гула роўна і весела; толькі часам, калі машыніст Васіль Шылай, таксама навічок, крыху зазяваецца, бо якая-небудзь кабета ці дзяўчына з тых, што кідаюць снапы на высокі палок, разам са снапом пашле якое слоўца-жарт, і малатарня як бы ўсміхнецца, але зараз жа і заные-зазвініць злосным працяглым зыкам — гэта ў барабан патрапіў нерастрэсены сноп ці нават з перавяслам, неразвязаны. І Васіль, чарнамазы, перапэцканы ўвесь, у запыленых акулярах на цыганскіх, з хітрынкай вачах, у расхрыстанай зрэбніцы-сарочцы, прапахлай потам і салідолам, у няпэўнага колеру штанах з хромавымі леямі на каленях, не застаецца ў даўгу — паблажліва закрычыць на іх, гарэзніц:

— Перастаньце, сакатухі, не балабоньце. Атлумілі вы мне ўсю маю галовачку!..

— Атлумілі! — перадражнівае языкастая і порсткая на работу Моця, дзяўчына-зух; яна дзень у дзень на калгаснай рабоце і разам з маладзейшымі ахвотна прыйшла на гумно, стала на мужчынскае месца — за падавальшчыцу. А тут, у Васіля, не заснеш, не адпачнеш — спіна не раз абмыецца потам, сарочка прыліпне да хрыбціны, і не аддзярэш, бо пылу і смецця наб'ецца ўсюды.

Гудзе малатарня. Прагна, з захлёбам глытае цяжкія, з налітым, як волава, зернем снапы; зярняты вылузваюцца з каласоў, страляюць па зубах бліскучага, чыста люстра, сталёвага барабана, сыплюцца на сіты, якія бесперапынна, бы ліхаманкава, трасуцца. Над малатарняй і ва ўсім гумне стаіць гаркавы, смачны хлебны пыл, асядае пластамі і на плячах, і на галаве малацьбітоў, сляпіцаю лезе ў нос, набіваецца ў вушы. Пыл дастае аж да свежаачасаных крокваў, пад вільчык, за які яшчэ звечара зачапілася зорка Канікула і ніяк не можа адарвацца ад смалістых крокваў. Помню, як часалі іх цесляры з нашага канца — Яўхім Цярэшка і Раман Говар-Гамарнік.

На звозцы снапоў занята, бадай, уся наша камсамолія. Няма сёння толькі аднаго Сцяпана Говара — ён з вазакамі адправіўся на станцыю Камунары з першым хлебам. Яму, перадавіку, які вызначыўся і на сяўбе, і на асушцы грэбелькі, выпаў такі гонар — у дарогу з чырвоным абозам. Колькі радасці, хвалявання было! Сцяпан да поту надоечы маляваў лозунг, не раз прыбягаў да мяне радзіцца: «Скажы, браток, як лепей будзе, калі напісаць: першы хлеб дзяржаве ці — дзяржаве першы хлеб?..» Дзівак Сцяпан — якая ж тут розніца?!

Мы з Сашкам, вядома, памірыліся. Ды, зрэшты, калі шчыра сказаць, і я, і ён даўно забылі ўсё. Тое, што між намі было тады, у маленстве,— сваркі і дзіцячыя бойкі,— парасло быльнікам. Цяпер Сашка дзеліцца са мной, расказвае, як яму сумна бывае, як хацелася, каб хоць вярнуліся тыя нашы забавы і дзіцячыя мары-летуценні.

Сашка падае снапы на мажару, а я ўкладваю іх, сноп да снопа, каласамі ўнутр, а гузамі на край. Ён — работнік заядлы, увішны; з ім не справішся ні араць, ні баранаваць. Змакрэе сам, каня ў пену загоніць, дыхавіцу наб'е і сабе і каню. Ледзь паспяваю я ўкладваць снапы, якія мне кідае і кідае Сашка — шчыруе без адхлання.

— Дос! — крычу я.— Не выпінайся так, бо надарвешся, шлунне парвеш!..

— А я ціха, марудліва не ўмею,— даверліва кажа Сашка.— На паўсілы ета не па-мойму...

З крыкам: «Глядзі, Алёшка, не кульніся!» — кратае запрэжаную ў мажару кабыліцу, і воз гопае па хрумсткім іржышчы, затым спыняецца ля мэндлікаў, што, нібы якіясьці прывіды, рассыпаліся на полі, дрэмлюць пад зорамі жнівеньскага неба. Пакуль Сашка кіне сноп, я паспею

зірнуць на зоры — яны як бы таямніча пераміргваюцца, а мне здаецца, не зоры гэта, а хлебныя зярняты.

— Яшчэ етый абабак во ўцісні пад вяроўку! — крычыць Сашка, і сноп лучыць мне па твары; вусатыя калосы набіваюцца за каўнер.

І вось ужо Сашка намацвае ў перадку тоўстую пяньковую вяроўку, і яе скрутак ляціць мне проста ў рукі. Я кладу яе якраз пасярэдзіне; бяруся за канец абедзвюма рукамі, кладуся на жывот і ссоўваюся па снапах з мажары долу. У чатыры рукі мы ўціскаем воз, зачэпліваем канцом за трайню, і Сашка, чыста сталы гаспадар, сягае побач з мажарай, якая натужна крэкча ўсім сваім драўляным нутром, гэпае коламі па камлюгах. Я вяду кабыліцу Зорку, каб часам не рванулася ўбок, бо тады бяда немінучая: і вокам не маргнеш, як воз са снапамі кульнецца ўбок.

— Вядзі ты раўней, братка,— хрыпіць мне пад вухам Сашка.— А то баразна там. Ці табе бельмакі павылазілі, Алёшка. Не глядзі ты на тэя зоркі, не заглядайся. У тым горадзе прывык на зоркі дзівіцца, дык ніяк не адвыкнеш... Як во станеш за вучыцеля, тады на ўсё ета наша зусім забудзешся...

— Што ты, Сашка, там чаўпеш? — крычу я, выкіроўваючы Зорку на раўнейшае.

— Я кажу, на неба не заглядайся,— абзываецца насмешліва Сашка.— Скора павіднее — вятох засвеціцца...

Выбраўшыся на крыжавую дарогу, што вядзе з поля на загуменне, дзе грыміць, пасвістваючы, новая калгасная малатарня і ў пыле пад перазовы начных зораў шчыруюць малацьбіты, мы, памагаючы адзін аднаму, лезем на воз, на снапы, і адпускаем лейцы — кабыліца сама ведае дарогу да гумна.

Пакуль едзем, Сашка паспявае выгаварыцца.

— Во ты, Алёшка, ты вучышся,— Сашка чамусьці прарывіста дыхае, перабірае тасёмкі лейцаў у руках.— А мяне етый захрыбетнік жыхарыць і жыхарыць. Кажа, дос табе лапці таптаць, кончыў сямігодку і хваця. Забяру цябе з сабою на шахты. Бо тут дабра не даждацца. Яшчэ, кажа, невядома... яшчэ віламі пісана з етым іхнім калхозам... Як ты думаеш, Алёшка, можаць ета быць, што калгасы распусцяць?..

— Што ты, Сашка, мелеш? — падхопліваюся я на ўзлокатках і аж злуюся: — Здурнеў ты, ці што?.. Як ета, каб калгасы разышліся? Ета ж самая што ні на ёсць кулацкая хлусня. Брахня самая нахабная, і бацька твой,

як бачна, брахун, ілгун. Ды яшчэ і з кулацкім душком!.. Гэта я табе шчыра кажу!..

— Алёшка, ты не злуйся,— Сашка даверліва туліцца мне да пляча; тады похапкам тузае лейчыну, паноквае на кабыліцу, хоць тая і цягне лёгка, і толькі як кола лучыць на згублены па дарозе сноп — чуваць глухі хруст, і, выдае: бы жывыя, шасцяць, трушчацца каласы.— Я табе шчыра, як другу... Мы ж разам гулялі, коўзанкі рабілі... Пад лёд, помніш, удвух правалiліся, і ты мне памог, падаў паплёцвіну-жардзіну... Ета ўсё праз ягоную прагнасць. Дужа ўжо жадны ён, бацюхна мой...

Сашка ўздыхае, няўцямна пазірае на зоры, якія, здаецца, вось-вось заіскрацца, тручыся адна аб адну, і пасыплюцца на зямлю, на наша бацькавіцкае поле, на снапы, на нас з Сашкам. Ён усё гаворыць, нібы разважае сам з сабою:

— Ты ж, пэўна, помніш тую авечку Іллюкову, што тады знайшлі ў бочцы з брагаю, а мяса і аўчыну ў гнаі? Маці і Алена, сястра, і я плакалі-галасілі: «Тата, што ты робіш, не чапай чужога. Абняславіш, апаскудзішся на ўсю дзярэўню!..» А ён адно: «Не ваша дзела, смаркачы!» А тады, як пайшлі з вобыскам і выцягнулі тую аўчыну, ён ніяк не прызнаваўся, быў яшчэ з калом на Іллюка і на панятых кінуўся. Ета ж не жыццё з такім бацькам, а нейкае бязладдзе. Усягды за лучынку знойдзе прычынку. Цяпер з гэтым духам. Ета ж прычапіўся, каб я свянцоную ваду тую нёс, дык як тая смала. Я наадрэз сказаў: «Не пайду, і канцы!» А ён як закрычыць, аж пена пайшла з рота. Крычаў да хрыпаты: «Вісус! На калені, бо як гракну вобзем, дык пячонкі адсаджу!» І за гуж. Запхнуў мяне ў клець, а сам пацёгся да бабы Прасенні, сваёй маці...

— Відаць, ета ён, бацька твой, працэсію тую тады, на духа, згарбузаваў?

— Не, ета самі бабы, а ён ужо, як ішлі яны ля нашае хаты, прыпрогся...

Сашка змоўк, ціха паноквaў колішнюю сваю кабыліцу, і я маўчаў, думаючы аб яго лёсе са шкадаваннем. Сапраўды, не па дарозе Сашку з такім бацькам. Але ж бацька ёсць бацька. Як усё адно адчуў Сашка, што ў мяне па душы, бо пасля зацяглай паўзы прамовіў самотна, з адчаем:

— Здэцца, адцураўся б такога бацькі. Пайшоў бы куды вочы глядзяць. А як бацьку перанесці адцуранне свайго дзіцёнка?..

Мы не заўважылі, як пад'ехалі да гумна. Над Бацька-

вічамі вісеў падрумянены акраец месяца — вятох з абломленым рогам, а зоры як бы пацямнелі, зрабіліся бляклымі. Аднак жа святло іх, рассейваючыся, мякка лілося, бы цадзілася з паднябесся, і гукі малатарні патаналі і глухлі, заблытаўшыся ў чорным голлі недалёкіх садоў. Каб не гэтае бадзёра-працяжнае гудзенне барабана і не галасы і гамана людзей на таку, можна б падумаць, што там, у чорным прадонні напята расчыненых варот гумна, варушыцца нейкае страшыдла, зеўрае жалезнымі пашчэнкамі.

Мы насцярожана сціхлі.

— Нешта аж страшна,— кажа Сашка і нерашуча саскоквае з мажары.— Стой, ваўкарэзіна!..

Кабыліца прыпынілася і, закапыліўшы губу, пачала шкуматаць сноп, які скінуўся, відаць, раней — звозілі жыта на чатырох мажарах.

— Дзе ета вы забавіліся, жанішкі? — дакорліца Моця ўжо ля нашае мажары пачала тупаць, набіраць бярэмя снапоў, не дачакаўшыся, пакуль мы ўз'едзем на ток.— Мы ўжо думалі, што паснулі на ржышчы нашыя ўдарнічкі...

— Ага! Паснулі...

Сашка нечага ўсё поркаўся ля воза, тады, ухапіўшыся за вяроўку, спрытна, як кот, ускочыў на снапы, пачаў шпурляць іх сноп за снопам, аж у вушах свістала, бы ад ветру.

— Ета вы, сядухі і бабы, тут паснулі. А нам што? Нам толькі каб відна было, то й да рання можна. Праўда, Алёшка?..

Моця, як абражаная ці пакрыўджаная, адразу гучна, як не на ўвесь ток, грымнула.

— Якая я табе баба? А я ў цябе дзяцей бабіла?..

— Ета дзела няхітрае,— ухіліста адказаў Сашка, але Моця як бы і чакала зручнага моманту, каб зачапіць тое здарэнне ў Кіпняў на сёмуху. Трохі гамзаючы, бо за ноч перасела горла, яна пачала як бы здаля:

— Кажуць жа, твой бацька з бабамі па жыце, пад Гараўшчынай, без споднікаў гойсаў і ўсё малітвы нейкія казаў. Праўда ета ці брахня, можа?..

Сашка патупаў на возе, чмыхнуў носам, як з пералёку, але прамаўчаў — толькі снапы аж свісталі ў ягоных руках, і я не стрываў, крыкнуў:

— Моця, адыдзіся!

— Не, скажы! — падхапіла Моця.— А за што ж ета Антон з Міллянам пабіліся? Хіба не з-за тае прачыстае іконы? Міллян хацеў прасіць баб, каб яго канцавую па-

лосу акрапілі — бульба зусім ад зямлі не адскочыла, сіднем сядзіць, хоць і на вадацечы... А Кіпень падхапіўся і з іконай на Мілляна, дык той ледзь уратаваўся. А ты баеш, не кажы...

— Не вякай, вякала! — агрызнуўся Сашка, але неяк нязлосна, і стаў як абвялы. Гэта было непадобна на Сашку: аказваецца, і ён можа стрымаць сябе пры такой невыкрутнай сітуацыі.

Разгрузілі мажару. Сашка перавярнуў шаляўчыну, атрос насыпаныя зярняты і па-гаспадарску ўзяў Зорку за аброць-вуздзечку:

— Но, мілая!..

І столькі было пяшчоты і ласкі ў гэтых словах, што мне зайздросна стала: Сашка — прыроджаны селянін, і як у яго ўсё гэта, уся хлебаробская работа, аж гарыць у руках. Веру, што з цягам часу ён стане слынным гаспадаром. Вось каб з яго натуры як-небудзь хутчэй вытравіць гэтае ўласніцкае, якое яму перадалося з роду, у спадчыну...

Мы яшчэ зрабілі рэйсы два, а вазілі снапы аж з-за Маяка — так завецца наш могільнік на гары, ад якой усё наваколле, вёрст на дзесяць, відно як на далоні. І Васіль-машыніст аб'явіў:

— Перакур. З драматой!..

Усё ўмомант сціхла: замёр, візгнуўшы барабан, абвіслі на шківах пасы, не тарахцяць сіты, не чутна голасу машыніста; змоўклі змораныя падавальшчыцы. Як снапы, клаліся ўсе, напрацаваўшыся, змогшыся без спачыну,— палеглі амаль што на сваіх месцах, там, дзе хто завіхаўся.

І панеслася храпенне — з пералівамі, з посвістамі і прысёрбваннем; раскінуўшы рукі, як асілак на полі бою, на ўсё гумно соп Васіль Шылай. У гурт збіліся дзяўчаты — Аўдотка, Варка, Параска, Дуня, Моця, Ганка...

Старэйшыя кабеты, перамовіўшыся, пацягліся гародамі, па канаплішчы, дамоў: ім рупіла хатняя работа — згатаваць сняданак, паставіць гаршкі ў печ на абед і вячэру, накарміць скаціну, паладкаваць у хаце. А ўранні — зноў сюды, на ток. Нягледзячы на сушу, якая была нахапілася на сёмуху, якраз у пару красавання, жыта на ўзлобінах трохі было прыхапіла, і каласы наліліся не дужа ўмалотныя, але ўвогуле ў Бацькавічах у той год ураджай удаўся памятны. Іллюк, аб'ехаўшы палеткі на жарабку-стаеннік, паабяцаў на калгасным агульным сходзе (сходы ў тыя першыя калектыўныя гады адбываліся кожны месяц, а то і часцей), што збожжа па выдачу прыпадзе дастаткам —

кіло па тры на працадзень. І тады з лёгкага языка, відаць, нашага Трахімкі — пастуха калгаснага статка — панеслася па сяле ягоная байка-прымаўка: «Калі ёсць хлеб ды вада, то жытуха — не бяда».

— Ідзі сюды, Алёшка! — крыкнуў Сашка, ладкуючыся на яшчэ цеплаватай, толькі з-пад барабана, саломе блізка ад малатарні.— Тут зацішна і неба свіціцца...

Да нас падсунуліся возчыкі Яўген і Мішка з нашага канца і Мішка з Мікольска; падахвоціўся і дзяцюк-нежанацік Восіпка Зайчык. Хлопцы, пазяхаўшы трохі смачна і дрыготка, неўзабаве паснулі, а нам з Сашкам нечага не спалася, чамусьці не ішоў сон. Стома ва ўсім целе, а ў галаве — звон, як нейкі няўлоўны камарыны бзык звініць над вухам; у вачах аж муляе, бы набілася пылу ці парушыння, хочацца іх церці, а не спіцца, не плюшчацца вочы.

— Не спіш, Алёша? — шэпча мне ў вуха Сашка.

— Не сплю.

— Чаго ты?

— Не ведаю,— пазяхаю я. Адчуваю, што не засну. Павярнуўшыся на спіну, пазіраю праз кроквы на цёмнае, з сінімі прасветлінамі жнівеньскае неба; яно нейкае як жывое, як рухаецца марудна-марудна, як «чортава кола», што ў парку ў горадзе над Сожам. Ужо, відаць, скора світанне. Зоры высыпалі і блішчаць, як пацеркі. Млечны Шлях аж іскрыцца і дыміцца; праз кроквы мне відзён яго ладны кавалак, і ад іх, зорак, якія, здаецца, зліпліся, ледзь не труцца адна аб адну, і адтуль, з маўклівага прадоння, бы дыміцца, курыцца срабрыста-вогненны пыл... Час ад часу на імгненне адна зорка ўспыхвае, прачэрціць, як сярнічкай, след і ў адзін момант знікае — там, дзе яна праляціць, застаецца адна цёмна-мярцвяная чарната, ды ненадоўга, зноў там святлее, і як бы на тым месцы ўжо зіхаціць малеча, акурат макавае зярнятка, новая зорачка.

— Як ты думаеш, Алёшка, колькі будзе вёрст да неба? — ужо крыху грамчэй пачынае Сашка.

Хлопцы даўно спяць, смачна цмокаюць губамі, свішчуць насамі, часам нехта бацне па саломе рукою ці выгукне якое недарэчнае слова ў сне, і дружнае храпенне глухне ў настоенай на збажыне свежасці блізкага світання.

— Каб змерыў хто яго?..

Падалося, Сашка жартуе — ён жа скончыў сямігодку

і павінен ведаць, вучыў жа геаграфію і фізіку, што неба — бездань і сусвет — не мае межаў. Але я ў тон яму паўжартам адказваю:

— Можа, вёрст тысячу з гакам будзе?

— А без гаку? — усур'ёз дапытваецца Сашка.

— Без гаку, напэўна, тысячы паўтары...

Сашка маўчыць, уздыхае, часта варочаецца, крэкча, як стары, бы нешта мулкае яму собіла пад бок, тады ўстае на ўзлокаткі, і мне бачны яго гарачыя вочы, зблытаныя валасы, акрэслены профіль, прамы нос, рэзка раздвоены падбародак. Чуваць, як пад спацелай суравой сарочкай ходзіць Сашкава грудзіна — Сашка, відаць, усхваляваны, і яму карціць выказацца.

— Мая баба Прасення,— пачынае Сашка неяк раптоўна, без пэўнай сувязі з тым, пра што толькі гаварыў,— багамолка. Яна заўсёды гаворыць, калі бываю ў яе,— усе беды на зямлі ад таго, што людзі выракліся веры... веры ў бога. А які той бог, каб спытаў яе, хто яго калі бачыў?.. Як ты думаеш, Алёшка, ёсць бог ці не, ці ета ўсё людскія выдумкі... Скажы, Алёшка, ты ж ужо больш вучыўся, у горадзе дзве зімы жыў... Мяне ета ўсё дужа стала цікавіць...

Я маўчу. Думаю, як усё гэта яму лепш вытлумачыць, каб усё стала зразумелым і запала ў душу. Я чытаў ужо шмат кніжак, апрача тых, што нам давалі ў тэхнікуме па праграме, і быў цвёрда ўпэўнены, што ніякага бога, вышэйшай істоты, якая б кіравала ўсім жыццём на зямлі, вядома, няма, але ж ёсць законы, згодна якім людзі жывуць, падпарадкоўваюцца ім і ладзяць свае ўзаемаадносіны. І я кажу Сашку:

— Добра, што ты, браце, шукаеш адказу на такія пытанні. Правільна разважаеш: бог — ета самая што ні на ёсць выдумка людзей. Рэлігія, яе служкі, папы, ксяндзы і ўсякія там равіны выдумалі сваіх багоў. Абы трымаць людзей у страху і пакоры...

— То, можа, і праўда твая, што ты даводзіш,— шкрэбаючыся і цярэблячыся ад вусатых каласкоў, цягне Сашка, і я адчуваю, што я яго ўсё-ткі не пераканаў.— Але скажы, чаму ўсякія замовы і шаптанні ёсць? Вунацька, як Ладымераву карову нешта ўкусіла, яна раздулася, як бочка, прывялі маю бабу, яна пагаварыла, і карова ўстала, зноў стала жвачку жаваць?..

— Ета ўсё забабоны, Сашка,— смялей спрабую я пе-

раканаць сябрука.— Тая карова і так, без бабінага шаптання, устала б. Яна проста аддыхалася і пайшла...

— А ўкус змяі? — не супакойваецца Сашка.— Было ж, як нашу Алену ўкусіла змяя, то яна гарэла як у агні, а ўжо вечарэла, сонца з паўдня звярнула. Зноў жа баба Прасення нашаптала ёй на вадзе, і болька пачала ападаць, і назаўтра як нічога і не было, Алена паздаравела... А ты кажаш, забабоны! Нешта ж ёсць такое... Можа, на тым небе? — Сашка ткнуў рукою ўгору, паказваючы чорныя кроквы, праз якія трымцелі зацягненыя туманам залацістыя зоркі.

Выпадак з Сашкавай сястрою, смуглатварай Аленай, адбыўся тым летам, калі я збіраўся на экзамены ў тэхнікум. Алена пасвіла авечкі ў Касіцкім і неасцярожна, вядома, басанож, наступіла на змяю — тая грэлася ў верасе, на санцапёку. Алену прывезлі дадому апаўдні з напухлай нагою. Дзяўчына нема раўла, злякаўшыся. Ёй укус замаўлялі бабы з нашага канца — і Бручвіха, і Мацвеіха, але не памагло. А баба Прасення, старая, згорбленая ў крук, уся высахлая, як смаляная карага, твар з кручкаватым, спушчастым носам увесь у зморшчынках; на галаве — чорная, некалі, відаць, у клетку бухматая хустка, з-пад якой тырчалі космы белых, пасечаных ад старасці валасоў, толькі вочы, глыбокія, чорныя, злосна бліскалі, як бы праціналі цябе навылёт,— родная старога Кіпня маці. Прасенню, мабыць, тады кудысьці, у Арцюхі ці ў Ігліцу, паклікалі на шаптанне. Што было рабіць? Кіпня суседзі ўпрасілі, каб вёз дачку ў Горкі, да фельчара. «Вот яшчэ дакука мне,— раскухцеўся Кіпень, які прыйшоў з касавіцы і нагбом даядаў шчаўе, запраўленае здорам.— Абыдзецца. Прыйдзе старая і пагамоніць...» Але Алена як таяла ўсё адно: гарэла ўся, стагнала, аж з вуліцы вярэдзілі ўсіх яе тыя стогны. Пёкла — ціхманая Кіпеніха, яна адна ў сям'і была такой бялявай, што выдавала побач з Кіпнем, які быў смаліста-чорны, чыста цыган,— не сваім голасам загаласіла, тады пачала плакаць наўзрыд, захліпаючыся слязьмі, і прычытала: «А божачка, а што ж ета робіцца! Няхай толькі загубіцца дзіцёнак — на цябе, знай, ляжа етае ўсё...»

— Не скуголь, а то як гракну вобзем, дак і пакоцішся, рассыплешся ўся,— ускіпеў Кіпень, аж губы пачарнелі, але нехаця ўсунуў цёмныя, брудныя ногі ў бахілы, схапіў шапку і ўзяўся адвезці Алену ў бальніцу. Прывёз Алену назад хутка. Фельчар зрабіў укол і даў нейкіх парашкоў.

Нага паступова супакоілася, і пад вечар прыйшла Прасення. Шаптала на вадзе. Укрыўшы хворую посцілкай, сказала: «Добра, што паспела да заходу сонца, а то ўсё прапала б — Яленіцы тваёй, Пёкла, быў бы каюк...»

Хацелася нагадаць, як усё тое было, але я стрымаў сябе, бо ведаў: Сашку не перайначыш так, адным махам, на гэта патрэбен час, і, галоўнае, каб ён сам, сваім одумам дайшоў. Я помніў, як яго дома вухрыў, настаўляў стары Кіпень, прыгаворваючы: «Ета абэрвус, яму хоць кол на галаве чашы, а ён будзе сваё трубіць». Ды, зрэшты, і спаць ужо хацелася — вочы самі неяк закрыліся — і я нібы праваліўся ў прадонне.

Прачнуўся ад таго, што Сашка тармасіў мяне за плячо і прыгаворваў:

— Ды ўстань жа, Алёшка, ужо ўсе пайшлі, а ты дрыхнеш. Паедзем, бо мой бацюхна ўжо там, мабыць, прычакаўся... Дай бульба прастыла, пара сышла...

Па дрогкай загуменнай дарозе санлівасць хутка прагнала. Сонца ўжо выкацілася з-за грэбелькі і, як асвяжэлае, умытае росамі, урачыста плыло над яшчэ соннымі садамі, адурманенымі пахамі агурочніку і прывялых канопляў, што ўсцяж дарогі на канцах гародаў даспявалі, павязаныя ў снапы і пастаўленыя ў бабкі. На бухматых канапляных шапках ужо мітусіліся вераб'і. Водар яблыкаў і груш, змяшаны з канапляным чадам, аж казыча ў носе, выклікаючы жаданне саскочыць з мажары і пусціцца ў бліжэйшы садок.

Маўчым, як ачмурэлыя, бы ўчадзелі ад гэтага цёплаасвяжальнага духу, які разам з туманам і дымкамі з каміноў цягне на дарогу, плыве загуменнем далей на поле, дзе жыта ў снапах, і, мабыць, асядзе, рассеецца на прымятым калясьмі ржэўніку. Там, дзе мы ўсю ноч, як лунацікі, укладвалі на мажару волгкія і да таго пацяжэлыя снапы.

А сонца ўжо выбавілася з аблокаў і вольна кацілася падсіненым досвіткам Забалоццем, высвечваючы ўсю доўгую вуліцу, і стрэхі заблішчалі, як начышчаныя, а касмылікі туману ўсё плывуць — відаць, ён застояўся за доўгую ноч, зляжаўся на стрэхах хат і абцяжараных пладамі садоў. Густы і дрыготкі, бы перастоеная сыракваша, туман як дужаецца з сонцам, якое, здаецца, яшчэ і гарачае, і пякучае. Не, яшчэ не скончылася лета, і сонца шчыруе борзда і ўвішна, як улетку. Толькі па дыханню садоў і гародаў — яны пад цяжарам ураджаю — можна ўлавіць

першыя прыкметы восені. Як бы ў пацверджанне нахлынуўшых думак з павевамі наляцеўшага ганца-ветрыка на дарогу зляцелі счаўрэлыя ліпавыя лісты...

— Скора зноў паедзеш, Алёшка,— самотна прамовіў Сашка, чмыхнуўшы бусліным носам, зябка сцепануў вострым плечуком.— Но, мілка, нешта ты як не выспалася.— Ён павярнуўся ў бок садоў, паўжартам дадаў: — Самае што яблыкі паспелі... Пашуравалі б мы ў садках, як некалі!..

— Добра было б, канечне,— паблажліва адзначыў я, ведаючы, што Сашка намякаў на колішнія нашы дзіцячыя вылазкі.— Але ж мы ўжо выраслі, не праўда?..

Сашка смачна пацягнуў носам, паварушыў тонкай шыяй, сказаў ціха сабе нешта, але я не пачуў. Як бляшаная, блішчала мокрая ад расы і туману дарога. Пахла канюплямі, пераспелымі грушамі і яблыкамі.

Не згаворваючыся, абодва мы адчулі, што нам не хочацца расставацца. Лета зблізіла нас, і мне ўдалося ўбачыць у Сашку нешта такое, што змушала хваляваць за яго і шкадаваць яго.

— Відна, паеду і я ў шахты,— з нейкай шкадобай і сумам у голасе прагаварыў Сашка.— Не магу я з ім, з бацькам еткім... Дужа ён нейкі жадны — усё б забраў, і ўсё яму мала. Такая скнара, што хлеба жабраку жалее, не дасць скібкі...

— А табе дапякае?

— Ай, дапякае! — Сашка ўзмахнуў сырамятнай лейчынай, адрывіста сказаў, як адрэзаў: — Надаелі мне ягоныя дапяканні...

Затарахцелі драбіны мажары. Ужо выніклі з туману канцавыя хаты. Над імі густа валілі малочна-белыя дымы. У бліжэйшых садках заўзята траскаталі сарокі-плятканкі, як пахваляючыся адна перад адной, што з ранкам у Бацькавічы прынеслі яшчэ навіну.

4

Ад хаты да хаты пранеслася:

— Трактар прыехаў! Трактар...

Дзеці і падлеткі-«ўзросткі» аж з дальняга канца, з-пад Хамінкі, несліся, засопшыся, на аселіцу. Як не навыперадкі тарабанілі хлопцы і дзяўчаты; без шапак, расхрыстаныя беглі мужчыны; з кіёчкамі клыпалі калматыя і ссі-

велыя дзяды-дамаседы; спяшаліся ўвішныя, выпетраныя вясковыя бабулькі. Усім карцела паглядзець на свае вочы і, вядома, памацаць сваімі рукамі тое дзіва, якое само едзе ды яшчэ плугі і бароны цягне. Пра трактар, канечне, людзі чулі. Той-сёй быў у Тур'і ці ў Сідараўцы, аж за Маластоўкай, райцэнтрам, дзе ўжо меліся трактары. Ляцелі ўсе як на пажар, штурхаючыся і задыхаючыся — як не перасварыліся каторыя найбольш порсткія.

Ды што тыя дзяды і бабулькі! Учуўшы з двара, дзе нешта майстраваў пад паветкаю, і я пусціўся з усімі на аселіцу. Вядома, многіх абагнаў і ўжо апынуўся ў натоўпе, блізка ля трактара. Ён стаяў на ўзбочыне, блізка ад дарогі, што паўз грэбельку выкручвалася ў бок Крывалесся, і быў амаль што не відзён здалёк. Вакол яго крычалі і шумелі людзі.

Той, хто даняў першым, мацаў трактар рукамі, гладзіў яго жалезныя бакі; некалькі мужчын забраліся да трактарыста — чырвонага ў твары дзецюка з суседняй вёскі Дзярнухі, які, мабыць, ад збянтэжанасці і разгубленасці маўчаў і плюскаў вачамі.

Калі прайшло ўтрапенне, цікавасць трохі ўлеглася, у натоўпе пачалі перагаворвацца — людзі спяшаліся выказаць свае пачуцці, якія можна было б выказаць адным словам — захапленне.

— Во йта сіла! — асіпла паўтараў Андрэй Кавалік, зарослы па вушы рыжа-вогненнай шчэццю, адно толькі вочы шалёна паблісквалі, і махаў над галавой нейкім абрыўкам пяньковай вяроўкі ці павадком ад аброці.— Сілачка, людзі!..

— А хто яе бачыў, етую сілу веліканскую? — запытальна акідваў натоўп блізарукімі, старэчымі вачыма пераломлены ў поясе сівабароды дзед і ўсё няўцямна пазіраў на гэтае дзіва і бубніў сабе ціха, стоячы воддалі, баючыся ці не жадаючы падступіцца бліжэй.— Няхай пакажа нам, на што здатны етый іх трахтур!..

— Ой, маці-ўгодніца, багародзіца прачыстая! — хрысцілася заўзята бабка Мацвеіха і баяла сваё: — Упасі нас, госпадзі, памілуй мя!..

Смешна крыўляліся яе тонкія бяскроўныя вусны — выдавала, бабка Мацвеіха плача. Пры гэтым яна шморгала сухім кручкаватым носам і клала на грудзі трыма закарэлымі, непаслухмянымі пальцамі крыжы — хрысцілася.

Трактар ціха і роўна гудзеў, матор працаваў на малых

абаротах, і паветра напаўнялася непрывычна гаркавым пахам перапаленай газы, і людзі, удыхаючы смурод, шморгалі насамі і кашлялі. І рокат матора, і гэты даўкі смурод у паветры — усё было нейкім нязвычным і цікавым.

Ачомаўшыся і супакоіўшыся ад такой сустрэчы, трактарыст абвёў вачыма натоўп:

— Дзе старшыня? Мне ж трэба на поле...

— А вунь і Іллюк! — выгукнуў нехта з хлапчукоў, якія паспелі абляпіць «жалезнага каня» з усіх бакоў.

— Ілля Рыгоравіч, дзе ты там? Давай хутчэй! — фанабэрыста падаў голас Сямён-Марцін, які таксама ўжо агледзеў трактар і нават умудрыўся пасядзець на месцы трактарыста. А цяпер гаспадарнічаў — раскідваў людзей увішна: — Дарогу, дарогу!..— Тады ціхенька шапнуў Іллюку: — Дужа чмыхае етый трахтур, як якей прастуджаны... Во будзе сарамоцця, калі папсуты які далі...

— Да што ты мне дурыш тут, дурань! — адмахнуўся, як ад мухі-назолы, Іллюк і лёгка, спружыніста ўскочыў на машыну, да трактарыста, па-салдацку расправіў выбеленую сонцам гімнасцёрку пад прапахлай потам папружкай, страсянуў густым злямцаваным чубам, адкашляўся: — Таварышы! Бацькавіцкія мужыкі, калгаснікі! Сянні ета вялікі, назаўсёды памятны дзень — мы палучылі ад дзяржавы, ад Савецкай уласці — машыну. Яна, як вы ведаеце, называецца — трактар. Тра-к-тар, таварышы!..

Ён перадыхнуў, аблізаў асмяглыя, запыленыя губы, абцягнуў гімнасцёрку, ніякавата ўсміхнуўся і загаварыў ужо крыху спакайней:

— А ці ведаеце вы, землякі-калгаснікі, што такое ёсць трактар? Трактар,— старшыня пяшчотна пагладзіў шурпатай даланёю абаранак руля.— Трактар — ета, як казаў наш павадыр Ленін, ёсць Савецкая ўлада з плюсам электрыфікацыі ўсяе страны!..

У натоўпе — вясёлы гул адабрэння, і нечы старэчы голас:

— Няхай пакажа, як яна арэць, етая фікацыя!..

Людзі заварушыліся, загаманілі:

— Да праўда, Іллюк, хай з плугамі праедзе...

— Можа, ета падман які, а вам — трахтур!..

— Дужа ж ён смярдзіць — не вытрымаць!..

Старшыня падаў знак трактарысту, ахрыпла крыкнуў:

— Едзем! Хто мае жаданне, глядзіце, як будзем араць...

— Зааром старыя межы,— пачулася нешта дужа знаёмае.— Зааром назаўсёды і беспаваротна!

Гэта з вучнямі прыджгаў на поле Аляксей Мікалаевіч. У руках ён трымаў скручаны ў трубачку чырвоны сцяжок — той, што развяваўся не раз, калі моладзь выходзіла на расчыстку і асушэнне грэбелькі. Замест яе, дзе была ржавая балотная вада, срэбрам блішчала ладная азярына-сажалка.

— Мікалаевіч! — гукнуў Іллюк, угледзеўшы настаўніка.— Давай сюды сцяг!

Самаробны, з міткалю, сцяжок успыхнуў ранішняй чырвонай зарою над шапкамі і кепкамі, хусцінкамі і чапцамі.

Пыхкаючы і страляючы гаркава-масляным дымком, пакідаючы за сабою на дарозе незвычайныя сляды — адбіткі ад жалезных зубцоў, трактар, сталёвы асілак, лёгка і ўпэўнена ўзяў кірунак на поле, у бок Крывалесся. Побач з трактарыстам прымасціўся з чырвоным сцяжком у руках Іллюк Кавалік, сын бедняка-бедалагі, які ўсё жыццё калупаў зямлю крывуляю сахой і ў сне не бачыў такога дзіва, якое цяпер прыйшло на палосы бацькавіцкіх хлебасеяў.

Ніхто, ні адзін чалавек — і старыя і малыя — не заставаліся на месцы, усе рушылі за трактарам на поле, здзіўлена разглядалі тыя сляды, што пакідаў за сабою «жалезны конь».

Не мог ніяк супакоіцца дзядзька Андрэй, усё размахваў пяньковым павадком, засопшыся: «А як жа цяпер з коньмі? Што, хіба ўсіх цяпер на мыла?..» Дзядзька Андрэй, лічыце, з таго года, як у Бацькавічах, пасля так званага адліву, калі многія сяляне вясною былі выпісаліся з калгаса, стаў за конюха, і, натуральна, яго больш за ўсё цікавіла, як жа будзе з коньмі, няўжо ўсё поле абсядуць, асядлаюць гэтыя жалезныя стаеннікі?

Як адгадала ягоныя думкі бабка Мацвеіха. Схапілася за крысо Андрэевай душагрэйкі, якую той не скідаў і ў пятроўку, бубніла гамзаючы:

— Братка, трахтур трахтурам, а конь канём...

— Трахтур — ета машына не для вас, старыя атопкі,— уставіў сваё Трахімка, «вясковае радзіва», які невядома адкуль з'явіўся ў натоўпе і горача ўпрошваў усіх, каб не спяшаліся, бо нікуды ён, трактар, не ўцячэ, калі ўжо далі, значыць, не адбяруць.— Вот я і кажу,— ляпаў сябе

рукамі па штанах-суконніках Трахімка,— трахтур, ён любіць розум і крэпкія рукі...

— Яшчэ, як тэй казаў, пабачым,— няпэўна махнуў кіем сівабароды стары па мянушцы Бура. Даўгалыгі і згорблены, ён бегма бег, пакуль дагнаў грамаду, і, адсопшыся, прыслухоўваўся, як людзі рэагуюць на такую незвычайную падзею ў Бацькавічах, і во, прыслухаўшыся, выказаў сваё меркаванне не надта ясна, бо быў глухі і не чуў усяе размовы.— Увосень хлеб памалоцім... Як тэй казаў, пазычай — злы абычай...

— Дзеду, не пляціце абы-што! — махала рукой паўнатварая, як пампушка, Аўхімава Адарка. Дзіўна, што і яна, маруда і спакайняка, была тут, у натоўпе. Яна была адсталa ад усіх і цяпер трусіла ў пары з дзедам і вымушана была слухаць яго, як яна казала, турэсы, гэта азначае пустую гамонку. А тады і сама выказвала сваё: — Бачыце, трактар як паехаў, дык мы ўсе і адсталі, языкі высалапіўшы, бяжым. Ета, відна, спраўная машына. Палягчэнне вялікае будзе мужыку...

— Га? — наставіў да вуха даланю дзед Бура і сам жа загаварыў зусім пра іншае: — А хлеб — не зяць, добрыя людзі з'ядзяць...

— Яму кажаш у лес,— рагатала Адарка, намагаючыся пабегчы за натоўпам,— а ён па дровы... Ведама, глухі — не дачуе, дык прыманіць...

...А трактар весела і зычна гудзеў, і дарога, шэра-светлая стужка, уздымалася на пагорак, і за трактарам спехам дыбалі людзі, крычалі, махалі рукамі — іх галасы патаналі і растваралiся ў спакойна-грымлівым рокаце матора.

Трактар прайшоў шляхам недалёка ад хаты Антона Кіпня. Той таксама памкнуўся ўслед, тады раптам перадумаў, матнуўся назад, мо таму, што быў у бруднай, са слядамі чырвані руды нацельнай сарочцы, у рудых каляных брызентавых штанах-шахцёрках, без апаяскі: твар няголены, на галаве валасы, некалі кучаравыя і бліскучыя, злямцаваліся, зблыталіся так, што да іх не падступіцца ні з якім грэбенем.

Чалавека, відаць, стрымлівала нешта большае. Як і заўсёды было, калі Кіпень узрушаны ці ўзлуецца, вочы яго, чорныя і калючыя, загараюцца кашачым агнём, яго нага позірку збаіцца, не стрывае кожны, хто хоць раз сутыкнецца з ім ва ўпор.

Кіпня падмывала кінуцца туды, дзе гудзеў трактар, дзе над выхлапной трубой, над шэра-пярэстым натоўпам

віецца стаўбунок пахучага дыму. Што ж стрымлівала, не пускала да людзей Кіпня? Відаць, баяўся Кіпень, што не ўтрымаецца, выдасць сябе, праціўніка ўсяго гэтага пералому, які зрабіўся ў Бацькавічах (каб толькі ў Бацькавічах!). Кіпень адчуваў, што ніхто і нішто не ўстаіць перад тым, што зрабілася і пахавала ўсе ягоныя надзеі, напэўна, назаўсёды. Застаецца адно: плысці, учапіўшыся абераруч за бераг чаўна разам з усімі, лоўка лавіруючы і ўчэпіста трымаючыся, каб не сарвацца і не бултыхнуцца ў вір з галавою. Але ж душа — душа іншы раз ідзе насуперак галаве, і з языка можа сарвацца тое, што не вымавіш і ў сне, што замкнёна на ўсе застаўкі, схавана на самым сподзе...

Не знаходзіў сабе месца Антон Кіпень і, сціскаючы кулакі, таптаўся каля прызбы, на ўбітай, стаптанай мураве, цяжка ступаў вялізнымі, у драпінах і цыпках, ступакамі, шкробаючыся, запускаючы закарэлымі пальцамі, усёю пяцярнёю, у прапыленыя, нечасаныя з зімы валасы, і ў вялікіх з сінімі прожылкамі бялках шалёных вачэй аж кіпела, клекатала злосць. Была яшчэ адна вельмі важная прычына, з-за чаго Кіпень не пайшоў да трактара. З Ілюком-старшынёю ў іх былі свае рахункі, хоць старшыня ніколі нічым не папракнуў Антона; больш таго, нават іншы раз прапускаў міма вушэй тое, што Антон плявузгаў на людзях і не надта асцярожнічаў на сходках і на праўленні.

— Эх, матары іх, галетнікі! — скрыгатаў зубамі Кіпень, накаляючыся і цямнеючы ў твары, і чорныя губы яго рабіліся як абвугленыя. — Наясіся хлеба з вашага трахтура... Адна згуба для людзей. Бясхлебіца будзе. Яй жа богу, галадоўка нападзе. Яно і без таго, без трахтароў етых на ўсё настала дарагоўля, нічога не дакупішся...

Кіпень, скрывіўшыся, ухмыляўся, а ўнутры аж гарэў ад злосці. І вочы зіркалі, як балотныя светлякі ў цемры, хоць было светла і спакойна вакол, на паніжэлым жніўеньскім небе было чыста — адно ўсцяж цвіла празрыстая сінеча.

«Любуйцеся, бясхлебнікі, сваім трахтурам. Паглядзім, як ён накорміць вас хлебам...»

А трактар усё гудзеў. І адтуль, з-пад цагельні, дзе за далягляд ам у сіне-бляклым марыве ляжала і яго былая радасць — шырокая, на два надзелы, паласа — даносілася нешта такое, як песня. Слоў нельга было разабраць.

Кіпень, забыўшыся, відаць, што яго ў каторы раз аклікала жонка з хаты, настаўляў да вуха цёмную, у застарэлых мазалях далонь, але дарэмна — яму даносілася адно толькі гудзенне.

5

У Бацькавічах людзі адкрытыя, таварыскія, ідуць адзін да аднаго ў хату проста, без запрашэння. Няхай то будзе сняданак ці абед, вячэра ці полудзень — да суседа зойдзе сусед, дасць «добрага здароўя», для прыліку, а можа, і напраўду, папытаецца пра нешта, для парадку гэтым вытлумачыць свой ранні ці позні візіт, усядзецца на ўслончыку ці на лаве, і пачынаецца доўгая, як асенні вечар, павольная, як плынь у лясной рэчцы, гутарка, якой не відаць ні канца ні краю.

Бывае, і госць і гаспадары ўжо ўсё перагаварылі, і адчуваецца, што вось бы і разысціся па часе, але ж не — як бы зусім пагас агонь размовы і прысак прастыў, ды раптам, як іскрынка ад ветру, ад нейкага новага, нечаканага ўспаміну ці проста нейкай дробязі гутарка ажыўляецца і набірае сілы.

Харытон Півоня, бацькаў равеснік, таварыш у паездках па шахтах, уранні адчыніў дзверы і з парога, як звычайна, пацепваючыся, прывітаўся і нерашуча спыніўся ў парозе, вінавата прамовіў:

— Я на мінуту... А Іван дома?..

— У двары,— маці адступілася бліжэй да печы, дзе поркалася, распальваючы агонь, і паказала госцю на ўслончык, што прыляпіўся ля вулічнай сцяны.— Вунака ляжыць, грэе чарэнь. А вы праходзьце, Піванавіч. Сядайце...

— Я тута! — азваўся бацька хрыпла, як праз сон, з чарэні, але не ўстаў — яго доўгія ў чорных бахілах ногі высунуліся аж на хату.

— Ездзіў жа ўчора ў Маластоўку, новае тачыла прывёз. Ета, мабыць, Гуцін памог,— дадала маці і пачала ўвішна дзьмухаць, падаўшыся з галавою ў чалеснік.— Дровы во сырыя, ніяк не хочуць гарэць...

— Дождж ліў увесь дзень без перастання,— павольна загаварыў Харытон, займаючы сваё прывычнае месца на ўслончыку, абшмараваным і пасечаным дробнымі і частымі насечкамі,— бацька любіў на ім крышыць табаку-карэнне.— Не мучайся ты, Уляна, ліні трохі карасіны... Ці,

можа, нямашака? Не здабылі? У майго вунь суседа, у Восіпкі Зайца, адразу лямпу запалілі. Як у клубе. А знаеш, чаму?..

— А хто іх ведае,— без усялякай ахвоты сказала маці і ўзялася здзіраць бяросту з бярозавага палена — на распалку.— Я не прыглядаюся, якая ў іх тамака лямпа...

— Бач ты іх,— працягваў Харытон, зябка кратаючыся на ўслончыку, той аж зарыпеў, захістаўся.— Як тады, то і на каганец не ставала газы, а цяпер, як трактар купілі, то васьмілінейку займелі. Разжыліся ўжо, праварнягі...

— А няхай іх, усё бяруць і ніяк не набяруцца,— падтрымала размову маці.— Злыдні. Ета ж даўмецца, нехта во надоечы тачыла звалок. І навошта яно яму, злосніку, тое тачыла?.. Дзе ён з ім дзенецца, каб спытаў, з тым тачылам, як дурань з дзвярыма...

— Што тваё тачыла,— Харытон пачаў ляпаць па кішэнях, канечне ж, шукаючы курыва.— Вунака, кажуць, бочку жалезную ля трактара адбілі і карасіны набралі колькі ўлезе...

— Дзіва што,— маці разагнулася — дровы разгарэліся — і пачала ставіць чыгункі і гаршкі ў печ, а вады не аказалася.

Я ўзяў вядро і шуснуў за дзверы. Калі, засопшыся, прынёс вядро з вадою, то бацька ўжо дыбаў па хаце з самакруткай у руках, і наўкол было ўсё сіняе ад махорачнага дыму.

Нешта без мяне яны гаварылі. Мабыць, штосьці такое, што мне нельга чуць. Бо, падалося, гутарка як бы нечакана абарвалася, і яны проста перамаўляліся, кожны цягнуў, абы не маўчаць. Харытон смактаў цыгарку і дударыў тое, з чым і прыйшоў:

— Дождж такі атадраў, што аж ручаі пацяклі...

— А ў нас там самая вадацеча,— патрапіла ў тон яму маці, запіхваючы пад хустку-канаплянку непаслухмяную чорную пасму.— Ты хоць бы бульбоўнік скасіў, гаспадар етакі,— кпліва зіркнула ў бок бацькі.— Зімою карове было б нешта пад ногі кінуць, а то ўсё згніе за дажджом, пабярэцца на куламесу...

— Іване, адыдзі ад акна, а то ёй там засціш,— паблажліва сказаў Харытон і пацягнуў зноў пустое, відаць, абы не маўчаць: — Абабкі пойдуць цяпер пасля дажджу па бярэзніку — не абярэшся... І казлякоў будзе многа. Нада дзевак павухрыць — няхай грыбоў назбіраюць... На жаронку хоць бы...

— Ай, насушыць можна,— падтрымала размову маці і пасунулася, аж з галавою, здаецца, у чалеснік, тады загрымела скаварадою.

Харытон пачаў жаліцца на хворасць — знібенне ў нагах і ламоту ў паясніцы.

— Ета ўцён у цябе, Харытонка, уцён. Трэба пашаптацца. На парозе тапаром уцён праганяюць...

— Слухай ты, браце, яе, бабу ету,— абарваў бацька рэзка і зацягнуўся самасадам, насупіўся.— Прастуда ў цябе. Нарві бадзягі ды натры ёю ногі, ад ламоты памагае дужа, і ўвесь боль пройдзе.

Маці, падціснуўшы губы, змаўчала. Тады, можа, каб скрасіць няёмкасць, запытала нясмела:

— Дык што, так і не рашылі, хто б мог тое тачыла ўнесці?..

— Чорт яго знае,— ужо больш мякка сказаў бацька. Ён вельмі хутка загараўся, гэтак жа нечакана астываў, лагаднеў, бы нічога з ім не было, ніякага душэўнага ўзрушэння.— Кажуць, Іллюк з Яшкам хадзілі па дварах, сям-там паглядзелі — пяма. Дзе ты яго знойдзеш. Добра, што Гуцін па старой памяці памог. А то рабі што хочаш, а без тачыла ў кузні як без рук: і тапары плотнікі вастраць, і нажы да жняярак навядзеш. Яшчэ грэчка, аўсы някошаныя...

Харытон, сплюнуўшы недакурак, сеў, тады падняўся — надумаўся быў пайсці, але нешта ўсё марудзіў — як бы яшчэ штосьці не сказана, можа, нават самае галоўнае, дзеля чаго гарадзіўся, як мне падумалася, увесь гэты агарод.

— Дак што,— парушыў маўчанне бацька і зазірнуў у ноч.— Падзелім хіба бульбу, як казаў сусед Трахімка, ды за молат, будзем пляскаць. Ты мне паможаш, Харытоне, пакуль знайду каго на месца Васіля?..

— Ды ўжо ж, памагу,— Харытон сеў на ўслончык, абвёў няўцямным позіркам хату, тады ўтаропіў свае калючыя, глыбока пасаджаныя зелянковыя вочы на мяне, сцепануў ніякавата плячамі.— Алёшка, ідзі зачыні балонку, а то вецер акно паб'ець...

Я пакасіўся на бацьку, і ён зразумеў мой позірк па-свойму, хітнуў лысаватай галавой:

— Ідзі, чаго ты бельмы свае ўставіў — аслепнеш!..

Я скочыў за дзверы і праз хвіліну вярнуўся — мяне разбірала цікаўнасць: Харытон скажа нешта такое, што не

хацелася б упусціць міма вушэй. І ён, разгарачаны, бліскаючы бялкамі вачэй, грымеў на ўсю хату:

— У век-вякоў не прашчу яму такую абіду, ета ж нада, якую нанёс мне, паганец. Навёў Іллюка з вобыскам на мяне, гад, бытта я замёт з твайго гумна расцягнуў. А сценку тую ж, відна, ён, гад печаны, і перанёс сабе. І сляды праз Лепятнёў агарод павялі да яго на двор. Зямля ж пасля дажджу мокрая...

— Ён, халера, не пасароміцца,— узгарэўся, як сухая кастрыца, бацька.— Ні з чым не размінецца... Цяпер, кажуць, узяўся вартаваць трактар уначы... Бачыш, ужо і карасіну цягнуць. Нічога сабе старажы, ліха іх матары. Ліса вартавала мужыковы тараны!..

— Ды перастань ты ўжо вярзці, што сліна к губе прынясе,— абачліва сказала маці і падхапіла чыгунок з бульбай, абгарнула ганчуркай і стала адліваць наварыстую жыжку над шайкай з мякінай.— Усяго могуць нагаварыць. Языкі ў людзей, дзякуй богу, доўгія. Не давядзі бог!..

Харытон зіркае зелянкавымі вачамі; падняўся, высокі, плячысты, вялікая галава і шырокі твар, смуглявы, у вясёлых зморшчынах, пацягнуўся, аж хруснула нешта ў лапатках:

— Ты, Улька, не бойся. Пустое я не буду казаць. Пабачыш, пабажуся, ён улезе ў пастыдку — рукі доўгія мае, а вочы дужа завідныя,— і перавёў адразу гаворку на другое: — Адчыніце акно. Ета ж у вас у хаце такая духата, што можна ўвапрэць, як у лазні...

— А праўда,— бацька парадкаваў на стале, рыхтуючыся да сняданка,— ці ета сянні субота, то ў лазні нада было б прапаліць. Даўно ўжо не мыліся.

— А ў мяне новыя венікі, навязаў надоечы.— Харытон надзеў кепку-блінок на шорсткія, з сівізною валасы, абцёр невялікія зграбныя вусы.— Пайду і я ўжо... Снедайце...

У парозе доўга кешкаўся з клямкай. Яна ў нас была вельмі капрызлівая: язычок саскокваў з прабоя і трэба было налаўчыцца, каб хутка адчыніць дзверы ў сенцы. Харытон ужо ў каторы раз паўшчуваў бацьку за нядбаласць.

— Ну й клямка, брат, у цябе... Як у спраўнага каваля...

— А я ўжо казала яму, гаспадару етаму, бесклапотніку,— узрадавалася маці, што пры чужым чалавеку баць-

ка не кінецца ў спрэчку, і выказала сваю крыўду смялей: — Атлуміла я ўжо сваю галовачку етымі гаворкамі, а ён як глухі, не чуе. Во ўжо рупата ў чалавека, апроч свае кузні, нічога знаць не знае.

Дзіўна, але бацька адмоўчваецца — старанна кроіць ладныя скібкі хлеба, потым, як між іншым, як толькі для Харытона аднаго, кажа:

— Вярхняк асеў, таму дзверы ўжо лёгка не адчыняюцца...

Ды Харытон быў ужо за парогам. У акне мільгануў, засціўшы на момант усё дваровае акно, яго вялізны цень.

Аказваецца, Харытон расказваў пра Кіпня. На нашым гародзе стаяла яшчэ напаўраскрытае і запушчанае гумно. Яно лічылася калгаснай маёмасцю, але старшыня папярэдзіў бацьку, каб ніхто не зачапіў яго, бо вясною цесляры часткова сцены разабралі на новую канюшню і цяпер суседзі спакушаліся — пад бокам былі лёгкія, сухія дровы. Бацька і заўважыў, што нехта хадзіў сюды цемначы; броўны паступова знікалі, і сцены ўсё меншалі, зеўраючы вялікімі праёмамі. Бацька заявіў Іллюку, і той сказаў: «Трэба прыпільнаваць уначы. Як каго зловім, будзе помніць да новых венікаў».

Зладзеі, вядома ж, хадзілі сярод ночы, і можна было нарвацца на сякеру ці нават на абрэз. Ужо такія выпадкі былі, і тыя, хто стаяў на варце, паплаціліся жыццём. Яшчэ жывы ў памяці нядаўні трагічны выпадак з дзедам Петраком, у якога быў багаты і ўрадлівы садок. Дзядуля не шкадаваў яблыкаў. Бывала, калі падлеткі летнім надвячоркам гамэрняй аціраюцца каля садка, выцягваючы тонкія шыі, каб зазірнуць праз агароджу на чырванабокія шафраны ці жаўтлявыя грушы-цукроўкі, дзядуля не адганяе іх, а ўсміхаецца моўчкі ў сівую бараду-лапатачку, тады пакліча каторага тоўстым парэпаным пальцам: «Ідзіце, жэўжыкі, не бойцеся»,— і праз леску ляцелі, шляпаючыся ў мурог, крамяныя яблыкі, пахучыя дулі. Аднойчы ўлетку, неўзабаве пасля спаса, калі ўжо садавіна згінала галлё да зямлі, глыбокай ноччу ў Петраковым садзе грымнуў стрэл. Дзед Пятрок, які начаваў у будане з сабачкам, схапіўся аберуч за жывот, нема крыкнуў: «Ратуйце!» У той жа дзень пад вечар дзеда Петрака не стала. Колькі ні дапытваліся ў яго, хто стрэліў, дзед адно прамовіў: «Нехта даўгі, у чорным». Прыязджала, вядома, міліцыя. Шукалі, мералі рулеткай нешта ў садзе, шукалі слядоў, а яны з першымі промнямі згубіліся ў траве, і ў

бульбоўніку толькі засталіся знакі ад вялікіх мужчынскіх чобатаў, але і тыя значыліся пядоўга, пакуль забойца выскачыў на вуліцу — тут сляды і зніклі.

Вядома, пасля гэтага здарэння ніхто не начаваў у сваіх садках, гаспадары баяліся, каб каго не напаткаў лёс дзеда Бручвянка, і гэта ў той час было на руку аматарам паласавацца чужымі яблычкамі — па садках шасталі не толькі дзеці і падлеткі, але часта дзецюкі і мужчыны.

Небяспека небяспекай, а калгаснае дабро трэба было берагчы. Начныя вартаўнікі неслі варту і каля калгаснага свірана, і на таках, і цяпер ля трактара ўначы. За вартай пільна сачылі актывісты — члены праўлення, з імі на праверку пастоў хадзілі і камсамольцы.

Неўзабаве такі пост высачыў таго, хто дапяў да бочкі з газай пры трактары,— ім аказаўся той жа Кіпень. Ён налучыў момант, калі вартаўнік Алёшка Целяпей адышоўся дамоў па чухмянёк, бо раптоўна ўліў дождж. Да Кіпня нахапілі з вобыскам. Тут знайшлі і сухія круглякі са сцяны былога нашага гумна. Склалі пратакол. Кіпню быў бы год адсідкі, але Іллюк папрасіў міліцыянера, і Кіпню адно далі штраняка — скінулі дзесяць працадзён.

6

Жнівень рахаваў дарункі лета. З палёў убралі жыта, пшаніцу, ячмень — снапамі звезлі і склалі ў гумны. З першага абмалоту здалі дзяржаве збожжа. Па трыццаць і больш фурманак з адборным, першага гатунку, зернем адвозілі бацькавіцкія жыхары на станцыю Камунары. Выпраўляўся абоз у дарогу на світанні, да сонца, а вяртаўся пад вечар наступнага дня — паражняком. Іншы раз на падводзе сядзеў шыкоўна апрануты мужчына, звесіўшы з драбін ногі ў чаравіках, ды яшчэ і паверх — блішчастыя, хоць глядзіся, як у люстра,— галёшы. Зразумела, прыбыў нехта з шахцёраў — іх з Бацькавіч хапала ў Данбасе і ў Крывым Розе, куды ў асноўным і адпраўляліся па белы хлеб і шчодры рубель нашы жыхары здаўна. Цяпер, па чутках, там пачалося нейкае бязладдзе, ледзь не галадоўка, і землякі, пачуўшы няладнае, ехалі дадому, у родныя гняздоўі, куды, магчыма, і не думалі вяртацца ніколі. Бацькавічы прымалі іх без крыўды, хоць і не дужа ласкава, са спачуваннем: «Што ж, жыў-жыў чалавек на чужыне, ды, відаць, на бацькаўшчыну захацелася, дома, пэўна, лепей...»

Ледзь не кожным разам абознікі прывозілі дадому аднаго-двух гэткіх гасцей. Такога раней не было. Звычайна ўвосень, калі з летнімі работамі падупыняліся, з вёскі касяком тарабанілі адыходнікі, а цяпер усё перайначылася. Шахцёры вярталіся пад родныя стрэхі. Вядома, добра пагуляўшы, пахадзіўшы па радні, шахцёры памалу ўцягваліся ў вясковае жыццё, уносілі нешта сваё ў вясковы побыт, пэўным чынам уплывалі на адносіны між сялянамі.

На полі яшчэ стаялі збялелыя бабкі аўса, у пракосах чаўрэла насенная канюшына, у кучках і валках дасыхала грэчка, яшчэ не касілі бульбоўнік, а ў хатах ці то ў будзённы дзень, ці ў свята зранку мацнела гамана, а то і ўсчыналіся песні; сям-там па прызбе можна ўбачыць чубатага ў сацінетавай касаваротцы хлопца з гармонікам, які чорнымі ад вугалю пальцамі перабіраў басы, і вакол яго нясмела кучыліся дзяўчаты. Без пары, далёка да пакроваў, усчаліся вечарынкі-ігрышчы і проста гульбішчы з танцамі, з пачастункамі і выпіўкамі.

Нешта на Іллю пасля абложнага дажджу-грыбасею на Целяпеевай падводзе заявіўся, як ён сам казаў, часова, на пабыўку з шахтаў Максім Ляўша. Белабрысы маўчун Алёха Целяпей на парцы гнядых падкаціў Максіма проста да старога Півана, да двара, увішна і з яўнай угодлівасцю адчыніў вароты і пусціў здарожаных коней на падворак, закруціў лейцы за драбінку і ўзяўся быў аберуч за Максімаў чамадан, угодліва і лісліва паглядзеў тэму ў вочы.

— Я ж сам не ўломак,— Максім, скочыўшы з фурманкі, памкнуўся перахапіць чамадан у яго з рук, але перадумаў, падмыргнуў гарэзлівым вокам: — Зайдзі ў хату!..

І сам першы ступіў на парог, узрушаны.

Пацалаваўшыся з падслепаватым старым Піванам, які ад збянтэжанасці застаўся на месцы як аслупянелы, пашарыў зладзеяватымі вачамі навокал: «А дзе ж маці?» (яна памерла ў вялікі пост, маразамі) — і глыбока, бы кавальскі мех, уздыхнуў. Пастаяў крыху сярод хаты, тады скінуў цяжкую скураную тужурку, тая, як бляшаная, загрымела, і ў хаце востра запахла вугалем, загрымеў чамаданам.

Неўзабаве на стале, на зашморганым настольніку, разлёгся вялікі, з пахучай паджарыстай скарынкай бохан — макееўская паляніца. Пакапаўшыся ў тым жа чамадане, Максім выцяг і ўрачыста ўладкаваў пасярод стала бутэль-

ку. Каўтануўшы сліну, Целяпей з услона ля печы нахабна ўтаропіўся вачамі ў наклейку, натужваючыся прачытаць надпіс. Целяпей мо хадзіў у школу адну зіму, і для яго было не проста прачытаць тыя два словы, і ён аж спацеў, моршчыў лоб, нарэшце неяк адолеў напісанае: «П-ш-е-ни-ч-на-я в-о-д-к-а...»

— Сядай і ты, Лёха, з намі, бо, бачу, саскучыўся ўжо.— Максім перахапіў у бацькі міску з гуркамі, якую нёс з пагрэбка стары Піван. Ён усё няўцямна і ўтрапёна пазіраў на сына, згадваючы, колькі ж гэта гадоў нічога ад яго не было чутно. У той год, яшчэ да калгаса ў Бацькавічах, сыны Півана падзяліліся, і пры дзяліцьбе Максіму дасталася бацькава хата, а зямлі — не выстарчыла. Як жыць? На чарэні ж ляда не расцярэбіш, і Максім — хлапец па мянушцы Ляўша — кінуўся ў белы свет як у капейку. Вядома, куды ён мог падацца, як не туды ж, у Горлаўку ці Макееўку, дзе ўжо асталяваліся і жылі многія землякі. Яны і прытулілі Ляўшу, далі начлег і кармёжку на першым часе і, парахаваўшыся, узялі з сабою ў падзямелле, канагонам. Максім ад прыроды, як і ўсе Півоні, мог пахваліцца і здароўем, і сілай, а ў Бацькавічах кажуць: «Дзе стан, там і сіла», быў хоць і не гонкі ростам, не тое што ўсе ягоныя браты, затое скроены моцна, плечы шырокія і рукі мускулістыя, кулачышчы, як гіры, шыя кароткая і тоўстая, такая, пра якую кажуць — шыя, хоць вобад гні. Кароткія, мядзведзеватыя ногі ступалі роўна і цвёрда, лёгка насілі, можа, пяціпудовае Максімава цела. Ступакі ў Максіма трохі пляскатыя і наскамі ўнутр — выдавала, што Максім трошкі касалапіў, але лёгкасцю і скорасцю хады гэтая загана як бы скрадвалася. Калі Максім ідзе — хораша глядзець. Максім быў і на язык шусцёр. Іншыя яго браты, каго ні вазьмі, таксама за словам у кішэню не лезлі, але з Максімам у сэнсе вастрыні слова і знаходлівасці ў гаворцы не зраўняюцца. І ў кампаніі, ці між сваіх, ці сярод людзей незнаёмых, чужых, Максім не губляўся, больш таго, адразу ён станавіўся ў ролі чалавека, якога з цікавасцю слухаюць і паважліва ставяцца да таго, што ён гаворыць і як паводзіць сябе. Адным словам, Максім, маладзейшы з Піванавых сыноў, якога некалі жартам Піван называў «хлебнікам», гэта азначала — карміцель, бацькоўская ўцеха, быў хлопец хоць куды, і, натуральна, гэта радавала ўсіх, асабліва старога Півана. Тое забылася, што ў свой час Піван быў, можа, нават рады, што Максім з'ехаў з дому.

Вестка аб прыездзе Максіма разнеслася хутка па вёсцы і па радні. Балазе блізка, амаль па суседству жылі Максімавы браты — Ахрэм і Харытон, дзядзькі Карп і Дзямід, ужо аддзеленыя, у сваіх хатах. На хутары цяпер жыў толькі Лазар, але і ён невядома як даведаўся і прыйшоў таксама. Праведаць прыезджага госця завіталі і суседзі.

Харытон, які цяпер у кузні стаяў пры горне за малатабойца, сказаў, каб і мой бацька заглянуў да Піваняў на адведкі.

Калі бацька зайшоў у хату і, ніякавата пацепваючыся, павітаўся, застолле ўжо шумела. На покуце, пад багаўнёю, сядзеў расчырванелы Максім з братамі і расказваў нешта, мусіць, важнае, бо, нягледзячы на тое што госці паспелі ўжо ўзяць па чарцы, усе слухалі сур'ёзна, нават заклапочана, забыўшыся на закусь. Падалося, яны ўсе ламалі галаву над вельмі цяжкай задачкай.

Ля стала ўходжваў сам стары Піван: ён цяпер жыў у хаце як не бабылём, бо два гады застаўся без жонкі. Сяды-тады прыходзіла ў хату старэйшая нявестка Дуня, бо якраз яна з Харытонам атабарылася праз адну хату ад свёкра і слыла спагадлівай, але ж і ў яе свая сям'я — дзеці малыя, гаспадарка і ў калгас трэба ісці ў рад з усімі, так што Піван сам прывык ужо быць і за гаспадыню. Цяпер, калі нечакана з'явіўся яго, можна сказаць, прапашчы сынок, Піван шчыра ўзрадаваўся, адразу ў яго старэчай, але яшчэ кемнай галаве заварушылася думка: «Во, можа, Максімка жэніцца, то і я пры іх дажыву як-небудзь астаткі веку. Колькі мне тут ужо засталося. Каб добрую дзеўчыну налучыў якую...»

Стары тупаў, узбуджаны і трошкі пад хмяльком ад прыгубленай чаркі, сноўдаўся па хаце, не ведаючы, за што зачапіць рукі, бо сыны, занятыя з госцем, не звярталі на яго ўвагі, і яму, некалі паўнаўладнаму гаспадару ў хаце і паважанаму хлебасею ў «вобчастве», крыўдна, што ўлада і колішняя слава яго амаль што згаслі. Адчуваў ён, знікла назаўсёды, застаецца толькі адно — успаміны ды сыны, яго ўцеха і суцяшэнне на старасці.

Пакрэктваючы і пагладжваючы яшчэ густаватую, але амаль усю белую, касмылістую бараду, Піван падыходзіў да стала і намагаўся нешта сказаць, але яго не слухалі, ад яго адмахваліся, як ад назойлівай мухі, і гэта яшчэ большай крыўдай адкладвалася на душы. Стары моўчкі

цяжка соўгаўся па хаце, няўцямна пазіраючы на застолле, і не мог ніяк супакоіцца ад думкі, што жыццё яго мінула, што былое не вернеш, як не вернеш пражытых дзён, былой радасці, былой блакітнай сваёй мары, якую насіў і пранёс праз усе нягоды і парогі, што ўгатаваныя былі яму на звілістай дарозе жыцця. А мара была і жыла з ім, з ёю не расставаўся ён ні на адзін дзень, ні на адну гадзіну. Чатыры сыны — Лазар, Харытон, Ахрэм і Максім, і чатыры надзелы — кожнаму пай, свая палоса, свой кут... Ды жыццё распарадзілася па-свойму, як бы само разгадала яго, Піванаву, загадку: Лазар першы аддзяліўся, пайшоў на хутар, і старому як бы адлегла ад сэрца. Паміж трыма сынамі лягчэй можна падзяліць зямлю, якую з такой прагавітасцю і неўтаймаванасцю збіраў і ўходжваў ён, не спыняючыся ні перад чым. За які кавалак, за мяжу ён гатоў быў біцца да крыві з кожным, нават з родным татам. Толькі быў стары Піван падзяліў сваю зямельку між сынамі, як пачалася гэтая, як ён казаў, катавасія з калгасамі, і лопнула, парвалася, развеялася пылам ягоная, Піванава, блакітная мара, бы мыльны пухір. Сыны — нядаўнія шахцёры, і Харытон, і Ахрэм,— у першую зіму ўступілі ў калгас. Лазар, старэйшы з братоў, атабарыўся на хутары і яшчэ ўсё жыў аднаасобна, але ўбачыў, што застаецца амаль што адзін — папрасіўся да гурту і нават пачаў актыўнічаць: ён меў залатыя рукі цеслі і, трэба сказаць, праявіў сябе як найлепшы будаўнік. Яго амаль кожны раз можна было бачыць з сякерай пад пахай на сяле, і часцей ён бавіўся ў нашай хаце. Заглядваў ён і да свайго бацькі, але, ваўкаваты і падхоплівы, Лазар усё пешта насіў тайную, даўно забытую ўсімі, але толькі, відаць, не ім самім, крыўду і на свайго бацьку, і на ўсіх сваіх братоў.

За сталом Лазар першы як бы ачнуўся ад той задуменнасці ці таго здранцвення, якое, мабыць, узрушыла ўсіх, а найбольш самога яго, зламыснага і гарачлівага, тое напаўзабытае, якое цяпер усплыло — яго прывёз з сабою з Данбаса Максім, басалыга, якога ўсе ўжо лічылі даўно страчаным для вёскі назаўсёды. Можа, усе і забылі, што Максім з'ехаў, пакрыўджаны бацькам, які не мог змірыцца з тым, што трэба ахвяраваць для сына апошнім надзелам, апошняй сваёй радасцю-марай.

Лазар першы заўважыў на парозе майго бацьку, заўсміхаўся, паказваючы рэдкаватыя, з'едзеныя зубы, громка паклікаў да стала:

— Праходзь, Панасавіч. Садзіся во... Бачыш, прыехаў наш блудны... Максім наш аб'явіўся!..

— Сядай, Іванька, во тут, на ўслоне,— замітусіўся стары Піван, шлэпаючы ў новых бліскучых галёшах, і, канечне, адразу ж пахваліўся сынавым падарункам.

Радасцю незвычайнай свяціліся яго вочы.

— Не беспакойцеся, суседзі, ета я так, на хвілінку, пабачыцца,— бацька скінуў пашчыканую іскрамі-вуголлем шапку, прыгладзіў дачасна палыселую галаву і прыляпіўся на ўслончыку з краю, пашукаў вачамі госця: — Ну, Максімка, дай паглядзець на цябе, які ты там, на шахцёрскім баршчы, адгадаваўся. Як там наша Хрысаніха, яшчэ жывая-здаровая?..

Максім як прасвятлеў пры ўспаміне пра Хрысаніху — яе добра ведаюць усе бацькавіцкія шахцёры, бо амаль усе прайшлі праз яе светлую хату-мазанку блізка ля прахаднoй у шахту, куды адзін за другім з'язджаліся яны на заробкі і спыняліся найперш у земляка Кузьмы, нашага сваяка, які на шахце меў пасаду ці то інжынера, ці то тэхніка, а яго жонка кожнага нашага чалавека прымала як мае быць, па ўсёй украінскай шчодрасці.

— Та жыва, дзякуй богу, і здаровая.— Максім пацягнуўся да бутэлькі, каб наліць, але ў яго бутэльку перахапіў Лазар, ухмыляючыся, затараторыў, не даўшы нікому ўткнуцца хоць бы з адным словам:

— Вып'ем, Іванька... Каб не прыйшлося нам сварыцца... Каб жылі мы дружна, як належыць, па-суседску...

— Кінь ты балабоніць, балабон пусты,— рэзка абарваў брата Харытон, старэйшы пасля Лазара з сыноў Півана.— Памаўчаў бы ўжо. Во няхай Максім гавора, яму ёсць што сказаць, а ты адразу лезеш — на і мае штаны ў жлукта. Не даеш слова сказаць. Няхай сусед паслухае! Яму ж цікава, ён сам жа шахцёрам быў. Можа, яшчэ не адмыўся як належыць вугальны пыл той, што мы разам глыталі і наглыталіся яго ўволю, як той казаў, па самае нельга... Выпівай, Панасавіч. На здароўе!..

— За здароўе ваша, а ў горла наша,— падхапіў, збянтэжана ўсміхаючыся, Лазар і першы кульнуў чарку, скрывіўшыся, выцер скуласты, у шчацінні твар шурпатай, у чорных ад смалы плямах і драпінах далоняй і зноў, як і дагэтуль, захапіў нітку гаворкі:

— Мы во слухалі тут, што нам прывёз Максім данбаскія навіны, і аж жахнуліся. Гамон! Няма тых зароб-

каў, Папасавіч, якія былі на Кольберы, на тым рудніку... Дзе яно ўсё тое, брат, падзявалася...

Лазар зладзеявата і асалавела азірнуўся па баках, нібы правяраючы, мацаючы шэрымі сухімі вачамі, ці няма каго старонняга, тады набраў поўныя грудзі паветра і як абвяў, відаць, збаяўся Харытона, яго суровага, строгага позірку. І сапраўды, Харытон не даў брату разгарнуцца.

— Вось балабон дык балабон! — Харытон з'едліва заўсміхаўся: — Плявузгае абы-што. Яму абы часаць язык, балазе ён у яго доўгі, як памяло, матляецца...

— Ну, ты кінь ета! — бялкі налітых злосцю вачэй у Лазара бліснулі пагрозліва, пашчэнкі захадзілі, шыя налілася чырванню.— Ты заўжды такі быў, разумнік, не дасі слова сказаць, рот заўсягды затыкаеш. А сам ты хто, брахун, без нажа можаш зарэзаць!..

— Хопіць вам, мужчыны,— абазваўся Карп Кузьміч, які моўчкі як бы драмаў над сталом, падпёршы рукою акуратную з лёгкай сівізною цёмную бародку; ён быў цвярозы, незахмялелы — Кузьміч нідзе, ні на якой бяседзе, ні на якім гульбішчы ці частаванні больш аднае чаркі не браў, спасылаючыся на сэрца, а сэрца ў яго было — дай божа. З Кузьмічом ніхто не справіцца ні з касой, ні за плугам.— Харытоне, Лазарка, ачомайцеся, абодва ж вы дзеці аднае маткі, за што вам сварыцца, за што лаяцца, за чубы хапацца? Зямлю ж во, дзякуй богу, падзялілі, усім хапіла... Цьфу, чэрці, аж гідка глядзець, як вы пачынаеце сварыцца. А за што? Ні за чорта лысага...

— Карп Кузьміч,— бацька крануў за плячо суседа,— на што намякаеш? Можа, на мяне, дык я ж тут ні пры чым. Вы — радня, вам і лепш разбірацца, хто каму вінен. А мы, напэўна, тут між вас лішнія, то, можа, будзе і пайсці... Тым больш, Харытоне, у нас работа ёсць у кузні...

Як нешта згадаўшы, Харытон раптоўна кінуў у застолле, слізгануў па твары Кузьміча:

— А тачыла тое наша дзе? Знікла, як у ваду апусцілася. Скажыце во, людзі... Некаму ж яно спатрэбілася. Што ён з ім, з тым тачылам, будзе рабіць, гад печаны!..

У голасе Харытона шчырасць і злосць.

— Мяркуе, што калгас разваліцца, тады, глядзі, і сваё тачыла будзе! — весела і задзірыста засмяяўся Максім.

У застоллі прамаўчалі. Але ягоныя гэтыя словы зразумелі правільна — дарэмныя патугі людзей, якія так упарта чапляюцца за старое.

— Назад ракі не поўзаюць,— сказаў Максім і прапа-

наваў наліць, і калі ўсе намерыліся ўзяцца за чаркі, ён адкашляўся і загаварыў далей: — Браты, не думайце, што я прыехаў удвору таму, што на шахтах сталі дрэнныя заробкі. Зусім не з-за таго, што, як Лазар кажа, там цяперака труднае ўрэмя. Папраўдзе, былі вялікія цяжкасці, але мы, шахцёры, хлеб елі. І цяпер ядзім. Для шахцёраў у першую чаргу дзяржава нічога не пашкадуе. Вугаль — той жа хлеб...

— А ты хіба зноў туды вострыш лыжы? — Лазар коршакам скочыў да свайго старога, пачаў тармасіць за плечы, пырскаючы слінаю: — Тата, чуеш, ён, басалыга, аказваецца, не наездзіўся... Бацька, чуеш, ён зноў цябе пакіне!..

— Ат, Лазар, не дуры галавы! — праз кашаль як не прастагнаў Піван.— Не плявузгай, сынок, абы-што... І Максімава тутака зямля, ягоную долю я здаў калгасу...

Сапраўды, вырас, акрэп Максім — волат, прыехаў у скуранцы, новая кепка, гарнітур, бардовая з вельвету рубашка-таўстоўка пад рыпучай каўказскай з маністамі напружкай, чаравікі з галёшамі. І старому ў падарунак — новыя бліскучыя галёшы, якія тут жа, у тую хвіліну, як Максім распакаваў чамадан, стары ўздзяўбурыў на свае брудныя, у цыпках ступакі — няхай усе ведаюць, што яго сын не жмінда: сыскаўся дадому не з пустымі рукамі і не памятае той балючай бацькавай крыўды.

— Пайду я ўжо,— бацька дзякуе суседзям за пачастунак, устае з-за стала.— Пагаворым іншым разам...

Ды не так жа проста было разысціся, калі на стале з'явілася яшчэ адна бутэлька і Максім, захмялелы, разгаварыўся. Развязаліся языкі і ў мужчын, ім, папраўдзе, было пра што пагаварыць, але абставіны былі не зусім спрыяльныя, застолле сабралася такое, што не кожны рашаўся, як кажуць, зліць адзін перад другім душу, бо на душы ў кожнага — сваё. І гэта, можа, лепш за іншых, адчуваў Максім, свежы чалавек, які з'ехаў у свет яшчэ да калгаса і сам прайшоў не малую школу, працуючы канагонам, а затым забойшчыкам і крапельшчыкам. Шахта зрабіла яго інакшым чалавекам, хаця, як вядома, тая закваска, на якой ён замешаны зроду, не скідваецца з рахунку, і яе, як тыя крапінкі з цела, адразу не адмыеш. Для пераробкі псіхікі чалавечай патрэбен не толькі час, але і вялікая, нават пераломная ўстрэска, каб чалавек перайначыўся, перасіліў сябе самога.

Выпілі па чарцы. Максім распытваў пра жыццё-быц-

цё, пра навіны ў калгасе, хто кіруе, дзе цяпер той-сёй з яго былой хлапечай хеўры... Што можна было яму расказаць? Вядома, першы хацеў выказацца той жа Лазар, але яго стрымлівала прысутнасць Баянка, майго бацькі. Не можа ж Лазар расказаць пры староннім чалавеку пра тое, што ён толькі абзавёўся зямлёю, абжыўся на хутары, а цяпер яго пасадзілі на калектыўны хлеб. Лазар, як і іншыя, такія, як ён, мусіў прыхаваць сваю крыўду. Ды яна часта і прарывалася — Лазар быў па натуры чалавек гарачы і вялікі зайздроснік на чужое.

— Жывём — хлеб жуём,— Лазар усёю пяцярнёю браў з місы яшчэ добра не прасолены ружаваты агурок, пажаваў, хрумстаючы, і балабоніў: — Ведаеш, у калгасе, як на тым хітрым рынку. Хто ўхапіў, той і з хлебам. А хто спадзяецца толькі на трудак, то перабіваецца з кваса на праснак...

— А што, браце, табе такое не даспадобы? — ускіпеў бацька і адставіў недапітую чарку. Іх позіркі стрэліся.— Знаю, табе хочацца ўсё цягнуць убок, на ўзбочыну. Канечне ж, не падабаецца табе, што і на полі і ў гумне няма табе раскашавання. Не даюць хлопцы табе разгарнуцца, і Дзяніс, і Косцік, не спяць у шапку. Але, думаю, ты ўварвеш, з хлебам будзеш. Балазе сёлета, дай бог кожны год з такім умалотам... Праўду ці не я кажу?..

— Знаю цябе, Баянок, жалезная душа,— засіпеў і пырскаў пенай, як зацугляны конь, Лазар, але неяк стрымліваў сябе, не даў волю свайму буянству.— Ты жывеш па прынцыпу, як набяжыць, бо гультай, прывалень. Цябе куды праставяць — там твая і ўся жызня цячэ... Вось што я табе скажу не баючыся, у вочы!..

Мабыць, каб не нагаварыць чаго больш крыўднага і абразлівага, Лазар кумельгам кінуўся да пяколачка, дзе яшчэ цяпліўся гарачы попел-прысак, пачаў дрыготкімі пальцамі круціць самакрутку.

Піван — адчуў нядобрае, пачаў дыпламатычна мірыць іх, але так, каб не пакрыўдзіць і сына, і суседа, якога ведаў як чалавека прынцыповага і які не цярпеў абразы, тым больш ад заможнікаў, якія лічылі сябе гаспадарамі і нікому не давалі патачкі.

— Хлопчыкі, гаварыце ціха, а то хто-небудзь пачуе!..— Стараўся супакоіць мужчын Піван.

Лазар аж хрыпеў, нешта бубніў сабе, скрывіўшыся і пацепваючыся,— ён ніяк не мог супакоіцца, бо і ўнутры варушылася злосць і ёй не знаходзілася ніякага выйсця.

Ён касавурыўся на Харытона, які моўчкі апетытна ўплётваў сала — скварку за скваркай: дзеля прыезду сына стары Піван абнашчыўся — наклаў на стол, побач з місаю гуркоў, ладны брус аблетаванага сала.

Максім, добра здарожыўшыся, захмялеў і, паклаўшы галаву на рукі, драмаў, але яго неўзабаве раскатурхалі мужчыны, прасілі расказваць пра знаёмых на шахтах, і наогул, як і што дзеецца на свеце. Максім жа ўзахлёб пазяхнуў, асалавела абвёў вачыма застолле, нібы ўсіх, хто быў тут, бачыў упершыню:

— Цяжкавата стала на шахце. Нашы беларусы паперлі дамоў. Кажуць, дома і кажух, і світа, і душа сыта,— і, як зусім працверазіўшыся, дадаў даверліва: — А што, калі б мне ў кузню, дзядзька Іван, у памочнікі?..

— А што, давай, брат, давай,— як абрадаваўся бацька і да Харытона: — Чуеш, кум! Максім хоча ў кузню?..

— Бяры, бяры! — загаманілі ўсе.

Карп Кузьміч, расчулены і супакоіўшыся трохі ад таго, што ўспамянулі пра тое тачыла, але ў тлуме і забылі, дрыготка пагладжваў сваю добра падстрыжаную, сівавату спадыспаду бародку і падтакваў:

— Нашага заводу чалавек, што ні возьме зрабіць...

Лазар, які задрамаў ужо на палку, ля пяколачка, з патухшай самакруткай у засмяглых губах, раптам ачнуўся і ўскочыў як бы ад нейкага ўнутранага штуршка і хрыпла загаварыў, атарапела пазіраючы наўкола:

— Дзядзька Карп... Кузьміч, дос табе выпінацца... Не бяры так усё на сябе, на сваю сілу — надарвешся... Ведай, Кузьміч, нічога з твайго етага выпінання не выйдзе...

Кузьміча як агрэлі чым знянацку, ён падкаціў масляныя хітрыя вочкі, па звычцы склаў рукі на грудзях, упіўся позіркам у пляменніка — відаць, ён не чакаў такога непрадбачнага і абразліва-крыўднага выбрыку, яго ўсяго як перакалаціла, але не такі Кузьміч, каб вопрамеццю кінуцца на крыўдзіцеля, тым болей на радню, ды яшчэ ў такі ўхабісты для жыцця Піваняў час. Была калатнеча, рабінавая ноч для ўсіх Піваняў, але ўсё, дзякуй богу, мінулася. Хмары навальнічныя сплылі, намецілася прасвятленне, хаця сонца яшчэ і не свеціць ярка, як у летні дзень, ды радавацца рана — Гопкі, таго дваццаціпяцітысячніка, няма, яго месца заняў еты, чырвоны камандзір, шалахвост Іллюк, шыбенік, можна сказаць, заўзяты, з ім піва не зварыш.

Усё, што было за гэтыя грымлівыя, трывожныя гады, што вісела над галавой Кузьміча, імгненна праплыло ў яго цвярозай галаве, і раптоўна губы, пасінелыя і засмяглыя ад узрушэння, ад унутранага гневу, які аж смылеў у глыбіні душы, асвяціліся ласкавай усмешкай:

— Ну, пляменнічак, дзякуй табе, уважыў... Я цябе, Лазарка, змалку ўважаю. Сваім хлопцам, бывала, наказваў, маўляў, вучыцеся ў Лазаркі, бярыце яго панароўку, як трэба жыць, пастаяць за сябе, а ты мне такую абіду нанёс... Нізавошта, ні за панюшку табакі, як тэй казаў. Ачарніў, Лазарка, ты мяне, абпэцкаў, як тую трапку-ганчурку... Абіда вялікая... Але што ты зробіш, Ісай-прарок цярпеў і нам, грэшным, наказаў...

І, як заўсёды, скрыжаваў на грудзях сухія, жылістыя рукі, глядзеў на пляменніка пакутліва і жаласна, толькі ў прыжмураных, насцярожаных вочках зіркаў злосны агеньчык.

А Лазара аж распірала злосць — ён увесь бы кіпеў ад гневу, але нешта ж стрымлівала яго — ён адно сіпеў і раздзімаў ноздры куртатага, храшчавітага носа, аж хрыпеў, трушчыў у вузлаватых кароткіх пальцах на муку самакрутку. Губы яго дрыжалі і шавяліліся. Па іх можна было здагадацца — у яго жавецца, плешчыцца адно толькі слова: «юда-хрыстапрадавец». Але, барані божа, гэтае слова не будзе сказана ў вочы, хоць бы Лазар выпіў яшчэ столькі ж гарэлкі, колькі ўжо ўзяў за сталом. У яго галаве засела цвёрда: «Півоні б'юцца — ніхто не ўмешвайся».

Браты вылезлі з-за стала, крэкчучы і горбячыся, як бы нехаця. Паміж Лазарам і Карпам Кузьмічом стаў сярэдні — чарнабровы Ахрэм, самы рослы і ўраўнаважаны, спакайняка і маўчун. За ўвесь час застолля ён амаль не абраніў ні слова, можа, з-за сваёй прыроджанай ціхманасці, а больш ад таго, што не ўсё, што тут гаварылася між братамі і дзядзькам, ён прымаў, бо ён быў маладзейшы, прайшоў сякую-такую школу на шахтах, і яму было не па душы тое захрыбетніцтва, тая сквапнасць, якія ў сваіх дзецях заахвочваў стары Піван, увабраўшы ў сябе ўсё, што ішло з глыбінь сялянскай уласніцкай хцівасці. За ім, як і амаль за ўсёй раднёю, замацавалася ўстойлівае: «Півоні? А, людзі працавітыя, але захрыбетнікі. Дужа жадныя. Усё забралі б, і таго мала. Такія скнары, што хлеба жабраку пашкадуюць...»

Ахрэм, сціснуўшы пашчэнкі, патрос кулакамі перад самым носам Лазара:

— Ну й дакорнік жа ты, браціш, яй жа богу! Сыдзі з вачэй, пакуль я добры, не ўзлаваўся папраўдзе...

Скрыгочучы зубамі і напінаючы жаўлакі, Лазар зіркаў шэра-сталёвымі вачамі, засунуўшы рукі ў штаны-суконнікі, аж хрыпеў ад гневу:

— Адыдзі сам, гад! Гэндра! Бо як пякну ў грызла, дык і перакацішся, і мэтлухі не збярэш... Адыдзі, зануда!..

Ускочыў і Харытон; набычыўся Максім, разгублены, і згорбіўся, нібы ад удару. Усчалася валтузня. Падскочыў стары Піван, як певень, ускудлачаны, бяззубым ротам хапаў паветра, душачыся махорачным дымам, што воблакам вісеў пад столлю. З усяе сілы нема закрычаў, як на пажары:

— Шыбенікі! Задзіры! Вон з мае хаты! Вон, каб вас, анціхрысты, не бачылі мае вочы!..

Мужчыны аціхлі, сумеліся. Аддыхаўшыся, не глядзелі адзін аднаму ў вочы — злосць, успыхнуўшая раптоўна, пачала паціху астываць, адыходзіць, і паступова ўлеглася тое няёмкае адчуванне, якое сапсавала было ўвесь настрой, угатаваны ўрачыстасцю сустрэчы.

— Яно, суседзі, пара і ўдвору. Засядзеліся ўжо мы,— ацверазіўся раптам бацька і, насоўваючы шапку, зацягнуў сваю любімую, яшчэ з пары шахцёрскага жыцця, песню: «Ой, арол мой шызакрылы...»

Яму няўцям і бязладна, але старатліва і шчыра басіў добра ахмялелы Харытон:

— «Раскажы, аролік, дзе мой мілы...»

Пад спеў сумнай песні радня разыходзілася па хатах, несучы ў сэрцах агоркласць, якая ляжала, не вярэдзячыся, на самым сподзе душы, а цяпер, падварушаная сустрэчай, выплеснулася цераз край. Праявілася тое, што глыбока, моцнымі каранямі ўвайшло ў зямлю, напоеную сокамі продкаў.

7

Уранні, яшчэ пастух не збіраў статак на ўдзёнкі, з рашатнёўскага канца завітала ў хату Вулька, замужняя дачка Рамана Говара-Гамарніка. Пакуль бацька снедаў, спяшаючыся ў кузню, Вулька расказала сваю «безатлагацельную» просьбу.

— Дзядзечка, скуйце мне такую завалу,— усхліпваючы, гаварыла Вулька,— во я і шыну ад кола прынесла, каб на гэтую завалу можна было зачыніць свякруху. Яй-бо-

жачка, старая качарга, етая гаргара, жыцця ад яе мне нямаш. Дай жа божачка, яна мне ўжо ўсе вантробы, усе лантухі пераела... Так дапякае, што я надумала зачыніць яе ў пярэдняй хаце — вазьму на завалу, і духі з яе вон!..

Сапраўды, дзіўна: што гэта — жарт ці сур'ёзна. Бацька ледзь стрымаўся, каб не зарагатаць, але ўбачыў, што Вулька вельмі ўзрушаная, зрабіў выгляд, што сур'ёзна ставіцца да яе гэтай просьбы, хоць ведаў, што гэта была ўспышка гневу пасля звычайнай сваркі.

— Дык як жа старая тады з хаты выйдзе? — стрымліваючы сябе, каб не рассмяяцца, пытаў у Вулькі.— Завала ж жалезная, і старой там будзе гамон?..

— А няхай як хоча, так і ходзіць,— не прыняла жарту Вулька і нервова выціралa ражком хусткі заружавелы твар, на якім цяпер выразна свяціліся дробныя, бы канапляныя зярняткі, вяснушкі.

Маці запрасіла Вульку да стала, хаваючы ўсмешку, сказала:

— Хіба праз акно давядзецца сягаць старой?

— А мне што? Няхай хоць і праз акно! — не адыходзіла Вулька.

Маці пачала распытваць яе пра дзяцей. Пасля загаварыла пра тое, што і бацька яе Раман, і маці Наталка — кволяцца, няхай бы Андрэй, старэйшы сын, жаніўся, усё старым было б лягчэй, а ён не захацеў пры бацьках, з'ехаў у горад, а гэтыя яшчэ падлеткі, Сцяпан ужо трохі выцягнуўся, а Маша — дзіця. Во ўчора Раман прыскочыў, увесь перапалоханы, разгублены, казаў: «Ці няма ў цябе, суседка, настойкі якой? Наталцы маёй зусім дрэнна...»

Вулька трохі сумелася, пачала спаквaля адпускацца — відаць, патроху знявервалася ў сваёй крыўдзе. Яна прызналася, што доўга не была ў сваіх бацькоў, а яе старэнькая маці даўно ўжо кволіцца і во цяпер занядужала зусім.

— Дык я пайду ўжо, цётачка,— заспяшалася раптам Вулька, як забыўшыся на сваю крыўду, якой была перапоўнена ўся толькі што.— Праведаю сваіх, бо я зусім выраклася, бачу іх гады ў рады. Атлуміла яна, гаргара, усю маю галовачку. Што я ўжо цярплю, гаркотніца, ад яе, што цярплю, дык і людзям сорамна сказаць...

— Такая наша доля, Вулечка,— уздыхнула ў тон ёй маці.— Нявесткіна, як кажуць, усё не ў чэсць, не ў ласку. У каго самая грубая дзяруга? У нявесткі. Хто хлеб спячэ — закалец на палец? Нявестка...

— Праўда ваша, цётачка,— усё ж трохі супакоеная і,

відаць, астуджаная ад злосці на сваю свякруху, казала Вулька. А калі папраўдзе, дык тая і ў хаце яшчэ ўпраўная, і Вульчыных дзяцей даглядае, а што крыклівая ды не ўступчывая, дык і Вулька — сама не саступіць надта з дарогі.

Вулька ўздыхнула, узялася за клямку:

— Пайду, бо я ж яшчэ ў печы не паліла...

— Ды ўжо ж глядзі, галубка. Праведай матку, бо яна ж, далібог, дужа слабая...

— То як жа з завалай? — нагадаў, збіраючыся да кузні, бацька.

— А ліха з ёй, з завалай,— махнула рукою Вулька.— Другім разам...

Здаецца, што тут такое дзіўнае — пасварыліся нявестка са свякрухай. Як быццам дробязь. А з такіх дробязей тчэцца найтанчэйшая тканіна — жыццё.

«Добра жывецца таму,— разважаў бацька па дарозе ў кузню пра ранні візіт колішняй суседкі,— хто ўмее ткаць свой уток. А калі скручваюцца, а часам і рвуцца яго ніці, як у бедалагі Вулькі?..»

...Вось і кузня, дзе бацька ўвіхаецца дзень пры дні, тыя ж ніці, тчэцца тая ж тканіна, яе ткуць тыя ж ткачы-людзі. Іх сёння сабралася, не раўнуючы, як на кірмашы. Адным рупіць вілы падправіць, серп назубіць, хоць жніво ўжо і канчалася, скабу якую зрабіць для хатніх патрэб; у баранавальшчыкаў — бароны, кляцы справіць, гайкі падцягнуць; у аратых — лемяхі наварыць, адвалы палапіць... Здаецца, дробныя клопаты, а гэта — жыццё.

Ля тачыльнага круга стоўпіліся цесляры, амаль уся брыгада, мужчыны з нашага канца — Якаў з Раманам, Карп Кузьміч з Аўхімам. Тут Антон Кіпень падахвоціўся сам да будаўнікоў, бо яму работы з коньмі пакуль не было, на зябліве цяпер арэ трактарыст Аўсянік, які астанецца ў Бацькавічах, пакуль вернуцца з курсаў свае хлопцы — Адам Чэрнік і Пятрок Кароткі. Тут і рашатнёўскія хутаране Лазар з Міхалём — бадай, самыя спраўныя цеслі. Між мужчын тэпае Хведзька, бабы Мацвеіхі сын, няўклюда, але ўпрасіўся за прычэпшчыка. Мабыць, Аўсянік Хведзькаваму бацьку даводзіцца нейкай раднёю, і Іллюк, старшыня, махнуў рукой: «Ідзі, ляд з табой. Глядзі толькі, каб на плугах не заснуў, бо ад цябе, Хведзька, толькі мокрае месца застанецца...»

З саменькага рання і Хведзька, «глымазда етая», як кажа Кіпень, няйначай, наважыўся першым дапяць да та-

чыла, тут ужо швэндаецца пад нагамі, і яму нешта ўжо руліць — у брудных парэпаных руках Хведзькі нейкая жалязяка.

Яго адціскаюць мужчыны, ім самім хочацца як барзджэй падступіцца да горна.

Цяпер у Бацькавічах свой каваль. Калі не ўсе, то большасць жыхароў любілі гэтага чалавека. Цанілі яго моцныя, у вугальных драпінах, жылістыя рукі. Яго бескарыслівасць здзіўляла ўсіх. А сам ён, мужчына ў самай сіле, яму тады, мабыць, было гадоў трыццаць пяць, ганарыўся, што атрымаў нарэшце занятак, якога прагла яго неўтаймаваная, можа, нават у нейкай ступені мяцежная душа.

Сёння ў каваля будзе незвычайны дзень. Старшыня згадзіўся на просьбу Максіма Ляўшы, а Харытон ахвотна ўступіў яму сваё месца, якое займаў часова, хоць і сам меў надзею навучыцца трохі кавальскай справе.

Трымаючы па звычцы пад пахаю вялікі самаробны ключ, якім бралася кузня на завалу знутры, бацька ўскінуў вачамі — дзе ж Максім? Не можа быць, каб спазніўся: першы дзень, бацька ведае па сабе, чалавек адпраўляецца на працу, хвалюючыся, як на экзамен. І праўда, Максім стаяў зводдаль, у чыстай, пэўна, новай шахцёрскай куртцы, у штанах з чортавай скуры, русявыя валасы прычасаныя; на твары ўрачыстая ўсмешка.

Пад вясёлыя воклічы і жарты яны, каваль, які сам нядаўна змяніў старога Майсея Руціна, і ўчарашні шахцёр Максім Ляўша, што вярнуўся на бацькаўшчыну, абуджаны пачуццямі сыноўняга абавязку, займаюць месца ля горна. У іх, гэтых людзей, лічыце, адзін лёс, хоць гадамі яны не равеснікі. У Максіма — усё яшчэ наперадзе, крылы маладосці яго нясуць лёгка — яму ўсе дарогі даступныя, а планы зманлівыя і вялікія. Яны, відаць, спускаліся пад зямлю ў адной і той жа шахцёрскай клеці, не раз бачылі, як ля пад'ёмніка, у штрэку, самотныя стаялі жанкі, з трывогай у сэрцы чакалі вяртання адтуль, з падзямелля, сваіх мужыкоў.

Магчыма, у гэтую хвіліну бацьку, як і Максіму, прыгадаўся той момант, калі шахцёр-навічок апускаецца ў забой, а можа, такое, калі нечакана, крэкчучы, хрусне руднічная стойка ці гулка, як адзінокая кропля, сарвецца і звякне вугальны асколачак, малюсенькі, з гарошынку. Тады, бывае, і вырашыцца шахцёрскі лёс. Добра, калі выцягнуць з пад'ёмнай клеці на паверхню жывога, і ты, як упершыню, убачыш і неба, зацененае капцом-тэрыконам,

і прыпомніш імгненна поле, пясчаныя бугры-пагоркі, парослыя купчастым, сінім пры зямлі хвойнікам, і родныя, прапахлыя піжмаю ўзмежкі, што вядуць на знаёмае і да болю ў грудзях незабыўнае ўзгор'е, адкуль ты хлапчуком любіў у ясны дзень паглядзець на неаглядныя абсягі палёў і лясоў. З нашага, бацькавіцкага, узгор'я, дзе спрадвеку прашчуры выбралі месца на могільнік, далёка бачна наваколле. А во гэтым летам на могільніку паставілі маяк-вышку, і хто з хлопцаў і мужчын не паспытаў узлезці на самы высокі масток вышкі, каб хоць раз зірнуць наўкола! Усе казалі: «Чырвоная Гара відна...» А да той Чырвонай Гары, раённага гарадка суседняй Браншчыны, трыццаць вёрст з гакам.

— Го, добрага памочніка ўзяў сабе, Баянок! — гаварылі мужчыны, праціскаючыся за кавалём у кузню.— Цяпер трымайся, бо еты Максімец, глядзі, і цябе, Іване, падкуе!..

— Ляўша ж...

Бацька дзьмухнуў кавальскім мехам — распальваў горан — і ніякавата ўсміхаўся. Хто можа яго, каваля, першага тутэйшага малатабойца, падкаваць, інакш кажучы, абставіць, пасадзіць, як кажуць, у галёшу? А што датычыць Максіма, то не такі ён, каб свайму чалавеку, ды яшчэ настаўніку, падстаўляць нагу. Вунь быў у яго нядаўна Васіль Шылай, асілак, працаўнік — пашукаць такога, але што зробіш, не ўстояў перад спакусай, зманіў яго братуха сібірскімі вольнымі землямі. Васіль падахвоціўся на братава запрашэнне, а цяпер, кажуць, шкадуе: вярнуўся б у родныя пенаты, ды дарога не блізкая і перад землякамі як бы і сорамна — вядома, сумленне і гонар не здымаюцца з рахунку.

А Максім, закасаўшы рукавы па локці, браў у рукі малаткі, то вялікі, важкі, на паўпуда, мабыць, то меншы, з якім часцей уходжваецца сам каваль.

Ужо горан палае. Іскры з пырскам і хлопаннем страляюць аж пад столь-дранку, праз якую свіціцца неба. Выдае, бы іскры шчыкаюць рэдзенькую нябесную сінечуміткаль, і яна дыміцца, разносячы з кузні наўкола, аж пад садок дзеда Петрака, востры пах паленага жалеза.

— Максіме, бяры еты малаток,— бацька борздка выхоплівае з печы нагрэты, аж да белага, нарог доўгімі жалезнымі абцугамі і кладзе яго на кавадла. — Давай, браткa, бі за мною. Гасі сюды, дзе я стукаю сваім малаточкам. Давай, давай, Максіме!..

Звініць кавадла. Шчыруюць, перагукваючыся, молат з малатком, паслухмяныя рукам каваля і сіле малатабойца, паддаецца дачырвана напаленае жалеза, прымае належную форму.

Максім назірае, як лёгка, старатліва паварочвае чырвоны нарог каваль, і ловіць сябе на думцы, што даўно яшчэ, там, у Данбасе, калі прыехаў туды амаль што зайцам, бо стары Піван грошай на дарогу не выстарчыў, упадабаў гэтага дзядзьку-земляка. Максіму стала неяк сорамна за ўчарашняе, калі браты счапіліся загрудкі. Ён адчуваў: прычынай стычкі, канечне ж, было тое, што нібыта гэты самы Іван-галетнік можа ў любы час перайсці дарогу. Учарашнім заможнікам не па душы, што калгас яму — родная маці і ягоны брат Косцік — завадатар на гэтай дарозе, і не дае ім, гаспадарам, разгарнення, сочыць, як не ходзіць па іх пятах, адчуваючы, што яны, старацелі, з калгасным не могуць размінуцца.

— Яшчэ, Максіме, сюды во, па гэтым краёчку! — каваль паволі выцірае спацелы, у вугольным пыле лоб і кідае нарог у шайку з вадою — на гартоўку, глядзіць, каб метал не перакаліўся, і ацірае рукі фартухом. Тады бярэцца за курэцкія прылады: — Адсаніся крыху, хлопча. Не бяры адразу так на пуп...

— Ды што вы, дзядзька Іван,— сумеўся Максім, хоць дыхаў часта, перарывіста,— я не змарыўся, ані ніколечкі!..

Яны прыселі — каваль на край запечча ля цёплага горна, а малатабоец на падзяўбанай і пашчапанай калодачцы-кругляку. Абодва адсопваліся — ім накідалі на дзень усялякага начыння. Ды сядзець доўга не давялося. За дзвярыма, на перамятым мурагу, усчалася валтузня — шум, гоман, якія, можа, чутны былі за вярсту.

Абодва вопрамеццю кінуліся з кузні. Максім аж рот разявіў ад здзіўлення. Лазар, што ўчора ледзь не пабіўся з Харытонам, стаяў на ўколенцах, падмяўшы пад сябе Кіпня, ускалмачанага, з распаласаванай на ўвесь жывот суравой сарочкай. Кіпень намагаўся вырвацца, сплёўваў са слінаю кроў. Абодва яны хрыпелі і злосна лаяліся, крычалі. Вакол іх, блытаючыся вялікімі ступакамі ў мурагу, сноўдаўся Хведзька-прычэпшчык і крычаў, баючыся блізка падступіцца.

Як выявілася, усе, хто быў тут, у іх ліку і Кузьміч, хуценька разбегліся, зашыліся па кутках.

Максім ачомаўся хутка — ухапіў за каршэнь Лазара і шкуматнуў з усяе сілы, што той адляцеў аж да прасла, уткнуўшыся ў крапіву-жыгучку. Цяжка, цялепкаючыся і плюючыся, падняўся Кіпень, пачаў абурацца, азіраўся вакол і страшэнна мацюкаўся.

— Ну, хрыпач, зладзюга! Ета папомніш! .

Кіпень ірвануўся ўхапіць сякеру, што ляжала тут жа, на тачыльным варштаце, але яго руку перахапіў бацька:

— Антонька, супакойся! Апомніся, дурань, што ты робіш! Чаго вы не падзялілі, дзівакі. Хіба етае зямлі? Дык яе вунь колькі — абы рукі ды ахвота. Бярыце, колькі аббяжыце. Работы хіба не хапае — рабіце, а не хапайцеся загрудкі, як бараны кручаныя...

Плюючыся і бліскаючы шалёнымі вачамі, задыханы, аж раздзімаліся ноздры, Лазар плюхнуўся на валун, што ўрос у мурог ля плота, і нешта мармытаў сабе пад нос, не звяртаючы ніякай увагі на Антона, якога трымалі за рукі бацька і Максім.

— Я табе пакажу лён,— аж захліпаўся слінаю Лазар.— Я не браў! Хто бачыў? Косцік ці Дзяніс? Дык пляваць я хацеў на іх. Актывісты мне знайшліся... Я ім пакажу, што самі яны — не святыя. Магу прыпільнаваць, няхай часцей ходзяць уначы, дык палучаць сваё, разлік атрымаюць на месцы. Будзе ім, як таму Платону, што ўсё лесу шкадаваў, дык ужо адшкадаваўся — парыць зямельку. А лес вунь расце. Дуброва вялікая, хопіць на ўсіх, а Платону і дзевяць грамаў хапіла...

— Ета ж Платон. А я што ўкраў? — аддыхваючыся, агрызнуўся Кіпень, але Лазар ураз адчуў, што той гатоў да замірэння.— Ты мяне зладзеем робіш, а сам, як тэй казаў, гарбат з галавы да пят... Няхай я апухну, няхай таму ногі паадсыхаюць, хто браў тую газу. Мае і нагі не было ля таго трахтура. А калі нехта так плявузгае — ета ўсё хлусня: не быў я тады ноччу ля трахтура — брахня ета ўсё...

— А Целяпей жа казаў, што той, хто ля бочкі з вядром тады аціраўся, быў у чухмянцы з башлыком, казаў, у такім, як у Кіпня,— збоку прагамзаў Хведзька. Ён быў перапалохаўся, як усчалася бойка, а цяпер вярнуўся. Абураны тым, што нехта набраў газы і, уцякаючы, пакінуў незаткнутай бочку, і газы багата выцекла на зямлю, пакуль прыбег вартаўнік, Хведзька не мог маўчаць.

Кіпень асклабіўся, з кулакамі падхапіўся быў да Хведзькі, лаяў яго апошнімі словамі, ды біцца ўжо не вы-

падала. Да кузні галопам імчаўся на жарабку, пад сядлом, Іллюк і злосна крычаў:

— Што ў вас тутака, жываглоты? Ану, марш адсюль! Ды каб без панікі мне, бо аднаго і другога заўтра — пад канвоем, і ў Маластоўку! Дровы пасячэце там, тады будзеце знаць, як буянства чыніць!.. Людзі ўжо даўно нарабіліся, а яны тут, у цяньку, бойку ўсчалі! Вон! А заўтра — на праўленне. Ясна?..

— Ясна,— Лазар згорбіўся і таропка пашкрэбаў раскідзістымі ступакамі ад кузні, касавурачыся і баязліва азіраючыся.— Ета ж такую абіду мне нанёс, век не прашчу!..

— Баюся я цябе, заграбайла, як леташняга снегу,— чулася з'едлівае наўздагон.

— Сам глыбаед, бярэш усё, што калгаснае, як сваё...

Але Кіпень, відаць, ужо не чуў сказанага, а мо спалохаўся старшыні, да якога ў яго свае, даўнія рахункі і крыўды, схаваныя на самы сподак душы.

Хведзька, ачомаўшыся, не надта дакладна і ясна, але вытлумачыў, як усё між мужчынамі пачалося. Аказваецца, Лазар, як Антону здалося, занадта доўга затрымаўся ля тачыла, а Антон таксама спяшаўся і сказаў: «Дос табе ўжо, падвайстрыў трохі і адсуньсь, дай другому!» А Лазар агрызнуўся: «А тваё якое дзела, вякала?» — «А, глыбаед, ета табе не там, на Рашатнёўцы, лён увесь парасцягвалі. У цябе, знаю, лёну хоць заваліся, а ў мяне і жменькі нямашака...» — «Я — глыбаед?» — ашчэрыўся Лазар і з усяго маху агрэў Кіпня. А той — каршуком на крыўдзіцеля.

— А ты, глымазда, ашмётак,— накінуўся бацька на Хведзьку,— дзе ты быў? Чаму не крычаў, не падаў нам знаку?

— Што я,— лыбіўся Хведзька, шморгаючы носам.— Я спужаўся...

— А дзе ж еты, Кузьміч? — азіраючыся вакол, з усмешкай запытаў пра дзядзьку Максім.

— Як сталі біцца,— расказваў Хведзька, — то дзядзька Карп бокам-бокам ды — дзёру, схаваўся за шула ды ціхенька і пазіраў адтуль...

Увечары пры сустрэчы бацька запытаў пра гэтае здарэнне ў Кузьміча, а той божкаўся і кляўся, што ён нічога не бачыў і не чуў. Аж пляваўся, мяшаў з гразёю як свайго пляменніка, так і Кіпня, з якім падтрымліваў нейтральныя, увогуле суседскія адносіны.

8

Набліжаўся дзень, калі трэба было развітацца з Бацькавічамі, з сябрамі, з якімі пражыта столькі незабыўных дзён і вечароў; адбылося столькі цікавых і задушэўных гутарак і вясёлых прыгод.

Аляксей Мікалаевіч усё лета нікуды з Бацькавіч не ад'язджаў, калі не лічыць праведак старых бацькоў у Свербічах. Дзякуючы настаўніку і наша камсамольская ячэйка і ўлетку жыла актыўна, сапраўды паўнакроўным жыццём. Хаця ў тое лета яна была яшчэ невялікая.

З намі былі яшчэ маладзейшыя, тыя, што нам тады зайздросцілі і стараліся не адстаць ад нас — яны праз якія два-тры гады ўліліся ў камсамольскую сям'ю і сталі на нашае месца. Мішка Канаплянік, Алёшка Максач, Мішка Бальнавічонак, Хведзька Кавалік, Уладзік Цярэшка, Адам Мірончык, Іван Аўхімаў — усіх не злічыш. Урадлівая наша бацькавіцкая зямля на хлопцаў. А для якога бацькі, скажыце, не гонар, калі ў хаце гадуецца не адзін сын, а поўнае аддзяленне, па-нашаму — плойма.

А бацькавіцкія дзяўчаты — яны ў тое зорнае хлебнае лета цвілі, быццам лілеі. У нашым канцы — што ні хата, то нявеста, або дзве, ці нават і ўсе тры. Хлопцаў у Бацькавічах было многа, а дзяўчат — процьма. Нездарма ў хаду тады была бойкая прыпеўка. «На полі крамяніста, на дзевак ураджай. Хто надумае жаніцца, ў дзярэўню прыязджай».

Лічыце з канца, ад Амялляна Цярэшкі, яго хата крайняя ад шляху на Маластоўку. У Амялляна — тры дачкі: Параска, яшчэ не перастарка, а ў нявесты ўжо гатовяцца і Алена, і Наста; у Кіпня — Елька і Аксана; у Аўхіма Цярэшкі — Адарка, ужо даўно пасаг нафталініцца ў куфры, а за ёю, адна за другую статнейшыя,— Дуня і Каця. А там дзяўчаткі падрастаюць і ў Трахімкі, і ў Рамана-Гамарніка, а ў Яўмена-шахцёра трое, хоць сёння шліце сватоў — Варка, Таня і Маша; у Якава Каваліка — дачка, у Івана Бэта — дзве, у Карпа Кузьміча, якога ў вочы называюць дзедам, таксама на дзяўчатак пашэнціла — маладая жонка яму нарадзіла адну за другой дзяўчатак, як кветачак.

Па вёсцы ідзі з хаты ў хату і ўбачыш на ложку гару падушак з выбеленымі кужэльнымі наўлічкамі, расшытымі чырвонай і чорнай заблыццю. Вядома, расце нявеста. Да глыбіні душы землякі пакрыўдзяцца, калі тут не на-

завеш Харытонаву чарнабровую ўвішніцу Кацю, а ягонага швагра — незаменнага бацькавіцкага рахункавода Сямёна-Марціна прыгажуню Алену. А яшчэ ж старэйшыя, але не сядухі, Васіліна і Ганка, як Сахвея і Хрысця, Арына і Вулька...

Незваротная залатая пара юнацтва. Здаецца, тое было ўчора, калі мы, маладыя, збіраліся на сходкі, удзельнічалі ў вясновых пагулянках, ігрышчах.

Успамінаюцца ігрышчы-вечарынкі ў Бацькавічах. Гэта не проста пагулянкі-танцулькі, а са сваімі традыцыямі маладзёжныя вечары, па-народнаму простыя і своеасаблівыя. Ігрышчы гэтыя пачынаюцца звычайна пасля жніва, увосень. Спачатку збярэцца адна якая-небудзь дружына — так, відавочна, называюць у нас хеўру хлопцаў і дзяўчат, што кучыцца вакол якой адной хаты, дзе звычайна ўзімку кватаруюць дзяўчаты. Збіраюцца на попрадкі, з прасніцамі і самапралкамі. Тады ў гулянку ўключаецца ўвесь канец. Нарэшце хваля гульбішча захоплівае ўсё сяло. Вёска аж стогне ад скокаў з рознымі гульнямі, вясёлымі карагоднымі песнямі. Гульбішча цягнецца не дзень, не два, а адлівамі і прылівамі — усю піліпаўку, захоплівае і каляды. Пасля дня Васіля святога ўгодніка гулянкі спадаюць і запыняюцца зусім. А ў хатах, дзе ў попрадках кватаруюць дзяўчаты, аж гудуць самапралкі, аж да крыві сціраюцца ад бясконцай суравой ніткі пальцы. Гарачая пара: кожнай дзяўчыне трэба напрасці нітак губак на дзесяць, і хлопцы-жаніхі прыціхаюць — баяцца і падступіцца да сваіх выбранніц аж да саракоў, вясенняга свята, калі тыя падуправяцца трохі і з першымі капяжамі гаспадыні кладуць аснову кроснаў.

Гэтым летам, нягледзячы на работу, якой хапае яшчэ і ў полі, і дома, рана загаманілі пра ігрышчы. Па сяле праплыла зманлівая чутка — дзяўчаты з рашатнёўскага канца бытта пачалі ўжо складчыну. Значыцца, запросяць гарманіста, балазе завёўся свой ужо, хаця не надта, як кажуць, узрачны, але ж свой, як задумалася, то можна ў любы час запрасіць на ігрышча.

На чарговым сходзе Аляксей Мікалаевіч сказаў, што камсамольцы павінны аб'явіць бой старым вясковым ігрышчам, якія часта канчаліся п'янкай, «дзяліцьбай кашы», і многія пасля з тыдзень насілі пад вачамі «ліхтары», хадзілі да фельчара ў Горкі на перавязку ці, яшчэ горш,— адлежваліся ў бальніцы.

Якраз наспявала і ўрачыстаць — адкрыццё новага

клуба ў Бацькавічах. Клуб быў амаль гатовы, адно заставалася пабяліць грубкі, тое-сёе дарабіць на сцэне, змайстраваць лаўкі.

Як і грэбелька, якую моладзь прывяла да ладу, ачысціла ад ілу і хмызу, клуб — наша гордасць. Яго пачалі будаваць, яшчэ калі за старшыню быў украінец Гопка. Будоўля, папраўдзе, была зацягнулася, але апошнім годам, калі мужчыны і хлопцы папрыязджалі з адыходніцтва, за вясну і лета хутка пасунулася наперад, і ў клубе можна спраўляць уваходзіны.

Аляксей Мікалаевіч дагэтуль налягаў на камсамольцаў, каб шчыравалі на сенакосе і на жніве, ахоўвалі збожжа на таку, а цяпер узялі пад свой нагляд клуб, асяродак сацыялістычнай культуры на вёсцы.

— Эх, шкада, Алёшка, што ты едзеш скора,— церабіў непакорны, аж грабянец ламаўся, каштанавы чуб настаўнік, калі мы сабраліся ў школе параіцца наконт адкрыцця клуба.— Узяўся б за клубніка. Думаю, што справіўся б... Але пакуль суд да дзела, то намалюеш нам хоць лозунгі. Вот з адпачынку вернецца Лабачэўская, і мы зажывём...

— Кажуць жа, што Антаніна Якаўлеўна замуж выйшла,— асцярожна нагадаў я, бо чуў гэта ад Сцяпана Говара, дзе ў хаце жыла на кватэры настаўніца.

— Яшчэ тое на вадзе віламі пісана,— абазваўся Сцяпан.

Канечне, яму лепш было вядома, бо Міхал, што падружыўся з нашай настаўніцай, даводзіўся сватам Говарам, а жыў у Маскве. Па чутках, улетку яны пажаніліся, і настаўніца, бытта, у Бацькавічы не прыедзе.

Аляксей Мікалаевіч далікатна прамаўчаў. Загаварылі пра тое, як лепш справіць свята ў новым клубе.

З раёна, з Маластоўкі, абяцалі даць духавы аркестр і сваіх артыстаў напачатак, каб Бацькавічы, спектаклямі не спешчаныя, паглядзелі якую-небудзь пастаноўку.

— На помач надзейся, а сам варушыся,— пажартаваў Аляксей Мікалаевіч і сур'ёзна: — Яшчэ невядома, ці прывязуць нам які спектакль, а хор трэба, каб быў. Дзяўчат сваіх збяром, а дакладчыка забяспечыць нам Сцяпан Андрэевіч... Згода? — Аляксей Мікалаевіч паглядзеў на Сцяпана Міронава, нашага хлопца, які ўжо год, як працаваў сакратаром сельскага Савета ў Ігліцы і ездзіў на работу на нейкім старэнькім веласіпедзіку. Для ўсіх ён быў ужо не проста Сцёпкам па мянушцы Грыль, а Сцяпан Андрэевіч.

Грыль важна ўхмыляецца, зіркае пукатымі вачамі, набычыўшыся. Сам ён, вядома, за дакладчыка не будзе, хто яго, учарашняга шалахвоста і калывуза, стане слухаць, але з важнай мінай думае. Неяк смешна. Але нічога не папішаш — начальства. Як пакажацца, крэкчучы і аблізваючыся потам, Грыль на сваім драндулеце, то і старыя вітаюцца, і той жа бацька высоўвае спацелую галаву з кузні і вітае начальства. Праўда, іншы раз пасмяецца з хлопца. Неяк было — Грыль звярнуўся да бацькі з просьбай: «Дзядзька, скуй-ка мне спіцу, бо ў мяне адна сапсавалася». А той, як бы самым сур'ёзным чынам, адказвае: «А навошта табе, Андрэевіч, тая спіца, ты ж цяпер на белым хлебе, то і без спіцы пройдзе...»

Смешна, папраўдзе, Сцяпан такі ж, як і я, падшыванец, а ўжо сядзіць з сур'ёзнай пыхай, надзьмуўшыся, як індык, і важна хітае сухім бусліным носам, зіркае пукатымі вачыма. І як бы нехаця, ледзь язык варочаецца, адказвае, акурат выпендрываецца:

— Не знаю, нада параіцца з Вярбіцкай. Яна сама, можа, захоча выступіць...

Ну й Сцяпане! Якраз пабраў усё да кропелькі ад свайго дзядзькі Сямёна-Марціна, славутага «звесткі-нявесткі».

Цікава наглядаць, як Сцяпан пахаджвае ў сваім пакойчыку, баском пакрыквае на мужчын і кабет, якія турбуюць яго па нейкай сваёй патрэбе. А што ж, начальства!

Бачна, заўважыў Сцяпанаву пыху і Аляксей Мікалаевіч, бо неяк хітра прыжмурыў адно вока, патрос чубам:

— Ладна. Я сам перагавару з райкомам...

Вызначылі дзяжурных за парадак на вечары. Улічылі, што той-сёй можа прыйсці «пад градусам». Асабліва — госці-шахцёры. Ды ігліцкія прыйдуць, а яны, гаршкоўнікі, з мухамі ў носе, любяць кулакамі размахваць... Трэба быць начыку!..

— За ігліцкіх я паручуся,— адкашляўся ў кулак Сцяпан, сумеўшыся. Мабыць, адчуў, што ў нечым як не патрапілі ягонаму самалюбству.— Я панароўку іх добра ўведаў...

Аляксей Мікалаевіч зірнуў на гадзіннік, што заўсёды з ім быў у кішэні, прычэплены раменьчыкам да лацкана сіняга гарнітура, з рукавоў якога заўсёды выглядалі манжэты белай сарочкі, акінуў зычлівым позіркам хлопцаў і з прыціскам, характэрным для ягонай гаворкі, сказаў:

— Усё? То будзем разыходзіцца... На падрыхтоўку нам засталося тры дні...

— Кінень у камсамол просіцца,— варухнуў плячамі. як ачнуўшыся, Сцяпан Говар, ён сядзеў за сталом побач з настаўнікам, запісваў нешта з таго, што гаварылася, у пратакол.

— Сашка? Няхай пачакае,— суха сказаў настаўнік, сцепануўшыся.— Старога злавілі на сцелішчы, за грэбелькай — трасты напхаў у рэзгіну. Пакуль устрымаемся. Што яшчэ там у нас?

— Кажуць, Моця з дзеўкамі дзелаць ігрышча збіраюцца,— з задняй парты выгукнуў Цярэшка і чамусьці паёрзаў, як збянтэжыўшыся.

— От, казёл яе бадай... Ета сітуацыя! — Аляксей Мікалаевіч абераў падшморгнуў штаны, яны ў яго ніколі не былі на месцы, і зноў сеў, плюскаючы блізарукімі вачамі. — Мабыць, трэба дзяўчат сабраць, ажывіць хор наш. Ета я бяру на сябе. Заўтра збяром... І трэба, каб гармонік быў...

— Го, етага Пілецкага за так і на вяроўцы не прыцягнеш! — у адзін голас загаманілі хлопцы.— Сапраўды, крывое калясо...

— Нічога, гарманіста, думаю, перахопім,— прайшоўся паміж партамі настаўнік.— Дзеля такога дня праўленне, думаю, раскашэліцца. За пяць працадзён будзе іграць...

— Уга-а-а! — Грыль атарапела круціў галавой, прыцмокваў языком.— Ці не замнога?..

— А што зробіш,— развёў рукамі Аляксей Мікалаевіч.— Пакуль што Пілецкі ў нас — культурная адзінка...

— Нічога сабе зяць — любіць узяць,— аж зазлаваўся Мішка Цярэшка, а ён рэдка калі выходзіў з раўнавагі.

— Зануда! — ускрыкнуў і Сцяпан Говар падхапіўшыся. І, мабыць, недарэмна, бо сам не раз быў за пасла ад моладзі ў ігліцкага прымака Стася Пілецкага, які, пасля службы, з гармонікам стаў наведвацца ў Бацькавічы і ўжо ў мясаед перавёз свой скарб да Шылаёвых, ажаніўшыся з Пёклай, белабрысай швагеркай Іллюка-старшыні. Бацькавіцкія дзяўчаты і хлопцы перад ігліцкімі задзёрлі насы: яшчэ б, пераманілі гарманіста. Але скора пераканаліся, што Стась — скнара, за іграннe пачаў браць плату ды яшчэ драў, як кажуць, са сваіх жа па тры скуры. Вось тады і пусціў нехта прыпеўку:

— Ай, Пілецкі, пан ігліцкі,
Ты крывое калясо,
За што ж цябе дзеўкі любяць?..
Бо ты граеш харашо...

— Што ж, хлопцы, еты Пілецкі сапраўды іграе няблага,— настаўнік пачаў збірацца, даючы зразумець, што сход закончаны.— Мабыць, час, хлопцы, і на седала. А некаторым і да дзяўчат не зашкодзіць, бо хутка і ў адлёт, як той казаў. Праўда, цёзка?..

Аляксей Мікалаевіч хітра падмігнуў мне. Я зніякавела затуліўся за спіну Мішкі Цярэшкі, прамаўчаў нечага, як апёкшыся.

9

Клуб агоралі шыкоўны — з новага бярвення, на дубовых шулах і шкандарах, пад гонтай; вялікія светлыя воклны, шырокі ганак, зала, як стадола, са сцэнай, на ўсю сцяну лозунг: «Пяцігодку — у чатыры гады!», плакаты, партрэты Леніна, Сталіна.

На адкрыццё клуба сабраліся і старыя, і моладзь, і падлеткі, і дзеці — яблыку недзе ўпасці. Духавога аркестра, як абяцалі, нам не далі. За дакладчыка прыехаў сакратар райкома камсамола Тодар Іваноў. У Бацькавічах яго добра ведалі, бо родам з недалёкай, зарэчнай вёскі Дзярнуха, і калі ў Горках працаваў загадчыкам хаты-чытальні, то прывозіў нам спектаклі і канцэрты, Тодар умеў раскатурхаць слухачоў, абы толькі пачне гаварыць — возьме ў палон, ачаруе красамоўнасцю.

Вядома, прыехала і начальства з Ігліцы, з сельсавета. А як жа, старшыня сельсавета Агата Макараўна Вярбіцкая — жанчына строгая, унушальнага выгляду,— такой поўнай жанчыны, як цётка Агата, у нас не было, пэўна, ніколі. Казалі, што яна хварэла на сэрца, але гэтаму, вядома, ніхто не паверыў бы. «Як ета хворая, а такая поўная, адно сала. Аж трымціць уся. Ета такі чалавек ешчы ўдаўся, такога тлустага заводу...»

Агату Макараўну і за вочы звалі ўсе вяскоўцы проста цёткай Агатай. Усю вясну і лета дзень пры дні ездзіла яна і ў поле, і на будоўлю клуба на рахманым шэрым, у яблыкі, кані, запрэжаным, мабыць, яшчэ ў панскую брычку, на якую заўсёды, як верабейчыкі, віслі мурзатыя дзеці-галапупікі, калі брычка паказвалася на бацькавіцкай мурожнай вуліцы.

Ад цёткі Агаты даставалася ўсім, нават і самому Іллюку, які часам пасля аб'езду калгаса спыняў свайго Ворана ля крамкі, якую летась адчынілі, і сюды кінулі, як казалі,

на ўмацаванне змычкі з горадам нашага нязменнага сябра вёскі рыжавусага бадруна Цітка Мірончыка, ці яшчэ ў адным новым цёплым месцейку — ля хаты Хведара Каваліка, па мянушцы Гаспадарык. Гэта быў вялікі зычлівец, сам не вораг чаркі, любіў пасядзець за бяседным сталом і прывабліваў вясковых лежабокаў і гулякаў, для якіх абы была чарка, а там хоць трава не расці. З зімы пачалося, што мужчыны, цэлай гамэрняй, унадзіліся да Хведара-Гаспадарыка і скрозь ночы сядзелі, дымілі самакруткамі за пляшкай самагонкі, якую ўмеў ціснуць Гаспадарык. Не дзіва, што нехта трапна ахрысціў яго хату сталоўкай. Адшумела вясна, пачалося лета, а «сталоўка» не зачынялася. Здаралася, што тут і да поўдня нудзіўся прывязаны двайным сырамятным паскам Іллюкоў Воран. Тады і дайшло ўсё да Вярбіцкай.

Калі паяўлялася цётка Агата, усе разляталіся, бы вераб'і, тарабанілі як на злом галавы, хаваліся хто куды змог. А сам Гаспадарык, сухарлявы, бы корчык, з масляністымі шэрымі вочкамі карузлік на хітрым змаршчакаватым твары, зарослым па вушы шэрай шчэццю, вінавата стаяў перад грознай цёткай Агатай і калаціўся, чыста асінавы ліст, аднак упарта апраўдваўся:

— Я што? — Ён яшчэ і храбрыўся, блазенна лыбіўся: — Я, як тэй казаў, з боку прыпёку. Мая душа крывая, усякага прымае...

— Яшчэ мне зубы загаворваеш, хітрун стары, джога! — Цётка Агата грымела на ўсю вуліцу, рэха галёкала аж на Забалоцці, і адчайна махала перад самым носам Гаспадарыка ўручыстым, абшмараваным пугаўём.— Развялі мне тут, дзяньгубы, гамэрню. Етага я не пацярплю. Во ўжо і Іллюка прынадзіў, а быў жа чалавек-крэмень. Аказваецца, етая га́ра такая моцная, што і быка зваліць. Хопіць! Як толькі знойдзем брагу, сам знаеш, без перасадкі загрыміш на адсідку! Памятай, чалавеча!..

— Ета я ўсё ведаю, Макараўна. Паследні раз, далібог, бажуся, як перад абразамі,— угодліва, лісліва білібеніў Гаспадарык. Тады, асмялеўшы, бо быў цёпленькі, завёў абы-што: — Піццё — смяццё, бяседа дарагая...

— Хведар Сяргеевіч, помні,— сур'ёзна, пастукваючы пугаўём аб падлогу, казала цётка Агата.— Закрывай «сталоўку», пакуль я добрая, бо пагром будзе, ушчэнт усё разаб'ю, што і аскялёпкаў не збярэш...

— Макараўна, даруй!..

...У прэзідыуме яна, цётка Агата, сядзіць вясёлая, ура-

чыстая, добрая душа, і не верыш, што ўчора яна тым сваім пугаўём частавала і Антона Кіпня, калі сельсавецкая «лёгкая кавалерыя» ў яго адрыне, пад сенам, знайшла лясёнку калгаснага лёну-трасты, якую ён уначы прыцёг са сцелішча. Не можна сабе ўявіць, як гэтая ж дабрадушная, з усмешыстым тварам цётка, акурат вясковая кабета, у Агаты і хустка-гарусоўка ў дробныя кветачкі, як і ў бацькавіцкіх жанчын, як яшчэ ставілі гэты зруб, ганяла таго ж Лазара, якога, як агню, баяліся самыя адчайныя забіякі-непрыкайнікі, і Лазар толькі кректаў ды прасіўся: «Макараўна, даруй. Не я ета, як перад богам малюся, ета ўсё тэй шыбенік, хлопец мой, прынёс тыя снапы. Каб яго чэрці на могільнік, пад маяк, сцягнулі. Яй жа божачку, не я ета...»

Але ж і хітрушчая цётка Агата — пастрашыць пугаўём каторага добранька, а пад суд не аддасць, ведае, што за сноп ці за жменю лёну нельга чалавеку даваць адсідку, а па закону належала, бо ў таго ж Лазара ці Антона — сям'я, дзяцей па асміне. Яна старалася тут, на месцы, сваёй уладай адвучваць каторых ад благой уласніцкай звычкі — не размінуцца, калі што блізка ляжыць, суседава ці чужое.

На сцэне блізка ад цёткі Агаты, нахмураны і бытта як пакрыўджаны, сядзіць Іллюк. Старшыня гэтым летам занадта ўжо злёгся са сваім дзедам Хведарам (Хвядорыха бабіла ўсіх траіх дзяцей у Іллюка), пачаў часцяком заглядваць у ягоную «сталоўку». Дазнаўшыся пра гэта і адчуваючы, што яно да дабра не давядзе, Агата спачатку спрабавала разагнаць, як яна казала, усю тую цёплую кампанію сама, каб не пайшла пагалоска далей, у раён, але «сталоўка» не закрывалася, і тады Агата паклікала Іллюка на партячэйку ў Ігліцу. Яму там далі, відаць, добрую прачуханку, ён стараніўся, пачаў абыходзіць дзедаву «сталоўку» далёка, каб не чуць і паху таго. Магчыма, цяпер злосці на цётку Агату ў Іллюка і няма, але на сэрцы яшчэ нейкі гнёт, беспрыменна, ляжыць. Сэрца ж, кажуць, і ў вераб'я ёсцека.

Цяпер паслухаем дакладчыка. Бо ён, Тодар Іваноў, і сёння гаворыць пафасна, з патхненнем. Дзіва што! Кучаравы прыгажун, шырокі ў плячах, бровы, як у казака, уразлёт, крыластыя, голас звонкі — чаму не заслухаешся?

— Таварышы нашы, дарагія калгаснікі! — над шапкамі, хусткамі, бародамі — белымі, цёмнымі і рыжымі,— над хвацкімі хлапечымі чубамі лунаў звонкі, вясёлы голас.— Усе вы бачыце, што на сённяшні дзень на радасць

усім працоўным, на зайздрасць і на страх ворагам, знешнім і ўнутраным, набіраецца моцы, сільнее наша родная Савецкая краіна. Умацоўваюцца, выходзяць на дарогу заможнасці і культуры калгасы, хоць яшчэ ўчора і на сённяшні дзень ворагі-злыдні, кулакі і падкулачнікі, ставяць палкі ў наша калектыўнае кола. Не выйдзе! Не засланіць асліным вушам сонца, як сказаў паэт. Сведчаннем нашае моцы, нашага няспыннага руху наперад, па ўказанай Леніным дарозе,— і еты клуб, у якім мы сёння, таварышы, дарагія калгаснікі, сябры-камсамольцы, сабраліся. Клуб, як ведаеце, пастаўлены, збудаваны сіламі калектыву, пры энтузіязме моладзі. Я вітаю ўсіх вас, ад душы, і прачытаю вам верш паэта-земляка, майго таварыша з роднае вёскі Петруся Бядуліна.

— Прачытай, прачытай, Тодарка! — пачулася весела з грамады.

Дакладчык пастаяў крыху, пакуль аціхла зала, тады спакойна, але выразна, чуваць было добра і ля парога, пачаў:

— Ідуць масы у калгасы
Грамадою.
Час расстацца-развітацца
Нам з бядою...

Слухалі ўсе ўважліва. А ў мяне як цвіце душа. Гэта ж вершы не якога нерэальнага паэта, што жыве недзе далёка, у вялікім горадзе, а нашага, тутэйшага, з глухой, глыбіннай вёскі, дзе яшчэ няма ні радыё, ні электрыкі. Наш просты вясковы хлопец, такі ж, як і гэты, што чытае во гэтыя вершаваныя радкі. Хацелася падысці да Тодара, пагаварыць з ім, але хіба цяпер праб'ешся да сцэны? Можа, як зраблю гэта пазней, калі скончыцца ўрачыстая частка.

Выступалі Вярбіцкая, Іллюк і Аляксей Мікалаевіч. Гаварылі горача, на ўсе лады хвалілі будаўнікоў, што пастараліся давесці за лета клуб, як было намечана праўленнем, і зрабіць уваходзіны. Адважылася выйсці на сцэну і наша Васіліна, уся святочна-ўрачыстая: на ёй беласнежная кужалёвая, расшытая пеўнікамі кофтачка, квяцісты, аж у вачах рэжа, саян, падвіты валасы — блішчаста-чорныя, з кудзеркамі каля лба, а за плячамі двума ручайкамі спадае каса. Васіліна ішла да сцэны з узнятым над галовамі людзей, што сядзелі на свежых, яшчэ пахнучых жывіцай лаўках, снопам лёну-даўгунцу, абвітым чырвонай стужкай. За ёю шыліся Параска і Сахвея. Іх звяно

вырасціла лён, які прадстаўлены на сельскагаспадарчую выстаўку ў Маскве. Людзі, канечне ж, ведалі пра гэта і сустрэлі дзяўчат шчырымі і такімі громкімі воплескамі, што аж страсянулася зала і, пэўна, выплеснуліся на вуліцу, бо ўсе вокны адчыненыя, і панесліся ў паднябессе, дзе ўжо засейваліся густым сяйвом буйныя жнівеньскія зоры. І з той багатай бацькавіцкай талакі моладзі, хто не ўціснуўся ў перапоўнены клуб, а такія былі і таўкліся пад вонкамі і не маглі не бачыць замглёнай зоркамі паласы, а каб угледзеліся, то на яе ўскрайку роўным белым святлом мігцела зорка вясёлай летняй пары — Канікула.

А Васіліна дала паклон на сцэну, тады нізка пакланілася ў залу і, перарывіста дыхаючы, прамовіла:

— Ета, старшыня, табе, вам, цёткa Агата! — і паказала на сноп, перадыхнула і ўжо смялей у залу: — Во, паглядзіце, людцы, які лён парос на нашай, калектыўнай нашай ніве. А казалі некаторыя, што нічога не выйдзе з етага, з нашай арцелі...

— А ета, бачыце, выйшла! — заўсміхаўся Іллюк, беручы з рук Васіліны сноп і сагнаўшы ўраз з твару пахмурнасць, урачыста вітаў ільнаводак, хітаючы клінаватай галавой: — Дзякуй вам, дзяўчаткі! Спасібачка! Вам, новым героям новай вёскі, пачот і слава, бо вы на справе, сваімі мазолістымі рукамі паказалі на прыкладзе ўсім, што азначае вольная, калектыўная праца на такой жа арцельнай палосе. Еты лён вырашчаны, таварышы, на ніве без межаў, без чорнай мужыцкай зайздрасці, якая была ўелася ў нашы душы здавён, ад дзядоў і прадзедаў!..

Іллюк аж спацеў, увагрэўся, выцер хусцінкай змакрэлы твар, адшукаў некага вачамі ў зале, крыкнуў ахрыпла, як на якім мітынгу:

— Пілецкі, давай марш!.. Для нашых першых ударнікаў. Да грамчэй, маруда, не жалей гармоні!..

Стась, які, пэўна ж, драмаў у першых радах з краёчку, па звычцы галаву паклаўшы на сваю хлебніцу-трохрадку, аж падскочыў і давяруў на ўсе гузікі. Паліліся бязладныя, але звонкія гукі, якія тут жа, умомант, склаліся ў марш, і зала, і ўсе, хто быў на сцэне, усталі і пад пералівістыя гукі марша білі ў далоні, выгукваючы, па пачыну цёткі Агаты, адно, новае ў новым клубе слова: «Слава!» — яно і здзіўляла, і захапляла сваёй незнаёмасцю, яшчэ нязведаным пачуццём, як усё адно нешта надта ж нязвыкла вясёлае і бадзёрае. Так, прынамсі, успрымалі новае слова тыя, каму хацелася звону, радасці, музыкі.

Як сапраўды па нашым жаданні, музыка запоўніла сваімі гукамі ўсіх і аж не месцілася ў будынку. І твары людзей аж свяціліся, пэўна ж, не толькі ад таго, што ярка гарэлі тры лямпы-дзесяцерыкі на тоўстых дратах, як жоўта-залатыя талеркі, пад высокай столлю, і ад сцен, што адлівалі смалістай жаўцізною. А болей, бадай, ад таго, што яны, гэтыя ўчарашнія гарапашнікі, упершыню сабраліся на такое свята, такой вялікай сям'ёю, каб адзначыць сваю, можа, першую такую вялікую калектыўную радасць.

Сэрцы, перапоўненыя шчасцем, спявалі. Старанна, імпэтна націскаў на галасы Стась-«крывое калясо», заўзята, з прысвістам і задуменна-радаснай апантанасцю на твары біў у бубен Алёха Целяпей. Неяк сарамліва-ўтрапёна пазіралі на віхурны круг жанкі і кабеты, мабыць, зайздросцілі такім танцорам, як Сахвея і Параска, успамінаючы сваю маладосць. І мне стала сумна і неяк балюча ад таго, што заўтра чакае мяне развітанне, ростань з усім гэтым, такім дарагім для маёй душы.

Я не згледзеў, як у клуб са сваёй хеўрай нахапілася Моця, чарнабрывая дзяўчына-зух. З ёю не зраўняецца ні адзін хлопец, не кажучы пра тых, каго яшчэ ўзімку турылі з вечарын. Моця з мужчынскімі замашкамі, вострая на язык, смелая і рашучая — у вочы кожнаму рэжа праўду, працаўніца заўзятая і заядлая, але і дакорніца, якой не знойдзеш днём з агнём.

— Гэй, Стась, што ты там носам клюеш, заснуў, ці што?..

Паставіўшы рукі ў бокі, Моця выйшла на сярэдзіну ў круг, выкінула адну руку ўгару, шчоўкнула пальцамі, з гікам крыкнула:

— Ану, давай, Бацю, урэж нашу мікольскую!

— Барыню, барыню, Стась!..— закрычалі з парога дзяўчаты, таксама гаманкія, вясёлыя, бо, відаць, ідучы ў клуб, трохі абнашчыліся.

А Стась і дагэтуль не драмаў, выціскаў з гармоніка каскад гукаў, ад самых высокіх, тонкіх, да густых, басавітых — як кажуць, стараўся, аддаючы тут усё, на што быў здатны. А Моця лёгка, бы птушка, акурат чорная галка, у клёшнай спадніцы, падскоквала і ўсё выкідвала каленца за каленцам і, без перадыху, бы гарохам, сыпала прыпеўку за прыпеўкай. Спявала Моця па-заліхвацку і пра барыню, якой быццам сорак лет, і пра хлопцаў, што чыста мухаморы, нудныя, нікуды не вартыя, паспускалі галовы —

невядома, чаго б ім нявесела... Здавалася, упыну ёй, гарэзніцы, не будзе.

Стась стараўся. Ды, відаць, і Алёха са сваім бубнам паддаваў спруту. Маўкліва-засяроджаны, хлопец з гумарам, ён час ад часу падміргваў гарманісту, тады неяк непрыкметна шапнуў: «Цісні, Стась, пакуль Моця не выдыхнецца. Не здавайся, а я яе падгрэчу!..»

Моця як скеміла, што яе хочуць падкузьміць, прайшлася яшчэ колькі разоў у крузе ўпрысядкі, расчырванелая, і ўраз стала, нейкая як бы памаладзелая, запынілася ля гурту, што ўтварыўся воддаль, у прасценку, прыстукнула і дала паклон-запрашэнне Максіму Півоні, як не ўкленчваючы перад ім. Той збянтэжана пачаў адступаць, як не хавацца за спіны, але хлопцы пачалі падпіхваць яго да Моці, а тая аж задыхалася, але чарнявую галаву трымала высока, паблісквачы асалавела карымі вачамі. І ўсё прытопвала, прыгожа раскідваючы доўгія, як раскрыленыя, рукі.

— Давай, шахцёр! Што ўпіраешся? — чулася трошкі кплівае з гурту.— Пакажы нашым пінжачкам шахцёрскую ўхватку!..

Максім нехаця, як падалося, бытта з нейкай злосцю, вытыкнуўся з гурту, кінуў пад ногі струшчаны недакурак і, размінаючыся, як бы яму мулялі новыя, са скуранымі шнуркамі, бліскучыя чаравікі, спаквапя, лена прайшоўся рукамі па рыпучай папружцы, якою была перахоплена малінавая касаваротка, і хітнуў бялявым чубам...

Абцёршыся ўжо ў каторы раз змакрэлым рукавом рубашкі, Стась р'яна расцягнуў квацістыя мяхі гармоніка, Алёха ўдарыў злёгку ў бубен, забомкалі бразготкі, быцам сотня медзякоў, рассыпаліся, як не рэхам аддаліся па вуліцы.

Падбачэніўшыся, Максім пайшоў і пайшоў, выстукваючы падкаванымі абцасамі дробныя перастукі, хвацка прысядаючы і выпростваючыся, і тут жа знакамі запрасіў у круг Моцю. Яна не адмаўлялася,— ёй і той хвіліны, якую ўхапіла для перадыху, дастаткова, каб зноў быць бадзёрай і спрытнай. Яны доўга і са смакам скакалі ў пару. Моця спявала прыпеўкі і шахцёрскія — «Шахцёр у шахту спускаецца, з белым светам прашчаецца...», і свае, якія пачуеш хіба ў Бацькавічах, аж пакуль Стась, бедалага, не ўзмаліўся: «Ой, браточкі, я ўжо скапыціўся». Стась паставіў гармонік на лаўку і, пахітваючыся, як не вываліўся на ганак глытнуць свежага паветра, але хутка вярнуў-

ся. А Моця зноў закамандавала: «Стась, давай вальсок... «На сопках Маньчжурыі»!..»

І падхапіла, павяла ў круг светлавалосую дзяўчыну. Я яе адразу не пазнаў: за год змянілася Люська, стала, як нявеста, стройная, вабная, сінія вочкі-валошкі — так і страляюць навокал з-пад дугастых броваў, а паўнаватыя ружовыя губкі напаўраскрытыя, бы пафарбаваныя, гараць макам шчочкі. Тонкая рука Люські на моцным, крутым плячы Моці ляжыць быццам нежывая, а ўся Люська, гнуткая і парывістая, нячутна і лёгка ходзіць, бытта плыве на нябачных хвалях.

«Ну й Люська, якая ты стала, вылюднела,— знячэўку падумалася.— А яшчэ летась, калі мы неяк сустрэліся на мікольскай дарозе, то была цыбатае дзяўчо, чыста чапля, на тонкіх крываватых ножках, і спадніца на ёй матлялася, як на калку. Каб не Моця, гэтая ўяда, то льга было б запрасіць...»

І тут, як насланнё якое, ад купкі дзяўчат блізка ад парога у мой бок як не падляцела Хрысця і, цырымонна пакланіўшыся, гарэзліва прамовіла:

— Можна вас?..

Вядома, можна. Анягож! Хто з хлопцаў будзе супраць таго, каб пагуляць, пабыць у танцы з такой весялухай і красуняй, як наша Хрысця Слайморшчына. Яна выросла неяк незаўважна, не навідавоку, бо ў Ігліцу ў школу яна не хадзіла, як таварышкі Арына і Вулька; у кампаніі з намі не мясіла чунямі ды бахіламі праклятушчую ігліцкую гразь. Хрысця — сірата. Сама сабе гаспадыня, бо старэйшая сястра адышла замуж, і ў Хрысці яшчэ рупата — хворы стары бацька, які не здолее ўжо і хадзіць, не тое каб зарабіць які працадзень. Хрысця — увішніца, гаспадынька, некаму будзе ўпраўная жонка. Кожны, хто зойдзе ў Слайморшчыну святліцу, зірне на Хрысцініна вышыванне, на адбеленыя, вышытыя рамонкамі і пеўнікамі, набожнікі, то ўхвальна, шчыра ацэніць Хрысцініну здатнасць, упраўнасць.

Хрысця і сёння няхай не так багата апранута, як іншыя, як тая ж Люська-гардуніца, затое ў Хрысці — і кофта сваёй работы, вышытая, і андарак-саян усімі колерамі вясёлкі ззяе, свеціцца. Хрысця, квола трымаючы сваю цёплую руку на маім плечуку, ціха і ўсмешыста нешта шэпча мне на вуха:

— Алёшка, не глядзі так у той бок — вочы папсуеш,— і смяецца залівіста, з падколам. Вядома, гэта пра Люську.

Яна ведае, як нашы бацькі, мой і Люсьчын, Раман Зубец, жартам ці ўсур'ёз называюць адзін аднаго сватамі. Нічога благога не маю супраць Люські — яна, учарашняя чапля, вылюднела, але, далібог, з ёю зусім не цікава, а Хрысця думае, што я заглядаюся на яе, і ўсё тармошыць мяне: — Во, цюхцяй, не ўмееш быць за кавалера, на ногі мне наступаеш...

Пакуль мы з Хрысцяй танцавалі, яна ўсё гаманіла, шантала пра Люську. Я і сам бачыў, што яна вельмі ўжо нейкая фарсістая, задавака. Можа, ад таго, што бацькі ёй не шкадуюць, раскашэльваюцца на абновы; паліто новае з каўняром справілі, і яна таму гэтак высока задзірае нос.

— Алёшка, яшчэ што табе скажу,— Хрысця даверліва прыхінулася і сцішана прагаварыла: — Будзь асцярожны. Люська ж возіцца з етым, з шыбенікам Ягоркам, а ён, сам знаеш, які задзіра. Калі даведаецца, што ты да яе горнешся, можа даць табе. А Люська такая, што сама падстроіць ета, што бытта ты да яе ліпнеш... Ета набіць каб сабе цану...

— Якую цану? Што, Люська твая з глузду з'ехала? Мне яна і патрэбная, як леташні снег...

Ды сам неяк непрыкметна зірнуў туды, дзе лёгка, як на хвалях, у паўзмроку ад тытуню вальсіруе, вышакоміцца з Моцяй Люська. А ўводдалі, адставіўшы нагу, нешта выхваляецца ў кампаніі блазнюкоў-падлеткаў шыракатвары Ягорка Чмель. Некалі Ягорка набіваўся мне ў дружбакі, часта прыходзіў да нас у хату з рашатнёўскага канца. Пасля сямігодкі, як і я, ездзіў на іспыты ў педтэхнікум, але не прайшоў па конкурсу і цяпер з маладзейшымі цягаўся ў школу ў Ігліцу. Пры сустрэчах са мною трымаўся суха, стрымана і пры зручным выпадку, у кампаніі, стараўся падкалоць, высмеяць, а то і нацкаваць каго з хлопцаў. Маўляў, мы лапцюжнікі, вясковая шантрапа, а ён, выскачка, вучыцца ў горадзе, нам не роўня...

Собіла чамусьці, назло Ягорку, каб так не выпендрываўся і не пачуваў сябе тут такім князем, запрасіць Люську на польку. Ведаю, што скора аб'явяць,— гулянка ўжо зацягнулася, а полькай звычайна ў Бацькавічах заканчваюцца вечарыны і ігрышчы.

Да мяне неяк нечакана падышоў наш настаўнік, і мае планы не збыліся. Адчуўшы, што я нечага яшчэ вагаюся, Аляксей Мікалаевіч настояў: «Хадзем, браце, бо заўтра ж табе ў дарогу!» Аказваецца, ён уведаў, што Ягорка падбіў хлопцаў-калыгвузаў наладзіць мне на рас-

станне «пачастунак», і адвёў ад мяне тое, што, мабыць, рыхтаваў колішні аднасум.

Дома мяне чакала прыемная навіна — з Крыварожжа, ад Каці, нашае колішняе суседкі і маёй таварышкі, прыйшоў ліст. Каця пісала, што паступіла ў медыцынскі тэхнікум і збіралася ўлетку наведацца ў Бацькавічы, але ёй гэта не ўдалося. Магчыма, прыедзе як-небудзь на адведкі ў горад.

Востра варухнулася ў сэрцы тое, што ўжо быццам аціхла, пачало пакрысе забывацца.

10

На гарачых крылах лета праляцелі вакацыі. Мы цяпер жылі ўтрох: са мною пасяліліся Пятро Цімашонак і Іван Касцючык, вясковыя хлопцы з Кармяншчыны. Знайшлі мы сабе пакойчык у драўляным дамку, блізка ад тэхнікума па вуліцы Ліповай. Пазней яна стала называцца імем Пушкіна.

Зялёная зацішная вуліца. Уздоўж яе каля дамоў раскашаваліся высозныя, абшмараваныя пры камлі тры таполі, і ўжо з верасня ўсё навокал пярэсціцца ад таполевага зелянкавага лісця. У сонечныя дні, пасля заняткаў, сяктак паабедаўшы ў недалёкай фабрычнай сталоўцы, мы падоўгу гулялі па Ліповай вуліцы. Бывала, што дужаліся з гарадскімі хлопцамі, а іх на Ліповай было як насеяна. А іншы раз хадзілі з імі ў скверык, што пачынаўся тут жа, за канцавымі дамамі; забаўляліся, гушкаліся на арэлях.

Гэта было другое лета, якое мы жылі ў вёсцы як студэнты. І цяпер, вярнуўшыся ў сцены тэхнікума, дзяліліся ўспамінамі і не былі абыякавымі да тых клопатаў і спраў, якімі жылі і нашы бацькі, і ўсе вясковыя людзі.

Аднак цяпер усё тое як бы адышло на задні план, а нашу ўвагу забралі гарадскія праявы жыцця. У тую восень шмат гаварылі пра трацкістаў і бухарынцаў, якіх выкрывалі як ворагаў народа. Казалі, што і ў нашым горадзе раскрылі змоўшчыкаў-ворагаў, якія краліся ўзарваць электрастанцыю і хлебазавод.

Нам ніяк не верылася, што ў гэтым людскім патоку, які бясконца плыве ўвесь дзень на той жа Савецкай вуліцы, якая во за павароткаю, ходзіць беспакарана нейкі вораг-шпіён ці дыверсант.

— Ты вось не верыш? — перапыняе мяне Пятро, наш класны камсорг, і сцішана дадае: — А ў нас, у Клетным, казалі, прыехаў ветурач і прышчапіў каровам сібірскую язву. Яго адразу схапілі...

— Можа, гэта хлусня жывая? — не пагаджаецца з Пятром Іван Касцючык і неяк смешна круціць стрыжанай галавой.— Языкі ў людзей ёсць доўгія, каторыя любяць пагаварыць. Як той казаў, пасеяць паніку. Вось жа кажуць, што знаходзяць бітае шкло ў хлебе, а мы хлеб ядзім, і нічога, жываты нашы, выходзіць, і шкло пераціраюць...

— І ў нас, хлопцы, было такое,— кажу я ў тон Пятру.

— Хлусня? — перапыніў горача Пятро, набычыўшыся.— Не забывайцеся на тое, як вучыць нас таварыш Сталін, класавая барацьба абвастраецца, і вораг не спыняецца ні перад чым, каб шкодзіць нам...

— Я таксама гэта ведаю. Гісторыю партыі вывучаю.— Іван нервова пацёр пукаты, у зморшчынках лоб.

Іван самы здольны з нас матэматык. Пятро — гісторык, марыць аб дыпламатычнай школе. Я — пішу і друкую заметкі ў газетах. Мы ўсе штудыруем новы падручнік па гісторыі партыі, раздзелы якога друкаваліся ў «Правде».

Мы з Пятром хоць і шмат чыталі і цікавіліся бягучай палітыкай, але падзей аналізаваць, мабыць, не ўмелі, дужа не разважалі над тым, што чыталі і што чулі,— жыццё прымалі такім, якое яно было, не асэнсоўвалі як мае быць тое, што давалі выкладчыкі на ўроках і лекцыях. Мы старанна вучыліся і бралі ўсё на веру. Інакш і не магло быць, бо мы былі вучнямі і верылі глыбока нашым настаўнікам.

Іван быў на год, можа, на два, старэйшы за нас і на ўсе рэчы, якія нас узрушалі і хвалявалі і пра якія мы спрачаліся да хрыпаты, Іван, здавалася, глядзеў крыху іранічна і на ўсё меў сваё нешматслоўнае, але цвёрдае, неабвержнае меркаванне. Не разумеючы па сутнасці Івана, мы карысталіся сваім катэгарычным: «Так можа разважаць толькі балбатун і ратазей», а Іван дакорліва ўсміхаўся: «Па-вашаму, дык і між нас трох прытаіўся нехта...»

— Нідзе і нікому не шкодзіць мець пільнасць,— сказаў, як падалося, катэгарычна Пятро.

І, вядома, ніхто яму не пярэчыў, бо якраз кожны з нас і думаў гэтак — і ў сценах тэхнікума, на ўроках і лекцыях, на камсамольскіх сходах, у газетах і па радыё вельмі многа і сур'ёзна гаварылася аб пільнасці. Нават ва ўстано-

вах, ля службовага тэлефона, віселі шыльдачкі з папярэджаннем: «Цішэй размаўляй — вораг пачуе...»

Кватаравалі мы ў цырульніка Янкеля Кадзіна. Нашы вузкія жалезныя ложкі стаялі ў агульным, без перагародак, акурат сялянская хата, пакоі, дзе памяшчаліся і дзеці гаспадароў — Ёхім, школьнік, і рыжавалосая, як і яе маці — цётка Цыля, пяцігадовая гарэза Любка. Ложак гаспадароў знаходзіўся за перагародкай, на кухні.

Жылі Кадзіны бедна, але згода і памяркоўнасць памагалі ім адолець усе нягоды і нястачы. Нас дзівіў той аптымізм, якім валодалі гэтыя вясёлыя, жыццярадасныя людзі.

Аднойчы, калі мы прыйшлі з заняткаў, то засталі нашу добрую, заўсёды вясёлую цётку Цылю ў слязах. Буйныя, як не па гарошыне, слёзы цяклі па шчоках, і яна нават не выцірала іх.

— Што з вамі? — даволі громка, бо цётка Цыля недачувала, спытаў Пятро, калі мы, разгарачаныя, уляцелі ў пакой.— Чаго вы такая разнерваваная?

— Ой, ой! — наўзрыд залямантавала гаспадыня, прыкладаючы да зарумзанага твару ражок фартуха, з якім ніколі не расставалася.— Оё-ёй, хлопчыкі, няма нашага гаспадара... Ой, мой Янкель, як жа мы будзем жыць без цябе?..

— Ды раскажыце вы толкам, цётка, што здарылася? — дапытваліся ўсе мы, не ведаючы, як супакоіць нашу добрую гаспадыню.

Разгубленая і перапалоханая, яна адно безупынку войкала і божкала, не зважаючы, што ўжо не на жарт расплакаліся Ёхім і Любка.

Нічога толкам не дазнаўшыся, мы заняліся сваімі клопатамі. Іван пачаў паліць у грубцы, а мы з Пятром узяліся абіраць бульбу. Звычайна гаспадыня ставіла на пліту і свой, крыху большы, чыгунок бульбы для сваёй сям'і. Цяпер жа яна сядзела як скамянелая, рассыпаўшы па плячах доўгія вогненна-рыжыя кучары. Каля яе, бы кацяняты, шморгалі насамі Ёхім і Любка.

Ужо ўвечары, калі ў хату завітала суседка Шульманіха, цётка Цыля неяк трохі супакоілася і расказала, што Янкеля арыштавалі. Мабыць, нехта ўдаў, наплявузгаў, што нібыта Янкеляў бацька быў фабрыкант, меў сваю гарбарню.

— Ай, бедны Янкель! Што там з табою будзе,— наўзрыд плакала цётка Цыля.

— Што паробіш, што паробіш,— спачувала ёй Шуль-

маніха і супакойвала яе: — Як-небудзь абыдзецца. Не пакінем, як жа можна?..

Усё гэта нейкім чынам закранала і нас, юнакоў; чужое гора, але і яно не праходзіла міма бясследна, нейк западала і ў нашы душы, змушаючы перажываць і хвалявацца.

Мы так былі ўражаны нечаканасцю нахлынуўшай на нашых гаспадароў бяды, што нават перасталі спрачацца. Увесь вечар праседзелі сцішана, урокі нікому не лезлі ў галаву. А жыццё ішло сваім парадкам.

У нас замест Алены Пятроўны рускую мову і літаратуру пачаў выкладаць Павел Сідаравіч Крыніцкі, ужо немалады, з лысінай ледзь не да патыліцы, круглатвары, з мяккімі, як спалоханымі, вачамі. На ўроках часта бянтэжыўся, аж на лбе выступала раса, тады выціраўся хусцінкай, яму, відаць, каўнер белай рубашкі муляў шыю, і здавалася, што настаўнік губляецца, не ведае, што сказаць, адно плюскае вачамі, калі ў яго нехта спытае пра тое, што не тычыцца тэмы.

«Гэтае пытанне,— скажа, уздыхнуўшы ён,— не ў маёй кампетэнцыі. Давайце гаварыць па тэме».

Сёння, можна сказаць, знячэўку, ён выклікаў Пятра:

— Скажыце, студэнт Цімашонак, як вы разумееце галоўную ідэю паэмы Уладзіміра Маякоўскага «Ленін»?

Пятро, як заўсёды, падняўся жвава, звыкла паправіў акуляры, адкашляўся і пачаў фантазіраваць, даючы зразумець выкладчыку, што для яго гэтае пытанне — дробязь і ён мае веды куды большыя, чым патрабуецца ад студэнта, будучага настаўніка пачатковых класаў.

— Яшчэ вялікі французскі пісьменнік-раманіст Анарэ дэ Бальзак гаварыў,— бадзёра сыпаў Пятро і важна папраўляў з'ехаўшыя на нос акуляры,— вялікі геній другой паловы дзевятнаццатага стагоддзя выказваўся, як і належыць генію, геніяльна і напісаў сваю бессмяротную шматтомную эпапею «Чалавечая камедыя». Разам з тым, ён аддаваў выключную ўвагу ідэі як найвышэйшай форме мыслення, як праяўленню сваіх філасофска-эстэтычных і маральных ідэалаў...

І нечакана змоўк, як зніякавеў. Відавочна, раптоўна згубіў ніць думкі і разгублена пазіраў на выкладчыка. А выкладчык маўчаў, адно неяк вельмі ўважліва і засяроджана разглядаў пазногці на сваіх белых, заўсёды чыстых і, як нам здавалася, выпешчаных руках, яго блішчастая лысіна ўвачавідкі густа пакрывалася потам.

— Цімашонак, прашу бліжэй да тэмы,— надта ж ціха, як спачувальна, заўважыў ён, сцепануўшыся.

— Я яшчэ скажу,— паныла вымавіў Пятро. І яшчэ больш разгубіўся. Адно прывёў па памяці цытату з паэмы і закончыў свой адказ вядомым выслоўем аб тым, што Маякоўскі быў і застаецца лепшым паэтам савецкай эпохі.

Павел Сідаравіч ледзь прыкметна ўсміхнуўся, ціха вымавіў сваё любімае: «Честолюбие изящное», а тады выразна, чуваць было ўсім, сказаў:

— Сядайце. Пасрэдна... За храбрасць!..

Узвіхрыўся і сціх шумок. У гэты момант Касцючык, які сядзеў побач на парце, шапнуў: «Гэты наш новы русавед, напэўна, строгі ды яшчэ з гумарам...»

— Так, мабыць, строгі, прыцісне нас, бы тых жэўжыкаў,— адказаў я, затуліўшыся, каб застацца незаўважаным. Але мне гэта не ўдалося — Павел Сідаравіч узняў вялікую лысую галаву, усміхнуўся дакорліва:

— А вы, там, на трэцяй парце, малады чалавек, што цікавае расказваеце? — і ён паказаў рукою на нас з Касцючыкам, а той, стрымліваючыся ад недарэчна нахлынуўшага смеху, урупіўся ў канспект.

— Хто? Я? — тыцнуў сябе ў грудзі і вяртлява захітаў круглай, чыста рэпа, галавою Вася Слыш, які сядзеў перада мною, і з-за яго плячэй, абцягнутых шэрым картовым пінжачком, мне відаць была толькі бялявая, як адпаліраваная, лысіна настаўніка.— Я — нічога... Я слухаю...

— І вы, малады чалавек,— Павел Сідаравіч не прыняў угодлівасці Слыша, яго непрыкрытага выслужвання і падхалімства.— Як вас велічаюць?..

— Я...— аж разгубіўся Вася-падліза перад насмешліва-калючым позіркам настаўніка.— Слыш — маё прозвішча...

— Дык вось, малады чалавек, даю і вам заўвагу! — Павел Сідаравіч пабарабаніў пальцамі па класным журнале, які пагрозліва разлёгся на стале.— А вам,— настаўнік паглядзеў журнал, прабег вачамі па слупку прозвішчаў,— таварыш Баянок, таксама заўвага!..

— За што? — безразважна вымавіў я і адчуў, як апякло ўвесь, аж да вушэй, твар раптоўнай гарачынёю, стала неяк соромна.

— А вы і не ведаеце? — Павел Сідаравіч хітра ўсміхнуўся, асабліва з'едліва блішчалі яго карыя вочкі.— Маладыя людзі, вы ўжо дарослыя. Добра і смела крытыкуеце на сходах сваіх настаўнікаў, то будзьце ласкавы і самі

трымайце сябе, як належыць людзям дарослым. Вы ведаеце, я кажу пра ўрокі. На маіх уроках я не дапушчу, каб вы займаліся хто чым уздумае. Я прывык працаваць, давайце ўмовімся, пры поўнай цішыні...

— Каб чутно было, як муха праляціць,— кінуў нехта з «камчаткі»,— так мы, трэцякурснікі, ахрысцілі апошнія парты.

— Хто гэта там такі смелы? — строга, але, па вачах бачна, не злосна запытаўся настаўнік. Вядома, ніхто не азваўся, і настаўнік працягваў, трымаючы ў руках тоўсты сшытак у зелянковых цвёрдых лубках: — Што ж?.. Пагаварылі і пойдзем далей. Не забывайцеся, сябры, пра адно — хутка, вельмі хутка пройдзе гэты ваш апошні год вучобы, і вы самі станеце гэтак, як і я цяпер перад вамі, на гэтае лобнае месца. І тады, можа, сёе-тое ўспомніце, прыгадаеце з таго, што мы вам, як настаўнікі, аддавалі і аддаём усё, што мелі самі, усё, без астатку...

Павел Сідаравіч памаўчаў, нахмурыўшыся, і, падалося, вочы яго, глыбокія, строгія, пад калматымі кусцістымі брывамі як пацямнелі ці павільгатнелі; з шырокага вулічнага акна па шкле слізгануў цёплы праменьчык і ўмомант як памаладзіў адухоўлена-задуменны твар настаўніка, лагодным зайчыкам заскакаў па тварах. Усе раптоўна прыціхлі, як усё адно адчулі нейкую сваю віну і перад ім, новым настаўнікам, які, напэўна, не менш за ўсіх нас перажываў ад таго, што мы страцілі сваю любімую настаўніцу, і перад ёю, якая для нас усіх не шкадавала сябе. Відаць, разумеючы ўсё гэта, Павел Сідаравіч стараўся супакоіць нас і зменшыць наш боль.

— Запішыце, сябры, новую тэму,— і Павел Сідаравіч, супакоіўшыся, разгарнуў тоўсты сшытак-канспект.

Расказваючы, ён непрыкметна назіраў, каб усе паспявалі запісаць за ім — мы тады канспектавалі ўсё і па літаратуры, і па мове, бо падручнікаў не хапала, а па тэорыі літаратуры зусім не было ніякага.

Пятро сядзеў на трэцяй парце у сярэднім радзе — і мне добра відно, як ён, схіліўшыся, пісаў, стараўся паспець за настаўнікам; канечне ж, і да яго дайшло, што яму не будзе такой палёгкі, якую меў ад Алены Пятроўны,— яна хваліла яго заўсёды і ягоную эрудыцыю ставіла ў прыклад усім. Пятро сапраўды часта здзіўляў усіх самастойнымі, аргументаванымі адказамі.

Да канца ўрока, мабыць, заставалася хвілін дзесяць,

і ўсе рупна шчыравалі, схіліўшыся над сшыткамі і блакнотамі, як раптоўна з «камчаткі» пачулася:

— Павел Сідаравіч, дазвольце выйсці!..

Настаўнік адарваўся ад канспекта, няўцямна паглядзеў у той бок і строга насупіўся: светлавалосы шчуплы хлапчук у велікаватым, як навыраст, картовым пінжачку высока выцягнуў руку, аж прыўзняўся з-за парты — усе наструніліся, здзіўлена паднялі галовы.

— Ну, што там у вас, Апанасік? — Павел Сідаравіч ужо ведаў прозвішчы многіх — ён хутка запамінаў навучэнцаў у твар.

— Дазвольце выйсці,— скрывіўшыся, паўтарыў Апанасік, страшэнны жартаўнік і шалапутнік.

— Пачакай. Скора ўжо званок,— як здагадаўшыся, што ў хлопца няма нічога сур'ёзнага, сказаў настаўнік і працягваў дыктаваць.

Апанасік балюча зморшчыўся і сядзеў надзьмуты, як верабей, адсунуўшы сшытак-канспект на самы край парты. Пацепваючыся і круцячыся, ён налучыў момант, калі настаўнік зрабіў паўзу, зноў узняў руку, але ўжо не гэтак, як у першы раз, а з нейкай неглыбока прыхаванай іроніяй:

— Сідар Паўлавіч, дазвольце ж!..

Усіх як бы ўзбурыла віхрам. Хлопцы і нават старанніцы дзяўчаты зарагаталі. Выбух смеху быў такі нечаканы і моцны, што, мабыць, быў чуцён і на калідоры, бо інакш чаго ў дзвярах з'явіўся сам дырэктар Міхаіл Максімавіч і, трымаючыся за шчаку, яму, можа, балелі зубы, спалохана адчыніў дзверы:

— Што здарылася, Павел Сідаравіч?!

Настаўнік, як бачна, не разгубіўся, спакойна і нават з гумарам растлумачыў дырэктару:

— Нічога сур'ёзнага, Міхаіл Максімавіч. Адзін наш будучы педагог, звяртаючыся да свайго новага калегі, значыцца, да мяне, пераблытаў маё імя і імя па бацьку... І ўсё...

— Нішто сабе,— ніякавата паціснуў плечуком дырэктар,— за такія жарты трэба з класа турыць!..

Павел Сідаравіч іранічна насупіўся. Усе чакалі, што Лёню Апанасіку выпадзе прачуханка, але адчулі, што пранясло, і з палёгкай уздыхнулі. А ён, уяда і гарэзнік, сядзеў сабе спакойны і недаступны, быццам егіпецкі фараон на троне, і толькі зіркаў на ўсіх сінімі, насмешліва-лагоднымі вачанятамі. Здавалася, ягоны позірк гаварыў: «Што

я благога зрабіў, дзівакі? Проста я пажартаваў, а вы ўжо і ўз'ерапеніліся...»

Урок закончыўся без асаблівых прыгод. Нікому з нас, нават Апанасіку, не ўляцела ні ад настаўніка, ні ад дырэктара, які таксама яшчэ, мусіць, не дужа звыкся з новай пасадай пасля нядаўняй смерці папярэдніка, педагога з вядомым прозвішчам — Серафімовіч.

Мы, студэнты, лічылі сябе без тыдня, як гаворыцца, настаўнікамі. Але дзіцячае, юнацкае праглядалася ў нашых паводзінах часта, ледзь не на кожным кроку. Не абыходзілася ў нас і без таго, каб там, дзе гэта ўдавалася, у каго з выкладчыкаў знайсці абы-якую слабінку, «ахілесаву пяту» ў характары, не ўпусціць моманту і жарцік які падпусціць на ўроку ці на практыцы, бо з другога курса ў нас ужо была практыка ў школе. Бавала, іншы раз з урока сарвецца хто, калі стараста-службіст Рыгор Кісель не выдасць і не паставіць у класным журнале «нб». Хватала дурасці і сваволля на перапынках. Часта і недаравальна назалялі, асабліва хлопцы, нашаму добраму і незлапамятнаму Якаву Рыгоравічу, выкладчыку спеваў і музыкі. Якаў Рыгоравіч стараўся з усіх сіл для нас, каб мы, шалапуты, наўчыліся чытаць ноты, хоць сяк-так адолелі ігру на піяніна і скрыпцы, а мы, байбусы, і не здагадваліся тады, як усё тое ўсім нам спатрэбіцца, калі праз які год раз'едземся па розных кутках і самі пакаштуем настаўніцкага хлеба.

Канечне ж, навучэнцы і не падумалі, што было на сэрцы ў выкладчыка — пажылога дзядзькі з пасярэбранымі скронямі і дабрадушным, усмешлівым тварам, на якім за шкельцамі акуляраў заўсёды ўсміхаліся блізарукія вочы, калі на ўроку спеваў усе, як згаварыўшыся, замест слоў: «Наш напев и могуч и суров...» цягнулі з гарэзлівасцю: «Яшка Пеўзнер магуч і суроў...». Але Якаў Рыгоравіч усміхаўся. У такт спакойна памахваў смычком, якім карыстаўся замест дырыжорскай палачкі. І, верыцца, не крыўдаваў, ніколькі не ўзбураўся, бо разумеў: мы для яго — яшчэ дзеці.

Вельмі жыва і натуральна праходзілі ўрокі беларускай мовы, літаратуры, а таксама методыкі мовы. Нашага беларусаведа Алеся Астапавіча Зайкоўскага любілі, бадай, усе непадробнай, шчырай любоўю. На першы погляд спакайняка і флегматык, Алесь Астапавіч, ужо мужчына ў гадах, быў надзіва таленавіты педагог, спалучаючы ў сабе настаўніка і выхавацеля. Ён добра ведаў і любіў свой

прадмет, амаль не карыстаўся канспектамі. І кожнага навучэнца, як кажуць, ведаў навылёт — для яго, умудронага жыццём, мы ўсе былі як на далоні.

Скажам, прынясе Алесь Астапавіч нашы сачыненні, а іх нам давалі багата і па праграме, і на вольныя тэмы, пачне раздаваць іх, тэпаючы між радамі партаў, і хітрушчымі вачамі цікуе, як хто рэагуе на аб'яўленую адзнаку. Вось ён кладзе сшытак перад Пятром, хлопцам занадта самалюбівым, які кожную няўдачу перажывае балюча і, як баец на полі бою, змагаецца за кожную адзнаку, а да сачынення ён не дужа здатны. І зрок у Пятра неважнецкі — хлопец носіць акуляры і часам прапусціць якую літару, коску паставіць не там, дзе трэба, і ў выніку — чацвёрка ці, бывае, і тройка. Але Пятро не здаецца, ён сапе, чмыхае, нервуецца, тады, нарэшце, устае з месца.

— Аляксандр Астапавіч,— кажа ён, зачырванеўшыся, быццам печаны рак,— я ж, здаецца, усё напісаў, асвятліў тэму ўсебакова, згодна з вашай лекцыяй. А чаму мне чацвёрка?..

— Гэта ты, браце, спытай у Касцючыка,— адказвае Алесь Астапавіч і хітра, нават з'едліва, усміхаецца: — У цябе, Іване, што там, які маеш заробак?..

Касцючык падымаецца, заікаючыся, адказвае:

— У мяне... тройка...

— Вось бачыш,— настаўнік хмурыцца, тады нязлосна жартуе: — А трэба, каб было наадварот, бо той, хто дае спісваць свайму суседу, заслугоўвае большай ганьбы, і яму трэба зніжаць за гэта ацэнку...

— Дык я ж не спісваў, Аляксандр Астапавіч,— чырванее Касцючык і, нечага як пакрыўджаны, бубніць нешта сабе.

— А вы як думаеце, Бутрымава, спісаў Іван у Пятра сачыненне ці не? — Алесь Астапавіч як стомлена, паволына шкрэбае да стала, садзіцца на сваё месца і, падпёршы мяккай рукою рыхлаваты, у вясёлых зморшчынках ля вачэй і вакол рота твар, маўчыць — чакае адказу.

Марыля Бутрымава, ціхманая, заўсёды ахайная, прамыя бялявыя валасы зачасаны на прабор, на круглявым, заўсягды засяроджаным твары цёплая ўсмешка ў самых кутках прыпухлых вуснаў, паднялася, ледзь прыкметна стукнула вечкам парты — стаіць сумеўшыся. Не ведае, што адказаць. У Алеся Астапавіча бывае такое часта: не адразу разгадаеш, чаго ён ад цябе хоча, куды скіруе сваім такім нечаканым пытаннем, якое запхае цябе ў тупік.

— Мабыць, што Касцючык на такое не здатны,— нарэшце нясмела вымаўляе Марыля і так жа нясмела садзіцца, не дачакаўшыся дазволу.

— Я з вамі згодзен, хлопец ён сур'ёзны,— адпускаецца Алесь Астапавіч і тады зноў за сваё: — А скажыце, чаму сачыненні Івана і Пятра падобны, як блізняты?..

— Дык яны ж разам жывуць, на адной кватэры,— хіхікае ў кулак Вася Слыш — ён усё намерваўся, як бы гэта і яму ўтыкнуцца ў размову.

— А-а-а, тады зразумела,— жартаўліва працягнуў Алесь Астапавіч і хітра падміргнуў у мой бок. Я ўжо добра-такі перахваляваўся, бо мой сшытак усё яшчэ ляжаў на стале. — Цяпер паглядзім, што напісаў наш селькор. Я думаю, пачытаем яго пісаніну...

Стала адразу неяк не па сабе. Чырвань, адчуваю, заліла ўсяго, аж да каранёў валасоў. І ў той жа час было прыемна, нешта салодкае шавяльнулася ў грудзях. Сачыненне пісалі на вольную тэму. «Чаму мне падабаецца настаўніцкая прафесія?» — такую выбраў я сабе тэму і пісаў яе, як выявілася, адзін, і гэта дадавала мне славы ў сваіх вачах.

Сачыненне чытаў Алесь Астапавіч. Асаблівых заўваг ён не зрабіў, але зазначыў, што можна было б даць некаторыя абагульненні, але сказаў, што ўвогуле атрымалася няблага. Ацэнка двайная: за літаратурнае ізлажэнне — «выдатна», а па мове — «добра».

Калі чыталася гэта сачыненне, я, прызнацца, быў на сёмым небе і, забыўшыся на тое, што мне ўжо не раз давалі заўвагі і настаўнікі, і з мяне смяяліся хлопцы і нават пісалі пра гэта на дошцы, я ўсё ж не стрымаўся, кінуў колькі ўкрадлівых позіркаў у бок яе, Марылі. Яна сядзела ў трэцім радзе, на пярэдняй парце, ля глухой сцяны, і мне, каб убачыць яе праз два рады партаў, трэба было касіць вачамі, і гэта стала для мяне такой неабходнасцю, што я не мог нічога з сабою зрабіць.

Усё тое пачалося з першага дня, калі нас пасля прыёмных экзаменаў размеркавалі па групах. Нас размясцілі ў кутнім пакоі на другім паверсе — вокны на шумлівую вуліцу. Мне выпала светлае месца, з сонечнага боку, на другой парце леваруч. Маім суседам стаў Касцючык. Здаецца, першым быў урок рускай мовы. Выкладчыца Алена Пятроўна Руцкая, танклявая, станістая, у сіняй, аж ляпіла ўваччу, сукенцы, вакол шыі беласнежны каўнерык, пышныя, высока ўзбітыя кучаравыя валасы над вялікім

ілбом,— расказвала нам, вясковым хлопцам, пра рускую мову, прыводзіла тую цытату Ламаносава, дзе пералічваліся славутыя мовы свету і іх адметныя якасці, і пра месца, якое між мовамі свету займае вялікая руская мова. Я, канечне, гэтага выказвання не чуў ад сваіх вясковых настаўнікаў і быў узрушаны бязмежна.

Неяк павярнуў галаву ўбок налева і вачамі сустрэўся з круглатварай дзяўчынай. Яна сядзела амаль у самым кутку глухой, да калідора, сцяны, на перадапошняй парце, падпёршы белым кулачком бледнаваты тварык, на якім бы знерухомелі вялікія, як не па яблыку, шэрыя вочы, а ў самых куточках паўнаватых вуснаў стаілася ўсмешка. Як глянуў я тады ў тыя вялікія, стоена-сцярожлівыя шэрыя вочы, так і застыў, бытта адурманены нейкімі чарамі. Спахапіўшыся, я стараўся не глядзець у той бок, дзе яна сядзела, прымушаў сябе адарвацца, засяродзіцца на нечым іншым, але яна стаяла перад вачамі. Падалося, і дзяўчыну зачапіла нешта, бытта ўнікала свайго позірку, ніякавата хмурылася, як зварухнуліся яе сакоўныя вусны, але яна спахапілася, адвяла, а мо нават схавала вочы.

Марыля аказалася стараннай у вучобе. Заўсёды рабіла па ўсіх прадметах канспекты — почырк у яе здзіўляюча акуратны і прыгожы, бадай, ці не лепшы з усіх нашых дзяўчат. Вакол яе заўсёды сяброўкі, хоць яна была залішне ціхая і сарамлівая.

Мы хутка ўсе перазнаёміліся і ўжо ведалі адзін пра аднаго: адкуль, што цікавіць, чым захапляецца. Дзяўчаты нашы былі пераважна з вёсак, запісаліся ў хор. Сюды ж трапілі і мы з Пятром і Касцючыкам.

Месц у інтэрнаце не хапала, і хлопцы ўладкаваліся на прыватных кватэрах. З нашае групы ў інтэрнаце атрымалі месцы толькі некаторыя дзяўчаты. У іх ліку і Марыля. У яе, аказваецца, не было бацькоў, яна жыла на ўтрыманні старэйшай сястры — вясковай настаўніцы — і пасля сямігодкі паступіла ў педтэхнікум. Напэўна ж, як і ўсе мы, выбрала спецыяльнасць па сваім жаданні, як таго прасіла сэрца.

У маёй душы, мабыць, пасялілася нешта дагэтуль не спазнанае, нешта такое, што выбіла мяне з прывычнай каляіны; расла нейкая няясная трывога, якая вірыла ў грудзях, як уздымала ўсё адно і кідала ў бездань. Каб неяк супакоіцца, я стараўся ўвесь свой вольны час аддаць корпанню ў кнігах. Пасля заняткаў спяшаўся ў бібліятэку, хадзіў на спеўкі ў хор, але нічым не мог заглушыць

у сабе тое нешта, што вярэдзіла, як не пераварочвала ўсяго, пазбавіўшы спакою.

Балюча рабілася ад таго, што гэтая мая сардэчная тайна вельмі хутка раскрылася. А гэта была іменна тайна, бо я нават сабе баяўся прызнацца, што гэтая спакойна-задумлівая дзяўчына ў карычневай сукенцы з белым, як сняжок-зазімак, каўнерыкам, які так хораша пасаваў і аздабляў яе, пазбавіла мяне спакою.

Аднойчы на перапынку не хто іншы, а іменна Вася Слыш, гэты даўгалыгі праныра, незаўважна, але я адразу ж злавіў яго, на дошцы крэмзаў: «Алёшка + Маша = любоў». Я быў узбурыўся да яго з кулакамі, але дзе там — Слыш стаяў, распасцёршы рукі, вядома ж, такі боўдзіла, што я мусіў адступіцца, хоць і ляцеў да яго коршакам. Канечне, з мяне смяяліся. А Марыля, падалося, на гэта зусім не рэагавала, толькі яшчэ болей як замкнулася ў сабе — мабыць, і не адчувала, што сваёй такой абыякавасцю абражала мае пачуцці. Я крадком назіраў за ёй і не мог узяць у галаву, даўмецца, што ж у яе на сэрцы, як яна адносіцца да ўсяго таго, што тварылася са мною. Я гарэў у агні сораму, часамі ўсё смылела ўсярэдзіне, я гатоў быў усходацца на кожнага, хто спрабаваў пасміхацца з мяне, а яна маўчала, як зацятая ці знямелая. І здавалася, была зусім спакойная — усім сваім спакоем, нават раўнадушнасцю як бы казала: «Ну што вы прычапіліся? Хіба вы не бачыце, што між намі нічога такога, на што вы намякаеце, няма і быць не можа. Гэта ўсё простыя выдумкі, напрасніна!..»

Доўга, ледзь не ўвесь першы год, я не асмельваўся нават падысці да Марылі, як робяць гэта вельмі проста той жа Слыш ці мой сусед па парце Касцючык, калі спатрэбіцца нешта спісаць у дзяўчат ці перамовіцца, параіцца, бо яны былі больш акуратныя, спраўна рабілі ўсе заданні, здавалася, я быў не такі ўжо баязлівы ці сарамлівы, проста вельмі не хацеў, каб на мяне глядзелі як на дзівака, з якога можна пакпіць і насмяяцца.

Аднак чым далей, тым болей у мяне выспявала жаданне загаварыць і пабыць у кампаніі дзяўчат, з якімі хадзіла Марыля. У інтэрнаце жылі ўжо, калі мы вучыліся на другім курсе, і Аня Гараськіна, і Маша Бандарык, і Вера Кроцікава, і Гэля Шубянок. Нашы хлопцы з імі таварышавалі: хадзілі па шумлівай Савецкай, гулялі ў парку, але ніколі не выпадала так, каб мы з Марыляй засталіся ўдваіх і я змог з ёю пагаварыць, выказаць ёй тое,

што было на душы. Стрымлівала, можа, і тое, што я апранаўся занадта сціпла: картовы пінжачок, просценькая сацінетавая рубашка, штаны з чорнай таннай матэрыі, каратковатыя, з калашын выторквалiся шкарпэткі, а чаравікі з разяўленымі насамі. Бяды мне было з валасамі, яны нейкія шорсткія, як не драцяныя, бялявымі віхрамі тапырыліся над ілбом з раннімі залысінамі, а ў дадатак яшчэ ў маленстве я перахварэў на воспу, і на драбнаватым твары ляпіліся драпіны, з якімі мне было хоць не жыві на свеце. Хіба мог я лічыць сябе роўняй да Марылі? Я не злаваў на яе, прыгожую і выдатніцу,— яна мела поўнае права мяне не заўважаць і зусім не адказваць на мае пачуцці... Мне было добра і таго, што я, забыўшыся на ўсё, на кпіны і падколванні, мог глядзець на Марылю, мець асалоду ад таго, што бачыў яе мілы, чароўны тварык...

Узважваючы ўсё, я разумеў, чаму Марыля зусім абыякавая да мяне, нават больш таго, рабіла выгляд, што я для яе як бы зусім не існую. І ў той жа час згараў ад пакут, якія распальваліся ва мне пякельным агнём. Сам не ведаючы, ад чаго, але мне хацелася нечым выдзеліцца з гурту, у маёй галаве нараджаліся фантастычныя планы і задумы; я рваўся зрабіць нешта такое, што, думалася, узвысіць мяне ў вачах Марылі. Падсвядома стараўся, каб яна звярнула на мяне ўвагу, ну, кінула хоць бы адзін цёплы позірк, падаравала хоць бы ўсмешку... Пакуль жа меў адно — халодную абыякавасць. Іншыя дзяўчаты даволі прыязна ставіліся і да мяне, хоць у групе былі хлопцы-зухі. Каго ні вазьмі — таго ж Пятра, альбо Івана Галіцкага, ці Уладзіка Міхейкіна, Рыгора Раднянка... А Вася Слыш і Янка Кабяк — усе яны, канечне ж, заглядваліся на дзяўчат, хоць у іх гэта было шыта-крыта, яны ўмелі схаваць свае заляцанні. А можа, мне так толькі здавалася? А сам я? Сябе, выходзіць, не браў у залік...

Лета, пражытае ў вёсцы, як бы крыху прыглушала маю скруху, але цяпер, убачыўшы Марылю, яшчэ больш хваляваўся і жыў надзеяй на ўзаемнасць. Як быццам промень надзеі бліснуў мне. Нейкім падсвядомым чуццём я ўлоўліваў у яе вачах нешта для мяне новае, штосьці такое, што пасяляла надзею і грэла радасцю сэрца. Але ж я ўжо недзе чытаў, што вочы — падманлівая маска: сцеражыцеся дзявочых вачэй.

Во цяпер, калі Алесь Астапавіч раздаваў нам гэтыя сачыненні, то, мабыць, невыпадкова падняў з месца Марылю, здагадваўся стары хітрун, што ў мяне тварылася на

сэрцы. У той момант я цішком, як бы незнарок, скасіў вачамі ў той бок, на крайні рад. Марыля не схавала, як некалі, вачэй; аднымі краёчкамі прыпухлых вуснаў ледзь-ледзь, гэта, мусіць, прыкмеціў толькі я, усміхнулася. А можа, у думках і прамовіла: «Я радая за цябе, Алёша...» Радасцю поўнілася сэрца...

Заняткі скончаны. З высокіх філёнкавых дзвярэй будынка, якія адчыняліся проста на тратуар, выплеснулася шумлівая талака. Умомант растварылася ў вірлівым натоўпе. Ля павароткі на Ліповую нас з Касцючыкам дагнаў задыханы і, як заўсёды, мітуслівы Пятро. З ходу агарошыў мяне:

— Ну, Алёшка, закахаўся ты, браце, у гэтую Бутрымаву! Уліп па вушы!

— Ат, Пятруха, не плявузгай абы-што! — абарваў яго Касцючык.

Мне ж не хацелася кідацца ў спрэчку з Пятром, бо і так яму сёння дасталася. Ды і што ў гэты момант значылі ягоныя кпіны ў параўнанні з тым, што адчула сэрца — яно як спявала...

Гэта ішоў, набіраючы разгону на апошніх перавалах да фінішу, новы навучальны год, трэці год нашага студэнцкага жыцця.

11

Дні цягнуліся як бы марудліва. Але незаўважна набліжаліся зімовыя канікулы. Я збіраўся дадому, але атрымаў ад бацькоў пісьмо. А неўзабаве і абяцаныя трыццаць рублёў і пасылку. Бацька намякаў, каб я па такой стыні ў дарогу не кратаўся, а маразы прасядзеў у цяпле. Мне, канечне, хацелася дамоў. Я жыву ўжо колькі ў горадзе, а ніяк не магу звыкнуцца з гарадскім жыццём. Ды яшчэ калі ўзяць пад увагу наша бедалажнае існаванне. На стыпендыю яшчэ першае паўмесяца можна так-сяк трываць, а пад канец настае такое жыццё, што ўцягвае жывот, студэнцкая яда — хлеб ды вада.

На тую трыццатку я купіў сабе на рынку трохі падношаныя, але ўвогуле прыстойныя чаравікі; да астачы дадаў свой набытак, які займеў за свае допісы ў газеце, і агараў новы сіні світарок — гэта была мая мара яшчэ з сямігодкі,— я вельмі зайздросціў хлопцам, у каго мелася такая апратка.

Я трохі, як кажуць, прыадзеўся і аж пасмялеў, як па-

збыўся трохі той сарамлівасці, якая мучыла мяне неадступна ўсюды, асабліва ў кампаніі, на людзях.

Атрымалі чарговую стыпендыю і як нанава нарадзіліся. Староста групы Рыгор Кісель прапанаваў пайсці ў гарадскі тэатр на спектакль. Якраз тады ішла п'еса В. Гусева «Слава». Я не збіраўся ў тэатр, бо ўжо бачыў гэты спектакль, але Касцючык, гэты настыра, угаварыў:

— Не адмаўляйся. Пойдзем. Я і табе білет узяў...

Я быў упіраўся, аднекваўся, але Касцючык шапярнуў: «Глядзі, бо праваронім дзяўчыну».

— Якую дзяўчыну? — пакрыўдзіўся быў я.— Пустамалот! Што ты мелеш?..

— Ну, браце, не прыкідвайся,— рашуча перапыніў мяне Касцючык.— Усе ведаюць, нават настаўнікі, што ты прыкіпеў да Марылькі, сохнеш па ёй, марнееш, як сам не свой...

— Няхай ведаюць, бяды мне такой,— адпіраюся я, а сам прыкідваю: «Сапраўды, каб пайсці... Дзяўчаты ж амаль усе згадзіліся на гэты паход. Цікава, а як Марыля, ці пойдзе яна?..»

Касцючык як адгадаў мае думкі, таямніча паведаміў:

— Марыля пойдзе. І з ёю будзе Гертруда. Я скажу Кісялю, каб даў нам білеты з імі ў адным радзе.

— Во яшчэ чаго не хапала,— прытворна кажу я, але ў душы радуюся: Касцючык надумаў гэтакі ход, бо, відаць, хацеў шчыра мне памагчы. А можа, заадно і сабе — ён жа апошнім часам усё падсаджваецца да Ані і Гертруды. На гэта, папраўдзе, ён мае прычыну. У дзяўчат не ладзіцца з трыганаметрыяй, і выкладчык матэматыкі Іларый Мікалаевіч дамацаваў Касцючыка да іх, і той ахвотна ўзяўся дапамагаць. «Нічога сабе,— падумалася,— шэфская дапамога... Гэта, напэўна ж, усё любошчы?..»

— Што ж, Іване, дзейнічай!..

Я цешыў сябе думкай, што мне, нарэшце, удасца пагаварыць шчыра з Марыляй, бо пакуль што пабыць з ёю ў кампаніі не ўдалося. Тым больш што на занятках Марыля стала зусім непрыступнай — проста мяне не заўважала. На ўсе спробы загаварыць з ёю яна адказвала халодным маўчаннем.

А Івана проста абышлі самым ганебным чынам. Вася Слыш, гэты спрытнюга і бабскі хвост, як мы яго і ў вочы называлі, паспеў ужо дамовіцца з Кісялём, і той узяў білеты сабе і Слышу з дзяўчатамі, у партэры, а мы з Іва-

нам трапілі на галёрку. Адзін Пятро ўкленчыў сабе месца з Аняй. І пасмейваўся пасля з нас.

— Нічога, Алёшка, не бядуй,— супакоілі мяне сябры.— Гэта, можа, яшчэ к лепшаму. Як той казаў, гэта праверка сапраўдных пачуццяў. Калі яны — ведаеш, пра каго я кажу,— не віляхвосткі, то ўсё зразумеюць...

Як аказалася, спектакль стаў сапраўды праверкай пачуццяў. Але чыіх? Мне ўсё было бачна з галёркі, як Слыш увіхаўся ля Марылі, і што мяне ўзбурыла, дык гэта тое, што яна, Марыля, была вясёлая, жартавала, нахілялася да Слыша, усміхалася яму. Вядома, на сцэну я амаль не глядзеў, усё, што там рабілася, ішло міма вушэй. Я, небарака, пакутаваў — не мог дачакацца, пакуль скончыцца першая дзея. Іване, мой зычлівец, паспрабаваў быў мяне супакоіць, ды дзе там! Адчуў, што гэта яму не ўдаецца, пакінуў мяне ў спакоі. Разумны хлопец, як я яму ўдзячны быў пасля!

А хлопцы, відаць, як згаварыўшыся, наважылі яшчэ падліць масла ў агонь. У антракце Гертруда шапнула Івану, што ён можа перасесці на месца Ані, бо ёй нешта нядобрыцца, разбалелася галава, і яе праводзіць вызваўся Цішка Кабяк. Во табе і Ціхан, а быў жа на першым курсе цюхцяй і спакайняк!

— Што ж, браце, мацуйся,— вінавата ўсміхнуўся Касцючык,— пайду хіба і я на Алімп!..

Заставалася адно — пацягнуцца дамоў, каб не быць сведкам сваёй ганьбы. Неяк усё ж я застаўся на галёрцы. Карцела ўбачыць, што ж будзе ў Слыша з Марыляй. Усё ён, уяда, нешта нашэптваў ёй, а яна, пэўна ж, слухае, не адмахваецца. Тут жа спектакль, а ён, канечне, перашкаджае дзяўчыне нейкімі сваімі байкамі. Здаецца, і ёй ужо гэта ўсё надакучыла — бо яна адвярнулася. Марыля вельмі любіць тэатр — я гэта добра ведаю.

Нарэшце спектакль скончыўся, і ўсе рушылі ў фае. Я стаў воддаль, не спяшаўся. У мяне такое паліто, што лепш не вытыркацца. Страхоцце, а не паліто. Яго мне гэтым летам змудраваў вясковы кравец Зміцер з Чыграёў, далёкая наша радня. Паліто пашылі з коўдры, якая засталася ад бацькавых паездак у шахты. Не кажучы ўжо, як яно было пашыта, але і колерам нецікавае, бо быў нейкі цагляна-жоўты колер, які аж рэзаў вочы, і я пакутаваў, калі паказваўся дзе ў сваёй гэтай апранасе. Але нічога не папішаш — холад, як і голад, кажуць, не цётка, апранеш

і не такое. Я, затуліўшыся за калону, чакаў, пакуль схлыне натоўп.

Гляджу, і Слыш дыбае, спяшаецца да вешалкі, прэ, як на злом галавы, не бачачы перад сабой нікога — стараецца, пракуда, дагадзіць дзяўчыне. Тады, бачу, і яна тутака, спакойна-велічная, з прыхаванай таемнай усмешкай (усё ж — красуня, як ні кажыце!), і дзяўчаты талакою, і Касцючык мой шкрабецца з імі, і Пятро, шчаслівец, падтрымлівае пад руку Аню-смугляначку, мы яе гэтак называлі за бліскучыя цыганскія вочы і густую смуглявасць твару. І ўсе, уся наша група, стоўпіліся. Я, ціханька сціснуўшыся, затуліўся — мне цяпер не выпадала вытыркацца.

Касцючык азірнуўся навокал і вельмі гучна, як знарок, гукнуў:

— Чуеце, сябры, а дзе ж наш Алёшка? Няўжо даў дзёру... Што гэта з ім, чуйце?..

Марыля раптам паружавела, ніякавата, як не балюча, перасмыкнулася.

— Сапраўды, дзе ж ён? — Пятро праціраў шкельцы акуляраў і, начапіўшы іх на пераносе, мацаў вачамі натоўп.

Хлопцы нешта разам загаманілі, пасоўваючыся да выхаду. А Слыш ужо спяшаўся ў руках з Марыльчыным цёмна-сіняга шавіёту паліто ёй насустрач і, падмігнуўшы хітра камусьці, накінуў яго ёй на плечы, тая, я добра заўважыў, неяк грэбліва сцепанулася.

Прыцёгся я дамоў адзін. Распрануўся і ляжаў з сухімі адкрытымі вачамі, як у пакой, не запальваючы святла, увaліліся Іван з Пятром. Дзяліліся ўражаннямі. Успаролі мяне, але я прытварыўся, што сплю. Было позна, і хлопцы неяк пакінулі мяне ў спакоі. Адно Касцючык зусім сур'ёзна і, як падалося, шчыра сказаў:

— Ну, брат, і Марылька ж твая — дзяўчына з характарам! Як ні ўвіхаўся «бабскі хвост», нічога ў яго не атрымалася. Толькі выйшлі з тэатра, а яна, брат, адбой яму пры ўсіх. Ідзі, кажа, Слыш, сваёй дарогай, я адна патраплю!

— Як бачыш, Алёха, Слыш астаўся з носам! — акругліў Пятро, ладкуючыся на сваёй нямудрай пасцелі.

— Ну, а ў вас, мушкецёры, як дзялы?..

— А нішто. У нас парадак! — паўжартам адказаў Пятро.

Але я ведаў, што ён можа і перабольшыць і зманіць. Скажа, што прымеш за чыстую праўду.

Яны яшчэ громка шапталіся. Я маўчаў — турбавала сваё. У вачах стаялі ўгодліва-нахабны Слыш і таемна-незразумелая Марыля.

12

Нечакана, на каляды, прыехаў у горад бацька.

Мы з Пятром пасля заняткаў кінуліся былі па магазінах прыкупіць чаго з прадуктаў, якой камсы ці пачак маргарыну на прыправу да абеду, а Іван вопрамеццю паджгаў дадому — яго чарга была варыць абед.

Дарогай мы падлічылі свае грошы, і аказалася, што ў нас іх, мусіць, не хопіць да стыпендыі.

— А ты яшчэ курыш! — паўжартам упікнуў я Пятра.

— Затое я не ем гэтак, як вы з Іванам,— як з налопу накінуўся на мяне Пятро, але хутка і астыў, апусціўся, адчуўшы, што перахапіў. Яму не выпадала са мной сварыцца, бо я ж і выручаў яго, асабліва гэтую восень і зіму — мне ўжо рэдакцыя давала даручэнне, і я часцяком змяшчаў заметкі на старонках абласной газеты. У мяне вадзілася нейкая капейка, а Пятро, як і Іван, перабіваліся толькі стыпендыяй ды гады ў рады атрымоўвалі ад бацькоў, з вёскі, небагатыя пасылкі і перадачы. Бывала, сноўдаемся па вуліцы, Пятро ўбачыць латок з курывам і ніяк не можа размінуцца: «Братка, дай хоць на пару беламорын...» А я ўжо, здаючыся, буркнуў: «Хопіць табе і пары гвоздзічкаў. Невялікі пан...»

— Ну, глядзі, Алёшка,— пагрозліва жартуе Пятро,— некалі, гадоў гэтак праз трыццаць, стрэнемся, то я тваю гэтую плюшкінскую рысу прыпомню. Я стану славутым гісторыкам, а ты сплеснявееш у сваёй вёсцы. Будзеш там, як той коласаўскі Лабановіч, зярняты святла збіраць!..

— А што, хіба гэта дрэнна? — запальваюся я, а мне ўзгарэцца адно імгненне.— Ты ж сам з вёскі. З такой жа, як і я: мядзведжы кут, глухамань, а выпендрываешся ўжо цяпер, яшчэ не скончыўшы тэхнікум. Бачыш, закапыліў губы, нарогам носа не дастанеш. Папраўдзе, між іншым, я паеду ў свае Бацькавічы! Не адмоўлюся, калі пашлюць...

Гэта былі не проста словы, а покліч сэрца.

— І я паеду, не адмоўлюся! — зарагатаў Пятро, будучы славуты гісторык.— Давай заглянем у булачную ды гайда дамоў? Бо ўжо кішкі марш заводзяць!..

З майго дазволу (на гэты месяц была мая чарга быць арцельным казначэем) Пятро купляе пачак «Беламору», на абед і вячэру бяром паўкілаграма камсы, бохан жытняга хлеба, тры французскія булачкі да чаю, цукар і пачак маргарыну і шпарым дадому. Той зімою ў магазінах ужо вольна прадавалася масла, па 25 рублёў за кілаграм, але мы такой раскошы не маглі сабе дазволіць, нават не ведалі, якое яно на смак.

На кватэры мяне чакаў неспадзяванак: бацька сядзеў на ўколенцах і з Іванам абіраў бульбу. На канапе, у мыцельніку, ляжаў ладны з суравіны заплечнік, стрыножаны новенькай пяньковай вяроўчынаю. Кайстра-заплечнік ужо развязаная — відаць, бацька штосьці выняў. Пры сцяне на круку, дзе мы вешалі сваю верхнюю апратку, вісеў знаёмы бацькаў шахцёрскі, з мультановай матэрыі, на ваце, сям-там пашчыпаны жалезнымі пырскамі, пінжак і шапка-аблавушка. Упрытык з кайстрай як бы выхваляліся на канапе новыя шэрыя вязёнкі. Я адразу заўважыў іх, бо, як памятаю, у бацькі ніколі болей аднаго дня ўзімку не трымаліся вязёнкі, ці рукавіцы. У першы раз як уссуне на рукі, яны губляліся, і бацька па іх не бедаваў. «Ат, мае рукі холаду не баяцца, і без вязёнак перазімую»,— адразу прыгадалася, як ён заўсёды апраўдваўся перад маці, калі тая яго ўшчувала за страту.

Я падляцеў да бацькі, і ён падняўся насустрач, падалося, з павільгатнелымі вачамі, шырока раскінуўшы вялікія, жылістыя, у застарэлых мазалях, драпінах і вугальных зярнятах рукі, прытуліў мяне, і я схаваўся ў яго на грудзях — чыстае птушанё пад крылом; бацька, засопшыся, патрымаў мяне ў абдымках нядоўга, можа, з хвілю, тады адштурхнуў лёгенька, як былінку.

— Ну, здароў, сынок. Як ты тут маешся?..

Паздароўкаўся і пацалаваўся такжа з Пятром. З Іванам яны ўжо, мусіць, і нагаварыліся. Бацька ведаў маіх аднакашнікаў, бо я дома пра іх на вакацыях шмат расказваў, і цяпер ён навочна аглядаў нашу арцель і нашае жытло.

Адольвала хваляванне — я мітусіўся па хаце, спрабаваў нешта рабіць; думкі мае блыталіся, хацелася нечага спытаць, але нічога не мог прыдумаць і, як з пералёку, лыпаў вачамі і сноўдаўся сюд-туд па хаце. Нарэшце, ачомаўшыся, пачаў роспыты:

— Ну, як вы там, тата? Што ў вас новенькага? Як маці, сястрычкі — Дуня і Тоця?..

— А што дома...— бацька ўжо самавіта зацягваў папяросай, якою даўмеўся пачаставаць яго Пятро.— Дом твой на месцы, нідзе твой дом не дзенецца. У лес не збяжыць — не воўк. Усе дома здаровыя-жывыя. А навіны сякія-такія ў нас, у калхозі, ёсць. Але ета пасля. А цяпер, во, ужо бульба, пэўна, гатовая. (Іван, наш арцельны кухар, паспеў умасціць на пліту чыгунок, і ўжо смачна булькатала, сыходзячы парай, бульба.) — Як адзін наш вясковы жыхар казаў, падзелім бульбу... Тады і пагаворым...

— Парадак,— павесялелі хлопцы.— Бацька з дарогі. Давайце палуднаваць!

Пакуль Іван завіхаўся з чыгункам ля пліты, на стале з'явіліся бацькавы пачастункі: дамашні хлеб, ладны кусман сала, кольца смажанай (па матчыным рэцэпце) кілбасы, вараныя яйкі, духмянае мяса-бужаніна.

Мы паклалі свае гарадскія прысмакі. Убачыўшы свежую, бы чыстае срэбра, камсу, бацька прыцмокнуў:

— Ну, хлопчыкі, будучыя вучыцелі-мучыцелі, каб даждацца вашага пасаду, во ўжо тады разгавеўся б і я. І мяне, можа б, калі пачаставалі, прывецілі. А цяпер, бачу, у вас закусь — дай божа, а етае, каб прамачыць глотку, ні кроплі?..

— Во, я ж казаў,— тузануў мяне за рукаво Пятро.

Ён мне ўжо непрыкметна намякнуў, што, можа, варта было б віна якога бутэльку ўзяць, але я пасаромеўся, пабаяўся, што бацька за такое пакрыўдзіцца і нават будзе сварыцца.

Ды бацька ўжо матнуўся да скарбніцы-кайстры і выцяг адтуль цёмную пляшку-пяцісотку, заткнутую пакуллем, і ўрачыста, з нейкай зухаватасцю ўмасціў на стале, пашукаў вачамі гаспадыню (пра гаспадыню яму паспеў ужо расказаць Іван) і, не знайшоўшы, ніякавата матнуў рукою:

— Дык што, хлопцы, падзелім бульбу?

— Канечне!

Пачаставаўшы нас гарэлкай, бацька кінуў у рот пару камсінак, заеў сопкай бульбінай і, жыва жэстыкулюючы, расказваў:

— Ета ж во маці надавуміла. У яе там засталася пляшка, блюла да калядаў. І во аддала мне ў дарогу. Ды глядзі, прыказвала, не выжлукці без пары, бо сорамна будзе. Ета ж не дзела, з пустымі рукамі ў чужыя людзі. І бачыце во, як знайшлася. А яно, як тэй казаў, па кроплі возьмеш, і весялей на душы, і гора — не бяда!..

Мне карцела хутчэй распытаць пра дом, пра вясковыя навіны, бо лісты з дому атрымоўваў вельмі рэдка, бацька зусім не ўмеў пісаць, а маці сяк-так крэмзала, але ёй не ставала часу гэтым займацца. Налучыўшы момант, я паўтарыў сваё пытанне. Бацька прыпаліў новую папяросу, а хлопцы, падсілкаваўшыся, заняліся сваімі справамі, і, набраўшы ў грудзі поўную зацяжку дыму, зайшоўся кашлем.

— Ты, сыне, пытаешся пра маці,— разважна прамовіў бацька і, аддыхаўшыся, загаварыў: — А нічога, маці яшчэ цягне патроху, не здаецца. Яна яшчэ, дзякуй богу, здаравейшая за мяне, сілу мае, не паддаецца старасці...

— Ну, і скажаш, тата!

— А што ж,— бацька зацягнуўся папяросай, пачаў зноў душыцца кашлем (гэта ў яго яшчэ з шахтаў, як аднойчы прысыпала было, небараку, у забоі).— І не маладзёны. Ета, кажысь, пад сорак падбіраецца ўжо. Скажу табе, сыне, і я ўжо старэю. Іголку, скажам, не ўдзену хутка: шморг-шморг, а яна нейк усё міма. А чуеш, старыя нашы, вясковыя мужыкі, ужо аджываюць свой век. На каляды памёр жа Гуль. Ты яго добра ведаеш. Доўга мучыўся, бедалага. Ужо будзе месяц, як аддаў богу душу, парыць зямельку. Кажуць, з прастуды памёр, а яшчэ дзябёлы быў старыкан. Усё лета яшчэ хадзіў з людзьмі. І з касою, і на таку яшчэ малацьбітам памагаў, і ўсю восень, да маразоў, босы, у адных сподніках. Забрала, бачыш, смерць. На самыя хрышчэнскія маразы хавалі — я памагаў. А шкода чалавека, хоць і старога. Такі добры чалавек быў, хоць і ў калгас доўга не ішоў, усё ўпарціўся. А чаго, каб спытаў хто? Ты ж стары, нездаляшчы, табе ў гурце пачот, уважэнне. Ды, бачыш, такі ж ужо характар меў... А помніш, як Гуль табе, малому, калі, бывала, у нас заседзіцца і заначуе, узяўшы ў краме добрую чарку, казкі тыя баіў? Як бытта ён быў у Фінляндыі і ехаў у тым поездзе, у якім з Фінляндыі ў Расію вяртаўся Ленін... І Леніна бачыў...

— Можа, ета выдумалі пра Гуля, а мо і праўда,— кажу я, прыгадваючы гэтага каржакаватага з рыжай па пояс барадой дзеда, якога ўсе ў Бацькавічах называлі Гуль.— Цікавы быў стары. Пагаварыць умеў, балака быў на ўсё сяло, а пагуляць любіў у ахвоту. Мо таму і мянушку такую далі яму...

Мне шкада яго. Як быццам ён. стары Гуль, мне даводзіцца нейкай раднёю. Шкада мне і бацькі, які во ўчарнеў,

змарнелы — не дужа добра выглядае; нядобра яму, мабыць, там у той кузні, дзень пры дні ля горна, на холадзе, а цяпер во маразы ўсчаліся, а на работу падымайся, ідзі з саменькага рання.

Бацька схіліў галаву, задумаўся. Відаць, і ў яго невясёлыя думкі. Хочацца дапытацца пра многае, але я маўчу, даю яму адумацца — ён і сам, ведаю, ўсё раскажа, ад мяне бацька нічога не ўтойваў, ведаў, што і мяне вельмі цікавяць вясковыя справы. І праўда, бацька хутка загаварыў, ажывіўшыся:

— А ты, хлопча, не чуў: паехаў жа ў Сібір твой дзядзька Максім Мазур. Сабраўся спехам, у адзін момант, прадаў хату, спакаваў усё, казалі, і кросны — усё ў багаж, і паехаў. Гавораць, дужа багатыя землі нашы мугулёўцы дзесьці аж за Омскам агледзелі і папёрлі гамузам — па дурнінку...

— А што, можа, і з нашых вяскоўцаў хто ўшпарыў?

— Канечне, ірванулі некаторыя,— бацька ўсміхнуўся сабе — пэўна ж, не надта ўхваляў ён тых землякоў, што паддаліся на спакусы з'ехаць з вёскі, ды яшчэ перад зімой,— ён прайшоўся па хаце, зацягнуўся цыгаркай.— Паддаліся, брат, агітацыі, Васільку Шылая помніш? Ета што за малатабойца са мною ў кузні рабіў? Той з'ехаў да брата і расхваліўся, пісьмы прысылаў радні. А радня разнесла па хатах, і адразу клюнулі многія.

Канечне, шкода, што з'ехаў у Сібір Яшка-Іванічка, а Лазар таксама прадаў усё сваё, яшчэ на пакровы, хутар свой — па баку і, як падсмалены, папёр. Паехаў злосны, ні з кім не папрашчаўся. Нават з братамі. Па дарозе заскочыў у кузню, падаў руку бацьку і Максіму і ўсяго што прамовіў: «Не памінайце ліхам...» А на хутары, баілі, п'яны хрыпеў: «Падавіцеся вы ўсе, калхознікі...»

— Чаго б яму, етаму глыбаеду, не ставала,— вырвалася ў мяне, бо я ведаў добра Лазараву ўхватку, ягоную рвацкую натуру.

— Можа б, ён яшчэ і не рашыўся,— у роздуме гаварыў бацька,— але яму прыпёрла — накрылі яго праўленцы з жытам. Як сеялі азіміну, ён і падмеўся за возчыка. Ды сабе мяшок і прыхаваў у кустоўі, у Касіцкім, а за ім сачылі. Высачыў усё той жа Антоська, сам добры зладзюга, і падаткнуў у сельсавет. Да Іллюка, бачыш, Кіпень не пайшоў, відаць, баяўся, што можа прыкрыць, а адразу да Вярбіцкай. І былі завялі на Лазара судовую справу, але ён неяк жа выкруціўся, зусім з вады выбавіўся. Але,

бачна, адчуў, што непярэліўкі, не будзе яму тута мяса ў місе, і пусціў усё з-пад малатка, прадаў усё, можна сказаць, за бясцэнак, і плетануў. Няхай едзе, туды яму дарога. Але, думаю, не знойдзе ён нідзе такой раскошы, як між сваіх людзей...

— Так, сапраўды, яны абодва, і Лазар, і Антонька, аднаго поля ягады,— пасля нейкай паўзы дадаў бацька і ўстаў, пазяхнуўшы.— Абое рабое — адзін аднаго вартыя...

І, як бы ўспомніўшы, што не дома, не ў сваёй хаце, бацька схамянуўся, азірнуўся наўкол:

— А дзе ж наша гаспадыня?..

— Тут я,— азвалася цётка Цыля з ляжанкі. Яна непрыкметна зайшла ў кухню і, каб не перашкаджаць нашай размове, прылегла, чакаючы, пакуль мы выберамся з-за стала.

— Гаспадынька, ета, галубачка, нядобра,— бацька пачаў настойліва запрашаць цётку Цылю да стала, ладкуючы закусь.— Не адмаўляйцеся, прашу вас, будзьце ласкавы, не ганьбуйце намі. Во пакаштуйце, што ёсць. Як кажуць, чым багаты...

Гаспадыня, пааднекваўшыся, падышла, прысела і прыгубіла чарку, пакаштавала госцеў наедак і адсунулася ад стала, загаварыла пра свайго Янкеля. Разгаварыўшыся, яна цікавілася, як цяпер жыве вёска і, вядома, якія цэны там, у далёкіх ад горада кутках. Бацька ахвотна дзяліўся навінамі.

— Дарагавата са скаромнінай,— бацька скручвае сабе цыгарку з табакі-самасейкі (Петраковымі папяросамі ён так і не накурыўся).— А аб адным малаку мужыку цяжка, касу ўлетку не пацягнеш, трэба і скраму прыдаць, хоць на які кус. Праўда, летам я сам толькі і жыву квасам, а больш нічога не ўбіць. Але ж сям'я. Кормім сабе кабанчыка да налецця. Мукі яму трэба, аб аднэй бульбе не абыдзешся. А гэта ў цане. Ды і бульба дарагая. Думаў прыкупіць, ды дзе тых грошай возьмеш, іх не набрацца — дарагоўля на ўсё. Сала падаражала...

— Ну, што вы, тата? Ураджай жа такі добры быў,— здзівіўся я, памятаючы, як мы ўлетку тралявалі тое ўмалотнае жыта. Ярына таксама ўродзістая яшчэ даспявала.— Помніш жа, старшыня абяцаў па кіло збожжа на працадзень!..

— Правільна, абяцаў,— падхапіў бацька.— Авансам па кілаграму атрымалі, тады прыйшла абвестка — стрэч-

ны план, і здалі збожжа, ледзь на пасеў выстарчылі. А ярына яшчэ ляжыць у снапах. Калі яно ўжо давядзецца малаціць, ярыну ўжо мышы абмалацілі і пытлююць ужо... Вот, брат, якія ў нас навіны...

— Сход жа справаздачны быў, канечне,— устаўляе Пятро, услухаўшыся ў нашу размову, а дагэтуль ён, стаіўшыся на ложку, засяроджана чытаў нешта.— Хіба старшыні не далі за ўсё гэта па карку? Камсамольцы ж у вас ёсць. Баявая ячэйка — Алёшка хваліўся...

— Быў сход, канечне,— махнуў рукою бацька, кпліва ўсміхнуўся.— Праўда, добра Іллюка прабралі. Канечне ж, дайшло да яго, бо бегае як падсмалены. Вымову запісалі з занясеннем. Каторыя не хацелі ўсёй душой, каб ён астаўся, але большасць крыкнула: «Няхай будзе Ілюк» — і яго пакінулі. А камсамольцам што? Пытлю даюць усім. Няма як раскашавацца ўрвіцелям. Канечне, ета ўсё завадатар Аляксей Свербікаў шкодзіць, навучае іх. Прывет табе перадаваў, казаў, каб не зазнаваўся, пісьмо якое калі напісаў, як у цябе з вучэннем... А Сашка, твой сябрук, з'ехаў на шахты, пасварыўся са старым Кіпнем і з'ехаў. Паехаў жа ўскорасці за ім і Мішка Цярэшкавых. У Данбас падаліся. Узялі Кузьмоў адрас у Ляўшы і — дай бог ногі... Так што арудуюць цяпер Свербікаў з Говарам. Сцяпан ходзіць у школу ў Ігліцу, а якое што, то ўдвух камандуюць, абодва добрыя закапёршчыкі... Ну, што табе яшчэ расказаць?.. Ці, можа, ты ўжо спаць будзеш... Па мне, дык хоць усю ноч прагаварылі б...

— Не, што вы, ета ж усё так цікава!

Я гатоў быў слухаць напралёт усю ноч, але ж у мяне яшчэ задачы не парашаны, а яны мне не дужа даваліся, і я выходзіў з тупіка часцяком толькі таму, што са мной сядзеў Іван Касцючык, бескарыслівая душа, мне заўсёды ён памагаў і выручаў мяне з бяды.

Бацька, скасавурыўшыся, паглядзеў на хлопцаў, якія ўрупіліся ў канспекты, але часта адрываліся, падымалі галовы, і ім, канечне ж, цікава ўсё гэта, бо яны такія ж, як я, вясковыя гарапашнікі, і ўскінуў вачамі, дзе льга прылегчы на спачын.

— Дос, хопіць ужо,— прабачліва сказаў ён і ўстаў з-за стала.— Я, хлопцы, здарожыўся, то трохі аддыхну.

Гаспадыня паказала яму месца на канапцы, падала чыстую падушку.

На наступны дзень увечары мы з бацькам засталіся адны: Іван і Пятро падаліся ў тэхнікум, і бацька мне ціха сказаў:

— А ведаеш, сынок, я тутака, у горадзе, кажысь, астануся хоць месяцы на два, на тры, да вясны. Пашукаю якое работы на заводзе і да цёплых дзён прабуду. Можа, і табе трохі памагу ці ў хату якую капейчыну закіну...

Я насцярожыўся:

— А як жа там маці будзе з малымі?..

— Перакідаецца маці як-небудзь,— у голасе бацькі нейкая трывога ці шкадаванне, але ён бадзёрыцца.— Дровы на зіму ёсць. Такжа назапашана корму для каровы і авечак. І хлеба, можа, хопіць. Як-небудзь да нові дацягнем...

Мне было радасна, што бацька застанецца Усё ж весялей будзе ўдвух, хоць ужо я і прывык у горадзе, крыху асвойтаўся, здружыўся з хлопцамі, ды на першым часе мне вельмі дапамагала стрыечная сястра Гапка, якая сама незадоўга прыехала з вёскі ў горад.

Але як жа там адна маці? Хто ёй паможа ўходжвацца з гаспадаркай? Дуня і Тоця — якія яны яшчэ памочнікі — толькі за сталом, хлеб дарэмна зводзяць. А рабіць? Як бацька адважыўся кузню кінуць? Хто яго там, у кузні, замяніў?

— А яны ж з работы цябе адпусцілі? — спытаў я, адумаўшыся і паразважаўшы над гэтым бацькавым рашэннем. Мне падалося, што нешта ў яго там не паладзілася і ён зноў рашыў падацца ў адыходнікі. Я ж ведаў: ён вельмі ўпадабаў кавальскую справу і ганарыўся, што нарэшце яму ўдалося заняць месца ля горна. Гэта не жартачкі: першы свой каваль у Бацькавічах!

Бацька, сумеўшыся, адказаў, як злякаўшыся, мусіць, не чакаў такога пытання:

— А што? Хто мяне можа затрымаць? Даведку з сельсавета ўзяў. Кузню перадаў Максіму. З ім падахвоціўся і Сцяпан Мацвяёнак. Даўно хацеў, прасіўся нават. Няхай пляскаюць удвух. Цямкія хлопцы. А старшыня? Што ён мне? Я з ім, шчыра скажу, пасварыўся. Секануў яму праўду ў вочы — няхай знае, што не з тымі ён злягаўся. І яны яго падкузьмяць, ета я пэўна знаю, падкуюць на ўсе чатыры нагі. Я яму пра ўсё і сказаў, а ён, разява, яшчэ сердзіцца. Я яму ўсё шчыра, бо ён жа нейкай раднёю даводзіцца, мы з ім у трэцяй стрэчы, а ён, дзівак, думае, што я з нейкай завіслівасцю. Пачаў да мяне прыдзірацца, а я прынёс

ключ у праўленне і паклаў яму на стол. «Будзеш каяцца яшчэ,— сказаў мне і ўхмыльнуўся,— папросішся, а мы тады падумаем, што з табою, адыходнікам, рабіць». Вот такія дзялы, сыне...

Мне неяк стала шкада бацьку. Я ведаю, як ён усё рупіўся пра кузню; усё стараўся дастаць які інструмент ці прыладу для свайго дзецішча, не шкадаваў ні сваёй працы, ні сваіх сродкаў, абы хутчэй пусціць кузню ў ход, і з кавалямі, якіх наймаў калгас, колькі паклаў сілы, пакуль навучыўся кавальскаму рамяству, і цяпер усё кінуўрынуў і кінуўся за блізкі свет, не ведаючы, што яго чакае тут, у горадзе.

Я глянуў непрыкметна на яго, і мы неяк сустрэліся позіркамі. Я адчуў: і ў яго душы неспакой, трывога. Я першы не вытрываў, прамовіў запытальна:

— Можа, і не трэба было ехаць, тата?..

— А ляд яго знае, што тут рабіць. Галавы не прылажу. Адным словам, пахаджу, пашукаю чаго, а тады будзе відаць...

...Ужо каторы раз вяртаемся да вясковых спраў, і бацька расказвае яшчэ тое-сёе з таго, што адбылося з таго дня, калі ён мяне адвёз перадапошнім жнівеньскім днём на станцыю Камунары і памог мне, з хатулямі, сесці сярод ночы ў пасажырскі цягнік Орша — Унеча, які праходзіў тут адзін раз за двое сутак.

Пасля і бацька неяк асцярожна, нібы саромячыся, запытаўся:

— Ну, скажы, Алёшка, а Каця прыязджала?

Я пачырванеў, збянтэжыўшыся:

— А што? Чаму цябе ета цікавіць?..

Бацька стрымана і лагодна ўсміхнуўся:

— Я ўсё ведаю. Дуня расказала. Ета такая мыш, ад яе нічога не ўтоіш...

— Не, не прыязджала,— з напускной абыякавасцю прамовіў я.— Ліст прыслала. Напісала, што ў іх адкрыўся медтэхнікум і яна паступіла. Будзе вучыцца на фельчара.

— Ета харошае дзела,— падтрымаў бацька і задумліва дадаў: — А скажы-тка, яна там нічога пра свайго бацьку не прыпісала? Што ён там парабляе, наш першы старшыня?..— Тады зноў прасвятлеў: — А дабрэнны чалавек быў Гопка. Галоўнае, чэсны. І аднолькава, правідлова адносіўся да людзей. А ўсё, кажысь, ад таго, што між чужых людзей жыў, не знаў ні свата ні брата. А цяпераш-

няму нашаму цяжка. Яго тузаюць то туды, то сюды. Радні паўсяла, аднаму дазволь, сямёра самі лезуць, запускаюць руку ў арцельнае, цягнуць, што дрэнна ляжыць!..

Каця ў тым лісце коратка паведаміла, што яе бацька — на заводзе, на ранейшым месцы, а хлопцы абодва вучацца ў школе.

Пасля, калі мы ўладкаваліся на спачын, бацька як бы незнарок наказваў мне:

— Ты ж глядзі, хлопча, адпішы ёй. І ад мяне Грыцку паклон перадай. Скажы, што яго памятаюць і будуць помніць. Недарэмна ён паклаў сілы, недарэмна бароўся за новую жытку!..

Дні праз два ўчарашні каваль з далёкай, глухой вёскі Іван Баянок у натоўпе кадравых рабочых-сельмашаўцаў дыбаў да прахадной вялікага, ужо тады слыннага на ўсю краіну завода. Яго залічылі падручным у кавальскі цэх. Вусаты вахцёр з ухмылкай паглядзеў на яго паперку-пропуск і прыязна падміргнуў:

— Новенькі?!

Бацька, ніякавата пазіраючы на свае новыя шэрыя чосанкі ў чырвоных бахілах, нявесела кіўнуў галавою:

— Як бачыш...

«Новенькі» хутка ўцягнуўся ў новую работу, стараўся, як заўсёды і ўсюды на людзях, у гурце — выкладваў усяго сябе без астатку, асабліва не дбаючы пра тое, як яму заплацяць, не патрабуючы нічога для сябе ўзамен. З паўмесяца мы з ім жылі на новай кватэры, недалёчка ад той, дзе засталіся мае аднакашнікі Іван і Пятро. Мы з бацькам асталяваліся ў Шульманаў, у невялічкім пакойчыку, за дашчанай перагародкай; тут стаяў жалезны ложак на драцянай сетцы са старым сеннікам, з якога бесперастанку сыпалася нейкая, напэўна, пазалеташняя пацяруха.

Гаспадары дазволілі бацьку спаць на чарэні вялізнай, на ўсю кухню, рускай печы, і мне аднаму на ложку была выгода. Сталаваліся мы дома. Я цяпер рэдка калі хадзіў у сталоўку, і на гэтым эканомілася сякая-такая капейчына. Ды такое наша агульнае і для мяне прывольнае жыццё цягнулася нядоўга: бацьку перавялі ў другую змену, і ён вымушаны быў перабрацца бліжэй да завода, балазе яму прапанавалі там месца на ціхім Сельмашаўскім завулку.

Яму стала лепей. А мне хоць зноў вяртайся да хлопцаў. Ды і там, калі падумаеш, цесна, адзін пакой, хоць і вялікі, як стадола, але займацца няма месца: нас трое ды свой вучань, а ён быў такі назола, што ад яго не знаходзіш ніякага ратунку, усюды лезе, пераверне ўсе твае сшыткі і канспекты. А тут ціха, ёсць у гаспадароў сын, мой равеснік, памяркоўны, харошы хлопец-дзевяцікласнік, і мы з ім хутка пасябравалі. І ўсё ж я сумаваў: па-першае, так раптоўна, нечакана давялося разлучыцца з сябрукамі-аднакласнікамі; па-другое, сустрэча і расстанне з бацькам, якога я вельмі любіў і які вымушаны быў жыць асобна. Як толькі настане нядзеля, я праз увесь горад тарабаніў на Палескі праезд, дзе ў звычайнай сялянскай хаце застаўся на кватэру бацька. Выхадныя дні мы былі разам. І я заўважыў, што бацьку жылося не соладка. Ужо два месяцы, як ён шчыруе ў кавальскім цэху. Спяцоўкі добрай яму не далі, бо за гэты час, бачу, яго пінжак зашмальцаваўся, штаны і валёнкі пакрыліся нейкай рудою — іржой. Нічога сабе з адзення не прыдбаў, нават сарочка тая, у якой прыехаў,— картовая, з адной нагруднай кішэняй на левым баку. І харчуецца вельмі сціпла, нават цукру ашчаджае. «Ты сабе, сынок, кладзі ў кварту паболей, табе трэба больш цукру, бо ты яшчэ расцеш, а мне хопіць і аднаго кусочка». Перабіваецца на бульбе і камсе, хлеба ўволю не мае, кусанікі чэрствыя жуе. Хіба ж гэта жыццё?..

— Плата мне як вучаніку,— нібы між іншым, кажа бацька за сталом.— Яшчэ месяц. Тады буду рабіць на большае жалаванне. Не бядуй, сыне...

Сам жа нешта невясёлы, зацята маўчыць, адно курыць, смаліць тытунь, карэнне нейкае смярдзючае, цыгарку за цыгаркай; у вачах — нейкі сум, жальба нейкая. Уздыхнуў, ціха прамовіў:

— Сны нейкія дурныя сняцца мне. Нешта такое сянні прыснілася, звярзлося штосьці, аж дасюль на сэрцы млосць...

— Ат, кінь, тата, пустое! Яшчэ ты ў сны нейкія верыш... Глупства ета ўсё!..

— Не, не кажы. Нешта ў мяне, брат, на душы неспакойна, усё мне думаецца, каб чаго дома не случылася. Адпішы ты пісьмо матцы, Алёшка,— ажывіўся бацька, выціраючы заросшае сіваватым шчаціннем падбароддзе.— А то ў мяне няма такое завядзёнкі — пісьмы дамоў пісаць. Трэба было чырвонец які адлажыць, дак, бачыш, са-

мі мы з табой не дужа раскашуемся. Але, сынку, не бядуй — не адзін год Масква будавалася.

— Што мне бедаваць,— храбрыўся я.— Стыпендыя вунь скора. А ліст дамоў я адпісаў ужо.

— Ну, глядзі ж, на пустыя забавы часу не глумі,— на развітанне наказвае бацька.— Вучыся. Навука, як казаў той пракуда Трахімка, ета шырокія вароты ў рай,— і засмяяўся, хітра прыжмурыўшы вока. Пасля ляпнуў мяне лёгенька па плечуку: — Не злуй, ета я так, пажартаваў. Ты ў мяне хлопец кемны, разумееш мяне...

Праз колькі дзён я атрымаў з дому, ад маці, пісьмо, у ім быў наказ бацьку, каб не біў лынды, не тачыў лясы, яна так і пісала, у тым горадзе, вясна ўжо ў вокны грукае, корму скаціне нямашака, карова схуднелая, аж рэбры свецяцца, авечкам падкінуць пад ногі ні саломінкі, а ён там (пра бацьку) няхай гулі гуляе, прахалоджваецца, валацуга. Маці скардзілася, што яна адна з малымі адхлання не знае, а як пачнуцца работы, тады ёй хоць кідай усё ды ў паніўку галавою. Далей была прыпіска: «Алёшка, перадай бацьку — Іллюк, старшыня, грозіўся, што калі Іван, бацька твой, не сышчыцца скора, то розыск пашле».

Я адразу ж прынёс бацьку той ліст. Прачытаў усё як ёсць. Ён слухаў мяне моўчкі, і твар яго то хмурнеў, то наліваўся нейкай невядомай мне абыякавасцю — тады, як паслухаў пагрозлівае папярэджанне старшыні, як скалануўся, пэўна ж, узлаваўся, пачаў хадзіць па пакоі, можа, каб супакоіцца. Нарэшце сам сабе прамовіў, сумна ўсміхнуўшыся:

— Няхай шукае, дуралей насаты,— і ўжо больш спакойна, разважліва: — Ета можа зрабіць толькі дуралей, у якога ў галаве вецер, мазгоў зусім няма...

Я прамаўчаў. Мы развіталіся. Бацька не праводзіў мяне да пераезда, як звычайна, а даў мне пяцёрку і чамусьці пацалаваў на дарогу. Калі я ў наступную нядзелю завітаў у адведкі, то гаспадар сказаў, што бацька паехаў дадому. Не дачакаўшыся канца вучнёўства, ён узяў разлік і ў самае разводдзе, перад вялікаднем, рушыў у дарогу.

Мне стала дужа сумна, што мы напаследак не нагаварыліся як мае быць, але і радасна за тое, што ён будзе дома з вясною.

13

Марыля захварэла, і яе спехам паклалі ў бальніцу. Пра гэта першы даведаўся Слыш і раззваніў аднакласнікам. Каля дзяўчат, як і дагэтуль, ён увіваўся, насіўся певуном. Слыш падлабуньваецца то да Марылінай сяброўкі Ані, то на перапынках перашэптваецца з Верай, якая сярод аднакласніц была, бадай, самая дарослая і строіла хлопцам вочкі. Пад вялікім сакрэтам ён жа і сказаў ёй, што Марыля захварэла на сухоты. Яна не сказала, дзе яе паклалі, мабыць, не хоча, каб пра гэта ведалі ўсе. Я, канечне, гэтаму не паверыў — палічыў, што Слыш, абражаны, знарок пусціў такую плётку, мусіць, і яму, віляхвосту, дзяўчына дала ад варот паварот, і ён цяпер плявузгае, абы ёй як адпомсціць.

Пачалася педагагічная практыка. Усёй групай мы кіраваліся ў школу, і адзін з нас даваў урок. А мы, практыканты, рассеўшыся па лаўках, слухалі і што-кольвечы занатоўвалі сабе ў спецыяльных для гэтага дзённіках-сшытках. Пасля ў сваёй аўдыторыі рабілі аналіз урока. Была мая чарга — я першы раз самастойна выступаў у ролі настаўніка. Вядома, калі я стаў перад класам, то дужа хваляваўся — не помніў амаль нічога з таго, што напісана ў маім канспекце, якія дагэтуль вывучыў амаль на памяць. Дзіўна, ад хвалявання ў мяне амаль што адняло мову. Здавалася, я так стаяў доўга і не мог ніяк супакоіцца. І практыканты, і вучні аціхлі. Чулася нават, як цікаў на стале гадзіннік настаўніка-метадыста Мікалая Данілавіча Дабрыяна. Відаць, і ён хваляваўся — перажываў за мяне. Сяк-так я авалодаў сабою, перасеўшым голасам выдыхнуў:

— Добры дзень, дзеці!..

Трэцякласнікі, якія мяне, як і ўсіх нашых навучэнцаў, крыху ведалі, бо мы з імі неяк хутка перазнаёміліся, аж уздыхнулі з палёгкай. Канечне ж, і яны шкадавалі небараку практыканта.

— Добры дзень! — звінела мне ў вушах.

Я нібы ачнуўся ад нейкага гіпнатычнага сну — да мяне вярнуліся спакой і яснасць. Я праверыў па класным журнале вучняў, выклікаў тых, каго намеціў сабе па канспекце, дапаўняў іх адказы і, нарэшце, перайшоў да тлумачэння новай тэмы. Урок у мяне прайшоў, можа, не горш, як і ў іншых, калі не лічыць, што я крыху заспяшаўся і закончыў яго хвіліны на дзве раней, як празвінеў

званок. Я быў зноў разгубіўся, але хутка знайшоўся — падняў аднаго вучня і прапанаваў яму паўтарыць заданае на дом. Мікалай Данілавіч, які не спускаў з мяне вачэй, незаўважна, кіўком галавы ўхваліў мой крок.

Абмеркаванне, ці, дакладней, разбор урока, пачаўся яшчэ па дарозе. Гэты разбор, канечне, адрозніваўся ад таго, што будзе потым у аўдыторыі. Мікалай Данілавіч, па звычцы, пакладзе перад сабою тоненькі школьны сшытак, перагнуты ў дзве столкі, і весела, прыжмурыўшы шэрыя ўсмешыстыя вочы, скажа: «Ну, што ж, пачнём, блаславіўшыся...» Кожны чакае, каб выклікалі не яго першым, бо Дабрыян абавязкова запатрабуе не простай пахвалы ці агульнага водгуку, а канкрэтнага абгрунтаванага аналізу ўрока, выяўлення яго недахопаў ці ўдач.

А тут не трэба думаць, каб усё тое, што скажаш, было да месца. Хлопцы табе сцебануць у вочы ўсё, што губа прынясе; скажуць усе твае заганы і, канечне, старацца пасмяяцца, пацвеліцца з цябе, небаракі практыканта.

Уяда Апанасік ужо зморшчыў свой нос-бульбачку, з'едліва хіхікнуў у кулак:

— Ніколі не падумаў бы, што ты, Алёшка, так здрэйфіш, разгубішся. Аж я перапужаўся за цябе, думаў: канцы табе! Давядзецца, думаў, выносіць з класа на насілках...

— Гэта ён смелы такі ў нас са сваімі,— падхапіў і насмешліва паглядзеў у мой бок Кісель-стараста. У яго, мабыць, не ўляглася крыўда за крытыку ў насценгазеце, і ён, пасміхаючыся, з украінскім выгаварам прастарэкваў: — Во, хлопцы, які харобры наш крытыкан. Цэ тобі, братко, не заметачкі та віршыкі вудумляты на сябріў. Боюся, Олісь, шчэ тобі нельга довераты вучніў. Ты шчэ зэлені дзіцятко!..

Унурыўшыся, я не спяшаўся што-небудзь сказаць, бо ведаў — пачнеш спрачацца з хлопцамі, толькі больш распаліш іх. Ды і мае сябрукі, надзейная абарона, наструненыя. Чамусьці маўчыць Касцючык, ціха шкрэбае сабе расклычанымі чаравікамі па тратуары і толькі сапе. Цімашонак, выпрасіўшы шчэпцік махоркі ў Слыша, старанна слініць цыгарку. Нейк таемна, мабыць, каб згаварыцца, шушукаюцца дзяўчаты. Пабраўшыся пад рукі, яны дыбаюць сабе наперадзе, час ад часу азіраючыся назад, мабыць, каб хлопцы надта не адставалі — у аўдыторыю трэба паспець да званка на наступны ўрок.

Зводдаль лёгка тэпае Мікалай Данілавіч, па звычцы рукі ў кішэнях мешкаватага паліто, задумлівы, нібы зу-

сім абыякавы да нашае размовы. Між тым ён, мабыць, усё чуе і толькі пасміхаецца сабе ў вусы. Я так хачу, каб ён заступіўся за мяне, падтрымаў, бо ўрок мой быў ужо не такі кепскі, як тут пачалі былі распісваць дарогаю хлопцы. Настаўнік жа маўчаў, не прамовіў ні аднаго слова, і гэта насцярожвала. Пачуваў я сябе пагана, і ўжо нават недзе з'явілася падсвядомая трывога — па практыцы хацелася мець добрую адзнаку, не адстаць ад таго ж Ваські Слыша, які ўжо меў у Мікалая Данілавіча чацвёрку, а ў іншых метадыстаў — нават пяцёркі. У Мікалая Данілавіча нялёгка было атрымаць выдатную адзнаку, здалёк ён бачыў і ведаў кожнага, асабліва не любіў падхалімаў, не даваў ім патачкі. Як ні віляў перад ім і Васька Слыш, але нічога ў яго не выйшла — чацвёрка, і не больш. А цяпер, бачу, як ён віляе, перамаўляецца з хлопцамі, стараецца падагрэць іх, строіць жарты, стараецца, каб як мага больш насаліць мне. Гэта бачна па ягоных масляністых вочках, якія бегаюць, пырскаючы злаславасцю і затоенай крыўдай. Я надоечы быў схапіўся са Слышам за тое, што ён распусціў чутку наконт Марылі. І цяпер ён касавурыўся, зіркаў нядобра ў мой бок, але адкрыта баяўся куснуць. Цішком падгрэчваў хлопцаў, але тыя, адчуўшы, што я не прымаў жартаў і зацята маўчаў, сціхлі і паравялі размову на іншае. Слышу стала балюча, і, налучыўшы момант, ён падышоў, паляпаў мяне па плячы, паблажліва загаварыў, паглядаючы ў бок хлопцаў:

— Я, канечне, спачуваю табе, Лёха, але ж ты мог бы даць і лепш. На цябе такое не падобна. Ты ж у нас, можна сказаць, талент!..

— А ты вужлянок, віляхвост! — не сцярпеў, аж скалануўся я, але, баючыся зусім сарвацца, змоўк і адышоўся.

Падагрэты ранейшай крыўдай, Слыш не стрымаўся, яхідна прыжмурыў левае вока (гэта яго звычка) і працадзіў скрозь зубы:

— Злуеш за Марылю... Але ведай, яна цяпер, сухотніца, нікому не патрэбная. Гуляй з ёю, калі хочацца табе!..

Гэта было ўжо занадта, я рвануўся коршакам на Слыша, з усяе сілы пачаў тармасіць яго за шалік-кашнэ, з якім ён не расставаўся і на ўроках, выхваляючыся перад дзяўчатамі. Магла быць стычка. Але хлопцы гамузам наваліліся і адразу ж развялі нас, патушылі агонь, які мог скончыцца нядобра для нас абодвух. Мне ў першую чаргу перад паездкай на курсы папсавалася б характарыстыка

і, канечне ж, зніжана ацэнка па педпрактыцы. Усё гэта адбылося так хутка, што Мікалай Данілавіч нічога не заўважыў, тэпаў сабе ўвішна, не азіраючыся, а можа, не падаў выгляду.

На разборы гэтага ўрока выступалі актыўна. Як і ўсіх, мяне пераважна хвалілі. Дзіўна, але заўзяты выступальшчык Васька Слыш зацята маўчаў, надзьмуўшыся як сыч, і ўсё глядзеў не міргаючы на выкладчыка, як быццам вымагаючы, каб той як мага больш чарніў мяне, а сам на прапанову выступіць плаксіва скрывіўся і адмаўчаўся. Затое грамчэй за ўсіх рагатаў, калі Мікалай Данілавіч, падводзячы вынікі, таксама з мяне жартаваў:

— Ну, Баянок, смелы ты хлопец, а спужаўся, аж штонікі калыхаліся...

Мне паставілі чацвёрку, і Слыш яшчэ доўга не мог супакоіцца, спадцішка нашэптваў таму-сяму, каб апраўдацца ў вачах таварышаў і абяліць сябе ў вачах Марылі, якая неўзабаве выпісалася з бальніцы і пачала наведваць заняткі.

Напрадвесні з трэцякурснікаў набралі невялікую групу для выпуску раней тэрміну. У групу будучых курсантаў трапіў і я. У сярэдзіне мая мы рыхтаваліся ехаць у Мінск, на курсы. У новым навучальным годзе мы павінны былі папоўніць шэрагі выкладчыкаў роднай мовы ў няпоўных сярэдніх і сярэдніх школах.

Яшчэ месяц заставаўся да ад'езду. То была самая светлая пара — вясна. Вясна ўжо гаспадарыла ў горадзе. Вуліцы, дамы, прысады — усё заліло яркае веснавое сонца. Усё навокал залацілася, наліваючыся маладой, крамянай свежасцю. Скрозь і ўсюды поўна народу. Пасля доўгай і халоднай зімы людзі пачулі радасць цяпла і сонца — паскідалі паліто і кажушкі. Маладыя гулялі па вуліцах без галаўных убораў, у лёгкіх апратках. Асабліва падхарашыліся дзяўчаты — шпацыравалі ў жакетках і лёгкіх сукенках, у пантоплях і чаравічках, з каляровымі стужкамі ў косах, модніцы выхваляліся адметнымі прычоскамі...

Тэхнікум размяшчаўся ў самым людным месцы ў цэнтры Савецкай вуліцы. Як толькі выйдзеш з дзвярэй, адразу губляешся ў людскім віры. Натоўп плыве бясконца, не месціцца на шырокім тратуары, і людская плынь выплёскваецца на брук, кіруючыся двума ручаямі на плошчу, адкуль дыхае гаючай зелянінай парк імя Луначарскага.

Стары парк — непаўторна прыгожая мясціна, калыханка нашага юнацтва. Там мы гулялі, сустракаліся; на

зацішных бэзавых і чаромхавых алеях, на стромым надрэччы, за вежамі золатагаловага палаца, дзе быў адкрыты гісторыка-краязнаўчы музей, стаялі ўздоўж алеяў лавачкі і альтанкі, улюбёнае месца студэнцкіх спатканняў. Адсюль, з зялёнай кручы, праглядвалася ўся шырокая плыткая рака і нават усё зарэчча: шэрыя стрэхі хат, кучаравыя сады, а далей, ля самага далягляду, выгінастая падкова лясоў. У час крыгаходу тут можна гадзінамі стаяць, слухаць, як з грукатам крышацца аграмадзіны льдзіны, дыбячыся перад быкамі чыгуначнага моста, а над ракою ў падвышаным і прасветленым небе імкліва, як не навыпарадкі, імчацца кучавыя воблакі, якраз такія, як во гэтыя зелянкава-люстраныя льдзіны, што грымяць і стогнуць унізе — іх стогны і грукат чуцён і тут, за стромаю, у голлі бэзавых кустоў з пахучымі, можна аж учадзець, чырвона-клейкімі пупышкамі-покаўкамі.

Самай крыгаломнай парою мы з Марыляй стрэліся ў парку, на ўжо зялёнай строме, недалёчка ад чырвонай вежы, адкуль зарэчная прастора адкрывалася ва ўсёй велічы і харастве.

Дарога да гэтае стромы — амаль тры такія доўгія і такія кароткія гады... Марыля была са мною ўвесь гэты час у сэрцы. Мы бачыліся кожны дзень — на занятках, часта па вечарах. Але Марыля заўсёды неяк старанілася мяне, неахвотна ўступала са мною ў гутарку, часцей адмоўчвалася, незразумелая і гордая. І я не адважваўся сказаць ёй, што тварылася ў мяне на сэрцы. Яна, мабыць, ведала ўсё гэта — дзяўчына адразу адчуе, калі да яе хлопец заляцаецца, і сама дасць табе нябачны знак, нават не сказаўшы ні слова, і ты зразумееш, як яна ставіцца да цябе. Марыля, здаецца, нічым не выдавала сябе за ўсе гэтыя гады, прынамсі, я не заўважыў з яе боку ніколі таго, што выходзіла б за межы простай таварыскасці. Яна не была грубай ці няветлівай са мною, яна была простай і мяккай, як і з усімі. І гэта яшчэ больш інтрыгавала мяне, распальвала душэўную трывогу. Я крыўдаваў на сябе, што не змог сказаць ёй пра свае пачуцці. Колькі разоў спрабаваў зрабіць гэта, шукаў зручнага моманту, каб пагаварыць, пісаў ёй у думках запіскі, лісты, але ўсе мае планы і намеры разбіваліся і гублялі сэнс, калі я сустракаўся вачамі з ёю на лекцыях ці ў перапынках. Я не ўлаўліваў ад яе нейкай, хоць слабай, узаемнасці і бянтэжыўся. Але не адступаў. Як толькі не пабачу яе, мне мроіцца яе воблік, ён засціў мне ўсё, не даваў спакою.

Я змушаў сябе думаць пра Кацю, але дарэмна. З Кацяй я зрэдзь перапісваўся, і яна абяцала, што прыедзе на зімовыя канікулы, але прайшлі ўжо і веснавыя, а яна маўчыць, а ў лістах намякала, каб я не сумаваў. Дзяўчат, казала, усюды хапае, і яна сама не думае доўга заседжвацца ў дзеўках, а са мною захавае дружбу навечна. А ў апошнім лісце пісала: «Каб ты хацеў, Алёшка, са мною ўбачыцца, ведай, гэта ўжо не так і далёка ад вашага горада нашае Крыварожжа...»

Мабыць, у гэтым ёсць сэнс, калі кажуць, што час — лепшы лекар ад усіх хвароб, у тым ліку і ад кахання. Але хіба гэта было ў нас каханне? Мы тады з Кацяй былі яшчэ дзеці, і ў нас была проста дзіцячая дружба; мы былі таварышамі, жылі па суседству. Цяпер, канечне, Каця ўжо выросла і, магчыма, ужо сама ў каго закахалася. Са мною ж яна зрэдзь перапісвалася, і лісты мне ішлі на адрас тэхнікума. Пра іх ведалі, можа, не толькі мае сябры, але і яшчэ хто-кольвек з нашае студэнцкае братвы. Мабыць, пра гэтыя лісты ведала і Марыля...

...На гэтае спатканне з Марыляй я не надта спадзяваўся, прызначыўшы яго старым, як свет, спосабам — на перапынку налучыў момант, калі ў аўдыторыі амаль нікога не было, падышоў да Марылі, яна сядзела на сваім заўсёдным месцы, і моўчкі паклаў ёй на парце запіску: «Марыля! Прыйдзі сёння а 17-й гадзіне ў парк. Буду на алеі, ля чырвонай вежы. Чакаю абавязкова. Алёша».

Апошні ўрок я сядзеў бы на гарачым вуголлі. Добра, што гэта быў урок спеваў і на ўроку, як заўсёды, было весела і шумна. Мы развучвалі новую песню, якая толькі што з'явілася. Яна пачыналася словамі: «Дан приказ — ему на запад, ей — в другую сторону...» Я стараўся не глядзець у той бок, на перадапошнюю парту. На сваім месцы задумлівая і трошкі сумнаватая — Марыля, але ўсё ж нейк нашы вочы стрэліся, і я прачытаў у іх згоду. Яна, канечне, запіску прачытала.

Вядома, я хваляваўся і ўвесь урок пакутаваў, аж згараў ад сораму — мне здавалася, што пра гэта ўжо ведаюць усе. Касцючык, мой нязменны сусед па парце, усё піхаў мяне ў бок і стараўся рассмяшыць, паказваючы, якую модную прычоску зрабіла сабе Геця — Гертруда Леўчык, у якую ён быў закаханы па вушы. Яны ўжо не раз хадзілі ў кіно, сустракаліся і ў парку. А мне, вядома, было не да смеху. У думках я ўжо караў сябе і ўяўляў, якім дзіваком буду я заўтра выглядаць, калі Марыля не

адгукнецца. А калі прыйдзе, як ёй выказаць усё, чым перапоўнена сэрца?

Марыля ў парк прыйшла. Я заўважыў яе здалёк — яна сядзела на лавачцы непадалёк ад чырвонай вежы, зарослай здзічэлымі кустамі бэзу. Яе ваўняную шапачку я пазнаў бы, заплюшчыўшы вочы. Ціха я падкраўся з-за кустоў, памкнуўся падысці незаўважна, але нейкая галінка пад нагой трэснула, і Марыля абярнулася, паклала на калені кніжку (яна, відаць, чытала яе), побач ляжаў яе стараваты дэрмацінавы партфелік, з ім Марыля хадзіла ўсе гэтыя гады. Імгненна мільганула думка: як доўга мы разам і як доўга не адважваліся стрэцца!

— А я ўжо думаў, што не прыйдзеш, Марылька! — недарэчнае вырвалася ў мяне.

Радасць і хваляванне працялі ўсяго. Кроў горача штурхала ў скроні, я адчуў, што ўвесь пачырванеў.

Марыля ўзняла на мяне вялікія, трошачкі сумныя, у пушыстых вейках шэрыя вочы, ледзь крануліся яе прыпухлыя, з цёплымі смяшынкамі ў самых куточках вусны, і яна ціха прамовіла:

— Сядай, Алёша...

Мы маўчалі. Падалося мне, вельмі доўга. І наўкол усё як аціхла, замерла. Толькі ўнізе, на вірлівай плыні ракі, якая ўсю доўгую зіму была скавана тоўстым ільдом, глуха і дрыготка шумелі крыгі, з трэскам трушчыліся адна аб адну, і ад моста аж сюды даносіліся адрывістыя, прыглушаныя далеччу галасы і гукі.

Здаецца, яшчэ ніколі я не бачыў Марылю такой прыгожай і адухоўленай. Я глядзеў на яе, бы заварожаны, баючыся дакрануцца, патрывожыць яе недарэчным словам. У тое імгненне хацелася столькі сказаць ёй, вытлумачыць усё, што набалела за ўсе гэтыя гады.

Марыля сядзела блізка ад мяне, схіліўшы галаву. Маўчала, гаварылі адно яе вочы, праменячыся ласкай і цяплом з-пад чыстага пукатага лба. Яна маўчала, але і маўчаннем сваім казала мне многае.

— Во ты ўжо, Алёша, паедзеш скора,— як у одуме, нарэшце азвалася яна.— Я табе зайздрошчу...

І ўздыхнула. Падалося, балюча, але мне аддалося ў сэрцы, аж зашчымела нешта пад грудзямі.

— А я спадзяваўся, Марылька,— вымаліў я, п'яны ад шчасця,— што і ты паедзеш з намі. Я вельмі хачу, каб мы былі разам...

— Ты так толькі гаворыш,— Марыля гарэзліва пакі-

вала мне пальчыкам і трошкі весялей усміхнулася,— а сам пішаш лісты некуды, у нейкі там Крывы Рог, ці што... Відаць, тая хахлушка-прысуха прысушыла сэрцайка...

Я, як утрапёны, пачаў горача і шчыра тлумачыць усё, як было. Гэта ж сапраўды так: Каця — мая знаёмая, мы жылі па суседству. Яе бацька ў нашай вёсцы старшыняваў. З маім бацькам таварышавалі.

— А ведаеш, Марылька,— казаў я далей, і, падалося, Марыля паверыла, стала слухаць з цікавасцю,— яе маці памерла маладой. Пахавалі яе ў нашых Бацькавічах. І Каця ўжо з Крыварожжа прыязджала на матчыну магілку. Ну, што ж тут такога, што яна піша мне? Яна, мабыць, сумуе. І я ёй спачуваю. Яна, ведаеш, добрая, шчырая...

— Хіба я супраць? Пішы,— з уздыхам прамовіла Марыля, і яе бледны, асветлены заўсёднай думкай круглявы твар як спахмурнеў, а вусны крануліся сумнай усмешкай.— Але ж вы, хлопцы, усе такія...

— Якія ж, Марылька?..

— Улюбляецеся абы-як, без разбору...

...Незаўважна сплылі попельныя хмурынкі, што былі застаяліся над паркам; з-за высозных, калматых у вершалінах соснаў бліснула промнямі-залацінкамі вячэрняе сонца і адтуль, прабіўшыся праз густыя вершаліны, дапяла сюды, у набрынялае сокамі галлё бэзу і чаромхі. Цёплымі, мяккімі коцікамі клаліся яны, промні, на рукі і твар Марылі, як бы песцілі і гладзілі яе, яна светла і хораша ўсміхалася.

Званочкам гучаў яе голас, мяккі і ласкавы:

— Ды не злуйся ты, Алёша... Гэта я так, пажартавала. Я ўжо ўведала крыху цябе... Гэта ж дзіва... Падумаць толькі... Тры гады скора?..

— Так, Марылька, тры гады,— падхапіў я і ўзрушана і беражна ўзяў яе за руку, мяккую і цёплую, і мяне ахапіла хваляванне. Дрыжачым, як не сваім, голасам я прамовіў: — Марылька... Дарагая... Любая... Каб ты ведала... як я... кахаю цябе... Марылька!

Яна была як быццам вельмі спакойная. Глядзела мне ў вочы — ласкава і загадкава ўсміхалася. А мо гэта сонца, маладое, але стомленае за доўгі дзень шчыравання, так ажывіла яе самотна-задумлівы твар у белай шапачцы, якая гарэзліва ссунулася, адкрыўшы гладка прычасаныя, залацістыя ад сонца валасы. Яе ўсмешка, чароўная і та-

емная, і радавала, і палохала. Марыля нахілілася незнарок, і я няўлоўна дакрануўся да яе напаўадкрытых цёплых вуснаў. Марыля лёгенька адхінула мяне, а сама, як злоўленая ў сіло птаха, аж страпянулася.

— Алёша, не трэба,— шапталі яе крышку аж асмяглыя вусны, а яе рука, што ляжала ў маёй руцэ, адазвалася лёгкім, амаль нячутным, мабыць, падсвядомым, поціскам.— Не трэба... Хто-небудзь нас убача...

— Няхай! — хацелася мне крыкнуць. Але я адно горача і нязграбна цалаваў Марылін твар, валасы. Яна, як самлелая,— не баранілася.

14

Марыля цяпер, пасля таго як выпісалася з бальніцы, жыла недалёка ад нашай вуліцы ў драўляным дамку пад чырвонай цяжкай чарапіцаю. Наймала ў гаспадыні маленькі, як паставіць ложак і столік, пакойчык. Яго і пакойчыкам нельга было назваць, правільней — гэта быў закутак. Амаль кожны дзень з заняткаў мы ішлі разам, бо ў нас ужо была адна дарога, і часам Марыля дазваляла мне праводзіць яе да самых веснічак, а праз нейкі час дазволіла зайсці на кватэру.

Як хораша, калі ты кахаеш і табе адказваюць узаемнасцю. Сапраўды, каханне пераўтварае чалавека: слабога робіць моцным, нясмелага — смелым, нават адважным...

Марылі ж, мабыць, каханне прыносіла пакуты. Яна толькі часамі была вясёлая і, як мне здавалася, радавалася нашым спатканням. Амаль заўсёды думна-самотная, яна, відаць, насіла ў сэрцы нешта цяжкае, цяжар нейкі, і не хацела, каб яе хто трывожыў, дакранаўся да таго, што балела і знібела.

Мы ніколі не гаварылі пра яе хваробу. А так хацелася сказаць ёй, што ніякая хвароба — не перашкода нам. Я кахаю яе яшчэ мацней. Але як усё гэта выказаць ёй, каб не пакрыўдзіць, не абразіць сваім шкадаваннем?

Мяне перавялі ў групу будучых курсантаў, і пры сустрэчах Марыля расказвала, як ідзе жыццё ў іх, якія планы ў выпускнікоў, хто куды збіраецца на працу.

Неяк мы сядзелі ў яе пакойчыку позна. Гаварылі аб розных дробязях. Марыля была надзіва вясёлая, жартавала.

— Чуеш, Алёша,— пасля нейкай паўзы загаварыла Марыля, папраўляючы на плячах цёплую ваўняную хустку, усміхаючыся стрымана і светла, як толькі ўмела ўсміхацца яна.— А наш Слыш ходзіць надзьмуты, як індык, нават у мой бок не глядзіць. А памятаеш, як ён заляцаўся... А ведаеш чаму?..

— Мабыць, здагадваюся,— кажу я і замілавана гляджу на Марылю. Мне карціць сказаць ёй пра тое, што яе так трывожыць. Мне шкада Марылі. Усё гэта Слыш — пусціў плётку пра хваробу Марылі. Чалавек без душы!..

— Гэта ты, Алёша, праўду кажаш,— Марыля сцепанулася і ўздыхнула.— Ён дазнаўся пра ўсё. Не ведаю і не хачу ведаць. Але, разумееш, мне было так балюча... Хацелася кінуць вучобу і з'ехаць куды...— Марыля закрыла твар рукамі і бязгучна, з ледзь чутным усхліпам расплакалася.

— Не трэба, Марылька, сціхні,— стараўся суцешыць, супакоіць яе, але яна, расчуленая, яшчэ больш расплакалася, не стрымліваючы слёз. Мне было шкада яе, я злаваўся на сябе і на ўсіх на свеце, што не магу ў гэты час памагчы ёй. Я ж ведаў, што ёй няможна хвалявацца, і ад гэтага таксама пакутаваў не менш. Што мне рабіць з гэтымі курсамі? Можа, узяць ды не ехаць, каб быць бліжэй да Марылі, не разлучацца да канца вучобы, а тады ўзяць накіраванне ў адну школу ці хоць у адзін раён? Але чаму такая думка не прыйшла ў галаву раней, калі фарміравалася група? Цяпер жа заканчваюцца заняткі, і праз якія тыдні два — ад'езд... Што будзе з Марыляй, калі мы раз'едземся? Як я буду без яе?

Трэба было гаварыць, а я маўчаў, бо не верыў, што мае словы, няхай самыя шчырыя і ласкавыя, памогуць і зменшаць яе душэўны боль. Я толькі беражна ўзяў яе цёплую руку і пацалаваў.

Марыля страпянулася і аціхла, відаць, выплакаўшыся, узняла галаву, выціраючы слёзы, усміхнулася, і яе бледнаваты, як мармуровы, твар прасвятлеў трапяткім святлом удзячнасці ці нечага яшчэ, чым вымяраецца радасць чалавечая ў мінуты яго душэўнага ўзрушэння.

— А ведаеш, Алёша,— Марыля ўсё яшчэ ніяк не магла супакоіцца і дыхала перарывіста: пад шэрым світэрам высока ўздымаліся акругла-дзявочыя грудзі,— я адгадваю, пра што ты зараз думаеш... Хочаш, скажу?..

— Скажы, Марылька!

Яна весела і гарэзліва ўскінула на мяне свае вялікія,

асмужаныя журбою вочы, стала зноў сур'ёзная і загадкавая:

— Не! Хацела сказаць, але няхай застаецца нашай тайнай. Добра?

— Як сабе хочаш...

— Давай лепш пагуляем у пошту,— прапанавала Марыля і паклала перада мною чысты аркушык паперы і аловак.

Я напісаў ёй першы: «Д. Л. М. Я. М. М. Ц. К. К. Н. У. Ж!..»

Марыля адразу ж, відаць, прачытала. Яна, нічога мне не кажучы, узяла з рук гэты аркушык і вывела тры роўныя прыгожыя літары: «Я. К. Ц.». Тады падумала і парушыла нашу гульню — надпісала: «Алёша + Марыля = любоў».

Успомнілася, як нас абаіх некалі даймалі гэтымі надпісамі ў групе, і падумалася, што Марыля жартуе, але паглядзеў на яе і ўбачыў у яе вачах каханне, кінуўся было яе абдымаць, але Марыля злёгку адхіснулася, схавала твар у пуховую хустку, якая зграбна ляжала ў яе на плячах.

— Алёша, Алёшачка!..— і яе здавіла рыданне. Яна закашлялася і адхінула мяне ад сябе: — Дарагі мой, не цалуй мяне...

Супакоіўшыся, яна была зноў даверліва-ласкавая і вясёлая. Мы доўга сядзелі, прытуліўшыся адно да аднаго, і марылі пра будучыню. Хутка скончыцца вучоба. Я вярнуся з курсаў. Марыля таксама атрымае пасведчанне настаўніцы. І мы будзем разам, можа, нават папросімся ў адну школу.

На развітанне Марыля папрасіла, каб я не прыходзіў больш да яе — ёй цяжка, яна адстала і цяпер хоча нагнаць упушчанае. Набліжаліся экзамены. Я згаджаўся з Марыляй — мы развітваліся. Колькі разоў і на двары, і за веснічкамі. Яна мяне праводзіла да нашай вуліцы, тады праводзіў яе — не мог жа я дзяўчыну пакінуць цёмначы адну і суправаджаў яе да весніц. І так доўга, аж пакуль на высокім небасхіле не гаслі зоры і з-за хмар выплываў акрайчык месяца.

...Раптоўна наблізіўся час ад'езду. Нас, пасланцоў у Мінск, праводзілі не толькі ўсе мае аднасумы, але многа хлопцаў і дзяўчат з малодшых класаў. У кожнага, хто

ад'язджаў, заставаліся сябры: у хлопцаў — дзяўчаты, у дзяўчат — хлопцы.

На вакзал у купцы хлопцаў і дзяўчат дыбаў і Вася Слыш, ганарліва, з вышыні свайго амаль двухметровага росту пазіраў на ўсіх і нешта ўсё шаптаўся з Аняй, да якой цяпер, казалі хлопцы, увішна закідваў свае сецізаляцанні.

Многія, напэўна, не на жарт здзівіліся, убачыўшы, што на праводзінах была і Марыля Бутрымава, якая ўвогуле апошнім часам старанілася кампаній, ведаючы цяпер адно — кнігі і падручнікі. Нашых не столькі здзівіла тое, што яна прыйшла, а больш, вядома, што яна, не сароме-ючыся, стаіць і размаўляе з Баянком, да якога, ведаюць усе, была раўнадушная. Ніколі ніхто ў класе за тры гады не бачыў, каб Марыля неяк выдала свае пачуцці. Усе ведалі добра адно: Алёшка сохне па Марылі, дзіва, закахаўся ў яе па вушы, а яна, гардуніца, нават і вокам не вядзе. Канечне, такая відная дзяўчына, сур'ёзная, строгая, а Алёшка — ветрагон, сёння закахаецца — заўтра пасварыцца і будзе да другой заляцацца. Але ж, глядзі, і ён нешта сумны, галаву апусціў, канечне ж, таксама перажывае. І яна горная. Вочы стомлена-сумныя, самотна глядзіць спадылба: боль і жальба ў яе вачах...

— Пройдземся далей, ад усіх,— кажу я Марылі ціха, каб не ўчулі Касцючык і Цімашонак, якіх паклікаў нечага да сябе Слыш і ўсё нешта падмігваў і хіхікаў у кулак, незаўважна кідаючы позіркі ў наш бок.

— Пройдземся,— згаджаецца Марыля.

Мы паволі крочым паўз вагоны, думаючы, відаць, абое аб адным — як нялёгка было нам сустрэцца, пакуль паразумеліся, і як нечакана ўсё наша збудаванне, на якое пайшло столькі часу, бурыцца.

Хочацца сказаць Марылі нешта тое адзінае, чым перапоўнена душа, але такіх слоў не знаходзіцца, і мы моўчкі глядзім адно на аднаго — гавораць нашы вочы, гавораць нашы сэрцы...

Але ж і сказаць нешта трэба, ды ўжо і аб'яўляюць пасадку.

Што пажадаць ёй на развітанне? Што ж, вядома,— шчасця! Але якое яно, тое шчасце? І наогул — што такое шчасце? Чалавек павінен сам вызначыць, што з'яўляецца шчасцем менавіта для яго.

Я спрабую пажартаваць, кажу, што звычайна кажуць у такія хвіліны:

— Што ж, Марылька, не сумуй — хлопцаў многа!..

Марыля не прыняла жарту. Затуліўшыся ад набегшага нечакана калючага, з крупкамі, снегу, ветру, яна дакорліва і самотна пазірала мне ў вочы — у яе вачах былі слёзы. Аднымі вуснамі яна прыглушана-ціха, як не з самай глыбіні душы, вымавіла:

— Бывай, Алёша. Наўрад ці ўбачуся з табой...

І аберуч абхапіла мяне за шыю, прытулілася мокрай, палаючай шчакою да майго твару.

— Да сустрэчы, Марылька! — сказаў я і задыхнуўся ад камяка ў горле. Авалодаўшы сабою, ужо на прыступках вагона крыкнуў: — Я табе напішу, Марылька! З Мінска напішу!..

Цягнік, здрыгануўшыся, рушыў. Усе хлопцы і дзяўчаты, што засталіся за вагонамі, махалі нам рукамі, кепкамі, хусцінкамі. Я лавіў вачамі постаць Марылі, але яна недзе згубілася ў натоўпе, а над усімі матлялася стаўбунаватая галава Ваські Слыша. Падалося, ён зласліва пасміхаўся.

Было балюча на сэрцы, хацелася плакаць, хоць вакол у вагоне хлопцы і дзяўчаты жартавалі, весяліліся — усіх нас чакалі новыя радасці і хваляванні; мы ж ехалі ў сталіцу, якую бачылі толькі ў снах.

Было горка на душы. Як аднекуль знутры, з глыбінь душы, усплылі словы верша, які любіла слухаць Марыля: «Мне доўгае расстанне з вамі чарней ад вашых чорных кос...» Як бы для нас абаіх сказаў паэт: «Чаму ж нядобры час прынёс мне доўгае расстанне з вамі?..»

Боль душы памалу аціхаў, але заспакаення не прыходзіла. Ад чаго баліць закаханая душа? Як суцешыць яе боль, чым суцешыць?

15

Віруе памяць. Як хвалі, то аціхае, то ўздымаецца грэбнямі; то плыве паволі і ціха, як у сне...

Нядаўна мы, студэнты-выпускнікі, ехалі ў Мінск, на курсы, і ўжо зноў дарога. Праляцела, як на гарачых навальнічных крылах, лета. Хутка праскочылі тры месяцы вучобы. І вось хваляванні перад размеркаваннем на працу.

Мне выпала Уздзеншчына, тады прыгранічны раён. Але перад гэтым зусім выпадкова я сустрэўся з Аляксеем

Свербікавым, нашым бацькавіцкім настаўнікам і камсамольскім сакратаром, і ён мне параіў прасіцца на радзіму, у свой раён. «Прыязджай удвору,— сказаў пры сустрэчы Аляксей Мікалаевіч.— У сваіх людзях абжывешся, скінеш свае гэтыя транты, бо бачыш, у чым ты ходзіш: штаны адны, ды і тыя кароткія, шкарпэткі павытыркаліся, а рубашак, як той казаў, яшчэ меней...»

На размеркаванні, паслухаўшыся Аляксея Мікалаевіча, я так і сказаў: «Хачу ў свой раён, на Маластоўшчыну». Старшыня камісіі паглядзеў на карту, тады на мяне і згодна кіўнуў галавой: «Добра, пішыце». Нехта тут быў запярэчыў, маўляў, камсамолец, выдатная характарыстыка, але старшыня махнуў рукой: «Нічога, там, у той глушы, патрэбны энтузіясты...»

...Я выскачыў з цягніка на сваёй станцыі Камунары з лёгкім чамаданчыкам у руках. У ім мой небагаты скарб: канспекты выкладчыкаў Карабана і Ларчанкі, якія на курсах чыталі лекцыі па літаратуры, ды салатавая віскозная рубашка, купленая на ганарар, атрыманы за допісы ў «Чырвоную змену», якія яшчэ пасылаў у рэдакцыю з педвучылішча.

Дагараў прагорклы пылам і кветкамі жнівеньскі надвячорак. Пацягнула нечым знаёмым. Нібы віталі мяне і гэты белы дамок станцыі ў зеляніне, і прыдарожныя платы, і дарога, зацярушаная свежым, адсырэлым сенам і конскімі яблыкамі, рассыпанымі па ёй.

З другога боку станцыі, паўз агароджу, тоўпілася чародка падвод; ля іх спаважна і заклапочана выдыбвалі вазакі. Да іх похапкам спяшаліся пасажыры ад цягніка, ад якога засталіся толькі кольцы дымкоў.

Бацька стаяў ля фурманкі, запрэжанай у пары гнядых, маладых, кражыстых цягавікоў, якіх здаў калгасу Пятрок Казёл. Некалі мы з Шылаём пры старшыні Гопку запрагалі гэтую пару ў жняярку. Бацька, апрануты ў выцвілую на плячах картовую сарочку навыпуск і ў чорныя штаны-суконнікі, кепачка ссунута на патыліцу,— выцягваў жылістую шыю і зіркаў вакол, шукаючы вачамі, канечне ж, мяне. Убачыўшы, скрывіўся, як не заплакаў, смяшліва жмурачыся, бы ад сонца, хоць яно ўжо, нізкае і негарачае, утапілася ў недалёкіх местачковых прысадах, кудою нам кіраваць.

— Што, сынок, прыехаў? — як для прыліку, спытаў бацька і памкнуўся перахапіць у мяне з рук чамаданчык. Тады спыніўся і абхапіў мяне за шыю, дыхнуў махорач-

ным дымам і прыхінуўся калючай шчакой да майго твару: — А я ўжо думаў, што падвёў мяне, случылася, можа, якая затрымка. Усе пасажыры ідуць, а цябе няма... Вот праява!..

— Дык народу ж цьма-цьмушчая,— сказаў я, стрымліваючы шчымлівасць сустрэчы.— Здаецца, і спяшаўся, а во трохі як забавіўся...

— Дык, хлопча,— пачаў бацька, ладкуючы мне мясціну на возе,— цяперака людзі не хочуць сядзець на месцы. Я вот і думаю: куды яны, етыя людзі, едуць, чаго шукаюць,— і перавёў гаворку на жарт: — Я, канечне, па сына еду. А куды ж едуць астатнія?..

Глянуў я на пярэстую, у клетачкі, посцілку — матчына тканне,— і стала неяк да болю ў грудзях прыемна, усяго ахапіла нейкае невыказна шчымлівае пачуццё, якое не адразу вытлумачыш словамі. Відаць, так заўсёды хвалюецца кожны, хто пасля ростані страчаецца з роднай мясцінай.

Выкіраваўшыся на брукаванку, якой ужо вымасцілі шлях ад станцыі да мястэчка, пусціўшы коней — яны лёгка зацокалі капытамі, мабыць, адчулі, што дарога вядзе дамоў.

Неба ўвачавідкі ніжэла, сутоньвалася, і волкая свежасць гусцела; пахі палёў, такія знаёмыя і шчымлівыя, наплывалі хвалямі, і ці ад іх, а можа, ад грукатлівай язды з непрывычкі аж кружылася галава...

Бацька паляпаў сябе па кішэнях і, не знайшоўшы нічога, расчараваны павёў вакол дзюбатым носам, пашкадаваў, што не купіў курыва на станцыі.

— Во, тата, вазьмі,— абрадаваў я бацьку і працягнуў яму пачак «Казбека», які купіў у Мінску, ведаючы, што бацька — заядлы курэц і без табакі, пэўна ж, не пражыве і паўдня.

— Ну, браце, не пазнаю я цябе, далібог! — ушчуваў нязлосна мяне бацька.— На такія дарагія папяросы раскашэльваешся... Глядзі, бо гэтак ураз агалееш...

А ў голасе — удзячнасць і цеплыня, і гэта радуе і падвясельвае і без таго радаснае хваляванне сустрэчы. Канечне ж, бацьку падарунак прыйшоўся па душы. Ён доўга разглядаў пачак, не рашаючыся раскрыць, а курыць яму хацелася. Праўда, не ў навіну яму такія шыкоўныя папяросы. З шахтаў заўсёды прывозіліся дарагія папяросы. Канечне ж, адзін пачак. І распячатваўся ён, калі ў дзень прыезду ў хату набівалася на адведкі суседзяў і

радні. Кожнаму, бывала, хто зойдзе, бацька прапаноўваў папяросу і казаў з жартаўлівай паблажлівасцю: «Закурвай, браток. «Наша марка» — куры сам...» А цяпер, як бы і не бачыў ніколі такіх папярос — круціў пачак у руках, радуючыся. Радасць была, пэўна ж, ад таго, што яму паднёс гэты пачак не хто іншы, а ягоны сын, якога ён любіць і, можа, не толькі, што во ён — у яго адзіны, яго ўцеха, але і таму, што во ён — ужо настаўнік. А гэта для яго, колішняга галетніка, як ні кажы, а найвялікшая радасць. Лічы, на ўсю вёску — адзіны настаўнік. Ёсць у Бацькавічах яшчэ Мікола Верабейчык, але той мала вучыўся, нейкія там гадавыя курсы прайшоў і настаўнічае ў пачатковай школе. А тут пасля сямігодкі — яшчэ тры гады... І ўсё лета — зноў на курсах. Сапраўднай навукі хапіў хлопец і кніжкі не выпускае з рук, усё вучыцца і вучыцца.

Нарэшце бацька аддае мне лейцы і прыпальвае папяросу, робіць запар аж тры зацяжкі, пускае кольцы сіняга дымку, які віецца над возам і хутка знікае ў сутонні. Я гляджу на бацьку і хачу адгадаць, спадабаўся яму пачастунак ці не, а ён маўчыць, смачна зацягваецца дымам. Счакаўшы крыху, пытаюся:

— Ну, як папяросы, спадабаліся?..

— А нічога, папяросы добрыя,— азваўся бацька і, падалося, іранічна ўхмыляўся ў шорсткія вусікі: — Толькі не для мяне такая хэнць. Мне б махорачкі нашай — ета дзела, а «Казбек» няхай такія кураць, як ты во... А сам, кажаш, не курыш, не налаўчыўся?..

— Не! Мне ета курэнне — пустое дзела,— кажу я, пазіраючы, з якой прагай натольвае сябе дымам бацька.— Вот паглядзець на карабок, на прыгожую этыкетку люблю, а курыць не хочацца...

— Ну й малайчына, добра робіш, што не курыш,— прамаўляе, як падалося, без асаблівай шчырасці бацька і бярэ ў свае рукі лейцы.

Надоўга мы замаўкаем. Толькі на ўскрайку мястэчка, праз якое наша дарога, бацька пытае:

— Алёшка, можа, заедзем. Тут, у мястэчку, у мяне даўні таварыш, яшчэ з тае службы, калі быў у Горках, у маёнтку Стоша, як саўгас там зачыналі. Пераначуем, а тады з зарою і паедзем. Як ты думаеш, сын?..

Прыемна, што бацька мяне ўжо мае за дарослага і раіцца, як з роўняй. Канечне ж, такая ўвага мне недарэмна, бо я не вясковы лабідуда, а чалавек самастойны — настаўнік! Паразважыўшы, я рашыў, што нам бавіцца не варта:

вечар ціхі, яшчэ віднавата, хоць і высыпалі ўжо вячэрнія зоры, іх сяйво расце, ахоплівае як не ўсю нябесную прастору. Пазіраючы ў цёплую далячынь, як кажу:

— Не, відаць, трэба рухацца. І надвор'е нам шэнціць. Паедзем, тата!..

— І то праўда,— бацька зухавата паправіў кепачку, прапахлую вугальным гарам, і ўвішна крануў коней.— Пакуль відна, дабяромся да Казелля, а там двор як рукой падаць. Свая зямля ўжо,— і зухавата прысвіснуў: — Но-о, мілыя!..

Рассоўваючы сена на возе, бацька пачаў ямчэй месціцца, прылёгшы на бок, і мне наказаў, каб і я прылёг — дарога за мястэчкам віхляла паміж палёў; шлях знаёмы і для коней — гэтым шляхам з далёкіх калгасаў вазілі сюды на нарыхтоўку збожжа, і гэта быў такі ж рэйс, бо хто, які гаспадар дазволіць гнаць улегцы парку коней на добрыя пяцьдзесят вярстоў...

— Алёшка, прыспі трохі,— наказаў бацька, заўважыўшы, што я сцішыўся.— А я пакуру...

— Зноў курыва...— пакрыўдзіўся я.— І як етая гарката табе не абрыдне? Лепш бы цукерку калі пасмактаў...

— Во йта сын! — зарагатаў бацька, беручыся за пачак «Казбека», які ён быў ужо запхнуў у кішэнь суконнікаў, добра абшмараваных на каленях і пашчыканых гарачымі пырскамі ў кузні.— Ну, браце, ты і загнуў — цукерку замест папяросы... А ты ведаеш, што за папяросу, калі яе няма, я аддаў бы ўвесь полудзень, увесь абед, калі хочаш знаць. А ты кажаш, цукерка. Глупства — твае цукеркі! Вот, ета ж я і забыў,— як схамянуўся бацька, паказаў на валізку, што ляжала ў нагах, начэпленая пяньковай вяроўчынай за перадок.— Тутака нам маці наладавала правіянт у дарогу. Але ж я такі ядун, што амаль ні да чога не дакрануўся...

— Чаму ж ета? — вырвалася ў мяне. Я сапраўды здзівіўся, што ўвесь дзень, ад саменькага світанку ці, можа, ад учарашняе ночы, бацька нічога не браў у рот.— Можа, нездаровіцца?

— Не, дзякаваць богу. Не здаюся,— бацька зрабіў добрую зацяжку і праз кашаль загаварыў: — Во етаю штукаю,— ён патрос папяросай перад сабой,— магу жыць і дзень, і два — нічога, ні каліва не вазьму. Каб у дарозе чарачка — другое дзела. Але ж, халера, грошай не выстарчыла. Я ўжо і пазычыў бы, каб не такая спешнасць. Аббег суседзяў, але ніхто не пазычыў. А тут ехаць трэ-

ба — ведаю, што будзеш джгаць пехатою, калі ніхто не трапіцца на дарозе...

— Дак у мяне трохі грошай ёсць,— прызнаўся я, хоць мне і шкада было траціць тыя грошы, якія асталіся ад стыпендыі пасля білета на дарогу.— Можа, яшчэ крама дзе не зачынена...

— Нічога, у Дзяражні крамнік знаёмы,— адразу ажывіўся бацька, стаў бадзёра-струнке, бы маладзёнак.— Тутака да Дзяражні вярсты са тры, не болей. За вёскай, пры дарозе — добры лужок... Да й коней трэба было б пакарміць. І самі прымгнём на які часок. Сон пераб'еш!..

Здавалася, бацьку ўжо болей нішто не цікавіла, апроч той крамы ў Дзяражні і знаёмага крамніка, які і ў позні час дасць яму тое зелле, адзін напамінак пра якое надае нейкай чортавай жвавасці.

Як на тое ліха, у Дзяражні крама была зачынена, але бацька, не раздумваючы, прыпыніў фурманку каля дома з пафарбаванымі філёнкамі, у вокнах свяціла яркая лямпа, асвятляючы ўсю вялікую хату, з вазонамі кветак на вулічных вокнах. Лёгка саскочыўшы з фурманкі, бацька накінуў лейцы на штыкеціну загароды перад домам, сказаў мне коратка: «Пасядзі на возе — я мігам» — і знік за дашчанай брамай, заціснуўшы ў жмені тую пяцёрку, якую я перадаў яму перад уездам у вёску. Азваўся на ланцугу сабака за брамай, але чамусьці ўмомант і аціх, як чым папярхнуўся, пэўна ж, пазнаў госця.

Давялося доўга сядзець мне на возе, балазе, што сена ў драбінах навалена не ашчаджаючыся, і на цеплаватай дзяружцы я ўгрэўся і пачаў ужо драмаць, як бразнула клямка ў браме і перада мною спынілася таўставатая кабеціна, мабыць, гаспадыня, і як праспявала:

— Ну, малец, заждаўся ты тутака. Ідзі ў хату, бо счаўрэеш етак, скурчыўшыся... Ідзі, дзетка, не саромейся. Твой жа бацька — уга, які дабрэнны чалавек. З маім шахцёравалі, дак вунацька як убачыліся, то і трапкачом не разгоніш. Ідзі, кажу табе, у хату... Не бойся, дзетка!..

Што было сказаць гэтай зычлівай жанчыне? Ісці ў хату мне зусім не хацелася — на дварэ хоць і вусцішна, нейкія цені шастаюць у садах, сабакі брэшуць, аднекуль з закутка на вуліцу выплёскваюцца нечыя крыкі, галасы, але затое — над табою, у небе, сяйво зорак, і ўжо непрыкметна вызорваецца шырокая, праз усё неба, зорная дарога — Млечны Шлях, які вабіць, хіліць да разваг і думак.

Можна так бяздумна глядзець на вабныя жнівеньскія зоры, нічога не думаючы, толькі глядзі і глядзі — і на душы спакайнее, у галаве — такая яснасць, а ў сэрцы слодыч летуценняў.

— Дзякуй, цётачка,— пасля нейкага нялоўкага маўчання абзываюся і ўжо зусім рашуча: — Я пабуду тут. Скажыце бацьку, каб не бавіўся... Коні застаяліся...

Я ссунуўся з посцілкі, узяў вехцік сена, кінуў пад ногі коням, якія, мусіць, ужо змірыліся, што іх тут спынілі, і галава да галавы, як і я, мабыць, дрэмлюць, сцішыўшыся.

— Ну, як сабе хочаш,— згадзілася гаспадыня і ўжо зусім ціха, адыходзячы, у варотцах прабубнела: — Ета ўжо, відна, не бацькавага характару. Як і не Іванаў сын... Упіра, аднак жа...

«Кажы сабе што хочаш,— падумалася,— а я не пайду ў хату. Ета не дзела — дамовіліся ехаць, а тут раптам усё перайначылася. Вот бацька! Скажа сам, а тады і ўсё ягонае ляціць угару тармашкамі. А ўсяму віною, мабыць, гэта праклятая гарэлка. Праз яе ўсе беды чалавечыя. Тады чаму ж па ёй так смагнуць некаторыя? Нешта ж, мабыць, ёсць у ёй такое, што цягне чалавека, не раўнуючы, як бы чорт у балота?

Пачала разбіраць мяне злосць і на крамніка, які трымае дома гарэлку, і на бацьку, які як убачыць гэтае чортава зелле, то забываецца на ўсё на свеце, яму абы падагрэцца, а больш злосці было на сябе: «Навошта я даваў бацьку тыя грошы? Чорт мяне за язык пацягнуў, лепш бы памаўчаў...»

На гэты раз чамусьці доўга сядзець і чакаць не давялося — пэўна ж, гаспадыня ўсё ж знайшла зачэпку і развязала колішніх дружбакоў-шахцёраў.

Забурчаў нязлосна, для прыліку, сабака, грымліва бразнулі дзверцы ў сенцах, і ў цішыні знаёмы бацькаў басок, падвесяліўшыся ўжо, сам сабе спяваў: «Чарачка, каток, каціся ў раток...»

Доўгія развітанні, абяцанні дружбы і запрашэнні, поціскі рук, абдымкі. Нарэшце з брамы паказаліся бацька і гаспадар — з барадою каржакаваты дзядзька, якога я крыху ведаў, калі ездзілі тыя гады, як вучыўся, на станцыю, то часам спыняліся ў Дзяражні, ля гэтага дома.

— Што ж ты, братка, не зайшоў,— паўшчуваў мяне гаспадар.— Можа, ужо як падвучыўся, то гонар займеў

такі высокі. З намі, мужыкамі, і знацца ўжо не хочаш? Як цябе, здаецца, Ляксандрам клічуць?..

— Алёшка,— падказаў бацька, шукаючы лейцы, разамлелы ад шітва.— Не гань яго дужа, не дакарай, браце Сахонавіч. Мой ета хлопец — адзін у мяне. Можа, трохі і не майго кодла, відаць, у дзеда ўдаўся. Быў мой цесць такі ось, вялікі дакорнік, якога пашукаць — не знойдзеш. Не валяюцца, скажу табе, такія, Сахонавіч!..

Бацька кінуў лейцы мне, а сам пачаў поркацца ў кішэні — няйначай, той «Казбек» шукаў. Урэшце выцяг пачак, падаў дружбаку:

— Во, Сахонавіч, бяры і закурвай. Сынаў падарунак.— І зноў бярэцца за тое ж — хваліць мяне, аж злосць на яго бярэ.— Еты хлопец, мой сын,— ужо настаўнік. Ета, брат, табе не хунт ліха! Усім сынам сын, вот, скажу табе, Сахонавіч!

Яны кураць, гавораць усё і доўга не могуць развітацца — мне гэта ўсё ўжо такое не ў навіну: бацька любіць пабыць з людзьмі; умее з імі ладзіць і паразумецца, пабыць у кампаніі ахвотнік, але тут ён не згубіў зусім меры. Як ачомаўшыся, раптам похапкам развітаўся і крануў коней.

За вёскай, памаўчаўшы, пачаў зусім мякка, як зусім і не браў у рот ні каліва:

— Ты, Алёшка, не крыўдуй. Грошы я твае не звёў. Мяне пачаставалі, а грошай узяць адмовіліся,— і падаў мне тую маю пяцёрку. Затым адшукаў у перадку кайстру з салам, маласольнымі агуркамі, сваёй выпечкі хлебам на капусных лістах.— Во, бяры ды сілкуйся, а я тым часам прыкархну трохі...

Я адчуў, што прагаладаўся, і ўзяўся спрытна за яду. Дарога была торная — лёгка каціліся па ўезджанай каляіне колы, тады-сяды ўздрыгваючы па выбоінах — ездзілі ў тое лета тут многа і з паклажамі і паражняком, у жнівень дарога аж грымела ад вазакоў, падводы цягнуліся і ўдзень і ўначы — на станцыю з далёкіх і блізкіх вёсак адпраўлялі і збожжа, і лён, і пяньку, а ўвосень людзі пеклаваліся з бульбай — яе вунь колькі трэба было перабавіць з поля для гарадоў і шахтаў.

Бацька сапраўды задрамаў і неўзабаве ўжо спаў як забіты...

А мне хацелася пагаварыць, распытаць у яго пра ўсё, што там, у Бацькавічах,— я ж усю зіму і вясну не быў дома, і лета, лічы, прайшло на гэтых курсах. Не цярпе-

лася хутчэй прыехаць дамоў, і я ўсё падшавельваў лейцамі, хоць коні спрытна трусілі, мабыць, і самі спяшаліся, без майго панукання.

Месяц — амаль круглы, як падрумянены,— плыў, ныраючы глыбока ў сівыя воблакі, то выбіваўся на ўзбялелыя і падсвечаныя зорамі матава-светлыя паляны. Роўная таямніча-вусцішная паласа святла клалася на зямлю, прыціхлую і стомленую за дзень, адбіваючыся ценямі, падобнымі на гурбы воблакаў. Ад святла і ад мігцення зорак усё вакол — і прыдарожныя бярозы, і кусты, і пералескі ўводдалі, і купкі хат на далягляд зе,— усё было як бы абсыпана беллю ці алавяным срэбрам, і толькі калі з неба, як з рэшата, раптам пасыпаліся зоры і зямля, нейкая дзіўна-казачная істота, паплыла бязважка,— стала неяк боязна, і падалося, што зараз усё, што ёсць вакол,— і вёска, што чарнее на пагорку грывастымі прывідамі, і поле, на якім яшчэ стаяць копы грэчкі, мэндлікі аўса,— усё, здаецца, можа знікнуць, у адно імгненне, як згарэць у агні.

Ціхая, млявая плыве месячная жнівеньская ноч над зямлёю, асветленай зяяннем Млечнага Шляху. Забыўшыся на ўсё, гляджу, як утрапёны ці заварожаны начным таямніча-казачным, на зоры, неадрыўна доўга, да болю ў вачах, і мне падаецца: усё — і фурманка з коньмі, і сонны бацька, які здаецца зусім нежывым, бо не чуваць ягонага дыхання, і дарога, і поле, і вёска на прыгорку — дзіўна неяк рухаецца, плыве, як на зыбучых хвалях...

Як ноч, як месяц, што недасягальнай залатой лодкай нырае між воблакаў, чапляючыся за зоры, здаецца, сам ты некуды плывеш, бо сядзіш не на фурманцы, засланай пярэстай дзяружкай паверх свежа-волкага сена, а на лодцы-месяцы і плывеш кудысьці ў недасяжна-далёкія светы, у казачную бязмежнасць.

Але вось аднекуль, з-за прыдарожных бяроз, дыхнуў зябкі халадок, і ўраз астуджаецца твар, коні, адчуваючы прахалоду ночы, стрэсваюцца, фыркаюць, раздзімаючы ноздры, дыхаючы цёплай парай, і ты вяртаешся ў рэальны свет. Робіцца неяк вусцішна. Хочацца затуліцца ў посцілку, надыхацца вольнай травою-кошанкай і думаць.

Як нядаўна ўсё тое было і як яно, тое радасна-балючае, чым поўнілася юначая душа, сплывае, растваряючыся ў цішыні гэтай зорнай ночы...

З галавы не выходзіць вобраз Марылі. Якая ты загадкавая, бы вунь тая зорка... Мая мілая зорка Канікула, дзе ты там у сваім сузор'і? Што з табою? Няўжо ў цябе сэрца каменнае і ты, мабыць, ужо забылася на таго, хто, як цень, неадступна глядзеў на цябе, як на сваю зорку? А цяпер ты ахаладалая, засталася вернай сабе, толькі на мігценне, на згубу яму, мабыць, аднойчы адкрылася і падарыла яму адно праменьчык свайго святла.

...Плыве ноч.

Памяць выхоплівае то адзін, то другі моманты расстання з Марыляй перад ад'ездам у Мінск.

«Я напішу табе, Марылька...» — гукаў я пад развітальны гудок паравоза. «Буду чакаць цябе, любы!» — падалося, шапталі яе асмягла-гарачыя губы, дотык да якіх не забудзецца ніколі.

Зорка Канікула! Так у думках назваў я сваю мару яшчэ тады, у летнія месяцы, на вакацыях, і яе вобраз стаў як бы часцінаю мяне самога. Няўжо здарылася самае горшае — яна, Марыля, стала ўсяго толькі зоркай?

Мо гэта яна памігвае з цёмнай, бяздоннай высі і кліча, заве да сябе, каб не разлучацца навек.

Загадваю сабе зорку. У сузор'і Сірыуса ёсць адна светлая і прыгожая. Улетку яна з мірыядаў зорак, што мігцяць, бліскаючы і пераліваючыся, вылучаецца роўным матава-белым святлом. Яе добра відаць у ліпені і ў першай палове жніўня ўвечары і сярод ночы...

Зорка Канікула, скажы, будзь ласкава, ці сустрэну я цябе? Калі мы будзем разам?

Зоркі сыплюцца. Лятуць і рассейваюцца. Цэлыя раі зорак з Млечнага Шляху, бытта шырокая ў Бацькавічах палоса, што калгасу дасталася ад Карпа Півоні, на якой заўсёды радзіла каласістае, умалотнае жыта...

...Тупаюць памалу коні, і яны, пэўна ж, здарожыліся, лена, як спрасоння, пагойдваецца фурманка. Варочаецца ў сне бацька, прыцмоквае і нешта гаворыць — яго голас, здаецца, ідзе аднекуль як з-пад зямлі. Ледзь чутна варушацца колы фурманкі, і дарога закалыхвае: вочы зліпаюцца, плюшчацца. Каб не заснуць, паноквaю на коней, шлёгаючы лейчынай.

А ноч во шастае сваімі нячутнымі крыламі, бы нейкая жывая істота. З-за павароткі нібы насоўваецца штосьці чорнае, як здань. Гэта месяц схаваўся за хмары, якія наплылі раптам, і закрылася ўсё неба. Стала боязна. Па

целе аж пабеглі дрыжыкі, за шыю папаўзлі мурашкі, на галаве як падхапіў хто валасы...

— Тата! Тата! — пачаў я тармасіць за плячо бацьку.— Прачніся. Ужо, мабыць, блізка Казелле!..

Лес наплыў зусім нечакана і як праглынуў дарогу. Стала цёмна, хоць вока выкалі. Мо я крыху задрамаў, і ўсё тое, што толькі што бачылася — і месяц-поўня, і зарапад, і зорка Канікула, якую ўжо ніяк не адшукаць на цёмным небе. Яно звузілася і святілася зусім вузкай шэрэй палоскай. Акурат, як палоска-шнурок Восіпкі Зайчыка, на якой не тое каб жыта, але і мятлюг не хацеў расці, калі ў Бацькавічах жылі аднаасобна.

Колы затарахцелі па карэннях, і фурманку трэсла, аж не ўседзець на месцы. Бацька нарэшце прачнуўся, пазяхнуў смачна, падняўся на ўколенцы, зябка пацепваючыся і адкашліваючыся.

— Дзе ета мы ўжо? Мабыць,у Казельскі лес уехалі? Во йта праспаў... Ну, брат, і спаў жа я, аж бакі адляжаў. Спаў як пшаніцу прадаўшы... А ты, мабыць, знябыўся адзін? Ці палуднаваў жа хоць? Тамака было ўсяго. Маці наладавала добры гаман... А гарэліца ў крамніка, халера, моцная. Не руская горкая, а свайго заводу — самагонка. Чаркі дзве як ўзяў, дык во амаль усю дарогу і праспаў. А ты, Алёшка, не крыўдуй. Я да яе, халеры, цяпер не надта ўлягаю...

Я працягнуў руку да кайстры:

— Можа, і сам перакусіш? Бо я ўжо еў крыху...

— Я не хачу,— пазяхнуў бацька, паляпаў рукамі па кішэні.— Перакурыць — ета дзела!..

— То раскажы, тата, што там у нас дома? — нарэшце я спрабую загаварыць пра тое, што рупіла.— Як там нашыя хлопцы? Што новага ў нас?

— А дом, знаеш сам, на месцы, нікуды не ўцёк. Усё, можна сказаць, як было, так і ёсць. Свербікаў жа паехаў у Мінск, то там ты з ім бачыўся. Калі бачыліся, то ён табе нешта ж расказваў?

— Так. Збольшага...

— І пра Каваліка казаў? — бацька зрабіў зацяжку і закашляўся.— Знялі Іллюка ўжо. Брыгаду прыняў. І то бегае, як падсмалены ганчак... Нічога, ета яму пойдзе на карысць. Будзе помніць, як чужым розумам жыць. А людзей, скажу табе, не правядзеш. Людзі цябе бачаць, які ты і куды ты хінеш. Як ні ўмееш лоўка фінціць, але ад людзей не схаваешся. Ета толькі адзін бог усё бачыць, ды

нічога не скажа, а людзі не змоўчаць. Убачаць, які ты ёсць, і адплацяць табе тым жа...

Бацька адвярнуўся, затуліўшыся ад ветру, набегшага аднекуль, з прагалы сырога начнога лесу, спехам нацягнуў на плечы пінжачок, які знайшоўся пад бокам. Мабыць, падумаў прыснуць, але яму ўжо не спалася. Паўлежачы, пазіраў у неба, дзе нядаўна гарэзіліся, як абсыпаныя сярэбраным пылам, буйныя і густыя, аж сляпіла вочы, жнівеньскія зоры. Цяпер яны як бы растварыліся, пакрываючыся сіне-шэрай імглою, і я пашкадаваў, што бацька дарэмна не бачыў усяго таго небнага хараства. А во ўжо і месяц знік, затуліўся цёмнай хмурынкай, і зоркі ўвачавідкі бляднелі, адна за другой траціліся бляск, знікалі, але яшчэ там-сям адзінокія знічкі алавяна і слаба мігцелі ледзь прыкметнымі пшанічнымі зярняткамі. І яны, бачна было, хутка і імгненна згасалі, прачарціўшы ў перадранішнім небе кволыя вогненна-сінія сляды...

— Вунь яшчэ зорка паляцела! — крыкнуў я знарок гучна, каб бацька ўчуў. Ён, канечне ж, ужо не спаў і праз кашаль азваўся:

— Кажуць, як на небе знікае зорка, на зямлі чалавек памірае...

— А пры чым тут чалавек? — здзіўлена пытаю я, падварушваючы коней.

— Не, брат,— пярэчыць бацька.— Нейкая сувязь між небам і зямлёю ёсць. Я няграматны, а думаю так: людзі, як і зоркі, нараджаюцца, жывуць і паміраюць...

— І след ад іх, хочаш сказаць, застаецца,— дадаў я і пачаў ладкавацца — паклаў у голаў чамаданчык, прыкрыў яго посцілкай, а паверх свой пінжачок, які яшчэ ліпеў ад студэнцкае пары.

— След, канечне, застаецца. Але мы яго не заўважаем, бо вочы нашы не такія, каб усё здалёк убачыць...

Далей я не чуў, што бацька гаварыў, вочы заплюшчыліся, і я як праваліўся ў бездань. А калі прачнуўся, то ўжо не было ні лесу, ні зорак — фурманка грукацела па вуліцы, крывой і ўзгорыстай. З боку яе свяціла халаднаватае, як набрынялае туманамі сонца.

Вуліца прачнулася і жыла, набраўшы за ноч добрую порцыю сілы на новы клопатны дзень. Заспаныя кабеты спяшаліся з вёдрамі да студні, мужчыны на падворках ладкавалі калёсы і мажары; знаёмым пошчакам перагукваліся малаткі — хто не паспеў ці паленаваўся накляпаць касу звечара, цяпер мусіў завіхацца спрасонку.

Прывычныя з маленства вясковыя праявы цяпер ажывалі, набываючы новую афарбоўку і сэнс. Хутка, абедзвюма рукамі сцёршы з твару санлівасць, я глядзеў на хаты, якія здаліся мне вельмі ж знаёмымі. Саламяныя стрэхі, шэрыя сцены, падслепаватыя вокны на чатыры шыбы, у каторых замест шкла — фанера ці вехаць анучаў.

— Ета, відаць, ужо Горкі,— сказаў я да бацькі, які скочыў з фурманкі, каб расслабіць самлелыя ногі, і нязграбна чыкільгаў, узяўшыся за драбіну.

— А хіба не пазнаў? — усміхнуўся бацька, паказаўшы шчарбіны ў роце.— А што ж яшчэ... Яны самыя і ёсць — Горкі...

І неяк хораша прасвятлеў, у вачах, яшчэ сонных і спакойных, з'явілася гарэзнасць ці нават маладая зухаватасць.

— Тут, у Горках,— гаварыў бацька з незвычайным ажыўленнем,— быў я гасцём у многіх хатах. Мы тут, у маёнтку, саўгас зачыналі. Цяжкія былі часы, але і дарагія — помняцца на ўсё жыццё. А ты во тут вучыўся...

Мы якраз ехалі міма доўгай, як стадола, хаты. Яна нейк яшчэ больш урасла ў зямлю і цяпер, заросłая састарэлай крапівою і дзядоўнікам, выглядала зусім несамавіта, але ў грудзях варухнуліся дарагія ўспаміны школьнага маленства. А бацька гаварыў сваё:

— Тут жа поп жыў — айцец Трусевіч. Скажу табе, хлопча, сцярвец быў, якога са свечкай не знойдзеш. З амбону людзям казаў адно — прычашчайцеся, цярпіце, не багахульствуйце. А сам пасля набярэцца етай гары і раве, не раўнуючы, як бугай. Усё дудзеў нейкую басяцкую песню: «Вы зямлі прасілі, я зямлю вам даў, а волю на небе знайдзёце...» Бачыш, куды гнуў, шайтан! Маўляў, волі табе, трудзяшчы чалавек, не было і не будзе ніколі. Маўляў, не спадзявайся і не чакай! Ета цябе, нябож, толькі спакушаюць воляй-свабодай, а тады кось-кось ды ў хамут. І засупоняць! Вось тады, між іншым, я і разануў яму па-шахцёрску. Буду казаць, айцец, чаму ета сам не жывеш, як сказана ў пісанні, па закону божаму, а толькі нас, бедалагаў, заклікаеш? Дык ён, ведаеш, паляпаў мяне па плячы, яхідна падміргнуў і кажа: «Ісус цярпеў і нам, грэшнікам, вялеў». Во які быў, ябеднік, хітрун! Сам жыве ў сваё ўдавольства, а іншых заклікае да цярплівасці і пакоры. Як у той жа Біблії, сам не бачыць у сваім воку бервяна, а ў тваім не сцерпіць і парушынкі...

Кіруемся пад горку, па жаўтапёсу. Густа прыляпіліся хаты ў купчастых ліпах і старасвецкіх ясенях. А за імі — бяскрайні, на паўсотню гектараў, панскі сад. Адтуль ужо чуваць галасы і б'е водар пераспелых яблыкаў, пукрыстых ігруш, і ўспамінаецца адразу — школа ў Горках, хлапечыя наскокі ў сад, школьныя сябры.

Бацька шморгае дзюбатым носам, і яго, мабыць, спакушае знаёмы пах садавіны, але чамусьці хмурнее:

— Во, сын, праз еты сад я тады, як быў тут за гаспадарніка, ледзь не заплаціў жыццём... Бандзюгі стралялі па мне, але прамахнуліся...

— Раскажы, тата, мне пра гэта больш! — прашу я. Але бацька адмахваецца, адно толькі пыхкае папяросай і паварочвае гутарку на тое, што жыццё — заўсёды было, ёсць і, можа, будзе заўсёды — гэта змаганне чалавека з сабою за тое, каб у чалавеку расло і ўмацоўвалася чалавечае.

На пагорку, злева, хата бацькавага стрыечнага брата Міхаля Аўсейчыка. З ім, як памятаецца, бацька жыў у добрай злагадзе і дружбе. Канечне, думаю, бацька не праміне выпадку, спыніцца. Я кінуў позірк туды, дзе хата, і бачу: у коўратцах стаіць гаспадар — знаёмая заечая шапка, якую памятаю яшчэ падлеткам, шырокая ўсмешка на шырокім у замшэлым шчацінні твары. Дзядзька Міхаль цёпла ўсміхаецца, мабыць, пазнаў нас, спакваля крочыць насустрач. Бацька спыняе коней, і яны горача і шчыра вітаюцца:

— Адкуль едзеш?.. Дзе быў, Панасавіч, сянні?

— Ды вот, бачыш, Сямёнавіч,— у тон яму жартуе бацька і паказвае на мяне,— мядзведзя пасвіў на аўсянні...

Сваякі смяюцца, ніякавата пацепваюцца. Перамаўляюцца жартамі, пустымі, нязначнымі словамі. Нарэшце дзядзька Міхаль заўважае мяне:

— Ну, здароў быў, пляменнік!..

— Добры дзень!

Дзядзька Міхаль, канечне ж, ведае, што я вучыўся на настаўніка: ён не раз бываў у нашай хаце, і яму расказвалі, як цяжка было вучыць тры гады сына ў горадзе. Цяпер і ён глядзіць, бачу па вачах, на мяне прыязна, нават з захапленнем. Мацае вачамі маю апратку — яшчэ ніштаватыя шавіётавыя штаны, чыстыя чаравікі і мышастага колеру вельветавы пінжачок з накладнымі кішэнькамі і бліскучымі гузікамі — яго я купіў за грошы, зэканомленыя ад стыпендыі. А ў чамаданчыку яшчэ ляжыць новая, з гальштукам віскозная сарочка. Я пашкадаваў зараз,

што яе не ўбачыць дзядзька Міхаль — з ім у мяне таксама добрыя адносіны яшчэ з часоў, калі я вучыўся тут, у Горках, а дзядзька вартаваў гэты панскі сад. Дарога ж са школы ляжала якраз праз яблыневыя рады. Мы, шкаляты, часта ўвосень забягалі ў будан, дзе ляжалі горы яблыкаў, і дзядзька нас не абыходзіў...

— Ну што ж, можа, і ў Горкі прыйдзеш? — Пасля нейкай паўзы дзядзька Міхаль звярнуўся да мяне і, падалося, да бацькі і пахваліў мяне: — Малайчына! Вот будзе і бацьку падмога.

— А што, няхай бы і ў Горкі ішоў,— ухваліў бацька і пачаў аглядаць вупраж, даючы зразумець, што нам не выстарчае затрымлівацца.— Людзі свае. Я скажу табе, Сямёнавіч, неблагія людзі. Жыць можна. Абы, канечне, сам быў чалавекам...

— Людзі як людзі,— пацепваецца дзядзька Міхаль, як ад таго, што яму трапіла за каўнер нешта мулкае.— Як тэй казаў, пяюць не для Ісуса, а дзеля хлеба куса...

— Не, брат, не кажы, а етых людзей знаю,— круціць галавою бацька і падае Міхалю пачак папярос.— Людзі нашы добрыя, спагадлівыя. Канечне, ёсць і такія, што ведаюць адно — грабці да сябе...

Дзядзька Міхаль доўга круціць у руках папяросу ў каструбаватых пальцах. Тады ківае, цёпла пасміхаючыся, у мой бок:

— Ета ўжо Алёшка прывёз? Малайчына. Хлопец, відаць, будзе ўшчэмны... Як ягоны бірулеўскі дзед Мазоль!..

— Ушчэмны — ета не ганьба,— падпраўляе дзядзьку-ву пахвальбу бацька.— Абы скнарай не рос...

— То, можа, зойдзем у хату? Якраз мая Аўдуля ўжо і блінцоў напякла,— дзядзька Міхаль запытальна глядзіць то на мяне, то на бацьку.

— Няхай другім разам. Во хлопцу ж трэба хутчэй у раён заявіцца, што прыбыў на службу. Трэба ж апрадзяліцца...

— Ну, то бывайце,— дзядзька з вінаватай усмешкай падаў бацьку і мне руку. Як бы вінавацячыся: — Як сабе хочаце. Але каб не крыўдзілася... Я з усёй душою!..

За аселіцай роўная, прыбітая за ноч прапыленая дарога. Коні барздзэй затрусілі, і перад вачамі замільгалі знаёмыя да драбніц прыдарожныя бярозы і хмызнякі, вакольныя палі з рассыпанымі на іх копкамі збажыны, а

ўдалечыні — падпаясаны тумапамі такі мілы сэрцу лясок — Крывалессе...

Узыходзіла сонца. Яно хутка і незаўважна адскочыла ад затуманенай зубчаткі лесу і плыло на падсінелым небе, адкідваючы аж сюды, у віслакосыя бярозы, цёплыя, лагодныя каснікі, і пад іх ніцямі, якія тут, на дарозе, атуленай з двух бакоў вербавымі кустамі, ужо крыху пашарэлымі і пакляванымі жаўцізной, спляталіся ў дзівосныя карункі святла, якое нячутнай, мяккай пяшчотаю клалася на ўсё наваколле — яно прачыналася і ажывала.

Ад сонца, ад святла, што бруілася і струменілася адтуль, дзе ўзнікла аранжавае сонца, не зыркае, не гарачае, а цёпла-пяшчотнае, леваруч, на вялікую прагалу поля, сплывалі сівыя, волкія туманы, і ўсё неба святлела і наліваласа крамянасцю. Тыя хмаркі, што былі затрымаліся з начы, сплывалі, паклычаныя ранішнім ветрам і патрывожаныя яго дыханнем, сыпанулі пад ногі коням халодныя лісточкі. Я падняў адзін такі лісток, і мне падумалася, што, мабыць, мяне чакае дома ліст ад Марылі. «Калі не здарылася самае горшае,— трывожна кальнула ў сэрца думка, але я паспяшаў сябе заспакоіць,— яна ж ведае адрас, прышле ліст у вёску...»

— Нешта ты, Алёшка, як невясёлы, чаму нос звесіў,— патрывожыў мае думкі бацька і крануў лейцамі.— Мо спаць хочаш?.. Яно і не дзіўна — усю ноч у дарозе... Во ўжо будзеш дома. Адаспішся. А можа, пра работу задумаўся, то дарэмна. Магчыма, дзе і лацвей было б. У нас, бачыш, глуш і беднасць яшчэ. Ды, як памяркуеш, свае людзі. Кажуць, у сваім доме і сцены — падмога...

— А я нікуды і не збіраўся,— задаволены бацькавай ухвалай, сказаў я.— Як абазваўся, што паеду на радзіму, то камісія з ахвотай згадзілася...

— Бачыш, там таксама людзі з розумам,— ухвальна прамовіў бацька, тады доўга маўчаў, як гледзячы некуды ўсярэдзіну самога сябе. Мабыць, ён меў мне сказаць нешта важнае і не ўмеў ці не рашаўся. Тады нарэшце, пазіраючы мне ў вочы, сказаў: — Я табе, сын, раю вот што. Ты будзеш рабіць між сваіх людзей. Са сваімі ж людзьмі і лёгка і цяжка. Яны цябе ведаюць, і ты іх. Будзь справядлівы да ўсіх. Жыві з адкрытай душой. І людзі не дадуць цябе ў крыўду!..

— Дзякую, тата!

Мой бацька... Заўсёды ён жыў для людзей. Не ўкленчваў перад багацеямі і хціўцамі. Заўсёды і смела стаяў за

праўду. Не стамляўся рабіць добрае для людзей. Справядліва жыў. Каб і мне гэта бацькава пераняць... Заўтра я пайду ў школу. Буду вучыць дзяцей. Як важна, думаў я, пад'язджаючы да сваёй вёскі, настаўніку мець чыстае сумленне і добрае, спагадлівае сэрца. Мабыць, гэта праўда, што толькі чалавек, які сам любіць дзяцей, зможа навучыць сваіх вучняў чалавечнасці, дабраце і праўдзе!

Яшчэ здалёк, ледзь расступіліся мокра-бліскучыя з начы прысады, я ўбачыў сваю хату пры бальшаку, ля студні з цыбатым жураўлём.

Запахла нечым шчымліва-родным. Так пахне толькі зямля, якая цябе нарадзіла.

Добрай раніцы, Бацькавічы!

АПАВЯДАННІ





У ЗАВІРУХУ

— Сын, раскажу табе, як аднойчы ездзіла ў Нярахаўку старгавацца наконт гумна. Было ета зімою, на каляды, здаецца. Пачула, што там, ля Мазуравых хутароў, у Нярахаўцы, гаспадар мае прадаць гумно. А жылі тады ўсе аднаасобна, то сам знаеш, як прасіцца са збажыною ў падсуседзі. У аднаасобніцтве без сваёй адрыны, а тым больш без гумна, нельга было зусім жыць. Далібог, праўда, можа, маладыя і не вераць, але ж ета чыстая праўда!

Запрэгла ў сані каня. Ой, а конь жа быў. Дужа-дужа наравісты. Можна сказаць, для вясковай жыткі няздатны. Ці помніш ты каня таго?..

— А як жа, Ардэнцам звалі...

— Так, нейкая нянаская назва, і конь быў нянаскай, казалі, заводскай пароды.— Маці памаўчала, паправіла на ссівелай галаве хустку-гарусоўку і, як павесялелая, казала: — Конь быў, ой жа, пацешны. Можна пра таго каня цэлы дзень расказваць. Не конь то, а цырк на дроце. Вот і запрэгла ў сані я свайго Ардэнца. Паклала ў розвальні мяшок з сенам і адправілася, як сказана ўжо, купляць гумно. А грошай мела ўсяго дваццаць рублёў. Ета ўсяго, каб пакласці на задатак.

Прыехала ўдала ў тую Нярахаўку, знайшла двор таго чалавека, а яго дома не застала. Агледзела будыніну. Яна мне прыдалася. Пра гумно мне наказаў твой бацька, а сам на зіму з'ехаў на шахты. Сказаў, каб гуменца апытала. Знацца, агледзела я тое гумно — яно амаль што новае і страха свежая, нават салома не зашарэлася, як сонейка, бліскучыць. Адным словам, пагляднае, спраўнае гуменца!

І што ж. Давялося ехаць у другі раз, бо гаспадыня мне нічога пэўнага не сказала: «Маўляў, гумно прадаецца, а больш яна нічога не ведае...»

Вось і гаспадар дома. Сталі мы рахавацца. Ён, аказваецца, і бацьку нашага ведае. Паверыў мне, і старгаваліся мы на паўтары сотні. А грошай у мяне ўсяго дзве дзесяткі, але я не рашаюся іх аддаць. Бо як жа без сведкі. Я і кажу, што грошы прывязу пасля, а ён усё хіліць на тое, каб я паклала задатак. Без задатку не згаджаецца — усё муляецца.

На тым і парашылі, што я пасля, ускорасці, прывязу задатак. Паехала я дамоў, а ўжо стала сутоньвацца, цямнець. Які ж той зімовы, каляды ўжо надышлі, дзень. Калядны дзень, кажуць, як заечы хвост.

Дарога, як ведаеш, ішла праз лес. Вусцішна. Стараюся, каб хаця да цемначы выбрацца на віднейшае, на палявік, але дзе там. Неўзабаве, як на тое ліха, закруціла, завіхрыла, і завея-завіруха нахапілася: усё перад вачамі закружылася, закіпела, як у гаршку. Усё змяшалася, ні макулінкі не відно, і цемрыва насунулася, хоць вока выкалі. Стала цёмна, як у варыўні. Паверыш, я не з баязлівых, а страх пачаў падбірацца за плечы. Ды і марозік крапчэе, за шчокі шчыпле. Ну, думаю, што будзеш рабіць? Сяджу ў санках-розвальнях і разважаю...

...А конь, Ардэнец наш, соўгаецца, як нежывы. Снегу намяло — пад пахі каню. І што ты думаеш, успомніла, як старыя людзі казалі, што не трэба каня тузаць — ён сам дарогі патрапіць. Яшчэ і бацька мой, твой дзед Ціхан, казаў: «Адпусці лейцы, конь сам дарогу ўчуе і будзе ісці, везці воз куды трэба». Але ж, разумееш, то быў конь нейкі нянаскі; калі сказаць, то ён, конь, быў нейкі, можна сказаць, збаламучаны, дурны. Можа, яго гадавалі для выездаў, для пагулянак, а патрапіў ён у сяло на гаспадарскую, зямельную работу. Яшчэ ж і малады быў, можа, яму было гады якія чатыры, ад сілы пяць. Адным словам, конь мой улез у снег. Пярэднія ногі выцягне, то заднія завязнуць. Убіўся конь у нейкае балота — ні ўзад ні ўперад.

Сяджу і думаю: «Вот і купіла гуменца... Замерзну тут, і дзеці дома не будуць ведаць, дзе іх матка». Ты ўжо быў ладным хлапчуком, падлетак смышлёны. Таксама пра гумно рупіўся, як дарослы. Астаўся ўдома, падахвоціўся глядзець за малою. У нас тады была Дуня, дзіцё сапліве. А табе ўжо, напэўна, гадоў восем было. Вялікі ўжо быў хлопчык. Ва ўсіх хатніх турботах мой памочнік. Жылі ж

мы адны. Бацька ўсё па шахтах швэндаўся. Грошы зарабляў. Ды ніяк не мог выбавіцца з нястачы. Бо скажу, гуляка быў — аддай чэсць! Але ж неяк на гумно грошай сабраў, калі распарадзіўся, каб купляла...

Маці смяецца, сама сабе разважае:

— Дзівачка сама была. Гэта ж трэба, ехала, дурніца, за блізкі свет зімою. Таргавалася за тое гумно, маючы ў кішэні грошай на задатак. Але слухай жа, як выбавілася з таго балота.

Агледзелася, вылезла з саней. Пачала сяк-так варушыць, выбаўляць каня з сумёту. Пашчасціла неяк выкіраваць каняку на роўнае. А мяцеліца круціць — свету божага не відно. Стала зусім цёмна, нават неба злілося з лесам, і ўсё круціць, вірыць, завіруха — вачэй не адплюшчыць...

Замерзну, думаю, і страху не адчуваю ані, толькі перад вачамі дзеці: ты і Дуня...

Тады неяк учула, што недзе збоку забрахаў сабака. Ой, як жа я ўзрадавалася! Пачала аглядацца вакол пільней. Бачу: між кустоў бліснуў агеньчык. Падалося: воўчае вока. Але ж не зялёны — у ваўкоў зелена блішчаць вочы. Жоўты агеньчык, ледзь зерыць. Свіціцца, як скрозь сіта. Ну, думаю, ратунак! Жывеш, баба!

Выбавіла ета я каня на роўнае, на цупкую дарогу. І сама ўжо мацаю нагамі, каб не збіцца ў сумёт, у свежы снег; вяду каня, за аброць трымаю адубелымі рукамі. Анямелі пальцы, а дзіўна: холаду не чую... Конь мой асмялеў, пачаў весялей фыркаць ды жвавей і лацвей выцягваць з снежнай куламесы ногі; усё ж і ён, нягегліца, набрыў на дарогу.

Якраз і лес скора парадзеў; сцяна лесу як бы расступілася; як скрозь мярэжку, наперадзе і хаты зачарнеліся. Агеньчыкі, як збавенне, як паратунак, весела бліснулі. Прыгледзелася, ага! Рашатнёўка. А там, сам ведаеш, і да дзярэўні нашай рукою падаць!..

Ну, дзякуй, цяпер ужо як-небудзь дабяруся ўдвору. А ў самой сэрца шчыміць, па целе кошкі шкрабуць — дзеці ж малыя адны насупраць ночы засталіся, без прыглёду. Таксама клопат! Ташната, аж сэрца знібіць, разрываецца. Тады, як у тым балоце бедавала,— як бы і страху не было такога, як цяпер, калі, лічы, небяспека мінавала. Дапяла да першае хаты. Спыніла каня. Паглядзела ў акно. Дапраўды Рашатнёўка. Здаецца, то была Аўрамава хата. Крайняя ад Дубровы, ад лесу...

Я пужкай каня падварушваю. Давай, конік, хутчэй бяжы. Ужо тут дарога вядомая. Шлях тады быў. Вербы як абхапіць пры камлі рукамі. Бярозы. У адзін момант даехала дамоў. Радая, не скажы, як на свет зноў нарадзілася.

І ты яшчэ не спаў. Сядзелі абое. Агню не запальваў. На двор уз'ехала і сама сабе не веру: дома!

Распрэгла каня, толькі на парог, а ты да мяне, як дарослы, з пытаннем:

— Ну што, старгавала гумно?

— Ага,— кажу,— старгавала...

А ў самой на сэрцы млосна, не выказаць ніякімі словамі. Ой, божачка! Ета ж я магла той цемраччу, у тую калядную завіруху, загінуць, ды з такім канём бязладным; магла акарчанець на марозе, як піць даць загінуць... Завея ж была, як на тое ліха, калядны мароз усё-такі!..

Чула я, мужыкі расказвалі, што ў дарозе замярзалі, асабліва калі няма дзе сагрэцца. Было такое, што тады падарожнікі, як засцігне іх буран у дарозе, адпрагалі коней, секлі сані, палілі касцёр, каб як сагрэцца і перачакаць завіруху.

...Маці змоўкла. Задумалася. Старанна разгладжвала канцы сваёй любімай хусткі-гарусоўкі.

Маўчаў і я, дзівіўся: якая ў мяне слаўная маці.



НА ВАКЗАЛЕ

У станцыйнай пачакальні людзей — яблыку няма дзе ўпасці. Пасажыры найбольш маладыя: студэнты, навучэнцы, старшакласнікі таўкуцца, перагукваюцца і напралом ціснуцца да кас, стараюцца хутчэй набыць білеты. Іх як бы прыспешвае хрыплаваты жаночы голас з рэпрадуктара: «Поезд отправляется...» У шырокія шкляныя дзверы хвалямі плыве людская рака — з адпраўленнем аднаго цягніка зала пусцее, а з другіх дзвярэй імкне новая хваля, і неабсяжная пачакальня напаўняецца. Гусцее гамана, патанае і глухне той жа халодна-спакойны голас: «Поезд Могилев — Минск отправляется... в восемнадцать часов три минуты...»

Гэта дадатковы цягнік. Набліжаўся Новы год. І ў перадапошні дзень адыходзячага года і дадатковы цягнік ці зможа забраць усіх жадаючых выбрацца з горада на гасціну да бацькоў, сваякоў, знаёмых. Я апынуўся на вакзале пад вечар і чакаў начнога цягніка, але пачуў аб'яву, што будзе дадатковы, узрадаваўся. Агледзеўся, дзе б прыткнуцца, але ні аднаго вольнага месца на лаўках не было — давялося са сваім дарожным чамаданчыкам прытуліцца да сцяны, дзе такія ж, як і я, пасажыры зайздросна пазіралі на шчасліўчыкаў, што паўселіся на лаўках і бавілі час у размовах ці ўрупіліся ў газеты: іх тут жа прадаваў бразгатлівы жалезны аўтамат.

Праз якую гадзіну непадалёку вызвалілася месца. Я сеў, распрамляючы добра самлелыя ад доўгага стаяння ногі, і пачаў прыглядацца да суседзяў. Гэта былі амаль усе пажылыя і старыя жанчыны ў вязаных і тканых хустках, у плюшаўках, неабношаных ватоўках — пераважна,

падалося, вясковыя кабеты. Яны дружалюбна і даверліва перамаўляліся, дзяліліся навінамі і клопатамі, як усё адно добрыя знаёмыя ці аднавяскоўцы.

Прыслухаўшыся, я заўважыў, што рэй у гутарцы вяла старая, захутаная ў дзве ці тры хусткі жанчына ў ношаным, з парыжэлага шавіёту зімовым паліто, аздобленым старамодным коцікавым каўняром (відаць, паліто з чужога пляча — доччына ці нявестчына). Жанчыну гэтую я не разгледзеў добра, але ўчуў яе спакойна-пявучы голас. Яна расказвала пра сваю бяду, як бы апраўдваючыся, чаму ў такі тлумны час выправілася ў далёкую дарогу.

— Еду я, мае вы людцы, аж у Прыдняпроўскі,— апавядала жанчына.— Ета новы горад такі, блізка ля Днепрапятроўска, можа, якіх вярстоў шэсць будзе... Я, мае вы добрыя людцы, дужа хварэла, у бальніцы два тыдні ляжала. Дужа мне сэрца балела. Так у мяне ўсё ўсярэдзіне крэпкае, яшчэ можна жыць, ды сэрца цісне ў грудзях, не прадыхнуць, паветра не хапае. Лячылі мяне дактары добрыя, уважыцельныя такія, ласкавыя, хаця і маладыя, а нам, старым, уважэнне даюць...

Мне пачулася: наша гэта кабета, як у нас кажуць, мугулёўская — добрая, шчырая душа і ахвочая, падхопліваяна слова. Гаворыць не стамляючыся, як усё адно чытае, як па-пісанаму чэша; звычайнае, будзённае, дробязнае, а слухаеш — заслухаешся, бо ў словах — жывая душа. Усё, чым жыве, адкрые першаму сустрэчнаму, выкажацца, як на споведзі, раскажа ўсё, як радні ці свайму блізкаму чалавеку.

Прыгледзеўся я да гэтай жанчыны. У яе змаршчакаваты, але прыемны твар; яшчэ жывыя, з адзнакамі чыстай сінечы пад некалі крутымі светлымі брывамі вочы; вакол вачэй і рота — дробныя, неглыбокія зморшчынкі; шчокі не абвіслыя, яшчэ не згубілі сваёй румянасці, хаця і бледнаватыя. З-пад клятчастай, паверх гарусоўкі, хусткі на скронях — прыхопленыя сівізной валасы, а над ілбом русявыя, не згубілі ранейшага бляску. Толькі губы, мабыць, некалі вабныя, выдавалі як падсіненыя. Жанчына гаварыла чыста, не шапялявячы — можа, у яе яшчэ свае, не ўстаўныя, зубы.

— Мяне ж дужа не пускалі, надта ўгаворвалі, каб не ехала, каб яшчэ пабыла, пагасціла які дзянёк. Угаворваў, проста-такі не пускаў мяне ў дарогу брат мой, да якога я і прыехала была пасля бальніцы. Кажа ён мне: «Пабудзь яшчэ, Настачка, пагасцюй з намі, правядзём стары

год, адмецім, як усе людзі, год новы. Хапае ж усяго, дай божа і дзецям і ўнукам нашым — такога жыццейка. Ёсць чым госця прывеціць і ў будзённы дзень, і ў свята. Дзякуй нашай уласці! Хаця во на старасці пабачылі жыцця — жыві, красуйся, весяліся, ды не памірай...» Але дзе ж тут уседзіш, калі там адна яна, мая дочачка... Як яна без мяне, без майго прыглёду? Не, кажу, браточак мой, братанька дарагі. Можа, я ўжо і не пабуду, не пабачуся з табой болей, ды трэба ехаць, не магу я сядзець, калі спомню, як яна там, без мяне, адна...

Ціха, амаль шэптам, бабуля нешта пачала расказваць кабетам, якія сагрэліся на сваіх хатулях і клунках і ўважліва слухалі. Давер, мабыць, мацаваўся не толькі ад яе слоў, якія яна ўмела вязала ў адзін вузел расказу, але і ад усёй яе істоты, ад спакою і ўпэўненасці ў сабе. І апратка яе казала за тое, што чалавек не зманіць. На бабулі была доўгая спадніца, што амаль закрывала халявы зелянкавых бурак з блішчастымі галёшамі. Спадніца, мабыць, няношаная, не абыдзенная, а святочная — руковы мультан у кветачкі.

Што кінулася ў вочы — дык гэта яе рукі, яшчэ не пакручаныя ў пальцах, не разбітыя работай, са слядамі былой, далёкай ужо маладосці; рукі можна было б назваць і цяпер прыгожымі, каб не такая зморшчаная скура; бабуля не хавае іх, а лёгка і ў такт гаворцы жэстыкулюе, памагае сабе, і яны ўвесь час у руху, у дзеянні. Бабуля раптам наблізілася зусім амаль да твару суседкі, што сядзела бліжэй, і паўшэптам загаварыла:

— Так і засталася мая дачушка ад тэй вей-мяцеліцы інвалідам, без абедзвюх ног. Так і жыве ўжо дзесяць гадоў... І я пры ёй. Жывём, праўда, добра, нечага бога гнявіць. І пенсія добрая ёй, і дзіця ўжо выгадавалася, сынок вырас... У нас кватэра-двухпакаёўка. Людзі тамашнія яе шкадуюць, уважэнне да яе маюць, бо яна ж на рабоце, на расчыстцы дарогі была. У завею чысцілі жалезную дарогу, на яе наляцеў паравоз...

Бабуля ўсё гэта расказвала, як падалося, вельмі спакойна, без аніякага хвалявання, нібы ўсё тое адбылося не з яе дачкой і яна толькі пераказвае пачутае з вуснаў іншага чалавека. Ды калі я прыгледзеўся, дык убачыў, што вочы яе ўраз павільгатнелі і па змаршчыкаватай шчацэ кацілася ціхая, скупая сляза.

Вакол завохкалі, заківалі галовамі, а бабуля ўжо апавядала пра тое, які багаты і прыгожы іх Прыдняпроўскі —

малады горад, што ўзнік ля старажытнага Днепрапятроўска, і якія харошыя людзі — украінцы і рускія — там жывуць, якое там харство вясною і ўлетку, калі ўсё зелянее і цвіце чароўнай квеценню.

— І мой жа сынок, Юрка, тамака жыве. Во проста кватэры нашыя блізка, у дамах глядзяцца вокны ў вокны. Ета ў мяне адзіны сынок застаўся,— апавядала бабуля, і вочы яе ўжо свецяцца шчасцем.— А два загінулі. За нашу родную зямельку, за наша жыццейка склалі галовачкі. Два ў мяне на гэтай вайне былі. Адзін, мой Андрэйка, лёг на вечны сон пад Чавусамі — тады там былі дужа страшныя баі. Забітага ў новым абмундзіраванні прывезлі. Без пары пагібнуў мой хлопчык. Аплакала яго, ды не ведала, што горачка маё не ўсё выплакала. Той жа зімачкай, пад Новы год якраз, прыйшла пахавальная і на другога — пад Кіевам на Дняпры, казалі, геройскай смерцю загінуў...

Я дзіўлюся, як спакойна і вельмі разважна апавядае бабуля. Думаю пра гэта, слухаю, і словы яе цяжкім каменем кладуцца мне на сэрца. А за спіною — гудзе, прыглушаны вялізнымі калонамі залы, шумлівы прыбой галасоў; людзі занятыя сваім звычайным клопатам — кожны спяшаецца атрымаць білет і сесці ў цягнік. Не ведаю, ці спяшаецца бабуля. Мне здаецца, яна бачыць і як бы зноў, ужо ў каторы раз, страчаецца са сваімі сынамі Андрэйкам і Іванкам, якія ёй часта прыходзяць у сне.

З невідочнага дынаміка пачулася: «Пригородный Могилев — Копысь отправляется». І раптам вал людзей, што напіраў на шырокія шкляныя дзверы, рушыў на перон. Бабульчыны суседкі падхапіліся і зніклі ў натоўпе. Бабуля засталася сядзець на сваім неравязаным аборкамі чамаданчыку, не праяўляючы ніколькі трывогі. Мабыць, ёй не хутка на цягнік, і яна не маркоцілася, як маркоцяцца і пакутуюць іншыя, калі наперадзе яшчэ доўгая зімовая ноч, а можа, і дня трэба будзе прыхапіць.

Я прапанаваў бабулі месца, але яна рашуча адмовілася. «Не трэба, даражэнькі, не турбуйся, добры чалавек. Я пасяджу на етым чамадане, не разваліцца,— вытрымае!..» Але бабуля ўвішна, нават падалося, вельмі лёгка пасунулася бліжэй і такім чынам апынулася насупраць мяне. Села і адразу, даверліва гледзячы мне ў вочы, ніколечкі не бянтэжачыся, працягвала расказ пра сваё падарожжа, рупілася ці, нават правільней — разважала, як яе ўгаворвалі па дарозе сюды, на вакзал, вярнуцца назад.

— Пляменніца ета мая стрэлася,— паправіўшы хустку,

загаварыла бабуля, і я заўважыў, што ў яе трэцяя хустка падыспадам белая, у сінія, ледзь прыкметныя кветачкі, чысценькая,— казала: «Цётка, паедзем назад, бо аўтобус пайшоў ужо». Але мне не хацелася вяртацца — вяртанне не дужа добрая прыкмета. Я б, можа, і вярнулася, але трапіўся шафёр, ехаў аж у саменькі Мугулёў і ахоцціо ўзяў мяне ў кабінку. Даехалі добра. Быйстра ён мяне прывёз аж у вакзал. Во, глядзіце, якія бываюць людзі! Прынёс мой еты чамадан сюды, у саменькі вакзал, і плату браць сумысля адмовіўся, як ні ўпрошвала: «Што ета вы, бабуся, я са сваёй маткі, можна сказаць, буду браць еты рубель?» Дак, кажу, у мяне грошай хопіць — вазьмі, дай жа бог, прашу богам, чэсна прашу. А ён: «Добрага вам здароўя, бабуся!» І развітаўся. Ну што ж, не ўзяў дык не ўзяў... Няхай табе добра будзе, на добрае здароўе і пойдзе!..

— А як жа вы адважыліся, бабуся, у такое далёкае падарожжа? Адна, ды яшчэ і пасля бальніцы, як вы кажаце...

— А што? Людзі во кругом, памогуць,— людзі найбольш добрыя. А ёсць, скажу табе, добры чалавек, ёсць і дрэнныя. Вось паслухайце.

Бабуля ўвішна падсунула свой чамадан бліжэй яшчэ, і я бачу цяпер увесь яе твар, спярэшчаны дробнымі маршчынкамі, цёплыя, некалі звабліпыя, апякаючыя, з самага яркага блакіту вочы — яны і цяпер свецяцца мякка, як скупое, але лагоднае зімовае сонейка.

— Ехала я сюды, садзілася на поезд, што ідзе праз Мугулёў на Ленінград з Днепрапятроўска. Пасадка была дужа цяжкая, вадная. Мяне ледзь не ўнеслі ў вагон. Нехта падпашкі абхапіў мяне, дайжа як перастала балець у сэрцы, як бы палягчэла трохі. Я так ужо і стаю, баюся паварушыцца і не аглядаюся, хто ета мяне так трымае падпашкі. А поезд ужо пайшоў, загрукацеў коламі... Ну, думаю, буду так і стаяць. А кругом ні аднаго вольнага месца. Усе праходы занятыя, не тое што каб лаўкі. У праходах людзей не праціснуцца. А тут мне раптам — афіцэр, ён лейтэнант нейкі ці, можа, яшчэ і старэйшы чынам вайсковец, падняўся і сказаў: «Садзіцеся, бабуся». Я села, канечне. Слухай жа, добры чалавек. Сяджу, трохі неяк і няёмка, вадна сябе адчуваю, бо чалавека ж, лічы, з месца сагнала. Баба старая, нездаляшчая. Але афіцэр той як здагадаўся ўсё роўна: «Не беспакойцеся, бабуся, я пастаю — малады яшчэ...» І ўсміхнуўся мне, старой, хора-

ша... Відаць, культурны мужчына. Але, не тут кажучы, насупраць сядзеў — такі бамбіза, нейкі мяжджула. І ўсё зіркаў на мяне нядобрым вокам. Як бы я не таго, афіцэрава, месца заняла, а яго сагнала сілком, насільна ўзяла дый падняла за каршэнь... Нядобры ў яго погляд, дыхае смярдзючым перагарам, відна, яшчэ не працверазіўся — п'яніца, відаць, няўклюда нейкая, што мне аж моташна стала. Але што ж ты зробіш. Маўчу сабе, пацепваюся. А ён як бы і чакаў, каб я што сказала, абы абазвалася... А я маўчу сабе, не аказваюся ніводным словам. А ён усё чмыхае, пазірае, як не б'ець, свідруе п'янымі заплыўшымі бельмакамі. А потым: «Што ета ты, бабка, савецкага афіцэра з месца сагнала? Ета ж наш зашчытнік, а табе, бабка, ужо даўно пара на адыход, на вечны пакой, а ты ўсё яшчэ капыцішся, блытаешся, не даеш людзям ездзіць... Сядзела б у запечку ды не рыпалася...» А што я, кажу яму, я твае грошы праезджваю, ты мне даеш хіба? Мне мая ўласць дае, і я куды хачу, туды і еду і ў цябе, такога дабрачынца, не спрашуся... А што мне месца ўступілі, дык ета — чалавек. А такі, як ты, роднай матцы не саступіць...

Я не хацеў перапыняць бабулю, але яна сама неяк змоўкла, пазіраючы вакол, тады раптам як схамянулася, усхвалявана загаварыла, і я заўважыў, што яе сіняватыя губы — аж задрыжэлі...

— Дак ведаеце, добры чалавек, ён, няўклюда той, заплывак нейкі і бязладдзе, і яшчэ больш асердаваўся, усё бубніць і бубніць. «Гэ,— кажа,— чортава бабка, не на таго чалавека ты наткнулася, я,— кажа,— табе даў бы месца на могільніку, а не ў вагоне...» Дак тут я ўжо не стрымалася, не сцярпела маё хворае сэрца. Я ж ужо і дала яму, дала, што аж усе людзі, што сядзелі і стаялі, паспачувалі мне — падтрымалі і смяяліся, давольныя, што яму так адчытала. Ах ты, кажу, падлюга ты, не чалавек ты ёсць, а самы настаяшчы, самы хворменны — падлец. Ты знаеш, каго ты з месца скідваеш, каго ты папіхаеш у пролабку — жывую сваю, можна сказаць, маці родную. Ты знаеш, кажу, што мой род увесь лёг за тое, што мы цяпер жывём, красуемся, ездзім, куды нам хочацца, куды душа зажадае?! Ты мяне не чапай, бо калі растрывожыш, то я табе ўраз морду паб'ю... А тады яшчэ і міліцыю пазаву, дак прыпаяюць сутак пятнаццаць, адседзіш як міленькі!..

— І што ж ён, пасажыр той, трохі супакоіўся?

— Ого, яшчэ як!

— А колькі ж вам, бабуся, ужо? Відаць, і сапраўды вам цяжка ездзіць. Мо нядобра там, у дачкі ці ў сына?..

— А не, дзетка мой любенькі. Добра жывём. Мой жа сынок, еты Юрка, прараб быў. Дамоў колькі панастаўляў і ў Крычаве, і ў Ленінградскай вобласці, і той жа горад новы, Прыдняпроўскі, будаваў. І кватэра ў яго добрая. І ў нас з Ленкай, з дачкой, кватэра велькая. І ванна ёсць, і халадзільнік, і ўсё іншае. Жывецца нам добра. Нас людзі ўважаюць і там, але двору хочацца. Я ўжо думала, што не паеду больш з Ракіцянкі, ад брата. Во каб памерла там, на родным котлішчы, то і няхай бы пахавалі, у сваёй зямельцы. Ды во валакуся, можа, ужо і не пабачуся я з роднымі вербачкамі сваімі, бярозамі тымі, што яшчэ са сваім Яшам, з мужыком, садзілі, як калектыўнае жыццейка пачалося...

— А што, старога ўжо няма?

— А нямашака даўно ўжо. Ад саменькае етае вайны. Праўда, прыйшоў быў з фронту ў сорак пятым, як пабеда настала. Пабыў дома, пажыў з паўгода. Кволіўся, увесь зранены, зрашэчаны, як тое дзіравае рэшата. Аднойчы лёг і з начы не ўстаў. Памёр — як заснуў усё адно... За чатыры гады фронту хіба мала яму дасталося!.. Сем разоў, казаў, паранены быў, падлечыцца, і зноў на перадавую. Памёр мой Якаў Іванавіч, не пабачыў тае жыццейкі, за якую здароўе палажыў. Затое мы жывём. Што ж, так здарылася з дачкой маёй, а то жылі б прыпяваючы. Ні ў чым цяпер нястачы не маем, жыві сабе ды красуйся. Хочаш белы хлеб, хочаш чорны — усяго, дзякуй ёй, нашай уласці, хапае. А каб ета ўсё расказаць-апісаць, як мы жылі, як жыў і мой хаця бацька, колькі ён парваў здароўя, каб прыдбаць які кавалак хлеба, дзяцей падгадаваць...

— А хто бацька ваш быў? Вы ж кажаце, што прозвішча ў вас знакамітае — Далецкая?..

— Так,— усміхнулася бабуля, мяккай рукою абцерла вусны, памаўчала, як бы збіраючыся з думкамі.— Ета па мужу я Свістунова, а бацька мой быў Андрэй Далецкі. Як мне расказваў ён і маці мая, то ён нарадзіўся ў панскім двары. Мая маці-нябожчыца служыла ў пана. Яшчэ дзяўчынкай забралі яе з вёскі, з Гуткоў. Ета вялікая была вёска, заможная, і панскі двор быў. То і нарадзіўся хлопчык у яе, бабкі маёй ужо... Як падрос тэй хлопчык, то яго забраў пан, у людской ён выхоўваўся, і сваё прозвішча яму даў. А маці яго памерла маладой, рукі нала-

жыць на сябе наважыла. Пэўна, жыццё нямі́ла ёй стала... Дак чатырнаццаць гадкоў у пана за фурмана быў мой бацька. А тады сабраў грошай трохі, ажаніўся. Ды такая тая жаніцьба была... Узяла яго адна жанчына ў прымы, на чацвёра дзяцей. Пагадаваў усіх, усе дзяўчынкі былі. А з маткай яшчэ нажылі двое — во брат мой Міхалка і я. Настай мяне клічуць. Настасся Андрэеўна, як вам сказаць. А тых яе, матчыных дачок, усіх замуж паддаваў. Як узялі адну, старэйшую, ды прачулі, што пасаг бацька дае — пяцьдзесят рублёў тымі, яшчэ мікалаеўскімі грашыма, то і пабралі ўсіх. А нас, малых, да ўсякае работы прывучаў. Я і помню, як хадзіла з бацькам у поле, як сена касілі, як малацілі збажыну. А памёр ужо бацька пры нашай уласці. Дужа радасна прыняў етую ўласць, калі ў нас паноў грамілі, панскі двор разбівалі, то і ён з флакам ішоў... І мяне ўзяў з сабою, і я ўсё бачыла, як пана таго, Далецкага старога, у вазок пасадзілі і ў Воршу над ружжамі адправілі... А тады як памі́раў мой бацька, то наказваў дзецям: «Я вам, старэйшым, даў што мог, а вы етага, Міхалку, не кідайце, памажыце яму». Ён быў ужо хлопец вялікі. Ён і шыць хадзіў з бацькам, і да ўсякае работы быў здатны. І таксама — пайшоў у Чырвоную гвардзію, заступацца за бедных людзей. Прозвішча, як вы кажаце, вядомае некалі было — Далецкі...

Я, можна сказаць, і сама рабіла нашу савецкую ўласць, душою за яе стаяла. Хадзіла з флакам, ішла з усімі тады, як аб'явілі слабоду... О, я была ў маладосці — можа, самая найпершая дзяўчына ў ваколіцы, на ўсю акрэснасць, можна сказаць. Да мяне сватаўся балтыйскі марак з Усполля Лявон Зябнёў, хацеў мяне замуж узяць, але брат — нізашто... Тады ж зямля, коні — галоўнае... Сказаў, куды ж ты пойдзеш за етага басяка-галетніка. У яго ж зямлі — старой тупічанскай бабе сесці, а ў Свістунова — надзел. Як аддзеліцца, стары Свістун дасць усё — у яго парка коней, толькі на выезд. Усё сваё — гаспадаром будзеш. І ты, сястрыца, не будзеш знаць бяды-гора. А каб жа знаццё тое, як потым стала, і зямля тая не нада, а стаў наш галетнік-марачок вядомы на ўсё Усполле, на ўсю воласць. Каб не ён, не наша знаёмства і ўзаемная любоў, то пабачыла б і я таго горачка, якое ўгатавана-ўрыхтавана было і мне з тым заможніцкім сынам, з маім Свістуновым...

Бабуля Наста ўздыхнула, змахнула з твару невідочную хмурнасць і далей казала сваю байку — казку жыцця:

— Як пачалася ў нас тады калектывізацыя ды як папраганялі з Ракіцянкі кулакоў, забралі і Якава. А мяне, як жонку варожага элемента, і ў калгас, у новае жыццё, хацелі не пусціць. Але прыехаў Лявонка, марак мой, прыйшоў да мяне, вядома, тайком, каб не бачылі, што з кулацкай жонкай хаўрус мае, і сказаў: «Наста, глядзі, не працюйся, не сядзі, пакуль цябе з твайго етага кулацкага седала турнуць, ідзі з усімі жанкамі ў поле і рабі. Цябе будуць праганяць, не пускаць, а ты ідзі і рабі, як усе ракіцянскія калхознікі...» Я так і зрабіла. Тады прыехаў адзін, вялікі начальнік, невядома адкуль, можа, з Амціслава, а можа, з Мугулёва, і ракіцянскія беднякі пажаліліся: «Навошта яна нам, етая Свістуніха. Яшчэ знутры новую жызню падарве...» А Лявон за мяне заступіўся: «Я,— казаў,— добра знаю Насту. Яна з беднага, можна сказаць, парабчанскага роду. Яна наша. Не здрадзіць». Так я і засталася з усімі ў новым калгасе ў Ракіцянцы.

— А тады ж,— даверліва казала далей бабуля Свістунова-Далецкая,— трэба было і мужа неяк ратаваць. Прачула я, што ён у Чэрыкаве на тралёўцы лесу рабіў. Я да яго некалькі разоў ездзіла, дабілася, што перадачы прымалі. А як жа? Я ж законная яго жонка, двое дзяцей у нас ужо было... Нічога я не магу сказаць, для мяне ён вось законны супружнік Яша, Якаў Іванавіч. Бегала, за дзень спраўлялася, па шпалах бегала — босая, бацінкі свае на плечы і босая па шпалах, а была ета вясна, халаднаватая яшчэ зямля, у пяткі пячэ, як іголкамі, а тады пагрэешся, і нічога — горача, як улетку. Спраўлялася за дзень. Вёрстаў трыццаць пяць будзе, не меней, да тых Верамейкаў, дзе ён тады калоды дубовыя на ваганеткі грузіў... І перадачы яму насіла, і ўсё пісала і пісала, аж у Маскву. І чакала, што паштальён прынясе мне добрую вестку. Аднойчы ён і кажа: «Наста, прыйшоў табе ліст». Я аж абамлела ад радасці. Прачытала і — чула маё сэрца,— слова мовіць не магла: «Якава Свістунова апраўдаць, вызваліць, як незаконна абвінавачанага...»

— Так што і Якаў Свістуноў быў дапушчаны да новай жызні,— закончыла бабуля сваю байку-казку і кранула мяне рукой за плячо: — Чуеш, добры чалавек, можа б, вы пагаварылі з етым во, што ходзіць, з чырвонаю павязкай, з дзяжурным? Можа, ён вас паслухае скарэй. Я ўжо думаю, што дарэмна я не паслухалася пляменніцы. Трэба было вярнуцца назад... Бялета не вазьму аніяк...

— І я так думаю, бабуся. Трэба пагаварыць.

Я памкнуўся ўслед за дзяжурным, але шапка дзяжурнага хутка знікла ў натоўпе, што зноў наплывам запоўніў усе праходы і аж распіраў сцены пачакальні. Я пачаў прабірацца, каб патрапіць за дзяжурным, ды тут з дынаміка пачулася: «Объявляется посадка на дополнительный поезд № 271 направлением на Минск. Поезд отправляется...»

З болем, са шчырым шкадаваннем вярнуўся я назад, узяў свой чамаданчык і пачаў развітвацца з бабуляй, з пасажырамі, што стаялі і сядзелі, слухаючы гэтую размову. Мне падалося, што бабуля Свістунова-Далецкая не хвалявалася; ёй, можа, і заўтра раніцою не ўдасца сесці на цягнік...

* * *

Мяне ўвесь час непакоіла чамусьці, ці сядзе ў таўкатні і перагружанасці паяздоў бабуля, якая пры сваёй нядаўняй хваробе, па сутнасці, і не павінна была б адважыцца на такую цяжкую дарогу. Я дакараў сябе, што не зрабіў спробы памагчы ёй з білетам раней, калі ў мяне яшчэ быў час у запасе, але ж і сама яна не парупілася.

Я ведаў, што цягнік Ленінград — Днепрапятроўск будзе ў Магілёве недзе а дзевятай гадзіне ўранні, і паспяшаўся на перагаворную, каб пазваніць на вакзал, пацікавіцца, ці звярталася да дзяжурнага якая-небудзь бабуля з просьбай. Мне далі размову ўжо а адзінаццатай гадзіне раніцы. У трубку хлынуў вакзальны гул — чутно было, што на вакзале яшчэ вельмі багата народу.

— Так, поезд прайшоў у 9 гадзін 47 мінут,— паведаміла мне жанчына — дзяжурная па вакзале.— Пасадка была вельмі цяжкая.

— А да вас бабуля, такая старая, у яе чамаданчык чырвонага колеру, абвязаны вяроўчынай, не звярталася з просьбай? — непакоіўся я і падумаў: «Хіба яна, гэтая бабуля, была там адна... Дзе там яе запомніш, пры такой таўкатні...»

— Пасадка была цяжкая,— паўтарыла дзяжурная.— Але, помню, падыходзіла адна, такая ветлівая, з бутэлечкай валяр'янкі ў руцэ. Ёй выдалі білет, плацкартнае месца. А цяпер яе не бачна — відаць, села...

Ну, што ж, шчасліва вам, бабуля!



МАТЧЫНА СЭРЦА

Пра мацярок можна расказваць бясконца!
М. Горкі

1

На бальшаку грукацелі абозы — наладаваныя коўдрамі і падушкамі фуры, запрэжаныя коньмі і нават каровамі — назад, у Маластоўку, вярталіся бежанцы — местачковыя шаўцы, рамізнікі, служачыя, прапыленыя, учарнелыя.

Наша хата стаяла пры саменькай дарозе. За глухой сцяною калодзеж з вышмараваным жураўлём і зялёным унутры цабэркам, акутым накрыж жалезам, каб коней не паілі з цабэрка, а ваду налівалі ў камягу.

Маці выйшла з хаты і, уражаная, пляснула ў далоні: на двор ехалі нашы даўнія знаёмыя з мястэчка — стары Мордух Руцін, яго жонка Фрэйда і хлопчык, Мордухаў унучак Лёва. Яго мы добра ведалі, бо як ездзілі з бацькам на кірмаш у Маластоўку, то заўсёды спыняліся ў Руціных, і стары каваль заўсёды хваліўся сваім унучкам, вельмі дасціпным шчабетуном.

— Чуеш, Іван,— звычайна пачынаў стары, гладзячы шурпатай далоняй рыжыя кучары хлопчыка, які круціўся ля дзеда.— Во, бачыш, ета ж сынок майго Боры. Жаніўся ён, не пытаючыся ў бацькі. Адправіў яго ў Гомель, каб вучыўся, а ён, бачыш, ажаніўся там. Бачыш, Іван, і во прывезлі. Гадуй, дзед, радуйся...

— Сціхні ты ўжо, стары,— падае голас з бакоўкі бабуля Фрэйда.— Не было б горшай бяды. Яны — маладыя, няхай жывуць, а нам во ўцеха, на старыя гады радасць...

Лёвачка быў такі блакітнавокі прыгажун, гаваркі і ласкавы, што яго нельга было не палюбіць. Мы заўсёды

падвозілі яго аж да канца мястэчка, і Лёвачка на развітанне махаў ручкай так, як вучыў яго дзядуля: «Лёва, зрабі для дзядзі во так ручкаю!..»

Вярталіся да свайго гнязда бежанцы, і на сэрцы як бы палягчэла. Руціны прывезлі яшчэ такую навіну: «Немцаў пагналі ад Сожа назад». Стары каваль трымае кубак з малаком, рука яго калоціцца, малако пырскае на стол, а ён усё бядуе: «Ай-ёй, што будзе...»

— Маўчы ўжо, стары,— супакойвае бабуля Фрэйда.— Мы, лічы, ужо дома, а дзе цяпер нашы Бора і Наташа?.. Чым жа вінаватыя гэтыя старыя, спрацаваныя людзі? Чаму яны вымушаны ўцякаць са свайго жытла? Усё сваё жыццё яны адно што працавалі і працавалі, каб як-небудзь звесці канцы з канцамі, пракарміць вялікую сям'ю. Памятаю, калі мы, бывала, прыедзем да Руціных, то бабуля Фрэйда, частуючы нас, жартавала: «Дрэнная я буду гаспадыня, калі не накармлю ўсю сям'ю адным селядцом».

Руціны нас як бы падвесялілі крыху. Усе гэтыя дні ў нас з маці была гаворка; я настойваю эвакуіравацца ці пайсці з якой-небудзь вайсковай часцю, а маці заладзіла сваё: «Куды ж ты, дзівак, паедзеш? У цябе ж яшчэ як мае быць швы ад той аперацыі не загаіліся, што ты будзеш есці ў дарозе, табе ж нельга сухама. Акалееш дзе-небудзь, згінеш, як муха...»

Я, вядома, слухаў, што маці казала, а тым часам з камсамольскім сакратаром Сцяпанам Говарам цішком рыхтаваўся да выезду. Цяпер жа нашы планы зблыталіся.

Адпачыўшы і падсілкаваўшыся, госці адправіліся дадому. Мне шкада было развітвацца з імі, асабліва з Лёвачкам, які ўжо быў ладны хлопчык, амаль што школьнік, рослы, выцягнуўся, але ўсё такі ж кучаравы, гарэза.

— Прыедзеш да нас, Лёва? — спытаў я ў хлопчыка, калі ён ужо ўсеўся на возе поруч з дзедам.— Ужо яблыкі спеюць...

— Добра, прыеду,— неяк сумна прамовіў Лёвачка.— Вайны не будзе, і прыеду...

Доўга я стаяў на пыльнай дарозе, збоч якой, бы волаты-вартавыя, гойдалі веццем старыя дуплістыя бярозы. Стаяў, пакуль фура Руціных не знікла за пагоркам.

Было ціха-ціха. Па небе спакойна плылі белыя кучаравыя аблокі. У вершалінах прыдарожных дрэў не чутно было ніякага шуму. Не верылася, што недзе недалёка, за Сожам, ужо грымелі выбухі, ірваліся снарады; смерць касіла людзей — кроўю і слязьмі аблівалася зямля.

Раптоўна адтуль, дзе толькі што схавалася фура Руціных, пачулася скрыгаслівае гудзенне — бы нехта надрыўна зароў у кулак ці закугакала надвячоркам сава, а потым неба як бы раскалолася і абрушылася, асляпляльна бліснула полымя; падалося, бы здрыгануліся, падскочылі знянацку бярозы... Адзін за другім два выбухі прагрымелі за пагоркам, і зноў усё аціхла. Было адно чуваць, як у сухім ад спёкі небе надрыўна і млосна загуў чужы, з чорнымі крыжамі самалёт. Мы ўжо ведалі, што гэта фашысты. Мусіць, з самалёта скінулі бомбы на бальшак.

Ачомаўшыся, я падумаў, што там жа недзе і фура Руціных. Падумалася, што, відаць, больш за ўсіх будзе боязна Лёвачку, ён жа яшчэ амаль што дзіця.

2

Увечары нехта асцярожна пастукаў у шыбу. Маці прыпала тварам да акна: хто б мог стукацца, бо суседзі ведалі, дзе зашчапка, і без аніякага стуку адчынялі хату.

Стук нясмела паўтарыўся, і маці патэпала ў сенцы.

— Хто там? У нас не зашчэплена!..

— Адчыніце, гэта я, Лёва,— пачулася ў цемры.

Маці адчыніла дзверы і ўвяла за руку хлопчыка — гэта быў Лёвачка Руціных, увесь перапэцканы, у адной маечцы і ў кароценькіх штоніках са шлейкай. На адной назе ў яго быў сандалік, а другая босая, падрапаная аб нешта вострае — з яе сачылася кроў. Хлопчык калаціўся і ўздрыгваў, прыціскаючы запэцканыя кулачкі да вачэй. Відаць, ён вельмі наплакаўся, і ў вялікіх блакітных вачах стаяла жудасць; твар час ад часу балюча перасмыкаўся.

Лёвачка крыху супакоіўся, і мы пачалі ў яго распытваць, што здарылася. Ён вельмі блытана і са слязамі расказаў, што нешта над іх падводай бліснула і яго як бы нехта балюча штурхнуў; ён ачуняў далёка ад дарогі ў жыце. Калі падняўся, то ўбачыў раскіданыя вакол рэчы, бабуля ляжала далей — уся ў крыві, забітая, а падводы і дзеда не было. Доўга ён шукаў сандалік, а тады, убачыўшы, што цямнее, кінуўся па дарозе ў вёску.

— Я вельмі баюся, цёця Уліта,— румзаў хлопчык.— Дзе мая бабуля?.. Навошта яе забілі? Дзе мой дзед?..

— Не бойся, Лёва, не плач,— супакойвала яго, як магла, маці.— Ранічкаю мы пойдзем з табою, знойдзем дзеда, не плач, дзіцятка маё...

Назаўтра бальшаком і агародамі адступалі на ўсход нашы. Байцы, змардаваныя і змучаныя ад спёкі і голаду, брылі і брылі ўвесь дзень — і з вінтоўкамі і проста так, з кацялкамі ў руках ці пры поясе, у пілотках і з непакрытымі галовамі.

Сяды-тады на двор забягаў хто з салдат і перасмяглымі вуснамі вымаўляў адно: «Піць». У вёдрах ужо даўно было суха. Усё — і ваду і малако — мы даўно аддалі такім жа чырвонаармейцам, якія ўжо заходзілі; цяпер можна было прапанаваць толькі яблыкі.

Вакол студні тоўпіліся салдаты, грымелі кацялкамі, чэрпалі цабэркам пясчаную кашу — вада не паспявала прыбываць. Такое было ўпершыню, каб за якую гадзіну вычарпалі ўвесь калодзеж, а ў ім жа вады было, мабыць, сажні на два...

Усю ноч і яшчэ ўвесь дзень праз Бацькавічы ішлі чырвонаармейцы. Пра тое, каб адправіць Лёвачку ў мястэчка, нечага было і думаць,— трэба было яго неяк супакоіць, пакуль аціхне крыху.

Нечакана стала ціха. Як бы ўсё вымерла. Прайшла пагалоска, што, мусіць, сёння будуць немцы. Што рабіць? Маці ўсё кідалася то на гарод, дзе на ўсякі выпадак быў выкапаны акопчык, то забягала ў хату, нейкая як сама не свая.

Лёвачка крыху пасумаваў, павохкаў, а потым супакоіўся, відаць, адчуў, што трывогай ахоплены ўсе, і ён не прасіўся, каб яго везлі дадому, да дзеда.

Яшчэ ледзь забялеўся ўсход, як мы з Говарам пагналі ў поле каровы. Бежанцы, якія вярталіся назад, сказалі, што ўжо за Горкамі бачылі, як праехалі нямецкія матацыклісты. Калі ўвечары мы, перапалоханыя і разгубленыя, прыгналі статак, то пачулі, што ўжо бальшаком прайшлі немцы.

Невядома, што тады было на душы ў маці, але яна была зноў жа, як падалося, спакойная. Як заўсёды, на золку даіла карову, працэджвала малако, налівала нам сырадою, моўчкі ставіла гарлачыкі ў суднік і пачынала паліць у печы, а нам з Лёвачкам наказвала:

— Хлопчыкі, схадзіце ў лес, нарвіце травы для Чарнаўкі...

Вярталіся мы з лесу неўзабаве, і было вельмі балюча на душы. Маці падавала нам абед, расказвала вясковыя навіны і прыдумвала для нас новы занятак.

Мінула яшчэ колькі дзён. Неяк увечары ў шыбу пачуў-

ся асцярожны стук — гэта прыйшоў стары каваль. Хто ж яму сказаў, што Лёвачка ў нас? А мажліва, ён прыйшоў так, падзяліцца сваім горам...

— Ой-ёй-ёй, што робіцца, Уліта! — загаварыў стары, атрасаючы пыл з ватоўкі.— Пахаваў я сваю Фрэйду, забітая яна ляжала, от прыкапаў трохі...

Стары няўцямна паглядзеў вакол, і вочы яго, яшчэ нядаўна такія зыркія і вясёлыя, здаецца, патухлі. Чалавека нічога не весяліла, нават тое, што ля яго каленяў цёрся ўнучак, пра якога ён не адразу і спытаўся. Маркотлівы і разгублены, стары шурпатай далоняй гладзіў па галоўцы Лёвачку і ўсё ўздыхаў, перабіраючы яго цёплыя кучары.

— Ой, Уліта, нічога ты не ведаеш, галубка!..

Пераначаваўшы, стары каваль сабраў унука і, як маці ні адгаворвала, ранічкай, узяўшы з сабой невялічкі клуначак, што яна яму напакавала, накіраваўся ў дарогу. Развітваючыся, яшчэ раз расказаў пра тое, як самалёт кінуў на іх бомбу, як асколкі сыпанулі па конях, як яны рванулі з месца, колькі было сілы...

Стары развітаўся з намі вельмі шчыра, нават усміхнуўся, прыгарнуў унука да грудзей і, як бывала некалі каля сваёй хаты ў Маластоўцы, калі мы з бацькам заязджалі да Руціных, прамовіў: «Лёва, зрабі на развітанне ручкай...»

3

Даходзілі жудасныя чуткі. Спачатку ў яўрэяў-местачкоўцаў адабралі маёмасць, хатнія рэчы, затым сагналі іх у адно месца і пад канвоем ганялі на работу. Адзін наш селянін ездзіў у мястэчка і сказаў, што бачыў старога Мордуха ля сталоўкі, ён у пары з вядомым у раёне ўрачом Плаксам пілаваў дровы. Ля іх паходжваў паліцэйскі. Той наш селянін падышоў да іх. Пагаварыўшы з паліцэйскім, ён перакінуўся словам і з кавалём.

— Перадай, братка, там Уліце,— шапнуў ён і адышоў, змахнуўшы слязу.

Маці вельмі балюча перажывала ўсё, моўчкі цяжка ўздыхала. Перад вачыма стаяў Лёвачка. Яго сінія вочкі, звонкі, бы званочак, галасок, бесклапотная дзіцячая ўсмешка, тужлівыя ўздыхі, калі ён успамінаў пра бабулю...

— Каб як можна было яго выратаваць,— загаварыў я, занепакоены, як і маці, лёсам гэтага хлопчыка, што быў

нам амаль што родным.— Можа, я пайду і як-небудзь паспрабую вывесці Лёву адтуль, з Маластоўкі?

— А як хто даведаецца, што мы хаваем яго ў доме, тады і нам бяды не мінуць...

— Адвядзём яго ў Селішча, да цёткі Вары. Там заціша, а людзям яна скажа, што ўзяла сабе хлопчыка з Ухіні, з дзіцячага прытулка.

— А то й праўда! — згадзілася маці.— Калі ж што якое, то можна не прызнавацца, сказаць, што хлопчык прыёмны, і ўсё.

— Дык я пайду, мама.

— Што ты, дзівак,— пэўна, як нешта ўжо вырашанае, сказала маці.— Калі ўжо ісці, то толькі мне!

Маці загарнула ў хустачку кавалак сала, адабрала большых яек, адрэзала акраец хлеба і ўсё паклала ў кошык. На досвітку адправілася ў дарогу. Праз якія чатыры гадзіны была ўжо ля Маластоўкі. Яе ніхто не спыніў. Вуліцы як вымерлі. Рэдка дзе корпалася ў гародзе кабета ці прасунецца паўз хаты да студні адзінокі чалавек. Вокны ў многіх дамах зачынены на стаўні, сям-там зеўралі павыбіваныя шыбы...

Вось і знаёмая драўляная будыніна — местачковая сталоўка. На двары штабялямі ляжаць дровы, сіратліва стаіць бочка-вадавозка на двух колах, спрэс нацярушана пілавінне...

Маці ўбачыла, як сюды прайшлі двое — згорблены стары каваль у сваёй паношанай і ўжо залапленай бравэрцы і другі, незнаёмы ёй, зарослы чорнай шчэццю мужчына сярэдніх гадоў. З імі клыпаў даўгалыгі Мікіта Канавал, колішні сусед, калі маці яшчэ дзеўкавала ў Бірулях.

Яна асцярожна аклікнула старога. Той азірнуўся, прывітаўся і паказаў на паліцэйскага: маўляў, у яго трэба спытаць дазволу на тое, каб пагаварыць. Нічога не заставалася, як прасіць гэтага боўдзілу.

— Дак ты ўжо, Мікіта, заганарыўся, атрымаўшы такую высокую пасаду,— не без іроніі пачала маці.— Можа, здароў, ці што?

— А як бы ты думала? — у сваю чаргу зафанабэрыўся Мікіта.— Мінулася ваша ўласць — боханы белага хлеба з крамы насіць. Жылі, як на вялікдзень, а цяпер, ваша дышла, пажывём, пакаштуем белага хлеба і мы,— і адвярнуўся, падцягваючы велікаватыя галіфэ.

— Ты ўжо, Мікіта Восіпавіч, як колішні сусед, не крыўдуй,— падладжвалася на вясёлы тон маці і паказала

на кошык: — Тутака во гасцінец, я, разумееш, па-зямляцку... А мне адпусці на хвілінку етага во старога, у яго, кажуць, ёсць чыгункі, трэба згаварыцца, бо няма ў чым бульбы зварыць...

Мікіта пакасавурыўся на кошык, азірнуўся вакол, патупаў на месцы, мабыць, разважаючы, што рабіць з гэтай кабетай. Усё ж былая суседка, разнясе, бытта Мікіта ўжо такі злоснік, што да яго і не падступішся.

— Ну, ідзі, стары хрэн, ды хутчэй, жыва каб мне назад! — кіўнуў паліцэйскі і ўзяў з рук маці кошык.

Стары каваль адразу здагадаўся, з якой нагоды прыйшла Уліта: яна сказала пра ўсё вачамі. Па дарозе ўдакладніла свой план, ціха шапнула:

— Няхай хлопчык прыбяжыць у канец, пад Тур'ю. Да канцавой хаты ў вішанніку...

— Добра, Улітачка, галубка, пастараюся!

Маці падалася сцежкаю на тур'еўскі шлях. Сэрца калацілася — было цяжка дыхаць. Яна развязала хустку, аддыхалася. Шчыравала гарачае жнівеньскае сонца. Прыпарвала. Раптам над нагамі замітусіліся трэскі, падхапіла ветрам лісце: злёгку закружылася ў паветры смецце, пажоўклыя паперкі. Зашасцела вецце на ліпах, пасыпаліся, ацярушваючыся, жаўтлявыя лісты... Правуркатаў глуха гром, але дажджу не было — адно пырснула некалькі кропель.

Выбраўшы месца ў вішанніку, маці прысела на пажухлую, прыпыленую траву і пачала прыслухоўвацца. Марудна цягнуліся хвіліны. Не зусім спадзявалася яна, што Лёвачка прыйдзе, бо не так лёгка было цяпер выбрацца з мястэчка. Але не прайшло і паўгадзіны, як Лёвачка з'явіўся, задыханы і нейкі трохі разгублены. Мабыць, яму сказалі, што тут яго будзе чакаць цётка Уліта, а цяпер ён бачыў, што яе няма, і гатоў быў расплакацца. Ва ўсякім разе так падалося маці, і яна, не марудзячы, выйшла насустрач:

— Лёва, дзіцятка маё, ідзі не бойся!

Лёвачка, як бы прасветлены наскрозь радасцю, ірвануўся да яе, зашчабятаў весела:

— Цёця, а мне дзядуля сказаў, што я з вамі пайду. Цяпер я з вашым Шурам буду гуляць. Добра, цётка Уліта?

— Добра, мой хлопчык. Пойдзем, сынок.

Азіраючыся раз-пораз на зялёнае, зацененае нізкімі хмарамі мястэчка, маці барзджэй пакрочыла на ўсход,

трымаючы за руку хлопчыка, які ледзь паспяваў за ёй і ўсё гаварыў і гаварыў, бы шчабятун які:

— Цётка Уліта, чаму гэта вы ўсё азіраецеся? Дзядуля сказаў, што прыйдзе да мяне, як перастане навальніца, як вернецца з горада мая мама...

Пад вечар яны ўдала дабраліся да Бацькавіч, і Лёвачка застаўся. Праўда, мы яго стараліся не пускаць далёка ад дому, ды ён і сам не надта кідаўся туды, бо быў кемлівы хлопчык. Мы з ім пасябравалі і ўвесь час праводзілі то ў лесе, які быў недалёка, то ў садку, забаўляліся пад паветкай, дзе была бацькава стальмашня.

Маці вельмі чуйна прыслухоўвалася да ўсяго, бо ўжо ў вёсцы пачалі ўводзіць «новы парадак». У Ігліцы стала воласць і новае начальства — стараста, пісар і паліцэйскія. У нашу вёску часта наязджаў Бугай — валасны бургамістр, як ён сябе называў, і агітаваў некаторых, каб пісаліся ў паліцыю — бараніць будучыя свае надзелы ад бальшавікоў. З яго ўсе ў думках пасмейваліся, а на запрашэнні аднекваліся: «Пан бургамістр, якія з нас паліцаі, глядзіце: адзін без нагі, другі без вока, а трэці глухі, як цецярук...» Бугай рагатаў і спяшаўся на хутар, да Ларывона Крука, якога прызначыў за старасту.

Неяк ля калодзежа маці набірала ваду, і Бугай спыніўся, пахваляючыся сваім рыжым жарабком, што гарцаваў пад ім. Угледзеўшы яе, ён з'едліва прамовіў:

— Іваніха, кажуць, у цябе жыве нейкае хлапчанё. Не яўрэйскае ета? Глядзі, бо за ета, ведаеш,— вешалка!..

— Што ты, пан бургомістр, гэта ж хлопчык маёй сястры з Пакроўкі,— зусім спакойна сказала маці і пакрыўджана дадала: — Вой людзі! Глядзі ты, ужо і навыдумлялі чортведама што... Вой людзі!..

— То я ведаю, Іваніха, што ты паняла...

— Так, пан бургомістр, зразумела.

У той жа дзень маці з Лёвачкам гародамі, па канаплянішчы, шыбанула на дуброўскую дарогу ў Селішча, дзе жыла цётка Вара. На тым хутары было ўсяго два ці тры двары, і людзі там жылі, як свае, як радня. А мо яны і даводзіліся адно аднаму раднёю. Сюды, мабыць, яшчэ ні разу не наведваліся паліцаі.

Цётка Вара ахвотна згадзілася ўзяць да сябе хлопчыка — Лёвачка, вядома ж, не хацеў заставацца, але маці яго ўгаварыла, а можа, ён і сам ужо здагадаўся, што яму ў нас жыць не можна. На хутары хлопчык прабыў усю восень і зіму.

Вясною партызаны ўсё часцей пачалі наведвацца на хутар. А затым і зусім атабарыліся побач, на выжарыне, акружанай балотам. Нехта дазнаўся, што ў Вары Цярэшкі жыве хлопчык з мястэчка. І праз нейкі час у Селішча завітала ў вайсковай форме маладая жанчына, доўга глядзела на Лёвачку, а потым са слязьмі на вачах сказала гаспадыні: «Дзякую вам, дарагая Вара Ціханаўна, вы мне выратавалі сына. Я праз увесь век не забуду. Яшчэ раз дзякую».

Яна забрала з сабою хлопчыка.

А стары каваль загінуў у той дзень, апоўдні, як над мястэчкам усходалася нечаканая навальніца. Яго застрэліў немец, нібы з тае прычыны, што стары спрабаваў адысці ад сваёй хаты.

* * *

Гэта даўняя гісторыя ўжо, мабыць, забылася, бо за час акупацыі было тут шмат усялякіх незвычайных здарэнняў. Людзям давялося перажыць шмат гора і пакут, і гэты эпізод у жыцці Уліты Іваніхі быў звычайным, і яна сама пра яго не спамінала.

Ды аднойчы, праз многа гадоў, зноў жа апоўдні, у гарачы жнівеньскі дзень, ля замшэлай Уліцінай хаты спынілася заляпаная гразёю «Волга» — надоечы джгаў навальнічны, сляпы дождж. З машыны выйшаў высокі, стройны, з залацістымі валасамі хлапчына, запытаў у басаногіх хлапчукоў, якія, нібы авадні, абляпілі машыну:

— Не ведаеце, дзе жыве цётка Уліта?

— А во, хата пад дранкаю,— паказаў адзін з басаногай каманды.— Толькі тут жыве не цётка, а бабуля Уліта.

— Ну, бабуля дык бабуля,— збянтэжыўся хлапчына і насцеж расчыніў дзверцы машыны:

— Мама, выходзьце...

Старая, убачыўшы, што ля хаты спынілася машына, заспяшалася насустрач і ўсё ўзіралася сваімі блізарукімі вачамі, ніяк не могучы ўцяміць, хто б гэта мог быць: каб госці — сын яе, дык ён старэйшы куды; унукі, дык яны меншыя, і нявестка яе не такая поўная... А рыжачубы ўсміхаўся ёй і ўжо раскідваў рукі для абдымкаў:

— Добры дзень, цётка Уліта! Добры дзень, маці!

— Здрастуй, здрастуй, сынок,— прамовіла бабуля.— Хто ж ты такі, я нешта не пазнаю?

Яна разгублена глядзела то на хлопца, то на жан-

чын — маладую і пажылую, што ціха і цёпла ўсміхаліся ёй.

— Чакайце,— прасвятлела і як бы нешта прыгадала старая.— Ці не Лёва ета?

— Ён самы, маці.

— То ж бо я гляджу,— замітусілася старая.— На дзеда падобны трохі, на старога Мордку,— і ўздыхнула, а тады барзджэй загаманіла: — Дык што ж мы стаім? Заходзьце ў хату. Заходзьце, госцейкі!..

...На захадзе, там, дзе ў мроіве гойдаліся, бы нейкія прывіды, гурбы хмар, чулася далёкая навальніца. Сюды даносілася толькі яе буркатлівае, прыглушанае далеччу рэха.



ЛІПЕНЬ-МЁД

Зіна прыйшла з вечарыны позна. Дамашнія, асабліва бабуля, бадай што ўжо выспаліся. Ціха, як крадучыся, на пальчыках, каб не разбудзіць Паўліка, прабралася ў чыстую палавіну хаты, спехам разабрала пасцель, гэтак жа похапкам выцягла з валасоў заколкі, скінула з сябе сукенку і, пацепваючыся, улеглася ў старым драўляным ложку, у якім любіла спачыць, калі прыязджала дамоў з горада.

Ляжала доўга, намагаючыся заснуць, але сон не ішоў. У нізкія, зацененыя знадворку кветкамі вокны цадзілася кволае ліпнёвае світанне, а Зіна не магла пазбавіцца ўзрушэння — яе на гэтай вечарыне ўзрушыла ўсю, да апошняй нервовай клетачкі.

«Што гэта? Насланнё, мабыць, нейкае?! — трывожна і радасна запыталася ў сябе.— Няўжо мой лёс? Аж смешна. Замужняя. З дзіцем. І раптам, ой, божа, каханне. Дзіўна, далібог!..»

Столькі дзяўчат у Крывяліцку. Адна прыгажэйшая за другую. І сваіх, і тых, што з горада прыязджаюць кожную суботу. Кожная, гэта Зіна добра ведае, проста ўскружыць галаву і свайму хлопцу, і кавалеру-гараджаніну.

Не спіцца. Зіна чуйна ўслухоўваецца ў знямела-трывожнае шапаценне кветак за акном і перабірае ў памяці гэты вечар, які начыста перакрэсліў усю яе цяперашнюю жытку.

Дзіва, дый годзе! Нейкі доўгавалосы студэнцік, дзіця горкае, яшчэ, мусіць, і цалавацца добра не ўмее, а выбраў яе, Зіну. А можа, гэта ёй, дзівачцы, усё здалося? Можа, гэта звычайнае хлапечае заляцанне?.. Калі Зіна з дзяўчатамі прыйшла на танцы, Толік — так звалі студэнта —

стаяў воддаль, над старою ліпаю, і адразу прыкмеціў яе, пачаў цікаваць. Зіна гэта адчула ледзь не фізічна, ёй аж нядобра зрабілася. Яна стрэлася з гэтым бадай што гіпнатычным позіркам і аж узлавалася: «Во яшчэ мне нахаба. Ай табе, жаўтароцік, дзяўчат мала? Засляпіла табе, ці што? На замужнюю бабу бельмы пяліш!..» Яе аж дрыжыкі пачалі біць. Падумала, што гэта халадок цягне з балота, ад Пцічанкі. Акрыўшыся матчынай хусткаю, якую захапіла ад назолаў-камароў, ды на заходзе неба было захмурылася, Зіна наважыла ўжо дамоў пайсці, але барадаты студэнт, мабыць, завадатар на вячорцы, паставіў новую пласцінку. Хлопцы і дзяўчаты ў круг рушылі як на злом галавы. Барадач цырымонна абвясціў:

— Вальс... для закаханых!..

Ціха, бачком да Зіны праціснуўся той хлапчук, што абстрэльваў яе вачамі, у лёгкім паклоне схіліў галаву, доўгія, аж па плечы, цёмныя валасы закрылі яго матава-бледны пры цьмянай лямпачцы твар, а сам ён выдаваў тонкім і доўгім у сваёй студэнцкай кашулі. У хрыплаватым, прастуджаным голасе Зіна ўлавіла непадробную шчырасць:

— Проша...

Дрыготка, аж працяло, Зіна лёгка і квола паклала сваю, здалося, бязважкую руку на яго плячук, адчула — пальцы яе дробненька, можа, ён і не качуў, трымцяць. Востра ў сэрцы штурхнула дакорам: «Навошта я паперлася на гэтае гульбішча! Я ж яшчэ не разведзеная». І ў тое ж імгненне нехта невідушчы, як бы збоку: «Дзівачка, усё адно ты з ім, п'янчугам і слімаком, жыць не будзеш. Пакуль маладая ды прыгожая — развяжы сабе свет. З ім табе не жыццё, а вечная пакута. Лепш адной век звекаваць!..»

...Памыўшыся сцюдзёнай, толькі са студні, вадою, Зіна стаяла перад трумо і прычэсвалася. Разглядаючы сябе ў люстэрка, яна як бы спрачалася сама з сабою. З аднаго боку дакарала сябе за той, як лічыла, неабдуманы крок, вінаваціла сябе, што падахвоцілася з дзяўчатамі на пагулянку. Нават ганіла і ўпікала сябе. З другога, як нехта старонні, бараніла, апраўдвала і падахвочвала: «Зінка, дзівачка ты! Прыгожая, людская і паставай, і з твару. Не азірайся, ідзі ўжо, калі ступіла крок, не бойся!..»

Зіна марудзіла, як не сваімі рукамі, прычэсвалася, абы больш пабыць адной. Зараз бабуля пакліча на сняданак, і можа ўсё раскрыцца. Яна, Зіна, не ўпэўнена, што бабуля не заўважыць, што з ёю робіцца. І, вядома, скажа маці, а

тая будзе знібець, чаўпці сваё: «Сцерпіцца — злюбіцца».

Як радае, што так лёгка выбавілася з гушчэчы цёмнага бору за Крывяліцкім балотам, ранішняе сонца нагбом п'е рэдзенькую расу на дрэвах, на траве і кветках і праз кусты язміну і маліннік перад вокнамі цёплымі абдымкамі-промнямі лашчыць голыя плечы і рукі Зіны, нячутна, мякка забаўляецца з распушчанымі валасамі. Зіне памроілася: яе асвежанага вадою твару кранаецца нехта нябачны, але такі жаданы, і яна як бы зноў засынае. З такога задумліва-соннага стану яе абуджае знаёмы голас:

— Зіначка, блінцы ачахнуць. Снедай, госцейка!..

Падумалася: якая ж я тут госця? Лічы, кожную суботу ці ў нядзелю з сумкай, напакаванай гасцінцамі, яна спяшаецца на электрычку. Два гады, як тут, у бацькоў, яе Паўлік. Ужо яму тры гадкі. Як на добры лад, Паўлік мог бы быць і з ёю, у свякрухі. Але дзе там — гарадская пенсіянерка. Наадрэз адмовілася глядзець дзіця. «Самі прыспасобілі,— кажа,— самі і гадуйце».

І зімою, і ўлетку Зіна бегала на станцыю і са станцыі паўз гэтую канаву-калектар. І гэтае лета не ведае адхлання. Усё бягом і, як кажуць, прыскокам. Хіба калі падумала яна, што тут, на тым балоце, якое ёй далося ў знакі ў маленстве, стрэнецца і яе доля-спакуса? Недзе там, на даляглядзе, стаіць між кустоў аграмадзіна-экскаватар, а ля яго, як мурашы, у рыжых, выцвілых кашулях пэцкаюцца, плёхаюцца ў багне хлапчукі. Казалі ёй, студэнты-гідратэхнікі на практыцы. Ды што ёй, Зіне, да іх. Каб жа знаццё, можа б, іншы раз хоць бы вокам кінула... А яна ўсё спяшаючыся, з адным клопатам — хутчэй да Паўліка. Дома з сынам, з бацькамі і бабуляй забываліся нягоды жыцця ў горадзе ў хаце свякрухі-скнары. Бацькі ведалі, што ў Зіны не ладзілася жыццё. Муж аказаўся шалапутны, мамчын сынок, злёгся з такімі, як і сам, абібокамі. Пасля вайсковай службы стаў працаваць на заводзе, але што толку? Адбудзе сяк-так змену — і на вуліцу, да такіх, як сам. Вечарамі прападае ля магазіна, а як выхадны — то на рынку. Нешта купляе, нешта прадае, выменьвае. На нейкай махінацыі быў папаўся — яму пагражала адсідка, але заводскія хлопцы, дзе Эдзік рабіў слесарам, пашкадавалі Зіну, бо знайшоўся ўжо Паўлік, і яе шалапута-мужа ўзялі на парукі.

Бедавала, плакала Зіна, праклінаючы сваё няўдалае замужжа. Не думала, не гадала, што ўсё гэтак абернецца,

што выпадзе ёй такая палынная доля. Каб гэта ведалася, яна ніколі б не паехала ў той горад, не засталася б на кватэры ў той цёткі з яе сынком. А памяркуеш, то і сама ж разява, дзе яе галава была тады, як пачаў заляцацца гэты Эдзік. Здурнела, пакваплілася — армеец. У вайсковай апратцы выдае зух-хлопцам. Відны з сябе. І язычок няблага падвешаны. Заляцаўся, залатыя горы Зіне абяцаў. Канечне, яна верыла і не верыла. Баялася памыліцца, не даць прамашкі — да бацькоў прывозіла Эдзіка на выглёнды, як у Крывяліцку кажуць.

У Зініных бацькоў Эдзік стараўся — еў, піў не саромеючыся і хваліўся без меры. Ілгаў абы-што, не чырванеючы. Калі пасля Зіна, асмеліўшыся, запытала ў маці пра кавалера, тая няпэўна паціснула плячамі:

— Хто яго ведае, хлопец як хлопец. А што там у яго наўме, адзін бог — суддзя. У горадзе свой дамок. Як ні кажы, прытулак. А жаночая доля такая: як ні харашыся, а дзеўкаваць век не будзеш, трэба браць на сябе гэты абузак — замужжа.

Паразважаўшы, маці выказалася больш пэўна:

— Ідзі, калі бярэ...

Бабуля маўчала. На сваім вяку яна больш пабачыла людзей, абы кіне вокам, то скажа, што то за чалавек; сцебане па вачах — не будзе заечую сцежку пятляць. Яна паназірала за Эдзікам і сабе зрабіла адзнаку: «Ілгун і задавака». Ды ў яе, бабулі, не папыталіся, і яна не назаляла, але папярэдзіла ўнучку: «Зінка, глядзі, каб не скруцілася твая маладосць. Не наравіцца мне, што гэты Эдзік дужа ж прагны. Гарэлку ў рот лье, як у барылку. І лжэ, як апошні лгун...»

І бацька добранькі, ужо такі маўчун, за дзень іншы раз не выцісне ніводнага слова, а тут як яго прарвала: «П'яніца праспіцца...»

Сказаў і, патупаўшы па хаце, моўчкі пасунуўся ў запечак. Вядома, лясны чалавек, усё жыццё на адзіноце.

Улетку Зіна распісалася з Эдзікам. Сумеснае іх жыццё, калі шчыра,— гарчэй, чым той горкі палын. А гэта ж, як па-людску, самая шчаслівая іх пара. Мядовыя дні, падараваныя ім маладосцю, азмрочыліся скрухай, горкай прыкрасцю. Не было ў іх таго, што дае сумесная блізкасць, калі адно жыве страсцю, ласкаю другога, калі ў самыя нават першыя хвіліны праяўлення страсці абое нібы адно, маючы найвышэйшую асалоду быцця, паўнаты таго, што дае абаім высокае чалавечае пачуццё.

Зіна намагаецца прыгадаць, ці кахала яна Эдзіка. І што гэта ў іх было? Тое найвялікшае, запаветнае чалавечае шчасце, сіла, з якой можна параўнаць хіба самую маладосць.

«Што было ў нас з Эдзікам? — разважала з сабою Зіна.— Каханне? Мабыць, не. Была простая закаханасць, счэпленая шлюбным счэпам...»

Яе маці, мабыць, век пражыла з гэтым сваім «сцерпіцца — злюбіцца». Мабыць, і яна не мела паўнаты таго шчасця, якое дае сапраўднае, заснаванае на духоўнай і душэўнай блізкасці, каханне.

У памяці ўсплылі словы маці, якія яна выказала адноўчы, калі Зіна збіралася распісвацца: «Важна, каб мужчына любіў цябе, а твая бабская справа — унаравіць яму, мужчыне. Такая наша бабская доля...»

Няхай сабе. Але ж жанчына — чалавек, і ёй уласціва тое, што і мужчыне. І павага да сябе як чалавека — не прыхамаць, а набытак існасці; усё ідзе ад прыроды, з глыбіні чалавечага пачуцця...

...Стыне на стале сняданак — блінцы са скваркамі, якія ў сям'і Чаплікаў на нядзелю традыцыйныя, а Зіна да стала не спяшаецца. Сцішана, на дыбачках падышла да калыскі, дзе смачна пасопваў яе ўцеха — Паўлік. (Імя ў гонар дзеда-партызана, што загінуў у час падрыву моста на Пцічы.) Нейкі момант стаяла, забыўшыся на ўсё, тады асцярожна, каб не разбудзіць, паправіла коўдрачку. І моўчкі, задуманая, прысела да стала. Не хацелася есці ані. У вачах, як наяве, стаяў чарнявенькі студэнцік. Ад яго рукі, якой ён трымаў Зінчыну руку, заставалася яшчэ цяпло — гаючасцю яно разлівалася ўсярэдзіне, змушаючы заміраць слодыччу растрывожанае сэрца.

— Можа, нездаровіцца табе, Зіначка? — бабуля адчула, што з унучкай нешта зрабілася.— Заўсёды была ты вясёлая, а сёння нейкая як разгубленая. Ці не хворая? Я ж во блінцоў напякла — твае любімыя дранічкі.

— Ой, бабулечка родная! — Зіна ўспыхнула ружовасцю; яе вялікія шэрыя вочы заблішчалі. І тут жа заклапочана: — А праўда, са мною як нешта робіцца. Я і сама не дам сабе рады... Няма мне з ім шчасця-радасці,— як не праз слёзы прамовіла Зіна.

Бабуля аж разгубілася. Спахапіўшыся, пачала ўшчуваць:

— Можа, як-небудзь абыдзецца,— і спачувальна ўздыхнула: — Малады, во й блазнуе, шаленец. А пасля аці-

шэе, нагуляўшыся, як тая рэчка, што ў паводку разліецца, павіруе, пахвалюецца ды ў свае берагі і асядзе. Кажуць жа : бабе важна аснавацца, тады яна сваё верне, узяўшы лейцы ў рукі. А ты, Зіначка, ласкай, унароўлівасцю старайся. Ты ж добрая. Наша парода такая — усё ласкавасцю ды ўнароўкай. Во й матка твая — ласкавае сэрца. Бацька ж, сама ведаеш, які... Характар мае дужа цяжкі. Ведама, ляснік-лесавік... З дрэвамі прывык, а яны ж, дрэвы, без языка...

Добра ёй было слухаць бабуліны казкі-казанні. Лагодныя і спачувальныя, яны як бы выводзілі Зіну з утрапення, і мала-памалу ў яе хадзе думак намячалася калі не пэўная яснасць, то прасвятленне. Ды раптам тое, на што настаўляла бабуля, павярнулася цяпер зусім інакшым, нечаканым паваротам. Перабіраючы ў памяці перажытае за амаль чатыры гады замужжа, яна цяпер прыйшла да цвёрдага рашэння — разысціся з Эдзікам, бо жыцця з ім, яна пераканалася, не будзе. Яна прыедзе і скажа мужу: «Эдзік, хопіць нам гуляць у хованкі. Таго, што трэба, у нас няма. Няма любові. І не будзе. Для абаіх нас, напэўна, будзе лепш, калі разысціся. Нельга адно аднаму завязваць свет...»

«А дзіця? — скажа Эдзік (гэта яна чула ўжо).— Дзіця нас трымае. Мы з табою, як бычок на вяровачцы.— Потым унурыцца, пачне: — Шкадую сына і таму не дам табе разводу...»

Ён, Эдзік, надзіва незразумелы і супярэчлівы чалавек. Калі цвярозы, то з ім яшчэ можна пагаварыць: ён пра нешта марыць, абяцае, што і кватэру з цягам часу атрымае, і машыну набудзе ўласную, а як толькі стрэнецца з сяброкамі, усе яго намеры ляцяць дагары, планы лопаюцца, як мыльныя бурбалкі. Эдзік прыцягнецца дамоў п'яны — і не трэба яму ні жонка, ні дзіця. А назаўтра, як учадзелы, сноўдаецца, і, мабыць, яму тады і белы свет нямілы.

Колькі паўпрошвала Зіна свякруху, каб яна паўшчувала сына, а тая адно пасміхнецца. «Я,— будзе казаць,— аддала табе хлопца... З арміі як прыйшоў, то быў нармальны чалавек. А ты, акаянніца, яго мне сапсавала: «Выпі, Эдзік, чарку, лепш паясі...» Во цяперака і цацкайся. Я вам не суддзя. Як гаворыцца, аддала на вечнае карыстанне. Радуйся, мілая, і бога не гняві...»

— Дык што ў вас там? — раптам запыталася бабуля і пільна паглядзела Зіне ў вочы, поўныя слёз.— Можа, на-

думала разводзіцца? Бачу, дзеўка, што ў вас з Эдзікам не куецца, а плешчацца...

Зіна, супакойваючыся, выцерла набегшыя слёзы, узяла блінец, абмакнула ў тук, што ўжо загусцеў на скаварадзе, і пачала неахвотна жаваць. Зацята маўчала, баючыся расплакацца. Не хацела, каб Паўлік прачнуўся, бо пачне дапытвацца пра тату, чаму да іх доўга не едзе.

І стала збірацца, хоць магла яшчэ пабыць — на работу ёй у другую змену. Маўчала і бабуля. Чакала, што ўнучка памалу супакоіцца і сама ўсё скажа. Узялася ёй памагаць. Адчыніла суднік, дастала збанок з мёдам, наліла ў паўлітровы слоік.

— Вазьмі, Зіначка, на дарогу,— сказала бабуля, падаючы слоік.— Гэта во свежы, бацька толькі што набраў з вулляка. Ліпеньскі мядок. Чысты. З кветак. Ад усякае хворасці помач дае вялікую. Ды не ганарыся, дзеўка, Эдзіка і свякруху пачастуй. Слухай-тка ўважліва, што я табе скажу. Ласкавае цялятка дзве маткі ссе, а ганарыстае — ніводнае!..

Зіна не хацела гэтага слухаць, была аж зазлавала. Ледзьве зноў не раскрычалася. Навошта ёй гэты мёд? Не было ёй клопату, абэрвуса таго яшчэ мёдам будзе частаваць. І свякруху, тую цёмную скнару, каб потым сама ж і насміхалася: «Што, маўляў, і мёд не памагае? Мёд — ліпкі, ды хліпкі...» Але змоўчала: шкада бабулю.

— Не трэба, баба, мне мёду,— выдыхнула праз слёзы. Боль, які ўсё паліць усярэдзіне, ірваўся, аж калола ў сэрцы... Яна, перасіліўшы сябе, як не аднымі губамі прашаптала: — Мабыць, не паможа нішто нам. Гарката такая ўжо, што і мёдам не супыніш. Даруй, бабуля, але мёду я не вазьму...

Збіраючыся, Зіна, аднак, не забыла прыхарашыцца. Адзела сваю любімую, яшчэ дзявоцкую, васільковую сукенку. Кароткую, нават каленцы відаць, агаляючы стройныя, па-дзявоцку зграбныя ногі. Прычоску падстроіла. А твар харашыць ёй не трэба: лёгкі румянец шчок з ямачкамі, яркая крамянасць сакаўных вуснаў з прытоенай усмешкаю ў самых куточках нібы казалі, што Зіна ў свае дваццаць чатыры гады можа пасупернічаць з любой дзяўчынай у Крывяліцку і ў ваколіцы. І ў горадзе на яе заглядаюцца. «Мабыць, я ўсё ж прыгожая»,— сама сабе ўсміхнулася Зіна, закрываючы зябкія з начы плечы лёгкай капронавай хусткай, каб валасы не пыліліся. Тады ледзь чутна, аднымі вуснамі паўтарыла бабуліна: «Ліпкая...»

Тым часам бабуля мітусілася, памкнулася была да калыскі, можа, хацела разбудзіць Паўліка, ён жа пасля ёй адхлання не дасць, усё будзе румзаць, дапытвацца пра маму, дзе яна падзелася. На пальчыках падскочыла да калыскі, прагна і пільна пазірала на хлопчыка, які смачна чмыхаў носікам, раскінуўшы ручкі. Чысты анёлак на карціне, якую Зіна бачыла аднойчы ў музеі. Яна не стрывала, дакранулася гарачымі вуснамі да лобіка, але Паўлік не прачнуўся, адно толькі бэцнуў ручкай, адганяючы нябачнага парушальніка яго ранішняга сну.

Зіна амаль подбегам выскачыла з сенечак, выхапілася з двара, не зважаючы на харство ліпеньскай раніцы, якая ўвачавідкі нараджалася і набірала сілы. Яшчэ вуліца не абудзілася знаёмымі з маленства галасамі. Кіруючыся праз вуліцу на загуменне, дзе пракладзена летняя сцежка паўз канаву да станцыі, Зіна кінула позірк у бок хаты Драздзіхі, дзе кватаравалі студэнты-гідратэхнікі — там ужо на двары чуўся шум і галёканне: хлопцы набіралі са студні вады, мыліся, рыхтуючыся на балота.

Зіну чамусьці абдало нейкай гарачынёй. Яна, не адчуваючы расы, якая калола ў ногі, не азіраючыся, подбегам шыбавала да станцыйнага доміка, што віднеўся на далягляцзе.

Спяшалася Зіна на ранішнюю электрычку, але на гэты раз паспела агледзець і той калектар, які вядуць гідратэхнікі, і Крывяліцкае балота, куды ў маленстве бегала басанож па брусніцы і буякі, дзе неаднойчы правальвалася ў «чортавы вокны», і цяпер паспачувала гэтым хлопцам у выцвілых студэнцкіх штармоўках з надпісам на спіне «Інтэграл». Гэта ж трэба ў такую спёку і ў навальнічныя дажджы цэлы дзень у ржавай багне, з аваднямі і камарамі.

А раніца бралася яркая, гарачая. Над балотам, з кустоўя і зарасніку, дыхала густая, аж сіняя, парнасць. Падсвечаныя першымі, яшчэ не пякучымі промнямі, дыміліся балотныя травы і кветкі, што ўсыпалі старую канаву і балота.

Задыхаўшыся, Зіна сцішыла крок, і яе ахінула ўтрапёнае, радаснае здзіўленне. Яна нібы нанава бачыла ўсё, чым жыло роднае, знаёмае наваколле. І гэтае балота, і недалёкі, збоч вёскі, вячысты бор, і высозныя старыя ліпы над станцыйным дамком — усё яе хвалявала цяпер, у гэтую ліпеньскую раніцу, як бы ўпершыню.

Зіна спахапілася, што глядзіць у той бок, дзе над ку-

стамі, удалечыні, застыла аграмадзіна-машына, куды во праз якую гадзіну прыйдуць хлопцы, той рыжы барадач, што ставіў пласцінкі на прайгравальнік, і сарамяжлівы Толік, з якім яны гулялі, мабыць, як не да рання.

Удыхае Зіна гаючую ранішнюю свежасць і ўся аж свеціцца, а сэрца радасна замірае, як у прадчуванні нечага светлага, неспазнанага ніколі дагэтуль.

Усплыло ў памяці ўчарашняе. Да драбніц прыгадалася тая нечаканая, неспадзяваная сустрэча. Робіцца аж смешна, як усё пачалося. Пайшла яна з студэнцікам на круг у танцы, ён па-гарадскому, а яна звычайна, як раней гулялі ў Крывяліцку. Сяк-так станцавалі. Зіна адышлася ў гурт дзяўчат, што стоўпіліся ля агароджы. У яе нешта аж у грудзях перасела — цяжка стала дыхаць. Можа, ад паху кветак, што плыў сюды, на «пятачок», з гародаў і лясной аселіцы. Толік зноў запрасіў Зіну. Танцавалі, а пасля сталі блізка адно ля аднаго.

Толік маўчыць. Маўчыць і Зіна. Першы асмеліўся Толік. Ён і кажа: «Давайце пройдземся. Пагуляем па свежым паветры». І запрашае Зіну ў той бок, дзе жыў на кватэры ў бабы Драздзіхі.

«Не,— кажа Зіна.— Пойдзем у наш канец, да нашай хаты».

Ішлі павольна, спакваля, і ў Зіны нечага ногі як не свае, як адваліліся — не слухаюць. Хвалюецца, уся дрыжыць, калоціцца... А ён маўчыць, таксама, мабыць, зляка ўся...

Была парнасць і духата. Мабыць, тую задуху ўзмацнялі саспелыя кветкі. Іх было досыць і на ўтравелай вуліцы, ля платоў, і на гародчыках. З лугоў і з лесу патыхала чаборам, медуніцамі, канюшынай і з балота — багавінням, аернікам. Кветкавы пах быў такі, што льга было ўчадзець.

А яшчэ пахлі ліпы. Яны дурманяць у ліпені, пасля кароткіх, імгненных навальніц, якія бываюць часта сушаю, на ўзлобку лета.

Ужо легла ноч, светлая, але без зор. Усё вакол: і вуліца, і дрэвы, і травы — сціпылася, як пасля вялікага напружання. Ён трымаў яе за руку, і Зіна пакрысе супакойвалася. «Толік, глянь, які ты доўгі!» — адхінуўшыся, сказала яна. А ён у адказ: «Давай памераемся...»

То была пара, калі сама што цвіла ліпа. І яе востры, мядовы пах забіваў усе астатнія.

Ужо на лавачцы, пад старым клёнам ля хаты Чаплі-

каў, Толік як асмялеў, крыху разгаварыўся. Гаварыў пра каханне. Не, не прызнаваўся ёй, што кахае, а як бы разважаў сам з сабою. І Зіне запомнілася нешта з ягоных разваг. «Калі хочаце ўбачыць душу чалавека,— казаў ён, прызнаючыся, што недзе аб гэтым вычытаў,— паглядзіце на яго губы. Цудоўныя светлыя вочы і драпежныя губы. Дзявочыя чыстыя вочы і разбэшчаныя губы».

Зіна маўчала як заварожаная. А тады ўсё ж запыталася, а якія ў яе губы. Толік ціха, як падалося ёй, нават задыхана, нахіліўшыся блізка-блізка, выдыхнуў: «Твае губы, Зінок, мабыць, з мёду, салодкія...»

Цяпер, разважаючы, Зіна думае, што пра губы Толік сказаў, бо, напэўна, хацеў пацалаваць яе, але яна адхінулася, хаця колькі намаганняў волі каштавала ёй гэта зрабіць.

«Узаемная любоў,— казаў ён, крыху супакоіўшыся,— гэта вялікае шчасце. Непадзеленая любоў — горкае шчасце».

Зіна больш слухала, чым гаварыла, хаця яна не маўчуння і, калі трэба, за словам далёка не ходзіць. Тым часам думала: «Няўжо гэта і ў нас любоў? А ён жа, Толік гэты, зялёны хлапчук яшчэ...»

Зіна ўжо ведала, што Толік — студэнт другога курса інстытута і гэта ў яго першая летняя практыка.

...Ужо седзячы ў электрычцы, Зіна дакарае сябе за сваю хвілінную слабасць. Не заўважыла, як Толік, гарачы, кранууся яе чамусьці асмяглых вуснаў, і яна не адхінулася, а замерла ў знямелай млявасці... «Зіна,— казаў Толік ледзь не дрыжачым, як спалоханым голасам.— Не ведаю, як гэта можна быць без любові...»

«А скажы, Толік,— шаптала Зіна, гледзячы ў бліскучыя ад узрушэння Толікавы вочы,— што гэта такое — каханне? Якое яно? Я дык, грэшная, і не ведаю... Не зведала, далібог...»

Толік маўчыць, як нахохлены верабей. Зіне здаецца, што ён хмурыць бровы, раз-пораз праводзіць рукой па сваіх валасах, як зусім разгубіўшыся. Тады прыпыніўся, абняў Зіну, але яна злёгку, ледзь улоўным рухам рукі адхіляе ягоную руку, а самой так хочацца прыхінуцца, што ледзь стрымлівае сябе, сваё парыванне.

Нарэшце Толік супакойваецца. Голас яго набывае цвёрдасць, рашучасць. Ведама, мужчына. «Гэта праўда,— кажа ён ужо спакойна, разважліва.— У нашыя гады, у юнацтве, мабыць, цяжка рашыць, дзе каханне, а дзе зака-

ханасць...» — «Гэта ты пра мяне, Толічак?..» — «Ага, пра цябе,— адказвае. А тады, памаўчаўшы, дадае: — І пра мяне таксама...»

Яны яшчэ ў Крывяліцку сустракаліся разоў колькі. Кароткія, але гарачыя, як ліпеньскія ночы без дажджу, з яркімі сполахамі зарніц, былі іх сустрэчы і спатканні.

Зіна за гэты час падала на развод, праўда, без згоды Эдзіка (яго за нейкі хуліганскі выбрык на базары пасадзілі на пятнаццаць сутак), і пры сустрэчы расказала аб гэтым Толіку.

Як і ў першы вечар, яны хадзілі па вуліцы доўга; потым, натаміўшыся, сядзелі на лавачцы, слухалі, як у садзе ад нейкага раптоўнага ўсплёску ветру зрываліся і падалі ў росную траву даспелыя яблыкі-налівы, як аб нечым ціха пашумліваў над імі стары клён...

Толік, як аказалася, не такі ўжо і маўчун, як падалося Зіне з першай сустрэчы. Як і ў першы раз, востра пахла кветкамі, мёдам-ліпцом...

Толік зайшоў у хату да Чаплікаў. Пазнаёміўся з бацькамі. І бацькі, і Паўлік упадабалі яго. Як на парозе з'яўляўся Толік, да яго ляцеў Паўлік насустрач: «Дзядзя Толік, дзядзя Толік прыйшоў!..»

Толік не надта цікавіўся, што ў яе было, як яны жылі з Эдзікам, але Зіна, расчуленая, сама ўсё выклала, як перад споведдзю. «Я і сама вінаватая, мабыць, што ў нас з Эдзікам так выйшла. Сляпая я была, калі шчыра. Усяму, мусіць, віною наша жаноцкая слабасць...»

Толік як бы пакрыўдзіўся ці адчуў нейкую няёмкасць, але ненадоўга. Развазжліва і доўга гаварыў пра каханне. Не ўсё тое, што ён гаварыў, яна зразумела, але нейкія думлі засталіся: «Чалавек,— казаў ён,— не кожны, асабліва ў маладыя гады, пакутуе ад таго, што не можа справіцца з парываннямі свайго сэрца. Сэрца ж часта ідзе насуперак волі. Мы часта пакутуем ад таго, што паддаёмся хвіліннай страсці, ап'янелыя, забываемся на ўсё, абы задаволіць сваё жаданне...»

«Во, дык і ты, Толік, мусіць, такі ж самы,— прытворна крыўдзіцца Зіна, а самой так хочацца прыхінуцца да хлопца, але яна стрымлівае сябе і зноў становіцца насцярожана-халоднай. Памаўчаўшы, пераводзіць гаворку на жарт: — Ліпнеш во да мяне, як на які мёд. Не прыліпай, кажу табе!..»

Толік, аказваецца, умеў пагаварыць. Зіна слухала яго,

бо ўсё гэта было для яе цікава, ёй як нанова адкрываўся свет, хаця і яна сёе-тое чытала і мела нейкія свае погляды на жыццё.

«Найвышэйшае шчасце,— казаў Толік, захапіўшыся сваімі развагамі,— дае чалавеку каханне. Яно, каханне, моцнае тады, калі ў душы кожнага адчуецца водгук сваіх душэўных струн. Патрэбна зліццё духу, пачуццяў, поглядаў і настрояў. Гэта новае, што нясе сёння каханне закаханым. Ды яшчэ сіла розуму і інтуіцыі, блізкасць ідэалаў, роднасць поглядаў...»

Чаму ж цяпер, у наш час, так часта каханне нетрывалае? Чаму гэтае чыстае пачуццё, дадзенае чалавеку прыродай, цяжэй захаваць, зберагчы?..

Зіна, задумваючыся аб сваім лёсе, прызнавалася сабе і Толіку, што яна — ахвяра легкадумнага кахання. Цяпер зноў нечакана на яе, як гром з яснага неба, абрынулася новая хваля. Яна адчула, што і Толік кінуўся, як у вір, забываўся на ўсё — ён яшчэ не зведаў таго, што дае закаханаму блізкасць з жанчынай. Усё гэта яму было вядома толькі з кніг ды з расказаў сяброкоў у мужчынскай кампаніі.

Спатканні з Зінаю ашаламілі яго, наваліўшыся так нечакана. Яму было добра з ёй, і ён поўнасцю аддаўся пад уладу свайго пачуцця. Нейкая сіла, невядомая і таемная, як шаптала яму: «Во — тваё шчасце. Зіна — твая зорка».

У той жа час Зіна, ацверазіўшыся ад учадзення, якое ахоплівала іх абаіх, пыталася ў сябе: «А што ж гэта такое? Каханне?.. А можа, часовае захапленне...»

Як і пасля першых сустрэч, Зіна аж трымцела ўся, калі ён танцаваў з ёю, калі быў блізка ля яе, калі сядзелі на лавачцы, і яе цягнула, як магнітам, да яго; калі ён цалаваў яе, ёй хацелася зліцца ў пацалунку, але яна стрымлівалася і пасля хваліла сябе за гэта. Магчыма, гэта было чыста жаноцкае — даць магчымасць яму папакутаваць, і ён аж гарэў ад прадчування асалоды.

Яна чакала кожнага новага спаткання нецярпліва і пакутліва, як асмяглая, звялая на спёцы расліна дажджу, каб ажыць і асвяжыцца. Яна верыла і не верыла Толіку, але кінула сябе ўсю насустрач невядомасці, якая ўзбурыла яе нечакана, і, ашалелая ад шчасця, аддалася свайму лёсу. У тыя кароткія вечары і ночы і ён быў перапоўнены слодыччу шчасця, якое падаравала яна сваёй нерастрачанай сілай і маладосцю. Яна і дагэтуль была прыгожая, вабная, а цяпер як бы памаладзела. Яе вочы, бліскучыя

ўвечары, як бы выпраменьвалі святло, а ад валасоў нібы струменілася гаючасць, якая проста п'яніла хлопца.

...Імгненна, як след бліскавіцы, праляцелі іх ліпеньскія вечары, поўныя ўзаемнага ап'янення ад шчасця, якое дае абаім каханне.

Аднойчы, калі яны сядзелі на лавачцы пад клёнам і слухалі далёкія ўсхліпы ліпеньскай ночы, Толік сказаў ёй, уздыхнуўшы і з нейкай бояззю ў голасе: «Заўтра ад'язджаем...»

Яна ўся аж скаланулася. «Я прыйду цябе праводзіць... На станцыю...»

Зіна прыйшла, а Толік крыху прыпазніўся. Ёй стала вельмі балюча і сорамна — яна тады сябе вельмі дакарала: «Вот табе і студэнцік...» Толік жа быў спакойны, нават прабачэння не папрасіў. І ёй кальнула ў сэрца трывога.

На развітанне Толік запытаў яе, Зінчын, адрас, а свайго не даў. Яна стала чакаць пісьма. Але пісьма не было. Ужо ўтравелі, патухлі кветкі на ўзмежках канавы, ля платоў, у гародчыках, пабіла першымі прымаразкамі пышнагаловыя вяргіні і ярка-чырвоныя мальвы.

Зіна, прыспаўшы Паўліка, самотная сядзела ля акна, перабірала ў памяці ўсё, што адбылося, а тады неяк сцішылася і задрамала. Прачнулася раптоўна, як ад нейкага ўнутранага штуршка — за акном мітусілася і біла крылцамі ў шкло жаўтагрудая лясная сінічка. «Мабыць, нейкая вестка будзе»,— падумала Зіна і ўспомніла Толікава: «Як цяжка ў юнацтве, ды і ў маладосці, разгадаць, каханне гэта ці звычайная закаханасць...»

Пад вечар вярнуўся з лесу бацька і падаў Зіне пісьмо. Дрыжачымі рукамі, ледзь не расплакаўшыся, Зіна распячатала яго, прабегла вачамі першыя радкі. Ясенінскімі радкамі Толік вітаў яе. «Ты жива еще, моя старушка? Жив и я. Привет тебе, привет!..»

...Зіна ішла той жа пратаптанай сцежкай, збоч канавы, на станцыю, не заўважаючы, што няма ўжо тых кветак і чаду спелага ліпеня — аселіца дыхала халадком і першымі жнівеньскімі туманамі. Ды гэтых змен у прыродзе яна як бы не адчувала. Душа яе спявала. Настала яе зорная часіна. Зіна забярэ свае рэчы і назаўсёды развітаецца з Халадзінскімі. Яна верыць Толіку, што ён прыедзе, як і напісаў у лісце.



ЛЮБАЧКІ

Усю ноч, мабыць, не аціхаў дождж, за акном як нехта вохкаў, плюхаўся. Па шкле паўзлі бураватыя пісягі. Марудліва, як нехаця, святлела. Кволячыся, бралася асенняя раніца. Праз акно віднелася чародка нізкіх аблокаў, што грувасціліся нізка, над самымі дахамі...

А ўчора было цёпла, сонечна. Мы ездзілі ў Маліннік, на ўгодкі нашай цёткі Прузынькі.

Летась, якраз на пачатку восені, ціхім вераснёўскім нядзельным днём, апоўдні, наша добрая, заўсёды ласкавая і прыветная цётка адышла. Той дзень і мы ў Маліннік памагалі вясковай радні выбіраць на сотках бульбу. Нашы гараджане, напалуднаваўшы, паспяшаліся на электрычку, а я крыху затрымаўся і ўжо на чыгуначным прыпынку пачуў сумную вестку: «Памерла ж ваша цётка Прузына».

Казалі, цётка Прузынька памерла вельмі лёгка — калыхала ў суседкі дзіця, і ёй нешта занядобрылася. Яна прыйшла дамоў, наказала меншаму ўнуку Сашку, каб абедалі без яе, а сама прылегла на ляжанцы, у запечку, і заціхла.

Маладыя прыйшлі з бульбянога поля на абед. Дачка Анця пачала ладкаваць на стол, паклікала маці да стала, а яна ўжо і нежывая.

— Яшчэ цёплая была,— абліваючыся слязамі, расказвала ўсім, хто быў на пахаванні, Анця, калі Прузыньку прыбралі і падрыхтавалі ў апошнюю дарогу.— Я і туды, я і сюды, а мамы ўжо і нямаш. Як жа гэта я, хоць бы прыгледзела, хаця б я пачула ад яе апошняе слова...

Уся радня, без перабольшання, шкадавала нябожчыцу. Мы з Марыляй, як яшчэ па вайне пажаніліся, бывала, калі прыедзем у Маліннік, спяшаемся да Прузынькі ў праведкі.

Марыля мая, бывала, абавязкова вязе ёй з горада гасцінец — пачку пячэння ці жменьку цукерак, а як пабагацелі, то і абнову якую-небудзь. А ўжо цётка не ведала, дзе нас і пасадзіць, і ўся аж свяцілася ад радасці. Хто я ёй — чужы чалавек, а сустракала, як роднага сына. І ўсё, бывала, руплцца: «Ну, як жа вы там, у тым горадзе, ці ладзіце? Як ты, Марылька? Як вы, Алеська?.. Хаця ўжо каб усё добра было... Каб хаця вайны не было... Як вы, Алеська, думаеце, не будзе ўжо вайны?.. Бо ў радзіве дужа часта пра вайну гавораць!..»

І ўсё мітусілася цётка Прузынька. Радая. Нейкая ўзрушана-прасветленая. Увішна тупала па хаце. Не дачакаўшыся, пакуль раскатурхаюцца дачка і зяць — маладыя гаспадары,— сама завіхалася і прыспешвала іх: «Аня, Цішка, хоніць ужо гаварыць... Садзіце гасцей... За сталом і пагаворыце». І да нас: «Любачкі ж вы мае, вы ж здарожыліся, сядайце, любачкі!..»

Гадоў дзесяць ужо, як цётка Прузынька была перахварэла — невялічкага росту, сухенькая, яна сагнулася і выдавала бы сярпок, але ўсё такая ж жвавая, рухавая, нягледзячы на тое, што хадзіла скурчыўшыся; вочы яе, некалі, відаць, самай чыстай нябеснай сінізны, свяціліся ласкаю. Мы ніколі не чулі, каб цётка Прузынька скардзілася на свае хваробы ці кволілася, што ёй нешта баліць ці нездаровіцца. Калі Марыля спытае, як здароўе, яна ўсміхнецца, і яе маленькі, увесь у зморшчынках, як васковы, тварык разгладжваецца, святлее, і цётка сваім мяккім голасам як не праспявае:

— А нічога, дзеткі, добрае здароўе, добрае... Дзякаваць богу... Жыццё цяпер настала хлебнае. І ўсім добра. І нам, старым, жыві ды не памірай!..

Яна не вохкала, не ўздыхала, не жалілася, як звычайна чуеш ад старых, на недалужнасць і хваробы, на старасць, на тое, што іх нечым пакрыўдзілі — увагай ці кавалкам хлеба. Кволая, не дужа здаровая ад маладых гадоў, цётка Прузына была надзіва цягавітая, завідлівая на працу, роўная і спакойная характарам, чулая да людзей, мужная ў сваім лёсе.

Ёй, расказваюць, не пашэнціла з маладосці. Яе Ладзіка забралі на фронт яшчэ ў тую, імперыялістычную, вайну з канём у абоз, і ён не вярнуўся. Засталася яна на гаспадарцы васемнаццацігадовай удавою з Анцечкай на руках.

Жыла на паўнадзеле, пры старым, нездалеючым свёкры, які неўзабаве памёр. Добра, што браты, іх было аж чац-

вёра — Архіп, Сідар, Тодар і Іван, яе не кінулі, а выручалі і вясною, калі самая сяўба, і ў жніво, калі кожны на сваёй паласе, як угарэлы, спяшаўся ўсё прыбраць і ўпарадкаваць у час — жылі ж усе тады са свае палоскі, са свайго мазаля. Іванка, малодшы, аж млеў, убіваўся па Прузыньцы. Ужо і як ажаніўся і пайшлі свае дзеці, не цураўся сястры, не было таго дня, каб не ўспомніў сястру-ўдаву; калі якога кабанчыка агорае, спяшаецца з дзялкай да Прузынькі; калі ў яе карова запусціцца, выпраўляе сваю старэйшую дачку Вольку з гарлачыкам малака: «Занясі Прузыньцы, няхай абнашчыцца. У яе дзіця малое».

Жонка часам і касавурыцца, а ён, калі выпадзе вольная часіна, бяжыць у канец, на Зарэчча, дзе ў старой, яшчэ дзедавай, хаце жыла-бедавала з адзінай дачкой Прузынька,— то дрывец ёй расстараецца, прыпасе, то хлевушок падправіць. На тым і трымалася яе гаспадарка.

Перад гэтай вайною выцягнулася, набралася ў нявесты Анця, і маці задумалася аб яе лёсе. На Анцю пачаў заглядацца чырвоны камандзір, суседні хлопец Цішка Комлікавых. Цішка пасля звальнення з вайсковай службы ўладкаваўся ў школе фізруком. Напрадвесні згулялі вяселле, а летам грымнула вайна. Як некалі Прузынька, цяпер Анця сабрала свайго мужа ў дарогу, а сама звалілася як нежывая. Не наўме была ні работа, ні свет белы — чула сэрца, што і ў яе, пэўна, такая доля, як і матчына,— застанецца ўдавой-салдаткай. А надыходзіла самая пара жніва. Ды дзе там да таго жніва, калі нямецкія машыны-страшыдлы дзень і ноч грукочуць, і людзі, што не паспелі выбрацца з Маліннка, пачуваюць сябе як самі не свае?

Прузынька пазірала, як убіваецца, абліваецца слязьмі дачка, і сама знібела, не магла даць сабе рады. Але неяк жа трэба жыць. Пачала гаварыць з Анцяй: «Пачакай, дачушка,— разважала, падвясельваючы і Анцю, і сябе.— Можа, яно неяк і абыдзецца, нашы прагоняць гэтых нелюдзяў-наваколаў. Дасць бог, і Цішка твой вернецца...»

Яна, Прузынька, вельмі ўпадабала зяця. Дармо што бядняк, з галецкага роду. Ды чэсны, мяккі душою чалавек. У Цішкі было яшчэ тры браты і дзве сястры — засталіся сіротамі, а бацька, Міхаіл — хворы, то дзеці і раслі без матчынай рукі, самапасам. Але дарма, жылі ўсе дружна, адно аднаго бераглі, шкадавалі; большы, Сяргей, для Цішкі як за бацьку — так яны, Комлікі, і выраслі ўсе, набралі сілы. Хлопцы сталі — на ўвесь Маліннік, ніхто благога слова не скажа!

Як прыстаў Цішка ў прымы да Прузыньчынай Анці, то ўсё-ўсё ўмеў рабіць. Дарма некаторыя пацвельваліся: «фізкультурнік — гультаю памочнік».

Не надта згаджаўся на гэтыя прымы Іван, Прузыньчын брат, спачатку ўсё неяк бокам на Цішку пазіраў, на вяселлі быў пахмурны, усё нейк паныла круціў галавою. А калі Прузынька пацікавілася, чаму такі браток невясёлы, Іван і выказаў, што на душы сабралася: «Надта ж ён ужо кволы, малы ў росце».

— Малы залатнік, ды багацька! — усміхнулася Прузынька, і брат адпусціўся крыху, памякчэў.

Цішка хутка даказаў сваё. На двары парадак навёў: якія шаечкі ці бочачкі — агледзеў, перасыпаў, клёпку да клёпкі, як зліў, куды там твой бондар. Адным словам, Прузынька змікіціла: гаспадар ёсць у доме. А што ўжо дабрэнны трапіўся зяць, вельмі ўслужлівы. Благога слова ад Цішкі не пачуеш. Усё спакойна, ласкава, без фанабэрыі. Ды, апроч усяго, і граматны, дармо што фізкультурнік.

Для Анці лепшага і не трэба. Яна ж, лічы, вясковая дзяўчына, скончыла якіх пяць класаў і пайшла рабіць у калгас. Хутка па сяле пайшла пагалоска: працавітая дзяўчына. Замужжам сваім Анця даражыла і старалася быць добраю жонкай.

Расстанне з Цішкам выбіла Анцю з такой удала пачатай жыццёвай сцяжыны. Анця занудзілася, засумавала па Цішку, журылася па сваёй горкай долі. Зблажэла ў твары, не выходзіць на вуліцу, а ўсё плача і плача. «Я,— кажа,— нешчаслівая, як вы, мама. Вайна некалі ў вас адняла майго бацьку, а цяпер і мая во такая доля»,— і ў слёзы. А для Прузынькі — перажыванне; яна і сама перажывае, на сэрца як хто камень-валун ускаціў — шкада Цішку. Каб хаця здаравяк быў, як іншыя, як хаця б і браты ягоныя, а то так, хлапчанё, нягледзячы што ў гадах, а худоба, адзін нос ды вочы блішчаць, як валюшкі сінія-сінія. Развітваўся неяк хутка, як спяшаючыся, а ёй, Прузыньцы, і руку пацалаваў. Ну, дай жа памяць, як яе Ладзік, калі гналі яго ў той абоз, тады забег да яе бацькі, да хлопцаў-швагроў і старому, цесцю, у руку пацалаваў. Тады ў яе, Прузынькі, і застаўся яе Ладзік у памяці — схіліўшыся ў паклоне, высокі, мажны ў плячах — мікалаеўскі салдат, яшчэ і салдацкай той апраткі не знасіў, вярнуўшыся са службы, а яго — зноў на вайну, у той праклятый абоз...

А цяпер з рэчмяшком за плячамі, ужо ў вайсковай

апратцы, з рамянямі крыж-накрыж, Цішка заскочыў дамоў развітацца і ёй, цешчы, руку пацалаваў, яшчэ сказаў: «Мама, глядзіце Анцю, не давайце ёй маркоціцца». Ведаў, небарака, што яна — хліпкая, за ўсё перажывае, а цяпер яшчэ, мусіць, і дзіцятка будзе. А як жа — усё перажыванне. Яна ж ведае, як адной, без бацькі, гадаваць дзяцей, без мужчынскай абароны...

Плакалі абедзве — і дачка, і маці. А жыць жа трэба. Жывы, як тая прыказка баіць, у магілу не палезеш. І восень ужо стукалася ў вароты. У Маліннік прыехаў з раёна немец-таўстун у вайсковым, казалі, нейкі Шнайдар, а людзі яго празвалі Цэбар, бо быў ён нізкі і пузаты, не раўнуючы, як цабэрак. Цэбар сабраў людзей на сход і сказаў: «Алес. Арбайтэн. Абшчына. Кальхоз нікс, абшчына — усім зямля будзет. Всё — для дойч зольдат. Алес арбайтэн!..»

Ужо і захаладалася — туманы сівыя, як трава-сівец, паплылі па-над Свіслаччу, усё поле паблякла, пашарэла, а жыта тое — сыплецца, на пні зярняты ацярушваюцца, а ячмяні рачком сталі; людзі жалі тую пераспелую ўжо збажыну, слязьмі паліваючы снапы, праклінаючы Гітлера, што напаў на нас, патрушчыў танкамі ды гарматамі жыта, парушыў жыццё, якое ўжо было наладжвалася ўсюды, па ўсёй нашай вольнай зямлі.

Жалі тое жыта, а думкі былі далёка, там, дзе фронт, дзе біліся нашы салдаты, дзе, відаць, быў і Цішка — увішны фізкультурнік. А гэта ўсё адно што і вайсковец, што страявы салдат. А ён меў і камандзірскія нашыўкі — чырвоненькія трохкутнічкі, аж тры ў пятліцы. Гэта як некалі быў аддзялённы. Ладзік усё ёй, Прузыньцы, расказваў, як вярнуўся быў з тае, яшчэ царскай службы.

Поле палівалася слязьмі.

Сярпы валіліся з рук.

Плакалі людзі. Плакала і поле, прапахлае порахам і дымам...

Ужо бульбу выбралі на гародах, з дрэў пазляталі пажухлыя лісты, усеяліся і стрэхі хат, і вуліцы жаўтлявай іржою; людзі трохі звыкліся з той жудой, якая на іх галовы звалілася нечакана, і пачалі як бы разважаць, абдумваць, што з імі зрабілі, як ім быць — жыць жа трэба, жывы пра жывое і думае, не можа не дбаць жывы чалавек пра сябе. На тое ён і чалавек, каб не апускаць рукі, калі цяжка, калі, здаецца, жыццё табе дае нечаканыя загадкі.

Іван цяпер зачасціў да сястры. Гэта былі ягоныя трывогі-разважанні, і яму, свайму брату, яна верыць, і дачку

так настаўляе. Трэба, кажа, дзядзьку слухаць. Як дзядзька скажа, так і будзе. Ён — чалавек не абы-які, служыў на чыгунцы, старшы сгрэлачнік, а цяпер дома, дастаў даведку ад урача, што ў яго — заразная хвароба, і ён нікуды не пойдзе. Прузыньцы шапнуў: «Прыходзіў знаёмы, з-пад Шацка, сказаў: германца спынілі ля Масквы. Збіраюцца нашыя з сілай. То і нам, каторыя ў тыле, не выпадае сядзець склаўшы рукі. Трэба нешта думаць...»

Яны разам бедавалі, шкадуючы Цішку. Як маглі, супакойвалі Анцю, баючыся, каб тая не захварэла ад жуды-скрухі.

— Што ж, не адзін ён такі, дастаецца ім усім, нашым салдатам-воінам,— казаў дзядзька Іван, усеўшыся на сваім любімым услончыку, ля комінка-пяколачка.— Цяпер усім гора. Вялікая бяда нахапілася на ўсіх людзей. А для салдата — двайная ношка. Яны, салдаты, за ўсю зямлю, за ўсю Айчыну адказ трымаюць. І недзе там, можа, у снягах пад Масквою, б'ецца з фашыстамі наш Цішка, Ціхан Міхайлавіч... Веру, што ён не схібіць, не паддасца звяругам-фашыстам!

— А можа, дзе ўжо ў палоне,— уставіла ненарокам Анця і заплакала: — Палонных жа вунь колькі, цэлыя натоўпы... Я штодня бягу на бальшак, выглядаю, усе вочы прагледзела, можа, гэтак і мой Цішка смягне недзе на дарозе, пад канвоем... Ох, божачка!..

— Кінь, дурніца, не ўбівайся,— ушчувае дачку Прузынька.— Усё нейк абыдзецца, усё будзе добра. Я ўчора ў Паланеі варажыла на картах — жывы твой Цішка, жывы!

...Неспадзеўкі, раптоўна расчыніліся дзверы, і на парозе з вінавата-разгубленым тварам стаў незнаёмы, малы ростам, з выгляду хлапчук-падлетак; твар увесь у шчэці, на ім — запэцканая, у латках ватоўка, на нагах нейкія атопкі ці галёшы, перацятыя вяроўчынай, лапленыя штаны. У руках — зрэбніца-торбачка. Такіх дахадзягаў, што сваім выглядам нагадвалі жабракоў, хадзіла ў тое лета і ўвосень безліч па хатах. Уранні, калі палілі ў печы, падчас сняданку, дзверы не зачыняліся. Толькі і чуеш, як раз за разам на парозе госць; просіць чаго-небудзь перакусіць. Не ганьбавалі і бульбінаю ці лустай хлеба. Гаспадыні звычайна варылі самы вялікі чыгун бульбы, пяклі праснакі з запасам на гасцей-палонных і акружэнцаў, яны бясконца брылі з хаты ў хату, перабіваючыся тым, што спагадлівы чалавек дасць. У тую жудасную восень у вёсках прывыклі да такіх гасцей, і калі чужы чалавек адчы-

няў дзверы, яго сустракалі дзе-небудзь, можа, і не надта ветла, але не крыўдзілі, не выпраўлялі з пустымі рукамі.

Іван, адказаўшы на прывітанне незнаёмага, запрасіў у хату і далей гаварыў з сястрой. Але Анця кумельгам, як спуджаная, падхапілася з ляжанкі, утрапёна завойкала, залямантавала:

— А-вой-вой, гэта ж Цішка. А-ёечкі, які ж ты страшны ды хілы...

А сама прыпала да грудзей мужа, ціха плакала.

Цішка, дрыготка абняўшы яе за плечы, маўчаў як анямелы, у горле перасела нешта даўкае — не пракаўтнуць. Нарэшце ён, вываліўшыся з Анціных рук, ступіў колькі крокаў па хаце, вінавата і збянтэжана падаў Івану руку.

— Добры дзень, дзядзька,— вымавіў ён пераселым, як не сваім голасам і асекся — не мог выціснуць з сябе ні слова.

— Добрага здароўя, хлопча, з прыбыццём цябе ў сваю хату,— загаварыў Іван неяк суха, як бы з нейкім дакорам.— Значыць, Цішка, адваяваўся?..

— Як бачыш, дзядзька Іван, адваяваўся,— як вінавата, плюскаў пачырванелымі ад доўгай хады вачамі Цішка.— Пад Дарагабужам... акружылі нас. Захапілі ў палон. Гналі сюды, у тыл, у лагер. Прыцемкам збег. Амаль месяц ішоў. Нацянькі, глухімі сцежкамі прабіраўся... Колькі разоў быў на волас ад смерці. Але, бачыш, жыць яшчэ трэба...

— Так, пляменнічак, трэба жыць,— уздыхнуў Іван...

Як на крылах, лятала і мітусілася па хаце Прузынька. Яе ахапіла нястрымная радасць: Цішка вярнуўся! Цяпер і гора не гора, калі ў такую цяжкую часіну мужчына, гаспадар у хаце.

— Во прыйшоў, дзякуй богу! — як птушка ля гнязда, шчабятала Прузынька.— Я ж казала, няйначай жа, навараражыла. Вой ды Паланея, вой ды варажбітка — угадала, як у ваду глядзела!

Ужо немаладая жанчына, што на сваіх плячах зведала ўсе нягоды лёсу, яна, можа, нават хутчэй за Івана, які таксама нямала пажыў і пабачыў на сваім веку, адчула ў радасці і трывогу — пялёгка будзе яму, актывісту і салдату, тут пад прымусам, але пакуль што радасць заглушыла тую трывогу — гэта ж з такой калатнечы, з такога перапуду выбраўся, выбавіўся чалавек — жывы застаўся, а гэта ўжо — шчасце!

Зіма прайшла ў цяжкім, як сон, аняменні, не жыццё было, а пекла пякельнае. І работа не супакойвала, усё валілася з рук. Цішка, як і трэба было чакаць, часта сустракаўся з дзядзькам Іванам, а той быў знаёмы з сакратаром райкома партыі Пракопам Рудчыкам, які цяпер жыў тайна ў знаёмых, перакідаўся па лясных хутарах, і меў ад яго сякія-такія навіны.

Збіраліся найчасцей у Прузыньчынай хаце. Прыходзіў сюды і Несцер Пятровіч, і Цішкаў брат, які не трапіў на фронт, бо меў інваліднасць. Усіх, вядома, турбавала адно: не за гарамі вясна і з лесу хлопцы пададуць сігнал — трэба падмога, але без зброі які з цябе ваяка! Так Цішка і яго сваяк Несцер Пятровіч, настаўнік, што прыбіўся дадому з Бягомльшчыны, арганізаваліся ў невялікую падпольную групу. Падпольшчыкі наважылі ўліцца ў шэрагі партызан, каб біць ворага зброяй. Употай яны збіралі патроны і вінтоўкі, раіліся, як пайсці ў лес, каб не зачапілі сем'яў.

Нарэшце такі выпадак надарыўся. Аднойчы зімовым завейным днём партызаны нахапіліся ў Маліннік (тры кіламетры ад чыгункі) і заадно прыхапілі з сабой вясковых хлопцаў і мужчын.

Так Цішка Комлік апынуўся ў партызанах. Цяпер хата Прузынькі стала лічыцца ў Малінніку партызанскай, а гэта азначала, што ў любы момант акупанты маглі нахапіцца і забраць усё да ніткі, спаліць двор, а сям'ю знішчыць без аніякага суда, у сваёй жа хаце...

Заставалася адно — хавацца і быць заўсёды начыку. Прузынька з Анцяю (яна ўжо мелася абрадзіцца), пакуль льга было, хаваліся па суседзях, у дзядзькі Івана, у другім канцы вёскі, а пасля, як Іванаў сын-падлетак самахоць уцёк за Свіслач, да партызан, ім не стала ніякага ратунку. «Хоць кладзіся ды памірай»,— праклінала ўсё на свеце Прузынька. Як толькі дзень, так малінаўскія паліцаі — Курнаёў сынок і Варона, што прыстаў быў у прымы да аднае салдацкай брыкухі-жонкі,— не давалі праходу.

— Старая, кажы, дзе ваш Цішка? — настаўляючы рулю нямецкага карабіна, дапытваўся Курнай.— Не выкажаш — самую забяром, адправім у Зарэчанск, у камендатуру...

— Ды што з ёю цацкацца,— выскаляўся чорны, як цыган, Варона і цікаваў нахабнымі вачамі, каб дзе што схапіць у хаце.— Да сценкі яе, старую качарэжку!..

Гэта было яшчэ не самае горшае. Напрадвесні, калі на чыгунцы, ля Свіслачы, за гародамі суседняй вёскі ўзарвалі вышку, у Маліннік нахапілася аблава — усе партызанскія двары ўзялі на прыцэл і першай з таго прырэчнага канца запалілі хату Прузынькі. Анці дома не было, а Прузыньку папярэдзіў сваяк Зміцер Корсік, які нечага быў каля рэчкі і ўгледзеў карнікаў, перадаў Прузыньцы, каб хавалася. Яна гародамі, пасля кустамі паспела ўцячы на хутар, схавацца ў добрых людзей — было яшчэ снежна, і трымаліся маразы. Прузынька перакалаціласа, калі Цішка сярод ночы, бывала, пастукае ў акно і з хлопцамі-партызанамі зойдзе дадому змяніць бялізну, пераабуецца ў сухія анучы, абагрэецца! Было і такое, што ён, Цішка, толькі забраўся на чэрань, каб адагрэць адубелыя ногі, бо ехалі доўга, у мяцеліцу, з адказнага задання, а ў хату заявіліся паліцаі — збіралі кажухі для сваіх ваякаў, што дубелі ў рускіх снягах, і ў Прузынькі як не выскачыла сэрца, яна, здаецца, ніколі такога страху за жыццё не мела, але ўсё нейк абышлося.

Жыццё — як дарога ў полі, то ўніз, то ўгору... Як скончылася тое ліхалецце, прыйшлі нашы, і Цішка стаў працаваць у Мінску, былі радасныя хвіліны. Пакрысе наладжвалася жыццё. У Анці пасля Валерыка радзіўся яшчэ адзін сынок — Воўка, а праз гады два знайшоўся і трэці — Сашка. «Усё хлопцы нараджаюцца ў тваёй Анці,— казалі Прузыньцы суседкі.— Мусіць, быць яшчэ адной вайне...»

— Ат, хай яна, тая вайна, ідзе на сухі лес, на голае голле,— казала Прузынька, а сама часцяком і плакала — ціхенька, каб не чулі свае,— прывыкла ўласнае гора ці бяду пераживаць сама, сваім одумам і развагамі.

Больш за ўсё на свеце пад старасць Прузынька любіла ўнукаў. Усіх траіх выпеставала, люляла на сваіх руках. Анця ж, вядома, дзень пры дні на рабоце ў калгасе — за тою работай свету белага не бачыла. Маліннік — гэта прыгарад, якіх сорак кіламетраў ад вялікага горада. Як не з кожнае хаты пасля вайны хто-небудзь пайшоў у горад. Многія, як і Цішка, жылі дома, у вёсцы, а кожнае раніцы, яшчэ на досвітку, спяшаліся на прыгарадны цягнік, каб паспець на змену. І снег, і холад, і паводка, а Свіслач разлівалася каля Малінніка шырока, амаль на вярсту ў якія вёсны, а ты ідзі, падымайся ні свет ні зара.

Не было такога выпадку, каб за тыя трыццаць гадоў, што ездзіў Цішка штодня на працу ў горад, не меў гарача-

га сняданку ці, як прыедзе дамоў, вячэры — у Прузынькі такое правіла: гаспадара глядзі лепей, як самое сябе, і гэтае матчына перадалося як дарагая спадчына Анці, калі тая ўзялася гаспадыняй.

Прузынька і ўнукаў гадавала. Калі ў школу пайшлі адзін за адным, выпраўляла не абы-як, а заўсёды ў торбачку, а пазней (калі пабагацелі), у партфелік пакладзе аладку са скваркамі ці лусту хлеба, яблычак — нельга ж, каб дзіця цярпела да паўдня на пусты жывот...

Для ўнукаў Прузынька жыла ўвесь час, усе гады, як яны — Валерка, Воўка і Сашка — на свет з'явіліся, у яе было нейкае асаблівае, можа, нават невядомае кожнай маці замілаванне. Сказаць, раслі яны ў яе, Прузынькі, на вачах — гэта тое, што нічога не сказаць, чым яны для яе былі. Клопат і турботы пра ўнукаў займалі ўсю яе, жанчыну, якая, мабыць, мела б сабе дзяцей столькі, колькі, як кажуць, даў бы ёй бог. Але такі ў яе, салдацкай удавы, лёс. Яна засталася з адным дзіцем на ўсё жыццё.

Для Прузынькі, кажуць, унукі — як падарунак лёсу, як падзяка за тое, што не мела для сябе ў маладосці.

Застанецца, мусіць, сакрэтам, калі Анця не ўсё зберагла ў памяці, як гэта Прузынька, бабуля, здолела выхаваць сваіх траіх унукаў такімі харошымі хлопцамі. Во яны — тры браты-здаравякі, адзін да аднаго, каржакаватыя, бялявыя — румянец на ўсю шчаку, сядзяць за сталом, на бабульчыных угодках. Задуманыя, горныя. А ў большага, Валеркі, вочы вільготныя, у слязах.

Праз год пасля таго, як Прузыньку, прыбраную, як на якое свята, у яе любімую зялёную хустку ў кветкі і цёмную сукенку, у новыя сандалікі, у чырвонай, прывезенай з горада труне адвезлі на могілкі, сабралася жалобнае застолле. Каржакаваты і загарэлы да чарнаты, ад гэтага выдаюць белізной валасы на скронях, дзядзька Сяргей, старэйшы з Комлікаў, прапанаваў ушанаваць памяць Ефрасінні мінутай маўчання. На ўгодках, як і на пахаванні Прузынькі, было застолле — ледзь не паўсяла.

Стол Анця і Цішка зрабілі багаты. Усяго, як кажуць, было навалам. Можа хто сказаць: канечне, восень. Увосень, кажа прымаўка, і бяднота — кум багачу. Ды пры чым тут восень, калі на стале і шынка вэнджаная, і каўбаса дарагая — сухая, маскоўская, і сыр расійскі, духмяны, і памідорчыкі марынаваныя... Праўда, было і сваё, вясковае — аладкі, як пуховачкі, у смятане і маласольныя

агурочкі, застудзіны, трыбушок і, вядома, духмяныя катлеты...

Настойка, па вясковай завядзёнцы, у старых, яшчэ, здаецца, даваеннага ўзору, графінах, простыя і прыдатныя келіхі — на пяцьдзесят грамаў.

Як ні кажыце, хаця ўжо нябожчыца і не можа крыўдаваць на тое, што яе не аплакваюць так, як шкадуюць чалавека, які дачасна адыходзіць, але відаць, якая ў гэтай хаце была ёй павага; не па абавязку дзяцей да сваіх бацькоў, а па шчырасці душэўнай, якая заўсёды жыве ў чалавеку і не прызнае фальшу, іменна за тое любяць і помняць у гэтай хаце Прузыньку — маці, бабулю, цешчу, «любачку».

...З вулічнага боку, пузырачыся, сцякалі па шкле рудаватыя дажджавыя рáгі. Але ўсё далей кроплі чысцелі і ўрэшце сталі чыстыя, як з калодзежа, і ўгары, над камінамі, якія ўсё яшчэ дымілiся, святлела; кудысьці далёка за горад сплывалі з дажджом сівыя, як чорныя спадыспаду, хмары.

Дзень браўся быць светлым, на пагоду.



ВЯЧЭРНІЯ ЗОРЫ

Уладарна раскашуецца, красуе лета. Бы з сяўні, весялун-чэрвень рассыпаў краскі на балацяных лужках; яркай, жывой зелянінай шумяць сады.

Пакуль не заявіліся пастухі, даяркі ў старанна вымытых халатах завіхаюцца, весела грымяць даёнкамі. Шчыруюць суседка перад суседкай.

З самага рання моцна прыпякае, а ў кароўніку прахалода. Устоеная за ноч цішыня то там, то тут парушаецца нязлосна-рэзкімі і ласкава-сцішанымі вокрыкамі даярак ды звонка-пералівістым цырканнем струменьчыкаў малака.

Арына, невялікага росту, у белай, глыбока насунутай на твар хусцінцы, з поўнай даёнкай скоранька тупае да бітонаў, дзе мажны чырванатвары ўчотчык спаквaля запісвае ў сшытак надоенае малако. Спакойная і засяроджаная, яна злівае сырадой і, трохі перадыхнуўшы, прастуе назад, у кароўнік. А за яе спіною чуваць: «Авой, Арына, ты як нейкая чараўніца — твае каровы, пэўна, і сянні дадуць уга колькі!..»

Арына ўспамінае даўнейшыя прымаўкі, якіх яе бацька ведаў дужа багата: «Малако ў каровы на языку», «Калі ёсць гной, то будзе і лой»...

Але Арына не ўмее гэтак лёгка і трапна гаварыць. Не такі ў яе характар — ціхоня. Відаць, удалася ў матку. Меншая сястра Дуня, тая не змоўчыць, калі што якое, сцебане ў вочы. І ёй, Арыне, выгаворвае, упікае за нясмеласць: «Ты, сястра, не давай ім патачкі. Не маўчы, а то ёсць і такія, нізавошта зняславяць, асудзяць, абгавораць...»

Цыркае і цыркае пругкі струменьчык у даёнку. А дум-

кі плывуць, абганяючы адна адну — з даляў памяці выплываюць карціны-ўспаміны, і яркія, вясёлыя, і змрочныя, турботныя — усё перажытае. І гадоў ужо багата. Рэдка хто ёй скажа: «Цётка Арына», а моладзь, тая — часцей: «Бабуся, баба». Каб раней, дык пажартавала б: «Якая я табе баба, ці я ў цябе дзяцей бабіла?» Арына, як і Дуня, незамужняя. Можна сказаць, звекавала ў дзеўках. А чаму, каб спытаў хто? Мо таму, што жыццё ім, сіротам, такое выпала.

Арына была яшчэ дзяўчынкай, як памерла маці. Малодшы брат з'ехаў некуды на шахты, дык аж праз дваццаць гадоў аказаўся, перад гэтай вайною ўжо, і бацька — стары Дзямід — вельмі перажываў сынаву зацятасць. Ад людзей было сорамна: казалі, што адцураўся Дзяміда сын. А як гэткае бацьку перанесці?..

Падлеткам Арына стала працаваць на ферме. Спачатку была цялятніцай, а прызвычаілася — узялася даглядаць і даіць кароў. Каму ж пайсці на тую ферму, як не Арыне Дзямідавай? Ціхая, рахманая, з прыхаванай журботнай усмешкай на заўсёды заклапочаным твары. Апраналася сціпла, але ва ўсё чыстае. У шэрых, дачасна атуленых зморшчынкамі вачах застаялася, праменячыся, нейкая асаблівая ласкавасць. І паходка ў Арыны лёгкая. Ніхто не чуў, каб яна з кім пасварылася, на каго павысіла голас, каму выгаварыла...

Ціхоня, кожнаму змоўчыць, саступіць, не стане на дарозе.

Што праўда, то праўда, і ў хаце ў Дзямідавых цішыня, ніколі не сварыліся сёстры. З малодшаю, Дуняй, Арына ўмела ладзіць, наказвала меншай, як з людзьмі жыць: вучыла цярплівасці і абыходлівасці з людзьмі.

Арына, можа, звекавала б, не выязджаючы далёка з вёскі, каб не вайна. У тое горкае ваеннае лета, у ліпеньскую сушу, фашысты прыпёрліся да Сожа, і з раёна прыйшоў загад: усю калгасную жывёлу адправіць у тыл. З суседкай — дзяўчынкай Хрысцінай і з дзядзькам Самусём Арына па незнаёмых бранскіх дарогах пагнала кароў на ўсход. Гулі, кружыліся з чорнымі крыжамі самалёты, вухкалі гарматы. А яны, учарнелыя і асмяглыя, гналі статак і тыдзень, і другі. Калі Самусь кінуў іх і цішком збег, засталіся дзяўчаты адны са статкам на ўзлессі. Паплакалі трохі, паўсхліпвалі ды рушылі далей. А што зробіш? Вядома, цяжка і страшна было, але каровак прыгналі аж за Арол. Атрымалі даведку, што здалі, і пакіраваліся дадому.

Насустрач сунулася вайна — фашысцкія грузавікі, танкі, матацыклы... На ўсю глотку гергеталі чужакі-салдаты.

— Цяжкая была дарога? — пытаўся пасля ў дзяўчат хто-небудзь з вяскоўцаў.

— Анягож,— казала Арына і, уздыхнуўшы, ківала галавою, дзівілася: — Столькі вёрст прайшоўшы, можна было і асмягнуць, не тое што... Сядзеш аддыхацца, дык як амярцвелы...

А якое жыццё было тады пры акупантах? Ці які нарад, ці што яшчэ — Арына і Дуня, ідзіце. Бо што якое, то стараста і коле ў вочы: «Скаціну, актывісткі, сагналі на той бок, да Саветаў». Можа, праз тое пякельнае жыццё Дзямід і памёр, без пары сышоў у магілу. Не раз жа цягалі на допыт у валасную ўправу. Казалі: за непакорнасць.

Засталіся Дзямідавы дочкі адны. Невялікую спадчыну пакінуў ім бацька — маленькую хатку ды невялічкі, але дагледжаны садок. Недарма кажуць: ніхто не бача, калі сірата плача, а кожны бача, як сірата скача.

Бывала, у Дзямідавых яблыкі ў садку наліваюцца, то і сусед мякчэе, часцей з імі загаворыць. А іншы раз і паслугу сваю прапануе. Скажам, касу паможа накляпаць і асадзіць, плуга пазычыць: у яго, суседа, і плужок таксама трымаецца ў схованцы. Гарачай парою, увесну, калі дарагая кожная хвіліна, і запрашэнне дасць: «Дзеўкі, сянні ў мяне абсеўкі, прыходзьце, частунак добры будзе». А пакуль той абед, то трэба вунь як пазавіхацца, намэнчыцца, на тых абсеўках.

Калі ж не дагодзіш, то сусед-зычлівец можа і аблаяць, і асудзіць. Нідзе не дзенешся, сусед — самая блізкая радня.

Дзяўчаты сабе і лапці плялі, і на кроснах ткалі, і аборы вілі — усю работу ў хаце ўласнымі рукамі ўпынялі. І жорны былі свае ў іх, а крупы яшчэ ў дзедавай ступе абтаўкалі — смачнейшая крупеня ці была ў каго, як не ў Арыны Дзямідавай.

Калі праз два гады ўвосень ва ўсходнія раёны прыйшлі нашы і ў калгасе ўсё трэба было нажываць зноў — абжываліся з першага калка, з асьміны таго ячменю, які пазычала дзяржава. Яго прыносілі на плячах аж за пяцьдзесят вёрст, са станцыі Камунары — коней жа ўсіх звяла вайна.

Мінулае, перажытае назаўсёды з табою, знібіць унутры, як асколак які. Не забыла, як у першыя ж дні вызвалення перапісвалі жыхароў — рабілася нанова так званая «шнуравая кніга».

— З якога цябе, Арына, запісаць года? — спытаў яе інвалід, уставіўшыся адным вокам на гаспадыню.

— Мне ўжо, здаецца, трыццаць пяты,— густа зачырванелася Арына.

— Хіба што етак? — ухмыльнуўся ён.— Дзеўка ж...

Арыну падмаладзілі аж на тры гады.

А потым прыехаў начальнік з раёна. Сказаў, што людзі патрэбны на шахты ў Данбасе. Запытаўся, хто больш падыходзіць. Дзяўчат трэба было — хоць бы пяцёра...

— Арыну Дзямідаву,— параіў сусед.— Каго ж яшчэ...

Праўда, Арына неўзабаве вярнулася, недзе з-пад Харкава. Шахты абышліся і без іх, дзяўчат. Работы і дома хапіла. Усім кабетам і дзяўчатам давялося брацца за плуг і барану. На каровах аралі і баранавалі.

— А жылі мы бедна,— успамінае Арына.— Дзіва што: і надзець не было чаго ні ў будзень, ні ў свята. Бывала, суседка мая, Ганначка, пытаецца: «Чаго ета ты, Арына, так ходзіш? Нада ж так абшарпацца, што й латкі няма дзе прышыць...» Ай, праўда, абнасіліся былі тады ўсе. Нічога ж не было ані ў краме, ані на рынку. Усе насілі свае работы — зрэбніца ды палатняная адзежа. І святочная, і абыходная,— усё на целе з лёну... Усе етак жылі,— як бы апраўдваецца перад кім Арына.— А йдзе я магла тады зарабіць?

— Цётка Арына, вы нейкая сянні вясёлая, як уся з ласкі сатканая? — не хаваючы зайздрасці, сказала даярка Маша. Тая даўно робіць даяркай, хоць па гадах многа маладзейшая за Арыну. Доўгія гады хадзіла ў перадавіках. Неўпрыкмет яе абагналі іншыя. І Арыну-пенсіянерку сталі часцей называць як лепшую — раяць прыклад з яе браць, бо Арына ўсё робіць з душой, сумленна, не вытыкаючыся наперад, не патрабуючы для сябе нічога ўзамен.

Неяк той яшчэ старшыня Фурсік (ён цяпер недзе ў саўгасе аграномам) пабыў на ферме і глядзеў у даярак посуд, то многім давялося чырванець. А Арыну пахваліў. У яе і даёнка аж блішчыць, як новая, і цадзілачка — беленькая, бы той сняжок.

Той-сёй, вядома, пакрыўдзіўся. Асабліва маладзейшыя. Усю дарогу ад Забалоцця — там ферма — зіркалі на Арыну. Маша дык не стрымалася, каб не ўпікнуць.

— Нешта Фурс надта хваліць вас, цётка Арына, ці не задужа ўжо... З чаго б ета такая вам павага?..

І зарагатала.

— Ат, адкасніся ты! — не стрымалася Арына.— Чаго ты лезеш, як зала́ ў вочы!

Нельга няпраўдаю жыць. Нельга хавацца за спіны іншых. Ды прамаўчала. Падумала: «Каб ета на мяне, дык я ад сораму згарэла б, а яна — хоць бы што...»

Ішлі моўчкі, наструненыя, як чужыя. Спрэчка, якая магла ўспыхнуць, разгарэцца, памалу аціхала.

Некалі, вельмі даўно ўжо, адразу пасля вайны, з кароўніка вывозілі гной. Коні той вясною былі вельмі схуднелыя, але возчыкі на гэта не зважалі: ім абы больш накласці.

— Не магу я глядзець, як некаторыя здзекуюцца з жывёліны,— не стрымалася Арына, падышла да аднаго нядбайніка і як не закрычала: — Нашто ета ты, акаяннік, каня абяссільваеш етым возам, ці не мог ты за два разы прывезці?..

— Не тваё дзела! — агрызнуўся возчык і кінуўся быў на Арыну з пугаўём. Але ўсе гамузам закрычалі, і возчык аціх, згроб сена, шпурнуў пад ногі каню.

...На лавачцы, пад любімай грушай-дзічкай, што аздабляе дворык, прысела Арына пасля вячэрняй дойкі, сцішылася; на каленях загарэлыя, у густа сплеценых венах рукі — ныюць прывычнай стомай; на твары — спакой і лагоднасць — у ахвоту напрацавалася. Над хатамі з Забалоцця нячутна крадуцца густыя летнія прыцемкі, і сюды, у Арынін садок, ад загумення даносіцца папіскванне перапёлкі. Неўзабаве ўжо запалавее жыта. Жаць пара!..

Думае Арына. Але не пра тое, што набліжаецца старасць. Яе радуе, што цяпер з пастухамі няма тых сварак і спрэчак, як бывала некалі, пасля вайны. Пастухі рупяцца, каб каровы поўнае вымя прынеслі, бо і пастухам плата — ад малака. І паша ўжо інакшая — канюшына з цімафееўкай, лубін кармавы, кукуруза. Малако кожны дзень прыбывае.

Як на Арынін розум, дык і лугавыя травы скормліваць трэба ўмела, па-гаспадарску. Пастухі маладыя і, можа, не ўсё ведаюць пра галоўныя травы. Аўсяніца ёсць — трава такая. Яшчэ называюць яе аўсюг, аўсянік. Яе любяць каровы. Добра пасвіць каровы і на аўсянні. У аўсянні многа травы. Аўсянне надта ж наежнае.

Яе, Арыну, часам упікаюць, як, скажам, тая Маша ці суседка Анюта: «Нашто табе так высільвацца, цётка Арына? Ты ж добрую пенсію маеш. Хата ў цябе, лічы, новая яшчэ, садок пладавіты, карова свая, свінчо. Можа, ужо

для Дуні, сястры меншай, стараешся? А можа, хочаш медаля яшчэ аднаго зарабіць?..»

«Эх, Анюта, Анюта,— сама сабе паківала яшчэ не пасівелай галавою Арына.— Не разумееш ты маёй натуры і, відаць, не зразумееш ніколі. Каровак я сваіх люблю. Я ж іх выпаіла, выпеставала з рук. А яны ў мяне вунь якія ласкавыя, харошыя. Як падумаю, што прыйдзецца расстацца, то не знаю, сэрца шчыміць!»

Ёй, Арыне, на старасці давядзецца перавучвацца: на ферму, сказаў малады заатэхнік, прыбыло новае абсталяванне і ў Забалоцці пераходзяць на механічнае даенне. «А мне б і так добра, у мяне рукі не баляць ніколечкі. Ды нічога, маладым абы лепей было...»

...Над хатамі, на сцямнелым, як падсіненым, небе, высыпалі, заіскрыліся вячэрнія зоры.



БУНТ У БІРУЛЯХ

На маёй Краснапольшчыне ёсць старая вёска Бірулі, якая мяжуе з бранскімі сёламі — Кібіршчынай, Перагонаўкай, Латакамі, Чыграямі... У Бірулях некалі былі крывыя, увосень і ўвесну гразкія вулачкі, хаты цесна стуленыя; на гародах адрыны, гумны... Праз вёску праклала сабе шлях звілістая і бруістая ад крыніц рэчка з ракітамі і кучаравымі лазнякамі па мурожных берагах. Ад колішніх Біруляў цяпер засталося толькі, можа, дзесятка паўтара хат. У дваццатыя гады некаторыя бірулёўцы, выбаўляючыся ад беззямелля, перасяліліся на хутары, а хтокольвек падаўся з абжытага кута ў свет на вольныя землі. Вакол Біруляў узніклі новыя паселішчы — Вяшняцкія, Сярэдні, Гароднае...

Людзі, што пасля гэтай вайны засталіся ў Бірулях, адбудаваліся, жывуць у новых дамах. На ўскраіне будынак пачатковай школы.

Каржакаватыя яблыні, грушы, адзінокія бярозы, ліпы і рабіны — знак таго, што будаваліся на старых котлішчах. Усё тая ж Свініца-рачулка віецца агародамі, між лугавін і крутаяраў.

З Біруляў, з пагорка, далёка відаць купчастыя ліпы і вербы ў вёсцы Горы, дзе раней быў маёнтак. А ў нізіне, цяпер цэнтры ўзбуйненага калгаса, чырвоная камяніца — былы панскі бровар, які мясцовыя жыхары называюць вінакурняй, а старыя яшчэ інакш, па-свойму — піпа.

Гэта, мусіць, ад слова «піпка». Комін бровара некалі ўвесь час дыміўся...

Камяніца ўрасла ў зямлю, частку яе сяляне пасля вайны разабралі, а ў той палавіне, што ацалела, цяпер сель-

маг. Зарослая ўлетку дзядоўнікам і бадылём, камяніца здаецца нейкім дзіўным прывідам, а зімою сваёй чырванню ажыўляе вясковы краявід.

Калі я бываю ў Бірулях, іду міма гэтай камяніцы, то нагадваю далёкую гісторыю, сведкам якой даўно ўжо, больш як паўстагоддзя, былі гэтыя маўклівыя чырвоныя муры. Мне яе расказвала маці.

Рэха падзей 1905 года, што пачаліся ў Піцеры, даносілася да самых глухіх закуткаў царскай імперыі. У родныя хаты з клункамі за плячыма вярталіся шахцёры — тутэйшыя сяляне, якіх загнала ў руднікі галеча. У клунках і хатульках яны прыносілі падарункі маткам і жонкам, а ў галовах — рэвалюцыйныя думкі.

У Бірулях быў шынок, дзе па вечарах збіраліся прыезджыя шахцёры, за чаркай манаполькі ціха і таемна дзяліліся неспакойнымі думкамі. Завадатарам у іх быў Андрэй Кабанёнак, здаравяка, плечы — сажань ушыркі. Ён быў ужо жанаты, хоць і малады, меў траіх дзяцей. Кабанёнкі жылі вельмі бедна, хата стаяла куранём, па вокны ўрасла ў зямлю, нават кароўкі сваёй не мелі.

Андрэй, казалі, пагаварыць умеў з сябрукамі. Бывала, збяруцца хлопцы-шахцёры, часцей Панас Міхалькоў, Якаў Усянок, Мікіта Гурскі. І сядзяць у шынку аж да глыбокай ночы, пакуль у газоўцы стае газы...

Каб хто прыслухаўся, пра што яны гаварылі, то пачуў бы, што яны рашыліся на нешта важнае і рызыкоўнае.

«Разаб'ём піпу,— гаварыў хлопцам Андрэй, які быў у таварышаў як бы за атамана.— Галоўнае — пачаць, а людзі падхопяць. Народ наш бедны і прыгнечаны, ненавідзіць Стошу-крывасмока. Ударым па маёнтку!..»

«Ударым»,— згаджаліся яго таварышы.

Насталі цёплыя дні. Блізілася вясна. Але яшчэ снег трымаўся моцна, уранні ціснулі маразы. Неяк марозным ранкам па вёсцы пранеслася: «Піпу забастоўшчыкі разбілі...»

Мужчыны, жанчыны, падлеткі з Біруляў пабеглі ў маёнтак. А сёй-той, найбольш смелы і рызыкоўны, запрог каня ў санкі: можа, што ямчэйшае з маёнтка ўдасца ўхапіць...

Неўзабаве бірулёўцы вярталіся дадому з дабром: адны везлі на вазах сена, другія набралі сухіх дроў-аблетнікаў з паленніцы; жанчыны неслі сувоі палатна, палойкі кужалю...

Яшчэ расказвалі, як забастоўшчыкі пайшлі ў маёнтак пана Стошы. Яны хацелі, вядома, Стошу прыстукнуць.

Але яго дома не засталі, аказаўся, гад, шчаслівы на той раз.

У спальні захапілі Стошыху. Дручкамі ўдарылі па вокнах — дзынкнула шкло, пасыпаліся шыбы. Трэснула, упала на падлогу рама.

— Што робіцца? — падхапілася ўтрапёная пані.— Ёсць аканом. Дасць вам тлумачэнне...

— Не трэба ваша тлумачэнне,— бліснуў шалёнымі вачамі Андрэй-атаман і да сваіх хлопцаў: — Братцы, а няхай жа пані сваімі белымі ручкамі свінням сняданак падрыхтуе.

Яе падхапілі і — да свінарніка. Умомант паявілася карыта. Пры ўсіх дваровых і пад рогат паўстанцаў-шахцёраў перапалоханая пані пэцкаецца, дрыжачымі рукамі пераціраe бульбу-паранку...

Затым падахвочаныя шахцёрамі людзі з дручкамі і віламі кінуліся да свірна, расчынілі дзверы, пачалі выкідваць мяхі са збожжам.

— Чырвонага пеўня пад страху! — крыкнуў Андрэй-атаман, але дварня залямантавала, пані павалілася ў ногі, пачала хрысціцца.

Мужчыны падхапілі Андрэя падпашкі, павялі да бровара, дзе ўжо кіпела народная ярасць.

...А праз дзень у Бірулі наехалі драгуны з шашкамі «нагала». У руках — бізуны. Драгуны ўехалі з Кібіршчанскай дарогі, а з-за рэчкі ім насустрач выбег сівабароды стары — бацька Якава Гурскага, аднаго з зачыншчыкаў бунту, грукаў палкай у вокны, склікаў суседзяў:

— Чаго седзіцё, ёлупні! Бярыце вілы і качэргі. Не ўпусцім у вёску супастатаў!..

Падбег староста Ларывон Дзядок, схапіў загрудкі старога і ўпіхнуў у бліжэйшую хату.

Засвісталі бізуны, бліснулі на зыркім сонцы казацкія шаблі. Драгуны занялі ўсе канцы вёскі, сабралі мужчын на пляцы.

— Дзе падбухторшчыкі? — падступіў вусаты афіцэр да старасты, наязджаючы на яго канём.— Выдайце бунтаўшчыкоў, бо самі паплоціцеся...

— У нас іх няма,— упаў на калені староста, выпусціў ад страху з рук шапку-кучомку.— Гэта не мы... Богам клянуся, што іх у нас няма!..

З-за спіны старасты высунуўся рыжабароды мужычок, загаварыў смела, але пачціва:

— Паны, за што мы будзем цярпець, калі мы нічога не бралі?..

— Узяць яго! — скамандаваў афіцэр.— Гэта і ёсць самы галоўны зачыншчык!..

Мужычок шмыгнуў у натоўп, сігануўшы, як заяц, на агароды, знік за гумнамі.

Драгуны схапілі першага, хто трапіў ім пад руку з натоўпу. Гэта быў ужо немалады ціхманы мужык Ладымер Карэцін. Ён не быў у маёнтку, нічога не браў, то надта не спяшаўся ўцякаць. Ды ўсё роўна яго схапілі.

— Ваша воля, паны! — паспеў крыкнуць Ладымер, і тут на яго наваліліся два казакі, павалілі на снег. Засвісталі бізуны; афіцэр, назіраючы экзекуцыю, прагаварыў з ухмылкай:

— Наша не воля, а наша ўласць!..

Драгуны запалілі гумно старасты. Тады пайшлі па хатах. Не мінулі, вядома, Андрэя, Міколы, Панаса і Якава. Перапаролі ўсё штыкамі, але нічога не знайшлі — іх бацькі нічога панскага не бралі. Не знайшлі і таго дабра, што мужыкі прыхапілі з маёнтка.

Самі ж завадатары ўцяклі своечасова, схаваліся ў зарэчных стагах, пажылі тайна крыху ў Кібіршчыне, а пазней з'ехалі ў Сібір, а можа, зноў на шахты.

У тыя гады ў Бірулі часта наведваўся сам валасны прыстаў. Усё да нечага прынюхваўся, вывіжоўваў, мусіць, хацеў дазнацца пра завадатараў, якія падбілі вясковых людзей на той самы бунт. Але бірулёўцы, што разам з усім людам Расіі ўзняліся супраць прыгнятальнікаў, нікога не выдалі. Іх бунтарная душа не магла змірыцца з бяспраўем, чакала больш зручнага моманту, каб зноў узняцца на змаганне.



МАРФАЧКА

Людзі ў гадах, як і яна, называюць яе памяншальна-ласкавым імем — Марфачка. Дык і драбяза, падшываны, што гадзяцца Марфачцы ўнукамі, туды ж: «Марфачка, гэта ваш Міша ўвечары сігналіў на ўсё сяло? Па дарозе ў магазін заглянуў ці «левака» падчапіў?..»

— Ат, балабоны, ну вас к чорту. Вам абы пасмяяцца,— без ценю крыўды адмахнецца ад назолаў Марфачка і борздзенька ступае сваёй дарогай.

Паходка ў Марфачкі лёгкая, плаўная. Калі здалёк глядзець, то падумаеш, што гэта маладая кабеціна. Крок у яе прыгожы, роўны; яна як бы нешта нясе на сваёй круглай галаве ў вянку валасоў, якія прыхапіў іней на скронях. І ўся Марфачка зграбная, невялікага росту, хаця ўжо і ў меру паўнаватая.

Яна як бы заўсёды куды спяшаецца. Во і цяпер стрэчнай суседцы дае кароткае «добрае здароўечка» і хуценька перабірае кароткімі нагамі ў бурках, аж пакалыхваецца яе беленькі, яшчэ сваёй работы фартушок; на ім вышытыя чырвоныя пеўнікі, выдае, бы ганяюцца адзін за другім, і глядзі, што ўхопяцца за чубкі...

Ужо ля канцавой хаты вуліцу амаль што была перайшла ёй з парожнім вядром Гапка, жанчына амаль такога ж веку, як і Марфачка. Згледзеўшы Марфачку, стала бы ўкопаная, чакала, пакуль пройдзе тая.

Гапка — адзінокая, жыве даўно адна; грубаватая, заўсёды крыклівая, можа, ад таго, што ніколі не была замужам.

Марфачка ведала, што Гапка не надта кінецца ў размовы, і наважыла была прайсці міма, бо тая часам, пад

благі настрой, можа і плявузгнуць такое, што сораму не абярэшся. Некалі Гапка, як была дзяўчынай, грымела на ўсю ваколіцу; без яе не абыходзілася ні адно гульбішча, ні адна вечарынка. Ходзіць яна ў клуб і цяпер, але ўжо зашыецца дзе-небудзь у куток і ціхенька пацягвае ў парэпаны кулак цыгарку. Праўда, бываюць выпадкі, калі Гапка, не стрымаўшыся, выгукае: «Гэй вы, шалахвосты, ціха!» Гэта, калі ўжо хлопцы прыйдуць «пад добрым градусам» і пачынаюць занадта ўжо дурэць. Звычайна ж Гапка ціхая і нейкая маўклівая.

— Што, можа, ужо на Бірулі лыжы навастрыла? — неахвотна, як бы з прымусам усміхнулася Гапка, даючы дарогу Марфачцы, і непрыкметна схавала вядро за спіну.

— Так, мая ты таечка, у Бірулі,— прывіталася Марфачка і пачала ўвішна страсаць з хусткі сняжынкі, што кружыліся над ёю роем і ўсцілалі мяккай ватаю вуліцу і ўсю Марфачку, хутаную ў цёплы кажушок і пярэстую, з доўгімі махрамі хустку. Марфачка раптам захацела спыніцца і даць волю свайму настрою, у ахвоту нагаварыцца. Яна, як бы гарохам, дробненька сыпала словамі:

— Ета ж во, мая ты таечка, ужо ўсю зіму збіраюся ў тыя Бірулі, да сястры Зінкі. Ды ўсё, бачыш, некалі, то тое, то сёе... Улетку, бачыш, работа. Думаеш, схаджу ўзімку, а тут зноў жа — рупата: Мішку сабраць у дарогу, у яго ўсё тыя паездкі ды паездкі, то тыя ўнукі: аднаго ў школу, другі на руках...

— А што ж там твая нявеха? — варухнула плечуком Гапка, але не так злосна, ужо і яе размякчыла жаноцкая цікаўнасць, налучылася нагода пагаварыць, хоць і не была яна такая ахвотніца да жаноцкіх баяў-перасудаў.— Табе б, Марфачка, не грэх і адпачыць ужо, дай табе божа, напрацавалася, набедавалася... Цяпер самае што толькі пажыць, агледзецца. А ты ўсё подбегам, усё з клопатам, з ношкаю ды з паклажаю. Не раўнуючы, як той конь-цягавік, усё на цябе хамут ды ў аглоблі!..

— А маўчы ты, таечка, не кажы...

Марфачка паправіла пад пахаю вузельчык — кайстрачку кужалёвую, чысценькую, бы гэты свежы сакавіцкі сняжок, што старанна засыпае беллю наваколле, шмарганула носікам-бульбачкай і паддала сабе ахвоты, загаманіла:

— Німа ёй цяпер урэмя, маёй нявестцы, ні хвіліначкі! Прачнецца на раніцу, то бягом на ферму, падмелася ж за даярку. Даяркі, кажа, добра зарабляюць. Пайду і я, кажа,

мама. Ну, кажу, ідзі, Гэлька, ідзі. А сама думаю, ты, дзіцятка-дачушка, і ў даярках столькі набудзеш... Усё лецейка ў цяньку над грушкаю сядзела ды ўсё абяцала: мама, я пайду торф накідаць, на торфе добра зарабляюць. Раз ці два, мабыць, схадзіла ды зноў над грушку: няхай, кажа, іх прахам возьме з тым іхнім торфам, гэта ж, кажа, адна пакута, а не работа. А цяпер, бачыш, на вялікія грошы пагалілася...

— А што, даяркі і сапраўды вунь у якой пашане,— неяк няпэўна, як здалося Марфачцы, падтрымала яе думку Гапка, тады нешта хітра ўхмыльнулася і проста спытала: — Як жа ты, Марфачка, усё-такі вырвалася, можа, замест сябе знайшла каго, ці як?..

— Ды во ета ўзяла ды адвяла Сонечку, унучку, да суседзяў, да Аўдоткі, пакуль Паўлік са школы прыйдзе,— вінавата і з сумам у некалі бліскуча-блакітных вачах прамовіла Марфачка.

Марфачка пераклала кайстрачку з правай рукі ў левую, выцерла набегшую на вочы слязу і спахапілася, што так забавілася:

— Ну, дык бывай, Гапачка, ты ж яшчэ ў печы не выпаліла. Я пайду...

Сцепанулася і Гапка, бразнула вядром.

— А мне што? У мяне дзеці не плачуць, дзякуй богу, мужыка няма, то і спяшацца няма куды. А снеданне яшчэ згатую, паспею... Дзень цяпер, бачыш, прыбывае. Ужо ж, кажаш, і саракі сёння... А я і не ведала... Забыла ўжо... Ай-ай! Ета ж некалі свята якое было! Пяклі з пшанічнай мукі птушак. Хадзілі на аселіцу, ці прыляцелі жаваранкі. Хлопцы і дзеўкі на арэлях гушкаліся. Гулянкі якія наладжваліся. Усё сяло хадуном хадзіла. Умелі гуляць некалі. А цяпер ціша, як нікога і няма. Ета ж галава ўжо, і забыла, што саракі сёння.

Гапка падхапіла вядро, тады паставіла на дол, хітала са скрухаю галавой, утрапёна пазірала на Марфачку і зноў заводзіла сваё:

— А як жа я ета, скажы ты, Марфачка, забыла, што сёння саракі. Мне ж проста сорам, ета ж каб ты ведала, мая ты галубка Іванаўна, у етый жа дзень, на саракі, я радзілася. Глядзі ты, брат, як ета я чыста забылася. Матка ж мая, нябожчыца, гаварыла, што я радзілася на саракі. Птушкі, казала, мяне прынеслі, жаваранкі з поля. Казала ўсё: Гапа, ты ў мяне будзеш шчаслівая — на саракі нарадзілася. Перад вясной. Сонейка вышэй стала хадзіць,

зямлю саграваe, а дзецям — самая вялікая радасць — цяпло і ласка...

— Дак што ж, таечка, будзь здаровая ды ў шчасці жыві,— засвяцілася Марфачка.— Колькі ж гэта табе, Гапачка, гадоў ужо? Відна, як і мне, пад шосты дзесятак блізка?..

— Ужо, брат Марфачка,— нахмурылася раптам Гапка.— Ужо шэсцьдзесят. Як падумаеш, аж вусцішна становіцца. Жыве чалавек і не лічыць, колькі ён пражыў. А тады раптам спахопіцца, як во я, то ўжэ, глядзі, і шэсцьдзесят. А ета ж, кажуць, і век наш, бабскі!..

— Дзе там! — адазвалася Марфачка, зайздросна паглядзела на румяны твар жанчыны: — Ты глядзі, якая яшчэ маладая. Шчокі румяныя, як у дзеўкі!..

— А што ж яшчэ я, калі шчыра сказаць, і ёсць дзеўка,— Гапка бліснула шэрымі, некалі задзірыстымі вачамі, трошкі прымярэжанымі пухнатымі вейкамі.— Так вось жыццё, як той казаў, пражыла адна. А чаму адна, каб хто ў мяне спытаў? Ніхто на гэта не адкажа. Я сама, калі хочаш ведаць, брат Марфачка, не скажу...

Гапка раптам неяк сцепанулася ўся, бы перапалохалася, падхапіла вядро і шырока засігала да студні, не развітаўшыся з суседкай, і тая збянтэжана і разгублена пазірала ёй услед. Ужо ля студні спахапілася і крыкнула:

— Марфачка, ты ж глядзі, як будзеш ісці з Бірулёў, то загляні. Прашу цябе, Марфачка!..

Вярталася дадому Марфачка пад вечар. Па наезджанай дарозе ішлося лёгка. Цёплая мяцеліца, што гарэзілася зрання, даўно ўжо аціхла. Сонца не было, але брала сваё, стаяла адліга. Свежы асляпляльна белы сняжок закідаў усе праталіны, што абазначыліся былі збоч дарогі, камякамі навіс на прыдарожных вербах і бярозах, зацерушыў белым пухам усё, як вокам кінуць.

Дарога наводзіла на роздум. Марфачка, удосталь нагаварыўшыся з малодшай сястрою, яшчэ больш расчулілася. На душы было неяк млосна, цяжкім гнётам клаліся ўспаміны. У Бірулях засталося яе назаўсёды незваротнае і такое дарагое дзяцінства. Успомніліся бацькі, якія даўно ўжо ляжаць на горцы ў засені шыпшынніку, прыгадаліся дзявоцкія вячоркі і хлопцы, якіх ужо даўно няма на свеце — гэта ж такія войны прайшлі, і сястра яе таксама во

ўдава, адна гадавала дзяцей — дачку і сына. Сын даўно ажаніўся, асеў недзе на шахтах і рэдка калі прышле якую дзесятку, а пісем зусім не піша. Дачка была таксама ў заробках — паехала па вярбоўцы, аднекуль прывезла нейкага дзетдомаўскага недалужніка — ён нічога сялянскага рабіць не здатны, толькі звалачэцца ў краму, накупляе гарэлкі і жлукціць. Як грошы скончыліся, то сабраўся ды на аўтобус і нават не развітаўся з жонкай і сынам — такім жвавым, кемлівым хлопчыкам. Не ведае сын, што бацька яго кідае, наказвае яму на дарогу: «Тата, не забудзь жа мне аўтамат купіць!..»

З абшмараваным, уручастым кіёчкам, які дала ёй у дарогу сястра, на выпадак, калі кінуцца сабакі, Марфачка хутка крочыла, не заўважыўшы, як апынулася на вуліцы свайго пасёлка,— ён цяпер зліваецца са старой вёскай і лічыцца адной брыгадай з палужскім канцом. Неяк няўцямна яна падняла галаву, і яе нібы аклікнуў хто. Арабіна, у белых камяках снегу, як у вясеннім цвеце, стаяла пад акном Гапчынай хаты і нібы запрашала: «Што ж ты, зайдзі!»

«Можа, сапраўды зайсці,— выплыла думка.— У яе ж сёння такі дзень».

А ля брамы ўжо стаяла Гапка і крычала:

— Заходзь, Марфачка, што ты стаіш як непрыкайная!..

...Яны ўжо сядзелі за сталом, галава да галавы, дзве жанчыны, бадай што, аднаго ўзросту, і гутарылі. Перад імі стаяла даўно пачатая бутэлька вішнёвай настойкі і дзве шклянкі з пітвом, у талерках закусь — крамяныя агуркі, смажанка-бульба, гектарніца-скаварада са скваркамі, і тлушч на ёй ляжаў белым пластом — скаварада на стале стаяла, мабыць, яшчэ зрання.

Гаворка спачатку вірліла, жанчыны гаварылі заўзята і горача, а цяпер як бы стаміліся — колькі ні гавары, а ўсяго не перагаворыш.

Як агонь, калі сціхае і ўжо вуголле пачынае пакрывацца налётам попелу, так і іх гутарка, калі яна вычарпалася — трэба было ў яе падкінуць нешта такое, каб ажывілася, зашугала, загарэлася яркім, зыркім полымем.

— Пайду я ўжо двору, Гапачка,— успомніла Марфачка, што яе там чакаюць дзеці, гаспадарка.— Пайду. Я ж пакінула ўсё на Паўліка, а які з яго шчэ гаспадар, ён жа блазан — школьнік. Сонечка там адна занудзіцца. Пайду, таечка.

— Кінь ты, брат Марфачка,— усхапілася, як бы ачнулася ад знебыцця гаспадыня.— Пасядзі. Куды ты рвешся. Думаеш, цябе чакаюць там. Ніхто там па табе не гаруе. Ты, шчыра табе скажу, для іх хутка будзеш зусім лішняя, непатрэбная. Паняла?..

— Чаму ж етак, таечка? — здзіўлена замігала светлымі вачамі Марфачка і спахмурнела, задумалася, ад нечаканасці так сціснулася ўся ў камячок, стала бы птушка-аўсянка.— Не веру я ў твае словы, таечка. Не веру. Як жа ета? Я — гадавала, бедавала. Ты ж ведаеш, як мне было, калі я расціла сваіх сыноў, Паўліка ды гэтага Мішу, сваімі мазольнымі рукамі ўсё для іх жа зарабляла. Хіба не помніш, як у нас тады, па вайне, калі немца вытурылі, а нашы прыйшлі і пагналі фашыстаў у тую Германію, а мы, бабы-ўдовы, засталіся з малымі дзяцьмі ды са старымі дзядамі... Помніш жа, як з тых Камунараў на сабе насілі тое семяно ў кайстрачках ды ў клуначках, на сваім гарбе, цэлую паўсотню вярстоў!..

— Помню, Іванаўна, памятаю,— уставіла як бы абыякавая, здаецца, да ўсяго Гапка і ўздыхнула.— Усё памятаю. Памятаю, як ты шчэ ў тэй варывеньцы жыла, як твае хлопцы ад сажалак снарад прывалаклі ды на дварэ пачалі цяпло раскладваць, але стары Цімонька прыбег, накрычаў на іх, і снарад адвезлі на падводзе пад Косцішын хутар і закапалі. Ета ж каб не стары Цімонька, то не скажу, ці былі б у цябе твае і ўнукі.

Гапка іранічна рассмяялася. Затым раптоўна сціхла, насупілася:

— Што ж, суседка, возьмем па каліву...

— Вып'ем, анягож! — Марфачка, падняла да рота шклянку, зморшчылася. З талеркі ўзяла агурок, пачала жаваць. Мабыць, яна цяпер забылася на ўсё на свеце. Ці гэта так падалося на першы погляд. Можа, наадварот, усё тое, што было на душы, прасвятлела, і прасіла выйсця ўсё, што накапілася за доўгія гады. Яна сядзела горная і нейкая надта ж сцішаная. Уся патанула ў думках. Паглыбілася ў сябе. Твар яе, маладжавы і акруглы, як бы святлеў, наліваючыся думкаю; вочы нязвычна запаліліся агеньчыкамі руху і дзеяння. Як бы знутры нехта невядомы ў ёй самой штурхаў яе некуды і падахвочваў выказаць усё тое набалелае і зляжалае пластом на сэрцы.

— Развярэдзіла ты, суседка, маю душу,— Марфачка аж жахнулася свайго голасу, цяжка здрыганулася.— Аж во забалела ўсярэдзіне. Ета, бачыш, як камень на сэрцы

зварухнула. Ён, етый камень, ляжыць мне ў грудзях з саменькай вайны. Усе етыя гады нашу яго, тэй камень — гнёт, прывыкла ўжо, а ета ты во зачапілася за яго, і ён зрушыўся, і на мяне як хто сто пудоў усклаў...

— Пра што ета ты, Марфачка?..

Гапка распраўлялася са скваркай, а тады, пазіраючы асалавелымі вачамі на суседку, натапырылася: што б такое магло ўзрушыць звычайна такую бесклапотна-гаварлівую сакатушку, як Марфачка. Няўжо ў яе не прайшло, не выветрылася з галавы тое далёкае, што перажыла, што ўжо даўно павінна было б перагарэць? Той год, калі шчаслівыя салдаткі сустракалі мужоў з вайны, для Марфачкі абярнуўся горкасцю і крыўдай на ўсё жыццё. Гапка — чалавек вясёлага нораву, лічыць, што не варта сушыць сваё сэрца ўвесь век з-за таго чалавека, які растаптаў твае пачуцці, такі чалавек не варты таго, каб яго насіць у сэрцы, па ім маркоціцца.

Здагадваючыся, пра што занепакоілася Марфачка, Гапка засмяялася бесклапотна, задзірыста, як магла смяяцца толькі колішняя весялуння Гапка, дзяўчына-агонь.

— Во, дурніца, знайшла праз што сумаваць. Ета ты ўсё пра свайго Васількa?.. Плюнь і выкінь з галавы.

Гапка лёгка адкінула назад галаву, у шэрых, прасветленых застоллем вачах з'явілася нешта падобнае на злосць. Яна паднялася, стала насупраць Марфачкі, і тая падумала, якая яшчэ дзябёлая і прыгожая гэта жанчына, на плечы яе, можа, не клаўся такі цяжар, і голас яе гучаў, як прысуд:

— Выкінь з галавы яго, паскудзіну, назаўсёды, кажу табе!..

Увішная, шурпатая Гапчына рука сціснула Марфаччына плячо. Сціснула моцна, бы абцугамі. Гапка загаварыла амаль шэптам, у самае вуха сяброўкі:

— Ты думаеш, што адна такая? Думаеш, мне не падкідваў лёс такое ж... Ты ж не ведаеш, ды не толькі ты, мала хто ведае, што быў чалавек, які мне падабаўся і прызнаваўся, што кахае мяне. Мы думалі пажаніцца, і на дарозе ў нас стала адна... жанчына, канечне, і яна пераманіла яго. А я засталася... дзяўчынай. Як бачыш, на ўсё жыццё...

— Да цябе ж, кажуць людзі, сваталіся,— ціха, як не сваім голасам, прамовіла Марфачка і змоўкла, не зважаючы, што ў яе па твары цякуць буйныя, па гарошыне, слёзы. Яна іх не выцірала, нават не зварухнулася з мес-

ца.— Кажуць, добрыя хлопцы набіваліся, адбою не было...

— Так. Што з таго,— сумна ўсміхнулася Гапка, паківала галавою.— Сваталіся, дак што з таго. Я парашыла лепш застацца векавухаю, чым тое нялюбае замужжа. Думаеш, я не ведала, як за маёй спіной некалі абгаворніцы плялі: маўляў, Гапка такая і раз'етакая, яе ніхто не бярэ, да яе мужчыны не заляцаюцца. І тады я назло ўсім, назло пляткаркам і курыць пачала і больш усё мужчынскую работу прасіла — усё і арала і баранавала, а як вечарынка якая — у танцах адзіноцтва сваё гасіла, старалася ўсё, што ніяк не забывалася, вырваць з сэрца, з карэннем вынішчыць!..

— Ну што ж, вырвала?..

Марфачка аж скаланулася, што такое сарвалася ў яе з вуснаў. Яна ведала, што Гапка — жанчына моцнай волі і ўмела схаваць сваю скруху, свае душэўныя трывогі за напускной радасцю і весялосцю. Ніколі ніхто не бачыў, каб яна сумавала, умела яна сама павесяліцца і разварушыць тых, хто побач з ёю. Ні з кім яна не дзялілася, не раскрывала, што ў яе на душы. Жанчыны звычайна яе чамусьці стараніліся і нават пабойваліся.

І раптам так выказвалася яна перад нейкай там Марфачкай, з якой яны, можна сказаць, зусім чужыя; жывуць, праўда, на адной вуліцы, хат праз якіх пяць-шэсць, але ніколі між імі не было такой адкрытасці і шчырасці. Чаму? Хто ведае чаму. Яны і на пакосе часта былі разам, і на жніве, і ў застоллі, на чэсцях сустракаліся ў адной кампаніі, а сёння бы ўпершыню адкрылі адна адну.

Гапка маўчала, у одуме абхапіўшы галаву рукамі. Можа, яна думала пра Марфачку. Прыгадвалася, мабыць, як з недалёкага хутара прывёз сабе нявесту Васілька Шабрук — насаты, вельмі ўжо ціхманы, падобны на хлапчука, жанішок, чыста дзятлік. У Палужжы за яго нялёгка было сасватаць дзяўчыну, а Марфачка, казалі, пайшла не задумваючыся. Можа, спадабаўся ёй Васілька-дзятлік, а хутчэй з-за таго, што ў сям'і Мядзведзіка было апрача Марфачкі яшчэ чатыры дачкі.

Не доўга Марфачка жыла ў сям'і Шабрукоў; яны з Васількам неўзабаве агаралі сабе хаценку з ёўні і аддзяліліся. Жылі маладыя бедна, але ў згодзе і дружбе. Ласкавая, вясёлая і вострая на язык Марфачка рабіла ўсё, каб было добра яе Васільку. Як палужанцы аб'ядналіся ў калгас, Васільку, які быў не надта ўжо каб здаравяка, знайшлася

справа па сіле — ён стаў паштаром, а Марфачка рабіла з жанчынамі на розных работах, у брыгадзе. Здаралася, што Васілька захварэе, а гэта такі бывала часцяком, асабліва ўзімку, то яго падмяняла Марфачка. У завіруху, у марозную халадэчу, па цаліку яна з паштовай сумкаю ішла на пошту ў Ігліцу, а тады і пісьмы і газеты сама па хатах разносіла. Разнясе ўсю пошту, а ўвечары за кросны ці за пралку сядзе, а тут жа і калыска пры ёй — якраз ужо тады і Паўлік знайшоўся... А Васілька ўсё кволіўся, а іншы раз і з мужчынамі дзе-небудзь у хаце прасядзіць цэлы дзень...

...Гапка думае пра Марфачку і цяпер глядзіць на яе як бы нейкімі новымі, не сваімі вачамі. У прасветленай, не затуманенай ад пітва галаве ў яе мільганула: значыць, і яна, Марфачка, носіць нешта пад сэрцам, і яна не вырвала, не вынішчыла са свядомасці свайго Васілька, а мінула столькі часу — дзіўная ўласцівасць чалавечая. Кажуць жа, што сэрцу не загадаеш.

— Вырвала, кажаш? — балючая ўсмешка скрывіла колісь прыгожы твар Гапкі. Яна як бы ў здзіўленні ўзняла вочы на суседку: — А ты, Марфачка, спытай лепш у сябе самой, ці вырвала ты назаўсёды свайго Васільку, а ён жа, паскуда, кінуў цябе?.. Што маўчыш, кажы!..

Марфачка нервова перабірала ў руках махры, мабыць, баялася, што Гапка заўважыць, як трымцяць у яе пальцы, яна адчувае, што і вусны неяк крывяцца, торгаюцца: калі б яна цяпер загаварыла, то расплакалася б. Даўно тое ж было, ужо ўсё перабалела, і ў сэрцы нічога не засталося, адна пустэча, нейкая толькі скруха — прыкрасць. Рана тая даўно як бы зарубцавалася і зусім не баліць. А глядзі, кранула тое месца, дзе рубец, і стала млосна, рана заныла. Невядома, што гэта — крыўда ці шкадаванне? Злосць ці боль страчанага?

— Што ж ты маўчыш, суседка?

Гапчыны колісь бліскучыя карыя вочы насміхаліся.

— Маўчу,— скрозь слёзы прамовіла Марфачка. Губы яе трэсліся, і яна ўся неяк зморшчылася, і твар яе сабраўся ў камячок, стаў нейкі стары, як азызлы. Відаць, усё тое, далёкае, даўно ўжо забытае, зноў выплеснулася з сэрца, з яго самых глыбокіх закуткаў. Ціха ліліся яе словы, словы жальбы і крыўды: — Я ўжо даўно як бы і забылася на тое, дык сэрца, сэрца не даруе. Паслухай жа, Гапачка, ці можна ж дараваць такое? Вярнуўся мой Васілька з вайны паранены, хваравіты. Прыйшоў двору ў

палапленым шыняльку. З парожнім рэчмяшком. У ім, праўда, быў нейкі абмылачак ды старая пара бялізны. «Цяжка мне было, Марфачка,— сказаў ён,— служыў у такой часці, дзе нават і пагаладаць неаднойчы даводзілася». Як прыйшлі нашы чырвоныя, то яго часць стаяла ў Крычаве. Усю зіму там стаялі яны — чыгунку і масты ладзілі. Я ж тады, дурніца, не ведала, што майго Васільку нейкая разлучніца прыгрэла. Ды чула маё сэрца: нейкі сумны, не той мой Васілька, усё нешта ўздыхае, не радуецца, што двору вярнуўся да дзетак. А хлопцы ўжо былі вялікія, падраслі за тыя гады, што ён быў на вайне,— Паўлік ужо выцягнуўся, падлетак. Адразу ж, ты ведаеш, у той год і ў фэзэву паехаў, аж на Урал, у які горад, я ўжо і забыла. Я рада, што вярнуўся мой франтавік, пасадзіла за стол свайго гаспадара і гляджу не нагляджуся: проста не веру, што ён ета — такі ён у мяне слабачок і пераборлівы на ежу, а вытрываў усю вайну і з медалём «За Пабеду» прыйшоў... Мне так шкада-шкада яго стала, як бы табе, суседачка, сказаць, як дзіцёнка роднага. Гляджу на яго, на маршчакі пад вачамі, на скроні сівыя і чуць не плачу. А ён нейкі журботны, маўклівы, не павесяліўся, а яшчэ цяжэй уздыхае, вочы патупіў, не глядзіць на мяне, бы ў тых вачах нейкая дужа-дужа вялікая вінаватасць ці боль пякучы які... Чула маё сэрца, што ета нешта не так, нешта палучылася. Я стала ў яго дапытвацца, а ён адмоўчваецца, паціпае дрыжачай рукой спацелы твар. І адно смаліць і смаліць — папяросу за папяросінай...

— Дурніца ты, Марфачка,— раптам падхапілася Гапка.— Ты ж магла здагадацца, падлюга ён, ужо прыжаніўся, можа, паквапіўся на чужое дабро. Трэба было каленам пад зад, і ўсё тутака.

— Эт ты, Гапа, Гапа,— загаварыла, крыху заспакоіўшыся, весялей Марфачка.— Ета, як чужая бяда, а сама, бачыш, па сваім Хомку маркоцішся, нудзішся ўсё жыццё. Усім сватам давала ад варот паварот. У дзеўках звекавала, а суджанаму не здрадзіла...

— Глупства ўсё ета,— махнула рукою Гапка.— Чалавек — вір, чалавечая душа — пацёмкі. Ой, многа трэба думаць, многа з чалавекам трэба паесці солі, каб зразумець яго, убачыць, што ў яго там на душы...

— Эх, Гапачка! — зусім расчулілася Марфачка.— Родненькая мая таечка, гаротніца і ты такая, як я, няшчасніца мая ты, кветачка любая, дай я цябе пацалую,— і Марфачка рашуча адхіліла шклянку, абхапіла Гапку за плечы,

моцна прытулілася да яе шчакі мокрым ад слёз тварам.— Я ж табе шчэ не даказала, як яго, свайго Васілёчка, праводзіла тады ў дарожку, яшчэ ў яго мяшэчак паклала ледзь не апошні брус сала. Не ведала я тады, што ета будзе апошняя наша сустрэча і нашы сцежкі разыдуцца назаўсёды. «Прашчай,— сказаў ён,— Марфачка. Прашчай, можа быць, не ўвідзімся. Не спамінай ліхам». Васілька мой яшчэ падаў мне руку, і мы так развіталіся...

— Забудзь, не шкадуй! — плюнула Гапка, абцёрла вусны звыклым рухам шурпатай, прапахлай тытунём далоні.— Туды яму і дарога, карузліку гарбаносаму... Можа, цяпер і раскайваецца, наеўшыся хлеба прымацкага, а ты во жывеш, дзякуй богу, як чалавек, унукаў гадуеш, сама сабе гаспадыня... І ўсё такое...

Спакойна і рэзка разважыла сваёй таварышцы па нясшчасці гэтая жанчына. І ў гэтай справе для яе не было нічога складанага і заблытанага — усё было ясна і светла, можа, ад таго, што гэта была не яе бяда.

— Я і не шкадую,— пасля нейкай хвіліны маўчання загаварыла Марфачка, а сама аж заходзілася ў плачы: — За што? За што ён мяне так пакараў... Ці ж я яго не глядзела, ці ж яму не дагаджала?..

— Нешта ж, бачыш, зганьбаваў ці чорт яго ведае, што яму заступіла,— ужо крыху спакайней сказала Гапка. Відаць, і ёй хацелася неяк суцешыць Марфачку. Можа, яна цяпер сур'ёзна задумалася і хацела дакапацца да прычыны іх таго разладу. Ды не доўга яе займала гэтае дакопванне. Яна тут жа раптам грукнула кулаком па стале:

— Паразіт ён, і ўсё!..

— Што ты, Гапачка, бронь божа,— завойкала, замахала рукамі Марфачка, і вочы яе свяціліся нейкай глыбокай, усёдаравальнай ласкай.— Не кажы так, таечка!.. Ета ж, як успомню, які быў жаласны тады, той міленькі мой Васілька, якія страшныя былі ў яго тады вочы, то аж сэрца захлынаецца, душа пачынае балець. Ета ўжэ, відно, вайна ўсё тое нарабіла, яна ета, праклятая нахабніца-разлучніца. Праз вайну-пякельню ўсё разбілася нашае шчасцейка. Вайна-пякельня разлучыла нашыя сэрцы. Не кажы, Гапачка, я вінавачу ету вайну!..

Гапка разгублена плюскала вочкамі, у роспачы ківала галавой і ўсё напружвала, маршчыніла лоб — сілілася, што адказаць, і, нічога важкага не знайшоўшы, як бы сама сабе абыякава прагаварыла:

— А ты ж, казалі, неяк бачылася з ім, на вяселлі ў сына... Праўда ета ці плявузганне?..

— Ага, праўда, бачылася,— паспешліва і неяк неахвотна адказала Марфачка і падхапілася, пачала развітвацца.— Ой, даруй, Гапачка, я ў цябе ўжо засядзелася. Там жа мяне ўжо заждаліся... Пайду ўжо я...

— Дак пачакай, ужо раскажы, я ж хачу ведаць, як у цябе адбылося тое... спатканне,— Гапка не дала падняцца госці, амаль што сілай пасадзіла яе на ранейшае месца.

— Ну што ж, калі хочаш, то слухай...

...Большы сын Марфачкі Паўлік, які жыве недзе ля Палтавы, напісаў, каб маці абавязкова прыехала на яго вяселле, бо знайшоў сабе дзяўчыну, з якою наважыў ажаніцца.

— Ну што ж, трэба ехаць,— даў згоду меншы, Міша, яшчэ быў тады нежанаты.— Ты, мама, едзь, а я пабуду дома, не бойся, усё дагледжу... Не маленькі. Будзь спакойная, мама!..

Марфачка сабралася, узяла тое-сёе ў чамаданчык на дарогу, накупіла падарункаў для сватоў і для нявесткі і адправілася на станцыю. Узяла білет і села ў цягнік, які менш як праз суткі прывёз яе да месца. Там яе сустрэў Паўлік, быў рады, як дзіця: «Ета добра, мама, што прыехала». Па дарозе расказаў, што запрасіў і бацьку: «Канечне, табе, мама, можа, і не спадабаецца, я ўсё разумею, ды ўсё ж ён мне бацька...»

Марфачка была спачатку разгубілася. Было найпершае жаданне — вярнуцца назад, кінуць усё і дадому, каб вочы не бачылі, каб сэрца не шчымела. Тады прыйшло інакшае, другое рашэнне: «А чым я перад ім вінаватая? Чаму мне павінна быць соромна? Ён кінуў мяне, разлюбіў — яму няхай і будзе соромна. У мяне — душа чыстая, я нічога яму кепскага не зрабіла, усю вайну чакала. Горачка столькі хапіла. З дзецьмі і па балотах і па зямлянках напеклавалася».

На вяселлі яны і сядзелі побач. І толькі сваты, якія ведалі пра ўсё, назіралі, сачылі за імі і, можа, заўважылі нацягнутасць і халоднасць між Марфачкай і Васількам, які адчуваў сябе бы акунёк на патэльні. А Марфачка жвава размаўляла, весела жартавала і зусім не падавала выгляду, што ўжо дзесяць гадоў, як яны разышліся, пастаяўшы моўчкі ля той вілаватай бярозы, назаўсёды.

Марфачка за сталом нават перакідвалася і словамі з былым мужам. Ён адказваў на яе запытанні, а сам у гаворку амаль што не ўступаў.

Праз дзень Васілька заспяшаўся на станцыю. Відаць, прычынай была Марфачка, бо ён не думаў, што і яна будзе. Сын яго запрасіў, але нічога не сказаў пра маці. Чаму так ён спяшаўся, нікому нічога не сказаў. «Не магу больш, прабач, сын... »

На станцыю Васільку праводзілі талакою. І сваты, і маладыя, з імі была і Марфачка. Неяк яны адсталі, і Васілька ўсё пацепваўся, гмыкаў, відаць, намерваўся загаварыць, але ніяк не рашаўся.

Маўчала і Марфачка, несучы ў сабе нейкую няпэўнасць — болю яна не адчувала, у душы была пустэча і недзе ў закутку — можа, спагадлівасць. Яна паглядзела на яго, як птушыную, пасечаную зморшчынамі шыю і ўздыхнула, з вуснаў зляцелі як чужыя словы:

— Як жа, Васілька, жывеш, ці шчаслівы хоць?..

Васілька аж прыгнуўся, глыбей ссутуліўся, дзятлікавую галоўку ўцягнуў у плечы і, бянтэжачыся і заікаючыся, выдыхнуў:

— Панімаеш, Ів-ванаўна, праўда, што к-кажуць, лепш першым куском... пп-падавіцца!..

І пашкандыбаў барзджэй. Нейкая крывая, вінаватая ўсмешка застыла на яго ўчарнелым хударлявым твары.

З тым яны і разышліся.

— Во бачыш, Гапачка, тое ўжо было больш як дзевяць гадоў. Бачыш, не соладка яму там, а маўчыць. Не абзываецца...

— А каб адклікнуўся? — аж падхапілася Гапка, яна ўжо была заснула, схіліўшы галаву сабе на рукі, і ціха драмала. А можа, так Марфачцы здалося.

— Не ведаю, таечка, не знаю,— зусім спакойна і лагодна, з цёплай усмешкаю на разамлелым ад гарачыні ў хаце твары гаварыла Марфачка.— Сэрцу не загадаеш. Сэрца — яно, можа, чуе іначай. Яно не паддаецца на нашы развагі... Не ведаю, галубка.

* * *

Гусцелі цёмныя змрокі, калі Марфачка асцярожна ўвайшла на двор. Намацала зашчапку ў сенцах, адчыніла дзверы і загаманіла ў цемру:

— Гэля, вы ўжо спіцё? А Міша прыехаў?..

— І Міша ваш недзе швэндаецца, як і яго мамачка,— пачулася з цемрыва.

Марфачка ўся аж скаланулася — хацелася сказаць ня-

вестцы нешта такое, каб тая адчула, што яшчэ тут, у хаце, не яна поўная гаспадыня. Без Марфачкі Гэлька засмецціласа б. Паспела ўжо і ў краме за прадаўшчыцу пабыць, і ў кладаўшчыках пахадзіла — ніяк не падабаецца ёй, бо ўсюды ж трэба працаваць, а яна, бачыш, вучоная — дзесяцігодку скончыла — і лічыць, што для яе падавай чыстую работу. Дзяцей, казала, ёй шмат не трэба. Ці дагледзела б яна і гэтых, каб не Марфачка. Калі шчыра сказаць, яны і выгадуюцца ў яе на руках. Во гэтая, меншанькая, толькі і ведала, што «бабуся, на ручкі...».

Нявестка ўзнялася на ўзлокаткі, падняла кудлатую галаву з ляжанкі і зноў уляглася.

Марфачка ціха, на пальчыках, прайшла ў залу, паглядзела на ложак, дзе звычайна спалі дзеці — Паўлік і Сонька, паправіла коўдру і, заспакоеная, скінула буркі, паклала галёшы, каб прасушыліся, і прылегла на канапцы, бо ляжанку за грубкай, дзе была яе пасцель, заняла нявестка.

Доўга не магла заснуць Марфачка. Асцярожна, каб не разбудзіць нявестку, варочалася, пазяхала ў кулак зноў жа, каб не чула Гэлька, і ёй усё ўспаміналася яе душэўная і шчырая размова з Гапай, чула, як бесклапотна сапла нявестка на цёплай ляжанцы, і думкі то наплывалі хвалямі, захлынаючыся, як у паводку, то спадалі, заціхалі, пакідаючы такі невыразны туманны след, і знікалі. Перад ёй усплыло ўсё яе жыццё як на далоні. У вушах стаялі Гапчыны словы: «Ты ім патрэбная, пакуль дзяцей падгадуеш...» Крыўда мучыла яе, не давала душэўнага заспакаення. Крыўда заглушала ўсё астатняе: «Во, адлучылася за ўсе гады на адзін толькі дзень, і ўжо нявеха натапырылася, надзьмулася як апечаная. Пра вячэру не заікнулася. Як бы тут яна, Марфачка, і не гаспадыня. Не, галубка, ты яшчэ без мяне тут зарасцеш па вушы трын-травою. Бачыш, во малако ўсё не працэджана, кінула проста так у даёнцы і посуд параскідала; як дзеці елі, так усё на стале кінулырынула. Ета ж усё на зругу, на здзек ёй, свякрусе. Няхай, качарга, ведае, што яе тут «для мэблі» трымаць не збіраюцца. Няхай не забывае, чый хлеб есць. Ды не ж, дудкі, Марфачка яшчэ не ўломак, яна яшчэ пакажа ёй, смаркачцы етай, пакажа, дзе бог, а дзе парог...»

Марфачка і сама з сябе ў думках пасмялася. Ніколі яна так не скажа. Не ў яе характары гэтакая злосць, смеласць. Ды ўрэшце, і што б гэта дало, каб яна ўзбунтавалася. Ніхто не паверыць, што Гэлька такая злосніца, спадцішка кусае, а на людзях: «Мама, мамачка». Людзі ска-

жуць: «А што ёй, старой, патрэбна? Сядзі ды пячэнне жуй, пенсію ж даюць, дык яшчэ і нейкія дагаджэнні, бачыш, ёй пакамандаваць хочацца; сядзі ўжо ціха ў запечку ды глядзі, калі чарга дойдзе, кінуць-пададуць якой капусты ў місцы ці скварку». Ведае Марфачка характар нявесткі, з ёю, з гэтай уядай, толькі зачапіся, то згрызот не абярэшся. Начаўпе, не пасароміцца ні суседзяў, ні дзяцей: «Ты і такая, ты і сякая. Недарма цябе і муж кінуў. За тваю ябеднасць, за тваю занозлівасць. Ты ўсюды свой доўгі язык уткнеш. І нам во жыць з Мішам не даеш, нашу жызню разбіваеш. І разаб'еш, толькі дай распусту, дай разгарненне...»

«Што ж застаецца,— разважае сама з сабою Марфачка,— маўчаць, ды падтакваць, ды ўсміхацца, рабіць выгляд, што ты ўсім задаволена, што ўсё робіцца так, як трэба, усё ідзе згодна, як задумала яна, твая нявестка, як зварыць яе разумная галава. А ты глядзі, што табе скажуць, куды загадаюць, і не пераступай мяжы, не праяўляй свайго, не рабі сваім одумам, бо ўсё адно ты будзеш абсуджана, тваё ўсё ні ў чэсць ні ў ласку. Ета ўсё таму, што твой клопат, тваё старанне ім не даспадобы; ты толькі выведзеш з раўнавагі таго, хто лічыць сябе тут за гаспадара...»

Марфачка варочаецца з боку на бок, не можа ўляжаць на месцы — бы на што мулкае натрапіла, не можа яна ніяк сцішыцца, забыцца сном. У вачах стаіць Гапка, яе насмешліва-бесклапотны твар, яе паблажліва-абыякавыя адносіны да таго, што для Марфачкі — справа яе жыцця, яе немінучай трывогі.

У акне нешта яркае бліснула, бы сполахі маланкі ці водбліскі далёкага зарыва, і зараз жа яе вуха ўлавіла знаёмы гул матора — гэта Міша вяртаўся з рэйса. Марфачка хуценька шамялякнула з канапкі і затэпала босымі ступакамі, адчуўшы пякучы халадок маснічын, і нейкая неабдымна-шырокая, бурлівая радасць запоўніла ўсю яе, падхапіла, бы на крылах, і яна ўся аж свяцілася ад незвычайнага наплыву ўнутранага ўзрушэння.

Марфачка запаліла святло, подбегам патэпала ў сенечкі, адкінула зашчапку.

— Ета ты, сынок? — прамовіла Марфачка, як бы праспявала, і сама здзівілася, які ў яе яшчэ тонкі і мяккі голас.

— Так, я, мама,— пачулася ў дзвярах.

...А з ляжанкі, дзе звычайна клалася Марфачка, чулася ціхае, з прычмокамі сапенне — нявестка дасыпала свой добры сон. Нявестцы смачна спалася.

ЗМЕСТ

БАЦЬКАВІЧЫ. Аповесць 3

АПАВЯДАННІ

У завіруху ——————————————— 230
На вакзале ——————————————— 234
Матчына сэрца ——————————————— 244
Ліпень-мёд ——————————————— 254
Любачкі ——————————————— 267
Вячэрнія зоры ——————————————— 278
Бунт у Бірулях ——————————————— 284
Марфачка ——————————————— 288

Кухараў С.

К 95 Бацькавічы: Аповесць, апавяданні.— Мн.: Маст. літ., 1991.— 303 с.: іл.

ISBN 5-340-00541-0.

Кухарев С. Батьковичи: Повесть, рассказы.

Звычайная, непрыкметная вёска ў глыбінцы, на ўсходзе Магілёўшчыны... Тут і жывуць героі аповесці і апавяданняў пісьменніка, сярод якіх ён нарадзіўся і вырас, робяць сваю адвечную сялянскую справу, сустракаюць тыя перамены, што прынесла ў ціхую вёску савецкая ўлада, будуюць новае жыццё.

К $\frac{4702120201—013}{М302(03)—91}$ БЗ 62—90 ББК 84Бел7

Литературно-художественное издание

Кухарев Степан Иванович

БАТЬКОВИЧИ

Повесть, рассказы

Минск, издательство «Мастацкая літаратура»
На белорусском языке

Літаратурна-мастацкае выданне

Кухараў Сцяпан Іванавіч

БАЦЬКАВІЧЫ

Аповесць, апавяданні

Рэдактар *Л. Р. Законнікава*
Мастак *А. А. Бетанава*
Мастацкі рэдактар *Л. Я. Прагін*
Тэхнічны рэдактар *І. І. Дуброўская*
Карэктар *Н. У. Доваль*

ІБ № 3333

Здадзена ў набор 20.01.90. Падп. да друку 28.09.90. Фармат 84×108 1/32. Папера друк. № 1. Гарнітура звычайная новая. Высокі друк. Ум. друк. арк. 15,96+0,11 укл. Ум. фарб.-адб. 16,07. Ул.-выд. арк. 17,60. Тыраж 4800 экз. Зак. 33. Цана 1 р. 40 к.

Выдавецтва «Мастацкая літаратура» Дзяржаўнага камітэта БССР па друку. 220600, Мінск, праспект Машэрава, 11.

Мінскі ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга паліграфкамбінат МВПА імя Я. Коласа. 220005, Мінск, Чырвоная, 23.

СЦЯПАН НУХАРАЎ

БАЦЬКАВІЧЫ